ARCHE Зьмест № 3’2001 СКАРЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. Скарына і ананасы. Аляксандар Надсан у ARCHE 3(17)-2001. "Я ня мог нідзе знайсьці слова „аўдыравацца“, але калі яно азначае тое, што я думаю, дык выглядае, што не Падуанскія дактары экзаменавалі Скарыну, але ён іх…"
3. Скарына і ананасы. Аляксандар Надсан у ARCHE 3(17)-2001. "Я ня мог нідзе знайсьці слова „аўдыравацца“, але калі яно азначае тое, што я думаю, дык выглядае, што не Падуанскія дактары экзаменавалі Скарыну, але ён іх…"
4. Вайна з беларускай гісторыяй. Генадзь Сагановіч у ARCHE 3(17)-2001. "…у адказ на правядзенне навуковай канферэнцыі “Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі: 1917—1997 гады”, арганізаванай беларускімі гісторыкамі, старшыня згаданага аб’яднання “Гістарычныя веды” Адам Залескі, мастак Міхась Савіцкі і іх калегі звярнуліся да Генеральнага пракурора Беларусі з просьбай…"
5. Вайна з беларускай гісторыяй. Генадзь Сагановіч у ARCHE 3(17)-2001. "…у адказ на правядзенне навуковай канферэнцыі “Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі: 1917—1997 гады”, арганізаванай беларускімі гісторыкамі, старшыня згаданага аб’яднання “Гістарычныя веды” Адам Залескі, мастак Міхась Савіцкі і іх калегі звярнуліся да Генеральнага пракурора Беларусі з просьбай…"
6. Апошняе слова Алеся Адамовіча. Сяргей Дубавец ў ARCHE 3(17)-2001. "І да высокага сэнсу, які адкрываецца, паўстае з гэтых твораў: не было ў тую вайну для беларуса сваіх, не было свайго боку, свайго інтарэсу. Гэта чужая вайна жорнамі прайшла-праехала па хрыбціне беларускага чалавека…"
7. Апошняе слова Алеся Адамовіча. Сяргей Дубавец ў ARCHE 3(17)-2001. "І да высокага сэнсу, які адкрываецца, паўстае з гэтых твораў: не было ў тую вайну для беларуса сваіх, не было свайго боку, свайго інтарэсу. Гэта чужая вайна жорнамі прайшла-праехала па хрыбціне беларускага чалавека…"

8. Пяць год яднаньня, альбо Палітычная прахіндыяда. Аляксандар Фадзееў ў ARCHE 3(17)-2001. "…Беларусь захоўвае для сябе “варыянтнасьць выбару”, паколькі ня можа прыйсьці да пагадненьня з Расеяй у пытаньні адзінага эмісійнага цэнтру…"
9. Пяць год яднаньня, альбо Палітычная прахіндыяда. Аляксандар Фадзееў ў ARCHE 3(17)-2001. "…Беларусь захоўвае для сябе “варыянтнасьць выбару”, паколькі ня можа прыйсьці да пагадненьня з Расеяй у пытаньні адзінага эмісійнага цэнтру…"
10. Эканамічны нацыяналізм супраць культурнай экспансіі. Валерка Булгакаў у ARCHE 3(17)-2001. "…“канчатковая сыстэмная інстытуалізацыя” беларускага дзяржаўнага апарату можа адбыцца толькі пры пераходзе дзяржаўнай улады ў іншую якасьць — марыянэткавай каляніяльнай адміністрацыі, у сфэру кампэтэнцыі якой не ўваходзяць ні фінансавыя, ні прававыя пытаньні…"
11. Эканамічны нацыяналізм супраць культурнай экспансіі. Валерка Булгакаў у ARCHE 3(17)-2001. "…“канчатковая сыстэмная інстытуалізацыя” беларускага дзяржаўнага апарату можа адбыцца толькі пры пераходзе дзяржаўнай улады ў іншую якасьць — марыянэткавай каляніяльнай адміністрацыі, у сфэру кампэтэнцыі якой не ўваходзяць ні фінансавыя, ні прававыя пытаньні…"
12. Любымі даступнымі сродкамі. Аляксей Знаткевіч ў ARCHE 3(17)-2001. "Паступова сярод часткі ўдзельнікаў, не ў апошнюю чаргу тых, што прайшлі праз турмы, высьпявала думка, што посьпеху можна дасягнуць толькі адказваючы гвалтам на гвалт…"
13. Любымі даступнымі сродкамі. Аляксей Знаткевіч ў ARCHE 3(17)-2001. "Паступова сярод часткі ўдзельнікаў, не ў апошнюю чаргу тых, што прайшлі праз турмы, высьпявала думка, што посьпеху можна дасягнуць толькі адказваючы гвалтам на гвалт…"
14. Сьвет эміграцыйнага эпісталярыю. Лявон Юрэвіч ў ARCHE 3(17)-2001. "…ад першай хвалі новых эмігрантаў зь Беларусі Янка Чарапук апынуўся паміж варагуючымі кааліцыямі, згуртаваньнямі, аб’яднаньнямі і задзіночаньнямі, прычым сутнасьць той варажнечы часта заставалася для яго невытлумачальнай…"

15. Сьвет эміграцыйнага эпісталярыю. Лявон Юрэвіч ў ARCHE 3(17)-2001. "…ад першай хвалі новых эмігрантаў зь Беларусі Янка Чарапук апынуўся паміж варагуючымі кааліцыямі, згуртаваньнямі, аб'еднаньнямі і задзіночаньнямі, прычым сутнасьць той варажнечы часта заставалася для яго невытлумачальнай…"
16. Пачаткі беларускай сеціратуры. Аліса Бізяева ў ARCHE 3(17)-2001. "…заклікае пісаць нармальныя сучасныя казкі для дзяцей пра Інтэрнэт і кампутары і, дарэчы, разважае на нашую тэму — „пра магчымы ўдзел…"
17. Пачаткі беларускай сеціратуры. Аліса Бізяева ў ARCHE 3(17)-2001. "…заклікае пісаць нармальныя сучасныя казкі для дзяцей пра Інтэрнэт і кампутары і, дарэчы, разважае на нашую тэму — „пра магчымы ўдзел…"
18. Засьпетыя на Гарацым. Тры стратэгіі будаўніцтва "Помнікаў". Андрэй Хадановіч ў ARCHE 3(17)-2001. "… гэтак маю стаяць і буду раўці аб нечым… пра… пра… чорт што там далей… аб нечым мабыць сьмешна-жалобным…"
19. Засьпетыя на Гарацым. Тры стратэгіі будаўніцтва "Помнікаў". Андрэй Хадановіч ў ARCHE 3(17)-2001. "… гэтак маю стаяць і буду раўці аб нечым… пра… пра… чорт што там далей… аб нечым мабыць сьмешна-жалобным…"
20. Легенда пра Вялікае Княства. Юлія Андрэева ў ARCHE 3(17)-2001. "На шчасьце, музычны зьмест новага альбому апынуўся лепшым, чым ягонае навуковае забесьпячэньне. Прынамсі, у якасьці лёгкай музыкі для адпачынку ён спадабаецца і прыдасца…"
21. Легенда пра Вялікае Княства. Юлія Андрэева ў ARCHE 3(17)-2001. "На шчасьце, музычны зьмест новага альбому апынуўся лепшым, чым ягонае навуковае забесьпячэньне. Прынамсі, у якасьці лёгкай музыкі для адпачынку ён спадабаецца і прыдасца…"
22. Адзін погляд на Бэрлін з Крыжовай гары. Алесь Эроціч ў ARCHE 3(17)-2001. "Тут пачынае дзейнічаць нешта падобнае да таго, што складае для чалавека магію любое даўніны, любой руіны ці помніка: таямнічая прыцягальнасьць мінулага часу, які прыносіць разбурэньні…"

23. Адзін погляд на Бэрлін з Крыжовай гары. Алесь Эроціч ў ARCHE 3(17)-2001. "Тут пачынае дзейнічаць нешта падобнае да таго, што складае для чалавека магію любое даўніны, любой руіны ці помніка: таямнічая прыцягальнасьць мінулага часу, які прыносіць разбурэньні…"
24. Палеміка ў ARCHE 3(17)-2001. "Аплявуха ў цэлым слушная, і павінен быў бы я прыняць яе з хрысціянскай пакорлівасцю, калі б не адна, мабыць, невядомая аўтару рэцэнзіі і, тым больш, чытачам “дробязь“…"
25. Палеміка ў ARCHE 3(17)-2001. "Аплявуха ў цэлым слушная, і павінен быў бы я прыняць яе з хрысціянскай пакорлівасцю, калі б не адна, мабыць, невядомая аўтару рэцэнзіі і, тым больш, чытачам “дробязь“…"
26. Хайку, напісаныя на дарогах. Адам Глёбус ў ARCHE 3(17)-2001. "Чорны сабачка засьнежанае поле…"
27. Хайку, напісаныя на дарогах. Адам Глёбус ў ARCHE 3(17)-2001. "Чорны сабачка засьнежанае поле…"

[image]
A R C H E **S k a r y n a** **№ 3 (17) – 2001**
[image]

[image]

[image]
[image]–[image]2001
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

З ь м е с т

Аляксандар Надсан
Скарына і ананасы
„Я ня мог нідзе знайсьці слова „аўдыравацца“, але калі яно азначае тое, што я думаю, дык выглядае, што не Падуанскія дактары экзаменавалі Скарыну, але ён іх…“ {далей}
Генадзь Сагановіч
Вайна з беларускай гісторыяй
„…у адказ на правядзенне навуковай канферэнцыі “Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі: 1917—1997 гады”, арганізаванай беларускімі гісторыкамі, старшыня згаданага аб’яднання “Гістарычныя веды” Адам Залескі, мастак Міхась Савіцкі і іх калегі звярнуліся да Генеральнага пракурора Беларусі з просьбай…“ {далей}
Сяргей Дубавец
Апошняе слова Алеся Адамовіча
„І да высокага сэнсу, які адкрываецца, паўстае з гэтых твораў: не было ў тую вайну для беларуса сваіх, не было свайго боку, свайго інтарэсу. Гэта чужая вайна жорнамі прайшла-праехала па хрыбціне беларускага чалавека…“ {далей}
Аляксандар Фадзееў
Пяць год яднаньня, альбо Палітычная прахіндыяда
„…Беларусь захоўвае для сябе “варыянтнасьць выбару”, паколькі ня можа прыйсьці да пагадненьня з Расеяй у пытаньні адзінага эмісійнага цэнтру…“ {далей}
Валерка Булгакаў
Эканамічны нацыяналізм супраць культурнай экспансіі

„…“канчатковая сыстэмная інстытуалізацыя” беларускага дзяржаўнага апарату можа адбыцца толькі пры пераходзе дзяржаўнай улады ў іншую якасьць — марыянэткавай каляніяльнай адміністрацыі, у сфэру кампэтэнцыі якой не ўваходзяць ні фінансавыя, ні прававыя пытаньні…“ {далей}

Аляксей Знаткевіч

Любымі даступнымі сродкамі

„Паступова сярод часткі ўдзельнікаў, не ў апошнюю чаргу тых, што прайшлі праз турмы, высьпявала думка, што посьпеху можна дасягнуць толькі адказваючы гвалтам на гвалт…“ {далей}

Лявон Юрэвіч

Сьвет эміграцыйнага эпісталярыю

„…ад першай хвалі новых эмігрантаў зь Беларусі Янка Чарапук апынуўся паміж варагуючымі кааліцыямі, згуртаваньнямі, аб’яднаньнямі і задзіночаньнямі, прычым сутнасьць той варажнечы часта заставалася для яго невытлумачальнай…“ {далей}

Аліса Бізяева

Пачаткі беларускай сеціратуры

„…заклікае пісаць нармальныя сучасныя казкі для дзяцей пра Інтэрнэт і кампутары і, дарэчы, разважае на нашую тэму — „пра магчымы ўдзел…“ {далей}

Андрэй Хадановіч

Засьпетыя на Гарацым.

Тры стратэгіі будаўніцтва "Помнікаў"

„…гэтак маю стаяць
і буду раўці
аб нечым… пра… пра…
чорт што там далей…
аб нечым мабыць сьмешна-
жалобным…“ {далей}

Юлія Андрэева

Легенда пра Вялікае Княства

„На шчасьце, музычны зьмест новага альбому апынуўся лепшым, чым ягонае навуковае забесьпячэньне. Прынамсі, у якасьці лёгкай музыкі для адпачынку ён спадабаецца і прыдасца…“ {далей}

Алесь Эроціч

Адзін погляд на Бэрлін з Крыжовай гары

„Тут пачынае дзейнічаць нешта падобнае да таго, што складае для чалавека магію любое даўніны, любой руіны ці помніка: таямнічая прыцягальнасьць мінулага часу, які прыносіць разбурэньні…“ {далей}

Палеміка

„Аплявуха ў цэлым слушная, і павінен быў бы я прыняць яе з хрысціянскай пакорлівасцю, калі б не адна, мабыць, невядомая аўтару рэцэнзіі і, тым больш, чытачам “дробязь“…“ {далей}

Адам Глёбус

Хайку, напісаныя на дарогах

„Чорны сабачка
засьнежанае поле…“ {далей}

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (17) – 2001
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **04-08-2001**
[image]

Аляксандар Надсан

Скарына і ананасы

АЛЯКСАНДАР НАДСАН апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў замежжа. Апякуецца лёнданскай бібліятэкай імя Францішка Скарыны. Аўтар кнігі "Друя і Грэка-каталіцкая царква на Беларусі" ("Божым шляхам", 2001).

Уладзімер Агіевіч. Сімволіка гравюры Скарыны. Менск: Беларуская навука, 1999.
Уладзімер Агіевіч. Сімволіка гравюраў Скарыны // Беларусь. Менск, 1997, №8.
Уладзімер Агіевіч. Волевыяўленне Скарыны адносна сваіх імёнаў: дакументальныя сведчанні і праблема перакладу // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. Менск, 1999, №1.

У 1935 ці 1936 г. — дакладна не памятаю, — калі я быў вучнем польскай пачатковай школы, на лекцыі польскай мовы мы чыталі апавяданьне пра сьвята „тшэх крулі“. Кожны з нас па чарзе чытаў урывак з апавяданьня. Майму сябру выпала чытаць пра „шопку“ (батлейку), сярод пэрсанажаў якое былі два анёлы. Сябра неяк агораў першыя два словы, а на анёлах засеў, пачаў чырванець і заікацца. Нарэшце, пасьля ня ведаю колькіх няўдалых спробаў, радасна ўсклікнуў: „Былі два ананасы!“ Якраз у тым часе зьявіўся ў продажы напой, які называўся „ананас“. Яго можна было купіць у Карпука насупраць

чыгуначнай станцыі і ў цукерні Зэліка на рынку. Для нас, падшыванцаў, сьвет тады дзяліўся на дзьве часткі: тых, хто пакаштаваў гэтага цудоўнага напою, і нешчасьліўцаў, якія толькі пра гэта марылі.
Я прыгадаў гэтае здарэньне, калі чытаў артыкул У.Агіевіча „Сімволіка гравюраў Скарыны“ ў часопісе „Беларусь“ (Менск, 1997, №8, с. 36–39). У ім, сярод іншага, аўтар разглядае вядомы партрэт Скарыны, або хутчэй напіс на ім. Гэты напіс зроблены даволі незвычайнаю вязьзю. Тым ня менш, крыху пасядзеўшы, нават неабазнаныя з кірылічнай палеаграфіяй могуць прачытаць яго як **Доктор Франциско Скорина**. Так да гэтага часу чыталі ўсе, хто займаўся Скарынам. Усе, апроч Агіевіча, паводле якога напіс трэба чытаць **Георги (Франциск) Скорина**. Вось вам і „ананас“!
Як гэта сталася, што вучоныя, якіх у артыкуле Агіевіч называе „афіцыйнымі захавальнікамі спадчыны Скарыны“, не заўважылі сваёй памылкі? Ягоны адказ просты: „Людзі навукі спараджаюць догмы і прымхі, гэта значыць абсалютна антынавуковыя рэчы. Больш таго, яны не прымаюць слова праўды“. Для большай яснасьці Агіевіч ілюструе сказанае малюнкам, на якім „людзі навукі“, прадстаўленыя як пэрсанажы байкі Крылова — „проказница мартышка, осел, козел и косолапый мишка“, — усялякімі спосабамі стараюцца не дапусьціць, каб іншыя даведаліся сапраўднае імя Скарыны.

Пытаньне імя беларускага першадрукара не дае спакою Агіевічу. Ён вяртаецца да яго ў артыкуле „Волевыяўленне Скарыны адносна сваіх імёнаў: дакументальныя сведчанні і праблема перакладу“ (Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1999, №1, с. 39–44), дзе разглядае напісаны на лацінскай мове пратакол паседжаньня 5 лістапада 1512 году „Калегіі дактароў навук і мэдыцыны“ Падуанскага ўнівэрсытэту ў справе дапушчэньня Скарыны да экзамену на ступень доктара мэдыцыны. І вось тут пачынаюцца паважныя сумневы, — не адносна самога дакуманту, але адносна веданьня Агіевічам лацінскай мовы. Напрыклад, ён піша, што слова **nominatur** — „2-ая асоба, цяперашні час ад дзеяслова **nomino**…“. У першай клясе гімназіі нас вучылі, што канчатак **-tur** характэрны для трэцяй (а не другой) асобы адзіночнага ліку дзеяслова залежнага стану. Таксама нам

укладалі ў галовы, што **nominatus est** — трэцяя асоба адзіночнага ліку мінулага закончанага часу дзеяслова залежнага стану і азначае „быў названы“, а ў ніякім выпадку ня „носіць імя“, як гэтага хоча Агіевіч. А ўжо зусім незразумела, чаму дзеепрыметнік прошлага закончанага часу **praefatus** патрабуе дапасаваньня дзеяслова ў мінулым незакончаным часе. Калі не мыляюся, дзеепрыметнікі дапасоўваюцца да назоўнікаў, а не да дзеясловаў няважна якога часу.
Агіевіч уважае дасюлешнія выданьні дакуманту недакладнымі, а ягоныя пераклады на беларускую мову — памылковымі. Асабліва яму не падабаецца месца, дзе старшыня паседжаньня, віцэ-прыёр калегіі Тадэй Мусаці, прадстаўляе Скарыну іншым: „Qui quidem iuvenis **et** doctor prefatus **nominatur** D[ominus] Franciscus“, г. зн. „Гэты вышэй згаданы юнак **і** доктар **завецца** С[падар] Францішак“. Паводле Агіевіча ўвесь сказ трэба чытаць: „Qui quidem juvenis **artitus** doctor prefatus **nominitabatur** D. Dranciscus…“, г. зн. „Гэты …малады **ўмелы ў мастацтве** доктар **звычайна (часта) называўся** С[падаром] Францішкам“. Мэта Агіевіча ясная: паказаць, што хоць Скарыну звычайна называлі Францішкам, гэта не было ягонае сапраўднае імя. Што ж, часам бывае, што некага называюць не сваім імем. Майго добрага знаёмага Сяргея ангельскія прыяцелі завуць Mike, але ў ягоным пашпарце ўсё ж напісана Siarhei. Бязглуздасьць таго, што намагаецца даказаць Агіевіч, відавочная. Уявіце сабе сцэну: старшыня прадстаўляе экзамэнацыйнай камісіі кандыдата і, замест назваць ягонае імя, кажа: „Яго звычайна клікалі Францішкам“. І нікому ж не прыйшло ў галаву спытацца, якое ж ягонае сапраўднае імя!
Варта дадаць, што ў дакумэнце няма ніводнага слова, сказанага самім Скарынам. Дык якое ж гэта „волевыяўленьне“? Агіевіч замяняе словы **et** і, больш часта, **artium** словам **artitus**. Такім чынам агульнапрыняты тытул **artium Doctor** (Доктар свабодных навукаў) ператварыўся ў **artitus Doctor**. Не зусім зразумела, што гэты „тытул“ мае значыць. Слова **artitus** даволі рэдкае ў лацінскай мове. Яно азначае ня столькі „ўмелы ў мастацтве (навуках)“, колькі хітры, пранырлівы“, напрыклад „artiti viri“ (хітрыя мужы) у камэдыі Пляўта (к. 210 г. да Хр.) „Asinaria“, або „Асьліная камэдыя“.
Напэўна, Агіевіч страціў нямала часу, пакуль знайшоў у слоўніку патрэбныя яму словы. На жаль, слоўнікі карысныя

толькі для тых, хто ведае мову. Інакш можа стацца, як у выдаўцоў альбому „Там, дзе сінее Нарач“ (Менск, 1963), дзе пад здымкам Максіма Танка, які сядзіць задумённы на беразе возера, сказана: „Не адна з яго песень стала народнай…“ Гэты сказ быў перакладзены на ангельскую мову як „Not a single song of his poetry became a folk one…“, што ў адваротным перакладзе на беларускую мову гучыць: „Ніводная песьня зь ягонай паэзіі ня стала народнай…“.
Сваё заключнае слова Мусаці распачаў наступным зваротам: „D[omini] Doctores, vos audivistis istum pauperem **et** doctum juvenem…“, што значыць: „С[падары] дактары, вы пачулі (або выслухалі) гэтага беднага і вучонага юнака…“. Паводле Агіевіча дадзены сказ павінен гучаць: “D(omini) Doctores, vos audivistis istum pauperem **artitum** doctorem juvenem”, што ён перакладае як: “С(падары) вучоныя, вы аўдыраваліся гэтым паўперам і **artitum** доктарам маладым…” Падуанскі пісар напэўна жахнуўся б ад непісьменнай лаціны Агіевіча. Ён ня бачыў беларускага перакладу… Я ня мог нідзе знайсьці слова „аўдыравацца“, але калі яно азначае тое, што я думаю, дык выглядае, што не Падуанскія дактары экзаменавалі Скарыну, але ён іх. Агіевіч не перакладае словаў artitus і pauper (бедны). Для першага, відаць, ён не знайшоў беларускага адпаведніка. Другое слова, паводле яго, не азначае „бедны“, але паказвае на прыналежнасьць Скарыны да закону тампліераў, поўны тытул якога ён дае як „Pauperes commilitones Christi Templique Solomonici“, а ў перакладзе „Зрэбныя сутаварышы Хрыстовыя Храму Саламонавага“. Пакінем у супакоі не зусім адпаведнае слова „зрэбныя“, але, як кожны гімназіст-першаклясьнік ведае, часьціна **que** — не канчатак, а энклітычны злучнік з тым самым значэньнем, што **et**. Таму трэба перакладаць ня проста „Храму“ але „і Храму“: пропуск злучніка мяняе сэнс.
Калі за часоў Скарыны існавала нейкая тайная арганізацыя з вышэй згаданым назовам, дык яна ня мела нічога супольнага з арыгінальным законам тампліераў, якіх сустрэў трагічны канец 200 гадоў раней. Агіевіч беспадстаўна залічае да гэтай арганізацыі Скарыну толькі на аснове наяўнасьці слова **pauper** (бедны). Гэтую тэму ён разьвівае ў сваім „magnum opus“ (пра што ніжэй), дзе на с. 301 палымяна заяўляе, што калі б пісар хацеў указаць на беднасьць Скарыны, то ўжыў бы слова **miser**. Да гэтага часу я быў перакананы, што слова **miser** азначае

„няшчасны, жаласны“. Але ж беднасьць, асабліва для студэнта, гэта яшчэ не няшчасьце.

Агіевіч, хоць ягонае веданьне лацінскай мовы, мякка кажучы, даволі хісткае, упэўнены, што ён адзіны зразумеў правільна тэкст Падуанскага дакуманту. Можна было б яго пакінуць у супакоі зь ягонай **felix ignorantia**, калі б ня тое, што ў кароткім пераказе зьместу артыкулу на ангельскай мове ён абвінавачвае тых, каго ён пагардліва называе „official legacy keepers“ (афіцыйнымі захавальнікамі спадчыны) Скарыны, у „acts of intellectual forgery“ (актах інтэлектуальнага падлогу). А гэта, як кажуць ангельцы, is not very nice.
У 1999 годзе выйшла друкам праца Агіевіча „Сімволіка Гравюры Скарыны“, прысьвечаная вывучэньню партрэта беларускага першадрукара, што знаходзіцца ў „Кнізе Ісуса, сына Сірахавага“ (Прага, 1517). Аўтар зьвяртае асаблівую ўвагу на сымбалізм партрэта і ягоных асобных часткаў. На ягоную думку, „Партрэт пераўзыходзіць значэнне асабовасці Скарыны сваім эпісэнсам біблейскага космасу! Тут асоба Скарыны — увасабленне ідэі чалавека наогул, чалавека-хрысціяніна як гуманнага ідэала эпохі Рэнесансу. Гравюра ёсць не што іншае, як фражскі ліст — навукова-папулярны жанр эпохі, у якім веды перадаваліся графічнымі сродкамі, а не пісьмом“ (с. 95). Мне мімаволі прыгадалася апавяданьне Міхася Чарота „Дзіўная заява“ пра селяніна, які забіў сьвіньню суседа, што ўлезла ў ягоны агарод. Сусед падаў скаргу ў суд, але, будучы непісьменным, з дапамогаю сябра прадставіў усё ў форме малюнку (мусіць гэта і быў „фражскі ліст“) і быў зьдзіўлены, што судзьдзі гэтага не зразумелі.
Сымбалі маюць месца ў нашым жыцьці — прыватным, грамадзкім, рэлігійным. Яны ёсьць і ў хрысьціянскай рэлігіі, дзе паказваюць на вышэйшую рэальнасьць, што стаіць за імі. Але сымбалі — ня словы, і таму заўсёды існуе небясьпека іхняй адвольнай інтэрпрэтацыі, г. зн. небясьпека ўбачыць у іх тое, што нам хочацца.
Вось, для прыкладу, як Агіевіч выясьняе значэньне плеценых у клеткі кошыкаў на партрэце: „Нам уяўляецца, што ідэю раўнавагі і супрацьлегласцей, разарванасці быцця і яго духоўнай еднасці мастак перадаў у крыптаграфіі чаргавання клетак на кошыках… На пярэднім плане злева яны

прыцягваюць увагу і даюць істотны імпульс для разважання. Клеткі сімвалізуюць вельмі многае, у тым ліку калізіі на шляху пазнання. У рытуале пасвячэння ў майстры клеткі адыгрываюць ролю прафілюючага матыву. Размяшчэнне сімвалаў-клетак на перыферыі сюжэта гравюры ўказвае, магчыма, на аддаленасць момантаў рытуалу“ (с. 159). Ня ведаю, што думаюць іншыя, але я б гэтую пісаніну акрэсьліў адным словам: лухта. А вось яшчэ прыклад: бэрэт на галаве Скарыны. Калі верыць Агіевічу, гэта не бэрэт, а „рытуальная павязка, зняцце якой з вачэй сімвалізуе празрэнне чалавека ў Храме ісціны“ (с. 156). Ня трэба быць геніем, каб адрозьніць бэрэт ад павязкі, і я застаюся пры сваім бэрэце. Але справа ня ў тым: зьняцьце павязкі ёсьць часткаю рытуалу прыняцьця ў масонскую лёжу, а „храм ісціны“ ня мае нічога супольнага з хрысьціянскай сьвятыняй. У часы Скарыны масонаў яшчэ не было, але існавалі іншыя эзатэрычныя арганізацыі, якія маглі мець (або ня мець) падобныя рытуалы. Адметнай рысай усіх такіх арганізацыяў было (і ёсьць) сакрэтнае вучэньне, даступнае толькі для невялікай колькасьці пасьвячаных. Ужо хоць бы дзеля гэтага яны не сумяшчальныя з Навукаю Хрыста, які загадаў сваім вучням: „Ідзеце і навучайце ўсе народы“ (*Мц 28:19*). У кнізе Агіевіча прыкра ўражвае ягонае намаганьне прывязаць да эзатэрычных арганізацыяў Скарыну, які, у адрозьненьне ад гэтых арганізацыяў, ня толькі не хаваў нічога, але першы распачаў вялікую справу зрабіць Слова Божае даступным для свайго народу.

Агіевіч надае вялікую ўвагу выяве пчалы на партрэце. Можна сказаць, што яна займае цэнтральнае месца ў ягоных разважаньнях. Для Агіевіча гэта не звычайная пчала, але сузор’е Пчалы, што быццам знаходзіцца каля задыякальнага сузор’я Авена (Aries). Праўда, ён сам прызнаецца, што „паколькі старадаўнія атласы (даскарынавай эпохі) з выявай „Пчалы“ да нас не дайшлі або не апісаны, то маюцца падставы для сцвярджэння, што яе адлюстраванне на гравюры 1517 г. ёсць адзінае з самых старажытных выяўленняў на планісферы“ (с. 222—223). Іншымі словамі, ніякага сузор’я Пчалы на паўночнай нябеснай паўкулі астраномы ў часы Скарыны ня ведалі, як, між іншым, ня ведаюць і ў нашыя дні. Гэта не перашкаджае Агіевічу сьцьвярджаць, што такое сузор’е было. Ён нават дае рэпрадукцыі мапаў, быццам з часоў Скарыны, з

пазначэньнем Пчалы, якое там завецца „Musca“ (муха) (гл. с. 108—218). На жаль, ён забыўся падаць даты, аўтараў і месцы выданьня гэтых мапаў… Падзел зорак у групы, або сузор’і, а таксама іхнія назвы — рэч умоўная, дзе людзкая фантазія мае не апошнюю ролю. Ня выключана, што нехта некалі мог назваць групу зорак сузор’ем Пчалы ці Мухі. Нішто не перашкаджае гэта зрабіць і Агіевічу, які нават мае ўжо гатовую назву: „Apis Skarynae“ (гл. с. 243). Але гэта не мяняе факту, што такое сузор’е застаецца няведамым сярод астраномаў. Гэта не бянтэжыць Агіевіча, у якога, відаць, спрацаваў прынцып „potest, decet, ergo est“, што можна перакласьці як „магчыма, пажадана: значыць, ёсьць“.

Каб даказаць, што пчала на партрэце — выява аднайменнага сузор’я, хопіць, паводле Агіевіча, накласьці мапу зорнага неба на „сістэму каардынат мастацкага твора“ (словы Агіевіча — **А.Н.**), і стане ясна, што сьвечка на партрэце адпавядае сузор’ю Авена, таблічка зь імем — Цяльцу, а кошыкі — Блізьнятам. Пчала, зразумела, адпавядае сузор’ю Пчалы! (Гл. с. 221.)
Чаму Агіевіч надае столькі вагі гэтаму ўяўнаму сузор’ю? Вось ягоны адказ: „Пчала, як нам вядома, знаходзіцца на зорным небе побач з Авенам і Цяльцом. Авен сімвалізуе Хрыста (агнца), г. зн. Пачатак, святло і да т. п. Рух зорак, лічылася, пачынаўся ад яго, бо сузор’е з’яўлялася ў экліптыцы ў дзень вясенняга раўнадзенства, 21 сакавіка, ад якога пачыналася злічэнне новага года. Месца Пчалы пры Авене, значыць, таксама звязваецца з ідэяй калі не самога пачатку, дык яго непасрэдным працягам. Скарына нарадзіўся („пачаўся“) у 1476 г. пад задыякальным знакам Цяльца і пад сузор’ем Пчалы ў канцы красавіка месяца 23 чысла… на Георгія (Юр’я)“ (с. 230).
Крыху далей Агіевіч заяўляе: „“Пчала“ сцвярджае імя Георгі і ставіць кропку ў дыскусіі пра яго (г. зн. Скарыны) першае імя, атрыманае падчас хрышчэння…“ (с. 231).
Дык вось дзе, як кажуць, сабака закапаны. Усе гэтыя гутаркі пра сымбалі, зоркі і сузор’і — толькі пусканьне дыму ў вочы. Галоўная мэта — даць „астранамічнае“ абгрунтаваньне для Георгія як сапраўднага імя Скарыны. І выйшла глупства астранамічнага маштабу. У Скарынавым „Последовании Церковного Собрания“ пад датаю 10 сакавіка напісана: „Того дни солце входит во знамя нбесное овен, и быва равен день с

нощию“; а пад 11 красавіка: „Того дни солнъце входит въ телец“. Такім чынам сонца ніякім чынам не магло быць 23 красавіка ў сузор’і Пчалы, калі яно наагул існуе. Але ўсё ня так проста: калі верыць Агіевічу, Скарына „прывязаў“ Пчалу да 23 красавіка, суаднёсшы „каардынаты сузор’я з пастулатамі прэцэсіі Гіпарха“, і такім чынам паказаў, што быў перакананым геліяцэнтрыстам ужо ў 1517 г., амаль трыццаць гадоў раней за Капэрніка (гл. с. 243)! The mind boggles, як сказалі б ангельцы.
Пытаньне імя Скарыны зьвязанае з пытаньнем ягонага веравызнаньня: імя „Георгі (Юры)“ можа быць і каталіцкім, і праваслаўным, чаго нельга сказаць пра „Францішка“. Да гэтага часу прыхільнікі імя „Георгі“ маглі прывесьці на сваю карысьць толькі адзін дакумант, менавіта канцылярскую копію каралеўскага прывілею, дадзенага Скарыну ў 1532 годзе. Дакумант быў вядомы вучоным ад 1858 году, але яны не надавалі яму вялікага значэньня. У 1925 годзе польскі гісторык Генрык Лаўмяньскі выказаў думку, што імя „Георгі“ ў дакуманце — памылка перапішчыка. Можна не пагаджацца з Лаўмяньскім, але нельга яго назваць аматарам, як гэта робіць Агіевіч, калі кажа, што здагадка апошняга адносна імя Скарыны „ёсць неарыгінальны ход аматараў перарабляць усё на свой капыл“ (с. 247). У іншым месцы ён са сваёй звычайнай далікатнасьцю называе Лаўмяньскага дэфарматарам (с. 250).
Глыбокія веды Агіевіча адчуваюцца ўва ўсёй кнізе. Напрыклад, пішучы пра сьв. Гераніма (каля 345—420), перакладчыка Сьвятога пісьма на лацінскую мову, ён кажа, што „папа прасіў яго зверыць і выправіць Новы Запавет паводле Септуагінты“ (с. 206). Да гэтага часу я быў перакананы, што Сэптуагінта — грэцкая вэрсія Старога Запавету, зробленая ў III—II стст. да нараджэньня Хрыста, г. зн. калі пра Новы Запавет не магло быць нават згадкі. Што ж, ніколі ня позна даведацца нешта новае… Між іншага, для тых, хто ня ведае, Агіевіч паведамляе, што „Блажэнны Іеранім — папярэднік Скарыны ў справе перакладу Бібліі“ (с. 197).
Не забыўся аўтар кінуць камень і ў мой агарод. У адным з маіх артыкулаў я пісаў, што аўтарам некаторых канонаў у Скарынавай „Малой падарожнай кніжцы“ быў Тэактыст (Феакціст у Агіевіча) са Студыйскага манастыра. Агіевіч пасьля грунтоўных дасьледаваньняў прыйшоў да перакананьня, што „Пошукі „Феакціста Студыта“ са „Студзійскага манастыра“

бясплённыя“ (с. 84). Ён зрабіў дапушчэньне, што „Феакціст“, як „Францішак“ — адно з прыбраных імёнаў Скарыны. Мне прыкра расчараваць Агіевіча. Студыйскі манастыр у Канстанцінопалі ў VIII—IX стагодзьдзях быў цэнтрам інтэнсіўнай літургічнай творчасьці. Сярод насельнікаў манастыра быў цэлы шэраг таленавітых гімнографаў. Вось іхнія імёны: Арсэн, Клімэнт, Кіпрыян, Мікалай, Пётра, Сімяон, Тодар, **Тэактыст**, Язэп. Для інфармацыі Агіевіча дадам, што, насуперак ягонаму цьверджаньню (гл. с. 84), Ян Дамаскін, Язэп Гімнограф і Язэп з Тэсалёнікаў ніколі не пісалі акафістаў: яны і вышэй менаваныя манахі-студыты былі аўтарамі канонаў, а гэта зусім іншы жанр царкоўнай гімнаграфіі. Такім чынам, адпадае яшчэ адно меркаваньне Агіевіча адносна імя Скарыны, менавіта, што побач са сваім сапраўдным імем „Георгі“ ён ужываў, у залежнасьці ад патрэбы, розныя прыбраныя імёны, або псэўданімы, як „Францішак“, „Тэактыст“ і, магчыма, іншыя (гл. с. 84—86).

Але час падводзіць рахункі. Здаецца, ува Ўладзімера Арлова я чытаў пра гісторыка Абэцэдарскага, які любіў казаць, што добры гісторык заўсёды знойдзе факты ў падтрымку сваёй канцэпцыі. Нешта падобнае можна сказаць пра Агіевіча. Ён паставіў перад сабой задачу знайсьці доказы, што Скарына атрымаў пры хрышчэньні імя „Георгі“. І знайшоў… Хацелася б не зьвяртаць на гэтыя доказы ўвагі, як не зьвяртаем увагі на бяздарную пісаніну іншага прыхільніка імя „Георгі“ М. Уляхіна, чые высновы „строго аргументированы и более правдоподобны, чем ныне официальный взгляд на жизнь и деятельность Скорины“, або спробы Р. Равякі зрабіць Скарыну прадвесьнікам заснавальніцы тэазофіі Блавацкай. На жаль, гэтага зрабіць нельга з розных прычынаў. Працы супрацоўніка Інстытуту філязофіі Акадэміі Навук Агіевіча друкуюцца ў навуковых выданьнях. Ягоная кніга выйшла пад шыльдаю Акадэміі Навук пасьля таго, як атрымала высокую ацэнку рэцэнзэнтаў, членаў-карэспандэнтаў Акадэміі А. Лойкі і М. Мушынскага. Праўда, прозьвішча Мушынскага няведамае сярод скарыназнаўцаў. Калі ідзе пра Лойку, дык той, хто меў цярплівасьць прачытаць ягоную аповесьць „Сонца маладзіковае“, ня зможа ставіцца паважна да ягоных навуковых меркаваньняў. На жаль, ягоныя словы, што кніга Агіевіча „ўвойдзе ў праграмы ВНУ і школаў“

(с. 11), пры сучасным антыбеларускім рэжыме могуць стаць рэальнасьцю. А гэта будзе сапраўднае няшчасьце.
Кожны мае права да сваёй думкі. Кажуць, што ў Амэрыцы існуе сэкта, якая да гэтага часу настойвае, што зямля пляскатая, як блін. Тым ня менш, у нашыя дні спробы даказаць, што Скарына атрымаў пры хрышчэньні імя Георгі, — гэта тое самае, што сьцёбаць пугаю мёртвага каня, каб той пабег. Таму выклікае зьдзіўленьне падтрымка Агіевіча Акадэміяй Навук, г. зн. установай, абавязкам якой ёсьць утрымліваць прыстойны ўзровень навуковага пошуку.
Ёсьць і іншая прычына, чаму нельга прамінуць маўчаньнем працы Агіевіча. На тытульнай старонцы сваёй кнігі з уласьцівай яму сьціпласьцю ён прывёў на царкоўнаславянскай мове словы з Эвангельля (даю ў беларускім перакладзе): „Дзякую Табе, Ойча, Госпадзе неба і зямлі, што ты схаваў гэтыя рэчы ад мудрых і разумных і адкрыў іх маленькім“ (*Мц 11:25*). Нам прыходілася ўжо зьвяртаць увагу на зьняважлівае стаўленьне „маленькага“ Агіевіча да „мудрых і разумных“ — тых, каго ён называе „афіцыйнымі захавальнікамі спадчыны Скарыны“. Ён абвінавачвае іх у непрыняцьці праўды і інтэлектуальным падлогу. Нельга бяз прыкрасьці чытаць ягонае выказваньне пра доктара Вітаўта Тумаша, які шмат зрабіў для вывучэньня спадчыны Скарыны: „Ход разважання В. Тумаша выдае характэрны склад мыслення аўтара, якое залежыць ад яго сацыяльнай практыкі, дзе значнае месца займае кампраміс тыпу гешэфту“ (с. 300). Таму мне здаецца, што для Агіевіча лепш падыходзіла б па духу малітва фарысэя: „Дзякую Табе, Божа, што я не такі, як іншыя людзі…“ (*Лк 18:11*).
У 1980 годзе ЮНЭСКА выдала па-ангельску і па-французку кнігу „Francisk Skorina“. Рэакцыя маіх ангельскіх і французскіх сяброў, якім я даваў яе прачытаць, была: „Я нічога ня ведаў пра Скарыну раней. Нічога ня ведаю і цяпер, прачытаўшы гэтую кнігу“. Тое самае можна сказаць пра кнігу Агіевіча.
У разважаньнях пра сымбалізм кошыкаў і павязак, уяўныя сузор'і, розныя імёны і эзатэрычныя арганізацыі згубілася асоба беларускага першадрукара. Ангельцы кажуць у такім выпадку, што „за дрэвамі лесу не відаць“.
Скарына зьяўляецца адной з найбольш сьветлых постацяў у нашай гісторыі, і кожная дэталь зь ягонага жыцьця і дзейнасьці нам дарагая. Мы ўдзячныя рупліўцам-вучоным, дзякуючы

стараньням якіх паволі зьнікаюць белыя плямы ў біяграфіі беларускага першадрукара. Аднак не абавязкова быць вучоным, каб адчуць веліч подзьвігу Скарыны. Трэба толькі шчыра любіць свой народ, як любіў яго сьвятар і паэт Казімер Сваяк, які незадоўга перад сьмерцю пісаў:

У чэскай Празе
друкаваў
Прадвечнай
Веды кнігу
наш Скарына. І
тайніцу падаў
Пісьма сьвятога
Простаму
Народу…
Бацькаўшчыны
мілай
Настаўнікам
быў ён.

У гэтых некалькіх радках сказана ўсё, чаго ня здолелі выказаць у тысячах словаў Агіевіч і іншыя, яму падобныя.

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **28-07-2001**
[image]

Аляксандар Надсан

Скарына і ананасы

АЛЯКСАНДАР НАДСАН апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў замежжа. Апякуецца лёнданскай бібліятэкай імя Францішка Скарыны. Аўтар кнігі "Друя і Грэка-каталіцкая царква на Беларусі" ("Божым шляхам", 2001).

Уладзімер Агіевіч. Сімволіка гравюры Скарыны. Менск: Беларуская навука, 1999.
Уладзімер Агіевіч. Сімволіка гравюраў Скарыны // Беларусь. Менск, 1997, №8.
Уладзімер Агіевіч. Волевыяўленне Скарыны адносна сваіх імёнаў: дакументальныя сведчанні і праблема перакладу // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. Менск, 1999, №1.

У 1935 ці 1936 г. — дакладна не памятаю, — калі я быў вучнем польскай пачатковай школы, на лекцыі польскай мовы мы чыталі апавяданьне пра сьвята „тшэх крулі“. Кожны з нас па чарзе чытаў урывак з апавяданьня. Майму сябру выпала чытаць пра „шопку“ (батлейку), сярод пэрсанажаў якое былі два анёлы. Сябра неяк агораў першыя два словы, а на анёлах засеў, пачаў чырванець і заікацца. Нарэшце, пасьля ня ведаю колькіх няўдалых спробаў, радасна ўсклікнуў: „Былі два ананасы!“ Якраз у тым часе зьявіўся ў продажы напой, які называўся „ананас“. Яго можна было купіць у Карпука насупраць

чыгуначнай станцыі і ў цукерні Зэліка на рынку. Для нас, падшыванцаў, сьвет тады дзяліўся на дзьве часткі: тых, хто пакаштаваў гэтага цудоўнага напою, і нешчасьліўцаў, якія толькі пра гэта марылі.
Я прыгадаў гэтае здарэньне, калі чытаў артыкул У.Агіевіча „Сімволіка гравюраў Скарыны“ ў часопісе „Беларусь“ (Менск, 1997, №8, с. 36–39). У ім, сярод іншага, аўтар разглядае вядомы партрэт Скарыны, або хутчэй напіс на ім. Гэты напіс зроблены даволі незвычайнаю вязьзю. Тым ня менш, крыху пасядзеўшы, нават неабазнаныя з кірылічнай палеаграфіяй могуць прачытаць яго як **Доктор Франциско Скорина**. Так да гэтага часу чыталі ўсе, хто займаўся Скарынам. Усе, апроч Агіевіча, паводле якога напіс трэба чытаць **Георги (Франциск) Скорина**. Вось вам і „ананас“!
Як гэта сталася, што вучоныя, якіх у артыкуле Агіевіч называе „афіцыйнымі захавальнікамі спадчыны Скарыны“, не заўважылі сваёй памылкі? Ягоны адказ просты: „Людзі навукі спараджаюць догмы і прымхі, гэта значыць абсалютна антынавуковыя рэчы. Больш таго, яны не прымаюць слова праўды“. Для большай яснасьці Агіевіч ілюструе сказанае малюнкам, на якім „людзі навукі“, прадстаўленыя як пэрсанажы байкі Крылова — „проказница мартышка, осел, козел и косолапый мишка“, — усялякімі спосабамі стараюцца не дапусьціць, каб іншыя даведаліся сапраўднае імя Скарыны.

Пытаньне імя беларускага першадрукара не дае спакою Агіевічу. Ён вяртаецца да яго ў артыкуле „Волевыяўленне Скарыны адносна сваіх імёнаў: дакументальныя сведчанні і праблема перакладу“ (Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1999, №1, с. 39–44), дзе разглядае напісаны на лацінскай мове пратакол паседжаньня 5 лістапада 1512 году „Калегіі дактароў навук і мэдыцыны“ Падуанскага ўнівэрсытэту ў справе дапушчэньня Скарыны да экзамену на ступень доктара мэдыцыны. І вось тут пачынаюцца паважныя сумневы, — не адносна самога дакуманту, але адносна веданьня Агіевічам лацінскай мовы. Напрыклад, ён піша, што слова **nominatur** — „2-ая асоба, цяперашні час ад дзеяслова **nomino**…“. У першай клясе гімназіі нас вучылі, што канчатак **-tur** характэрны для трэцяй (а не другой) асобы адзіночнага ліку дзеяслова залежнага стану. Таксама нам

укладалі ў галовы, што **nominatus est** — трэцяя асоба адзіночнага ліку мінулага закончанага часу дзеяслова залежнага стану і азначае „быў названы“, а ў ніякім выпадку ня „носіць імя“, як гэтага хоча Агіевіч. А ўжо зусім незразумела, чаму дзеепрыметнік прошлага закончанага часу **praefatus** патрабуе дапасаваньня дзеяслова ў мінулым незакончаным часе. Калі не мыляюся, дзеепрыметнікі дапасоўваюцца да назоўнікаў, а не да дзеясловаў няважна якога часу.
Агіевіч уважае дасюлешнія выданьні дакуманту недакладнымі, а ягоныя пераклады на беларускую мову — памылковымі. Асабліва яму не падабаецца месца, дзе старшыня паседжаньня, віцэ-прыёр калегіі Тадэй Мусаці, прадстаўляе Скарыну іншым: „Qui quidem iuvenis **et** doctor prefatus **nominatur** D[ominus] Franciscus“, г. зн. „Гэты вышэй згаданы юнак **і** доктар **завецца** С[падар] Францішак“. Паводле Агіевіча ўвесь сказ трэба чытаць: „Qui quidem juvenis **artitus** doctor prefatus **nominitabatur** D. Dranciscus…“, г. зн. „Гэты …малады **ўмелы ў мастацтве** доктар **звычайна (часта) называўся** С[падаром] Францішкам“. Мэта Агіевіча ясная: паказаць, што хоць Скарыну звычайна называлі Францішкам, гэта не было ягонае сапраўднае імя. Што ж, часам бывае, што некага называюць не сваім імем. Майго добрага знаёмага Сяргея ангельскія прыяцелі завуць Mike, але ў ягоным пашпарце ўсё ж напісана Siarhei. Бязглуздасьць таго, што намагаецца даказаць Агіевіч, відавочная. Уявіце сабе сцэну: старшыня прадстаўляе экзамэнацыйнай камісіі кандыдата і, замест назваць ягонае імя, кажа: „Яго звычайна клікалі Францішкам“. І нікому ж не прыйшло ў галаву спытацца, якое ж ягонае сапраўднае імя!
Варта дадаць, што ў дакумэнце няма ніводнага слова, сказанага самім Скарынам. Дык якое ж гэта „волевыяўленьне“? Агіевіч замяняе словы **et** і, больш часта, **artium** словам **artitus**. Такім чынам агульнапрыняты тытул **artium Doctor** (Доктар свабодных навукаў) ператварыўся ў **artitus Doctor**. Не зусім зразумела, што гэты „тытул“ мае значыць. Слова **artitus** даволі рэдкае ў лацінскай мове. Яно азначае ня столькі „ўмелы ў мастацтве (навуках)“, колькі хітры, пранырлівы“, напрыклад „artiti viri“ (хітрыя мужы) у камэдыі Пляўта (к. 210 г. да Хр.) „Asinaria“, або „Асьліная камэдыя“.
Напэўна, Агіевіч страціў нямала часу, пакуль знайшоў у слоўніку патрэбныя яму словы. На жаль, слоўнікі карысныя

толькі для тых, хто ведае мову. Інакш можа стацца, як у выдаўцоў альбому „Там, дзе сінее Нарач“ (Менск, 1963), дзе пад здымкам Максіма Танка, які сядзіць задумённы на беразе возера, сказана: „Не адна з яго песень стала народнай…“ Гэты сказ быў перакладзены на ангельскую мову як „Not a single song of his poetry became a folk one…“, што ў адваротным перакладзе на беларускую мову гучыць: „Ніводная песьня зь ягонай паэзіі ня стала народнай…“.
Сваё заключнае слова Мусаці распачаў наступным зваротам: „D[omini] Doctores, vos audivistis istum pauperem **et** doctum juvenem…“, што значыць: „С[падары] дактары, вы пачулі (або выслухалі) гэтага беднага і вучонага юнака…“. Паводле Агіевіча дадзены сказ павінен гучаць: “D(omini) Doctores, vos audivistis istum pauperem **artitum** doctorem juvenem”, што ён перакладае як: “С(падары) вучоныя, вы аўдыраваліся гэтым паўперам і **artitum** доктарам маладым…” Падуанскі пісар напэўна жахнуўся б ад непісьменнай лаціны Агіевіча. Ён ня бачыў беларускага перакладу… Я ня мог нідзе знайсьці слова „аўдыравацца“, але калі яно азначае тое, што я думаю, дык выглядае, што не Падуанскія дактары экзаменавалі Скарыну, але ён іх. Агіевіч не перакладае словаў artitus і pauper (бедны). Для першага, відаць, ён не знайшоў беларускага адпаведніка. Другое слова, паводле яго, не азначае „бедны“, але паказвае на прыналежнасьць Скарыны да закону тампліераў, поўны тытул якога ён дае як „Pauperes commilitones Christi Templique Solomonici“, а ў перакладзе „Зрэбныя сутаварышы Хрыстовыя Храму Саламонавага“. Пакінем у супакоі не зусім адпаведнае слова „зрэбныя“, але, як кожны гімназіст-першаклясьнік ведае, часьціна **que** — не канчатак, а энклітычны злучнік з тым самым значэньнем, што **et**. Таму трэба перакладаць ня проста „Храму“ але „і Храму“: пропуск злучніка мяняе сэнс.
Калі за часоў Скарыны існавала нейкая тайная арганізацыя з вышэй згаданым назовам, дык яна ня мела нічога супольнага з арыгінальным законам тампліераў, якіх сустрэў трагічны канец 200 гадоў раней. Агіевіч беспадстаўна залічае да гэтай арганізацыі Скарыну толькі на аснове наяўнасьці слова **pauper** (бедны). Гэтую тэму ён разьвівае ў сваім „magnum opus“ (пра што ніжэй), дзе на с. 301 палымяна заяўляе, што калі б пісар хацеў указаць на беднасьць Скарыны, то ўжыў бы слова **miser**. Да гэтага часу я быў перакананы, што слова **miser** азначае

„няшчасны, жаласны“. Але ж беднасьць, асабліва для студэнта, гэта яшчэ не няшчасьце.

Агіевіч, хоць ягонае веданьне лацінскай мовы, мякка кажучы, даволі хісткае, упэўнены, што ён адзіны зразумеў правільна тэкст Падуанскага дакуманту. Можна было б яго пакінуць у супакоі зь ягонай **felix ignorantia**, калі б ня тое, што ў кароткім пераказе зьместу артыкулу на ангельскай мове ён абвінавачвае тых, каго ён пагардліва называе „official legacy keepers“ (афіцыйнымі захавальнікамі спадчыны) Скарыны, у „acts of intellectual forgery“ (актах інтэлектуальнага падлогу). А гэта, як кажуць ангельцы, is not very nice.
У 1999 годзе выйшла друкам праца Агіевіча „Сімволіка Гравюры Скарыны“, прысьвечаная вывучэньню партрэта беларускага першадрукара, што знаходзіцца ў „Кнізе Ісуса, сына Сірахавага“ (Прага, 1517). Аўтар зьвяртае асаблівую ўвагу на сымбалізм партрэта і ягоных асобных часткаў. На ягоную думку, „Партрэт пераўзыходзіць значэнне асабовасці Скарыны сваім эпісэнсам біблейскага космасу! Тут асоба Скарыны — увасабленне ідэі чалавека наогул, чалавека-хрысціяніна як гуманнага ідэала эпохі Рэнесансу. Гравюра ёсць не што іншае, як фражскі ліст — навукова-папулярны жанр эпохі, у якім веды перадаваліся графічнымі сродкамі, а не пісьмом“ (с. 95). Мне мімаволі прыгадалася апавяданьне Міхася Чарота „Дзіўная заява“ пра селяніна, які забіў сьвіньню суседа, што ўлезла ў ягоны агарод. Сусед падаў скаргу ў суд, але, будучы непісьменным, з дапамогаю сябра прадставіў усё ў форме малюнку (мусіць гэта і быў „фражскі ліст“) і быў зьдзіўлены, што судзьдзі гэтага не зразумелі.
Сымбалі маюць месца ў нашым жыцьці — прыватным, грамадзкім, рэлігійным. Яны ёсьць і ў хрысьціянскай рэлігіі, дзе паказваюць на вышэйшую рэальнасьць, што стаіць за імі. Але сымбалі — ня словы, і таму заўсёды існуе небясьпека іхняй адвольнай інтэрпрэтацыі, г. зн. небясьпека ўбачыць у іх тое, што нам хочацца.
Вось, для прыкладу, як Агіевіч выясьняе значэньне плеценых у клеткі кошыкаў на партрэце: „Нам уяўляецца, што ідэю раўнавагі і супрацьлегласцей, разарванасці быцця і яго духоўнай еднасці мастак перадаў у крыптаграфіі чаргавання клетак на кошыках… На пярэднім плане злева яны

прыцягваюць увагу і даюць істотны імпульс для разважання. Клеткі сімвалізуюць вельмі многае, у тым ліку калізіі на шляху пазнання. У рытуале пасвячэння ў майстры клеткі адыгрываюць ролю прафілюючага матыву. Размяшчэнне сімвалаў-клетак на перыферыі сюжэта гравюры ўказвае, магчыма, на аддаленасць момантаў рытуалу“ (с. 159). Ня ведаю, што думаюць іншыя, але я б гэтую пісаніну акрэсьліў адным словам: лухта. А вось яшчэ прыклад: бэрэт на галаве Скарыны. Калі верыць Агіевічу, гэта не бэрэт, а „рытуальная павязка, зняцце якой з вачэй сімвалізуе празрэнне чалавека ў Храме ісціны“ (с. 156). Ня трэба быць геніем, каб адрозьніць бэрэт ад павязкі, і я застаюся пры сваім бэрэце. Але справа ня ў тым: зьняцьце павязкі ёсьць часткаю рытуалу прыняцьця ў масонскую лёжу, а „храм ісціны“ ня мае нічога супольнага з хрысьціянскай сьвятыняй. У часы Скарыны масонаў яшчэ не было, але існавалі іншыя эзатэрычныя арганізацыі, якія маглі мець (або ня мець) падобныя рытуалы. Адметнай рысай усіх такіх арганізацыяў было (і ёсьць) сакрэтнае вучэньне, даступнае толькі для невялікай колькасьці пасьвячаных. Ужо хоць бы дзеля гэтага яны не сумяшчальныя з Навукаю Хрыста, які загадаў сваім вучням: „Ідзеце і навучайце ўсе народы“ (*Мц 28:19*). У кнізе Агіевіча прыкра ўражвае ягонае намаганьне прывязаць да эзатэрычных арганізацыяў Скарыну, які, у адрозьненьне ад гэтых арганізацыяў, ня толькі не хаваў нічога, але першы распачаў вялікую справу зрабіць Слова Божае даступным для свайго народу.

Агіевіч надае вялікую ўвагу выяве пчалы на партрэце. Можна сказаць, што яна займае цэнтральнае месца ў ягоных разважаньнях. Для Агіевіча гэта не звычайная пчала, але сузор’е Пчалы, што быццам знаходзіцца каля задыякальнага сузор’я Авена (Aries). Праўда, ён сам прызнаецца, што „паколькі старадаўнія атласы (даскарынавай эпохі) з выявай „Пчалы“ да нас не дайшлі або не апісаны, то маюцца падставы для сцвярджэння, што яе адлюстраванне на гравюры 1517 г. ёсць адзінае з самых старажытных выяўленняў на планісферы“ (с. 222—223). Іншымі словамі, ніякага сузор’я Пчалы на паўночнай нябеснай паўкулі астраномы ў часы Скарыны ня ведалі, як, між іншым, ня ведаюць і ў нашыя дні. Гэта не перашкаджае Агіевічу сьцьвярджаць, што такое сузор’е было. Ён нават дае рэпрадукцыі мапаў, быццам з часоў Скарыны, з

пазначэньнем Пчалы, якое там завецца „Musca“ (муха) (гл. с. 108—218). На жаль, ён забыўся падаць даты, аўтараў і месцы выданьня гэтых мапаў… Падзел зорак у групы, або сузор’і, а таксама іхнія назвы — рэч умоўная, дзе людзкая фантазія мае не апошнюю ролю. Ня выключана, што нехта некалі мог назваць групу зорак сузор’ем Пчалы ці Мухі. Нішто не перашкаджае гэта зрабіць і Агіевічу, які нават мае ўжо гатовую назву: „Apis Skarynae“ (гл. с. 243). Але гэта не мяняе факту, што такое сузор’е застаецца няведамым сярод астраномаў. Гэта не бянтэжыць Агіевіча, у якога, відаць, спрацаваў прынцып „potest, decet, ergo est“, што можна перакласьці як „магчыма, пажадана: значыць, ёсьць“.

Каб даказаць, што пчала на партрэце — выява аднайменнага сузор’я, хопіць, паводле Агіевіча, накласьці мапу зорнага неба на „сістэму каардынат мастацкага твора“ (словы Агіевіча — **А.Н.**), і стане ясна, што сьвечка на партрэце адпавядае сузор’ю Авена, таблічка зь імем — Цяльцу, а кошыкі — Блізьнятам. Пчала, зразумела, адпавядае сузор’ю Пчалы! (Гл. с. 221.)
Чаму Агіевіч надае столькі вагі гэтаму ўяўнаму сузор’ю? Вось ягоны адказ: „Пчала, як нам вядома, знаходзіцца на зорным небе побач з Авенам і Цяльцом. Авен сімвалізуе Хрыста (агнца), г. зн. Пачатак, святло і да т. п. Рух зорак, лічылася, пачынаўся ад яго, бо сузор’е з’яўлялася ў экліптыцы ў дзень вясенняга раўнадзенства, 21 сакавіка, ад якога пачыналася злічэнне новага года. Месца Пчалы пры Авене, значыць, таксама звязваецца з ідэяй калі не самога пачатку, дык яго непасрэдным працягам. Скарына нарадзіўся („пачаўся“) у 1476 г. пад задыякальным знакам Цяльца і пад сузор’ем Пчалы ў канцы красавіка месяца 23 чысла… на Георгія (Юр’я)“ (с. 230).
Крыху далей Агіевіч заяўляе: „“Пчала“ сцвярджае імя Георгі і ставіць кропку ў дыскусіі пра яго (г. зн. Скарыны) першае імя, атрыманае падчас хрышчэння…“ (с. 231).
Дык вось дзе, як кажуць, сабака закапаны. Усе гэтыя гутаркі пра сымбалі, зоркі і сузор’і — толькі пусканьне дыму ў вочы. Галоўная мэта — даць „астранамічнае“ абгрунтаваньне для Георгія як сапраўднага імя Скарыны. І выйшла глупства астранамічнага маштабу. У Скарынавым „Последовании Церковного Собрания“ пад датаю 10 сакавіка напісана: „Того дни солце входит во знамя нбесное овен, и быва равен день с

нощию“; а пад 11 красавіка: „Того дни солнъце входит въ телец“. Такім чынам сонца ніякім чынам не магло быць 23 красавіка ў сузор’і Пчалы, калі яно наагул існуе. Але ўсё ня так проста: калі верыць Агіевічу, Скарына „прывязаў“ Пчалу да 23 красавіка, суаднёсшы „каардынаты сузор’я з пастулатамі прэцэсіі Гіпарха“, і такім чынам паказаў, што быў перакананым геліяцэнтрыстам ужо ў 1517 г., амаль трыццаць гадоў раней за Капэрніка (гл. с. 243)! The mind boggles, як сказалі б ангельцы.
Пытаньне імя Скарыны зьвязанае з пытаньнем ягонага веравызнаньня: імя „Георгі (Юры)“ можа быць і каталіцкім, і праваслаўным, чаго нельга сказаць пра „Францішка“. Да гэтага часу прыхільнікі імя „Георгі“ маглі прывесьці на сваю карысьць толькі адзін дакумант, менавіта канцылярскую копію каралеўскага прывілею, дадзенага Скарыну ў 1532 годзе. Дакумант быў вядомы вучоным ад 1858 году, але яны не надавалі яму вялікага значэньня. У 1925 годзе польскі гісторык Генрык Лаўмяньскі выказаў думку, што імя „Георгі“ ў дакуманце — памылка перапішчыка. Можна не пагаджацца з Лаўмяньскім, але нельга яго назваць аматарам, як гэта робіць Агіевіч, калі кажа, што здагадка апошняга адносна імя Скарыны „ёсць неарыгінальны ход аматараў перарабляць усё на свой капыл“ (с. 247). У іншым месцы ён са сваёй звычайнай далікатнасьцю называе Лаўмяньскага дэфарматарам (с. 250).
Глыбокія веды Агіевіча адчуваюцца ўва ўсёй кнізе. Напрыклад, пішучы пра сьв. Гераніма (каля 345—420), перакладчыка Сьвятога пісьма на лацінскую мову, ён кажа, што „папа прасіў яго зверыць і выправіць Новы Запавет паводле Септуагінты“ (с. 206). Да гэтага часу я быў перакананы, што Сэптуагінта — грэцкая вэрсія Старога Запавету, зробленая ў III—II стст. да нараджэньня Хрыста, г. зн. калі пра Новы Запавет не магло быць нават згадкі. Што ж, ніколі ня позна даведацца нешта новае… Між іншага, для тых, хто ня ведае, Агіевіч паведамляе, што „Блажэнны Іеранім — папярэднік Скарыны ў справе перакладу Бібліі“ (с. 197).
Не забыўся аўтар кінуць камень і ў мой агарод. У адным з маіх артыкулаў я пісаў, што аўтарам некаторых канонаў у Скарынавай „Малой падарожнай кніжцы“ быў Тэактыст (Феакціст у Агіевіча) са Студыйскага манастыра. Агіевіч пасьля грунтоўных дасьледаваньняў прыйшоў да перакананьня, што „Пошукі „Феакціста Студыта“ са „Студзійскага манастыра“

бясплённыя“ (с. 84). Ён зрабіў дапушчэньне, што „Феакціст“, як „Францішак“ — адно з прыбраных імёнаў Скарыны. Мне прыкра расчараваць Агіевіча. Студыйскі манастыр у Канстанцінопалі ў VIII—IX стагодзьдзях быў цэнтрам інтэнсіўнай літургічнай творчасьці. Сярод насельнікаў манастыра быў цэлы шэраг таленавітых гімнографаў. Вось іхнія імёны: Арсэн, Клімэнт, Кіпрыян, Мікалай, Пётра, Сімяон, Тодар, **Тэактыст**, Язэп. Для інфармацыі Агіевіча дадам, што, насуперак ягонаму цьверджаньню (гл. с. 84), Ян Дамаскін, Язэп Гімнограф і Язэп з Тэсалёнікаў ніколі не пісалі акафістаў: яны і вышэй менаваныя манахі-студыты былі аўтарамі канонаў, а гэта зусім іншы жанр царкоўнай гімнаграфіі. Такім чынам, адпадае яшчэ адно меркаваньне Агіевіча адносна імя Скарыны, менавіта, што побач са сваім сапраўдным імем „Георгі“ ён ужываў, у залежнасьці ад патрэбы, розныя прыбраныя імёны, або псэўданімы, як „Францішак“, „Тэактыст“ і, магчыма, іншыя (гл. с. 84—86).

Але час падводзіць рахункі. Здаецца, ува Ўладзімера Арлова я чытаў пра гісторыка Абэцэдарскага, які любіў казаць, што добры гісторык заўсёды знойдзе факты ў падтрымку сваёй канцэпцыі. Нешта падобнае можна сказаць пра Агіевіча. Ён паставіў перад сабой задачу знайсьці доказы, што Скарына атрымаў пры хрышчэньні імя „Георгі“. І знайшоў… Хацелася б не зьвяртаць на гэтыя доказы ўвагі, як не зьвяртаем увагі на бяздарную пісаніну іншага прыхільніка імя „Георгі“ М. Уляхіна, чые высновы „строго аргументированы и более правдоподобны, чем ныне официальный взгляд на жизнь и деятельность Скорины“, або спробы Р. Равякі зрабіць Скарыну прадвесьнікам заснавальніцы тэазофіі Блавацкай. На жаль, гэтага зрабіць нельга з розных прычынаў. Працы супрацоўніка Інстытуту філязофіі Акадэміі Навук Агіевіча друкуюцца ў навуковых выданьнях. Ягоная кніга выйшла пад шыльдаю Акадэміі Навук пасьля таго, як атрымала высокую ацэнку рэцэнзэнтаў, членаў-карэспандэнтаў Акадэміі А. Лойкі і М. Мушынскага. Праўда, прозьвішча Мушынскага няведамае сярод скарыназнаўцаў. Калі ідзе пра Лойку, дык той, хто меў цярплівасьць прачытаць ягоную аповесьць „Сонца маладзіковае“, ня зможа ставіцца паважна да ягоных навуковых меркаваньняў. На жаль, ягоныя словы, што кніга Агіевіча „ўвойдзе ў праграмы ВНУ і школаў“

(с. 11), пры сучасным антыбеларускім рэжыме могуць стаць рэальнасьцю. А гэта будзе сапраўднае няшчасьце.
Кожны мае права да сваёй думкі. Кажуць, што ў Амэрыцы існуе сэкта, якая да гэтага часу настойвае, што зямля пляскатая, як блін. Тым ня менш, у нашыя дні спробы даказаць, што Скарына атрымаў пры хрышчэньні імя Георгі, — гэта тое самае, што сьцёбаць пугаю мёртвага каня, каб той пабег. Таму выклікае зьдзіўленьне падтрымка Агіевіча Акадэміяй Навук, г. зн. установай, абавязкам якой ёсьць утрымліваць прыстойны ўзровень навуковага пошуку.
Ёсьць і іншая прычына, чаму нельга прамінуць маўчаньнем працы Агіевіча. На тытульнай старонцы сваёй кнігі з уласьцівай яму сьціпласьцю ён прывёў на царкоўнаславянскай мове словы з Эвангельля (даю ў беларускім перакладзе): „Дзякую Табе, Ойча, Госпадзе неба і зямлі, што ты схаваў гэтыя рэчы ад мудрых і разумных і адкрыў іх маленькім“ (*Мц 11:25*). Нам прыходілася ўжо зьвяртаць увагу на зьняважлівае стаўленьне „маленькага“ Агіевіча да „мудрых і разумных“ — тых, каго ён называе „афіцыйнымі захавальнікамі спадчыны Скарыны“. Ён абвінавачвае іх у непрыняцьці праўды і інтэлектуальным падлогу. Нельга бяз прыкрасьці чытаць ягонае выказваньне пра доктара Вітаўта Тумаша, які шмат зрабіў для вывучэньня спадчыны Скарыны: „Ход разважання В. Тумаша выдае характэрны склад мыслення аўтара, якое залежыць ад яго сацыяльнай практыкі, дзе значнае месца займае кампраміс тыпу гешэфту“ (с. 300). Таму мне здаецца, што для Агіевіча лепш падыходзіла б па духу малітва фарысэя: „Дзякую Табе, Божа, што я не такі, як іншыя людзі…“ (*Лк 18:11*).
У 1980 годзе ЮНЭСКА выдала па-ангельску і па-французку кнігу „Francisk Skorina“. Рэакцыя маіх ангельскіх і французскіх сяброў, якім я даваў яе прачытаць, была: „Я нічога ня ведаў пра Скарыну раней. Нічога ня ведаю і цяпер, прачытаўшы гэтую кнігу“. Тое самае можна сказаць пра кнігу Агіевіча.
У разважаньнях пра сымбалізм кошыкаў і павязак, уяўныя сузор'і, розныя імёны і эзатэрычныя арганізацыі згубілася асоба беларускага першадрукара. Ангельцы кажуць у такім выпадку, што „за дрэвамі лесу не відаць“.
Скарына зьяўляецца адной з найбольш сьветлых постацяў у нашай гісторыі, і кожная дэталь зь ягонага жыцьця і дзейнасьці нам дарагая. Мы ўдзячныя рупліўцам-вучоным, дзякуючы

стараньням якіх паволі зьнікаюць белыя плямы ў біяграфіі беларускага першадрукара. Аднак не абавязкова быць вучоным, каб адчуць веліч подзьвігу Скарыны. Трэба толькі шчыра любіць свой народ, як любіў яго сьвятар і паэт Казімер Сваяк, які незадоўга перад сьмерцю пісаў:

У чэскай Празе
друкаваў
Прадвечнай
Веды кнігу
наш Скарына. І
тайніцу падаў
Пісьма сьвятога
Простаму
Народу…
Бацькаўшчыны
мілай
Настаўнікам
быў ён.

У гэтых некалькіх радках сказана ўсё, чаго ня здолелі выказаць у тысячах словаў Агіевіч і іншыя, яму падобныя.

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **28-07-2001**
[image]

Генадзь Сагановіч

Вайна з беларускай гісторыяй

ГЕНАДЗЬ САГАНОВІЧ супрацоўнік Інстытуту гісторыі НАН, кандыдат гістарычных навук, галоўны рэдактар "Беларускага Гістарычнага Агляду". У 2001 годзе мае выйсьці ягоны фундамэнтальны "Нарыс гісторыі Беларусі (да канца XVIII ст.)".

“А. Г. Лукашенко весьма настойчиво проводит борьбу против фальсификации истории, особенно в учебниках для средней школы”.

З заявы грамадскага аб’яднання “Гістарычныя веды”

За савецкім часам гісторыі Беларусі як асобнага прадмету ў навучальных праграмах сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў БССР проста не існавала. Яна была неабавязковым дадаткам да гісторыі СССР (фактычна — Расіі). Толькі пасля распаду Савецкага Саюзу, калі гістарычная навука вызвалілася ад партыйнага кантролю, і паўстала патрэба абнаўлення гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з новымі палітычнымі рэаліямі, становішча з выкладаннем гісторыі Беларусі змянілася. Ужо ў 1991 г. быў апублікаваны праект новай канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў Беларусі, з якога і пачаліся рэальныя перамены. У адпаведнасці з ім з 1992 г. прадмет “гісторыя СССР” касаваўся і далучаўся да курсу гісторыі

сусветнай, а гісторыі Беларусі ўпершыню надавалася статус самастойнай дысцыпліны. Асноўныя прынцыпы прынятай канцэпцыі арыентавалі выкладанне гісторыі на ўсведамленне нацыянальнай адметнасці Беларусі, адраджэнне гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці, на выхаванне патрыётаў Беларусі незалежна ад нацыянальнасці[1]. Вызначаная ў канцэпцыі прыярытэтам адпавядала і новая праграма гістарычнай адукацыі, якая была распрацавана аўтарскім калектывам вучоных і педагогаў пад кіраўніцтвам Міхася Бікацыйных пасля апрабацыі ў газетах выйшла ў свет асобным выданнем[2]. Паводле гэтай праграмы да пачатку 1993/94 навучальнага году спецыялісты падрыхтавалі 20 новых дапаможнікаў па гісторыі, выдадзеных на беларускай мове. У іх упершыню ў Беларусі гісторыя разглядалася не з класавых, а з агульнанацыянальных пазіцый, вытокі беларускай дзяржаўнасці звязваліся з Полацкім княствам і Вялікім Княствам Літоўскім, адкрыта гаварылася пра спусташальныя войны, якія вялі на беларускай зямлі маскоўскія цары, а пры асвятленні найноўшай гісторыі аўтары выразна адмоўна ацэньвалі таталітарную савецкую сістэму. Прапанаваная новымі падручнікамі трактоўка мінулага Беларусі радыкальна адрознівалася ад традыцыйнай савецкай і выклікала раздражненне актыўных прыхільнікаў старога рэжыму. Рэальныя ўмовы для іх наступу на гісторыкаў дэмакратычнай арыентацыі і для вяртання савецкае візіі мінулага стварыў прыход да ўлады Аляксандра Лукашэнкі ў 1994 годзе. Невыпадкова адразу пасля змены дзяржаўнай сімволікі новае кіраўніцтва Беларусі жыва зацікавілася беларускай гістарычнай навукай і ўзялося прыводзіць яе інтэрпрэтацыйныя мадэлі ў адпаведнасць з савецкім бачаннем мінулага. З гэтага моманту гістарычная адукацыя ў краіне стала полем найвастрэйшых спрэчак і трапіла ў поле асаблівай увагі дзяржаўных ідэолагаў.

У жніўні 1995 г. Галоўнае ўпраўленне грамадска-палітычнай інфармацыі на чале з Уладзімірам Замяталіным праз дзяржаўныя мас-медыі паведаміла пра рашэнне прэзідэнта забараніць выкарыстанне новых падручнікаў па гісторыі і вярнуць у школы старыя, савецкага ўзору. Міністэрства адукацыі ахапіла сапраўдная паніка, бо такое рашэнне было немагчыма выканаць нават з чыста тэхнічных прычынаў.

[1] Газета. 1991, 30 лістапада.

[2] Праграма па гісторыі для ўстаноў агульнаадукацыйных школ. Менск, 1995.

[3] **Веды. № 43—44 (1998).**

Усвядоміўшы гэта, А. Лукашэнка публічна заявіў, што на самай справе распараджэння пра забарону новых падручнікаў не існуе. Спецыяльная нарада прэзідэнта з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі 23 жніўня 1995 г. вырашыла дазволіць карыстацца “нацдэмаўскімі” падручнікамі, а новыя, альтэрнатыўныя, падрыхтаваць на наступны год. Дзеля праверкі і выпраўлення навучальнай літаратуры па гісторыі стварылі спецыяльную Дзяржаўную камісію пры Кабінеце Міністраў, якую ўзначаліў сам У. Замяталін. У склад камісіі ўвайшла пераважна старая прафесура сталінска-савецкай школы, у прыватнасці гісторыкі Пётр Петрыкаў, Аляксандр Філімонаў, Валеры Чарапіца, філосаф Вячаслаў Дашкевіч і інш. Так у Беларусі быў адкрыта ўзяты курс на перавод гістарычнай адукацыі на новыя (старыя!) ідэалагічныя рэйкі, а заявленне — на яе рэсаветызацыю, на вайну з беларускай гістарычнай. Праз тры гады на афіцыйнай нарадзе ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прэзідэнт А. Лукашэнка ўрэшце пустоў чэсаў пра сутнасць дзяржаўнай палітыкі ў сферы гуманітарнай адукацыі, калі пахваліўся тым, што “за последние годы преодолена деидеологизация средней и особенно высшей школы”[3].

Узяўшыся прасейваць тэксты школьных выданняў праз сіта ідэалагічнай цэнзуры, Дзяржаўная камісія дбала пра адпаведнасць іх зместу не столькі гістарычнай праўдзе, колькі ідэалагічнай лініі Лукашэнкавага рэжыму. Аднак нават адцэнзураваныя дапаможнікі не задавальнялі многіх членаў камісіі. Не выключана, што яны самі інспіравалі скарпіяцкай прынятыя імі ж кнігі. У прэсе з’яўляліся лісты і публічныя ад імя “ветэранаў” і “настаўнікаў”, якія выкрывалі крытэрыяў выданні. Асаблівую ролю ў кампаніі супраць новых падручнікаў і нацыянальных падыходаў у гістарыяграфіі выконвала грамадскае аб’яднанне “Гістарычныя веды”, створанае ўвесну 1996 г. Згуртаваўшы некалькі дзесяткаў навукоўцаў старога веку, якія абвясцілі сябе “защитниками и сторонниками советской государственности и советской власти”[4], яно прысвоіла сабе ролю своеасаблівага экспертнага органу, які стаў надзіва аўтарытэтным у дзяржаўных дарэчах. У праграмным звароце, апублікаваным у прэсе, гэта група, узначаленая прафесарам Адамам Залескім, заявіла, што будзе весці “борьбу против фальсификаций событий прошлого”,

[4] **Залесский А. Как хочу, так и порочу // Народная газета. 1996, 24 мая.**

[5] **Заявление научного объединения “Историческая знания” // Народная газета. 1996, 16 августа.**

[6] **Чернявский В. В чем же критерии? // Веды. № 25 – 26 (10 верасня 1999 г.).**

[7] **Згода. № 4. 15 – 31 сакавіка 1999 г.**

выкарыстоўваючы “мировой опыт революций и контрреволюций”[5]. Невыпадкова “барацьбітоў з фальсіфікацыяй” найбольш непакоіла асвятленне падзей апошняй вайны, ацэнка партызанскага руху і савецкага ладу. Аднак займала іх і далёкае мінулае. Напрыклад, у падручніку “Гісторыя Беларусі XVI—XVIII стст.” для 7 класу (аўтар П. Лойка) крытыкі бачылі “русафобства”, не прымалі станоўчай ацэнкі царкоўнай уніі 1596 году і г. д., у “Гісторыі Беларусі. Канец XVIII ст. — 1917 г.” (аўтар М. Біч) зноў жа не прымалі “русафобскіх” пазіцый аўтара і таго, што ў ім без станоўчай ацэнкі “великое событие” — падзелы Паспалітай і ўключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі, у падручніку для 9 класу “Гісторыя Беларусі 1917—1991 гадоў” (аўтары В. Сідарцоў і В. Фамін) іх раздражняла ўпамінанне пра тое, што ў савецкай дзяржаве існавалі “антынародны таталітарны рэжым” ды “нацыянальны і культурны прыгнёт”[6].

[5] **Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. — 1999 г. Вуч. дапаможнік для 8 кл. сярэд. шк. / Пад рэд. Я. К. Новіка. Менск, 2000. С. 59, 183.**

Дзяржаўная камісія ўважліва сачыла за зместам навучальных выданняў не толькі па беларускай, але і па сусветнай гісторыі. Так, з падручніка “Сусветная гісторыя найноўшага часу” для 9 класу (Менск, 1998) яна выкрасліла як тлумачэнне тэрміну “таталітарызм”, так і ўсё, што сведчыла пра супрацоўніцтва Савецкага Саюзу з гітлераўскай Нямеччынай, а таксама пра негатыўную ролю Сталіна і яго віну ў развязванні другой сусветнай вайны[7].

Адначасова з крытыкай “крамольных” выданняў прадстаўнікі старой савецкай школы пачалі пісаць свае, сапраўды альтэрнатыўныя дапаможнікі, у якіх ацэнкі падзеям і эпохам расстаўляліся ў поўнай адпаведнасці з ідэалагічным курсам рэжыму. Напрыклад, у дапаможніку Васіля Мілаванава “Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. — 1917 г.” для 8 класу, які выйшаў у 1998 годзе, падзелы Рэчы Паспалітай трактуюцца як “прагрэсіўнае дзеянне”, што дало беларусам “магчымасць скінуць з сябе прыгнёт польска-літоўскіх феадалаў” (с. 4). Наступнай альтэрнатывай для вучняў 11 класу стала “Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. — 1999 г.” пад рэдакцыяй Яўгена Новіка. Расійскі генерал Міхаіл Мураўёў, якога за жорсткасць пры падаўленні нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863—64 гадоў празвалі “вешальнікам”, у гэтым дапаможніку паўстаў “энергічным дзяржаўным дзеячам, які з веданнем справы рабіў

тое, да чаго быў закліканы”, а дэнансацыя дагавору аб утварэнні СССР, заключанага ў 1922 г., і паўстанне СНД названыя дзяржаўным пераваротам[8].

Пад не менш пільнай увагай уладаў апынулася і гістарычная адукацыя ў вышэйшай школе. Яшчэ да пачатку яе рэсаветызацыі Інстытут гісторыі НАН Беларусі падрыхтаваў і выпусціў “Нарысы гісторыі Беларусі” у 2-х частках (Мінск, 1994—95), якія грунтуюцца на нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі. Гэта была першая сінтэза айчыннай гісторыі, створаная ў суверэннай Беларусі. Некалькі гадоў яна выкарыстоўвалася як дапаможнік для студэнтаў ВНУ, але зусім не адпавядала новай дзяржаўнай палітыцы ў галіне вышэйшай адукацыі. Выпраўляць сітуацыю ўзялі на сябе “прыдворныя” гісторыкі, і ўжо ў 1998 г. у якасці дапаможніка для ВНУ антытэзы акадэмічным нарысам выйшаў дапаможнік “Гісторыя Беларусі” ў 2х частках, падрыхтаваны калектывам гісторыкаў-выкладчыкаў. Яго аўтары настолькі захапіліся выкананнем палітычнай замовы, што дапусцілі шэраг фактаграфічных памылак, асвятляючы беларуска-польскія адносіны[9]. Атрымалася мяккая рээдыцыя гісторыі “Паўночна-Заходняга краю”, якая выклікала абурэнне не толькі навукоўцаў і грамадскасці, але і студэнтаў. Аднак у адказ на крытыку за безліч памылак і адкрытае падладжванне пад ідэалагічны заказ рэжыму, змешчаную ў часопісе “Беларускі Гістарычны Агляд” і ў Штогодніку Інстытута гісторыі, аўтары дапаможніка выступілі з палітычнымі абвінавачваннямі на сваіх апанентаў: “Часопіс [БГА] рэдагуецца прадстаўнікамі замежных краін, ... мае сваіх людзей у ЗША і краінах Еўропы”, “вядома, хто ім заказвае музыку, хто плоціць за яе”[10]. Супрацоўнікаў Інстытуту гісторыі на старонках прыдэнцкага перыёдыка “Беларуская думка” прыраўнялі да “агентаў заходніх спецслужбаў”, якія сваёй канцэпцыяй гісторыі спрабуюць “не дапусціць стварэння саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі”[11].

На жаль, палітычнаму курсу прэзідэнта, а не праўдзівай гісторыі стараюцца дагадзіць і іншыя новыя дапаможнікі, напр.[12]

---

[8] **Новік Я., Марцуль Г., Зуева З., Качайлаў І., Лотава В.** **Спрачныя пытанні і ўнікальная фальсіфікацыя** // Адукацыя і грамадства, 2000. № 2. С. 116—128.

[9] **Новік Я.** Пытаць і спрачацца // Беларуская думка. 2000. № 10. С. 158.

[10] **Тамсам.** С. 164.

[11] **Гістарычная** памяць і новыя міфы // Беларуская думка. 2000. № 10. С. 158.

[12] **Нарысы** гісторыі

“дапушчана Міністэрствам адукацыі”, такія, напрыклад, як **перавыдадзены 1996** “Очерки истории Беларуси” П. Чыгрынава (Менск, 2000).
Пасля абвяшчэння курсу на перагляд падручнікаў і з’яўлення публікацый членаў клубу “Гістарычныя веды” з палітычнымі абвінавачваннямі апанентаў у сферы гістарычнай навукі і адукацыі запанавала нездаровая атмасфера. Сітуацыя **13 Заява Рады** абвастрыла публікацыя адкрытага ліста групы **Беларускай** гісторыкаў-артадоксаў да А. Лукашэнкі з красамоўнай **асацыяцыі** “Работа по восстановлению исторической правды **гісторыкаў //** яростному сопротивлению со стороны национал- **Народная** экстремистов” [12]. У адказ Рада Беларускай асацыяцыі **газета. 1996,** гісторыкаў выступіла з заявай, у якой рашуча пра- **24 ліпеня.** супраць навешвання ярлыкоў і спробаў вярнуць гістарычную навуку Беларусі да часоў бальшавізму[13]. Аднак улады адкрыта занялі бок невялікага кола савецкіх артадоксаў, што ўзяліся “ўзнаўляць гістарычную праўду”.
Ва ўзніклых умовах кожная спроба пераглядзець савецкую гісторыю сутыкалася з бурнай рэакцыяй ветэранаў і актыўных прыхільнікаў Лукашэнкі са славяна-патрыятычных колаў. Асабліва паказальны прыклад з даследчыцкай рэпрэсій Ігарам Кузняцовым, які з-за сваіх публікацый ашальмаваны імі ў прэсе, што мусіў бараніць сваю **14 Лідэр** актыўных **аб’яднання** “**Гістарычныя веды**” **у 1999 г.** **у Менску** **выкупіў** **ў сяброў** **клуба** **“Гістарычныя веды” ў 1999 г.** судзе. У 1998 г. у адказ на правядзенне навуковай экспертызы “Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі: 1917—1997 гады”, арганізаванай беларускімі гісторыкамі, старшыня аб’яднання “Гістарычныя веды” Адам Залескі[14], **Міхаіл В.** Савіцкі і іх калегі звярнуліся да Генеральнага пракурора Беларусі з просьбай прыцягнуць да крымінальнай **Сакуціна** аўтараў апублікаваных матэрыялаў — каб “защитить **Беларусі** достоинство президента А. Лукашенко” (?!). У гэтай **з просьбай** кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі Міхаіл Мясніковіч накіраваў у Інстытут гісторыі ліст з загадам “разабрацца з супрацоўнікамі” ды “прыняць меры”. За “справу гісторыкаў” узялася і пракуратура. Калі раней толькі ветэраны і створаная імі з савецкіх артадоксаў грамадская камісія (В. Корбут, А. Залескі ды інш.) сцвярджалі, быццам расстрэлы ў Курапатах займаліся фашысты, дык цяпер і Генеральны пракурор Алег Бажэлка заявіў, што яшчэ невядома, ці сапраўднасці пахаваны ў Курапатах, бо, маўляў, **15 Прапаповіч** расследаванне праводзілася скрайне неаб’ектыўна, **А. Пракуроры** **ўзяліся за** **гісторыкаў // Навіны. № 119** **(6 лістапада**

займаліся “специалисты из Института археологии Академии наук во главе с Зеноном Пазьняком”[15]. Так стала афіцыйна сцвярджацца “новая праўда” пра Курапаты.

Фактычна з таго ж 1996 году ў Беларусі была ўведзена палітычная цэнзура на гістарычную літаратуру. Адной з першых з планаў выдавецтва “Мастацкая літаратура” на 1996 г. чыноўнікі выключылі ўжо падрыхтаваную да друку кнігу Ў. Арлова і Г. Сагановіча “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі” (а таксама творы Васіля Быкава і Ларысы Геніюш), якая, на іх думку, была “напісаная тэндэнцыйна ў русафобскім духу”[16], хоць праца прайшла сур’ёзную экспертызу ў Інстытуце гісторыі, які рэкамендаваў яе да выдання. У 1997 г. пасля прызначэння невядомых адпаведных асобаў быў спынены продаж папулярнай кнігі Ў. Арлова “Адкуль наш род”. Апошнім сімвалам увядзення цэнзуры ў краіне стала выданне Пагоня з вокладкі чарговага, трэцяга тому “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” (1996). Гэта зрабіла новае кіраўніцтва выдавецтва “Беларуская Энцыклапедыя”, намесніка галоўнага рэдактара якога быў прызначаны Пётр Петрыкаў — былы дырэктар Інстытуту гісторыі, адзін з самых актыўных апалагетаў савецкага мінулага. Ён выступіў з жорсткай крытыкай ранейшага кіраўніцтва энцыклапедыі, сцвярджаючы, што галоўнай адметнасцю першых тамоў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” быў “ярка выражаны антырусскі дух”, у іх выпадках зацятая русафобія”[16]. Прывёўшы ў прыклад некаторыя артыкулы, напісаныя супрацоўнікамі Інстытуту гісторыі, П. Петрыкаў абвінаваціў гэтую ўстанову ў тым, што яна ажыццяўляе “татальную фальсіфікацыю” гісторыі. Беспадстаўны і палітычны характар падобных заўваг паказалі дырэктар Інстытуту гісторыі Міхаіл Касцюк і яго намеснік Міхаіл Біч, якія ўступілі ў палеміку з былым калегам[17], але гэта не адвяло хмараў, якія пагрозліва згушчаліся над дырэкцыяй інстытуту.

Пры новых кіраўніках выдавецтва “Беларуская Энцыклапедыя” канцэпцыя чарговых тамоў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” на хаду мянялася, і нават падрыхтаваныя да друку артыкулы вярталіся на цэнзуру. П. Петрыкаў, напрыклад, патрабаваў выкрэсліваў слова “русіфікацыя”, не прапускаў нават крытыкі ў бок Расіі ды савецкай улады і г. д. З-за грубага ўмяшання ў

[16] **Петрыкаў П. Тупая русафобія // Беларуская думка. 1996. № 3.**

[17] **Касцюк М. Палітызаваная гістарыяграфія можа быць сапраўднай навукай // Голас Радзімы. 1996, 9 жніўня; Біч М. Дыялектыка і тэндэнцыйнасці // Голас Радзімы. 1996, 12 верасня.**

[18] **Пятрэшкевіч А. Старыя абруч мінулага зноў ніякі кайданы // Голас Радзімы. 1998, 17 кастрычніка.**

тэксты многія гісторыкі (у прыватнасці, Валянціна Андрэй Кіштымаў, Уладзімір Конан, Мікола Крыштофік, Генадзь Сагановіч і інш.) адмовіліся ад далейшага супрацоўніцтва з выдавецтвам і забралі адтуль свае рукапісы. Наступным ударам па нацыянальнай гістарыяграфіі стала атака на рэдакцыю гістарычна-дакументальнай хронікі “Памяць”. Члены аб’яднання “Гістарычныя веды” К. Дамарад і А. Хахлоў у 1998 г. накіравалі ліст у Адміністрацыю прэзідэнта і ў Дзяржкамдрук РБ, у якім з жорсткімі абвінавачваннямі абрынуліся на выданні гэтай хронікі і асабліва на кіраўніка арганізацыйна-метадычнага цэнтру Алеся Петрашкевіча, які, па іх словах, належаў да “реакционного направления в исторической науке Беларуси”, што аформілася ў ходзе “контрреволюционного переворота, совершенного в Беларуси в 1991 г.”[18]. Выданню інкрымінаваліся ўсё тыя ж абвінавачванні маўляў, раённыя “Хронікі” не раскрываюць сусветнага гістарычнага значэння рэвалюцыі 1917 г., прыніжаюць ролю камуністычнай партыі, сацыялістычнага будаўніцтва і перамогі ў вайне, раздзімаюць тэму сталінскіх палітычных рэпрэсій, праслаўляюць эксплуататараў (князёў і паноў), распальваюць антырасійскія настроі. У выніку гэтага даносу вядомы беларускі драматург і гісторык А. Петрашкевіч быў звольнены з пасады кіраўніка важнага энцыклапедычнага цэнтра.

Кампанія супраць галоўнай фартэцыі “фальсіфікатараў” акадэмічнага Інстытуту гісторыі, які сапраўды з’яўляецца цэнтрам гістарычнай навукі, бо сабраў найлепшыя кадры краіны, пачалася таксама яшчэ ў 1995—96 гадах, і не скончылася. Чаго толькі ні пісала афіцыйная прэса, называючы флагман беларускай гістарыяграфіі “националистическим заповедником”, або заяўляючы, што яго дзейнасць “супярэчыць гістарычнай праўдзе, палітыцы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь” [19]. Асабліва выслужылася газета “Веды” — перыядычны орган Нацыянальнай акадэміі навук і Міністэрства адукацыі, рэдактарскае крэсла ў якой было аддадзена члену той самай Дзяржаўнай камісіі па падручніках В. Дашкевічу. Найбольш паслядоўна і груба крытыкаваліся акадэмічныя “Нарысы гісторыі Беларусі”, у віну якім ставілася тая ж “антыруская накіраванасць і прыніжэнне ролі савецкага перыяду”[20], скажэнне гісторыі наагул. Крытыкі імкнуліся давесці, што гісторыкі з Акадэміі навук пераблыта

---

[18] **Петрашкевіч П.** **Тумаін русафобій хаўтаў Беларускую Незалежную // Беларуская думка. 1996. № 3.**

[19] **Нарысы гісторыі Беларусі, воля. 1998, 22 снежня.**

[20] **Зайцаў А. Чайкоўскі і кампанія // Веды. 1999, 24 верасня.**

[21] **Веды. 2000, 28 студзеня.**

[22] **Кафлыбіч**

непрыдатныя, а найбольш вінаваты дырэктар інстытута акадэмік Міхаіл Касцюк. Публікуючы дылетанцкія, антынавуковыя матэрыялы членаў клубу “Гістарычныя веды”, у якіх пераважалі эмоцыі і палітычныя штампы, галоўны рэдактар “Ведаў” абяцаў стварыць з іх спецыяльны выпуск, дапаможнік, “азнаямленне з якім павінна стаць абавязковым у сярэдніх школах і ВНУ”[21]. Каб не дапусціць чарговага абрання дырэктарам М. Касцюка, Прэзідыум Акадэміі парушыў свой жа Статут і не абвясціў конкурсу на замяшчэнне вакантнай пасады. Больш за тое, у кастрычніку 1999 г. на ўрачыстасцях з нагоды 70-годдзя гэтай установы прэзідэнт НАН Беларусі Аляксандр Вайтовіч выступіў з жорсткімі палітычнымі абвінавачваннямі ў адрас дырэкцыі Інстытуту, якія даходзілі да абразаў, а праз месяц уласным загадам прызначыў на пасаду выканаўцы абавязкаў дырэктара Інстытуту гісторыі прафесара Мікалая Сташкевіча — былога супрацоўніка Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

Выразным сімвалам арганізаванага наступу на Інстытут гісторыі стала прымацаваная на яго будынку на вул. Сурганова ў 2000 г. расійскамоўная мемарыяльная дошка кандыдату ў прэзідэнту Беларускай Акадэміі Паўлу Горыну — асобе, якой у 1930-х бальшавіцкая ўлада даручала “ачысціць нацдэмаўшчыну і арганізаваць акадэмію “сапраўды камуністычную, падпарадкаваную інтарэсам сацыялістычнага будаўніцтва”[22].

Пакуль можна канстатаваць, што М. Сташкевіч не справіўся ускладзеных на яго задачаў па “перавыхаванні” беларускіх гісторыкаў. Жыццяздольнасць калектыву Інстытуту гісторыі, неэфектыўнасць палітыкі застрашвання засведчылі і выбары яго навуковай рады, праведзеныя на пачатку 2000 г. шляхам тайнага галасавання ў раду ўвайшлі пераважна прадстаўнікі выразнымі прафесійна-грамадзянскімі і нацыянальнымі пазіцыямі. Таму Прэзідыум НАН, які абяцаў правесці афіцыйныя выбары дырэктара Інстытуту гісторыі ў канцы 2000 г., так і не адважыўся даць яго супрацоўнікам законную магчымасць абраць сабе кіраўніка. Наадварот, прэзідэнт НАН А. Вайтовіч публічна прыгразіў, што мае план ліквідацыі Інстытуту гісторыі і стварэння замест яго “Нацыянальнага інстытуту гісторыі пры Адміністрацыі Прэзідэнта”, у які будуць набірацца кадры толькі адпаведнай палітычнай арыентацыі.

С. Разуром нацыянальнага руху у Беларусі. Менск 2000. С. 65.

23. Криштапович Л. Е. Белорусизация: Русская цивилизация. Раструбить Беларусь. Минск: Институт социально-академических исследований при Администрации президента РБ, 1999. С. 134—135.

Пэўна, гэта адзіная магчымасць пазбавіцца тых, хто з прафесійнага абавязку не пагаджаецца паставіць гістарычную навуку на службу палітычнаму рэжыму.
Калі падобны план перадачы кантролю над гістарычнай навукай Адміністрацыі прэзідэнта рэалізуецца, можна толькі здагадвацца, што панапісваюць пра мінулае Беларусі наваспечаныя спецыялісты ад гісторыі! Крэда “правільнага” асвятлення беларускай гісторыі (а фактычна — хімера ўбогай версіі “западно-руссизма” і панславізму) нядаўна было выкладзена адным з такіх “знаўцаў” у выданні Інстытуту сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: “Белорус... по своей теоретической и практической жизни является русским человеком”, а варожы славянам Захад “ведет тотальную информационно-психологическую войну против общерусского мировоззрения нашего народа”[23]... Каментар тут даваць немагчыма, можна толькі ставіць дыягназ.

Гэты тэкст, як і артыкулы
В. Булгакава “Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму” і
А. Дынька “Resistant Culture” ў папярэднім нумары “Скарыны”, былі падрыхтаваныя для таварыства “IDEE–Трэці сэктар”.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **28-07-2001**
[image]

Генадзь Сагановіч

Вайна з беларускай гісторыяй

ГЕНАДЗЬ САГАНОВІЧ супрацоўнік Інстытуту гісторыі НАН, кандыдат гістарычных навук, галоўны рэдактар "Беларускага Гістарычнага Агляду". У 2001 годзе мае выйсьці ягоны фундамэнтальны "Нарыс гісторыі Беларусі (да канца XVIII ст.)".

“А. Г. Лукашенко весьма настойчиво проводит борьбу против фальсификации истории, особенно в учебниках для средней школы”.

З заявы грамадскага аб’яднання “Гістарычныя веды”

За савецкім часам гісторыі Беларусі як асобнага прадмету ў навучальных праграмах сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў БССР проста не існавала. Яна была неабавязковым дадаткам да гісторыі СССР (фактычна — Расіі). Толькі пасля распаду Савецкага Саюзу, калі гістарычная навука вызвалілася ад партыйнага кантролю, і паўстала патрэба абнаўлення гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з новымі палітычнымі рэаліямі, становішча з выкладаннем гісторыі Беларусі змянілася. Ужо ў 1991 г. быў апублікаваны праект новай канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў Беларусі, з якога і пачаліся рэальныя перамены. У адпаведнасці з ім з 1992 г. прадмет “гісторыя СССР” касаваўся і далучаўся да курсу гісторыі

сусветнай, а гісторыі Беларусі ўпершыню надавалася статус самастойнай дысцыпліны. Асноўныя прынцыпы прынятай канцэпцыі арыентавалі выкладанне гісторыі на ўсведамленне нацыянальнай адметнасці Беларусі, адраджэнне гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці, на выхаванне патрыётаў Беларусі незалежна ад нацыянальнасці[1]. Вызначаная ў канцэпцыі прыярытэтам адпавядала і новая праграма гістарычнай адукацыі, якая была распрацавана аўтарым калектывам вучоных і педагогаў пад кіраўніцтвам Міхася Бікацыйных пасля апрабацыі ў газетах выйшла ў свет асобным выданнем[2]. Паводле гэтай праграмы да пачатку 1993/94 навучальнага году спецыялісты падрыхтавалі 20 новых дапаможнікаў па гісторыі, выдадзеных на беларускай мове. У іх упершыню ў Беларусі гісторыя разглядалася не з класавых, а з агульнанацыянальных пазіцый, вытокі беларускай дзяржаўнасці звязваліся з Полацкім княствам і Вялікім Княствам Літоўскім, адкрыта гаварылася пра спусташальныя войны, якія вялі на беларускай зямлі маскоўскія цары, а пры асвятленні найноўшай гісторыі аўтары выразна адмоўна ацэньвалі таталітарную савецкую сістэму. Прапанаваная новымі падручнікамі трактоўка мінулага Беларусі радыкальна адрознівалася ад традыцыйнай савецкай і выклікала раздражненне актыўных прыхільнікаў старога рэжыму. Рэальныя ўмовы для іх наступу на гісторыкаў дэмакратычнай арыентацыі і для вяртання савецкае візіі мінулага стварыў прыход да ўлады Аляксандра Лукашэнкі ў 1994 годзе. Невыпадкова адразу пасля змены дзяржаўнай сімволікі новае кіраўніцтва Беларусі жыва зацікавілася беларускай гістарычнай навукай і ўзялося прыводзіць яе інтэрпрэтацыйныя мадэлі ў адпаведнасць з савецкім бачаннем мінулага. З гэтага моманту гістарычная адукацыя ў краіне стала полем найвастрэйшых спрэчак і трапіла ў поле асаблівай увагі дзяржаўных ідэолагаў.

У жніўні 1995 г. Галоўнае ўпраўленне грамадска-палітычнай інфармацыі на чале з Уладзімірам Замяталіным праз дзяржаўныя мас-медыі паведаміла пра рашэнне прэзідэнта забараніць выкарыстанне новых падручнікаў па гісторыі і вярнуць у школы старыя, савецкага ўзору. Міністэрства адукацыі ахапіла сапраўдная паніка, бо такое рашэнне было немагчыма выканаць нават з чыста тэхнічных прычынаў.

[1] Газета. 1991, 30 лістапада.

[2] Праграма па гісторыі для ўстаноў агульнаадукацыйных школ. Менск, 1995.

[3] **Веды. № 43—44 (1998).**

Усвядоміўшы гэта, А. Лукашэнка публічна заявіў, што на самай справе распараджэння пра забарону новых падручнікаў не існуе. Спецыяльная нарада прэзідэнта з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі 23 жніўня 1995 г. вырашыла дазволіць карыстацца “нацдэмаўскімі” падручнікамі, а новыя, альтэрнатыўныя, падрыхтаваць на наступны год. Дзеля праверкі і выпраўлення навучальнай літаратуры па гісторыі стварылі спецыяльную Дзяржаўную камісію пры Кабінеце Міністраў, якую ўзначаліў сам У. Замяталін. У склад камісіі ўвайшла пераважна старая прафесура сталінска-савецкай школы, у прыватнасці гісторыкі Пётр Петрыкаў, Аляксандр Філімонаў, Валеры Чарапіца, філосаф Вячаслаў Дашкевіч і інш. Так у Беларусі быў адкрыта ўзяты курс на перавод гістарычнай адукацыі на новыя (старыя!) ідэалагічныя рэйкі, а заявленне — на яе рэсаветызацыю, на вайну з беларускай гістарычнай. Праз тры гады на афіцыйнай нарадзе ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прэзідэнт А. Лукашэнка ўрэшце пустоў ческаў пра сутнасць дзяржаўнай палітыкі ў сферы гуманітарнай адукацыі, калі пахваліўся тым, што “за последние годы преодолена деидеологизация средней и особенно высшей школы”[3].

Узяўшыся прасейваць тэксты школьных выданняў праз сіта ідэалагічнай цэнзуры, Дзяржаўная камісія дбала пра адпаведнасць іх зместу не столькі гістарычнай праўдзе, колькі ідэалагічнай лініі Лукашэнкавага рэжыму. Аднак нават адцэнзураваныя дапаможнікі не задавальнялі многіх членаў камісіі. Не выключана, што яны самі інспіравалі скарпіяваўскі прынятыя імі ж кнігі. У прэсе з’яўляліся лісты і публічныя ад імя “ветэранаў” і “настаўнікаў”, якія выкрывалі крытэрыяў выданні. Асаблівую ролю ў кампаніі супраць новых падручнікаў і нацыянальных падыходаў у гістарыяграфіі выконвала грамадскае аб’яднанне “Гістарычныя веды”, створанае ўвесну 1996 г. Згуртаваўшы некалькі дзесяткаў навукоўцаў старога веку, якія абвясцілі сябе “защитниками и сторонниками советской государственности и советской власти”[4], яно прысвоіла сабе ролю своеасаблівага экспертнага органу, які стаў надзіва аўтарытэтным у дзяржаўных дарэчах. У праграмным звароце, апублікаваным у прэсе, гэта група, узначаленая прафесарам Адамам Залескім, заявіла, што будзе весці “борьбу против фальсификаций событий прошлого”,

[4] **Залесский А. Как хочу, так и порочу // Народная газета. 1996, 24 мая.**

[5] **Заявление научного объединения “Историческая знания” // Народная газета. 1996, 16 августа.**

[6] **Чернявский В. В чем же критерии? // Веды. № 25 – 26 (10 верасня 1999 г.).**

[7] **Згода. № 4. 15 – 31 сакавіка 1999 г.**

выкарыстоўваючы “мировой опыт революций и контрреволюций”[5]. Невыпадкова “барацьбітоў з фальсіфікацыяй” найбольш непакоіла асвятленне падзей апошняй вайны, ацэнка партызанскага руху і савецкага ладу. Аднак займала іх і далёкае мінулае. Напрыклад, у падручніку “Гісторыя Беларусі XVI—XVIII стст.” для 7 класу (аўтар П. Лойка) крытыкі бачылі “русафобства”, не прымалі станоўчай ацэнкі царкоўнай уніі 1596 году і г. д., у “Гісторыі Беларусі. Канец XVIII ст. — 1917 г.” (аўтар М. Біч) зноў жа не прымалі “русафобскіх” пазіцый аўтара і таго, што ў ім без станоўчай ацэнкі “великое событие” — падзелы Паспалітай і ўключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі, у падручніку для 9 класу “Гісторыя Беларусі 1917—1991 гадоў” (аўтары В. Сідарцоў і В. Фамін) іх раздражняла ўпамінанне пра тое, што ў савецкай дзяржаве існавалі “антынародны таталітарны рэжым” ды “нацыянальны і культурны прыгнёт”[6].

[5] **Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. — 1999 г. Вуч. дапаможнік для 8 кл. сярэд. шк. / Пад рэд. Я. К. Новіка. Менск, 2000. С. 59, 183.**

Дзяржаўная камісія ўважліва сачыла за зместам навучальных выданняў не толькі па беларускай, але і па сусветнай гісторыі. Так, з падручніка “Сусветная гісторыя найноўшага часу” для 9 класу (Менск, 1998) яна выкрасліла як тлумачэнне тэрміну “таталітарызм”, так і ўсё, што сведчыла пра супрацоўніцтва Савецкага Саюзу з гітлераўскай Нямеччынай, а таксама пра негатыўную ролю Сталіна і яго віну ў развязванні другой сусветнай вайны[7].

Адначасова з крытыкай “крамольных” выданняў прадстаўнікі старой савецкай школы пачалі пісаць свае, сапраўды альтэрнатыўныя дапаможнікі, у якіх ацэнкі падзеям і эпохам расстаўляліся ў поўнай адпаведнасці з ідэалагічным курсам рэжыму. Напрыклад, у дапаможніку Васіля Мілаванава “Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. — 1917 г.” для 8 класу, які выйшаў у 1998 годзе, падзелы Рэчы Паспалітай трактуюцца як “прагрэсіўнае дзеянне”, што дало беларусам “магчымасць скінуць з сябе прыгнёт польска-літоўскіх феадалаў” (с. 4). Наступнай альтэрнатывай для вучняў 11 класу стала “Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. — 1999 г.” пад рэдакцыяй Яўгена Новіка. Расійскі генерал Міхаіл Мураўёў, якога за жорсткасць пры падаўленні нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863—64 гадоў празвалі “вешальнікам”, у гэтым дапаможніку паўстаў “энергічным дзяржаўным дзеячам, які з веданнем справы рабіў

тое, да чаго быў закліканы”, а дэнансацыя дагавору аб утварэнні СССР, заключанага ў 1922 г., і паўстанне СНД названыя дзяржаўным пераваротам[8].

Пад не менш пільнай увагай уладаў апынулася і гістарычная адукацыя ў вышэйшай школе. Яшчэ да пачатку яе рэсаветызацыі Інстытут гісторыі НАН Беларусі падрыхтаваў і выпусціў “Нарысы гісторыі Беларусі” у 2-х частках (Мінск, 1994—95), якія грунтуюцца на нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі. Гэта была першая сінтэза айчыннай гісторыі, створаная ў суверэннай Беларусі. Некалькі гадоў яна выкарыстоўвалася як дапаможнік для студэнтаў ВНУ, але зусім не адпавядала новай дзяржаўнай палітыцы ў галіне вышэйшай адукацыі. Выпраўляць сітуацыю ўзялі на сябе “прыдворныя” гісторыкі, і ўжо ў 1998 г. у якасці дапаможніка для ВНУ антытэзы акадэмічным нарысам выйшаў дапаможнік “Гісторыя Беларусі” ў 2х частках, падрыхтаваны калектывам гісторыкаў-выкладчыкаў. Яго аўтары настолькі захапіліся выкананнем палітычнай замовы, што дапусцілі шэраг фактаграфічных памылак, асвятляючы беларуска-польскія адносіны[9]. Атрымалася мяккая рээдыцыя гісторыі “Паўночна-Заходняга краю”, якая выклікала абурэнне не толькі навукоўцаў і грамадскасці, але і студэнтаў. Аднак у адказ на крытыку за безліч памылак і адкрытае падладжванне пад ідэалагічны заказ рэжыму, змешчаную ў часопісе “Беларускі Гістарычны Агляд” і ў Штогодніку Інстытута гісторыі, аўтары дапаможніка выступілі з палітычнымі абвінавачваннямі на сваіх апанентаў: “Часопіс [БГА] рэдагуецца прадстаўнікамі замежных краін, ... мае сваіх людзей у ЗША і краінах Еўропы”, “вядома, хто ім заказвае музыку, хто плоціць за яе”[10]. Супрацоўнікаў Інстытуту гісторыі на старонках прыдэнцкага перыёдыка “Беларуская думка” прыраўнялі да “агентаў заходніх спецслужбаў”, якія сваёй канцэпцыяй гісторыі спрабуюць “не дапусціць стварэння саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі”[11].

На жаль, палітычнаму курсу прэзідэнта, а не праўдзівай гісторыі стараюцца дагадзіць і іншыя новыя дапаможнікі, напр.[12]

---

[8] **Новік Я., Марцуль Г., Зуева З., Качайлаў І., Лотава В.** **Спрачныя пытанні і ўнікальная фальсіфікацыя** // Адукацыя і грамадства, 2000. № 2. С. 116—128.

[9] **Новік Я.** Пытаць і спрачацца // Беларуская думка. 2000. № 10. С. 158.

[10] **Тамсам.** С. 164.

[11] **Гістарычная** памяць і новыя міфы // Беларуская думка. 2000. № 10. С. 158.

[12] **Нарысы** гісторыі

“дапушчана Міністэрствам адукацыі”, такія, напрыклад, як **перавыдадзены 1996** “Очерки истории Беларуси” П. Чыгрынава (Менск, 2000).
Пасля абвяшчэння курсу на перагляд падручнікаў і з’яўлення публікацый членаў клубу “Гістарычныя веды” з палітычнымі абвінавачваннямі апанентаў у сферы гістарычнай навукі і адукацыі запанавала нездаровая атмасфера. Сітуацыя **13 Заява Рады** абвастрыла публікацыя адкрытага ліста групы **Беларускай** гісторыкаў-артадоксаў да А. Лукашэнкі з красамоўнай **асацыяцыі** “Работа по восстановлению исторической правды **гісторыкаў //** яростному сопротивлению со стороны национал- **Народная** экстремистов” [12]. У адказ Рада Беларускай асацыяцыі **газета. 1996,** гісторыкаў выступіла з заявай, у якой рашуча пра- **24 ліпеня.** супраць навешвання ярлыкоў і спробаў вярнуць гістарычную навуку Беларусі да часоў бальшавізму[13]. Аднак улады адкрыта занялі бок невялікага кола савецкіх артадоксаў, што ўзяліся “ўзнаўляць гістарычную праўду”.
Ва ўзніклых умовах кожная спроба пераглядзець савецкую гісторыю сутыкалася з бурнай рэакцыяй ветэранаў і актыўных прыхільнікаў Лукашэнкі са славяна-патрыятычных колаў. Асабліва паказальны прыклад з даследчыцкай рэпрэсій Ігарам Кузняцовым, які з-за сваіх публікацый ашальмаваны імі ў прэсе, што мусіў бараніць сваю **14 Лідэр** актыўных **аб’яднання** “**Гістарычныя веды**” **у 1999 г.** **у Менску** **выкупіў** **ў сяброў** **клуба** **“Гістарычныя веды” ў 1999 г.** судзе. У 1998 г. у адказ на правядзенне навуковай экспертызы “Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі: 1917—1997 гады”, арганізаванай беларускімі гісторыкамі, старшыня аб’яднання “Гістарычныя веды” Адам Залескі[14], **Міхаіл В.** Савіцкі і іх калегі звярнуліся да Генеральнага пракурора Беларусі з просьбай прыцягнуць да крымінальнай **Сакуціна** аўтараў апублікаваных матэрыялаў — каб “защитить **Беларусі** достоинство президента А. Лукашенко” (?!). У гэтай **з просьбай** кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі Міхаіл Мясніковіч накіраваў у Інстытут гісторыі ліст з загадам “разабрацца з супрацоўнікамі” ды “прыняць меры”. За “справу гісторыкаў” узялася і пракуратура. Калі раней толькі ветэраны і створаная імі з савецкіх артадоксаў грамадская камісія (В. Корбут, А. Залескі ды інш.) сцвярджалі, быццам расстрэлы ў Курапатах займаліся фашысты, дык цяпер і Генеральны пракурор Алег Бажэлка заявіў, што яшчэ невядома, ці сапраўднасці пахаваны ў Курапатах, бо, маўляў, **15 Прапаповіч** расследаванне праводзілася скрайне неаб’ектыўна, **А. Пракуроры** **ўзяліся за** **гісторыкаў // Навіны. № 119** **(6 лістапада**

займаліся “специалисты из Института археологии Академии наук во главе с Зеноном Пазьняком”[15]. Так стала афіцыйна сцвярджацца “новая праўда” пра Курапаты.

Фактычна з таго ж 1996 году ў Беларусі была ўведзена палітычная цэнзура на гістарычную літаратуру. Адной з першых з планаў выдавецтва “Мастацкая літаратура” на 1996 г. чыноўнікі выключылі ўжо падрыхтаваную да друку кнігу Ў. Арлова і Г. Сагановіча “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі” (а таксама творы Васіля Быкава і Ларысы Геніюш), якая, на іх думку, была “напісаная тэндэнцыйна ў русафобскім духу”[16], хоць праца прайшла сур’ёзную экспертызу ў Інстытуце гісторыі, які рэкамендаваў яе да выдання. У 1997 г. пасля прызначэння невядомых адпаведных асобаў быў спынены продаж папулярнай кнігі Ў. Арлова “Адкуль наш род”. Апошнім сімвалам увядзення цэнзуры ў краіне стала выданне Пагоня з вокладкі чарговага, трэцяга тому “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” (1996). Гэта зрабіла новае кіраўніцтва выдавецтва “Беларуская Энцыклапедыя”, намесніка галоўнага рэдактара якога быў прызначаны Пётр Петрыкаў — былы дырэктар Інстытуту гісторыі, адзін з самых актыўных апалагетаў савецкага мінулага. Ён выступіў з жорсткай крытыкай ранейшага кіраўніцтва энцыклапедыі, сцвярджаючы, што галоўнай адметнасцю першых тамоў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” быў “ярка выражаны антырусскі дух”, у іх выпадках зацятая русафобія”[16]. Прывёўшы ў прыклад некаторыя артыкулы, напісаныя супрацоўнікамі Інстытуту гісторыі, П. Петрыкаў абвінаваціў гэтую ўстанову ў тым, што яна ажыццяўляе “татальную фальсіфікацыю” гісторыі. Беспадстаўны і палітычны характар падобных заўваг паказалі дырэктар Інстытуту гісторыі Міхаіл Касцюк і яго намеснік Міхаіл Біч, якія ўступілі ў палеміку з былым калегам[17], але гэта не адвяло хмараў, якія пагрозліва згушчаліся над дырэкцыяй інстытуту.

Пры новых кіраўніках выдавецтва “Беларуская Энцыклапедыя” канцэпцыя чарговых тамоў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” на хаду мянялася, і нават падрыхтаваныя да друку артыкулы вярталіся на цэнзуру. П. Петрыкаў, напрыклад, патрабаваў выкрэсліваў слова “русіфікацыя”, не прапускаў нават крытыкі ў бок Расіі ды савецкай улады і г. д. З-за грубага ўмяшання ў

[16] **Петрыкаў П. Тупая русафобія // Беларуская думка. 1996. № 3.**

[17] **Касцюк М. Палітызаваная гістарыяграфія можа быць сапраўднай навукай // Голас Радзімы. 1996, 9 жніўня; Біч М. Дыялектыка і тэндэнцыйнасці // Голас Радзімы. 1996, 12 верасня.**

[18] **Пятрэшкевіч А. Старыя абруч мінулага зноў ніякі кайданы // Голас Радзімы. 1998, 17 кастрычніка.**

тэксты многія гісторыкі (у прыватнасці, Валянціна Андрэй Кіштымаў, Уладзімір Конан, Мікола Крыштофік, Генадзь Сагановіч і інш.) адмовіліся ад далейшага супрацоўніцтва з выдавецтвам і забралі адтуль свае рукапісы. Наступным ударам па нацыянальнай гістарыяграфіі стала атака на рэдакцыю гістарычна-дакументальнай хронікі “Памяць”. Члены аб’яднання “Гістарычныя веды” К. Дамарад і А. Хахлоў у 1998 г. накіравалі ліст у Адміністрацыю прэзідэнта і ў Дзяржкамдрук РБ, у якім з жорсткімі абвінавачваннямі абрынуліся на выданні гэтай хронікі і асабліва на кіраўніка арганізацыйна-метадычнага цэнтру Алеся Петрашкевіча, які, па іх словах, належаў да “реакционного направления в исторической науке Беларуси”, што аформілася ў ходзе “контрреволюционного переворота, совершенного в Беларуси в 1991 г.”[18]. Выданню інкрымінаваліся ўсё тыя ж абвінавачванні маўляў, раённыя “Хронікі” не раскрываюць сусветнага гістарычнага значэння рэвалюцыі 1917 г., прыніжаюць ролю камуністычнай партыі, сацыялістычнага будаўніцтва і перамогі ў вайне, раздзімаюць тэму сталінскіх палітычных рэпрэсій, праслаўляюць эксплуататараў (князёў і паноў), распальваюць антырасійскія настроі. У выніку гэтага даносу вядомы беларускі драматург і гісторык А. Петрашкевіч быў звольнены з пасады кіраўніка важнага энцыклапедычнага цэнтра.

Кампанія супраць галоўнай фартэцыі “фальсіфікатараў” акадэмічнага Інстытуту гісторыі, які сапраўды з’яўляецца цэнтрам гістарычнай навукі, бо сабраў найлепшыя кадры краіны, пачалася таксама яшчэ ў 1995—96 гадах, і не скончылася. Чаго толькі ні пісала афіцыйная прэса, называючы флагман беларускай гістарыяграфіі “националистическим заповедником”, або заяўляючы, што яго дзейнасць “супярэчыць гістарычнай праўдзе, палітыцы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь” [19]. Асабліва выслужылася газета “Веды” — перыядычны орган Нацыянальнай акадэміі навук і Міністэрства адукацыі, рэдактарскае крэсла ў якой было аддадзена члену той самай Дзяржаўнай камісіі па падручніках В. Дашкевічу. Найбольш паслядоўна і груба крытыкаваліся акадэмічныя “Нарысы гісторыі Беларусі”, у віну якім ставілася тая ж “антыруская накіраванасць і прыніжэнне ролі савецкага перыяду”[20], скажэнне гісторыі наагул. Крытыкі імкнуліся давесці, што гісторыкі з Акадэміі навук пераблыта

---

[18] **Петрашкевіч П.** **Тумаін русафобій хаўтаў Беларускую Незалежную // Беларуская думка. 1996. № 3.**

[19] **Нарысы гісторыі Беларусі, воля. 1998, 22 снежня.**

[20] **Зайцаў А. Чайкоўскі і кампанія // Веды. 1999, 24 верасня.**

[21] **Веды. 2000, 28 студзеня.**

[22] **Кафлыбіч**

непрыдатныя, а найбольш вінаваты дырэктар інстытута акадэмік Міхаіл Касцюк. Публікуючы дылетанцкія, антынавуковыя матэрыялы членаў клубу “Гістарычныя веды”, у якіх пераважалі эмоцыі і палітычныя штампы, галоўны рэдактар “Ведаў” абяцаў стварыць з іх спецыяльны выпуск, дапаможнік, “азнаямленне з якім павінна стаць абавязковым у сярэдніх школах і ВНУ”[21]. Каб не дапусціць чарговага абрання дырэктарам М. Касцюка, Прэзідыум Акадэміі парушыў свой жа Статут і не абвясціў конкурсу на замяшчэнне вакантнай пасады. Больш за тое, у кастрычніку 1999 г. на ўрачыстасцях з нагоды 70-годдзя гэтай установы прэзідэнт НАН Беларусі Аляксандр Вайтовіч выступіў з жорсткімі палітычнымі абвінавачваннямі ў адрас дырэкцыі Інстытуту, якія даходзілі да абразаў, а праз месяц уласным загадам прызначыў на пасаду выканаўцы абавязкаў дырэктара Інстытуту гісторыі прафесара Мікалая Сташкевіча — былога супрацоўніка Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

Выразным сімвалам арганізаванага наступу на Інстытут гісторыі стала прымацаваная на яго будынку на вул. Сурганова ў 2000 г. расійскамоўная мемарыяльная дошка кандыдату ў прэзідэнту Беларускай Акадэміі Паўлу Горыну — асобе, якой у 1930-х бальшавіцкая ўлада даручала “ачысціць нацдэмаўшчыну і арганізаваць акадэмію “сапраўды камуністычную, падпарадкаваную інтарэсам сацыялістычнага будаўніцтва”[22].

Пакуль можна канстатаваць, што М. Сташкевіч не справіўся ускладзеных на яго задачаў па “перавыхаванні” беларускіх гісторыкаў. Жыццяздольнасць калектыву Інстытуту гісторыі, неэфектыўнасць палітыкі застрашвання засведчылі і выбары яго навуковай рады, праведзеныя на пачатку 2000 г. шляхам тайнага галасавання ў раду ўвайшлі пераважна прадстаўнікі выразнымі прафесійна-грамадзянскімі і нацыянальнымі пазіцыямі. Таму Прэзідыум НАН, які абяцаў правесці афіцыйныя выбары дырэктара Інстытуту гісторыі ў канцы 2000 г., так і не адважыўся даць яго супрацоўнікам законную магчымасць абраць сабе кіраўніка. Наадварот, прэзідэнт НАН А. Вайтовіч публічна прыгразіў, што мае план ліквідацыі Інстытуту гісторыі і стварэння замест яго “Нацыянальнага інстытуту гісторыі пры Адміністрацыі Прэзідэнта”, у які будуць набірацца кадры толькі адпаведнай палітычнай арыентацыі.

С. Разуром нацыянальнага руху у Беларусі. Менск 2000. С. 65.

23. Криштапович Л. Е. Белорусизация: Русская цивилизация. Раструбить Беларусь. Минск: Институт социально-академических исследований при Администрации президента РБ, 1999. С. 134—135.

Пэўна, гэта адзіная магчымасць пазбавіцца тых, хто з прафесійнага абавязку не пагаджаецца паставіць гістарычную навуку на службу палітычнаму рэжыму.
Калі падобны план перадачы кантролю над гістарычнай навукай Адміністрацыі прэзідэнта рэалізуецца, можна толькі здагадвацца, што панапісваюць пра мінулае Беларусі наваспечаныя спецыялісты ад гісторыі! Крэда “правільнага” асвятлення беларускай гісторыі (а фактычна — хімера ўбогай версіі “западно-руссизма” і панславізму) нядаўна было выкладзена адным з такіх “знаўцаў” у выданні Інстытуту сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: “Белорус... по своей теоретической и практической жизни является русским человеком”, а варожы славянам Захад “ведет тотальную информационно-психологическую войну против общерусского мировоззрения нашего народа”[23]... Каментар тут даваць немагчыма, можна толькі ставіць дыягназ.

Гэты тэкст, як і артыкулы
В. Булгакава “Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму” і
А. Дынька “Resistant Culture” ў папярэднім нумары “Скарыны”, былі падрыхтаваныя для таварыства “IDEE–Трэці сэктар”.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **28-07-2001**
[image]

Сяргей Дубавец

Апошняе слова Алеся Адамовіча

СЯРГЕЙ ДУБАВЕЦ галоўны рэдактар газэтаў "Свабода" (1990-1991), "Наша Ніва" (1991-2000), вядучы аўтарскай перадачы "Вострая Брама" на Радыё Свабода. Літаратурны крытык, аўтар кнігі эсэістыкі "Дзеньнік прыватнага чалавека" (БГАКЦ- Эўрофорум", 1998), укладальнік кнігі Алеся Адамовіча "Vixi", падрыхтаванай да друку ў

I

У выдавецтве “Наша Ніва” завяршаецца праца над новай кнігай Алеся Адамовіча. Аснову выданьня складаюць тры апошнія аповесьці аўтара — “Вэнэра”, “Нямко” і “Vixi”.

Крыху больш за дзесяць гадоў мінула, як ня стала нэнзуры. Крыху менш за дзесяць гадоў, як ня стала Адамовіча. Паміж гэтымі “больш” і “менш” — невялікі зазор часу, калі й пісаліся згаданыя творы. Прызнаны літаратар з іміджам праўдалюбца мог разьлічваць, што будзе апублікаванае кожнае яго нае слова, і, натуральна, імкнуўся да-казаць, а значыць і да-асэнсоўваць тое, што раней да-казваць і да-асэнсоўваць было немагчыма. (Праўда, першыя павевы свабоды шмат каго і расслабілі. Маўляў, калі можна гаварыць усё, дык ужо й ня так гэта важна. Сьледам прападала і ранейшая дысцыпліна думкі, энэргія творчасьці. Іншыя ўспрынялі свабоду як чарговую аддігу і засьпяшаліся выказаць недаказанае. У Адамовіча выбару не

было. Інфаркт і дыягназ хуткае сьмерці выводзіліяпонскай працу над апошнімі творамі за межы тагачаснае рэчаіснасці і"Вокнаў сяты то адлігай, ці то свабодай.) **Брама".**

Аднак выйдзе ў сьвет ягоная апошняя кніга толькі зараз, празь дзесяць гадоў. (Магчыма, гэта значыць, што мы, сёньняшнія выдаўцы, належым якраз да расслабленых той свабодай, што б ні казалі мы пра новую дыктатуру. Якраз у тыя часы мне здавалася непрымальнай расейскамоўнасьць Адамовіча, незразумелаю была амплітуда — ад аналізу твораў Максіма Гарэцкага і Кузьмы Чорнага да сутворчасьці з Данііламі Граніным і Элемам Клімавым.) Тое, што яна ня выйшла дзесяць гадоў таму, ніяк не адбілася на яе вартасьці.

Сёньня ўжо я разумею, што бяз гэтых твораў немагчыма будзе адэкватна ўспрымаць беларускую гісторыю мінулага стагодзьдзя, сучасны стан краіны, цяперашні літаратурны працэс. Рэзкі спад інтэлектуальнага ўзроўню беларускай гуманістыкі абумоўлены тым, што многае з зразуметага папярэднікамі пераасэнсоўваецца цяпер наноў і павярхоўна, часта з нуля, без уліку ранейшага досьведу.

Як рэдактара, мяне ў кнізе Адамовіча прывабілі дзьве рэчы. Па-першае, я разумеў, што на зломе апошніх гадоў са сьценаў беларускага дому павыпадалі цагліны, безь якіх ва ўсім гмаху робіцца няўтульна. Вось жа адна з такіх цаглінаў адкрылася майму позірку. Па-другое, — прызабытае пачуцьцё, калі чытаеш творы сучасьніка і табе перадаецца жаданьне ствараць таксама. Гэтае пачуцьцё ўзьнікае ад амаль культавага стаўленьня да літаратуры, да літаратурнае творчасьці. Гадоў 10—15 таму гэткае пачуцьцё панавала і ў нашых асяродках. Было нясьцерпна важна пачуць новы верш ці прачытаць п'есу калегаў, а то й самому ноч-другую праседзець, перадаючы на паперы вобраз ці настрой. Як усё ж даўно няма гэтага захапленьня і як даўно не ўзбуджаюць яго ў табе творы сучаснікаў! І рэдагаваньне — як даўно з сутворчасьці ператварылася ў выпраўленьне непісьменнасьці! Вось жа Адамовічавы аповесьці вярнулі тое забытае пачуцьцё.

Аповесьць "Vixi" — сьведама недапісаная кода. Аўтар ведае, што неўзабаве памрэ і занатоўвае свае думкі, а таксама згадвае дзяцінства. Дзьве другія аповесьці — "Вэнэра" і "Нямко" — пра вайну і пра вёску. Але пасьля ўсяго напісанага пра вайну і пра

вёску — у тым ліку і самім Адамовічам — яны раптоўныя. Гэта Адамовічава рыса па-над усім ранейшым досьведам беларускай літаратуры. Самыя апошнія высновы. Напрыклад, пра падсьведамую нецярпімасьць да іншага, спраўнейшага, багацейшага, акуратнейшага. Прычым нецярпімасьць — на паражэньне.

У Адамовічавай “Вэнэры” аўтар выяўляе гэтае пачуцьцё ў партызанах. Яно як бы і незлаблівае, але разам з тым імгненна гатовае разьвіцца ў вялікую вынішчальную сілу.

“... Вэнэрын бацька і хадзіў па вуліцы, і пазіраў, і вітаўся так, што зь міжвольнай павагай-цікаўнасьцю азірнесься на яго. А ўжо дома ў яго тым больш: ногі абавязкова выцераш ля парогу. Ды ня надта мы да яго зазіралі, шарагоўцы-партызаны. Вечна нейчы конь пад сядлом навязаны да плоту Станкевіча. Які-небудзь камандзір гасьцюе. Моцны мужык — Станкевіч. Хітраван. Куркуль. Кулак. Словы гэтыя, ахвотна вымаўленыя, ніяк, зрэшты, не падрывалі нашай да яго павагі. Даравалася яму многае, нават багацьце — за дачку.”

Дачка-прыгажуня Вэнэра — галоўная гераіня аповесьці.

“А неяк чэпэ здарылася: нехта палазіў каля вульляў Станкевіча. Называецца: павязаць пчолак. З патрону выломваеш кулю, запалку да патрону, патрон да лаза — ш-шух! Душагубка для пчол. Адчыняй вечка і, не баючыся джалаў, гаспадар, як фашыст. Але ня можа быць, каб гэта з нашага атраду. Пэўна нейкія чужакі пашарылі. Носава віншавалі: во як памацалі твайго цесьця! А ён нават задаволены, радуецца — чаго толькі: віншаваньням альбо што Станкевіча раскулачылі? Гэткія гісторыі нас усіх чамусьці забаўляюць. А, недаспадобы? Прыйшлі, вярнуліся ў лягер уначы, у зямлянцы сьпяць упокат, аднаму, другому з усяго маху па задніцы — падскоквае, як шалёны. А, недаспадобы?! У гэтым уся весялосьць: каб чалавеку не падабалася.”

Аўтар нібы зноў усяляецца ў сьведамасьць таго 16-гадовага сябе, каб лепей зразумець сутнасьць гэтага часу і партызаншчыны. Для гэтага даводзіцца ні ў чым не выгароджваць і не прыхарошваць таго, 16-гадовага. А выглядае ён сапраўды не героем, хутчэй нейкім ціхім, затоеным шкоднікам.

Не адзін раман датуль Адамовіч прысьвяціў партызанам. А тут — бяз зносак на цэнзуру, савецкую ідэалёгію і грамадзкія

прынятасьці — сьпяшаецца даць выверануюхарактарыстыку партызаншчыны. Такую, каб не падлягала ўжо пераацэнкам у залежнасьці ад зьмены ідэалёгіі. Каб была простая праўда.
“Вось такія справы! — хочацца паўтарыць усьлед за аўтарам “Бойні нумар пяць”. Такія вось пірагі. Гарачыя, апячэсься. У амэрыканскага немца Курта Вонэгута вычытаў я і яшчэ адну думку, хоць забіце, але яна і мая ўласная: пра мінулую вайну як пра крыжовы паход дзяцей. Яна, на жаль, скарыстана, зрасходавана на амэрыканцаў, што ваявалі ў Эўропе. А як бы спатрэбілася для нашай партызаншчыны. Вось ужо дзеці дык дзеці! А дзе дзеці, там і жорсткасьць. Асаблівая, дзіцячая.
У нас нават камандзіры атрадаў, брыгад былі найбольш дваццацідвух-дваццацітрохгадовыя. Ва ўзводах — школьнікі, нядаўнія школьнікі. Былі і барадачы, “дзяды”, але няшмат, як бы спэцыяльна для дакумэнтальных кінастужак, фатаздымкаў, каб ня крыўдзіць тых, хто менавіта такімі ўяўляе “народных мсьціўцаў”.
... У атрадзе нашым было каля 600 чалавек. Гэта ў 1943 годзе. Складаўся ён з каго (досыць тыпова для Беларусі)? Працэнтаў 10 — былыя акружэнцы, яны ж нашы камандзіры, штабная публіка. Столькі ж, бадай, былых “дабравольцаў”, “уласаўцаў”. Гэта ўсё наш армейска-кадравы склад, баявы касьцяк атраду. Акружэнцы партызанілі з 41-га, “дабравольцы” — зь вясны 42-га. І тыя, і другія як бы арыстакратыя наша, “старыя партызаны”. Хаця непрыкметны падзел між імі заўсёды існаваў: ніводнага “ўласаўца” не было ў штабе, а калі “ўласавец” камандзір, дык не вышэй чым узводу. І наагул грахі вольныя ці міжвольныя не дараваліся. Злучыліся з арміяй — і большасьць іх, не пытаючыся, хто як партызаніў, адправілі ў штрафныя роты...
Гэта я пра камандзіраў казаў. Ну, а наступная паводле значэньня і павагі катэгорыя партызан — “дзяды”, ува ўзводах баявых і пры гаспадарчым узводзе. Іх ня больш за 3—5 працэнтаў.
Ага, не забыцца пра былых паліцаяў, іх таксама працэнтаў пяць.
Наагул працэнтаў 35 — ня мы. Астатнія — мы, школьнікі. Зь вёсак, з рабочых пасёлкаў, як наша Глуша, з райцэнтраў, мястэчак. Былі і гарадзкія, але ім больш складана трапіць у партызаны, дабрацца да нас. Там у іх заводзіліся “маладыя

гвардыі", у Беларусі — у кожным гарадку, а ў вялікіх гарадох — амаль на кожнай вуліцы. Так што і ўся рэспубліка беларусаў у вайну — крыжовы паход дзяцей.
Вось такія ў нас справы школьныя, Курт!"
Вось такія справы... Дзеці, дзеці. У нас і цяпер, здаецца часам, палітыкі, як дзеці, — з абодвух бакоў. Крыўдлівыя, інфантыльныя, нямудрыя яшчэ зусім. Ну ніяк ня ўгледзець спаміж іх *сваіх абаронцаў*. Як і ў тых партызанах.
Гэта пераважна пра стыхійную партызанку, самую масавую. Былі ж яшчэ і "асобыя атрады", засланыя ў Беларусь з Масквы. Калі праўду, дык поўную праўду. Няма больш куды адкладаць Алесю Адамовічу.
Вёску прыгажуні Вэнэры, якая давала прытулак партызанам, зьнішчыў "асобы атрад" НКВД. Партызаны вяртаюцца з чарговага рэйду і такі паміж імі завязваецца дыялёг:
"— А праўда, што гэта спэцатрад тут дзейнічаў? — пытае Навічок. (У хлопца ёсьць прозьвішча, імя, але для нас ён проста Навічок: усяго толькі два тыдні, як прыбег з Бабруйску.) Злавеснае наша маўчаньне Навічку анічога не сказала, упарта дамагаецца адказу:
— Кажуць, што яшчэ да немцаў тут нашы былі, нейкі атрад спэцыяльны...
— Табе гэта ня немцы расказвалі? — пытае Рамановіч. Вунь якія жорсткія вочы могуць быць у нашага камандзіра. — ... Не балбачы, чаго ня ведаеш. Чуў звон!
Мы згодныя з Рамановічам. Пра гэта ня трэба. Мы таксама ведаем. Але пра гэта ня трэба. Ні ведаць, ні помніць ня хочацца".
Ведаць і помніць ня хочацца, але ведаецца і помніцца. Зразумела, што трэба распавесьці пра гэта, прычым найхутчэй, хоць бы і праз 50 гадоў пасьля вайны. Бо гэта праўда. Таму пасярод аповесьці Алесь Адамовіч згадвае сваю з калегамі працу над кнігай "Я з вогненнай вёскі":
"*Нам жанчыны расказваюць, старэнькія, ім ужо за 70, магнітафон запісвае:*
— Прыехалі й кажуць: ідзіце ў лес, немцы хутка будуць у вас... А людзі, зіма ж, мароз, куды ж ім у лес ды ў каго шмат дзяцей. Не паслухаліся некаторыя. Дык яны назаўтра вярнуліся, і тых, хто ў лес ня выехаў, ажно дзевяць сямеек, — усіх пастралялі...
— Чакайце, гэта хто былі?

— Ды хто, партызаны, мы ж кажам. Спэц... гэты атрад — яны сябе называлі. Восемдзесят ці колькі душ, ды зь дзеткамі пастралялі... Вы, кажуць, немцаў чакалі, вы не савецкія людзі. Камандзір іхны, як яго... Калайджан, чорны такі, вочы такія, усё крычаў: “Вы — паліцэйскія лазутчыкі, вы ворагі народу, здраднікі!”

Ад мясцовых партызан мы тое самае чулі. Спэцыяльна распытвалі ў іншых вёсках. І ўсё-ткі не далі ў кнігу. Можна растлумачыць: гэтага нізавошта б не прапусьцілі, 70-ыя гады. Праўда, але з адной агаворкай. Касэту мы самі сьцёрлі, запісалі на ёй іншы расказ у другой вёсцы, дзе забівалі ўжо сапраўды немцы. Першая думка, пачуцьцё наша (усе трое да таго ж былыя партызаны): ды калі прагучыць гэты выпадак, усе астатнія нашы запісы, нашы “вогненныя вёскі”, дзе немцы і паліцаі “працавалі”, нехта паставіць пад сумненьне. А ці ня іх, такіх вось “спэцатрадаў”, справа — вашы Хатыні.

Які быў расклад рэчаў у тыя дні: альбо — альбо. Калі і вашы “органы” — зьвяр’ё, значыць, як бы апраўданьне нямецкім карнікам. Сьцёрлі магнітную стужку — факт...

Мой суаўтар па кнізе “Я з вогненнай вёскі” Янка Брыль спэцыяльна адшукваў сьляды гэтага Калайджана. Па музэях ды публікацыях. Выявілася: прысланы быў з Масквы, бо ў 1942 годзе “камандзіраў не хапала”. (Ды й ня вельмі давяралі акружэнцам: з НКВД — надзейней.)

Ваграм Пагосавіч Калайджан, старшы лейтэнант, — вось ён і расстраляў на Віцебшчыне вёску Дуброва. Потым яго адклікалі ў Маскву. Паводле афіцыйнай вэрсіі: судзіць. Паводле пераканаьня мясцовых партызан: уцёк сам, за ім ужо палявалі мясцовыя хлопцы. Прынамсі, ніякой за сабою віны не прызнаваў, а наадварот, крыўдаваў (пасьля вайны ўжо), выпрошваў узнагароду.

Тое, што адбылося ў нашай мясцовасьці — ува Ўюнішчах, ну, — проста-такі сьпісана з Калайджана. І таксама — “спэцатрад”.”

Той спэцатрад расстраляў у вясковым рове жыхароў, якія спрабавалі ўцячы ад нямецкае “акцыі”. Спэцатрад зрабіў сваю справу і сышоў. Прыйшлі немцы і ўсіх астатніх сагналі ў хлеў і спалілі. У тым ліку Вэнэрыну матку, брата і сясьцёр. Сама яна, абпаленая, выжыла. Потым *свае* партызаны, сустрэўшы яе ў лесе, не пазналі колішняй прыгажуні, адабралі ў яе каня — усё,

што засталося ад былое гаспадаркі. Потым быў канец вайны, і ў яе доме — адзіным ацалелым ад вёскі — зрабілі калгасную кантору. Сама яна жыла ў бакоўцы, на печцы, куды нападпітку бясконца лазілі заежджыя ўпаўнаважаныя. Нарабілася ў Вэнэры дзяцей. Урэшце, нават пакладзістым сваім норавам яна не дагадзіла пастаяльцам і прыпісалі ён крадзёж з калгаснага поля шасьці бульбін, за што, ужо пасьля сьмерці Сталіна, атрымала яна 6 гадоў Гулагу і назаўсёды зьнікла з поля зроку ўсіх, хто яе ведаў, у тым ліку і аўтара аповесьці.

Як і Васіль Быкаў, Адамовіч гоніць свайго героя па балатах, праз падпаленыя хлявы і расстрэлы — ад вечнае пагоні — ня тых, дык гэтых, ня немцаў і паліцаяў, дык партызан і “спэцатраду” — гоніць праз усе магчымыя й немагчымыя пакуты ды катаваньні — да сьмерці. І да высокага сэнсу, які адкрываецца, паўстае з гэтых твораў: не было ў тую вайну для беларуса сваіх, не было свайго боку, свайго інтарэсу. Гэта чужая вайна жорнамі прайшла-праехала па хрыбціне беларускага чалавека. У гэтым сэнсе філязофія Адамовіча і Быкава — адна, дакладней, да адной яны ўзыходзяць філязофіі. Два найглыбейшыя псыхолягі і сьведкі ўздымаюць нас да гэтае праўды. Большае праўды, мабыць, ужо ня будзе. Бязь іх, верагодна, не было б і гэтай.

Чытаючы пра ўсю тую нялюдзкасьць, увесь час спрабуеш сканструяваць хоць нейкую альтэрнатыву — ну, хто мог бы тут абараніць, хто мог бы выступіць сваім?

Самая простая выснова — вінаватая зброя. Чалавек бяз стрэльбы — найчасьцей ахвяра, і міжволі салідарызуецца з такім самым, але варта яму ўзяць зброю і гэта ўжо зусім іншы чалавек. Але ж у тым і рэч, што мы гаворым пра абаронцу, якога можна было б прызнаць за свайго. А які на вайне абаронца бяз зброі?

Алесь Адамовіч не аднойчы заўважае, што ўвесь ягоны матэрыял — дакумэнтальны. Ён шукае ў сваёй памяці або ў аповедах іншых таго свайго абаронцу для Вэнэры і многіх тысячаў падобных да яе вясковых проста людзей, людзей бяз зброі. У выніку зьяўляецца яшчэ адна аповесьць — “Нямко”. Абаронцам беларускае вёскі ў гэтым дакумэнтальным расповедзе аказваецца немец.

“Штурмбанфюрэр уласнаю асобаю меў палітычную суразмову з малодшымі афіцэрамі, а тыя — з салдатамі: як паводзіць сябе

на гэты раз, у гэтай вёсцы. Аніякіх пагроз і канфіскацыяў, за паслугі дзякаваць і нават плаціць, сьмела ўступаць у асабістыя кантакты — усё, як у цывілізаванай краіне. А калі надыдзе дзень акцыі (аб чым будзе ў час паведамлена), усіх гаспадароў свайго дому ліквідаваць, дом і ўсе пабудовы падпаліць. Словам, далей дзейнічаць, як і ў іншых вёсках."

Маладзенькаму нямецка-фашысцкаму захопніку Францу глянулася такая ж маладзенькая гаспадыня хаты Паліна. І вось у час экзэкуцыі, калі ў іншых хатах гансы з гергардамі пачынаюць расстрэльваць сваіх гаспадароў, ён расстрэльвае свайго напарніка — дасьведчанага экзэкутара — і разам з Палінай і яе маткай хаваецца ў падзямельлі. Пакуль дагарае расстраляная і спаленая ягонымі таварышамі вёска. Пасьля адыходу немцаў яны ўтраіх выбіраюць на пажарышчах косткі згарэлых людзей і хаваюць іх.

Сярод матывацыяў Франца няма пажады, няма яшчэ і вялікага каханьня. Проста чалавек у ім загаварыў. Неасэнсавана так залапатаў у выхаванцу гітлерюгенду, і ён выступіў абаронцам і для Паліны, і для яе маці, і для ўсёй беларускай вёскі. Можна толькі ўявіць, што чакала гэтую парачку — Паліну і немца — наперадзе. Трэ было хавацца ад любога ўзброенага чалавека. Адамовіч узнаўляе ўсю іхную горкую адысэю. Вайна завяршаецца ў лягеры сьмерці ў Азарычах. Пасьля вайны не лягчэй. Усё ж, зашыўшыся кудысь у палескую пушчу, яны выжываюць.

Яны выжываюць разам з усімі, каму ў тую вайну ўдалося выжыць. Гэта значыць, з тымі, хто нарадзіў сёньняшняе жыцьцё ў Беларусі і чыёй сьвядомасьцю гэтае жыцьцё абумоўленае. Чытаючы ў Адамовіча дакумэнтальныя гісторыі рэальных беларускіх людзей і цэлых вёсак, раптам вельмі добра разумееш, чаму сёньня так трымаюцца людзі за тое, што маюць, ня хочучы ніякіх там рэформаў, пераменаў, дзяржаўнасьцяў-незалежнасьцяў. Толькі б было так, каб не расстрэльвалі, не палілі жыўцом, не прыніжалі самым нізкім прыніжэньнем, не забівалі сваякоў, ня страшылі па начах сваімі наездамі — толькі было б як цяпер. Хай і голад, і холад, і нават сьмерць, але толькі па-людзку, як цяпер. Яны зьведалі такое беспрасьвецьце, што ўжо ў генах у іх той жах, як і радасьць зь цяперашняга, сапраўды ж у параўнаньні сьветлага жыцьця. Калхозны зьдзек яны церпяць, бо гэта ў параўнаньні ўжо зусім і

ня зьдзек. А чаго яшчэ большага хацець, калі зьведаў забойства бацькоў ды дзяцей, — у цябе на вачох. Калі сам цудам выпаўз. Цяперашняе жыцьцё мае назву калі ня шчасьце, дык не-кашмар. Не-кашмар, можа быць, нават больш чым шчасьце.
Адна думка мне прычапілася — а што ж іншыя народы-нацыі, хіба не перажылі ўсяго гэтага? Чаму яны сёньня так складна жывуць? А ў Беларусі яшчэ толькі на транспарантах ды платах пішуць гэтыя пажаданьні пра незалежнасьць, дэмакратыю і свабоду. Ці нам дасталося болей, чым іншым? Ці мы сапраўды як нацыя — яшчэ дзеці, да сьмерці перапалоханыя мінулай вайною і сталінскімі экзэкуцыямі?..

II

Сэрца білася-білася і перастала. Лекары так і сказалі: у любы момант сэрца можа спыніцца. “Любы момант” цяпер і азначаў — жыцьцё. Ці ён усяго толькі імгненьне, ці месяц, ці год — гэта ўсё адно “любы момант”. Кожная хвіліна. Жыцьцё пасьля жыцьця. Час, адведзены на тое, каб яшчэ пасьпець стаць, адбыцца, давыказаць тое, што раней не давалася, дарабіць тое, чаго пасьля цябе не даробіць ніхто.
У Алеся Адамовіча “любы момант” расьцягнуўся ў часе ў асобны творчы пэрыяд, можа быць, самы ясны, а можа і самы плённы. Усё, што перашкаджала раней звонку і ў сабе, адышло. Разьвеялася вакол задушлівая атмасфэра савецкай цэнзуры, сьціхлі або ператварыліся ў пустое зьвяганьне некалі страшныя ідэалягічныя прысуды. Перад вачыма адкрылася брама вечнасьці. Каля яе думкі больш ня склейваюцца ў стылістычныя спайкі з эпікі, лірыкі ды публіцыстыкі, што так замінала колісь і за што папракала крытыка. Справядліва ці не — няважна. Важна, што цяпер такое нагоды ў яе няма.
Сэрца зьлітавалася. “Любога моманту” хапіла на тры творы. Адамовіч дапісвае аповесьць “Вэнэра”. Пачынае аповесьць “Vixi” — мудры такі расповед пра тых і тое, што згадваецца зь дзяцінства, нібы наўмысна нетаропкі і падрабязны. Недзе тут, у гэты самы пэрыяд, знаходзіцца час пачаць і закончыць яшчэ адну аповесьць — “Нямко”, на маю думку, самы празаічны і з празаічных найбольш дароблены твор пісьменьніка.
Памежны стан, у якім напісаныя гэтыя творы, нагадвае пра іншае, далёкае, але з такім самым настроем складзенае чатырохрадкоўе:

Ў краіне сьветлай, дзе я ўміраю
у белым доме, ля сіняй бухты
я не самотны, я кнігу маю
з друкарні пана Марціна Кухты.

...Інтэрнэт-пошукавік “Яндэкс” паказаў, што на масавым узроўні ў Расеі Алеся Адамовіча пакрысе забываюць. Ён выдаў некалькі старых згадак пра “Мэмарыял”, пра тое, як Сяргей Кавалёў з павагі да пісьменьніка ўзяў сабе мянушку Алесь. Ёсьць абоймы-сьпісы шасьцідзясятнікаў, найчасьцей тых, каго ўжо няма сярод жывых. Часам зьяўляецца ягонае прозьвішча ў зьвязку з гарбачоўскай перастройкай. Вось, па вялікім рахунку, і ўсё. Гісторыя, палітыка... Ніякай уласна літаратурнай размовы няма.

Мне падумалася — а хто ён для іх, сёньняшніх? Пісьменьнік? Тады дзе ягоныя абароцістыя мэнэджэры, літагенты, спонсары ды куча іншае брацьці, безь якой цяпер паэт у Расеі — меней чым паэт? Ягоныя крытыкі і знаўцы толку ў ім таксама даўно выйшлі з моды разам з тою эпохай. Ну хто цяпер сур’ёзна будзе чытаць пра ядзерную пагрозу? Праехалі...

Дзеля пэўнасьці зазірнуў яшчэ ў глябальную і ўва ўсім дасьведчаную “Брытаніку”. Няма там нашага Адамовіча ў артыкулах пра расейскую і савецкую ці постсавецкую літаратуру. “Брытаніка” на мой запыт адкрыла тэкст пра беларускае пісьменства, дзе шмат Алесяў, але іншых. Нават Толік Сыс там ёсьць, а Алеся Адамовіча няма. Чаму? Простыя тлумачэньні не падаюцца пераканаўчымі. Каго ж я тады чытаю? У нас даўно ніхто ня піша так — па вялікім рахунку, — як Адамовіч у апошніх сваіх творах. А выглядае, што тыя гэтага не заўважаюць, а тыя наагул ніколі ня чулі. Куды ж ён праваліўся? Пытаньне змушае пільней углядацца ў тэктанічныя расколіны, што ўтварыліся пасьля распаду савецкай літаратурнай імпэрыі.

Гэта яшчэ адзін плюс, што ягоная новая кніга выходзіць амаль празь дзесяць гадоў пасьля сьмерці. Як мінімум, аўтар нагадае пра сябе. Але мне думаецца пра большае — ён вернецца. Можа быць, у крыху іншым выглядзе, у зьмененым вобразе. І зьмена пачнецца з мовы.

Уявіце сабе беларускага пісьменьніка і навукоўца, знаўцу літаратуры, для якога беларушчына (мова, прырода, людзі) — свая ад нараджэньня, уявіце, што піша ён пра сваю радзіму,

вёску, вясковых людзей — у хаце, у лесе, у полі — у беларускім краявідзе, выслоўлівае іхныя пачуцьці-перажываньні, але робіць усё гэта — на іншай мове. Чаму так атрымалася? Некалі, яшчэ ў савецкія часы, я думаў, што паміж Быкавым і Адамовічам тут існуе нейкае спаборніцтва. Абодва ваенныя пісьменьнікі, шырока прызнаныя і шанаваныя, блізкія ў сваіх поглядах на шмат якія зьявы жыцьця, але адзін упарта піша па-беларуску, а другі — наўмысна па-расейску, і вось — хто ўрэшце пераможа, здабудзе найбольшы літаратурны посьпех. Сёньня такія думкі выглядаюць наіўнымі, але калі іх усё ж працягваць, дык бачым, які атрымаўся вынік. Быкава па-ранейшаму чытаюць па-беларуску і ў перакладах, а новая кніга з трох апошніх аповесьцяў Адамовіча на мове арыгіналу так і не зьявілася, выходзіць па-беларуску. Можа таму, што беларуская якраз і ёсьць мовай самага першага арыгіналу? Беларускі селянін у сваёй вёсцы, у лесе, у полі — зноў гаворыць, думае і перажывае так, як гэта зь ім адбывалася ў сапраўднасьці — гэта значыць па-беларуску. Пераклад тут выглядае як фармальнае прывядзеньне твораў у адпаведнасьць самім сабе.

Верагодна, сам Адамовіч сьведама падзяліў сябе на тры часткі, нібы жыў тры жыцьці адначасова. Дасьледчык беларускае літаратуры пісаў пра Гарэцкага і Чорнага па-беларуску, для ўнутрыбеларускага карыстаньня, савецкі празаік пісаў пра сваю радзіму для ўсесаюзнага чытача (у адной абойме з Айтматавым, Сулейменавым ды падобнымі папулярнымі тады пісьменьнікамі-нацменамі), змагар зь ядзернай пагрозай пачуваўся чалавекам сусьвету, тут ужо мова ня мела істотнага значэньня ўвогуле.

Але так было тады, у тым грамадзкім настроі, калі на ўсёй прасторы СССР у інтэлігенцкіх асяродках заканадаўцамі літаратурных павеваў выступалі “Литературка” і “Новый мир”. Сёньня ў Маскве бадай зусім ужо адышла мода на колішніх фаварытаў-нацменаў, але ані кроплі ня зьменшылася рэальная павага да аўтарытэтных творцаў іншых літаратур. Здавалася б дробязь, але радок “Перевод с белорусского” вельмі важны для ідэнтыфікацыі Быкава ў сёньняшнім расейскім часопісе. Вобраз прызнанага беларускага мэтра застаецца для расейца нязьменным. Захоўваецца вельмі важная дыстанцыя, якая не дазваляе і з Быкавым выраблять пасьпешныя пераацэнкі ды

дэвальвацыі, як гэта адбылося з многімі расейскімі кумірамі часоў перастройкі.
Можа быць, дзеля адпаведнасьці і зьберажэньня сапраўдных культурных скарбаў, трэба, каб такі радок зьявіўся і пад творамі Адамовіча. “Перевод с белорусского”. Гэта выглядала б як аднаўленьне гістарычнай справядлівасьці, выпраўленьне памылак, тым больш, пераклад гэтых трох аповесьцяў на беларускую мову не ўспрымаецца інакш як адваротны. Быццам Адамовіч і пісаў па-беларуску, пасьля пераклалі на расейскую, а пасьля — зноў на мову арыгіналу. І яшчэ адно “тым больш”. Тым больш, што радок “Пераклад з расейскай” пад гэтымі творамі, наадварот, дэвальвуе ўяўленьне пра аўтара ў вачох беларускага чытача, проста-ткі крадзе ў нас вобраз пісьменьніка.
Рэч у тым, што рэакцыя на згаданы радок у беларускага і расейскага чытача проціleглая. Расеец *a priori* адчувае павагу да твораў замежнае літаратуры, уяўляючы сабе тую дыстанцыю, якая не дазваляе з чужым прарокам-сучаснікам абыходзіцца гэтак фрывольна, як “можна” абыходзіцца са сваім. Варта толькі пачытаць, што сёньня ў Расеі пішуць пра свайго Солжа — гэта яны так Салжаніцына называюць. Што да беларускага чытача, дык тут усё наадварот. Уявіце, як бы вы чыталі раман Караткевіча, пад якім стаяла б “Пераклад з расейскай”. Адразу — цень непаўнавартасьці, другаснасьці, нянаскасьці.
Натуральна, у маёй прапановы знойдуцца і праціўнікі. Ёсьць пэўныя прынятасьці, ёсьць воля аўтара, нявыказаная, праўда, ёсьць акадэмічны падыход і маральна-этычныя нормы. Безумоўна, усё гэта ёсьць. Аднак я думаю пра актуалізацыю празаіка Адамовіча ў сёньняшнім часе, калі паняцьце расейскамоўнага пісьменьніка-нацмена адышло ў нябыт разам з краінай, у якой яно нарадзілася. Чытаем жа мы па-беларуску Гусоўскага або Чачота з Сыракомлем. Хіба гэты культурны выпадак тыпалягічна іншы? Калі Польшча яшчэ сяк-так дбае пра ўсерэчыпаспаліцкіх пісьменьнікаў, дык Расея пра ўсесаюзных — забывае.
Вяртаньне і па сутнасьці адваротны пераклад, напэўна, ніяк не пярэчылі б уяўленьням самога Адамовіча, які па-расейску выступаў рэпрэзэнтантам сваёй краіны і нацыі:
“Паводле беларускага паняцьця, дасавецкага, “кулак” — гэта

той, хто сьпіць на кулаку. *Упаў, дзе стаяў, запрацаваўшыся да бяспамяці, і не на падушку галаву, а на цьвёрды кулак — каб лішне не заспаць. Дзядзька Антон успамінаў, як абрабаваны "цьвёрдымі заданьнямі" стары, калі сын прыехаў да іх дамоў незадоўга ды высылкі, скардзіўся не на тое, што забралі і скаціну, і інвэнтар, і зерне, а што: "Вось глянь, якія рукі сталі, сорам на вуліцу выйсьці — як вітацца з чалавекам?" Мазалі-капыты сталі сыходзіць з далоняў, Мітрафан Тычына саромеўся такіх рук".*

"Госьці да нас заходзілі часта, бацька любіў, а мама ўмела тое, што называецца, "прыняць людзей". Гэта быў сапраўды сьвяточны дзень для нашых бацькоў — каб на стале было і каб людзі пайшлі, задаволеныя бяседай, гамонкаю, сьмехам. (Не выпадкова ў беларусаў застольле так і завецца: бяседа.)"

"Гаворкі з чужым сэрцам у сваіх грудзях — гэта па-новаму цікава. Ну, а ў мяне — старое, як сьвет: размова з уласным сэрцам. Менавіта такая пара "прыступіла" (як скажа беларус) і да мяне. Больш як год мінула..."

"Уся ісьціна ў тым, што памерці я хачу ў Беларусі, а ляжаць у Глушы. Там я зьвязаны з усім. Тут жа толькі ты. Гэта — для жыцьця. А для Вечнасьці — Беларусь."

Сьветапоглядна ў гэтых кароткіх цытатах Алесь Адамовіч — патрыёт свае бацькаўшчыны. Зьехаўшы ў Маскву, у тусоўкі тамтэйшых герояў перастройкі, перад сьмерцю вярнуцца ён пажадаў у Беларусь, якая — для вечнасьці. Так і атрымалася. Найперш яго не стае сёньня якраз беларускай літаратуры. Гэтак як сама мова можа быць запатрабаваная толькі беларусамі, так і Алесь Адамовіч дзеля далейшага свайго жыцьця ў творах можа быць запатрабаваны толькі беларускай культурай.

Словам, усё менш ён патрэбны там і ўсё больш тут. Патрэбны, бо тут ужо даўно гэтак ніхто ня піша.

Мой асабісты досьвед ранейшых твораў Адамовіча мае ў сабе мноства засьцярогаў — зашмат газэтнасьці пасярод прозы, таго, што актуальнае часова, зашмат натуралізму — спроба хоць гэтак пра вайну не дэклямаваць, а крычаць, роўма раўсьці, калі сказаць праўду не дае цэнзура. Вось яны з Клімавым і складаюць пад хлявом кучу аголеных трупаў. Каб хоць гэтак... У новай кнізе гэты фактурны максымалізм прападае. Зьяўляецца збалянсаваная проза. Адхіленьні ад сюжэтнае

канвы — ці то асацыятыўныя згадкі ці філязофскія развагі — толькі падтрымліваюць сюжэт. Аўтар думае на паперы. Гэты бок літаратурнае працы добра знаёмы кожнаму, хто да яе датычны. Калі сядаеш да стала толькі зь першай зачэпкай-фразай, выпісваеш яе, і тут нейкая нязнаная энэргія падказвае табе і працяг, і яшчэ працяг, далей-далей. Як падарожжа ў нешта нязнанае, дзе на кожным кроку адкрыцьцё, а за ім — новае.

Схаваўшыся за парай-тройкай наратыўных абзацаў, думка зноў выныpвае з новай развагай. Скажам, пра тое, што ня толькі мы разглядаем людзей на фатаздымках, але і яны пазіраюць на нас.

“Што гэта так — яны відушчыя, фатаграфіі *— я адчуў фізычна ў той момант, калі чакаў: вось-вось мяне знойдуць немцы, насьцігне аўтаматная чарга, буду ляжаць ля іх ног, запэцканы ўласнай крывёю, а яны з мае кішэні дастануць маміну фатаграфію, і* яна ўбачыць*... Я сьпяшаўся не запаўзьці далей, глыбей у кусты, а пасьпець, пакуль яны не зьявіліся, схаваць, закапаць у пясок кашалёк з фатаграфіяй.* Каб мама ня ўбачыла нічога гэтага.”

Ня дзіва, што большая частка развагаў у гэтых апошніх творах — развагі пра сьмерць. Расьцягнуты ў часе “любы момант” патрабуе гэтага і адначасова падказвае адкрыцьці. Напрыклад, пра тое, што на вайне кожнаму адведзена свая пэўная колькасьць шанцаў выжыць, або пра такую трапна падгледжаную зьяву, як сорам сьмерці:

“Сьмерць непрыгожая, усе кнігі, і фільмы, і опэры хлусяць, што яна бывае прыгожаю. Непрыгожы чалавек, які памірае і, галоўнае, ён сам гэта разумее ў тое імгненьне. А вось навакольныя часам не разумеюць гэтага і мучаць яго сваім неразуменьнем. Існуе сорам сьмерці*, я ў гэтым перакананы, сам перажыў. Часам ён мацнейшы за страх — сорам сьмерці. Многія маглі б расказаць. Ня нейкай там нізкай, подлай, здрадніцкай сьмерці (гэта асобная гаворка), а сорам сьмерці* любой*”.*

“Ванечка памёр у лясной вёсачцы (на паўшляху да лягеру). Не давезьлі. Мы ўсю дарогу падбадзёрвалі яго: вось прыедзем, там лекары, мігам паставяць цябе на ногі, табе не першыня! Але Ванечка ўжо апошні шанец зрасходаваў, і ён гэта ведаў. Глядзеў на нас нядобрымі вачыма аднекуль здалёк, як на тых, хто задумаў насьмяяцца, здрадзіў яму, на змоўшчыкаў.

Ванечка (мы ўяжджалі ў вёску) раптам папрасіў:
— Спыніце.
— Табе кепска, Ванечка, зараз чаго-небудзь цёпленькага табе.
— Адыдзіце, я зараз памру. Ну, прашу.
Мы, наадварот, — усе да яго, замітусіліся, бадзёрымі і, як заўжды пры чалавеку, які памірае, фальшывымі словамі спрабавалі — што? Угаварыць яго — не памірaць? Не казаць пра сьмерць?..
— Ды дактары цябе ўраз!..
— Ты яшчэ танцаваць будзеш!..
Мы адганялі ад сябе і ад яго страх сьмерці. Не заўважаючы, што ўжо апошняе — сорам сьмерці пачаў яго мучыць. Ванечка бездапаможна, крывячы, як дзіця, рот, заплакаў. Здавалася, таму, што мы ня цямім чагосьці, ня хочам яго паслухацца.
І раптам вусны пабялелі, закамянелі, рот раскрыўся, як яма...”
Адамовіч выступае дасьледчыкам сьмерці — сваёй і ўвогуле. Здаволіцца тым, што з канцом жыцьця канчаецца і ўсё наагул, ён ня можа. Працяг зямнога жыцьця дасьледуе прагматычна, больш давяраючы не вядомым клішэ, а статыстыцы, мэдыцыне: *“... Так, магчыма, што гэта ўсяго толькі (і шкада, калі так) падмена сапраўднай веры ў бясьсьмерце — мэдычнай вэрсіяй яе: усе гэтыя гісторыі пра жыцьцё пасьля жыцьця.* Life after life. *Расказаныя людзьмі, якія пабылі ў стане клінічнай сьмерці. Але як хочацца ў гэта паверыць: пралятаеш па тунэлі-трубе сьмяротнага жаху і адзіноты і раптам — вырываесься, цябе абдымае незямное сьвятло, сустракаюць, да цябе вярнуліся тыя, каго страціў, здавалася, навек. Перад кім заўсёды перажываеш пачуцьцё віны, бо менавіта ты* адпусьціў *тых, каго любіў. Ня ўсё зрабіў, каб затрымаць. Сустракаюць, каб табе ня страшна было. Сьвятло, добрае, нязвыклае, незямное любові сьвятло ўзгадваюць усе, хто пабыў там і вярнуўся. Ні пекла, ні раю, а вось такая сустрэча з самымі-самымі?.. А што калі ў ліку тых, хто сустракае* там, *і былыя нашы ворагі? Няхай ззаду, няхай за сьпінай тваёй мамы, бацькі, брата, сяброў... І што калі “пекла” (побач ці ўнутры “раю” той сустрэчы) — гэта ты сам, раптам сярод тых, хто любіць цябе, убачаны вачыма тых, хто цябе ненавідзіць. Што, калі гэта і ёсьць* бясконцае імгненьне пекла*? (Там роўнае вечнасьці ўсё.) Сустрэча з самім сабой — такім нягоднікам, такім паганцам, якімі нас бачаць, бачылі ворагі нашы (а мы — іх). Бо ж нават сьвятыя старцы перад канцом*

прасілі ўсіх, малілі дараваць ім”.
Вяртаньне Адамовіча дазваляе і нам пастаяць перад той Брамай вечнасьці і апошняе праўды. За апошнія сем гадоў інтэлектуальнае аднастайнасьці ды манатоннасьці так шмат павукоў завялося ў цесным пакоі беларускага інтэлектуалізму, так аплецена ўсё і ўся павуціньнем новых умоўнасьцяў і недагаворак, нейкай хвараблівай самацэнзурай. Беларусь, ад аднае згадкі якой, паводле Ніла Гілевіча, цяплее на сэрцы, усё больш — тая, што прыдуманая ў марах. А рэальная нацыя — сутыкнешся зь ёю — усё больш халодзіць сэрца, не разумее прыгожых утопіяў, а іншы раз дык і ўвогуле — якісьці калектыўны здраднік. Вось як гэта ў Адамовіча:
“У галовах нашага насельніцтва панаваў дзікі кавардак ад усіх падзеяў. Я ў вайну ня раз чуў, як заводзкія паліцаі з гарачлівасьцю даваенных актывістаў лаялі “кулакоў”, “куркулёў” вясковых. Дзе, як не ў падвалах НКВД, ішлі рэпэтыцыі, браліся ўрокі таго, што вычваралі потым “нашы людзі” ўжо ў падвалах нямецкіх “службаў бясьпекі”, СД і гестапа? Ну, а вышукваць, знаходзіць і сыгналізаваць аб “ворагах” (сёньня — контрарэвалюцыянэрах, “кулаках”, заўтра — камуністах, габрэях, партызанах) — гэта проста-ткі ўбівалася ў людзей. Столькі гадоў”.
У больш лібэральным выглядзе тое ўбівалася і пасьля вайны, і таму не прапала. Няштатныя сябры КГБ, таптуны ўсякія сёньня дадаюць масавасьці мітынгам і дэманстрацыям апазыцыі. Колькі іх па ўсёй Беларусі? Дзясяткі ці, можа, сотні тысяч? Азначэньне “нашы людзі” Алесь Адамовіч бярэ ў двукосьсе. Можна толькі ўявіць, колькі такіх цяпер працуе ў беларускай апазыцыі ды ўсялякіх недзяржаўных структурах! Адной масай сваёй яны здольныя застопарыць любы поступ і працэс. Натуральна, няма сэнсу з падазронасьцю ставіцца да кожнага чалавека. А як адрозьніць? Можна аналізаваць паводзіны і словы. Праўда, у сёньняшнім надта ж стракатым нашым сьвеце іншы раз здаецца, што каго заўгодна можа панесьці куды заўгодна, а таму гэткі аналіз — марная справа. Ёсьць больш пэўны спосаб. Назаву яго псыхалягічным вычуваньнем. Выхоўваецца яно якраз такімі вось творамі нацыянальнае літаратуры, як у новай кнізе Алеся Адамовіча. Побач з псыхалягічнымі партрэтамі народу ўсякага аўтар дае вельмі выразныя вобразы здаровага душою беларускага чалавека —

зусім тыповага і тады, на вайне, і цяпер. З гэткіх вобразаў і фармуецца агульны вобраз Беларусі.
Вось, падумалася, што такое і дзеля чаго нацыі патрэбная свая літаратура — каб лепей разумець сябе і тады з большым посьпехам вяршыць свой лепшы лёс. Найбуйнейшыя беларускія празаікі-псыхолягі ўсе нібы і існуюць якраз дзеля гэтага. Гарэцкі, Чорны, Мележ, Быкаў і вось цяпер — Адамовіч.
...Сэрца білася-білася і перастала. Лекары так і сказалі яму: у любы момант сэрца можа спыніцца. “Любы момант” цяпер і азначаў — жыцьцё. Жыцьцё пасьля жыцьця. Выйшла так, што “любы момант” расьцягнуўся на цэлы творчы пэрыяд, і тое, што ў гэты пэрыяд было створанае, цяпер можа быць запатрабаванае — у любы момант. Колькі яго адведзена ўсім жывым.

III

Кніга апошніх твораў і апошняе шчырасьці пісьменьніка мусіць зьмяніць ягоны звыклы вобраз, які сфармаваўся ў крытыкаў і публікі. Маю на ўвазе найперш нэгатыўныя стэрэатыпы, маўляў, Адамовіч не празаік, а публіцыст, Адамовіч састарэў, Адамовіч — не беларускі літаратар. Якраз у апошніх сваіх творах, на маю думку, пісьменьнік разбурае такія меркаваньні пра сябе.
Шэсьцьдзясятнікаў, або дзяцей XX зьезду, і сёньня папракаюць у тым, што ў душы яны былі “ідэальнымі сацыялістамі”, лічылі, што гэта Сталін завaліў добрую справу сацыяльнага вызваленьня, распачатую Леніным. Многія зь іх засталіся пры гэткіх пераканаьнях і сёньня, але ня тыя, у кім падлеткавая страсьць раскалупваць фантомы была закладзеная ад прыроды. У ідэалёгіі няма аб’ектыўных ісьцін і сьвятынь. За зьнішчаным Сталіным адкрываўся від на яшчэ некранутага Леніна — і цяпер ужо ён стаяў перашкодаю на шляху спазнаньня чалавечае нармальнасьці і маралі. У аповесьці “Vixi” Адамовіч піша:
“Ад “старога сьвету” (ужо старога савецкага) нам засталіся героі: Паўкі і Паўлікі, Алегі і Зоі. Сярод іх і беларуска-савецкі “бацька Мінай”. Чалавек, які не памяняўся лёсам са сваімі дзецьмі, як прапаноўвалі яму, партызанскаму камандзіру, нядобрыя немцы, не прыйшоў зь лесу, і дзяцей расстралялі. З усіх прапагандысцкіх сіл узьвялічвалі яго “подзьвіг”, да амаль

антычных вяршынь. “Агульнае” паставіў вышэй за “асабістае”, тым больш што фашысты ўсё роўна дзяцей ня выпусьцілі б і г. д. і да т. п. Але нешта не сыходзілася, не атрымлівалася зь яго антычнага героя: тыя ж маглі пайсьці супраць волі цара, а то і багоў, каб толькі выканаць абавязак перад роднай крывёю. Няшчасны савецкі бацька, савецкі камандзір, які добра разумеў: могуць і свае расстраляць, калі праявіш “слабасьць”. Герой-то ты герой, але раптам вырашыш выкупіць жыцьцё дзяцей і сваё там, у ворагаў, за кошт партызанскіх таямніц, сакрэтаў.
Бацька не прыйшоў да дзяцей, не паспрабаваў выратаваць іх”.
Адамовічава прыдумка — “звышлітаратура” — назаўсёды засталася ў эпосе гарбачоўскае перастройкі. Верагодна, тамсама застаўся і стэрэатып “мастацкасьці”, які раўніва адстойвалі яшчэ рэдактары прозы беларускіх позьнесавецкіх часопісаў. Цяпер такі папрок не гучыць актуальным. Прынамсі, ён не выглядае абавязковым. “Кінасцэнарная” мова, публіцыстычныя і мэмуарныя ўстаўкі за апошні час вырабіліся ў іншую, сваю постмадэрную паэтыку. Называй мы гэта літаратурай ці нелітаратурай, усё ж, мабыць, не ў паэтыцы справа, а ўва ўменьні выславіць да цябе не выказванае. Найцяжэйшая задача, якую Алесю Адамовічу давялося вырашаць у ягонай апошняй кнізе — гэта “дайсьці да мацерыка”, да астачы сваёй уласнай савецкасьці — зразумець і ацаніць яе. Рэдкі ці нават адзінкавы прыклад сучаснага самааналізу, прынамсі, у беларускай літаратуры:
“У пасьляваенных “органах” апынулася нямала былых партызан. І наш адзін — Мікалай С. Ад яго я шмат цікавых рэчаў пачуў і пра сябе таксама.
— Чаму маё начальства так цябе ня любіць? — пытаў Мікалай.
— А ня любіць?
— Гэта дакладна. Па-першае, кажуць: не савецкі чалавек.
І другое: ён нас ня любіць, органы.
Зь іншым я спрачацца ня стаў бы: забілі, замучылі, падставілі пад кулі кожнага трэцяга жыхара велізарнай краіны, а вы іх любіце! Крыўдуюць. Але вось: савецкі, не савецкі — гэта трэба было яшчэ даказаць. Калі быў, заставаўся “савецкім”, а калі перастаў ім быць. Ува ўсякім выпадку, калі бацька, вярнуўшыся з арміі ў Глушу, раптам задумаў і пачаў будаваць уласны дом (ня жыць жа вечна па закутках у аптэцы!), я зьдзівіўся:
— Уласны? Дык хутка ж камунізм!

Самае дзіўнае, што ня ўсё было жартам, была доля зусім шчырага перакананьня, чаканьня: мы ж перамаглі, цяпер усё адолеем, зможам!
Ну што, хіба ня цалкам савецкі (ідыёт)? Дом бацькаў, намі дабудаваны, стаіць, можаце пераканацца, у Глушы. Ну, а камунізм на адной шостай... Тут была яўная недапрацоўка і саміх органаў. Больш рашуча з намі трэба, больш крута. Каб аніякіх адліг, аніякіх перабудоваў. Народ наш па-добраму не разумее, тут жа робіцца нахабным. Вось і мы — у раньнехрушчоўскія часы. Нас стараліся паклікаць на дапамогу, каб разам “паляпшаць сацыялізм”, у адной запрэжцы з органамі, а мы, хаця і марылі аб палепшаным, але каб бяз органаў, без такіх, прынамсі, а калі зь імі, дык бяз нас”.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 29-07-2001
[image]

Сяргей Дубавец

Апошняе слова Алеся Адамовіча

СЯРГЕЙ ДУБАВЕЦ галоўны рэдактар газэтаў "Свабода" (1990-1991), "Наша Ніва" (1991-2000), вядучы аўтарскай перадачы "Вострая Брама" на Радыё Свабода. Літаратурны крытык, аўтар кнігі эсэістыкі "Дзеньнік прыватнага чалавека" (БГАКЦ- Эўрофорум", 1998), укладальнік кнігі Алеся Адамовіча "Vixi", падрыхтаванай да друку ў

I

У выдавецтве “Наша Ніва” завяршаецца праца над новай кнігай Алеся Адамовіча. Аснову выданьня складаюць тры апошнія аповесьці аўтара — “Вэнэра”, “Нямко” і “Vixi”.

Крыху больш за дзесяць гадоў мінула, як ня стала нэнзуры. Крыху менш за дзесяць гадоў, як ня стала Адамовіча. Паміж гэтымі “больш” і “менш” — невялікі зазор часу, калі й пісаліся згаданыя творы. Прызнаны літаратар з іміджам праўдалюбца мог разьлічваць, што будзе апублікаванае кожнае яго нае слова, і, натуральна, імкнуўся да-казаць, а значыць і да-асэнсоўваць тое, што раней да-казваць і да-асэнсоўваць было немагчыма. (Праўда, першыя павевы свабоды шмат каго і расслабілі. Маўляў, калі можна гаварыць усё, дык ужо й ня так гэта важна. Сьледам прападала і ранейшая дысцыпліна думкі, энэргія творчасьці. Іншыя ўспрынялі свабоду як чарговую аддігу і засьпяшаліся выказаць недаказанае. У Адамовіча выбару не

было. Інфаркт і дыягназ хуткае сьмерці выводзіліяпонскай працу над апошнімі творамі за межы тагачаснае рэчаіснасці і"Вокнаў сяты то адлігай, ці то свабодай.) **Брама".**

Аднак выйдзе ў сьвет ягоная апошняя кніга толькі зараз, празь дзесяць гадоў. (Магчыма, гэта значыць, што мы, сёньняшнія выдаўцы, належым якраз да расслабленых той свабодай, што б ні казалі мы пра новую дыктатуру. Якраз у тыя часы мне здавалася непрымальнай расейскамоўнасьць Адамовіча, незразумелаю была амплітуда — ад аналізу твораў Максіма Гарэцкага і Кузьмы Чорнага да сутворчасьці з Данііламі Граніным і Элемам Клімавым.) Тое, што яна ня выйшла дзесяць гадоў таму, ніяк не адбілася на яе вартасьці.

Сёньня ўжо я разумею, што бяз гэтых твораў немагчыма будзе адэкватна ўспрымаць беларускую гісторыю мінулага стагодзьдзя, сучасны стан краіны, цяперашні літаратурны працэс. Рэзкі спад інтэлектуальнага ўзроўню беларускай гуманістыкі абумоўлены тым, што многае з зразуметага папярэднікамі пераасэнсоўваецца цяпер наноў і павярхоўна, часта з нуля, без уліку ранейшага досьведу.

Як рэдактара, мяне ў кнізе Адамовіча прывабілі дзьве рэчы. Па-першае, я разумеў, што на зломе апошніх гадоў са сьценаў беларускага дому павыпадалі цагліны, безь якіх ва ўсім гмаху робіцца няўтульна. Вось жа адна з такіх цаглінаў адкрылася майму позірку. Па-другое, — прызабытае пачуцьцё, калі чытаеш творы сучасьніка і табе перадаецца жаданьне ствараць таксама. Гэтае пачуцьцё ўзьнікае ад амаль культавага стаўленьня да літаратуры, да літаратурнае творчасьці. Гадоў 10—15 таму гэткае пачуцьцё панавала і ў нашых асяродках. Было нясьцерпна важна пачуць новы верш ці прачытаць п'есу калегаў, а то й самому ноч-другую праседзець, перадаючы на паперы вобраз ці настрой. Як усё ж даўно няма гэтага захапленьня і як даўно не ўзбуджаюць яго ў табе творы сучаснікаў! І рэдагаваньне — як даўно з сутворчасьці ператварылася ў выпраўленьне непісьменнасьці! Вось жа Адамовічавы аповесьці вярнулі тое забытае пачуцьцё.

Аповесьць "Vixi" — сьведама недапісаная кода. Аўтар ведае, што неўзабаве памрэ і занатоўвае свае думкі, а таксама згадвае дзяцінства. Дзьве другія аповесьці — "Вэнэра" і "Нямко" — пра вайну і пра вёску. Але пасьля ўсяго напісанага пра вайну і пра

вёску — у тым ліку і самім Адамовічам — яны раптоўныя. Гэта Адамовічава рыса па-над усім ранейшым досьведам беларускай літаратуры. Самыя апошнія высновы. Напрыклад, пра падсьведамую нецярпімасьць да іншага, спраўнейшага, багацейшага, акуратнейшага. Прычым нецярпімасьць — на паражэньне.

У Адамовічавай “Вэнэры” аўтар выяўляе гэтае пачуцьцё ў партызанах. Яно як бы і незлаблівае, але разам з тым імгненна гатовае разьвіцца ў вялікую вынішчальную сілу.

“... Вэнэрын бацька і хадзіў па вуліцы, і пазіраў, і вітаўся так, што зь міжвольнай павагай-цікаўнасьцю азірнесься на яго. А ўжо дома ў яго тым больш: ногі абавязкова выцераш ля парогу. Ды ня надта мы да яго зазіралі, шарагоўцы-партызаны. Вечна нейчы конь пад сядлом навязаны да плоту Станкевіча. Які-небудзь камандзір гасьцюе. Моцны мужык — Станкевіч. Хітраван. Куркуль. Кулак. Словы гэтыя, ахвотна вымаўленыя, ніяк, зрэшты, не падрывалі нашай да яго павагі. Даравалася яму многае, нават багацьце — за дачку.”

Дачка-прыгажуня Вэнэра — галоўная гераіня аповесьці.

“А неяк чэпэ здарылася: нехта палазіў каля вульляў Станкевіча. Называецца: павязаць пчолак. З патрону выломваеш кулю, запалку да патрону, патрон да лаза — ш-шух! Душагубка для пчол. Адчыняй вечка і, не баючыся джалаў, гаспадар, як фашыст. Але ня можа быць, каб гэта з нашага атраду. Пэўна нейкія чужакі пашарылі. Носава віншавалі: во як памацалі твайго цесьця! А ён нават задаволены, радуецца — чаго толькі: віншаваньням альбо што Станкевіча раскулачылі? Гэткія гісторыі нас усіх чамусьці забаўляюць. А, недаспадобы? Прыйшлі, вярнуліся ў лягер уначы, у зямлянцы сьпяць упокат, аднаму, другому з усяго маху па задніцы — падскоквае, як шалёны. А, недаспадобы?! У гэтым уся весялосьць: каб чалавеку не падабалася.”

Аўтар нібы зноў усяляецца ў сьведамасьць таго 16-гадовага сябе, каб лепей зразумець сутнасьць гэтага часу і партызаншчыны. Для гэтага даводзіцца ні ў чым не выгароджваць і не прыхарошваць таго, 16-гадовага. А выглядае ён сапраўды не героем, хутчэй нейкім ціхім, затоеным шкоднікам.

Не адзін раман датуль Адамовіч прысьвяціў партызанам. А тут — бяз зносак на цэнзуру, савецкую ідэалёгію і грамадзкія

прынятасьці — сьпяшаецца даць выверануюхарактарыстыку партызаншчыны. Такую, каб не падлягала ўжо пераацэнкам у залежнасьці ад зьмены ідэалёгіі. Каб была простая праўда.
“Вось такія справы! — хочацца паўтарыць усьлед за аўтарам “Бойні нумар пяць”. Такія вось пірагі. Гарачыя, апячэсься. У амэрыканскага немца Курта Вонэгута вычытаў я і яшчэ адну думку, хоць забіце, але яна і мая ўласная: пра мінулую вайну як пра крыжовы паход дзяцей. Яна, на жаль, скарыстана, зрасходавана на амэрыканцаў, што ваявалі ў Эўропе. А як бы спатрэбілася для нашай партызаншчыны. Вось ужо дзеці дык дзеці! А дзе дзеці, там і жорсткасьць. Асаблівая, дзіцячая.
У нас нават камандзіры атрадаў, брыгад былі найбольш дваццацідвух-дваццацітрохгадовыя. Ва ўзводах — школьнікі, нядаўнія школьнікі. Былі і барадачы, “дзяды”, але няшмат, як бы спэцыяльна для дакумэнтальных кінастужак, фатаздымкаў, каб ня крыўдзіць тых, хто менавіта такімі ўяўляе “народных мсьціўцаў”.
... У атрадзе нашым было каля 600 чалавек. Гэта ў 1943 годзе. Складаўся ён з каго (досыць тыпова для Беларусі)? Працэнтаў 10 — былыя акружэнцы, яны ж нашы камандзіры, штабная публіка. Столькі ж, бадай, былых “дабравольцаў”, “уласаўцаў”. Гэта ўсё наш армейска-кадравы склад, баявы касьцяк атраду. Акружэнцы партызанілі з 41-га, “дабравольцы” — зь вясны 42-га. І тыя, і другія як бы арыстакратыя наша, “старыя партызаны”. Хаця непрыкметны падзел між імі заўсёды існаваў: ніводнага “ўласаўца” не было ў штабе, а калі “ўласавец” камандзір, дык не вышэй чым узводу. І наагул грахі вольныя ці міжвольныя не дараваліся. Злучыліся з арміяй — і большасьць іх, не пытаючыся, хто як партызаніў, адправілі ў штрафныя роты...
Гэта я пра камандзіраў казаў. Ну, а наступная паводле значэньня і павагі катэгорыя партызан — “дзяды”, ува ўзводах баявых і пры гаспадарчым узводзе. Іх ня больш за 3—5 працэнтаў.
Ага, не забыцца пра былых паліцаяў, іх таксама працэнтаў пяць.
Наагул працэнтаў 35 — ня мы. Астатнія — мы, школьнікі. Зь вёсак, з рабочых пасёлкаў, як наша Глуша, з райцэнтраў, мястэчак. Былі і гарадзкія, але ім больш складана трапіць у партызаны, дабрацца да нас. Там у іх заводзіліся “маладыя

гвардыі", у Беларусі — у кожным гарадку, а ў вялікіх гарадох — амаль на кожнай вуліцы. Так што і ўся рэспубліка беларусаў у вайну — крыжовы паход дзяцей.
Вось такія ў нас справы школьныя, Курт!"
Вось такія справы... Дзеці, дзеці. У нас і цяпер, здаецца часам, палітыкі, як дзеці, — з абодвух бакоў. Крыўдлівыя, інфантыльныя, нямудрыя яшчэ зусім. Ну ніяк ня ўгледзець спаміж іх *сваіх абаронцаў*. Як і ў тых партызанах.
Гэта пераважна пра стыхійную партызанку, самую масавую. Былі ж яшчэ і "асобыя атрады", засланыя ў Беларусь з Масквы. Калі праўду, дык поўную праўду. Няма больш куды адкладаць Алесю Адамовічу.
Вёску прыгажуні Вэнэры, якая давала прытулак партызанам, зьнішчыў "асобы атрад" НКВД. Партызаны вяртаюцца з чарговага рэйду і такі паміж імі завязваецца дыялёг:
"— А праўда, што гэта спэцатрад тут дзейнічаў? — пытае Навічок. (У хлопца ёсьць прозьвішча, імя, але для нас ён проста Навічок: усяго толькі два тыдні, як прыбег з Бабруйску.) Злавеснае наша маўчаньне Навічку анічога не сказала, упарта дамагаецца адказу:
— Кажуць, што яшчэ да немцаў тут нашы былі, нейкі атрад спэцыяльны...
— Табе гэта ня немцы расказвалі? — пытае Рамановіч. Вунь якія жорсткія вочы могуць быць у нашага камандзіра. — ... Не балбачы, чаго ня ведаеш. Чуў звон!
Мы згодныя з Рамановічам. Пра гэта ня трэба. Мы таксама ведаем. Але пра гэта ня трэба. Ні ведаць, ні помніць ня хочацца".
Ведаць і помніць ня хочацца, але ведаецца і помніцца. Зразумела, што трэба распавесьці пра гэта, прычым найхутчэй, хоць бы і праз 50 гадоў пасьля вайны. Бо гэта праўда. Таму пасярод аповесьці Алесь Адамовіч згадвае сваю з калегамі працу над кнігай "Я з вогненнай вёскі":
"*Нам жанчыны расказваюць, старэнькія, ім ужо за 70, магнітафон запісвае:*
— Прыехалі й кажуць: ідзіце ў лес, немцы хутка будуць у вас... А людзі, зіма ж, мароз, куды ж ім у лес ды ў каго шмат дзяцей. Не паслухаліся некаторыя. Дык яны назаўтра вярнуліся, і тых, хто ў лес ня выехаў, ажно дзевяць сямеек, — усіх пастралялі...
— Чакайце, гэта хто былі?

— Ды хто, партызаны, мы ж кажам. Спэц... гэты атрад — яны сябе называлі. Восемдзесят ці колькі душ, ды зь дзеткамі пастралялі... Вы, кажуць, немцаў чакалі, вы не савецкія людзі. Камандзір іхны, як яго... Калайджан, чорны такі, вочы такія, усё крычаў: “Вы — паліцэйскія лазутчыкі, вы ворагі народу, здраднікі!”

Ад мясцовых партызан мы тое самае чулі. Спэцыяльна распытвалі ў іншых вёсках. І ўсё-ткі не далі ў кнігу. Можна растлумачыць: гэтага нізавошта б не прапусьцілі, 70-ыя гады. Праўда, але з адной агаворкай. Касэту мы самі сьцёрлі, запісалі на ёй іншы расказ у другой вёсцы, дзе забівалі ўжо сапраўды немцы. Першая думка, пачуцьцё наша (усе трое да таго ж былыя партызаны): ды калі прагучыць гэты выпадак, усе астатнія нашы запісы, нашы “вогненныя вёскі”, дзе немцы і паліцаі “працавалі”, нехта паставіць пад сумненьне. А ці ня іх, такіх вось “спэцатрадаў”, справа — вашы Хатыні.

Які быў расклад рэчаў у тыя дні: альбо — альбо. Калі і вашы “органы” — зьвяр’ё, значыць, як бы апраўданьне нямецкім карнікам. Сьцёрлі магнітную стужку — факт...

Мой суаўтар па кнізе “Я з вогненнай вёскі” Янка Брыль спэцыяльна адшукваў сьляды гэтага Калайджана. Па музэях ды публікацыях. Выявілася: прысланы быў з Масквы, бо ў 1942 годзе “камандзіраў не хапала”. (Ды й ня вельмі давяралі акружэнцам: з НКВД — надзейней.)

Ваграм Пагосавіч Калайджан, старшы лейтэнант, — вось ён і расстраляў на Віцебшчыне вёску Дуброва. Потым яго адклікалі ў Маскву. Паводле афіцыйнай вэрсіі: судзіць. Паводле пераканаьня мясцовых партызан: уцёк сам, за ім ужо палявалі мясцовыя хлопцы. Прынамсі, ніякой за сабою віны не прызнаваў, а наадварот, крыўдаваў (пасьля вайны ўжо), выпрошваў узнагароду.

Тое, што адбылося ў нашай мясцовасьці — ува Ўюнішчах, ну, — проста-такі сьпісана з Калайджана. І таксама — “спэцатрад”.”

Той спэцатрад расстраляў у вясковым рове жыхароў, якія спрабавалі ўцячы ад нямецкае “акцыі”. Спэцатрад зрабіў сваю справу і сышоў. Прыйшлі немцы і ўсіх астатніх сагналі ў хлеў і спалілі. У тым ліку Вэнэрыну матку, брата і сясьцёр. Сама яна, абпаленая, выжыла. Потым *свае* партызаны, сустрэўшы яе ў лесе, не пазналі колішняй прыгажуні, адабралі ў яе каня — усё,

што засталося ад былое гаспадаркі. Потым быў канец вайны, і ў яе доме — адзіным ацалелым ад вёскі — зрабілі калгасную кантору. Сама яна жыла ў бакоўцы, на печцы, куды нападпітку бясконца лазілі заежджыя ўпаўнаважаныя. Нарабілася ў Вэнэры дзяцей. Урэшце, нават пакладзістым сваім норавам яна не дагадзіла пастаяльцам і прыпісалі ён крадзёж з калгаснага поля шасьці бульбін, за што, ужо пасьля сьмерці Сталіна, атрымала яна 6 гадоў Гулагу і назаўсёды зьнікла з поля зроку ўсіх, хто яе ведаў, у тым ліку і аўтара аповесьці.

Як і Васіль Быкаў, Адамовіч гоніць свайго героя па балатах, праз падпаленыя хлявы і расстрэлы — ад вечнае пагоні — ня тых, дык гэтых, ня немцаў і паліцаяў, дык партызан і “спэцатраду” — гоніць праз усе магчымыя й немагчымыя пакуты ды катаваньні — да сьмерці. І да высокага сэнсу, які адкрываецца, паўстае з гэтых твораў: не было ў тую вайну для беларуса сваіх, не было свайго боку, свайго інтарэсу. Гэта чужая вайна жорнамі прайшла-праехала па хрыбціне беларускага чалавека. У гэтым сэнсе філязофія Адамовіча і Быкава — адна, дакладней, да адной яны ўзыходзяць філязофіі. Два найглыбейшыя псыхолягі і сьведкі ўздымаюць нас да гэтае праўды. Большае праўды, мабыць, ужо ня будзе. Бязь іх, верагодна, не было б і гэтай.

Чытаючы пра ўсю тую нялюдзкасьць, увесь час спрабуеш сканструяваць хоць нейкую альтэрнатыву — ну, хто мог бы тут абараніць, хто мог бы выступіць сваім?

Самая простая выснова — вінаватая зброя. Чалавек бяз стрэльбы — найчасьцей ахвяра, і міжволі салідарызуецца з такім самым, але варта яму ўзяць зброю і гэта ўжо зусім іншы чалавек. Але ж у тым і рэч, што мы гаворым пра абаронцу, якога можна было б прызнаць за свайго. А які на вайне абаронца бяз зброі?

Алесь Адамовіч не аднойчы заўважае, што ўвесь ягоны матэрыял — дакумэнтальны. Ён шукае ў сваёй памяці або ў аповедах іншых таго свайго абаронцу для Вэнэры і многіх тысячаў падобных да яе вясковых проста людзей, людзей бяз зброі. У выніку зьяўляецца яшчэ адна аповесьць — “Нямко”. Абаронцам беларускае вёскі ў гэтым дакумэнтальным расповедзе аказваецца немец.

“Штурмбанфюрэр уласнаю асобаю меў палітычную суразмову з малодшымі афіцэрамі, а тыя — з салдатамі: як паводзіць сябе

на гэты раз, у гэтай вёсцы. Аніякіх пагроз і канфіскацыяў, за паслугі дзякаваць і нават плаціць, сьмела ўступаць у асабістыя кантакты — усё, як у цывілізаванай краіне. А калі надыдзе дзень акцыі (аб чым будзе ў час паведамлена), усіх гаспадароў свайго дому ліквідаваць, дом і ўсе пабудовы падпаліць. Словам, далей дзейнічаць, як і ў іншых вёсках."

Маладзенькаму нямецка-фашысцкаму захопніку Францу глянулася такая ж маладзенькая гаспадыня хаты Паліна. І вось у час экзэкуцыі, калі ў іншых хатах гансы з гергардамі пачынаюць расстрэльваць сваіх гаспадароў, ён расстрэльвае свайго напарніка — дасьведчанага экзэкутара — і разам з Палінай і яе маткай хаваецца ў падзямельлі. Пакуль дагарае расстраляная і спаленая ягонымі таварышамі вёска. Пасьля адыходу немцаў яны ўтраіх выбіраюць на пажарышчах косткі згарэлых людзей і хаваюць іх.

Сярод матывацыяў Франца няма пажады, няма яшчэ і вялікага каханьня. Проста чалавек у ім загаварыў. Неасэнсавана так залапатаў у выхаванцу гітлерюгенду, і ён выступіў абаронцам і для Паліны, і для яе маці, і для ўсёй беларускай вёскі. Можна толькі ўявіць, што чакала гэтую парачку — Паліну і немца — наперадзе. Трэ было хавацца ад любога ўзброенага чалавека. Адамовіч узнаўляе ўсю іхную горкую адысэю. Вайна завяршаецца ў лягеры сьмерці ў Азарычах. Пасьля вайны не лягчэй. Усё ж, зашыўшыся кудысь у палескую пушчу, яны выжываюць.

Яны выжываюць разам з усімі, каму ў тую вайну ўдалося выжыць. Гэта значыць, з тымі, хто нарадзіў сёньняшняе жыцьцё ў Беларусі і чыёй сьвядомасьцю гэтае жыцьцё абумоўленае. Чытаючы ў Адамовіча дакумэнтальныя гісторыі рэальных беларускіх людзей і цэлых вёсак, раптам вельмі добра разумееш, чаму сёньня так трымаюцца людзі за тое, што маюць, ня хочучы ніякіх там рэформаў, пераменаў, дзяржаўнасьцяў-незалежнасьцяў. Толькі б было так, каб не расстрэльвалі, не палілі жыўцом, не прыніжалі самым нізкім прыніжэньнем, не забівалі сваякоў, ня страшылі па начах сваімі наездамі — толькі было б як цяпер. Хай і голад, і холад, і нават сьмерць, але толькі па-людзку, як цяпер. Яны зьведалі такое беспрасьвецьце, што ўжо ў генах у іх той жах, як і радасьць зь цяперашняга, сапраўды ж у параўнаньні сьветлага жыцьця. Калхозны зьдзек яны церпяць, бо гэта ў параўнаньні ўжо зусім і

ня зьдзек. А чаго яшчэ большага хацець, калі зьведаў забойства бацькоў ды дзяцей, — у цябе на вачох. Калі сам цудам выпаўз. Цяперашняе жыцьцё мае назву калі ня шчасьце, дык не-кашмар. Не-кашмар, можа быць, нават больш чым шчасьце.
Адна думка мне прычапілася — а што ж іншыя народы-нацыі, хіба не перажылі ўсяго гэтага? Чаму яны сёньня так складна жывуць? А ў Беларусі яшчэ толькі на транспарантах ды платах пішуць гэтыя пажаданьні пра незалежнасьць, дэмакратыю і свабоду. Ці нам дасталося болей, чым іншым? Ці мы сапраўды як нацыя — яшчэ дзеці, да сьмерці перапалоханыя мінулай вайною і сталінскімі экзэкуцыямі?..

II

Сэрца білася-білася і перастала. Лекары так і сказалі: у любы момант сэрца можа спыніцца. “Любы момант” цяпер і азначаў — жыцьцё. Ці ён усяго толькі імгненьне, ці месяц, ці год — гэта ўсё адно “любы момант”. Кожная хвіліна. Жыцьцё пасьля жыцьця. Час, адведзены на тое, каб яшчэ пасьпець стаць, адбыцца, давыказаць тое, што раней не давалася, дарабіць тое, чаго пасьля цябе не даробіць ніхто.
У Алеся Адамовіча “любы момант” расьцягнуўся ў часе ў асобны творчы пэрыяд, можа быць, самы ясны, а можа і самы плённы. Усё, што перашкаджала раней звонку і ў сабе, адышло. Разьвеялася вакол задушлівая атмасфэра савецкай цэнзуры, сьціхлі або ператварыліся ў пустое зьвяганьне некалі страшныя ідэалягічныя прысуды. Перад вачыма адкрылася брама вечнасьці. Каля яе думкі больш ня склейваюцца ў стылістычныя спайкі з эпікі, лірыкі ды публіцыстыкі, што так замінала колісь і за што папракала крытыка. Справядліва ці не — няважна. Важна, што цяпер такое нагоды ў яе няма.
Сэрца зьлітавалася. “Любога моманту” хапіла на тры творы. Адамовіч дапісвае аповесьць “Вэнэра”. Пачынае аповесьць “Vixi” — мудры такі расповед пра тых і тое, што згадваецца зь дзяцінства, нібы наўмысна нетаропкі і падрабязны. Недзе тут, у гэты самы пэрыяд, знаходзіцца час пачаць і закончыць яшчэ адну аповесьць — “Нямко”, на маю думку, самы празаічны і з празаічных найбольш дароблены твор пісьменьніка.
Памежны стан, у якім напісаныя гэтыя творы, нагадвае пра іншае, далёкае, але з такім самым настроем складзенае чатырохрадкоўе:

Ў краіне сьветлай, дзе я ўміраю
у белым доме, ля сіняй бухты
я не самотны, я кнігу маю
з друкарні пана Марціна Кухты.

...Інтэрнэт-пошукавік “Яндэкс” паказаў, што на масавым узроўні ў Расеі Алеся Адамовіча пакрысе забываюць. Ён выдаў некалькі старых згадак пра “Мэмарыял”, пра тое, як Сяргей Кавалёў з павагі да пісьменьніка ўзяў сабе мянушку Алесь. Ёсьць абоймы-сьпісы шасьцідзясятнікаў, найчасьцей тых, каго ўжо няма сярод жывых. Часам зьяўляецца ягонае прозьвішча ў зьвязку з гарбачоўскай перастройкай. Вось, па вялікім рахунку, і ўсё. Гісторыя, палітыка... Ніякай уласна літаратурнай размовы няма.

Мне падумалася — а хто ён для іх, сёньняшніх? Пісьменьнік? Тады дзе ягоныя абароцістыя мэнэджэры, літагенты, спонсары ды куча іншае брацьці, безь якой цяпер паэт у Расеі — меней чым паэт? Ягоныя крытыкі і знаўцы толку ў ім таксама даўно выйшлі з моды разам з тою эпохай. Ну хто цяпер сур’ёзна будзе чытаць пра ядзерную пагрозу? Праехалі...

Дзеля пэўнасьці зазірнуў яшчэ ў глябальную і ўва ўсім дасьведчаную “Брытаніку”. Няма там нашага Адамовіча ў артыкулах пра расейскую і савецкую ці постсавецкую літаратуру. “Брытаніка” на мой запыт адкрыла тэкст пра беларускае пісьменства, дзе шмат Алесяў, але іншых. Нават Толік Сыс там ёсьць, а Алеся Адамовіча няма. Чаму? Простыя тлумачэньні не падаюцца пераканаўчымі. Каго ж я тады чытаю? У нас даўно ніхто ня піша так — па вялікім рахунку, — як Адамовіч у апошніх сваіх творах. А выглядае, што тыя гэтага не заўважаюць, а тыя наагул ніколі ня чулі. Куды ж ён праваліўся? Пытаньне змушае пільней углядацца ў тэктанічныя расколіны, што ўтварыліся пасьля распаду савецкай літаратурнай імпэрыі.

Гэта яшчэ адзін плюс, што ягоная новая кніга выходзіць амаль празь дзесяць гадоў пасьля сьмерці. Як мінімум, аўтар нагадае пра сябе. Але мне думаецца пра большае — ён вернецца. Можа быць, у крыху іншым выглядзе, у зьмененым вобразе. І зьмена пачнецца з мовы.

Уявіце сабе беларускага пісьменьніка і навукоўца, знаўцу літаратуры, для якога беларушчына (мова, прырода, людзі) — свая ад нараджэньня, уявіце, што піша ён пра сваю радзіму,

вёску, вясковых людзей — у хаце, у лесе, у полі — у беларускім краявідзе, выслоўлівае іхныя пачуцьці-перажываньні, але робіць усё гэта — на іншай мове. Чаму так атрымалася? Некалі, яшчэ ў савецкія часы, я думаў, што паміж Быкавым і Адамовічам тут існуе нейкае спаборніцтва. Абодва ваенныя пісьменьнікі, шырока прызнаныя і шанаваныя, блізкія ў сваіх поглядах на шмат якія зьявы жыцьця, але адзін упарта піша па-беларуску, а другі — наўмысна па-расейску, і вось — хто ўрэшце пераможа, здабудзе найбольшы літаратурны посьпех. Сёньня такія думкі выглядаюць наіўнымі, але калі іх усё ж працягваць, дык бачым, які атрымаўся вынік. Быкава па-ранейшаму чытаюць па-беларуску і ў перакладах, а новая кніга з трох апошніх аповесьцяў Адамовіча на мове арыгіналу так і не зьявілася, выходзіць па-беларуску. Можа таму, што беларуская якраз і ёсьць мовай самага першага арыгіналу? Беларускі селянін у сваёй вёсцы, у лесе, у полі — зноў гаворыць, думае і перажывае так, як гэта зь ім адбывалася ў сапраўднасьці — гэта значыць па-беларуску. Пераклад тут выглядае як фармальнае прывядзеньне твораў у адпаведнасьць самім сабе.

Верагодна, сам Адамовіч сьведама падзяліў сябе на тры часткі, нібы жыў тры жыцьці адначасова. Дасьледчык беларускае літаратуры пісаў пра Гарэцкага і Чорнага па-беларуску, для ўнутрыбеларускага карыстаньня, савецкі празаік пісаў пра сваю радзіму для ўсесаюзнага чытача (у адной абойме з Айтматавым, Сулейменавым ды падобнымі папулярнымі тады пісьменьнікамі-нацменамі), змагар зь ядзернай пагрозай пачуваўся чалавекам сусьвету, тут ужо мова ня мела істотнага значэньня ўвогуле.

Але так было тады, у тым грамадзкім настроі, калі на ўсёй прасторы СССР у інтэлігенцкіх асяродках заканадаўцамі літаратурных павеваў выступалі “Литературка” і “Новый мир”. Сёньня ў Маскве бадай зусім ужо адышла мода на колішніх фаварытаў-нацменаў, але ані кроплі ня зьменшылася рэальная павага да аўтарытэтных творцаў іншых літаратур. Здавалася б дробязь, але радок “Перевод с белорусского” вельмі важны для ідэнтыфікацыі Быкава ў сёньняшнім расейскім часопісе. Вобраз прызнанага беларускага мэтра застаецца для расейца нязьменным. Захоўваецца вельмі важная дыстанцыя, якая не дазваляе і з Быкавым выраблять пасьпешныя пераацэнкі ды

дэвальвацыі, як гэта адбылося з многімі расейскімі кумірамі часоў перастройкі.
Можа быць, дзеля адпаведнасьці і зьберажэньня сапраўдных культурных скарбаў, трэба, каб такі радок зьявіўся і пад творамі Адамовіча. “Перевод с белорусского”. Гэта выглядала б як аднаўленьне гістарычнай справядлівасьці, выпраўленьне памылак, тым больш, пераклад гэтых трох аповесьцяў на беларускую мову не ўспрымаецца інакш як адваротны. Быццам Адамовіч і пісаў па-беларуску, пасьля пераклалі на расейскую, а пасьля — зноў на мову арыгіналу. І яшчэ адно “тым больш”. Тым больш, што радок “Пераклад з расейскай” пад гэтымі творамі, наадварот, дэвальвуе ўяўленьне пра аўтара ў вачох беларускага чытача, проста-ткі крадзе ў нас вобраз пісьменьніка.
Рэч у тым, што рэакцыя на згаданы радок у беларускага і расейскага чытача проціleглая. Расеец *a priori* адчувае павагу да твораў замежнае літаратуры, уяўляючы сабе тую дыстанцыю, якая не дазваляе з чужым прарокам-сучаснікам абыходзіцца гэтак фрывольна, як “можна” абыходзіцца са сваім. Варта толькі пачытаць, што сёньня ў Расеі пішуць пра свайго Солжа — гэта яны так Салжаніцына называюць. Што да беларускага чытача, дык тут усё наадварот. Уявіце, як бы вы чыталі раман Караткевіча, пад якім стаяла б “Пераклад з расейскай”. Адразу — цень непаўнавартасьці, другаснасьці, нянаскасьці.
Натуральна, у маёй прапановы знойдуцца і праціўнікі. Ёсьць пэўныя прынятасьці, ёсьць воля аўтара, нявыказаная, праўда, ёсьць акадэмічны падыход і маральна-этычныя нормы. Безумоўна, усё гэта ёсьць. Аднак я думаю пра актуалізацыю празаіка Адамовіча ў сёньняшнім часе, калі паняцьце расейскамоўнага пісьменьніка-нацмена адышло ў нябыт разам з краінай, у якой яно нарадзілася. Чытаем жа мы па-беларуску Гусоўскага або Чачота з Сыракомлем. Хіба гэты культурны выпадак тыпалягічна іншы? Калі Польшча яшчэ сяк-так дбае пра ўсерэчыпаспаліцкіх пісьменьнікаў, дык Расея пра ўсесаюзных — забывае.
Вяртаньне і па сутнасьці адваротны пераклад, напэўна, ніяк не пярэчылі б уяўленьням самога Адамовіча, які па-расейску выступаў рэпрэзэнтантам сваёй краіны і нацыі:
“Паводле беларускага паняцьця, дасавецкага, “кулак” — гэта

той, хто сьпіць на кулаку. *Упаў, дзе стаяў, запрацаваўшыся да бяспамяці, і не на падушку галаву, а на цьвёрды кулак — каб лішне не заспаць. Дзядзька Антон успамінаў, як абрабаваны "цьвёрдымі заданьнямі" стары, калі сын прыехаў да іх дамоў незадоўга ды высылкі, скардзіўся не на тое, што забралі і скаціну, і інвэнтар, і зерне, а што: "Вось глянь, якія рукі сталі, сорам на вуліцу выйсьці — як вітацца з чалавекам?" Мазалі-капыты сталі сыходзіць з далоняў, Мітрафан Тычына саромеўся такіх рук".*

"Госьці да нас заходзілі часта, бацька любіў, а мама ўмела тое, што называецца, "прыняць людзей". Гэта быў сапраўды сьвяточны дзень для нашых бацькоў — каб на стале было і каб людзі пайшлі, задаволеныя бяседай, гамонкаю, сьмехам. (Не выпадкова ў беларусаў застольле так і завецца: бяседа.)"

"Гаворкі з чужым сэрцам у сваіх грудзях — гэта па-новаму цікава. Ну, а ў мяне — старое, як сьвет: размова з уласным сэрцам. Менавіта такая пара "прыступіла" (як скажа беларус) і да мяне. Больш як год мінула..."

"Уся ісьціна ў тым, што памерці я хачу ў Беларусі, а ляжаць у Глушы. Там я зьвязаны з усім. Тут жа толькі ты. Гэта — для жыцьця. А для Вечнасьці — Беларусь."

Сьветапоглядна ў гэтых кароткіх цытатах Алесь Адамовіч — патрыёт свае бацькаўшчыны. Зьехаўшы ў Маскву, у тусоўкі тамтэйшых герояў перастройкі, перад сьмерцю вярнуцца ён пажадаў у Беларусь, якая — для вечнасьці. Так і атрымалася. Найперш яго не стае сёньня якраз беларускай літаратуры. Гэтак як сама мова можа быць запатрабаваная толькі беларусамі, так і Алесь Адамовіч дзеля далейшага свайго жыцьця ў творах можа быць запатрабаваны толькі беларускай культурай.

Словам, усё менш ён патрэбны там і ўсё больш тут. Патрэбны, бо тут ужо даўно гэтак ніхто ня піша.

Мой асабісты досьвед ранейшых твораў Адамовіча мае ў сабе мноства засьцярогаў — зашмат газэтнасьці пасярод прозы, таго, што актуальнае часова, зашмат натуралізму — спроба хоць гэтак пра вайну не дэклямаваць, а крычаць, роўма раўсьці, калі сказаць праўду не дае цэнзура. Вось яны з Клімавым і складаюць пад хлявом кучу аголеных трупаў. Каб хоць гэтак... У новай кнізе гэты фактурны максымалізм прападае. Зьяўляецца збалянсаваная проза. Адхіленьні ад сюжэтнае

канвы — ці то асацыятыўныя згадкі ці філязофскія развагі — толькі падтрымліваюць сюжэт. Аўтар думае на паперы. Гэты бок літаратурнае працы добра знаёмы кожнаму, хто да яе датычны. Калі сядаеш да стала толькі зь першай зачэпкай-фразай, выпісваеш яе, і тут нейкая нязнаная энэргія падказвае табе і працяг, і яшчэ працяг, далей-далей. Як падарожжа ў нешта нязнанае, дзе на кожным кроку адкрыцьцё, а за ім — новае.

Схаваўшыся за парай-тройкай наратыўных абзацаў, думка зноў выныpвае з новай развагай. Скажам, пра тое, што ня толькі мы разглядаем людзей на фатаздымках, але і яны пазіраюць на нас.

“Што гэта так — яны відушчыя, фатаграфіі *— я адчуў фізычна ў той момант, калі чакаў: вось-вось мяне знойдуць немцы, насьцігне аўтаматная чарга, буду ляжаць ля іх ног, запэцканы ўласнай крывёю, а яны з мае кішэні дастануць маміну фатаграфію, і* яна ўбачыць*... Я сьпяшаўся не запаўзьці далей, глыбей у кусты, а пасьпець, пакуль яны не зьявіліся, схаваць, закапаць у пясок кашалёк з фатаграфіяй.* Каб мама ня ўбачыла нічога гэтага.”

Ня дзіва, што большая частка развагаў у гэтых апошніх творах — развагі пра сьмерць. Расьцягнуты ў часе “любы момант” патрабуе гэтага і адначасова падказвае адкрыцьці. Напрыклад, пра тое, што на вайне кожнаму адведзена свая пэўная колькасьць шанцаў выжыць, або пра такую трапна падгледжаную зьяву, як сорам сьмерці:

“Сьмерць непрыгожая, усе кнігі, і фільмы, і опэры хлусяць, што яна бывае прыгожаю. Непрыгожы чалавек, які памірае і, галоўнае, ён сам гэта разумее ў тое імгненьне. А вось навакольныя часам не разумеюць гэтага і мучаць яго сваім неразуменьнем. Існуе сорам сьмерці*, я ў гэтым перакананы, сам перажыў. Часам ён мацнейшы за страх — сорам сьмерці. Многія маглі б расказаць. Ня нейкай там нізкай, подлай, здрадніцкай сьмерці (гэта асобная гаворка), а сорам сьмерці* любой*”.*

“Ванечка памёр у лясной вёсачцы (на паўшляху да лягеру). Не давезьлі. Мы ўсю дарогу падбадзёрвалі яго: вось прыедзем, там лекары, мігам паставяць цябе на ногі, табе не першыня! Але Ванечка ўжо апошні шанец зрасходаваў, і ён гэта ведаў. Глядзеў на нас нядобрымі вачыма аднекуль здалёк, як на тых, хто задумаў насьмяяцца, здрадзіў яму, на змоўшчыкаў.

Ванечка (мы ўяжджалі ў вёску) раптам папрасіў:
— Спыніце.
— Табе кепска, Ванечка, зараз чаго-небудзь цёпленькага табе.
— Адыдзіце, я зараз памру. Ну, прашу.
Мы, наадварот, — усе да яго, замітусіліся, бадзёрымі і, як заўжды пры чалавеку, які памірае, фальшывымі словамі спрабавалі — што? Угаварыць яго — не памірaць? Не казаць пра сьмерць?..
— Ды дактары цябе ўраз!..
— Ты яшчэ танцаваць будзеш!..
Мы адганялі ад сябе і ад яго страх сьмерці. Не заўважаючы, што ўжо апошняе — сорам сьмерці пачаў яго мучыць. Ванечка бездапаможна, крывячы, як дзіця, рот, заплакаў. Здавалася, таму, што мы ня цямім чагосьці, ня хочам яго паслухацца.
І раптам вусны пабялелі, закамянелі, рот раскрыўся, як яма...”
Адамовіч выступае дасьледчыкам сьмерці — сваёй і ўвогуле. Здаволіцца тым, што з канцом жыцьця канчаецца і ўсё наагул, ён ня можа. Працяг зямнога жыцьця дасьледуе прагматычна, больш давяраючы не вядомым клішэ, а статыстыцы, мэдыцыне: *“... Так, магчыма, што гэта ўсяго толькі (і шкада, калі так) падмена сапраўднай веры ў бясьсьмерце — мэдычнай вэрсіяй яе: усе гэтыя гісторыі пра жыцьцё пасьля жыцьця.* Life after life. *Расказаныя людзьмі, якія пабылі ў стане клінічнай сьмерці. Але як хочацца ў гэта паверыць: пралятаеш па тунэлі-трубе сьмяротнага жаху і адзіноты і раптам — вырываесься, цябе абдымае незямное сьвятло, сустракаюць, да цябе вярнуліся тыя, каго страціў, здавалася, навек. Перад кім заўсёды перажываеш пачуцьцё віны, бо менавіта ты* адпусьціў *тых, каго любіў. Ня ўсё зрабіў, каб затрымаць. Сустракаюць, каб табе ня страшна было. Сьвятло, добрае, нязвыклае, незямное любові сьвятло ўзгадваюць усе, хто пабыў там і вярнуўся. Ні пекла, ні раю, а вось такая сустрэча з самымі-самымі?.. А што калі ў ліку тых, хто сустракае* там, *і былыя нашы ворагі? Няхай ззаду, няхай за сьпінай тваёй мамы, бацькі, брата, сяброў... І што калі “пекла” (побач ці ўнутры “раю” той сустрэчы) — гэта ты сам, раптам сярод тых, хто любіць цябе, убачаны вачыма тых, хто цябе ненавідзіць. Што, калі гэта і ёсьць* бясконцае імгненьне пекла*? (Там роўнае вечнасьці ўсё.) Сустрэча з самім сабой — такім нягоднікам, такім паганцам, якімі нас бачаць, бачылі ворагі нашы (а мы — іх). Бо ж нават сьвятыя старцы перад канцом*

прасілі ўсіх, малілі дараваць ім”.
Вяртаньне Адамовіча дазваляе і нам пастаяць перад той Брамай вечнасьці і апошняе праўды. За апошнія сем гадоў інтэлектуальнае аднастайнасьці ды манатоннасьці так шмат павукоў завялося ў цесным пакоі беларускага інтэлектуалізму, так аплецена ўсё і ўся павуціньнем новых умоўнасьцяў і недагаворак, нейкай хвараблівай самацэнзурай. Беларусь, ад аднае згадкі якой, паводле Ніла Гілевіча, цяплее на сэрцы, усё больш — тая, што прыдуманая ў марах. А рэальная нацыя — сутыкнешся зь ёю — усё больш халодзіць сэрца, не разумее прыгожых утопіяў, а іншы раз дык і ўвогуле — якісьці калектыўны здраднік. Вось як гэта ў Адамовіча:
“У галовах нашага насельніцтва панаваў дзікі кавардак ад усіх падзеяў. Я ў вайну ня раз чуў, як заводзкія паліцаі з гарачлівасьцю даваенных актывістаў лаялі “кулакоў”, “куркулёў” вясковых. Дзе, як не ў падвалах НКВД, ішлі рэпэтыцыі, браліся ўрокі таго, што вычваралі потым “нашы людзі” ўжо ў падвалах нямецкіх “службаў бясьпекі”, СД і гестапа? Ну, а вышукваць, знаходзіць і сыгналізаваць аб “ворагах” (сёньня — контрарэвалюцыянэрах, “кулаках”, заўтра — камуністах, габрэях, партызанах) — гэта проста-ткі ўбівалася ў людзей. Столькі гадоў”.
У больш лібэральным выглядзе тое ўбівалася і пасьля вайны, і таму не прапала. Няштатныя сябры КГБ, таптуны ўсякія сёньня дадаюць масавасьці мітынгам і дэманстрацыям апазыцыі. Колькі іх па ўсёй Беларусі? Дзясяткі ці, можа, сотні тысяч? Азначэньне “нашы людзі” Алесь Адамовіч бярэ ў двукосьсе. Можна толькі ўявіць, колькі такіх цяпер працуе ў беларускай апазыцыі ды ўсялякіх недзяржаўных структурах! Адной масай сваёй яны здольныя застопарыць любы поступ і працэс. Натуральна, няма сэнсу з падазронасьцю ставіцца да кожнага чалавека. А як адрозьніць? Можна аналізаваць паводзіны і словы. Праўда, у сёньняшнім надта ж стракатым нашым сьвеце іншы раз здаецца, што каго заўгодна можа панесьці куды заўгодна, а таму гэткі аналіз — марная справа. Ёсьць больш пэўны спосаб. Назаву яго псыхалягічным вычуваньнем. Выхоўваецца яно якраз такімі вось творамі нацыянальнае літаратуры, як у новай кнізе Алеся Адамовіча. Побач з псыхалягічнымі партрэтамі народу ўсякага аўтар дае вельмі выразныя вобразы здаровага душою беларускага чалавека —

зусім тыповага і тады, на вайне, і цяпер. З гэткіх вобразаў і фармуецца агульны вобраз Беларусі.
Вось, падумалася, што такое і дзеля чаго нацыі патрэбная свая літаратура — каб лепей разумець сябе і тады з большым посьпехам вяршыць свой лепшы лёс. Найбуйнейшыя беларускія празаікі-псыхолягі ўсе нібы і існуюць якраз дзеля гэтага. Гарэцкі, Чорны, Мележ, Быкаў і вось цяпер — Адамовіч.
...Сэрца білася-білася і перастала. Лекары так і сказалі яму: у любы момант сэрца можа спыніцца. “Любы момант” цяпер і азначаў — жыцьцё. Жыцьцё пасьля жыцьця. Выйшла так, што “любы момант” расьцягнуўся на цэлы творчы пэрыяд, і тое, што ў гэты пэрыяд было створанае, цяпер можа быць запатрабаванае — у любы момант. Колькі яго адведзена ўсім жывым.

III

Кніга апошніх твораў і апошняе шчырасьці пісьменьніка мусіць зьмяніць ягоны звыклы вобраз, які сфармаваўся ў крытыкаў і публікі. Маю на ўвазе найперш нэгатыўныя стэрэатыпы, маўляў, Адамовіч не празаік, а публіцыст, Адамовіч састарэў, Адамовіч — не беларускі літаратар. Якраз у апошніх сваіх творах, на маю думку, пісьменьнік разбурае такія меркаваньні пра сябе.
Шэсьцьдзясятнікаў, або дзяцей XX зьезду, і сёньня папракаюць у тым, што ў душы яны былі “ідэальнымі сацыялістамі”, лічылі, што гэта Сталін завaліў добрую справу сацыяльнага вызваленьня, распачатую Леніным. Многія зь іх засталіся пры гэткіх пераканаьнях і сёньня, але ня тыя, у кім падлеткавая страсьць раскалупваць фантомы была закладзеная ад прыроды. У ідэалёгіі няма аб’ектыўных ісьцін і сьвятынь. За зьнішчаным Сталіным адкрываўся від на яшчэ некранутага Леніна — і цяпер ужо ён стаяў перашкодаю на шляху спазнаньня чалавечае нармальнасьці і маралі. У аповесьці “Vixi” Адамовіч піша:
“Ад “старога сьвету” (ужо старога савецкага) нам засталіся героі: Паўкі і Паўлікі, Алегі і Зоі. Сярод іх і беларуска-савецкі “бацька Мінай”. Чалавек, які не памяняўся лёсам са сваімі дзецьмі, як прапаноўвалі яму, партызанскаму камандзіру, нядобрыя немцы, не прыйшоў зь лесу, і дзяцей расстралялі. З усіх прапагандысцкіх сіл узьвялічвалі яго “подзьвіг”, да амаль

антычных вяршынь. “Агульнае” паставіў вышэй за “асабістае”, тым больш што фашысты ўсё роўна дзяцей ня выпусьцілі б і г. д. і да т. п. Але нешта не сыходзілася, не атрымлівалася зь яго антычнага героя: тыя ж маглі пайсьці супраць волі цара, а то і багоў, каб толькі выканаць абавязак перад роднай крывёю. Няшчасны савецкі бацька, савецкі камандзір, які добра разумеў: могуць і свае расстраляць, калі праявіш “слабасьць”. Герой-то ты герой, але раптам вырашыш выкупіць жыцьцё дзяцей і сваё там, у ворагаў, за кошт партызанскіх таямніц, сакрэтаў.
Бацька не прыйшоў да дзяцей, не паспрабаваў выратаваць іх”.
Адамовічава прыдумка — “звышлітаратура” — назаўсёды засталася ў эпосе гарбачоўскае перастройкі. Верагодна, тамсама застаўся і стэрэатып “мастацкасьці”, які раўніва адстойвалі яшчэ рэдактары прозы беларускіх позьнесавецкіх часопісаў. Цяпер такі папрок не гучыць актуальным. Прынамсі, ён не выглядае абавязковым. “Кінасцэнарная” мова, публіцыстычныя і мэмуарныя ўстаўкі за апошні час вырабіліся ў іншую, сваю постмадэрную паэтыку. Называй мы гэта літаратурай ці нелітаратурай, усё ж, мабыць, не ў паэтыцы справа, а ўва ўменьні выславіць да цябе не выказванае. Найцяжэйшая задача, якую Алесю Адамовічу давялося вырашаць у ягонай апошняй кнізе — гэта “дайсьці да мацерыка”, да астачы сваёй уласнай савецкасьці — зразумець і ацаніць яе. Рэдкі ці нават адзінкавы прыклад сучаснага самааналізу, прынамсі, у беларускай літаратуры:
“У пасьляваенных “органах” апынулася нямала былых партызан. І наш адзін — Мікалай С. Ад яго я шмат цікавых рэчаў пачуў і пра сябе таксама.
— Чаму маё начальства так цябе ня любіць? — пытаў Мікалай.
— А ня любіць?
— Гэта дакладна. Па-першае, кажуць: не савецкі чалавек.
І другое: ён нас ня любіць, органы.
Зь іншым я спрачацца ня стаў бы: забілі, замучылі, падставілі пад кулі кожнага трэцяга жыхара велізарнай краіны, а вы іх любіце! Крыўдуюць. Але вось: савецкі, не савецкі — гэта трэба было яшчэ даказаць. Калі быў, заставаўся “савецкім”, а калі перастаў ім быць. Ува ўсякім выпадку, калі бацька, вярнуўшыся з арміі ў Глушу, раптам задумаў і пачаў будаваць уласны дом (ня жыць жа вечна па закутках у аптэцы!), я зьдзівіўся:
— Уласны? Дык хутка ж камунізм!

Самае дзіўнае, што ня ўсё было жартам, была доля зусім шчырага перакананьня, чаканьня: мы ж перамаглі, цяпер усё адолеем, зможам!
Ну што, хіба ня цалкам савецкі (ідыёт)? Дом бацькаў, намі дабудаваны, стаіць, можаце пераканацца, у Глушы. Ну, а камунізм на адной шостай... Тут была яўная недапрацоўка і саміх органаў. Больш рашуча з намі трэба, больш крута. Каб аніякіх адліг, аніякіх перабудоваў. Народ наш па-добраму не разумее, тут жа робіцца нахабным. Вось і мы — у раньнехрушчоўскія часы. Нас стараліся паклікаць на дапамогу, каб разам “паляпшаць сацыялізм”, у адной запрэжцы з органамі, а мы, хаця і марылі аб палепшаным, але каб бяз органаў, без такіх, прынамсі, а калі зь імі, дык бяз нас”.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 29-07-2001
[image]

Аляксандар Фадзееў

Пяць год яднаньня, альбо Палітычная прахіндыяда

АЛЯКСАНДАР ФАДЗЕЕЎ
загадчык аддзелу Беларусі маскоўскага Інстытуту краін СНД.
Артыкул перакладзены з ласкавай згоды названага інстытуту.

Пяць год таму, 2 красавіка 1996 г., была падпісаная дамова аб утварэньні супольнасьці Беларусі і Расеі, а найвышэйшая рада гэтага ўтварэньня прыняла рашэньне абвясьціць 2 красавіка днём яднаньня народаў Расеі і Беларусі. З нагоды юбілею з 13 сакавіка гэтага году напоўніцу працаваў аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзеньні “мерапрыемстваў”. Што зьбіраюцца сьвяткаваць кіраўнікі дзьвюх дзяржаваў, чынавенства і “вядомыя дзеячы навукі, культуры і мастацтва”, казаць ніхто не бярэцца. Вынікі пяцёх год настолькі нязначныя і сумныя, што аніякага пад’ёму не выклікаюць, а правядзеньне ўрачыстасьцяў у Крамлі з размахам і помпай нічога, апроч неўразуменьня, не выклікае.

Наўрад ці варта аналізаваць увесь спэктар інтэграцыйнага працэсу, разглядаць усе праблемы і цяжкасьці на шляху аб’яднаньня, можна спыніцца толькі на тых кірунках, якія спрабуюць прадставіць як цалкам пасьпяховыя, у якіх ёсьць

буйныя дасягненьні.
Па-першае, пытаньні сумеснай абароны, аховы межаў і вайсковага супрацоўніцтва. Лічыцца, што тут ёсьць заўважныя дасягненьні, але калі добра разабрацца, то выяўляецца, што грамадзкую думку, мякка кажучы, уводзяць у аблуду. Так, сапраўды, вайсковыя функцыянэры абедзьвюх краін штогод рапартуюць аб адсутнасьці ў іх кардынальных разыходжаньняў у пазыцыях, аб новых плянах узмацненьня сумеснай абароны, вайсковага і вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва і да т. п. Што ж зроблена насамрэч? Бадай нічога. Яшчэ ў далёкім 1996 годзе былі распрацаваныя праект канцэпцыі сумеснай абароннай палітыкі і плян стварэньня і ўзбраеньня рэгіянальнай групоўкі войскаў, а на працягу пяцёх наступных год заключаныя амаль чатыры дзясяткі адпаведных дамоваў... Гладка было на паперы... Гэтыя цудоўныя дакумэнты былі створаныя з усёй вайсковай карпатлівасьцю і дэталізацыяй, упікнуць вайсковых спэцыялістаў няма ў чым, ды вось толькі ўсе яны, як адзін, не маглі быць рэалізаваныя з той простай прычыны, што аб'ектыўна патрабавалі зьмены нацыянальных канстытуцыяў Расеі і Беларусі, вайсковага заканадаўства і іншых законаў абедзьвюх дзяржаваў. З таго часу багата вады сплыло, але ніякіх, падкрэсьлім, ніякіх зьменаў у праўнай базе ў пляне зруху інтэграцыі ў гэтым кірунку зроблена не было. Да сёньня не прынятая нават вайсковая дактрына расейска-беларускай дзяржавы, ня кажучы ўжо аб стварэньні на практыцы сумесных абарончых рубяжоў. Хаця, пры такім падыходзе да канстытуцыйных асноваў і да задачаў аб'яднаньня, дактрыну, у выпадку яе прыняцьця, напаткае такі ж незайздросны лёс, які напаткаў і ранейшыя аснаватворныя акты. Час зразумець, нарэшце, што нельга ажыцьцявіць захады вайсковага будаўніцтва ў саюзнай дзяржаве без папярэдняга рашэньня галоўных палітычных і канстытуцыйных пытаньняў, якія пяць год настойліва ігнараваліся.

Апошнім часам шмат і правільна гаварылася пра ўмацаваньне заходніх межаў расейска-беларускай дзяржавы. З 1996 г. памежныя органы дзьвюх краінаў працуюць у межах праграмы "Абсталяваньне межаў", а з 1997 г. быў створаны памежны камітэт супольнасьці Беларусі і Расеі. Гады прамінулі, час падвесьці вынікі сумеснай дзейнасьці. Яны настолькі

“ўражваюць”, што могуць выклікаць шок: па-ранейшаму ня вырашаны пытаньні фінансаваньня і службы ў рамках розных заканадаўстваў, што рэгулююць ахову межаў; абсталяваныя адна камэндатура (у мястэчку Вопса) і дзьве памежныя заставы (у Савейках і Лынтупах). За пяць год у расейскіх ВНУ падрыхтавалі, увага, 18 (!) беларускіх афіцэраў-памежнікаў і патрапілі, нарэшце, арганізаваць адзін гадавальнік для службовых сабакаў.

Падкрэсьлім галоўнае — усе памежныя, кантрольна-прапускныя аб’екты абсталёўваліся выключна на беларуска-літоўскай і беларуска-латыскай межах. А як жа мяжа саюзнай дзяржавы з Польшчай, якая пасьпела ўступіць у NATO? А ніяк. Сумесная ахова мяжы з краінай паўночнаатлянтычнага альянсу ні ў адной з дамоваў ці пагадненьні паміж Расеяй і Беларусяй не прадугледжваецца. Памежнікі тут ні пры чым, паколькі адпачатку вышэйшае палітычнае кіраўніцтва абедзьвюх дзяржаваў даволі выбарачна падыходзіла да ўзмацненьня заходніх межаў супольнасьці-саюзу-саюзнай дзяржавы — каб, крый Божа, не падумалі чаго на Захадзе, каб, барані Божа, не перайсьці т. зв. “чырвонай рысы”. Калі ж расейскія і беларускія кіраўнікі перастануць быць наіўнымі прасьцякамі ў міжнароднай палітыцы? Бо тыя ж палякі ў апошнія гады плянамерна і не зважаючы ні на што, узмацнялі межы з саюзнай дзяржавай. Цяпер, напрыклад, канчаецца абсталяваньне згодна з апошнімі стандартамі на польска-беларускай мяжы яшчэ дзьвюх новых заставаў з абарончымі ўмацаваньнямі і самым сучасным электронным кантролем (Нароўка і Пляска).

Па-другое, пераход да адзінай валютнай палітыкі і ўвядзеньне адзінай грашовай адзінкі ў саюзнай дзяржаве лічацца самым яскравым пацьвярджэньнем дзейснасьці інтэграцыйных намаганьняў ужо ў пэрыяд прэзыдэнцтва Ў. Пуціна. Ці так гэта? У сярэдзіне сакавіка ў інтэрвію газэце “Союз” першы намесьнік старшыні праўленьня Нацбанку Беларусі Павал Калаўр яшчэ раз (сьпярша — у нацыянальным сходзе Беларусі) пацьвердзіў, што пагадненьне з Расеяй зусім не азначае, што з 1 студзеня 2005 г. расейскі рубель стане выконваць функцыі адзінай валюты. Паводле словаў гэтага высокапастаўленага ўрадоўца, які агучыў пазыцыю рэспубліканскага кіраўніцтва, Беларусь захоўвае для сябе “варыянтнасьць выбару”, паколькі ня можа

прыйсьці да пагадненьня з Расеяй у пытаньні адзінага эмісійнага цэнтру.
Больш за тое, беларускі бок яўна спрабуе адцягнуць нават першыя крокі ў рашэньні гэтай праблемы, адкладваючы іх да пэрыяду распрацоўкі канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы. Гэты дакумэнт яшчэ толькі неабходна распрацаваць у сьценах саюзнага парлямэнту, але, як вядома, ён дагэтуль ня створаны, акурат выбары ў дадзены заканадаўчы орган зь віны Адміністрацыі прэзыдэнта А. Лукашэнкі ўвесь час пераносяцца на няпэўную пэрспэктыву. І, думаецца, зусім не задаволіць Расеі прапанаваная саюзьнікамі схема, паводле якой у нейкі адзіны эмісійны цэнтар уліюцца цэнтральныя банкі абедзьвюх дзяржаваў. Старшыня праўленьня НББ Пётра Пракаповіч у канцы сакавіка таксама заявіў, што ЦБ Расеі ні пры якіх умовах ня стане адзіным эмісійным цэнтрам саюзнай дзяржавы, бо гэта пярэчыць саюзнай дамове і беларускай канстытуцыі. У гэтым пытаньні кіраўніка НББ падтрымала і міністэрства юстыцыі Беларусі.
З заяваў Калаўра і Пракаповіча можна выснаваць, што і ў расейскім крэдыце ў цьвёрдай валюце Беларусь ня мае патрэбы. Гэта і нядзіўна — крэдыт ураду Расеі (першую траншу ў памеры 30 млн. даляраў) зьяўляецца зьвязаным і можа выкарыстоўвацца толькі на падтрымку беларускага рубля ў пераходны да адзінай валюты пэрыяд. НББ здолеў шляхам немудрагелістых спэкуляцыйных апэрацыяў у лютым крыху папоўніць уласныя рэзэрвы (на 15—18 млн. даляраў) і цяпер поўніцца аптымізмам. Паколькі Беларусь працягвае раздумваць і валаводзіць з нагоды расейскага крэдыту, то ствараецца ўражаньне, што акурат гэты крэдыт ёй у найбліжэйшы час сапраўды не патрэбны.
Зьвернем увагу, што замена нацыянальных валют адзінай павінна спалучацца зь іншымі кірункамі эканамічнай і фінансавай інтэграцыі, найперш з утварэньнем і пачаткам функцыянаваньня двухадзінай сыстэмы цэнтральных банкаў РФ і Беларусі. Без такой сыстэмы гаварыць аб пераходзе на адзіную валюту, а на добры лад і аб практычным стварэньні саюзнай дзяржавы, няма сэнсу. Задачы такой банкаўскай сыстэмы відавочныя: рэалізоўваць адзіны мэханізм плацяжоў, падтрымліваць неабходныя і дастатковыя ўзроўні золата-валютных рэзэрваў, ажыцьцяўляць узгодненую валютную

палітыку, уключаючы сумесныя вонкавыя фінансавыя апэрацыі. На Цэнтральны банк Расеі саюзным кіраўніцтвам павінна быць ускладзена галоўная функцыя — рэгуляваньне цэнавай палітыкі і падтрыманьне стабільнасьці саміх цэнаў, прадухіленьне інфляцыі. Для гэтага ЦБ РФ павінен быць незалежны як у прыняцьці рашэньняў, так і ў пляне кадравай палітыкі. А якраз на гэта кіраўніцтва Беларусі, мяркуючы з усяго, і не гатовае, таму што прывыкла дэталёва кантраляваць уласную нацыянальную банкаўскую сыстэму і яе кіраўніцтва. Ёсьць і яшчэ адзін немалаважны аспэкт. Пераход вагароў валютнай палітыкі да ЦБ РФ адразу пазбавіць вярхі Беларусі магчымасьці затуляць бюджэтныя дзіры і выплачваць вонкавую запазычанасьць (найперш саюзнай Расеі) у адвольным парадку. Не задавальняе беларускай эліты і іншае — непазьбежнае надзяленьне Цэнтрабанку Расеі новым прававым статусам, улучна з правам беспасярэдняга распараджэньня фінансавымі патокамі, нерухомасьцю на ўсёй саюзнай тэрыторыі, улучна, натуральна, з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусі. Апроч гэтага, будзе цалкам заканамерна, калі ЦБ РФ стане зусім самастойным у пытаньнях разьмеркаваньня капіталаў, разьмяшчэньня валютных укладаў, вылучэньня крэдытаў, правядзеньня трансфэрных апэрацыяў і апэрацыяў з рэзэрвовымі фондамі ў межах саюзнай дзяржавы. Нідзе ў сьвеце, як вядома, вышэйзгаданы шэраг рашэньняў не прымаецца выходзячы з прынцыпу “сувэрэннай роўнасьці” (на чым зацята працягваюць настойваць у Менску). Няма падставаў для выключэньняў і ў выпадку з Цэнтральным банкам Расеі, мэханізм прыняцьця рашэньняў якога будзе завязаны на фінансавым патэнцыяле канкрэтнай краіны-саюзьніцы і яе рэальнай долі ў статутным капітале саюзнага (у яго ролі — Цэнтральнага банку Расеі) банку.

Такім чынам, усе крокі саюзнага банку павінны будуць вызначацца ў першую чаргу прадстаўнікамі статутнага капіталу, а ў другую — акцыянэрамі (паводле схемы простай бальшыні). Беларускі бок да такога павароту ня толькі не гатовы, але ня можа прыняць такую пабудову сыстэмы ў прынцыпе: у Беларусі, як вядома, рашэньне такіх фінансавых праблем застаецца за праўленьнем НББ, якое прызначаецца і кантралюецца кіраўніцтвам Рэспублікі, галавой дзяржавы. Пры гэтым прэзыдэнт і ўрад Беларусі захоўваюць ня проста

кантроль за прынцыпамі палітыкі НББ, але і магчымасьць апэратыўнага ўмяшаньня ў яго дзейнасьць.
Цікава, што ў ходзе барацьбы за вагары кіраваньня эмісійным цэнтрам Расея і Беларусь нібыта забыліся пра такую актуальную праблему саюзнай дзяржавы, як заснаваньне Інстытуту інвэстыцый. Між тым інвэстыцыйны цэнтар саюзнай дзяржаве вельмі патрэбны, ягонае стварэньне ня можа адкладацца да лепшых часін, пераносіцца на нейкі наступны этап інтэграцыі. У прыватнасьці, інвэстыцыйны цэнтар спрыяў бы, не падмяняючы нацыянальных інвэстыцыйных праграмаў і інвэстыцыяў з саюзнага бюджэту, засяроджаньню намаганьняў на разьвіцьці новых відаў і формаў учыннай актыўнасьці, мадэрнізацыі прамысловага патэнцыялу і прыярытэтным ажыцьцяўленьні тых бізнэс-праектаў, якія ўяўляюць сабой асаблівую цікавасьць для ўдзельніцаў саюзнай дзяржавы. Адзначым, што ў дзейнасьці такога інвэстыцыйнага цэнтру, у яго рэсурсах і крэдытах зацікаўлена найперш Беларусь. Але і тут уся тая ж перашкода — інвэстыцыйны цэнтар значыць аўтаномнасьць з пазыцыяў статусу і функцыянаваньня, а кіраваньне ім — максымальную самастойнасьць.
Яшчэ адзін вузел застарэлых супярэчнасьцяў паміж Расеяй і Беларусяй хаваецца ў сфэры рэгуляваньня працэсу руху капіталаў. Увесь папярэдні досьвед у дадзеным пытаньні — нэгатыўны. Беларускі бок з зайздроснай упартасьцю адхіляе ўдзел расейскіх дзелавых колаў у прадпрымальніцтве і, тым больш, набыцьці імі акцый суб'ектаў гаспадараньня на сваёй тэрыторыі. Выключэньні, праўда, датычаць прамых інвэстыцыйных уліваньняў і прадастаўленьня крэдытных ліній пад кантролем нават ня ўраду, а непасрэдна прэзыдэнта.

Зразумець такую пазыцыю кіраўніцтва Беларусі, вядома, можна, улічваючы дзяржаўную ідэалёгію, але яна ўяўляецца неапраўданай, урэшце зьнікае магчымасьць прасоўваньня па шляху набыцьця якасьці канвэртаванасьці для валюты, выкарыстоўванай у абарачэньні ў Рэспубліцы. Без дасягненьня ўзаемнай свабоды перасоўваньня капіталаў нельга перайсьці і да больш высокага аб'яднаньня, якое павінна характарызавацца перадачай з-пад нацыянальнага кантролю ажыцьцяўленьня шэрагу плацяжоў, у першую чаргу ў сфэрах таварамены і аказаньня паслугаў. Сёньня аб разумнай палітыцы ў галіне

плацяжоў у межах саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі даводзіцца толькі марыць.
Па-трэцяе, як бы вырашаным лічыцца пытаньне аб фармаваньні саюзнага парлямэнту, абраньні дэпутатаў яго ніжняй палаты. Дзярждума РФ, прынамсі, ухваліла летась (праўда, толькі ў першым чытаньні) праект адпаведнага закону з расейскага боку. Але на гэтым усё і спынілася. Адміністрацыя прэзыдэнта Беларусі, нягледзячы на ўсе запэўніваньні, да сёньня ня ўнесла аналягічнага законапраекту ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі. Чаму працэс стварэньня парлямэнту саюзнай дзяржавы спыніўся? Ён жа мог запрацаваць яшчэ ў мінулым годзе. Адказ, на наш погляд, крыецца ў тым, што (пры ўсёй абмежаванасьці паўнамоцтваў) у самой сутнасьці расейска-беларускага заканадаўчага органу адпачатку і аб'ектыўна закладваецца магутны патэнцыял народаўладзьдзя, сапраўднай дэмакратыі. Элітам дзьвюх дзяржаваў гэта ня надта даспадобы.
Апроч таго, дзейнасьць саюзнага парлямэнту спрыяла б узмацненьню дзяржаўных асноваў новага расейска-беларускага ўтварэньня. Парлямэнт, як усім добра вядома, — гэта неабходны элемэнт сыстэмы кіраваньня дзяржавай. З другога боку, акурат парлямэнт — найбольш пэўны паказьнік гатоўнасьці палітычнага кіраўніцтва абедзьвюх дзяржаваў да стварэньня не на паперы, а ў рэчаіснасьці акурат супольнай, саюзнай дзяржавы (няхай у форме фэдэрацыі). Натуральна, што больш слабым формам партнэрства, і нават канфэдэрацыі, ніякі заканадаўчы орган ня толькі не патрэбны, але ён варожы іх сутнасьці.
Відавочна, палітычныя вярхі Расеі і Беларусі пакуль не гатовыя да фармаваньня саюзнай дзяржавы. Вось чаму іх працягвае задавальняць бледая імітацыя парлямэнцкай дзейнасьці ў выглядзе функцыянаваньня парлямэнцкага сходу саюзу Беларусі і Расеі. Ягоная структура, парадак фармаваньня, прынцыпы і паўнамоцтвы ў свой час былі няўдала "сьпісаныя" з Усеагульнай асамблеі Эўрапейскага аб'яднаньня вугалю і сталі (ЭАВС), якое даўно перастала існаваць. Як і там, дэпутаты парлямэнцкага сходу саюзу Беларусі і Расеі не абіраліся народамі дзяржаў-саюзьніцаў, а прызначаліся, кааптаваліся нацыянальнымі органамі. Гэты сурагат, варты жалю правобраз парлямэнту ніколі не прадстаўляў і не прадстаўляе цяпер

нікога, апроч самога сябе, ня мае практычна ніякіх паўнамоцтваў, уласьцівых заканадаўчаму органу. Дарэчы, для аматараў бяздумна капіяваць заходні досьвед, падкрэсьлім, што ў самой Заходняй Эўропе, якая імкнецца да кансалідацыі, ужо амаль чвэрць стагодзьдзя насельніцтва абірае свой парлямэнт (Эўрапарлямэнт) на прамых і ўсеагульных выбарах. Гэтаму не замінаюць і розныя выбарчыя сыстэмы: мажарытарная, прапарцыйная, мяшаная. Значыцца, якраз тое, што пры распрацоўцы законапраектаў выбараў у саюзны парлямэнт шмат кім разглядалася як галоўная цяжкапераадольная перашкода, якая патрабуе шматгадовай, працяглай працы для ўніфікацыі выбарчых кодэксаў абедзьвюх краінаў.

Нельга выключаць, што пэўныя колы вышэйшых чыноўнікаў і ў Беларусі, і ў Расеі не сьпяшаюцца з абраньнем саюзнага парлямэнту адно з тае прычыны, што такія выбары непазьбежна прывядуць да падвышэньня інтарэсу практычна ўсіх слаёў актыўнага насельніцтва сваіх краін да праблемы аб'яднаньня ў адну дзяржаву, да ўсьведамленьня праўдзівых чыньнікаў гамаваньня інтэграцыйнага працэсу, сярод якіх адзін з галоўных — чынавенскі падыход. Ня варта выключаць і імкненьня кіраўніцтва абедзьвюх краін пазьбегчы абвастрэньня многіх праблемаў унутрыдзяржаўнага характару, якія непазьбежна ўсплывуць, вылезуць у працэсе шырокай выбарчай кампаніі.

Саюзны парлямэнт зможа прадстаўляць інтарэсы грамадзян абедзьвюх краін, адстойваць іх перад найвышэйшай дзяржаўнай радай, саюзным урадам і інш. саюзнымі і нацыянальнымі органамі. Ён будзе прадстаўляць ужо не парлямэнты Расеі і Беларусі, а беспасярэдне народы РФ і Беларусі, што аб'ектыўна зробіць парлямэнт саюзнай дзяржавы больш аўтарытэтным і незалежным, дэмакратычным і легітымным. Галоўнае — грамадзяне расейска-беларускай дзяржавы паступова прыйдуць да ўсьведамленьня сябе як адзінага народу, які мае права і магчымасьць мець свой парлямэнцкі орган. З часам саюзны парлямэнт можа, хаця шмат каго "наверсе" гэта палохае ўжо цяпер, ператварыцца ў найвышэйшы орган заканадаўчай улады. Ну, а ў расейска-беларускай саюзнай дзяржаве, якая існуе толькі на паперы, зьявіцца найважнейшая прыкмета рэальнай дзяржавы.

І, нарэшце, па-чацьвертае, праблема адзінай канстытуцыі. Пакуль яе ў саюзнай дзяржавы проста няма. Таму саюзны парлямэнт павінен разглядацца як найважнейшы інстытут інтэграцыі, паколькі гэты карпаратыўны орган мае распрацаваць канстытуцыю саюзнай дзяржавы, канстытуцыйны акт. Без канстытуцыйных асноваў прасоўваньне па ўсім фронце інтэграцыі, ува ўсіх сфэрах палітычнага, фінансава-эканамічнага, вайсковага ўзаемадзяньня немагчымае. У адваротным выпадку ўсе намаганьні інтэгратараў будуць па-ранейшаму зводзіцца на нішто канстытуцыйнымі непаразуменьнямі.

Канстытуцыя неабходная саюзнай дзяржаве, паколькі толькі яна ў стане зацьвердзіць прававыя асновы палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сыстэмаў расейска-беларускай дзяржавы. Сёньня, калі канстытуцыя адсутнічае, любыя спробы радыкальных зьменаў дзяржаўных сыстэмаў Расеі і Беларусі ў мэтах інтэграцыі формаў кіраваньня, арганізацыі, усталяваньня і кампэтэнцыі уладных органаў бессэнсоўныя. Эўропа ўжо з пачатку XIII ст. ішла па шляху станаўленьня канстытуцыйнага права, усе эўрапейскія дзяржавы маюць канстытуцыі, і саюзнай дзяржаве ў гэтым пляне ня варта прыпадабняцца нейкаму Аману, які ня мае канстытуцыі.

Вядома, распрацоўку і прыняцьцё канстытуцыі ня варта спрашчаць, паколькі гэта вельмі складаны, доўгі і цяжкі працэс. Навідавоку і перашкоды, бо канстытуцыя прадугледжвае замацаваньне прынцыпаў разьдзяленьня ўладаў, дэмакратызацыю прававой сыстэмы, мэханізму дзяржаўнага кіраваньня, нутраной і вонкавай палітыкі, а таксама пашырэньне правоў і свабодаў асобы. Неабходна будзе закласьці прававыя гарантыі вяршэнства саюзнай канстытуцыі ўва ўсёй сукупнай сыстэме крыніцаў права, яе прыярытэтнасьці што да ўсіх іншых законаў і нормаў, якія рэгулююць сацыяльнае жыцьцё. Гэта запатрабуе намаганьняў, ня столькі чыста заканатворчых, але, у першую чаргу, рэалізацыі цалкам пэўнай палітычнай волі.

Пакуль жа, наадварот, усё больш сьведчаньняў прыхільнасьці найвышэйшай улады абедзьвюх краінаў да пазыцыі непарушнасьці нацыянальных канстытуцыйных асноваў, старых канстытуцыяў, якія набываюць якасьць “сьвятарнай каровы”. Чуйна ўлавіўшы гэты настрой “вярхоў”, частка правазнаўцаў

Расеі і Беларусі працягвае даводзіць, што канстытуцыю часта мяняць нельга, яе ўвогуле лепш не чапаць (інакш — сацыяльны выбух, хваляваньні і інш.).
Насамрэч прычына палягае ў іншым: у цяперашніх канстытуцыях Расеі і Беларусі ўстаноўлена і замацавана адна форма дзяржаўнага кіраваньня — прэзыдэнцкая. Адсюль і ўся арганізацыя сыстэмы найвышэйшых органаў дзяржаўнай улады, дзе прыярытэт, натуральна, аддадзены прэзыдэнту як кіраўніку дзяржавы. Таму меркаваць, што ў гэтых рэаліях зьмены ў нацыянальных канстытуцыях і прыняцьцё саюзнай канстытуцыі будуць праходзіць гладка і лёгка, а адпаведны рэфэрэндум абвесьцяць заўтра, — небясьпечная і вялікая аблуда. Існуючыя рэзкія, часам незамірэнчыя супярэчнасьці паміж палітычнымі элітамі Расеі і Беларусі робяць парлямэнцкі шлях усталяваньня канстытуцыйных асноваў саюзнай дзяржавы адзіна магчымым. Апошняя, сьнежаньская 1999 г. дамова паміж Рэспублікай Беларусяй і Расейскай Фэдэрацыяй з усёй нагляднасьцю прадэманстравала, што спадзявацца на паяву варыянту падоранай вярхамі канстытуцыі, падрыхтаванай у нетрах прэзыдэнцкіх адміністрацый, дарэмна.
Такім чынам, вышэй былі разгледжаны толькі тыя праблемныя вузлы аб'яднаўчага працэсу, па якіх, як пераконваюць грамадзкасьць абедзьвюх краін, дасягнуты значны прагрэс. Яго насамрэч няма. Што ж у такім выпадку казаць пра іншыя кірункі інтэграцыі?

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2001**
[image]

Аляксандар Фадзееў

Пяць год яднаньня, альбо Палітычная прахіндыяда

АЛЯКСАНДАР ФАДЗЕЕЎ
загадчык аддзелу Беларусі маскоўскага Інстытуту краін СНД.
Артыкул перакладзены з ласкавай згоды названага інстытуту.

Пяць год таму, 2 красавіка 1996 г., была падпісаная дамова аб утварэньні супольнасьці Беларусі і Расеі, а найвышэйшая рада гэтага ўтварэньня прыняла рашэньне абвясьціць 2 красавіка днём яднаньня народаў Расеі і Беларусі. З нагоды юбілею з 13 сакавіка гэтага году напоўніцу працаваў аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзеньні “мерапрыемстваў”. Што зьбіраюцца сьвяткаваць кіраўнікі дзьвюх дзяржаваў, чынавенства і “вядомыя дзеячы навукі, культуры і мастацтва”, казаць ніхто не бярэцца. Вынікі пяцёх год настолькі нязначныя і сумныя, што аніякага пад’ёму не выклікаюць, а правядзеньне ўрачыстасьцяў у Крамлі з размахам і помпай нічога, апроч неўразуменьня, не выклікае.

Наўрад ці варта аналізаваць увесь спэктар інтэграцыйнага працэсу, разглядаць усе праблемы і цяжкасьці на шляху аб’яднаньня, можна спыніцца толькі на тых кірунках, якія спрабуюць прадставіць як цалкам пасьпяховыя, у якіх ёсьць

буйныя дасягненьні.
Па-першае, пытаньні сумеснай абароны, аховы межаў і вайсковага супрацоўніцтва. Лічыцца, што тут ёсьць заўважныя дасягненьні, але калі добра разабрацца, то выяўляецца, што грамадзкую думку, мякка кажучы, уводзяць у аблуду. Так, сапраўды, вайсковыя функцыянэры абедзьвюх краін штогод рапартуюць аб адсутнасьці ў іх кардынальных разыходжаньняў у пазыцыях, аб новых плянах узмацненьня сумеснай абароны, вайсковага і вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва і да т. п. Што ж зроблена насамрэч? Бадай нічога. Яшчэ ў далёкім 1996 годзе былі распрацаваныя праект канцэпцыі сумеснай абароннай палітыкі і плян стварэньня і ўзбраеньня рэгіянальнай групоўкі войскаў, а на працягу пяцёх наступных год заключаныя амаль чатыры дзясяткі адпаведных дамоваў... Гладка было на паперы... Гэтыя цудоўныя дакумэнты былі створаныя з усёй вайсковай карпатлівасьцю і дэталізацыяй, упікнуць вайсковых спэцыялістаў няма ў чым, ды вось толькі ўсе яны, як адзін, не маглі быць рэалізаваныя з той простай прычыны, што аб'ектыўна патрабавалі зьмены нацыянальных канстытуцыяў Расеі і Беларусі, вайсковага заканадаўства і іншых законаў абедзьвюх дзяржаваў. З таго часу багата вады сплыло, але ніякіх, падкрэсьлім, ніякіх зьменаў у праўнай базе ў пляне зруху інтэграцыі ў гэтым кірунку зроблена не было. Да сёньня не прынятая нават вайсковая дактрына расейска-беларускай дзяржавы, ня кажучы ўжо аб стварэньні на практыцы сумесных абарончых рубяжоў. Хаця, пры такім падыходзе да канстытуцыйных асноваў і да задачаў аб'яднаньня, дактрыну, у выпадку яе прыняцьця, напаткае такі ж незайздросны лёс, які напаткаў і ранейшыя аснаватворныя акты. Час зразумець, нарэшце, што нельга ажыцьцявіць захады вайсковага будаўніцтва ў саюзнай дзяржаве без папярэдняга рашэньня галоўных палітычных і канстытуцыйных пытаньняў, якія пяць год настойліва ігнараваліся.

Апошнім часам шмат і правільна гаварылася пра ўмацаваньне заходніх межаў расейска-беларускай дзяржавы. З 1996 г. памежныя органы дзьвюх краінаў працуюць у межах праграмы "Абсталяваньне межаў", а з 1997 г. быў створаны памежны камітэт супольнасьці Беларусі і Расеі. Гады прамінулі, час падвесьці вынікі сумеснай дзейнасьці. Яны настолькі

“ўражваюць”, што могуць выклікаць шок: па-ранейшаму ня вырашаны пытаньні фінансаваньня і службы ў рамках розных заканадаўстваў, што рэгулююць ахову межаў; абсталяваныя адна камэндатура (у мястэчку Вопса) і дзьве памежныя заставы (у Савейках і Лынтупах). За пяць год у расейскіх ВНУ падрыхтавалі, увага, 18 (!) беларускіх афіцэраў-памежнікаў і патрапілі, нарэшце, арганізаваць адзін гадавальнік для службовых сабакаў.

Падкрэсьлім галоўнае — усе памежныя, кантрольна-прапускныя аб’екты абсталёўваліся выключна на беларуска-літоўскай і беларуска-латыскай межах. А як жа мяжа саюзнай дзяржавы з Польшчай, якая пасьпела ўступіць у NATO? А ніяк. Сумесная ахова мяжы з краінай паўночнаатлянтычнага альянсу ні ў адной з дамоваў ці пагадненьні паміж Расеяй і Беларусяй не прадугледжваецца. Памежнікі тут ні пры чым, паколькі адпачатку вышэйшае палітычнае кіраўніцтва абедзьвюх дзяржаваў даволі выбарачна падыходзіла да ўзмацненьня заходніх межаў супольнасьці-саюзу-саюзнай дзяржавы — каб, крый Божа, не падумалі чаго на Захадзе, каб, барані Божа, не перайсьці т. зв. “чырвонай рысы”. Калі ж расейскія і беларускія кіраўнікі перастануць быць наіўнымі прасьцякамі ў міжнароднай палітыцы? Бо тыя ж палякі ў апошнія гады плянамерна і не зважаючы ні на што, узмацнялі межы з саюзнай дзяржавай. Цяпер, напрыклад, канчаецца абсталяваньне згодна з апошнімі стандартамі на польска-беларускай мяжы яшчэ дзьвюх новых заставаў з абарончымі ўмацаваньнямі і самым сучасным электронным кантролем (Нароўка і Пляска).

Па-другое, пераход да адзінай валютнай палітыкі і ўвядзеньне адзінай грашовай адзінкі ў саюзнай дзяржаве лічацца самым яскравым пацьвярджэньнем дзейснасьці інтэграцыйных намаганьняў ужо ў пэрыяд прэзыдэнцтва Ў. Пуціна. Ці так гэта? У сярэдзіне сакавіка ў інтэрвію газэце “Союз” першы намесьнік старшыні праўленьня Нацбанку Беларусі Павал Калаўр яшчэ раз (сьпярша — у нацыянальным сходзе Беларусі) пацьвердзіў, што пагадненьне з Расеяй зусім не азначае, што з 1 студзеня 2005 г. расейскі рубель стане выконваць функцыі адзінай валюты. Паводле словаў гэтага высокапастаўленага ўрадоўца, які агучыў пазыцыю рэспубліканскага кіраўніцтва, Беларусь захоўвае для сябе “варыянтнасьць выбару”, паколькі ня можа

прыйсьці да пагадненьня з Расеяй у пытаньні адзінага эмісійнага цэнтру.
Больш за тое, беларускі бок яўна спрабуе адцягнуць нават першыя крокі ў рашэньні гэтай праблемы, адкладваючы іх да пэрыяду распрацоўкі канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы. Гэты дакумэнт яшчэ толькі неабходна распрацаваць у сьценах саюзнага парлямэнту, але, як вядома, ён дагэтуль ня створаны, акурат выбары ў дадзены заканадаўчы орган зь віны Адміністрацыі прэзыдэнта А. Лукашэнкі ўвесь час пераносяцца на няпэўную пэрспэктыву. І, думаецца, зусім не задаволіць Расеі прапанаваная саюзьнікамі схема, паводле якой у нейкі адзіны эмісійны цэнтар уліюцца цэнтральныя банкі абедзьвюх дзяржаваў. Старшыня праўленьня НББ Пётра Пракаповіч у канцы сакавіка таксама заявіў, што ЦБ Расеі ні пры якіх умовах ня стане адзіным эмісійным цэнтрам саюзнай дзяржавы, бо гэта пярэчыць саюзнай дамове і беларускай канстытуцыі. У гэтым пытаньні кіраўніка НББ падтрымала і міністэрства юстыцыі Беларусі.
З заяваў Калаўра і Пракаповіча можна выснаваць, што і ў расейскім крэдыце ў цьвёрдай валюце Беларусь ня мае патрэбы. Гэта і нядзіўна — крэдыт ураду Расеі (першую траншу ў памеры 30 млн. даляраў) зьяўляецца зьвязаным і можа выкарыстоўвацца толькі на падтрымку беларускага рубля ў пераходны да адзінай валюты пэрыяд. НББ здолеў шляхам немудрагелістых спэкуляцыйных апэрацыяў у лютым крыху папоўніць уласныя рэзэрвы (на 15—18 млн. даляраў) і цяпер поўніцца аптымізмам. Паколькі Беларусь працягвае раздумваць і валаводзіць з нагоды расейскага крэдыту, то ствараецца ўражаньне, што акурат гэты крэдыт ёй у найбліжэйшы час сапраўды не патрэбны.
Зьвернем увагу, што замена нацыянальных валют адзінай павінна спалучацца зь іншымі кірункамі эканамічнай і фінансавай інтэграцыі, найперш з утварэньнем і пачаткам функцыянаваньня двухадзінай сыстэмы цэнтральных банкаў РФ і Беларусі. Без такой сыстэмы гаварыць аб пераходзе на адзіную валюту, а на добры лад і аб практычным стварэньні саюзнай дзяржавы, няма сэнсу. Задачы такой банкаўскай сыстэмы відавочныя: рэалізоўваць адзіны мэханізм плацяжоў, падтрымліваць неабходныя і дастатковыя ўзроўні золата-валютных рэзэрваў, ажыцьцяўляць узгодненую валютную

палітыку, уключаючы сумесныя вонкавыя фінансавыя апэрацыі. На Цэнтральны банк Расеі саюзным кіраўніцтвам павінна быць ускладзена галоўная функцыя — рэгуляваньне цэнавай палітыкі і падтрыманьне стабільнасьці саміх цэнаў, прадухіленьне інфляцыі. Для гэтага ЦБ РФ павінен быць незалежны як у прыняцьці рашэньняў, так і ў пляне кадравай палітыкі. А якраз на гэта кіраўніцтва Беларусі, мяркуючы з усяго, і не гатовае, таму што прывыкла дэталёва кантраляваць уласную нацыянальную банкаўскую сыстэму і яе кіраўніцтва. Ёсьць і яшчэ адзін немалаважны аспэкт. Пераход вагароў валютнай палітыкі да ЦБ РФ адразу пазбавіць вярхі Беларусі магчымасьці затуляць бюджэтныя дзіры і выплачваць вонкавую запазычанасьць (найперш саюзнай Расеі) у адвольным парадку. Не задавальняе беларускай эліты і іншае — непазьбежнае надзяленьне Цэнтрабанку Расеі новым прававым статусам, улучна з правам беспасярэдняга распараджэньня фінансавымі патокамі, нерухомасьцю на ўсёй саюзнай тэрыторыі, улучна, натуральна, з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусі. Апроч гэтага, будзе цалкам заканамерна, калі ЦБ РФ стане зусім самастойным у пытаньнях разьмеркаваньня капіталаў, разьмяшчэньня валютных укладаў, вылучэньня крэдытаў, правядзеньня трансфэрных апэрацыяў і апэрацыяў з рэзэрвовымі фондамі ў межах саюзнай дзяржавы. Нідзе ў сьвеце, як вядома, вышэйзгаданы шэраг рашэньняў не прымаецца выходзячы з прынцыпу “сувэрэннай роўнасьці” (на чым зацята працягваюць настойваць у Менску). Няма падставаў для выключэньняў і ў выпадку з Цэнтральным банкам Расеі, мэханізм прыняцьця рашэньняў якога будзе завязаны на фінансавым патэнцыяле канкрэтнай краіны-саюзьніцы і яе рэальнай долі ў статутным капітале саюзнага (у яго ролі — Цэнтральнага банку Расеі) банку.

Такім чынам, усе крокі саюзнага банку павінны будуць вызначацца ў першую чаргу прадстаўнікамі статутнага капіталу, а ў другую — акцыянэрамі (паводле схемы простай бальшыні). Беларускі бок да такога павароту ня толькі не гатовы, але ня можа прыняць такую пабудову сыстэмы ў прынцыпе: у Беларусі, як вядома, рашэньне такіх фінансавых праблем застаецца за праўленьнем НББ, якое прызначаецца і кантралюецца кіраўніцтвам Рэспублікі, галавой дзяржавы. Пры гэтым прэзыдэнт і ўрад Беларусі захоўваюць ня проста

кантроль за прынцыпамі палітыкі НББ, але і магчымасьць апэратыўнага ўмяшаньня ў яго дзейнасьць.
Цікава, што ў ходзе барацьбы за вагары кіраваньня эмісійным цэнтрам Расея і Беларусь нібыта забыліся пра такую актуальную праблему саюзнай дзяржавы, як заснаваньне Інстытуту інвэстыцый. Між тым інвэстыцыйны цэнтар саюзнай дзяржаве вельмі патрэбны, ягонае стварэньне ня можа адкладацца да лепшых часін, пераносіцца на нейкі наступны этап інтэграцыі. У прыватнасьці, інвэстыцыйны цэнтар спрыяў бы, не падмяняючы нацыянальных інвэстыцыйных праграмаў і інвэстыцыяў з саюзнага бюджэту, засяроджаньню намаганьняў на разьвіцьці новых відаў і формаў учыннай актыўнасьці, мадэрнізацыі прамысловага патэнцыялу і прыярытэтным ажыцьцяўленьні тых бізнэс-праектаў, якія ўяўляюць сабой асаблівую цікавасьць для ўдзельніцаў саюзнай дзяржавы. Адзначым, што ў дзейнасьці такога інвэстыцыйнага цэнтру, у яго рэсурсах і крэдытах зацікаўлена найперш Беларусь. Але і тут уся тая ж перашкода — інвэстыцыйны цэнтар значыць аўтаномнасьць з пазыцыяў статусу і функцыянаваньня, а кіраваньне ім — максымальную самастойнасьць.
Яшчэ адзін вузел застарэлых супярэчнасьцяў паміж Расеяй і Беларусяй хаваецца ў сфэры рэгуляваньня працэсу руху капіталаў. Увесь папярэдні досьвед у дадзеным пытаньні — нэгатыўны. Беларускі бок з зайздроснай упартасьцю адхіляе ўдзел расейскіх дзелавых колаў у прадпрымальніцтве і, тым больш, набыцьці імі акцый суб'ектаў гаспадараньня на сваёй тэрыторыі. Выключэньні, праўда, датычаць прамых інвэстыцыйных уліваньняў і прадастаўленьня крэдытных ліній пад кантролем нават ня ўраду, а непасрэдна прэзыдэнта.

Зразумець такую пазыцыю кіраўніцтва Беларусі, вядома, можна, улічваючы дзяржаўную ідэалёгію, але яна ўяўляецца неапраўданай, урэшце зьнікае магчымасьць прасоўваньня па шляху набыцьця якасьці канвэртаванасьці для валюты, выкарыстоўванай у абарачэньні ў Рэспубліцы. Без дасягненьня ўзаемнай свабоды перасоўваньня капіталаў нельга перайсьці і да больш высокага аб'яднаньня, якое павінна характарызавацца перадачай з-пад нацыянальнага кантролю ажыцьцяўленьня шэрагу плацяжоў, у першую чаргу ў сфэрах таварамены і аказаньня паслугаў. Сёньня аб разумнай палітыцы ў галіне

плацяжоў у межах саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі даводзіцца толькі марыць.
Па-трэцяе, як бы вырашаным лічыцца пытаньне аб фармаваньні саюзнага парлямэнту, абраньні дэпутатаў яго ніжняй палаты. Дзярждума РФ, прынамсі, ухваліла летась (праўда, толькі ў першым чытаньні) праект адпаведнага закону з расейскага боку. Але на гэтым усё і спынілася. Адміністрацыя прэзыдэнта Беларусі, нягледзячы на ўсе запэўніваньні, да сёньня ня ўнесла аналягічнага законапраекту ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі. Чаму працэс стварэньня парлямэнту саюзнай дзяржавы спыніўся? Ён жа мог запрацаваць яшчэ ў мінулым годзе. Адказ, на наш погляд, крыецца ў тым, што (пры ўсёй абмежаванасьці паўнамоцтваў) у самой сутнасьці расейска-беларускага заканадаўчага органу адпачатку і аб'ектыўна закладваецца магутны патэнцыял народаўладзьдзя, сапраўднай дэмакратыі. Элітам дзьвюх дзяржаваў гэта ня надта даспадобы.
Апроч таго, дзейнасьць саюзнага парлямэнту спрыяла б узмацненьню дзяржаўных асноваў новага расейска-беларускага ўтварэньня. Парлямэнт, як усім добра вядома, — гэта неабходны элемэнт сыстэмы кіраваньня дзяржавай. З другога боку, акурат парлямэнт — найбольш пэўны паказьнік гатоўнасьці палітычнага кіраўніцтва абедзьвюх дзяржаваў да стварэньня не на паперы, а ў рэчаіснасьці акурат супольнай, саюзнай дзяржавы (няхай у форме фэдэрацыі). Натуральна, што больш слабым формам партнэрства, і нават канфэдэрацыі, ніякі заканадаўчы орган ня толькі не патрэбны, але ён варожы іх сутнасьці.
Відавочна, палітычныя вярхі Расеі і Беларусі пакуль не гатовыя да фармаваньня саюзнай дзяржавы. Вось чаму іх працягвае задавальняць бледая імітацыя парлямэнцкай дзейнасьці ў выглядзе функцыянаваньня парлямэнцкага сходу саюзу Беларусі і Расеі. Ягоная структура, парадак фармаваньня, прынцыпы і паўнамоцтвы ў свой час былі няўдала "сьпісаныя" з Усеагульнай асамблеі Эўрапейскага аб'яднаньня вугалю і сталі (ЭАВС), якое даўно перастала існаваць. Як і там, дэпутаты парлямэнцкага сходу саюзу Беларусі і Расеі не абіраліся народамі дзяржаў-саюзьніцаў, а прызначаліся, кааптаваліся нацыянальнымі органамі. Гэты сурагат, варты жалю правобраз парлямэнту ніколі не прадстаўляў і не прадстаўляе цяпер

нікога, апроч самога сябе, ня мае практычна ніякіх паўнамоцтваў, уласьцівых заканадаўчаму органу. Дарэчы, для аматараў бяздумна капіяваць заходні досьвед, падкрэсьлім, што ў самой Заходняй Эўропе, якая імкнецца да кансалідацыі, ужо амаль чвэрць стагодзьдзя насельніцтва абірае свой парлямэнт (Эўрапарлямэнт) на прамых і ўсеагульных выбарах. Гэтаму не замінаюць і розныя выбарчыя сыстэмы: мажарытарная, прапарцыйная, мяшаная. Значыцца, якраз тое, што пры распрацоўцы законапраектаў выбараў у саюзны парлямэнт шмат кім разглядалася як галоўная цяжкапераадольная перашкода, якая патрабуе шматгадовай, працяглай працы для ўніфікацыі выбарчых кодэксаў абедзьвюх краінаў.

Нельга выключаць, што пэўныя колы вышэйшых чыноўнікаў і ў Беларусі, і ў Расеі не сьпяшаюцца з абраньнем саюзнага парлямэнту адно з тае прычыны, што такія выбары непазьбежна прывядуць да падвышэньня інтарэсу практычна ўсіх слаёў актыўнага насельніцтва сваіх краін да праблемы аб'яднаньня ў адну дзяржаву, да ўсьведамленьня праўдзівых чыньнікаў гамаваньня інтэграцыйнага працэсу, сярод якіх адзін з галоўных — чынавенскі падыход. Ня варта выключаць і імкненьня кіраўніцтва абедзьвюх краін пазьбегчы абвастрэньня многіх праблемаў унутрыдзяржаўнага характару, якія непазьбежна ўсплывуць, вылезуць у працэсе шырокай выбарчай кампаніі.

Саюзны парлямэнт зможа прадстаўляць інтарэсы грамадзян абедзьвюх краін, адстойваць іх перад найвышэйшай дзяржаўнай радай, саюзным урадам і інш. саюзнымі і нацыянальнымі органамі. Ён будзе прадстаўляць ужо не парлямэнты Расеі і Беларусі, а беспасярэдне народы РФ і Беларусі, што аб'ектыўна зробіць парлямэнт саюзнай дзяржавы больш аўтарытэтным і незалежным, дэмакратычным і легітымным. Галоўнае — грамадзяне расейска-беларускай дзяржавы паступова прыйдуць да ўсьведамленьня сябе як адзінага народу, які мае права і магчымасьць мець свой парлямэнцкі орган. З часам саюзны парлямэнт можа, хаця шмат каго "наверсе" гэта палохае ўжо цяпер, ператварыцца ў найвышэйшы орган заканадаўчай улады. Ну, а ў расейска-беларускай саюзнай дзяржаве, якая існуе толькі на паперы, зьявіцца найважнейшая прыкмета рэальнай дзяржавы.

І, нарэшце, па-чацьвертае, праблема адзінай канстытуцыі. Пакуль яе ў саюзнай дзяржавы проста няма. Таму саюзны парлямэнт павінен разглядацца як найважнейшы інстытут інтэграцыі, паколькі гэты карпаратыўны орган мае распрацаваць канстытуцыю саюзнай дзяржавы, канстытуцыйны акт. Без канстытуцыйных асноваў прасоўваньне па ўсім фронце інтэграцыі, ува ўсіх сфэрах палітычнага, фінансава-эканамічнага, вайсковага ўзаемадзяньня немагчымае. У адваротным выпадку ўсе намаганьні інтэгратараў будуць па-ранейшаму зводзіцца на нішто канстытуцыйнымі непаразуменьнямі.

Канстытуцыя неабходная саюзнай дзяржаве, паколькі толькі яна ў стане зацьвердзіць прававыя асновы палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сыстэмаў расейска-беларускай дзяржавы. Сёньня, калі канстытуцыя адсутнічае, любыя спробы радыкальных зьменаў дзяржаўных сыстэмаў Расеі і Беларусі ў мэтах інтэграцыі формаў кіраваньня, арганізацыі, усталяваньня і кампэтэнцыі уладных органаў бессэнсоўныя. Эўропа ўжо з пачатку XIII ст. ішла па шляху станаўленьня канстытуцыйнага права, усе эўрапейскія дзяржавы маюць канстытуцыі, і саюзнай дзяржаве ў гэтым пляне ня варта прыпадабняцца нейкаму Аману, які ня мае канстытуцыі.

Вядома, распрацоўку і прыняцьцё канстытуцыі ня варта спрашчаць, паколькі гэта вельмі складаны, доўгі і цяжкі працэс. Навідавоку і перашкоды, бо канстытуцыя прадугледжвае замацаваньне прынцыпаў разьдзяленьня ўладаў, дэмакратызацыю прававой сыстэмы, мэханізму дзяржаўнага кіраваньня, нутраной і вонкавай палітыкі, а таксама пашырэньне правоў і свабодаў асобы. Неабходна будзе закласьці прававыя гарантыі вяршэнства саюзнай канстытуцыі ўва ўсёй сукупнай сыстэме крыніцаў права, яе прыярытэтнасьці што да ўсіх іншых законаў і нормаў, якія рэгулююць сацыяльнае жыцьцё. Гэта запатрабуе намаганьняў, ня столькі чыста заканатворчых, але, у першую чаргу, рэалізацыі цалкам пэўнай палітычнай волі.

Пакуль жа, наадварот, усё больш сьведчаньняў прыхільнасьці найвышэйшай улады абедзьвюх краінаў да пазыцыі непарушнасьці нацыянальных канстытуцыйных асноваў, старых канстытуцыяў, якія набываюць якасьць “сьвятарнай каровы”. Чуйна ўлавіўшы гэты настрой “вярхоў”, частка правазнаўцаў

Расеі і Беларусі працягвае даводзіць, што канстытуцыю часта мяняць нельга, яе ўвогуле лепш не чапаць (інакш — сацыяльны выбух, хваляваньні і інш.).
Насамрэч прычына палягае ў іншым: у цяперашніх канстытуцыях Расеі і Беларусі ўстаноўлена і замацавана адна форма дзяржаўнага кіраваньня — прэзыдэнцкая. Адсюль і ўся арганізацыя сыстэмы найвышэйшых органаў дзяржаўнай улады, дзе прыярытэт, натуральна, аддадзены прэзыдэнту як кіраўніку дзяржавы. Таму меркаваць, што ў гэтых рэаліях зьмены ў нацыянальных канстытуцыях і прыняцьцё саюзнай канстытуцыі будуць праходзіць гладка і лёгка, а адпаведны рэфэрэндум абвесьцяць заўтра, — небясьпечная і вялікая аблуда. Існуючыя рэзкія, часам незамірэнчыя супярэчнасьці паміж палітычнымі элітамі Расеі і Беларусі робяць парлямэнцкі шлях усталяваньня канстытуцыйных асноваў саюзнай дзяржавы адзіна магчымым. Апошняя, сьнежаньская 1999 г. дамова паміж Рэспублікай Беларусяй і Расейскай Фэдэрацыяй з усёй нагляднасьцю прадэманстравала, што спадзявацца на паяву варыянту падоранай вярхамі канстытуцыі, падрыхтаванай у нетрах прэзыдэнцкіх адміністрацый, дарэмна.
Такім чынам, вышэй былі разгледжаны толькі тыя праблемныя вузлы аб'яднаўчага працэсу, па якіх, як пераконваюць грамадзкасьць абедзьвюх краін, дасягнуты значны прагрэс. Яго насамрэч няма. Што ж у такім выпадку казаць пра іншыя кірункі інтэграцыі?

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2001**
[image]

Валерка Булгакаў

Эканамічны нацыяналізм супраць культурнай экспансіі

Беларускі і расійскі сцэнары інтэграцыі

ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ галоўны рэдактар часопісу ARCHE, укладальнік зборніку "Быць (або ня быць) сяроднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне" ("Энцыклапедыкс", 2000).

Папярэдняя публікацыя ў часопісе — артыкул "Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму" (№1-2001).

1.

Першая думка, якая зьявілася пры азнаямленьні са зьмешчаным вышэй тэкстам Аляксандра Фадзеева: гэта адзін з элемэнтаў добра сплянаванай правакацыі. Прыкладна ў той час, калі ў рэдакцыю паступіў гэты артыкул, інфармацыйныя агенцыі паведамілі пра перанос на няпэўны тэрмін сэсіі парлямэнцкага сходу саюзу Расіі і Беларусі, а таксама пра часовае спыненьне трансьляцыі ў Беларусі расійскіх

тэлеканалаў у сувязі з паказам урачыстага сходу ў Палацы Рэспублікі, прысьвечанага 56-ай гадавіне перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У ходзе гэтага паказу быў цалкам перададзены зварот Аляксандра Лукашэнкі да вэтэранаў, а таксама сьвяточны канцэрт. Трансьляцыі былі адноўленыя толькі на другі дзень.
Гэтыя тры акцыі, адбытыя ў невялікі прамежак часу, падштурхоўваюць да высновы, што Аляксандар Лукашэнка рукамі сваіх паліттэхнолягаў распачаў прапагандысцкую кампанію, каб падчас прэзыдэнцкіх выбараў заручыцца падтрымкай той часткі беларускага грамадзтва, якая скептычна ставіцца да інтэграцыі з Расіяй.
Тое, што Лукашэнка з году ў год заігрывае з апазыцыйна настроеным да афіцыйна праводжанага палітычнага курсу, “несваім” электаратам, рэч відавочная. Але калі раней гэта адбывалася, так бы мовіць, на словах (прыгадаем Лукашэнкавае “Мы дапусьцілі страшны крэн на Ўсход”), то ў год прэзыдэнцкіх выбараў атрымала рэальны вымер. Сёлета беларускі рэжым імкнецца стварыць вобраз “новых апазыцыянэраў” асабіста аддадзеным першаму беларускаму прэзыдэнту дзеячам накшталт Івана Пашкевіча або Леаніда Сініцына. Іх няхітрая прадэмакратычная рыторыка і гучныя, але палітычна малаэфэктыўныя акцыі (напрыклад, праект “Пяць з плюсам” Леаніда Сініцына, пакліканы надаць легітымнасьць органам дзяржаўнага кіраваньня Рэспублікі Беларусі) ужо цяпер падштурхоўвае некаторых выбаршчыкаў ды высновы, што, па-першае, дэмакратыя ў Беларусі ўсё-ткі ёсьць, па-другое, яна не абавязкова мусіць зьвязвацца з імёнамі Вінцука Вячоркі або Сямёна Домаша і, па-трэцяе, гарантам гэтай дэмакратыі быў, ёсьць і будзе ня хто іншы, як Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка.
Але нават калі прыняць тэзыс пра такую шматхадовую правакацыю, неабходна пацікавіцца, якія ж матывы рухалі аўтарам публікацыі “Пяць гадоў яднаньня, альбо палітычная прахіндыяда”

2.
Артыкул “Пяць гадоў яднаньня...” зьявіўся ў № 26 Інфармацыйна-аналітычнага бюлетэню, выдаванага маскоўскім

Інстытутам Дыяспары і Інтэграцыі, які, у сваю чаргу, зьяўляецца структурным элемэнтам Інстытуту краін СНД, узначальванага Канстанцінам Затулінам, расійскім палітыкам і аналітыкам*.

* У аснову апошняга аналітычнага опусу Затуліна — артыкулу пад красамоўным назовам “Саюзная дзяржава на постсавецкай прасторы. Бяз поўнага аб’яднаньня з Расіяй дэмакратызацыя ў “асобна ўзятай” Беларусі немагчымая” (**http://cis.ng.ru/state/2001-05-30/4_state.html**) — лёг яго выступ на міжнароднай канфэрэнцыі “Беларусь паміж Усходам і Захадам: прэзыдэнцкія выбары-2001 і пэрспэктывы дэмакратыі”, адбытай 10—11 траўня ў Осьле з удзелам вядомых беларускіх палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў — Жаны Літвініхі, Аляксандра Мілінкевіча, Вінцука Вячоркі, а таксама пасла Ганса-Гэарга Віка. У публікацыі, што характэрна, жыўцом, без найменшых зьменаў узятыя некаторыя кавалкі тэкстаў аўтарства Аляксандра Фадзеева. Але ёсьць і ўласнае, затулінскае: “... мы ў Расіі не заўсёды падзяляем асобных крокаў прэзыдэнта Беларусі, усіх формаў і мэтадаў яго працы. Аднак гэта тое пытаньне, уплываць на якое мы напоўніцу ня зможам (не считаем в полной мере возможным), прынамсі, да поўнага аб’яднаньня Расіі і Беларусі”.
Канстанцін Затулін — расійскі парлямэнтар са стажам, гарачы прыхільнік расійска-беларускага аб’яднаньня. Этапы яго біяграфіі характэрныя для расійскіх палітыкаў “новай хвалі”: пры канцы 80-х ён памочнік сакратара ЦК УЛКСМ, у 1993—94 гг. — сакратар партыі “ПРЕС” у расійскай Дзяржаўнай Думе, з 1997 г. — дараднік мэра Масквы. У лютым 1996 г. пастановай ураду Ўкраіны за прапаганду расійскіх прэтэнзій на Крым быў абвешчаны на 5 год пэрсонай нон грата для ўезду ў Рэспубліку Крым**. 21 траўня 1999 году Затулін быў затрыманы ўкраінскімі памежнікамі ў кіеўскім аэрапорце. Летась ён шмат сілаў паклаў на прыняцьцё расійскім парлямэнтам законапраекту аб выбарах у саюзны парлямэнт дэпутатаў ад Расіі.

** Дзейнасьць Затуліна была прычынай войстрага канфлікту паміж галоўным рэдактарам “Советской Белоруссии” Паўлам Якубовічам і тагачасным галоўным рэдактарам “Знамени

Юности” Ігарам Гукоўскім, які ўрэшце прывёў да адстаўкі апошняга. “Зачэпкай для канфлікту, дакладней, для нападак на галоўнага рэдактара маладзёвай газэты “Знамя Юности” І. Гукоўскага паслужыў адкрыты ліст дырэктара Інстытуту краін СНД К. Затуліна галоўнаму рэдактару “Советской Белоруссии” Паўлу Якубовічу, у якім ён “у адказ на прыдумкі (измышления) П. Якубовіча наконт палітычнай пазыцыі К. Затуліна паказаў двудушнасьць (двуличие) спадара Якубовіча, які пад выглядам асаблівай лояльнасьці да прэзыдэнта А. Лукашэнкі і яго палітычнага інтэграцыйнага курсу стала і мэтаскіравана на старонках газэты Адміністрацыі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі “Советская Белоруссия” праводзіў і праводзіць сукрытую антыпрэзыдэнцкую, антырасійскую і пранатаўскую прапаганду”, — пісаў нейкі А. Пятроў у сваім артыкуле “О “пятой колонне” в Белоруссии. Кто пытается влиять на президента А. Г. Лукашенко” у № 7—8 часопісу “Русский вестник” за 1998 г.” (Цыт. паводле: Война по законам подлости. Менск: ЗАО “Православная инициатива”. С. 283.) Інстытут краін СНД Канстанціна Затуліна — адна зь нешматлікіх расійскіх *think tanks*, якая прафэсійна займаецца аналітыкай палітычных працэсаў на постсавецкім прасьцягу. Гэтая прафэсійнасьць спалучаецца зь вялікадзяржаўнымі, імпэрскімі падыходамі і геапалітычнымі амбіцыямі. У № 28 памянёнага бюлетэню зьмешчаны артыкул усё таго ж Аляксандра Фадзеева “Што значыць быць прэзыдэнтам у Беларусі”, дзе чытаем: “Беларусы, як і ўкраінцы, ня мелі ў мінуўшчыне “сваёй” дзяржаўнасьці, і таму, у сутнасьці, беларускія грамадзяне цалкам укладваюцца ў сучаснае разуменьне найноўшай *расійскай дыяспары* з усімі вынікаючымі з гэтага наступствамі, уключаючы, перадусім, усьведамленьне сваёй этнічнай ідэнтычнасьці з жыхарамі Расіі. У расійцаў і беларусаў супольная геаграфічная лякацыя, калектыўная памяць і гісторыя, нацыянальныя героі, культура і культурныя дасягненьні. І, што галоўнае — супольная радзіма... Больш за тое, сучасная Беларусь ня можа разглядацца як спачатнае (изначальное) этнадзяржаўнае ўтварэньне, якое мае глыбокае гістарычнае карэньне, паколькі ейная тэрыторыя — адвольна вызначаная ў якісьці пэрыяд існаваньня СССР адміністрацыйная адзінка, абмежаваная адміністрацыйнымі, насамрэч віртуальнымі, межамі тэрыторыя. У малой Беларусі

сёньня толькі расійцаў (ня лічачы грамадзян з расійскай крывёю ад мяшаных шлюбаў) каля 1,5 мільёна, г. зн. гэтулькі, колькі расійцаў ува ўсім далёкім замежжы. Падкрэсьлім, што толькі стварэньне ў сапраўднасьці (на деле) саюзнай расійска-беларускай дзяржавы здыме гэтую найвайстрэйшую праблему, адновіць гістарычную справядлівасьць у справе вызначэньня тытульнай нацыі".

Чаму ж настолькі важнае месца адводзіцца Беларусі расійскімі аналітыкамі*, што яны гатовыя нават скінуць беларусаў з п'едэсталу тытульнай нацыі ў сваёй уласнай краіне? Адказ на гэтае пытаньне дае сам А. Фадзееў у апублікаваным у № 23 бюлетэню артыкуле пад назвай "Пэрспэктывы прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі 2001 году і нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Расіі": "Народы Расійскай Фэдэрацыі і Рэспублікі Беларусі былі адзінай нацыяй, яны зьвязаны міжсобку векавымі гістарычнымі і культурнымі сувязямі. Без саюзу зь Беларусяй немагчымая рэалізацыя ў пэрспэктыве рэгіянальнага лідэрства Расіі ў Цэнтральнай Эўропе (а ў будучыні, можна спадзявацца, і ў Цэнтральна-Паўднёва-Ўсходняй Эўропе). Барацьба Расіі за рэгіянальнае лідэрства ўва Ўсходняй Эўропе сёньня значна больш прадуктыўная за беспасьпяховыя спробы далучыцца на роўных да "сямёркі" і адыгрываць ролю сусьветнай дзяржавы ў няўклюдным выкананьні расійскага МЗС. Саступіўшы ж лідэрства Польшчы, якая не хавае сваіх стратэгічных памкненьняў у гэтым кірунку (барацьба за лідэрства ў Цэнтральнай Эўропе — асноўны прынцып яе афіцыйнай вонкавапалітычнай канцэпцыі), Расія ня толькі сутыкнецца з новым "залатым актаэдрам" (заміж цяперашняга "трыкутніка") на сваіх заходніх межах, але канчаткова згубіць надзею дадатна вырашыць украінскае пытаньне".

* Аляксандар Фадзееў не самотны ў сваіх далёкасяжных высновах. Навуковы супрацоўнік Інстытуту параўнальнай паліталёгіі РАН Барыс Кагарліцкі ў сваім аналізе "Саюз мядзьведзя і вялізнага ката́" ("Союз медведя и очень большой кошки" (**http://www.intellectualcapital.ru/iss3-1/icissue1-1.htm**)) апісвае значэньне "беларускага чыньніка" цалкам у духу "новых дыскусій пра расійскі фэдэралізм": "Аб'яднаньне зь Беларусяй ... можа стаць пераломным момантам, зь якога пачнецца пабудова нармальнай

фэдэратыўнай дзяржавы, якая будзе складацца з 30—40 раўнапраўных суб'ектаў. Прапанаваны Лукашэнкам рэфэрэндум дазваляе як бы пачаць з чыстага аркуша, стварыўшы фактычна новую дзяржаву, з новымі тэрытарыяльнымі структурамі. Эмацыйную падтрымку аб'яднаньня можна выкарыстаць, каб зламіць супрацьдзеяньне некаторых рэгіянальных элітаў, пагатоў што асобныя рэгіёны самі зацікаўленыя ў рэформе...". У публікацыі Кагарліцкага прысутнічаюць такія выказваньні, характэрныя для мысьленьня маскоўскай інтэлігенцыі, як, напрыклад, "Беларусь сапраўды паліцыйная дзяржава: у цэнтры Менску можна пакінуць незачыненую машыну, цьвёрда ведаючы, што зь ёй нічога ня здарыцца" або "Хто насамрэч ненавідзіць прэзыдэнта, дык гэта адукаваная менская сярэдняя кляса. Гэтыя людзі з зайздрасьцю пазіраюць на сваіх маскоўскіх калегаў і знаёмых, якія забясьпечылі сабе заходняе спажываньне за кошт галадуючай краіны".

3.

Як расійскі нацыяналіст, Аляксандар Фадзееў горача прымаў і прымае беларуска-расійскую інтэграцыю. Пры гэтым Беларусь для яго — ня што іншае, як разьменная карта ў складанай геапалітычнай гульні, стратэгічны пляцдарм, захапіўшы які, можна "дадатна вырашыць украінскае пытаньне" і вярнуць страчаны геапалітычны кантроль над часткай Эўропы, якая ляжыць да нямецкай, аўстрыйскай, грэцкай і італьянскай (*sic!*) мяжы. Расійскі нацыяналізм Фадзеева характэрным чынам спалучаецца зь ярка выражаным нігілізмам што да іншых, "мясцовых" у расійскай тэрміналёгіі культур, напрыклад, беларускай. Ім фактычна адмаўляецца ў праве на існаваньне. Аляксандар Фадзееў усяляк жадае прысьпешыць інтэграцыю. Адзін з найважнейшых матываў, які рухаў ім у гэтай публікацыі, палягае ў выяўленьні *сабатажу*, які нібыта чыніцца ёй пэўнымі палітычнымі сіламі.

Паказальна, што аб'ектам атакі становіцца вышэйшае чынавенства Беларусі ("... пэўныя колы вышэйшых чыноўнікаў і на Беларусі, і ў Расіі не сьпяшаюцца з абраньнем саюзнага парлямэнту адно з тае прычыны, што такія выбары непазьбежна прывядуць да падвышэньня інтарэсу практычна

ўсіх слаёў актыўнага насельніцтва сваіх краін да праблемы аб'яднаньня ў адну дзяржаву, да ўсьведамленьня праўдзівых чыньнікаў гамаваньня інтэграцыйнага працэсу, сярод якіх адзін з галоўных — чынавенскі падыход"). Вышэйшае чынавенства і шырэй, дзяржаўны апарат Беларусі выклікае фрустрацыі маскоўскіх аналітыкаў з той простай прычыны, што ўяўляе сабой сацыяльную групу, якая за апошнія дзесяць гадоў перажыла дастаткова поўную сувэрэнізацыю і зьвязвае свае асабістыя інтарэсы зь дзяржаўнымі, а значыць і нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі.

Пры гэтым само вайстрыё атакі накіравана на Адміністрацыю прэзыдэнта Беларусі (як піша Фадзееў, "...[канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы] яшчэ толькі неабходна распрацаваць у сьценах саюзнага парлямэнту, але, як вядома, ён дагэтуль ня створаны, акурат выбары ў дадзены заканадаўчы орган зь віны адміністрацыі прэзыдэнта А. Лукашэнкі ўвесь час пераносяцца на няпэўную пэрспэктыву", і праз старонку ізноў: "Адміністрацыя прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, нягледзячы на ўсе запэўніваньні, да сёньня ня ўнесла аналягічнага законапраекту ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу рэспублікі"), што аўтаматычна навешвае этыкетку сабатажніка яе кіраўніку Міхаілу Мясьніковічу. Бедны Міхалу! Відаць, адчуваючы гэткага роду небясьпеку, летась ён двойчы надрукаваў свой опус пад назвай "На шляху да яднаньня" ("На пути к единению") сьпярша ў маскоўскім часапісе "Обозреватель" (№ 6 за 2000 г.), а пасьля ў ня менш адыёзным "Евразийском вестнике" (**http://www.e-journal.ru/soyz-st1.html**). Заключае гэты артыкул, напоўнены шматлікімі і ні да чога не абавязваючымі зьвесткамі з эканомікі і геаграфіі, наступны фрагмэнт: "Мы хочам збудаваць моцную і дэмакратычную саюзную дзяржаву, якая будзе карыстацца высокім аўтарытэтам у міжнароднай супольнасьці, дзяржаву, у якой рэальна будуць забясьпечвацца і надзейна абараняцца правы грамадзяніна і чалавека...".

Такім чынам, непакой у маскоўскіх аналітыкаў выклікае сам факт таго, што за часы незалежнасьці Беларусі ў краіне паўсталі самастойныя эліты, якія адкрыта артыкулююць свае інтарэсы, істотная частка якіх разыходзіцца з інтарэсамі элітаў расійскіх (у артыкуле Фадзеева гэтая тэма прагучэла пару разоў і неяк подбегам, напрыклад, у зьвязку зь фінансавым

аспэктам беларуска-расійскай інтэграцыі: “Не задавальняе беларускую эліту і іншае — непазьбежнае надзяленьне Цэнтрабанку Расіі новым прававым статусам, улучна з правам беспасярэдняга распараджэньня фінансавымі патокамі, нерухомасьцю на ўсёй саюзнай тэрыторыі, улучна, натуральна, з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусі”; толькі пры канцы артыкулу тэма гэтая гучыць надзвычай завойстрана: “Існуючыя рэзкія, часам незамірэнчыя супярэчнасьці паміж палітычнымі элітамі Расіі і Беларусі робяць парлямэнцкі шлях усталяваньня канстытуцыйных асноваў Саюзнай дзяржавы адзіна магчымым”). Галоўным жа прадстаўніком новых беларускіх элітаў уваччу Масквы ёсьць Аляксандар Лукашэнка.

4.

У сытуацыі сутыкненьня і канфлікту жыцьцёва важных інтарэсаў менскіх і маскоўскіх элітаў Лукашэнка дагэтуль перайграваў Маскву, навязваючы ёй свой уласны, *беларускі* сцэнар інтэграцыі. Выкарыстоўваючы традыцыйную савецкую рыторыку і фразэалёгію, яму ўдавалася знаходзіць пачуцьцёвы водгук і падтрымку сярод расійскіх палітыкаў і бізнэсоўцаў. Артыкул Аляксандра Фадзеева досыць відавочна паказвае, што “эмацыйная” прывабнасьць беларускага прэзыдэнта прынамсі ў расійскіх “апініятворчых” колах рэзка ідзе на спад. Ужо цяпер яму пачынаюць выстаўляць рахункі. Здаецца, яшчэ момант, і для Масквы Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка станецца больш небясьпечны за Леаніда Данілавіча Кучму.

Пра канфлікт беларускага і расійскага сцэнароў інтэграцыі трэба сказаць некалькі словаў асобна. Як вынікае зь “Пяцёх гадоў яднаньня...”, для расійцаў інтэграцыя — гэта фактычна рэкалянізацыя, культурна-эканамічнае паглынаньне з абавязковай заменай “мясцовай адміністрацыі” на прызначаную з імпэрскага цэнтру. І ня важна напачатку, поўнай ці частковай будзе гэтая замена.

Імпэратывам “інтэграцыі па-расійску” ёсьць аслабленьне юрыдычнай і фінансавай самастойнасьці “інтэграванай тэрыторыі” пры захаваньні і павелічэньні культурнага і інфармацыйнага ўплываў, а таксама стварэньне сьпярша фармальна наддзяржаўных органаў, якія зь цягам часу могуць перарасьці ў органы адзінай дзяржавы. Стаўкі Масквы пры такой інтэграцыі вельмі высокія — яе посьпех будзе азначаць

ня столькі зьліцьцё дзьвюх “старых” дзяржаваў у адну “новую”, колькі ператварэньне народаў-насельнікаў гэтых дзяржаваў у адну новую “супэрнацыю” (“Галоўнае — грамадзяне расійска-беларускай дзяржавы паступова прыйдуць да ўсьведамленьня сябе як *адзінага народу* (вылучэньні нашы — **Аўт.**), які мае права і магчымасьць мець свой парлямэнцкі орган”, — рэжа з пляча Аляксандар Фадзееў).

У выпадку Беларусі, апрача культурнай катастрофы і адміністрацыйнай сумятні, рэалізацыя расійскага сцэнару інтэграцыі на практыцы азначала б разбурэньне сфармаванай сыстэмы дзяржаўнага кіраваньня Рэспублікі Беларусі, якой бы яна ні была, кардынальную ломку існуючых дачыненьняў улады і ўласнасьці (нагадаем ужо працытаванае: “Не задавальняе беларускую эліту і іншае — непазьбежнае надзяленьне Цэнтрабанку Расіі новым прававым статусам, улучна з правам беспасярэдняга распараджэньня фінансавымі патокамі, *нерухомасьцю* (вылучэньне наша — **Аўт.**) на ўсёй саюзнай тэрыторыі, улучна, натуральна, з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусі”).

Тэма жудаснай неэфэктыўнасьці беларускага дзяржаўнага апарату ў развагах маскоўскіх аналітыкаў таксама прысутнічае не дарма. Так, ува ўжо згаданым артыкуле Фадзеева “Пэрспэктывы прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі 2001 г. і нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Расіі” ўтрымліваецца цэлы шэраг нападак на беларускі дзяржаўны апарат: “Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў дзяржаўны апарат Рэспублікі Беларусі, пры наяўнасьці пэўнай кагерэнтнасьці і згуртаванасьці, пакуль не праяўляе здольнасьці да разуменьня вайстрыні паўсталых перад ім заданьняў, а асобныя ідэалягемы, якімі ён кіруецца, не ўяўляюць сабой адзінай і закончанай ідэалягічнай сыстэмы. Непасьлядоўнасьць у дзеяньнях органаў улады ў шмат чым як і раней тлумачыцца боязяй прыняцьця канчатковых рашэньняў, што сьведчыць, перадусім, пра *пераходны* (вылучэньне наша — **Аўт.**) характар самой дзяржаўнай улады, якая знаходзіцца на пэўнай стадыі на шляху да канчатковай сыстэмнай інстытуалізацыі”. З такога роду аналітычных канструкцый вынікае, што “канчатковая сыстэмная інстытуалізацыя” беларускага дзяржаўнага апарату можа адбыцца толькі пры *пераходзе* дзяржаўнай улады ў іншую якасьць — марыянэткавай каляніяльнай адміністрацыі, у сфэру кампэтэнцыі якой не

ўваходзяць ні фінансавыя, ні прававыя пытаньні. Як не ўваходзяць пытаньні ваеннага будаўніцтва, аховы мяжы, мытнай і фіскальнай палітыкі*.

* Ці трэба дадаваць, што галоўная мэта навязьлівай нэгатыўнай крытыкі эканамічнага курсу беларускіх уладаў пры адначасовай завышанай ацэнцы расійскіх гаспадарчых ператварэньняў *у гэтым кантэксьце* перадусім палягае ў “выкрываньні” неэфэктыўнасьці беларускага дзяржаўнага апарату да кіраваньня краінай, няздольнасьці беларускіх элітаў ажыцьцяўляць дзейсны макраэканамічны мэнэджмэнт. Апошні паводле часу аналіз Аляксандра Фадзеева — “Беларуская эканоміка ў год выбараў прэзыдэнта”, большая частка якога была перадрукавана газэтай “Наша Ніва”, не пакідае ў гэтым жадных сумлеваў: “Рэспубліканскае кіраўніцтва вырашэньне сваіх эканамічных праблемаў напярэдадні выбараў зьвязвае ў апошні час з атрыманьнем ільготных крэдытаў або ад багатых арабскіх краінаў, у прыватнасьці, пэўныя надзеі пакладаюцца на Кувэйт, або на Кітай. Пра сур’ёзную рэформу ў сфэры эканомікі пакуль няма мовы”.
З гледзішча Масквы незалежнасьць Беларусі захоўваецца фактычна дзякуючы апартунізму беларускай намэнклятуры, а не рашучасьці прадстаўнікоў беларускай апазыцыі ці непадкупнасьці дзеячоў беларускай культуры (хаця ў гэтым ёсьць момант правакацыі і прапаганды — каб усяляк прынізіць ролю апошніх у палітычным жыцьці Беларусі; Маскве выгадна разглядаць іх як статыстаў у гульні зь вялікімі стаўкамі, у якой удзельнічаюць сапраўды сур’ёзныя асобы). Беларуская намэнклятура як носьбіт рэальнай незалежнасьці Беларусі — гэтая рэальнасьць яшчэ не ацэненая беларускімі аналітыкамі як мае быць.
Заканамерна, што расійскі сцэнар інтэграцыі цішком сабатуецца беларускімі ўладамі на самым высокім узроўні. Ня выключана, што ціхі сабатаж напаткае і тыя новыя інтэграцыйныя ініцыятывы, якія, як вынікае з артыкулу Аляксандра Фадзеева, Расія рыхтуецца прапанаваць ужо ў найбліжшай будучыні.

5.

Самым пэрспэктыўным кірункам інтэграцыі, на думку Фадзеева, павінна стаць уніфікацыя канстытуцыйнага і інш. заканадаўства дзьвюх краін. Як ён піша, “час зразумець, нарэшце, што нельга ажыццявіць захады вайсковага будаўніцтва ў саюзнай дзяржаве без папярэдняга рашэньня галоўных палітычных і канстытуцыйных пытаньняў, якія пяць год настойліва ігнараваліся”.

Фадзееў схільны акурат у роўніцы права бачыць прычыну таго, што буксуе вайсковая інтэграцыя паміж Расіяй і Беларусяй (“Гэтыя цудоўныя дакумэнты… не маглі быць рэалізаваныя з той простай прычыны, што аб’ектыўна патрабавалі зьмены нацыянальных канстытуцыяў Расеі і Беларусі, вайсковага заканадаўства і іншых законаў абедзьвюх дзяржаваў”). Але што там ні гаварылася, уніфікацыя канстытуцыйнага і інш. заканадаўства для Масквы — гэта інтэграцыйная пэрспэктыва, так бы мовіць, першага ўзроўню. Расійскі сцэнар інтэграцыі будзе рэалізаваны толькі пры ўмове вырашэньня інтэграцыйнай задачы другога ўзроўню — ліквідацыі прэзыдэнцкай формы дзяржаўнага кіраваньня ў Беларусі ў такім выглядзе, у якім яна склалася за апошнія 7 гадоў. Чаму? Давайце зноў учытаемся ў аналізаваны тэкст.

На першы погляд, Аляксандар Фадзееў нават робіць Лукашэнку такі сабе рэвэранс. Ён, напрыклад, піша: “Яшчэ адзін вузел застарэлых супярэчнасьцяў паміж Расеяй і Беларусяй хаваецца ў сфэры рэгуляваньня працэсу руху капіталаў. Увесь папярэдні досьвед у дадзеным пытаньні — нэгатыўны. Беларускі бок з зайздроснай упартасьцю адхіляе ўдзел расейскіх дзелавых колаў у прадпрымальніцтве і, тым больш, набыцьці імі акцый суб’ектаў гаспадараньня на сваёй тэрыторыі. Выключэньні, праўда, адзначаны адносна прамых інвэстыцыйных уліваньняў і прадастаўленьня крэдытных ліній ў пад кантролем нават ня ўраду, *а непасрэдна прэзыдэнта*” (вылучэньні нашы — **Аўт.**). Аднак на гэтым усе пазытыўныя знакі ўвагі да першага прэзыдэнта Беларусі і канчаюцца. Больш за тое, расійскі аўтар пачынае раскідвацца яўнымі інвэктывамі: “Відавочна, палітычныя вярхі Расіі і Беларусі пакуль не гатовыя да фармаваньня саюзнай дзяржавы”. У гэтым кантэксьце пачынае зусім інакш гучаць кагадзе працытаванае: “Час зразумець, нарэшце, што нельга ажыццявіць захады вайсковага будаўніцтва ў саюзнай дзяржаве без папярэдняга рашэньня

галоўных *палітычных* (вылучэньні нашы — **Аўт.**) і канстытуцыйных пытаньняў, якія пяць год настойліва ігнараваліся”.
Насамрэч *першае* і *апошняе* палітычнае пытаньне для расійскага пляну інтэграцыі — як хутка і эфэктыўна зьнішчыць сыстэму прэзыдэнцкай улады на Беларусі. І гэта адкрыта цьвердзіць расійскі аналітык Фадзееў: “Насамрэч прычына [інтэграцыйных праблем] заключаецца ў іншым: у цяперашніх канстытуцыях Расійскай Фэдэрацыі і Рэспублікі Беларусі ўстаноўлена і замацавана адна форма дзяржаўнага кіраваньня — прэзыдэнцкая. Адсюль і ўся арганізацыя сыстэмы вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, дзе прыярытэт, натуральна, аддадзены прэзыдэнту, як кіраўніку дзяржавы. Таму меркаваць, што ў гэтых рэаліях зьмены ў нацыянальных канстытуцыях і прыняцьцё саюзнай канстытуцыі будуць праходзіць гладка і лёгка, а адпаведны рэфэрэндум абвесьцяць заўтра — небясьпечная і вялікая аблуда”. Разгорнем гэты тэзыс: павелічэньне ўладных паўнамоцтваў беларускага прэзыдэнта азначае запаволеньне інтэграцыйных працэсаў, і наадварот*.

* Зь іншага боку, ад палітычнай сьмерці для Масквы Лукашэнку ратуе беларуская апазыцыя. Яе ўзмацненьне пацягне за сабой павелічэньне падтрымкі Расіі асабіста Лукашэнкі і створанага ім рэжыму.

6.
Чаму ж нарастае адчужэньне паміж Лукашэнкам і новымі расійскімі элітамі? Паспрабуем выясьніць прычыны гэтай нелюбосьці эканамічнымі чыньнікамі.
Як мы кагадзе высьветлілі, для расійцаў інтэграцыя зь Беларусяй — гэта перадусім культурна-эканамічная экспансія. Прычым новыя расійскія эліты зацікаўленыя ў гэтым эканамічным складніку экспансіі / інтэграцыі ня менш, а можа нават больш, чым у экспансіі культурнай, бо эканамічная дамінацыя стварае трывалае заплечча для рознага роду культурных ініцыятываў.
Расійская спэцыфіка такая, што ў гэтай краіне палітыка цесна зьвязаная з эканомікай. Адзін зь фігурантаў гэтага аналізу Канстанцін Затулін адначасова буйны расійскі бізнэсоўца.
У свой час ён быў арганізатарам і кіраўніком шэрагу

камэрцыйных структур, у прыватнасьці, заснавальнікам і кіраўніком Маскоўскай таварнай біржы, сталым чальцом яе біржавога камітэту, а таксама прэзыдэнтам “Міжнароднага Біржавога і Гандлёвага Саюзу”.
Капітал новых расійскіх элітаў быў сфармаваны ў выніку глыбокага ператварэньня існуючых эканамічных адносінаў у краіне, выкліканага, у прыватнасьці, прыватызацыяй дзяржаўнай уласнасьці. Атрымаўшы капітал за досыць хуткі адцінак часу, часта неправавым ці напаўлегальным чынам, новыя расійскія капіталісты імкнуцца выкарыстоўваць яго з максымальнай аддачай. Павелічэньне прыбытку пры выкарыстаньні капіталу зьвязваецца імі з пашырэньнем абсягу яго дзеяньня (як тут не прыгадаць клясычную формулу Маркса: “Патрэба пастаяннага павелічэньня рынку дзеля збыту сваіх тавараў гоніць буржуазію па ўсёй плянэце”)**.

**Уздым расійскай прамысловасьці, абумоўлены павелічэньнем эканамічнага значэньня расійскага малога і сярэдняга бізнэсу, ужо цяпер павышае прывабнасьць беларускага рынку для збыту расійскай прадукцыі. Гэта істотна зьмяняе балянс сілаў, бо калі раней інтэграцыю інсьпіраваў дзяржаўна-манапалістычны капітал сыравіннай і вайскова-прамысловай галінаў народнай гаспадаркі, то цяпер інтарэс у інтэграцыі пачынае сыходзіць зьнізу, з боку непараўнальна меншых суб’ектаў гаспадараньня. Хаця, калі па шчырасьці, Аляксандар Фадзееў выдае жаданае за сапраўднае, калі ў нарысе “Перадвыбарная сэнсацыя” піша: “Цяпер як ніколі відавочна, што беларускія вытворцы прайграюць у канкурэнтнай барацьбе ня толькі заходнім імпарцёрам, але і расійскім пастаўнікам, якія літаральна запоўнілі рынак Беларусі таннымі і якаснымі таварамі, выцесьніўшы зь яго шэраг традыцыйных, айчынных”. Аднак ход яго думкі вельмі паказальны.
У артыкуле Фадзеева ёсьць момант, ключавы для разуменьня таго, чаму павялічваецца дыстанцыя паміж беларусім прэзыдэнтам і расійскімі бізнэс-коламі. Зьвернемся яшчэ разу да прыведзенага кагадзе фрагмэнту: “Яшчэ адзін вузел застарэлых супярэчнасьцяў паміж Расіяй і Беларусяй хаваецца ў сфэры рэгуляваньня працэсу руху капіталаў. Увесь папярэдні досьвед у дадзеным пытаньні — нэгатыўны. Беларускі бок з зайздроснай упартасьцю адхіляе ўдзел расійскіх дзелавых

колаў у прадпрымальніцтве і, тым больш, набыцьці імі акцый суб'ектаў гаспадараньня на сваёй тэрыторыі. Выключэньні, праўда, адзначаны адносна прамых інвэстыцыйных уліваньняў і прадастаўленьня крэдытных ліній пад кантролем нават ня ўраду, а непасрэдна прэзыдэнта".
Як для даўнага бээсэсэраўскага нацыяналіста, любы іншаземны капітал для Лукашэнкі аднолькава чужы. Сваім абраньнем на пасаду прэзыдэнта ён абавязаны перадусім лёзунгам сваёй перадвыбарчай кампаніі, якія абвяшчалі ўсямерную падтрымку буйной і сярэдняй беларускай прамысловасьці. За гады свайго прэзыдэнцкага кіраваньня Лукашэнка, як яму здавалася, рабіў усё, каб забясьпечыць яе больш-менш стабільнае функцыянаваньне. З гэтай стабільнасьцю ён зьвязвае і шанцы на сваё палітычнае выжываньне ў будучым.
Дапушчэньне буйнога расійскага капіталу — такім, якім ён ёсьць — на нутраны беларускі рынак для Лукашэнкі было б раўназначнае палітычнаму самагубству. Як і рэалізацыя расійскага пляну інтэграцыі, гэта б пацягнула за сабой новы перадзел уласнасьці, зьмяненьне рамкавых умоваў гаспадараньня і, што найважнейшае, непрадказальную рэструктурызацыю народнай гаспадаркі Беларусі, выкліканую яе падгонкай да патрэбаў расійскага, а не беларускага рынку. На практыцы гэта прывяло б да масавага банкруцтва беларускіх заводаў і фабрык, да рэзкага ўзросту беспрацоўя і г. д. А эканамічныя катаклізмы непазьбежна справакавалі б катаклізмы сацыяльныя, што ў выніку істотна б звузіла сацыяльную базу падтрымкі цяперашняга беларускага рэжыму і, магчыма, паставіла крыж на самой ідэі інтэграцыі з Расіяй, так па-свойму дарагой Лукашэнку.

7.

Фадзееўскі аналіз паказвае, наколькі агрэсіўныя мэты ў дачыненьні да Беларусі можа перасьледаваць новая расійская адміністрацыя*. Крывавая разьніна ў Чачні, здушэньне апазыцыйных расійскіх СМІ — гэта, можа быць, толькі першыя этапы доўгатэрміновага пляну, пакліканага павялічыць прэстыж дзяржаўнай улады Расійскай Фэдэрацыі**.

* Паказальна, што адзін з апошніх указаў Пуціна, які ўводзіць

рэжым лібэралізацыі для вывазу капіталу ў краіны СНД, застаўся зусім незаўважаным у беларускіх мэдыях.
** Заходняму назіральніку такая пастаноўка пытаньня можа здацца посткаляніяльнай абсэсіяй. Насамрэч, ці не запомніцца Ўладзімер Пуцін яго сучасьнікам як ініцыятар маштабнай мадэрнізацыі розных сфэраў жыцьця Расійскай Фэдэрацыі. За няпоўныя два гады свайго кіраваньня ён запачаткаваў рэформу мэдычнага абслугоўваньня і пэнсійнай сыстэмы, канстытуцыйнага ладу, партыйнай, падатковай сыстэмы і г. д. Экспансіянізм жа, якім стала характарызавацца замежная палітыка Крамлю, заўважны адно ў рэгіёне, у якім толькі аслабленая глыбокім унутраным крызысам Расія і здольная праяўляць актыўнасьць — на абшарах СНД і насамперш ува Ўкраіне і Беларусі.
Так і не засвоіўшы горкага гістарычнага досьведу, Расія вяртаецца ў Беларусь у якасьці агрэсіўнай імпэрскай сілы, якая для дасягненьня сваіх стратэгічных, “вселенскіх” мэтаў гатовая паступацца народамі і культурамі, дзяржавамі і грамадзтвамі... Тое, што гэта раней ці пазьней адбудзецца, Лукашэнка, відаць, цьмяна вычуваў яшчэ ў сярэдзіне 90-ых. Сапраўды, часам здаецца, што распачаты беларускім лідэрам працэс інтэграцыі — гэта ня што іншае, як *гульня на апярэджаньне*, а выйгранкай у гэтай гульні — каналізацыя народнай энэргіі ў патрэбным для беларускай дзяржавы рэчышчы.
Каб раскрыць сутнасьць беларускага сцэнару інтэграцыі, важна адказаць на адно прынцыповае пытаньне: ці была яна абумоўленая аб’ектыўным запатрабаваньнем беларускага грамадзтва, ці ўсё ж гэта *idée fixe* першага беларускага прэзыдэнта?
Як паказваюць апытаньні, праведзеныя незалежнымі сацыялягічнымі агенцыямі, стаўленьне беларускіх грамадзянаў да інтэграцыі паміж Расіяй і Беларусяй дастаткова пазытыўнае. Ува ўсякім разе, колькасьць тых, хто выступае супраць яе або пакуль яшчэ вагаецца, значна саступае колькасьці яе безумоўных прыхільнікаў. Гл., напрыклад, табліцу* на наступнай старонцы.

* Дадзеная табліца створана на падставе апытаньня, праведзенага 21.09.2000. Як паведамляе агенцыя Белапан, згодна з сацыялягічным апытаньнем НІСЭПД, у сакавіку 2001 г.

за саюз Расіі і Беларусі выступала 59 % жыхароў Беларусі. Як бачым, ідэя карыстаецца вялікай сацыяльнай падтрымкай нязьменна, хаця тое ж самае апытаньне паказала, што меншыня беларусаў выказваецца за зьліцьцё Расіі і Беларусі ў адну дзяржаву. Таксама зварачаем увагу на ваганьне лічбы прыхільнікаў Саюзу.
Тое, што палітыка збліжэньня з Расіяй увогуле адпавядае цяперашнім запатрабаваньням беларускага грамадзтва, выразна ўсьведамляе кааліцыя апазыцыйных кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта Беларусі, т. зв. “пяцёрка”. У супольна прынятай праграме яна заявіла, што інтэграцыйныя захады ў рамках “Саюзу дзьвюх сувэрэнных дзяржаваў” будуць працягнутыя ў выпадку абраньня апазыцыйнага кандыдата на пасаду прэзыдэнта краіны. Нэгатыўная рэакцыя на гэткага роду заяву сакратара Сойму БНФ Вячаслава Сіўчыка і прэс-сакратара Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ Валер’я Буйвала толькі дадала грамадзкай падтрымкі гэтай апазыцыйнай кааліцыі — масавай сьвядомасьці беларускіх грамадзян цяпер навязваецца думка, што агрэсіўныя, прагныя рэваншу нацыяналістычныя сілы і кандыдаты на пасаду прэзыдэнта ад дэмакратычнай грамадзкасьці ніяк міжсобку не зьвязаныя**.

** У гэтую схему цудоўна кладзецца кладзецца той растыражаваны беларускімі мэдыямі і на першы погляд алягічны факт, што ўзначаленая Станіславам Шушкевічам Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада пастанавіла прыпыніць сваё членства ў Каардынацыйнай Радзе Дэмакратычных Сілаў датуль, пакуль яе члены “ня зоймуць прынцыповай пазыцыі ў дачыненьні да дзяржаўнага сувэрэнітэту і кандыдатаў у прэзыдэнты, якія выступаюць за саюз Расіі і Беларусі”, а таксама падтрымаць вылучэньне кандытатам у прэзыдэнты Зянона Пазьняка.

8.
Задуманы афіцыйнымі беларускімі ўладамі і ўпаасобку першым беларускім прэзыдэнтам уласны сцэнар інтэграцыі істотна розьніцца ад расійскага. Калі расійцы пры дапамозе інтэграцыйных працэсаў імкнуцца захапіць новыя эканамічныя прасторы, то беларусы, наадварот, імкнуцца захаваць

эканамічны статус-кво. Іншымі словамі, інтэграцыя для беларусаў мае служыць перадусім кансэрвацыі існуючай структуры эканомікі і дачыненьняў уласнасьці, адпаведнай ёй палітычнай сыстэмы Беларусі, а таксама ідэалягічным мэтам (сацыяльнай мабілізацыі).

Рэалізацыя беларускага сцэнару інтэграцыі была шмат у чым прадвызначана асобай прэзыдэнта Лукашэнкі. Фактычна, ён першы з буйных беларусіх палітыкаў парваў з савецкім мінулым і пачаў арыентавацца на жывы беларускі палітычны рынак, тым часам некаторыя палітыкі адраджэнскай арыентацыі перабывалі і часам яшчэ дагэтуль перабываюць у стане агрэсіўнага інфантылізму — замест таго, каб адаптаваць свае палітычныя праграмы да запытаў беларускага грамадзтва, яны каторы ўжо год спрабуюць падагнаць беларускае грамадзтва да сваіх нібыта ўнівэрсальна-эўрапейскіх палітычных праграмаў.

Ідэал палітыка вачыма Лукашэнкі — быць унутраным голасам кожнага простага беларуса. Любы больш-менш сур'ёзны сацыяльны запыт спараджаў сустрэчную прапанову — найчасьцей адэкватную попыту. Сёлета, у год прэзыдэнцкіх выбараў, улада ідзе нават на яўнае самапрыніжэньне, патураючы найменшым грамадзкім прыхамацям. Каб забясьпечыць як мага большую прыхільнасьць свайго электарату, Лукашэнка пераўзышоў самога сябе — ён распарадзіўся перанесьці на пазьнейшы тэрмін набор у войска (каб хлопчыкі пасьпелі здаць уступныя іспыты ў ВНУ) і амаль удвая зьменшыць тэрмін адключэньня гарачай вады, зьвязанага з правядзеньнем прафіляктычных работаў на цепласетках. Няма сумлеву, людзі гэта ацэняць.

Існуючы ў беларускім грамадзтве запыт на інтэграцыю Лукашэнка і задавальняе вось ужо сем гадоў. Аднак задавальняе з улікам спэцыфічных беларускіх інтарэсаў, што цяпер больш і больш раздражняе Маскву. Беларускі сувэрэнітэт ператварыўся ў сутнасьці ў *палітычную валюту* Лукашэнкі, зь якой ён зьвязвае свае надзеі на адносна бяскрызыснае існаваньне створанага ім рэжыму. Не выпадкова сваёй сёлетняй прамове да дэпутатаў беларускага парлямэнту ён даў назоў "Краіна канчаткова аформіла сваю дзяржаўнасьць і набыла рэальны сувэрэнітэт" (адкрываюць і закрываюць прамову проста нацыяналістычныя цьверджаньні: "Апошнія гады XX

стагодзьдзя можна з поўным правам назваць эпахальнымі ў гісторыі нашага народу. Беларусь канчаткова аформіла сваю дзяржаўнасьць і набыла рэальны сувэрэнітэт. Найважнейшае, што мы з вамі зраблілі, — мы збудавалі сваю дзяржаву з усімі атрыбутамі гэтай дзяржавы" і, адпаведна, "Беларусь павінна стаць магутнай працьвітаючай дзяржавай").
Пры гэтым Лукашэнка вульгарна зьвязвае паняцьце "сувэрэнітэту" з "выбудовай дзяржавы", а не з культурнай самастойнасьцю ці нацыянальнай згуртаванасьцю. Працаваць і лічыцца ня столькі з культурнымі прэфэрэнцыямі, колькі са спажывецкімі настроямі — такі ляйтматыў яго палітычнай дзейнасьці.
Разбуральная культурная палітыка, якая пасьлядоўна праводзіцца беларускім прэзыдэнтам з часу яго абраньня на гэтую пасаду, з усёй відавочнасьцю паказвае, што ён зрабіў адназначны выбар на карысьць пабудовы ў краіне "палітычнай" або "этатысцкай" нацыі, заснаванай на атаесамленьні яе чальцоў зь дзяржавай і яе атрыбутамі, а не "культурнай" нацыі, заснаванай на моўнай і культурнай супольнасьці, адзінстве гістарычнага паходжаньня і г. д.
Гэткага роду палітыка спарадзіла і спараджае моцнае адчужэньне паміж інстытутамі дзяржаўнай улады і асяродзьдзямі беларусаў з моцным нацыянальна-культурным этасам. Не сакрэт, што самі гэтыя інстытуты і іх абмеркаваньне ў названых асяродзьдзях усё часьцей стаюцца табуяванай тэмай. Але калі мы хочам, каб рэжым Лукашэнкі з доўгай гістарычнай пэрспэктывы ўспрымаўся ўсяго толькі як плаўны пераход ад савецкага таталітарызму да беларускай дэмакратыі, неабходна *нацыяналізаваць* калі не самога Лукашэнку, дык прынамсі пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі.

9.

Сваім правакацыйным тэкстам Аляксандар Фадзееў перш за ўсё прыцягвае ўвагу да таго відавочнага для яго факту, што інтэграцыя пачала разьвівацца па непажаданым для Расіі сцэнары. Артыкул падштурхоўвае да думкі, што драма Лукашэнкі палягае ў тым, што ён ня можа перайсьці нейкай нутраной мяжы, што ён не марыянэтка па натуры.
Аднак зь беларускага гледзішча ўсё выглядае іначай. Сапраўдная трагедыя, якая разгортваецца перад намі, палягае ў

лабавым, здаецца, нават сьмяротным сутыкненьні “старых постсавецкіх” (якія кансалідуе Аляксандар Лукашэнка) і “новых незалежніцкіх” элітаў, у іх узаемным непрызнаньні і ігнараваньні, у іх некансалідаванасьці*.

* Тут трэба асобна зацеміць, што аўтар, натуральна, не заклікае апошніх ісьці на калябарацыю зь першымі, а падкрэсьлівае той відавочны для яго факт, што ў выпадку прыходу прадстаўнікоў апошніх да ўлады ім непазьбежна давядзецца выкарыстоўваць першых для нармальнага функцыянаваньня дзяржаўнага апарату. Таму ўжо цяпер важна задумацца над тым, на якія праграмы і лёзунгі магла б купіцца старая савецка-постсавецкая намэклятура. Як выяўляецца, і першыя, і другія кроўна зацікаўленыя ў захаваньні незалежнасьці Беларусі. Аднак паміж імі ляжыць сапраўдная прорва, выкліканая ня толькі сьветаглядным ці ідэалягічным опцыямі, але і больш празаічнымі прычынамі.
Як ні банальна гэта гучыць, але незалежніцкія эліты — зьява параўнальна новая для палітычнай гісторыі Беларусі. На сацыяльнай сцэне яны зьявіліся толькі пару дзесяцігодзьдзяў таму назад. Таму спрафанізаваная сьвядомасьць шырокіх народных масаў дагэтуль успрымае іх як нешта штучнае, чужароднае,“не-сваё”. Сапраўды, як і скуль у зрусіфікаваным да апошняга дзіцяці грамадзтве могуць масава паўставаць носьбіты іншай мовы і іншай культуры?
Гэтую пазыцыю, пашыраную ў пэўных слаёх нашага грамадзтва, часам войстра фармулюе Лукашэнка, абвінавачваючы беларускую апазыцыю (чытай: усё незалежнае беларускае грамадзтва) у страшным граху залежнасьці ад вонкавых крыніц дапамогі. На пытаньне, як палітычныя партыі і іх лідэры, культурныя ініцыятывы, грамадзкія рухі могуць існаваць доўгія гады безь дзяржаўнай падтрымкі, спрафанізаваная сьвядомасьць ня можа даць іншага адказу.
Натуральна, кансалідаваныя Лукашэнкам старыя эліты цураюцца новых элітаў ня толькі таму, што апошнія паўсталі параўнальна позна і яшчэ да канца не засьведчылі сваёй палітычнай вагі. Супрацьстаяньне паміж імі мае рысы ідэалягічнага канфлікту і можа разглядацца як сутыкненьне двух нігілізмаў. Сытуацыя *нігілізм versus нігілізм:* нігілізм лукашэнкаўцаў зьвязаны зь іх чыста ўтылітарным, спажывецкім

стаўленьнем да беларускай культуры (якая да апошняга часу заставалася асноўным элемэнтам калектыўнай самаідэнтыфікацыі беларусаў) у яе неспрафанізаваных праявах і абумоўлены проста-ткі абагаўленьнем “эканамічнага базысу”*. Нігілізм “адраджэнцаў” матываваны іх сьвядомай адмовай прызнаваць хоць якія эканамічныя дасягненьні і нават рэальнасьці Беларусі і, як вынік, ролю ў гэтых дасягненьнях дзяржаўнага апарату (адзін з самых плённых беларускіх філёзафаў Аляксандар Грыцанаў у “Белорусской газете” цалкам сур’ёзна гаворыць пра “дэбільную эканамічную палітыку беларускіх уладаў”; зрэшты ня ён адзін); сам дзяржаўны апарат і яго ўладкаваньне выклікае ў іх незьлічоныя фрустрацыі; надзеі на будучыню яны, як правіла, зьвязваюць толькі з дапамогай звонку.

* У сваім нядаўным тэксьце “Беларусь у кантэксьце глябалізацыі”, апублікаваным у № 12 за 2000 год маскоўскага часопісу “Обозреватель”(**http://www.nasledie.ru/oboz/N12_00/INDEX.HTM**), Міхаіл Мясьніковіч яшчэ раз расставіў па месцах “рэальныя прыярытэты беларускай улады”: “Базысны інтарэс Беларусі — стварэньне сучаснай постіндустрыйнай эканомікі, устойлівай сыстэмы палітычнай дэмакратыі, сапраўды грамадзянскай супольнасьці, якая захоўвае і павялічвае найлепшыя культурныя традыцыі нашага народу”. Сем гадоў лукашэнкаўскага кіраваньня дапамаглі нам усім лепш зразумець, што такое беларускае грамадзтва, з чаго яно складаецца і чым яно кіруецца. Будзе фатальнай памылкай, калі гэты неацэнны досьвед ня будзе скарыстаны цяпер, калі засталося так мала часу да новых прэзыдэнцкіх выбараў.
Ня трэба баяцца пераймаць ад Лукашэнкі** таго, чым ён заслужыў гарачую любоў і падтрымку значнай часткі беларускага народу — пільнай увагі да яго рэальных, надзённых справаў і клопатаў, часам вельмі нязвычных для чалавека з эўрапейскай адукацыяй і эўрапейскім ладам мысьленьня. У сваёй дзейнасьці апазыцыйныя палітыкі абавязкова мусяць выкарыстоўваць і расійскую тэму. Геапалітычнае і нацыякультурнае становішча Беларусі сьведчыць, што расійская карта мусова будзе разыгрывацца беларускімі палітыкам яшчэ многа дзясяткаў гадоў.

** Цяпер ня час і ня месца асэнсоўваць ролю і значэньне Лукашэнкі ў найноўшай гісторыі Беларусі. Але, відаць, усе пагодзяцца з тым, што гэтая асоба навязала значнай частцы беларускага грамадзтва ўяўленьне аб тым, якім павінен быць сучасны палітычны дзеяч. У сёньняшніх варунках даводзіцца лічыцца з гэткага роду іміджам.
Лукашэнка — палітык са страшнай воляй да ўлады. Перамагчы яго можна, толькі выявіўшы такую ж самую якасьць. З гэтым зьвязана найважнейшая аблуда супернікаў Лукашэнкі, якая ўжо цяпер даецца ім у знакі: перадвыбарчай праграме цяперашняга беларускага лідэра нельга супрацьстаўляць “навукова ўзважаную”, “палітычна карэктную” “канструктыўную” праграму дзеяньняў. Адным словам, посьпех прыйдзе толькі тады, калі будуць задзейнічаныя ўсе рэгістры беларускай душы.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2001**
[image]

Валерка Булгакаў

Эканамічны нацыяналізм супраць культурнай экспансіі

Беларускі і расійскі сцэнары інтэграцыі

ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ галоўны рэдактар часопісу ARCHE, укладальнік зборніку "Быць (або ня быць) сяроднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне" ("Энцыклапедыкс", 2000).

Папярэдняя публікацыя ў часопісе — артыкул "Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму" (№1-2001).

1.

Першая думка, якая зьявілася пры азнаямленьні са зьмешчаным вышэй тэкстам Аляксандра Фадзеева: гэта адзін з элемэнтаў добра сплянаванай правакацыі. Прыкладна ў той час, калі ў рэдакцыю паступіў гэты артыкул, інфармацыйныя агенцыі паведамілі пра перанос на няпэўны тэрмін сэсіі парлямэнцкага сходу саюзу Расіі і Беларусі, а таксама пра часовае спыненьне трансьляцыі ў Беларусі расійскіх

тэлеканалаў у сувязі з паказам урачыстага сходу ў Палацы Рэспублікі, прысьвечанага 56-ай гадавіне перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У ходзе гэтага паказу быў цалкам перададзены зварот Аляксандра Лукашэнкі да вэтэранаў, а таксама сьвяточны канцэрт. Трансьляцыі былі адноўленыя толькі на другі дзень.
Гэтыя тры акцыі, адбытыя ў невялікі прамежак часу, падштурхоўваюць да высновы, што Аляксандар Лукашэнка рукамі сваіх паліттэхнолягаў распачаў прапагандысцкую кампанію, каб падчас прэзыдэнцкіх выбараў заручыцца падтрымкай той часткі беларускага грамадзтва, якая скептычна ставіцца да інтэграцыі з Расіяй.
Тое, што Лукашэнка з году ў год заігрывае з апазыцыйна настроеным да афіцыйна праводжанага палітычнага курсу, “несваім” электаратам, рэч відавочная. Але калі раней гэта адбывалася, так бы мовіць, на словах (прыгадаем Лукашэнкавае “Мы дапусьцілі страшны крэн на Ўсход”), то ў год прэзыдэнцкіх выбараў атрымала рэальны вымер. Сёлета беларускі рэжым імкнецца стварыць вобраз “новых апазыцыянэраў” асабіста аддадзеным першаму беларускаму прэзыдэнту дзеячам накшталт Івана Пашкевіча або Леаніда Сініцына. Іх няхітрая прадэмакратычная рыторыка і гучныя, але палітычна малаэфэктыўныя акцыі (напрыклад, праект “Пяць з плюсам” Леаніда Сініцына, пакліканы надаць легітымнасьць органам дзяржаўнага кіраваньня Рэспублікі Беларусі) ужо цяпер падштурхоўвае некаторых выбаршчыкаў ды высновы, што, па-першае, дэмакратыя ў Беларусі ўсё-ткі ёсьць, па-другое, яна не абавязкова мусіць зьвязвацца з імёнамі Вінцука Вячоркі або Сямёна Домаша і, па-трэцяе, гарантам гэтай дэмакратыі быў, ёсьць і будзе ня хто іншы, як Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка.
Але нават калі прыняць тэзыс пра такую шматхадовую правакацыю, неабходна пацікавіцца, якія ж матывы рухалі аўтарам публікацыі “Пяць гадоў яднаньня, альбо палітычная прахіндыяда”

2.
Артыкул “Пяць гадоў яднаньня...” зьявіўся ў № 26 Інфармацыйна-аналітычнага бюлетэню, выдаванага маскоўскім

Інстытутам Дыяспары і Інтэграцыі, які, у сваю чаргу, зьяўляецца структурным элемэнтам Інстытуту краін СНД, узначальванага Канстанцінам Затулінам, расійскім палітыкам і аналітыкам*.

* У аснову апошняга аналітычнага опусу Затуліна — артыкулу пад красамоўным назовам “Саюзная дзяржава на постсавецкай прасторы. Бяз поўнага аб’яднаньня з Расіяй дэмакратызацыя ў “асобна ўзятай” Беларусі немагчымая” (**http://cis.ng.ru/state/2001-05-30/4_state.html**) — лёг яго выступ на міжнароднай канфэрэнцыі “Беларусь паміж Усходам і Захадам: прэзыдэнцкія выбары-2001 і пэрспэктывы дэмакратыі”, адбытай 10—11 траўня ў Осьле з удзелам вядомых беларускіх палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў — Жаны Літвініхі, Аляксандра Мілінкевіча, Вінцука Вячоркі, а таксама пасла Ганса-Гэарга Віка. У публікацыі, што характэрна, жыўцом, без найменшых зьменаў узятыя некаторыя кавалкі тэкстаў аўтарства Аляксандра Фадзеева. Але ёсьць і ўласнае, затулінскае: “... мы ў Расіі не заўсёды падзяляем асобных крокаў прэзыдэнта Беларусі, усіх формаў і мэтадаў яго працы. Аднак гэта тое пытаньне, уплываць на якое мы напоўніцу ня зможам (не считаем в полной мере возможным), прынамсі, да поўнага аб’яднаньня Расіі і Беларусі”.
Канстанцін Затулін — расійскі парлямэнтар са стажам, гарачы прыхільнік расійска-беларускага аб’яднаньня. Этапы яго біяграфіі характэрныя для расійскіх палітыкаў “новай хвалі”: пры канцы 80-х ён памочнік сакратара ЦК УЛКСМ, у 1993—94 гг. — сакратар партыі “ПРЕС” у расійскай Дзяржаўнай Думе, з 1997 г. — дараднік мэра Масквы. У лютым 1996 г. пастановай ураду Ўкраіны за прапаганду расійскіх прэтэнзій на Крым быў абвешчаны на 5 год пэрсонай нон грата для ўезду ў Рэспубліку Крым**. 21 траўня 1999 году Затулін быў затрыманы ўкраінскімі памежнікамі ў кіеўскім аэрапорце. Летась ён шмат сілаў паклаў на прыняцьцё расійскім парлямэнтам законапраекту аб выбарах у саюзны парлямэнт дэпутатаў ад Расіі.

** Дзейнасьць Затуліна была прычынай войстрага канфлікту паміж галоўным рэдактарам “Советской Белоруссии” Паўлам Якубовічам і тагачасным галоўным рэдактарам “Знамени

Юности” Ігарам Гукоўскім, які ўрэшце прывёў да адстаўкі апошняга. “Зачэпкай для канфлікту, дакладней, для нападак на галоўнага рэдактара маладзёвай газэты “Знамя Юности” І. Гукоўскага паслужыў адкрыты ліст дырэктара Інстытуту краін СНД К. Затуліна галоўнаму рэдактару “Советской Белоруссии” Паўлу Якубовічу, у якім ён “у адказ на прыдумкі (измышления) П. Якубовіча наконт палітычнай пазыцыі К. Затуліна паказаў двудушнасьць (двуличие) спадара Якубовіча, які пад выглядам асаблівай лояльнасьці да прэзыдэнта А. Лукашэнкі і яго палітычнага інтэграцыйнага курсу стала і мэтаскіравана на старонках газэты Адміністрацыі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі “Советская Белоруссия” праводзіў і праводзіць сукрытую антыпрэзыдэнцкую, антырасійскую і пранатаўскую прапаганду”, — пісаў нейкі А. Пятроў у сваім артыкуле “О “пятой колонне” в Белоруссии. Кто пытается влиять на президента А. Г. Лукашенко” у № 7—8 часопісу “Русский вестник” за 1998 г.” (Цыт. паводле: Война по законам подлости. Менск: ЗАО “Православная инициатива”. С. 283.) Інстытут краін СНД Канстанціна Затуліна — адна зь нешматлікіх расійскіх *think tanks*, якая прафэсійна займаецца аналітыкай палітычных працэсаў на постсавецкім прасьцягу. Гэтая прафэсійнасьць спалучаецца зь вялікадзяржаўнымі, імпэрскімі падыходамі і геапалітычнымі амбіцыямі. У № 28 памянёнага бюлетэню зьмешчаны артыкул усё таго ж Аляксандра Фадзеева “Што значыць быць прэзыдэнтам у Беларусі”, дзе чытаем: “Беларусы, як і ўкраінцы, ня мелі ў мінуўшчыне “сваёй” дзяржаўнасьці, і таму, у сутнасьці, беларускія грамадзяне цалкам укладваюцца ў сучаснае разуменьне найноўшай *расійскай дыяспары* з усімі вынікаючымі з гэтага наступствамі, уключаючы, перадусім, усьведамленьне сваёй этнічнай ідэнтычнасьці з жыхарамі Расіі. У расійцаў і беларусаў супольная геаграфічная лякацыя, калектыўная памяць і гісторыя, нацыянальныя героі, культура і культурныя дасягненьні. І, што галоўнае — супольная радзіма... Больш за тое, сучасная Беларусь ня можа разглядацца як спачатнае (изначальное) этнадзяржаўнае ўтварэньне, якое мае глыбокае гістарычнае карэньне, паколькі ейная тэрыторыя — адвольна вызначаная ў якісьці пэрыяд існаваньня СССР адміністрацыйная адзінка, абмежаваная адміністрацыйнымі, насамрэч віртуальнымі, межамі тэрыторыя. У малой Беларусі

сёньня толькі расійцаў (ня лічачы грамадзян з расійскай крывёю ад мяшаных шлюбаў) каля 1,5 мільёна, г. зн. гэтулькі, колькі расійцаў ува ўсім далёкім замежжы. Падкрэсьлім, што толькі стварэньне ў сапраўднасьці (на деле) саюзнай расійска-беларускай дзяржавы здыме гэтую найвайстрэйшую праблему, адновіць гістарычную справядлівасьць у справе вызначэньня тытульнай нацыі".

Чаму ж настолькі важнае месца адводзіцца Беларусі расійскімі аналітыкамі*, што яны гатовыя нават скінуць беларусаў з п'едэсталу тытульнай нацыі ў сваёй уласнай краіне? Адказ на гэтае пытаньне дае сам А. Фадзееў у апублікаваным у № 23 бюлетэню артыкуле пад назвай "Пэрспэктывы прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі 2001 году і нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Расіі": "Народы Расійскай Фэдэрацыі і Рэспублікі Беларусі былі адзінай нацыяй, яны зьвязаны міжсобку векавымі гістарычнымі і культурнымі сувязямі. Без саюзу зь Беларусяй немагчымая рэалізацыя ў пэрспэктыве рэгіянальнага лідэрства Расіі ў Цэнтральнай Эўропе (а ў будучыні, можна спадзявацца, і ў Цэнтральна-Паўднёва-Ўсходняй Эўропе). Барацьба Расіі за рэгіянальнае лідэрства ўва Ўсходняй Эўропе сёньня значна больш прадуктыўная за беспасьпяховыя спробы далучыцца на роўных да "сямёркі" і адыгрываць ролю сусьветнай дзяржавы ў няўклюдным выкананьні расійскага МЗС. Саступіўшы ж лідэрства Польшчы, якая не хавае сваіх стратэгічных памкненьняў у гэтым кірунку (барацьба за лідэрства ў Цэнтральнай Эўропе — асноўны прынцып яе афіцыйнай вонкавапалітычнай канцэпцыі), Расія ня толькі сутыкнецца з новым "залатым актаэдрам" (заміж цяперашняга "трыкутніка") на сваіх заходніх межах, але канчаткова згубіць надзею дадатна вырашыць украінскае пытаньне".

* Аляксандар Фадзееў не самотны ў сваіх далёкасяжных высновах. Навуковы супрацоўнік Інстытуту параўнальнай паліталёгіі РАН Барыс Кагарліцкі ў сваім аналізе "Саюз мядзьведзя і вялізнага ката́" ("Союз медведя и очень большой кошки" (**http://www.intellectualcapital.ru/iss3-1/icissue1-1.htm**)) апісвае значэньне "беларускага чыньніка" цалкам у духу "новых дыскусій пра расійскі фэдэралізм": "Аб'яднаньне зь Беларусяй ... можа стаць пераломным момантам, зь якога пачнецца пабудова нармальнай

фэдэратыўнай дзяржавы, якая будзе складацца з 30—40 раўнапраўных суб'ектаў. Прапанаваны Лукашэнкам рэфэрэндум дазваляе як бы пачаць з чыстага аркуша, стварыўшы фактычна новую дзяржаву, з новымі тэрытарыяльнымі структурамі. Эмацыйную падтрымку аб'яднаньня можна выкарыстаць, каб зламіць супрацьдзеяньне некаторых рэгіянальных элітаў, пагатоў што асобныя рэгіёны самі зацікаўленыя ў рэформе...". У публікацыі Кагарліцкага прысутнічаюць такія выказваньні, характэрныя для мысьленьня маскоўскай інтэлігенцыі, як, напрыклад, "Беларусь сапраўды паліцыйная дзяржава: у цэнтры Менску можна пакінуць незачыненую машыну, цьвёрда ведаючы, што зь ёй нічога ня здарыцца" або "Хто насамрэч ненавідзіць прэзыдэнта, дык гэта адукаваная менская сярэдняя кляса. Гэтыя людзі з зайздрасьцю пазіраюць на сваіх маскоўскіх калегаў і знаёмых, якія забясьпечылі сабе заходняе спажываньне за кошт галадуючай краіны".

3.

Як расійскі нацыяналіст, Аляксандар Фадзееў горача прымаў і прымае беларуска-расійскую інтэграцыю. Пры гэтым Беларусь для яго — ня што іншае, як разьменная карта ў складанай геапалітычнай гульні, стратэгічны пляцдарм, захапіўшы які, можна "дадатна вырашыць украінскае пытаньне" і вярнуць страчаны геапалітычны кантроль над часткай Эўропы, якая ляжыць да нямецкай, аўстрыйскай, грэцкай і італьянскай (*sic!*) мяжы. Расійскі нацыяналізм Фадзеева характэрным чынам спалучаецца зь ярка выражаным нігілізмам што да іншых, "мясцовых" у расійскай тэрміналёгіі культур, напрыклад, беларускай. Ім фактычна адмаўляецца ў праве на існаваньне. Аляксандар Фадзееў усяляк жадае прысьпешыць інтэграцыю. Адзін з найважнейшых матываў, які рухаў ім у гэтай публікацыі, палягае ў выяўленьні *сабатажу*, які нібыта чыніцца ёй пэўнымі палітычнымі сіламі.

Паказальна, што аб'ектам атакі становіцца вышэйшае чынавенства Беларусі ("... пэўныя колы вышэйшых чыноўнікаў і на Беларусі, і ў Расіі не сьпяшаюцца з абраньнем саюзнага парлямэнту адно з тае прычыны, што такія выбары непазьбежна прывядуць да падвышэньня інтарэсу практычна

ўсіх слаёў актыўнага насельніцтва сваіх краін да праблемы аб'яднаньня ў адну дзяржаву, да ўсьведамленьня праўдзівых чыньнікаў гамаваньня інтэграцыйнага працэсу, сярод якіх адзін з галоўных — чынавенскі падыход"). Вышэйшае чынавенства і шырэй, дзяржаўны апарат Беларусі выклікае фрустрацыі маскоўскіх аналітыкаў з той простай прычыны, што ўяўляе сабой сацыяльную групу, якая за апошнія дзесяць гадоў перажыла дастаткова поўную сувэрэнізацыю і зьвязвае свае асабістыя інтарэсы зь дзяржаўнымі, а значыць і нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі.

Пры гэтым само вайстрыё атакі накіравана на Адміністрацыю прэзыдэнта Беларусі (як піша Фадзееў, "...[канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы] яшчэ толькі неабходна распрацаваць у сьценах саюзнага парлямэнту, але, як вядома, ён дагэтуль ня створаны, акурат выбары ў дадзены заканадаўчы орган зь віны адміністрацыі прэзыдэнта А. Лукашэнкі ўвесь час пераносяцца на няпэўную пэрспэктыву", і праз старонку ізноў: "Адміністрацыя прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, нягледзячы на ўсе запэўніваньні, да сёньня ня ўнесла аналягічнага законапраекту ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу рэспублікі"), што аўтаматычна навешвае этыкетку сабатажніка яе кіраўніку Міхаілу Мясьніковічу. Бедны Міхалу! Відаць, адчуваючы гэткага роду небясьпеку, летась ён двойчы надрукаваў свой опус пад назвай "На шляху да яднаньня" ("На пути к единению") сьпярша ў маскоўскім часапісе "Обозреватель" (№ 6 за 2000 г.), а пасьля ў ня менш адыёзным "Евразийском вестнике" (**http://www.e-journal.ru/soyz-st1.html**). Заключае гэты артыкул, напоўнены шматлікімі і ні да чога не абавязваючымі зьвесткамі з эканомікі і геаграфіі, наступны фрагмэнт: "Мы хочам збудаваць моцную і дэмакратычную саюзную дзяржаву, якая будзе карыстацца высокім аўтарытэтам у міжнароднай супольнасьці, дзяржаву, у якой рэальна будуць забясьпечвацца і надзейна абараняцца правы грамадзяніна і чалавека...".

Такім чынам, непакой у маскоўскіх аналітыкаў выклікае сам факт таго, што за часы незалежнасьці Беларусі ў краіне паўсталі самастойныя эліты, якія адкрыта артыкулююць свае інтарэсы, істотная частка якіх разыходзіцца з інтарэсамі элітаў расійскіх (у артыкуле Фадзеева гэтая тэма прагучэла пару разоў і неяк подбегам, напрыклад, у зьвязку зь фінансавым

аспэктам беларуска-расійскай інтэграцыі: “Не задавальняе беларускую эліту і іншае — непазьбежнае надзяленьне Цэнтрабанку Расіі новым прававым статусам, улучна з правам беспасярэдняга распараджэньня фінансавымі патокамі, нерухомасьцю на ўсёй саюзнай тэрыторыі, улучна, натуральна, з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусі”; толькі пры канцы артыкулу тэма гэтая гучыць надзвычай завойстрана: “Існуючыя рэзкія, часам незамірэнчыя супярэчнасьці паміж палітычнымі элітамі Расіі і Беларусі робяць парлямэнцкі шлях усталяваньня канстытуцыйных асноваў Саюзнай дзяржавы адзіна магчымым”). Галоўным жа прадстаўніком новых беларускіх элітаў уваччу Масквы ёсьць Аляксандар Лукашэнка.

4.

У сытуацыі сутыкненьня і канфлікту жыцьцёва важных інтарэсаў менскіх і маскоўскіх элітаў Лукашэнка дагэтуль перайграваў Маскву, навязваючы ёй свой уласны, *беларускі* сцэнар інтэграцыі. Выкарыстоўваючы традыцыйную савецкую рыторыку і фразэалёгію, яму ўдавалася знаходзіць пачуцьцёвы водгук і падтрымку сярод расійскіх палітыкаў і бізнэсоўцаў. Артыкул Аляксандра Фадзеева досыць відавочна паказвае, што “эмацыйная” прывабнасьць беларускага прэзыдэнта прынамсі ў расійскіх “апініятворчых” колах рэзка ідзе на спад. Ужо цяпер яму пачынаюць выстаўляць рахункі. Здаецца, яшчэ момант, і для Масквы Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка станецца больш небясьпечны за Леаніда Данілавіча Кучму.

Пра канфлікт беларускага і расійскага сцэнароў інтэграцыі трэба сказаць некалькі словаў асобна. Як вынікае зь “Пяцёх гадоў яднаньня...”, для расійцаў інтэграцыя — гэта фактычна рэкалянізацыя, культурна-эканамічнае паглынаньне з абавязковай заменай “мясцовай адміністрацыі” на прызначаную з імпэрскага цэнтру. І ня важна напачатку, поўнай ці частковай будзе гэтая замена.

Імпэратывам “інтэграцыі па-расійску” ёсьць аслабленьне юрыдычнай і фінансавай самастойнасьці “інтэграванай тэрыторыі” пры захаваньні і павелічэньні культурнага і інфармацыйнага ўплываў, а таксама стварэньне сьпярша фармальна наддзяржаўных органаў, якія зь цягам часу могуць перарасьці ў органы адзінай дзяржавы. Стаўкі Масквы пры такой інтэграцыі вельмі высокія — яе посьпех будзе азначаць

ня столькі зьліцьцё дзьвюх “старых” дзяржаваў у адну “новую”, колькі ператварэньне народаў-насельнікаў гэтых дзяржаваў у адну новую “супэрнацыю” (“Галоўнае — грамадзяне расійска-беларускай дзяржавы паступова прыйдуць да ўсьведамленьня сябе як *адзінага народу* (вылучэньні нашы — **Аўт.**), які мае права і магчымасьць мець свой парлямэнцкі орган”, — рэжа з пляча Аляксандар Фадзееў).

У выпадку Беларусі, апрача культурнай катастрофы і адміністрацыйнай сумятні, рэалізацыя расійскага сцэнару інтэграцыі на практыцы азначала б разбурэньне сфармаванай сыстэмы дзяржаўнага кіраваньня Рэспублікі Беларусі, якой бы яна ні была, кардынальную ломку існуючых дачыненьняў улады і ўласнасьці (нагадаем ужо працытаванае: “Не задавальняе беларускую эліту і іншае — непазьбежнае надзяленьне Цэнтрабанку Расіі новым прававым статусам, улучна з правам беспасярэдняга распараджэньня фінансавымі патокамі, *нерухомасьцю* (вылучэньне наша — **Аўт.**) на ўсёй саюзнай тэрыторыі, улучна, натуральна, з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусі”).

Тэма жудаснай неэфэктыўнасьці беларускага дзяржаўнага апарату ў развагах маскоўскіх аналітыкаў таксама прысутнічае не дарма. Так, ува ўжо згаданым артыкуле Фадзеева “Пэрспэктывы прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі 2001 г. і нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Расіі” ўтрымліваецца цэлы шэраг нападак на беларускі дзяржаўны апарат: “Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў дзяржаўны апарат Рэспублікі Беларусі, пры наяўнасьці пэўнай кагерэнтнасьці і згуртаванасьці, пакуль не праяўляе здольнасьці да разуменьня вайстрыні паўсталых перад ім заданьняў, а асобныя ідэалягемы, якімі ён кіруецца, не ўяўляюць сабой адзінай і закончанай ідэалягічнай сыстэмы. Непасьлядоўнасьць у дзеяньнях органаў улады ў шмат чым як і раней тлумачыцца боязяй прыняцьця канчатковых рашэньняў, што сьведчыць, перадусім, пра *пераходны* (вылучэньне наша — **Аўт.**) характар самой дзяржаўнай улады, якая знаходзіцца на пэўнай стадыі на шляху да канчатковай сыстэмнай інстытуалізацыі”. З такога роду аналітычных канструкцый вынікае, што “канчатковая сыстэмная інстытуалізацыя” беларускага дзяржаўнага апарату можа адбыцца толькі пры *пераходзе* дзяржаўнай улады ў іншую якасьць — марыянэткавай каляніяльнай адміністрацыі, у сфэру кампэтэнцыі якой не

ўваходзяць ні фінансавыя, ні прававыя пытаньні. Як не ўваходзяць пытаньні ваеннага будаўніцтва, аховы мяжы, мытнай і фіскальнай палітыкі*.

* Ці трэба дадаваць, што галоўная мэта навязьлівай нэгатыўнай крытыкі эканамічнага курсу беларускіх уладаў пры адначасовай завышанай ацэнцы расійскіх гаспадарчых ператварэньняў *у гэтым кантэксьце* перадусім палягае ў “выкрываньні” неэфэктыўнасьці беларускага дзяржаўнага апарату да кіраваньня краінай, няздольнасьці беларускіх элітаў ажыцьцяўляць дзейсны макраэканамічны мэнэджмэнт. Апошні паводле часу аналіз Аляксандра Фадзеева — “Беларуская эканоміка ў год выбараў прэзыдэнта”, большая частка якога была перадрукавана газэтай “Наша Ніва”, не пакідае ў гэтым жадных сумлеваў: “Рэспубліканскае кіраўніцтва вырашэньне сваіх эканамічных праблемаў напярэдадні выбараў зьвязвае ў апошні час з атрыманьнем ільготных крэдытаў або ад багатых арабскіх краінаў, у прыватнасьці, пэўныя надзеі пакладаюцца на Кувэйт, або на Кітай. Пра сур’ёзную рэформу ў сфэры эканомікі пакуль няма мовы”.
З гледзішча Масквы незалежнасьць Беларусі захоўваецца фактычна дзякуючы апартунізму беларускай намэнклятуры, а не рашучасьці прадстаўнікоў беларускай апазыцыі ці непадкупнасьці дзеячоў беларускай культуры (хаця ў гэтым ёсьць момант правакацыі і прапаганды — каб усяляк прынізіць ролю апошніх у палітычным жыцьці Беларусі; Маскве выгадна разглядаць іх як статыстаў у гульні зь вялікімі стаўкамі, у якой удзельнічаюць сапраўды сур’ёзныя асобы). Беларуская намэнклятура як носьбіт рэальнай незалежнасьці Беларусі — гэтая рэальнасьць яшчэ не ацэненая беларускімі аналітыкамі як мае быць.
Заканамерна, што расійскі сцэнар інтэграцыі цішком сабатуецца беларускімі ўладамі на самым высокім узроўні. Ня выключана, што ціхі сабатаж напаткае і тыя новыя інтэграцыйныя ініцыятывы, якія, як вынікае з артыкулу Аляксандра Фадзеева, Расія рыхтуецца прапанаваць ужо ў найбліжшай будучыні.

5.

Самым пэрспэктыўным кірункам інтэграцыі, на думку Фадзеева, павінна стаць уніфікацыя канстытуцыйнага і інш. заканадаўства дзьвюх краін. Як ён піша, “час зразумець, нарэшце, што нельга ажыццявіць захады вайсковага будаўніцтва ў саюзнай дзяржаве без папярэдняга рашэньня галоўных палітычных і канстытуцыйных пытаньняў, якія пяць год настойліва ігнараваліся”.

Фадзееў схільны акурат у роўніцы права бачыць прычыну таго, што буксуе вайсковая інтэграцыя паміж Расіяй і Беларусяй (“Гэтыя цудоўныя дакумэнты… не маглі быць рэалізаваныя з той простай прычыны, што аб’ектыўна патрабавалі зьмены нацыянальных канстытуцыяў Расеі і Беларусі, вайсковага заканадаўства і іншых законаў абедзьвюх дзяржаваў”). Але што там ні гаварылася, уніфікацыя канстытуцыйнага і інш. заканадаўства для Масквы — гэта інтэграцыйная пэрспэктыва, так бы мовіць, першага ўзроўню. Расійскі сцэнар інтэграцыі будзе рэалізаваны толькі пры ўмове вырашэньня інтэграцыйнай задачы другога ўзроўню — ліквідацыі прэзыдэнцкай формы дзяржаўнага кіраваньня ў Беларусі ў такім выглядзе, у якім яна склалася за апошнія 7 гадоў. Чаму? Давайце зноў учытаемся ў аналізаваны тэкст.

На першы погляд, Аляксандар Фадзееў нават робіць Лукашэнку такі сабе рэвэранс. Ён, напрыклад, піша: “Яшчэ адзін вузел застарэлых супярэчнасьцяў паміж Расеяй і Беларусяй хаваецца ў сфэры рэгуляваньня працэсу руху капіталаў. Увесь папярэдні досьвед у дадзеным пытаньні — нэгатыўны. Беларускі бок з зайздроснай упартасьцю адхіляе ўдзел расейскіх дзелавых колаў у прадпрымальніцтве і, тым больш, набыцьці імі акцый суб’ектаў гаспадараньня на сваёй тэрыторыі. Выключэньні, праўда, адзначаны адносна прамых інвэстыцыйных уліваньняў і прадастаўленьня крэдытных ліній ў пад кантролем нават ня ўраду, *а непасрэдна прэзыдэнта*” (вылучэньні нашы — **Аўт.**). Аднак на гэтым усе пазытыўныя знакі ўвагі да першага прэзыдэнта Беларусі і канчаюцца. Больш за тое, расійскі аўтар пачынае раскідвацца яўнымі інвэктывамі: “Відавочна, палітычныя вярхі Расіі і Беларусі пакуль не гатовыя да фармаваньня саюзнай дзяржавы”. У гэтым кантэксьце пачынае зусім інакш гучаць кагадзе працытаванае: “Час зразумець, нарэшце, што нельга ажыццявіць захады вайсковага будаўніцтва ў саюзнай дзяржаве без папярэдняга рашэньня

галоўных *палітычных* (вылучэньні нашы — **Аўт.**) і канстытуцыйных пытаньняў, якія пяць год настойліва ігнараваліся”.
Насамрэч *першае* і *апошняе* палітычнае пытаньне для расійскага пляну інтэграцыі — як хутка і эфэктыўна зьнішчыць сыстэму прэзыдэнцкай улады на Беларусі. І гэта адкрыта цьвердзіць расійскі аналітык Фадзееў: “Насамрэч прычына [інтэграцыйных праблем] заключаецца ў іншым: у цяперашніх канстытуцыях Расійскай Фэдэрацыі і Рэспублікі Беларусі ўстаноўлена і замацавана адна форма дзяржаўнага кіраваньня — прэзыдэнцкая. Адсюль і ўся арганізацыя сыстэмы вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, дзе прыярытэт, натуральна, аддадзены прэзыдэнту, як кіраўніку дзяржавы. Таму меркаваць, што ў гэтых рэаліях зьмены ў нацыянальных канстытуцыях і прыняцьцё саюзнай канстытуцыі будуць праходзіць гладка і лёгка, а адпаведны рэфэрэндум абвесьцяць заўтра — небясьпечная і вялікая аблуда”. Разгорнем гэты тэзыс: павелічэньне ўладных паўнамоцтваў беларускага прэзыдэнта азначае запаволеньне інтэграцыйных працэсаў, і наадварот*.

* Зь іншага боку, ад палітычнай сьмерці для Масквы Лукашэнку ратуе беларуская апазыцыя. Яе ўзмацненьне пацягне за сабой павелічэньне падтрымкі Расіі асабіста Лукашэнкі і створанага ім рэжыму.

6.
Чаму ж нарастае адчужэньне паміж Лукашэнкам і новымі расійскімі элітамі? Паспрабуем выясьніць прычыны гэтай нелюбосьці эканамічнымі чыньнікамі.
Як мы кагадзе высьветлілі, для расійцаў інтэграцыя зь Беларусяй — гэта перадусім культурна-эканамічная экспансія. Прычым новыя расійскія эліты зацікаўленыя ў гэтым эканамічным складніку экспансіі / інтэграцыі ня менш, а можа нават больш, чым у экспансіі культурнай, бо эканамічная дамінацыя стварае трывалае заплечча для рознага роду культурных ініцыятываў.
Расійская спэцыфіка такая, што ў гэтай краіне палітыка цесна зьвязаная з эканомікай. Адзін зь фігурантаў гэтага аналізу Канстанцін Затулін адначасова буйны расійскі бізнэсоўца.
У свой час ён быў арганізатарам і кіраўніком шэрагу

камэрцыйных структур, у прыватнасьці, заснавальнікам і кіраўніком Маскоўскай таварнай біржы, сталым чальцом яе біржавога камітэту, а таксама прэзыдэнтам “Міжнароднага Біржавога і Гандлёвага Саюзу”.
Капітал новых расійскіх элітаў быў сфармаваны ў выніку глыбокага ператварэньня існуючых эканамічных адносінаў у краіне, выкліканага, у прыватнасьці, прыватызацыяй дзяржаўнай уласнасьці. Атрымаўшы капітал за досыць хуткі адцінак часу, часта неправавым ці напаўлегальным чынам, новыя расійскія капіталісты імкнуцца выкарыстоўваць яго з максымальнай аддачай. Павелічэньне прыбытку пры выкарыстаньні капіталу зьвязваецца імі з пашырэньнем абсягу яго дзеяньня (як тут не прыгадаць клясычную формулу Маркса: “Патрэба пастаяннага павелічэньня рынку дзеля збыту сваіх тавараў гоніць буржуазію па ўсёй плянэце”)**.

**Уздым расійскай прамысловасьці, абумоўлены павелічэньнем эканамічнага значэньня расійскага малога і сярэдняга бізнэсу, ужо цяпер павышае прывабнасьць беларускага рынку для збыту расійскай прадукцыі. Гэта істотна зьмяняе балянс сілаў, бо калі раней інтэграцыю інсьпіраваў дзяржаўна-манапалістычны капітал сыравіннай і вайскова-прамысловай галінаў народнай гаспадаркі, то цяпер інтарэс у інтэграцыі пачынае сыходзіць зьнізу, з боку непараўнальна меншых суб’ектаў гаспадараньня. Хаця, калі па шчырасьці, Аляксандар Фадзееў выдае жаданае за сапраўднае, калі ў нарысе “Перадвыбарная сэнсацыя” піша: “Цяпер як ніколі відавочна, што беларускія вытворцы прайграюць у канкурэнтнай барацьбе ня толькі заходнім імпарцёрам, але і расійскім пастаўнікам, якія літаральна запоўнілі рынак Беларусі таннымі і якаснымі таварамі, выцесьніўшы зь яго шэраг традыцыйных, айчынных”. Аднак ход яго думкі вельмі паказальны.
У артыкуле Фадзеева ёсьць момант, ключавы для разуменьня таго, чаму павялічваецца дыстанцыя паміж беларусім прэзыдэнтам і расійскімі бізнэс-коламі. Зьвернемся яшчэ разу да прыведзенага кагадзе фрагмэнту: “Яшчэ адзін вузел застарэлых супярэчнасьцяў паміж Расіяй і Беларусяй хаваецца ў сфэры рэгуляваньня працэсу руху капіталаў. Увесь папярэдні досьвед у дадзеным пытаньні — нэгатыўны. Беларускі бок з зайздроснай упартасьцю адхіляе ўдзел расійскіх дзелавых

колаў у прадпрымальніцтве і, тым больш, набыцьці імі акцый суб'ектаў гаспадараньня на сваёй тэрыторыі. Выключэньні, праўда, адзначаны адносна прамых інвэстыцыйных уліваньняў і прадастаўленьня крэдытных ліній пад кантролем нават ня ўраду, а непасрэдна прэзыдэнта".
Як для даўнага бээсэсэраўскага нацыяналіста, любы іншаземны капітал для Лукашэнкі аднолькава чужы. Сваім абраньнем на пасаду прэзыдэнта ён абавязаны перадусім лёзунгам сваёй перадвыбарчай кампаніі, якія абвяшчалі ўсямерную падтрымку буйной і сярэдняй беларускай прамысловасьці. За гады свайго прэзыдэнцкага кіраваньня Лукашэнка, як яму здавалася, рабіў усё, каб забясьпечыць яе больш-менш стабільнае функцыянаваньне. З гэтай стабільнасьцю ён зьвязвае і шанцы на сваё палітычнае выжываньне ў будучым.
Дапушчэньне буйнога расійскага капіталу — такім, якім ён ёсьць — на нутраны беларускі рынак для Лукашэнкі было б раўназначнае палітычнаму самагубству. Як і рэалізацыя расійскага пляну інтэграцыі, гэта б пацягнула за сабой новы перадзел уласнасьці, зьмяненьне рамкавых умоваў гаспадараньня і, што найважнейшае, непрадказальную рэструктурызацыю народнай гаспадаркі Беларусі, выкліканую яе падгонкай да патрэбаў расійскага, а не беларускага рынку. На практыцы гэта прывяло б да масавага банкруцтва беларускіх заводаў і фабрык, да рэзкага ўзросту беспрацоўя і г. д. А эканамічныя катаклізмы непазьбежна справакавалі б катаклізмы сацыяльныя, што ў выніку істотна б звузіла сацыяльную базу падтрымкі цяперашняга беларускага рэжыму і, магчыма, паставіла крыж на самой ідэі інтэграцыі з Расіяй, так па-свойму дарагой Лукашэнку.

7.

Фадзееўскі аналіз паказвае, наколькі агрэсіўныя мэты ў дачыненьні да Беларусі можа перасьледаваць новая расійская адміністрацыя*. Крывавая разьніна ў Чачні, здушэньне апазыцыйных расійскіх СМІ — гэта, можа быць, толькі першыя этапы доўгатэрміновага пляну, пакліканага павялічыць прэстыж дзяржаўнай улады Расійскай Фэдэрацыі**.

* Паказальна, што адзін з апошніх указаў Пуціна, які ўводзіць

рэжым лібэралізацыі для вывазу капіталу ў краіны СНД, застаўся зусім незаўважаным у беларускіх мэдыях.
** Заходняму назіральніку такая пастаноўка пытаньня можа здацца посткаляніяльнай абсэсіяй. Насамрэч, ці не запомніцца Ўладзімер Пуцін яго сучасьнікам як ініцыятар маштабнай мадэрнізацыі розных сфэраў жыцьця Расійскай Фэдэрацыі. За няпоўныя два гады свайго кіраваньня ён запачаткаваў рэформу мэдычнага абслугоўваньня і пэнсійнай сыстэмы, канстытуцыйнага ладу, партыйнай, падатковай сыстэмы і г. д. Экспансіянізм жа, якім стала характарызавацца замежная палітыка Крамлю, заўважны адно ў рэгіёне, у якім толькі аслабленая глыбокім унутраным крызысам Расія і здольная праяўляць актыўнасьць — на абшарах СНД і насамперш ува Ўкраіне і Беларусі.
Так і не засвоіўшы горкага гістарычнага досьведу, Расія вяртаецца ў Беларусь у якасьці агрэсіўнай імпэрскай сілы, якая для дасягненьня сваіх стратэгічных, “вселенскіх” мэтаў гатовая паступацца народамі і культурамі, дзяржавамі і грамадзтвамі... Тое, што гэта раней ці пазьней адбудзецца, Лукашэнка, відаць, цьмяна вычуваў яшчэ ў сярэдзіне 90-ых. Сапраўды, часам здаецца, што распачаты беларускім лідэрам працэс інтэграцыі — гэта ня што іншае, як *гульня на апярэджаньне*, а выйгранкай у гэтай гульні — каналізацыя народнай энэргіі ў патрэбным для беларускай дзяржавы рэчышчы.
Каб раскрыць сутнасьць беларускага сцэнару інтэграцыі, важна адказаць на адно прынцыповае пытаньне: ці была яна абумоўленая аб’ектыўным запатрабаваньнем беларускага грамадзтва, ці ўсё ж гэта *idée fixe* першага беларускага прэзыдэнта?
Як паказваюць апытаньні, праведзеныя незалежнымі сацыялягічнымі агенцыямі, стаўленьне беларускіх грамадзянаў да інтэграцыі паміж Расіяй і Беларусяй дастаткова пазытыўнае. Ува ўсякім разе, колькасьць тых, хто выступае супраць яе або пакуль яшчэ вагаецца, значна саступае колькасьці яе безумоўных прыхільнікаў. Гл., напрыклад, табліцу* на наступнай старонцы.

* Дадзеная табліца створана на падставе апытаньня, праведзенага 21.09.2000. Як паведамляе агенцыя Белапан, згодна з сацыялягічным апытаньнем НІСЭПД, у сакавіку 2001 г.

за саюз Расіі і Беларусі выступала 59 % жыхароў Беларусі. Як бачым, ідэя карыстаецца вялікай сацыяльнай падтрымкай нязьменна, хаця тое ж самае апытаньне паказала, што меншыня беларусаў выказваецца за зьліцьцё Расіі і Беларусі ў адну дзяржаву. Таксама зварачаем увагу на ваганьне лічбы прыхільнікаў Саюзу.
Тое, што палітыка збліжэньня з Расіяй увогуле адпавядае цяперашнім запатрабаваньням беларускага грамадзтва, выразна ўсьведамляе кааліцыя апазыцыйных кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта Беларусі, т. зв. “пяцёрка”. У супольна прынятай праграме яна заявіла, што інтэграцыйныя захады ў рамках “Саюзу дзьвюх сувэрэнных дзяржаваў” будуць працягнутыя ў выпадку абраньня апазыцыйнага кандыдата на пасаду прэзыдэнта краіны. Нэгатыўная рэакцыя на гэткага роду заяву сакратара Сойму БНФ Вячаслава Сіўчыка і прэс-сакратара Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ Валер’я Буйвала толькі дадала грамадзкай падтрымкі гэтай апазыцыйнай кааліцыі — масавай сьвядомасьці беларускіх грамадзян цяпер навязваецца думка, што агрэсіўныя, прагныя рэваншу нацыяналістычныя сілы і кандыдаты на пасаду прэзыдэнта ад дэмакратычнай грамадзкасьці ніяк міжсобку не зьвязаныя**.

** У гэтую схему цудоўна кладзецца кладзецца той растыражаваны беларускімі мэдыямі і на першы погляд алягічны факт, што ўзначаленая Станіславам Шушкевічам Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада пастанавіла прыпыніць сваё членства ў Каардынацыйнай Радзе Дэмакратычных Сілаў датуль, пакуль яе члены “ня зоймуць прынцыповай пазыцыі ў дачыненьні да дзяржаўнага сувэрэнітэту і кандыдатаў у прэзыдэнты, якія выступаюць за саюз Расіі і Беларусі”, а таксама падтрымаць вылучэньне кандытатам у прэзыдэнты Зянона Пазьняка.

8.
Задуманы афіцыйнымі беларускімі ўладамі і ўпаасобку першым беларускім прэзыдэнтам уласны сцэнар інтэграцыі істотна розьніцца ад расійскага. Калі расійцы пры дапамозе інтэграцыйных працэсаў імкнуцца захапіць новыя эканамічныя прасторы, то беларусы, наадварот, імкнуцца захаваць

эканамічны статус-кво. Іншымі словамі, інтэграцыя для беларусаў мае служыць перадусім кансэрвацыі існуючай структуры эканомікі і дачыненьняў уласнасьці, адпаведнай ёй палітычнай сыстэмы Беларусі, а таксама ідэалягічным мэтам (сацыяльнай мабілізацыі).

Рэалізацыя беларускага сцэнару інтэграцыі была шмат у чым прадвызначана асобай прэзыдэнта Лукашэнкі. Фактычна, ён першы з буйных беларусіх палітыкаў парваў з савецкім мінулым і пачаў арыентавацца на жывы беларускі палітычны рынак, тым часам некаторыя палітыкі адраджэнскай арыентацыі перабывалі і часам яшчэ дагэтуль перабываюць у стане агрэсіўнага інфантылізму — замест таго, каб адаптаваць свае палітычныя праграмы да запытаў беларускага грамадзтва, яны каторы ўжо год спрабуюць падагнаць беларускае грамадзтва да сваіх нібыта ўнівэрсальна-эўрапейскіх палітычных праграмаў.

Ідэал палітыка вачыма Лукашэнкі — быць унутраным голасам кожнага простага беларуса. Любы больш-менш сур'ёзны сацыяльны запыт спараджаў сустрэчную прапанову — найчасьцей адэкватную попыту. Сёлета, у год прэзыдэнцкіх выбараў, улада ідзе нават на яўнае самапрыніжэньне, патураючы найменшым грамадзкім прыхамацям. Каб забясьпечыць як мага большую прыхільнасьць свайго электарату, Лукашэнка пераўзышоў самога сябе — ён распарадзіўся перанесьці на пазьнейшы тэрмін набор у войска (каб хлопчыкі пасьпелі здаць уступныя іспыты ў ВНУ) і амаль удвая зьменшыць тэрмін адключэньня гарачай вады, зьвязанага з правядзеньнем прафіляктычных работаў на цепласетках. Няма сумлеву, людзі гэта ацэняць.

Існуючы ў беларускім грамадзтве запыт на інтэграцыю Лукашэнка і задавальняе вось ужо сем гадоў. Аднак задавальняе з улікам спэцыфічных беларускіх інтарэсаў, што цяпер больш і больш раздражняе Маскву. Беларускі сувэрэнітэт ператварыўся ў сутнасьці ў *палітычную валюту* Лукашэнкі, зь якой ён зьвязвае свае надзеі на адносна бяскрызыснае існаваньне створанага ім рэжыму. Не выпадкова сваёй сёлетняй прамове да дэпутатаў беларускага парлямэнту ён даў назоў "Краіна канчаткова аформіла сваю дзяржаўнасьць і набыла рэальны сувэрэнітэт" (адкрываюць і закрываюць прамову проста нацыяналістычныя цьверджаньні: "Апошнія гады XX

стагодзьдзя можна з поўным правам назваць эпахальнымі ў гісторыі нашага народу. Беларусь канчаткова аформіла сваю дзяржаўнасьць і набыла рэальны сувэрэнітэт. Найважнейшае, што мы з вамі зраблілі, — мы збудавалі сваю дзяржаву з усімі атрыбутамі гэтай дзяржавы" і, адпаведна, "Беларусь павінна стаць магутнай працьвітаючай дзяржавай").
Пры гэтым Лукашэнка вульгарна зьвязвае паняцьце "сувэрэнітэту" з "выбудовай дзяржавы", а не з культурнай самастойнасьцю ці нацыянальнай згуртаванасьцю. Працаваць і лічыцца ня столькі з культурнымі прэфэрэнцыямі, колькі са спажывецкімі настроямі — такі ляйтматыў яго палітычнай дзейнасьці.
Разбуральная культурная палітыка, якая пасьлядоўна праводзіцца беларускім прэзыдэнтам з часу яго абраньня на гэтую пасаду, з усёй відавочнасьцю паказвае, што ён зрабіў адназначны выбар на карысьць пабудовы ў краіне "палітычнай" або "этатысцкай" нацыі, заснаванай на атаесамленьні яе чальцоў зь дзяржавай і яе атрыбутамі, а не "культурнай" нацыі, заснаванай на моўнай і культурнай супольнасьці, адзінстве гістарычнага паходжаньня і г. д.
Гэткага роду палітыка спарадзіла і спараджае моцнае адчужэньне паміж інстытутамі дзяржаўнай улады і асяродзьдзямі беларусаў з моцным нацыянальна-культурным этасам. Не сакрэт, што самі гэтыя інстытуты і іх абмеркаваньне ў названых асяродзьдзях усё часьцей стаюцца табуяванай тэмай. Але калі мы хочам, каб рэжым Лукашэнкі з доўгай гістарычнай пэрспэктывы ўспрымаўся ўсяго толькі як плаўны пераход ад савецкага таталітарызму да беларускай дэмакратыі, неабходна *нацыяналізаваць* калі не самога Лукашэнку, дык прынамсі пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі.

9.

Сваім правакацыйным тэкстам Аляксандар Фадзееў перш за ўсё прыцягвае ўвагу да таго відавочнага для яго факту, што інтэграцыя пачала разьвівацца па непажаданым для Расіі сцэнары. Артыкул падштурхоўвае да думкі, што драма Лукашэнкі палягае ў тым, што ён ня можа перайсьці нейкай нутраной мяжы, што ён не марыянэтка па натуры.
Аднак зь беларускага гледзішча ўсё выглядае іначай. Сапраўдная трагедыя, якая разгортваецца перад намі, палягае ў

лабавым, здаецца, нават сьмяротным сутыкненьні “старых постсавецкіх” (якія кансалідуе Аляксандар Лукашэнка) і “новых незалежніцкіх” элітаў, у іх узаемным непрызнаньні і ігнараваньні, у іх некансалідаванасьці*.

* Тут трэба асобна зацеміць, што аўтар, натуральна, не заклікае апошніх ісьці на калябарацыю зь першымі, а падкрэсьлівае той відавочны для яго факт, што ў выпадку прыходу прадстаўнікоў апошніх да ўлады ім непазьбежна давядзецца выкарыстоўваць першых для нармальнага функцыянаваньня дзяржаўнага апарату. Таму ўжо цяпер важна задумацца над тым, на якія праграмы і лёзунгі магла б купіцца старая савецка-постсавецкая намэклятура. Як выяўляецца, і першыя, і другія кроўна зацікаўленыя ў захаваньні незалежнасьці Беларусі. Аднак паміж імі ляжыць сапраўдная прорва, выкліканая ня толькі сьветаглядным ці ідэалягічным опцыямі, але і больш празаічнымі прычынамі.
Як ні банальна гэта гучыць, але незалежніцкія эліты — зьява параўнальна новая для палітычнай гісторыі Беларусі. На сацыяльнай сцэне яны зьявіліся толькі пару дзесяцігодзьдзяў таму назад. Таму спрафанізаваная сьвядомасьць шырокіх народных масаў дагэтуль успрымае іх як нешта штучнае, чужароднае,“не-сваё”. Сапраўды, як і скуль у зрусіфікаваным да апошняга дзіцяці грамадзтве могуць масава паўставаць носьбіты іншай мовы і іншай культуры?
Гэтую пазыцыю, пашыраную ў пэўных слаёх нашага грамадзтва, часам войстра фармулюе Лукашэнка, абвінавачваючы беларускую апазыцыю (чытай: усё незалежнае беларускае грамадзтва) у страшным граху залежнасьці ад вонкавых крыніц дапамогі. На пытаньне, як палітычныя партыі і іх лідэры, культурныя ініцыятывы, грамадзкія рухі могуць існаваць доўгія гады безь дзяржаўнай падтрымкі, спрафанізаваная сьвядомасьць ня можа даць іншага адказу.
Натуральна, кансалідаваныя Лукашэнкам старыя эліты цураюцца новых элітаў ня толькі таму, што апошнія паўсталі параўнальна позна і яшчэ да канца не засьведчылі сваёй палітычнай вагі. Супрацьстаяньне паміж імі мае рысы ідэалягічнага канфлікту і можа разглядацца як сутыкненьне двух нігілізмаў. Сытуацыя *нігілізм versus нігілізм:* нігілізм лукашэнкаўцаў зьвязаны зь іх чыста ўтылітарным, спажывецкім

стаўленьнем да беларускай культуры (якая да апошняга часу заставалася асноўным элемэнтам калектыўнай самаідэнтыфікацыі беларусаў) у яе неспрафанізаваных праявах і абумоўлены проста-ткі абагаўленьнем “эканамічнага базысу”*. Нігілізм “адраджэнцаў” матываваны іх сьвядомай адмовай прызнаваць хоць якія эканамічныя дасягненьні і нават рэальнасьці Беларусі і, як вынік, ролю ў гэтых дасягненьнях дзяржаўнага апарату (адзін з самых плённых беларускіх філёзафаў Аляксандар Грыцанаў у “Белорусской газете” цалкам сур’ёзна гаворыць пра “дэбільную эканамічную палітыку беларускіх уладаў”; зрэшты ня ён адзін); сам дзяржаўны апарат і яго ўладкаваньне выклікае ў іх незьлічоныя фрустрацыі; надзеі на будучыню яны, як правіла, зьвязваюць толькі з дапамогай звонку.

* У сваім нядаўным тэксьце “Беларусь у кантэксьце глябалізацыі”, апублікаваным у № 12 за 2000 год маскоўскага часопісу “Обозреватель”(**http://www.nasledie.ru/oboz/N12_00/INDEX.HTM**), Міхаіл Мясьніковіч яшчэ раз расставіў па месцах “рэальныя прыярытэты беларускай улады”: “Базысны інтарэс Беларусі — стварэньне сучаснай постіндустрыйнай эканомікі, устойлівай сыстэмы палітычнай дэмакратыі, сапраўды грамадзянскай супольнасьці, якая захоўвае і павялічвае найлепшыя культурныя традыцыі нашага народу”. Сем гадоў лукашэнкаўскага кіраваньня дапамаглі нам усім лепш зразумець, што такое беларускае грамадзтва, з чаго яно складаецца і чым яно кіруецца. Будзе фатальнай памылкай, калі гэты неацэнны досьвед ня будзе скарыстаны цяпер, калі засталося так мала часу да новых прэзыдэнцкіх выбараў.
Ня трэба баяцца пераймаць ад Лукашэнкі** таго, чым ён заслужыў гарачую любоў і падтрымку значнай часткі беларускага народу — пільнай увагі да яго рэальных, надзённых справаў і клопатаў, часам вельмі нязвычных для чалавека з эўрапейскай адукацыяй і эўрапейскім ладам мысьленьня. У сваёй дзейнасьці апазыцыйныя палітыкі абавязкова мусяць выкарыстоўваць і расійскую тэму. Геапалітычнае і нацыякультурнае становішча Беларусі сьведчыць, што расійская карта мусова будзе разыгрывацца беларускімі палітыкам яшчэ многа дзясяткаў гадоў.

** Цяпер ня час і ня месца асэнсоўваць ролю і значэньне Лукашэнкі ў найноўшай гісторыі Беларусі. Але, відаць, усе пагодзяцца з тым, што гэтая асоба навязала значнай частцы беларускага грамадзтва ўяўленьне аб тым, якім павінен быць сучасны палітычны дзеяч. У сёньняшніх варунках даводзіцца лічыцца з гэткага роду іміджам.
Лукашэнка — палітык са страшнай воляй да ўлады. Перамагчы яго можна, толькі выявіўшы такую ж самую якасьць. З гэтым зьвязана найважнейшая аблуда супернікаў Лукашэнкі, якая ўжо цяпер даецца ім у знакі: перадвыбарчай праграме цяперашняга беларускага лідэра нельга супрацьстаўляць “навукова ўзважаную”, “палітычна карэктную” “канструктыўную” праграму дзеяньняў. Адным словам, посьпех прыйдзе толькі тады, калі будуць задзейнічаныя ўсе рэгістры беларускай душы.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2001**
[image]

Аляксей Знаткевіч

Любымі даступнымі сродкамі

АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ
супрацоўнік агенцыі навін БелаПАН і карэспандэнт Інтэрнэт-часопісу Transitions Online (www.tol.cz), што асьвятляе падзеі ў 28 краінах былога сацыялістычнага блёку і СНД.

„Любымі даступнымі сродкамі" - гэта дапрацаваная вэрсія артыкулу, апублікаванага Transitions.

„Паглядзеце на гэтыя твары: у іх няма нічога чалавечага, толькі прага разбурэньня", — кіпеў увечары камэнтатар БТ. На экране тым часам паказвалі твары маладых людзей з тых тысячаў, што рушылі па праспэкце Скарыны ў Менску падчас сьвяткаваньня Дня Волі 23 сакавіка 1997 году. Вядучы не шкадаваў словаў для шальмаваньня „падагрэтых гарэлкай хуліганаў, якія падпальвалі камэрцыйныя кіёскі". Каб давесьці слушнасьць абвінавачваньня, камэра спынілася на лапіку агню на асфальце — хутчэй за ўсё гарэў плякат з партрэтам Аляксандра Лукашэнкі. Якраз перад тым улады абавязалі вывесіць такія партрэты ва ўсіх установах. Нягледзячы на мірны характар пратэсту, у той дзень міліцыя неаднаразова атакавала дэманстрантаў, зьбіваючы гумавымі дручкамі ня толькі „трэніраваных адмарозкаў", калі карыстацца выразам Зімоўскага, але й жанчын, і старых.

Некалькі гадоў запар мірныя антыўрадавыя дэманстрацыі — лідэры дэмакратычнай апазыцыі настойвалі на неабходнасьці выключна негвалтоўных мэтадаў супраціву — зь нязьменнай

жорсткасьцю разганялі, арыштоўваючы найбольш актыўных удзельнікаў. Пры гэтым амаль пасьля кожнай акцыі некаторых затрыманых зьбівалі ў пастарунках. Паступова сярод часткі ўдзельнікаў, не ў апошнюю чаргу тых, што прайшлі праз турмы, высьпявала думка, што посьпеху можна дасягнуць толькі адказваючы гвалтам на гвалт.

Два гады пазьней, 17 кастрычніка 1999 году каля 20 тысяч чалавек выйшлі на вуліцы Менску, каб запатрабаваць адстаўкі Лукашэнкі, выступіць супраць ягоных плянаў аб'яднаньня з Расеяй, а таксама запатрабаваць расьсьледаваньня зьнікненьняў вядомых палітыкаў і спыненьня палітычна матываваных рэпрэсій. Гэтым разам частка дэманстрантаў была гатовая да бойкі. Калі падчас першай сутычкі на рагу Фрунзэ й Першамайскай адзін зь міліцыянтаў упаў на зямлю, яго зьбівалі нагамі. Як міліцыя атрымала загад атакаваць, прыкладна тысяча дэманстрантаў — большасьць зь іх складалі маладыя хлопцы — замест таго, каб разьбегчыся, як гэта найчасьцей бывала раней, узяліся за камяні і калы. Балазе побач апынуўся кантэйнэр з тратуарнай пліткай (як сьцьвярджае былы міліцыянт і сёньняшні палітэмігрант Алег Батурын, адмыслова падвезенай уладамі, каб справакаваць жорсткія сутыкненьні). Першая атака амонаўцаў была адбітая. Паводле прэс-рэлізу ўладаў, 53 міліцыянты атрымалі пашкоджаньні, а чацьвёра трапілі ў шпіталь. Пазьней стала вядома, што затрыманых падчас гэтай дэманстрацыі катавалі сьпярша ў міліцэйскіх машынах, а пасьля ў пастарунках. Лукашэнка любіць паўтараць, што ягоны ўлюбёны праект — беларуска-расейская саюзная дзяржава, якая павінна пераняць лепшае з Савецкага Саюзу — падтрымліваецца ўсімі беларусамі. Аднак дасьледаваньні недзяржаўных сацыялягічных службаў паказваюць, што грамадзтва падзялілася ў адносінах да гэтага пытаньня. Пры гэтым маладзейшыя рэспандэнты часьцей выступаюць за захаваньне поўнае незалежнасьці Беларусі.

Сярод студэнтаў, напрыклад, рэдка знойдзеш такіх, якія б адчувалі настальгію па Савецкім Саюзе. І менавіта студэнцтва актыўна ўдзельнічала ў пратэстах супраць першага беларуска-расейскага саюзнага пагадненьня ўвесну 1996 году. Тады дэманстрацыі ў Менску зьбіралі ад 10 да 50 тысяч удзельнікаў, нягледзячы на арышты соцень людзей. Студэнтаў тузінамі

выключалі з універсытэтаў, а настаўнікі па загадах з аддзелаў адукацыі рабілі ўсё, каб утрымаць вучняў ад выхаду на дэманстрацыі.
Сёньня, калі мінулася пяць год, многія маладыя людзі расчараваліся ў традыцыйнай беларускай апазыцыі, арганізатарцы тых пратэстаў у 1996 годзе. Многія юнакі лічаць яе слабой і неэфэктыўнай. Некаторыя зь іх эмігравалі, некаторыя адышлі ад палітыкі, але ёсьць і такія, што далучыліся да арганізацый, якія лічаць гвалт адным з магчымых мэтадаў вырашэньня сёньняшніх праблем Беларусі.

Нататкі з падпольля
Сябры арганізацый „Край“ і „Белы легіён“ актыўна ўдзельнічалі ў сутыкненьнях зь міліцыяй у кастрычніку 1999-га. Гэтыя тыповыя для Беларусі „праварадыкальныя“ арганізацыі не дэкляруюць ідэі перавагі беларусаў над іншымі нацыянальнымі супольнасьцямі. Яны не вызнаюць расізму ані шавінізму (хоць пры гэтым часам ужываюць жорсткую антырасейскую — у сэнсе антыімпэрскую — рыторыку). У гэтым іхнае прынцыповае адрозьненьне ад радыкальнай правіцы на Захадзе — яны, як правіла, не шукаюць сабе ворагаў сярод меншасьцяў (прынамсі пакуль). Яны таксама не прапагандуюць гвалт дзеля гвалту. Але з гледзішча сёньняшніх беларускіх уладаў яны ўяўляюць небясьпеку для дзяржаўнага ладу, і таму іх сябрам даводзіцца захоўваць канспірацыю, каб ня трапіць пад каптур КДБ. Калі ў „Белым легіёне“, прынамсі, кіраўнік вядомы грамадзкасьці, дык кіраўнікі „Краю“ дагэтуль захоўваюць інкогніта. Таму сябры „Краю“ не адгукнуліся на просьбу *Transitions* аб інтэрвію. Але калі меркаваць па нешматлікіх заявах „Краю“ для прэсы, іхных падпольна друкаваных бюлетэнях і Інтэрнэт-сайце, ідэалёгія арганізацыі дастаткова блізкая да ідэалёгіі „Белага легіёну“, чые налепкі і ўлёткі з нумарам пэйджэра і словамі „Радзіма альбо сьмерць!“ можна пабачыць у мэтро і на будынках у Менску.
„Белы легіён“ узначальвае 33-гадовы Сяргей Чыслаў, які быў адным зь лідэраў Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў (БЗВ) на пачатку 90-х. Большасьць чальцоў БЗВ была вымушаная сысьці з войска пад ціскам кебічаўскае адміністрацыі або пасьля прыходу Лукашэнкі да ўлады. Чыслаў заснаваў „Белы легіён“ разам з часткай маладзейшых сяброў БЗВ. Паводле

словаў Чыслава, сёньня ў арганізацыі каля 200 чалавек па ўсёй краіне — большасьць зь іх мужчыны да 30 гадоў.
Чыслаў кажа, што „Белы легіён“ аб’ядноўвае патрыётаў Беларусі як дзяржавы, якія, у адрозьненьне ад груповак кшталту „Русского национального единства“ (РНЕ) — нэанацысцкай арганізацыі, імпартаванай у Беларусь з Расеі, адмаўляюць этнічны нацыяналізм. Як і беларускія радыкальныя арганізацыі, РНЕ не зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі. Аднак ёсьць шмат сьведчаньняў таго, што арганізацыя атрымоўвае фінансаваньне з Расеі, і хадзілі чуткі, што яе чальцоў трэніравалі афіцэры беларускіх спэцпадразьдзяленьняў міліцыі і войска, што часткова пацьвердзілася з арыштам былых байцоў спэцгрупы Міністэрства ўнутраных справаў „Алмаз“ В. Ігнатовіча ды ягоных калегаў у сувязі са справай З. Завадзкага.
„У адрозьненьне ад РНЕ, мы не пытаемся ў людзей, што хочуць да нас далучыцца, напрыклад, ці ёсьць у іх сэміцкая кроў“, — кажа Чыслаў. Ён дадае, што згодны з многімі праграмнымі ідэямі традыцыйнай беларускай апазыцыі, але ня верыць яе лідэрам. Паводле ягоных словаў, многія зь іх задаволеныя сёньняшняй сытуацыяй у Беларусі, бо яна дае ім магчымасьць атрымоўваць заходнія гранты як „змагарам з рэжымам“.
„Белы Легіён“ ніколі не рабіў спробаў афіцыйна зарэгістравацца, у адрозьненьне ад Беларускай партыі свабоды (БПС), якая падавала адпаведную просьбу і якой было адмоўлена ў рэгістрацыі. „Сёньня немагчыма дзейнічаць у адпаведнасці з законам, — кажа лідэр БПС, 29-гадовы Сяргей Высоцкі. — Як толькі вы пачынаеце падпарадкоўвацца існуючым законам, рэжым адразу прыдумае для вас новыя, яшчэ больш жорсткія. Да таго ж, аддаць сьпісы сяброў уладам [што неабходна для рэгістрацыі] значыла б фактычна „здаць“ іх.“
Высоцкі кажа, што ягоная партыя мае каля 200 актывістаў у Менску і некалькі суполак з пару тузінаў чалавек у іншых гарадох Беларусі. Абсалютная бальшыня чальцоў — маладыя хлопцы.
Высоцкі ня згодны з тымі лідэрамі беларускай апазыцыі, якія кажуць аб неабходнасьці „аксамітнай рэвалюцыі“. „Тыя, хто рыхтуецца да „аксамітнай рэвалюцыі“, не атрымаюць ніякай“, — лічыць ён. Аднак пры гэтым ён не ўважае сяброў БПС

ультрарадыкаламі. „Мы — дзесьці паміж традыцыйнымі эўрапейскімі кансэрватарамі і „новымі правымі“… Беларусь, магчыма, адна зь нешматлікіх краінаў Эўропы, якой патрэбны нацыяналізм. Як і любая кансэрватыўная партыя, мы падтрымліваем беларускую дзяржаўнасьць і лічым, што абараняць яе трэба любымі мэтадамі.“

БПС была заснаваная ў 1992 годзе групай студэнтаў Менскага пэдінстытуту, дзе ў той час вучыўся Высоцкі. У 1993-м яны наладзілі першую невялікую мірную дэманстрацыю пратэсту, патрабуючы вываду расейскіх войскаў зь Беларусі. У лістападзе 1996-га Высоцкі выйшаў у другі тур на давыбарах у Вярхоўны Савет, апярэдзіўшы свайго суперніка (у Менску ў Зялёным Лузе). Але давыбары праходзілі адначасова з рэфэрэндумам, пасьля якога Лукашэнка дадаў сабе два гады прэзыдэнцтва, распусьціў аднапалатны Вярхоўны Савет і абраў 110 ляяльных дэпутатаў зь Вярхоўнага Савету ў ніжнюю палату новага парлямэнту. Такім чынам другі тур давыбараў быў скасаваны. Высоцкі кажа, што было б наіўна спадзявацца на тое, што цяпер сытуацыю можна будзе зьмяніць праз выбары. „Трэба рыхтаваць нацыянальныя сілы, бо сілу можна перамагчы толькі іншай сілай.“ Ён кажа, што згубіў павагу да многіх памяркоўных лідэраў апазыцыі пасьля лістападаўскага крызысу 96-га году. „Я бачыў камандзіраў вайковых частак і дэлегацыі шахтароў, якія прыходзілі ў Вярхоўны Савет і вызываліся бараніць яго. Але кіраўніцтва Вярхоўнага Савету адмаўлялася ад такіх прапаноў і ехала ў Маскву кансультавацца і прасіць дапамогі.“

У краіне, дзе беларускую мову рэдка пачуеш на вуліцах пасьля двухсотгадовай русіфікацыі і дзе нават беларускія культурныя ініцыятывы часта бэсьцяцца афіцыёзнымі СМІ як „праявы нацыяналізму“, БПС выступае пад адкрыта нацыяналістычнымі лёзунгамі. Партыйны бюлетэнь „Наш шлях“ выходзіць пад эпіграфам „Беларусь вышэй за ўсё!“ і часам зьмяшчае фота самога Высоцкага ў „фюрэрскай“ позе. Пры гэтым у бюлетэні не сустрэнеш адкрытага расізму ці этнічных фобіяў (за выняткам слова „маскалі“, якое сёньня, бясспрэчна, набыло адмоўныя канатацыі).

Высоцкі кажа, што сябры ягонай партыі ня раз мелі сутычкі з чальцамі РНЕ. Пры гэтым ён ганарыцца тым, што БПС здолела стварыць канкурэнцыю РНЕ ў асяродку менскіх футбольных

фанатаў.

Зьмены пачынаюцца з сэрца

У той час як значная частка маладых апазыцыйных актывістаў радыкалізуецца, лідэр найбуйнейшай і найбольш вядомай апазыцыйнай моладзевай арганізацыі „Малады фронт“ у пошуку адказаў на сёньняшнія праблемы Беларусі зьвяртаецца да Бога.

24-гадовы Павал Севярынец далучыўся да моладзевай фракцыі Беларускага Народнага Фронту у 1995 годзе і браў актыўны ўдзел у масавых пратэстах апазыцыі ў 1996—1998 гадох. „У той час для нас галоўным было прарвацца празь яшчэ адзін міліцэйскі кардон, падысьці на дзесяць мэтраў бліжэй да будынку прэзыдэнцкай адміністрацыі, — кажа Севярынец. — Асноўныя ідэі фармуляваліся „ад зваротнага“: супраць дыктатуры, супраць расейскага імпэрыялізму.“ Севярынца некалькі разоў затрымлівалі ў 1997 годзе за ўдзел у шэсьцях і мітынгах. У 98-м супраць яго завялі крымінальную справу па абвінавачваньні ў „злосным хуліганстве“ (разам з хаўрусьнікамі ён сарваў канцэрт у падтрымку беларуска-расейскага саюзу, які меркавалася правесьці 2 красавіка 1997 году на плошчы Якуба Коласа). Яго кінулі ў Валадарку, але выпусьцілі праз два месяцы пад ціскам, як ён лічыць, грамадзкіх пратэстаў у Беларусі і за яе межамі.

Калі 236 дэлегатаў з усёй Беларусі сабраліся на ўстаноўчы сход „Маладога фронту“ ў 1997 годзе, менавіта Севярынец быў абраны старшынём новай арганізацыі. Сёньня большасьць сяброў „МФ“ — а іх каля 1500 ува ўсёй краіне — маладзейшыя за 21 год, а амаль палова — маладзейшыя за 18. У адрозьненьне ад „Белага Легіёну“ і БПС, значная частка чальцоў „МФ“ — дзяўчыны.

„Малады фронт“ імкнецца весьці апазыцыйную дзейнасьць новымі для Беларусі мэтадамі, напрыклад, правядзеньнем дыскатэк і віктарынаў. Час ад часу актывісты арганізацыі ўночы масава вывешваюць на будынках па ўсёй краіне тузіны бел-чырвона-белых сьцягоў.

„У 1999-м годзе перад намі паўстаў выбар: ці мы проста застаемся ў апазыцыі з ранейшай плятформай, ці мы прапануем альтэрнатыву, — кажа Севярынец. — Традыцыйныя ідэі дэмакратыі, адкрытага грамадзтва і рынкавай эканомікі

недастатковыя для стварэньня такое альтэрнатыўнае плятформы. Ідэі хрысьціянства, якія маюць глыбокія карані ў беларускай гісторыі, далі нам адказ.“
Лідэр „Маладога фронту“ лічыць, што асноўныя праблемы Беларусі глыбейшыя за аўтарытарную ўладу і пагрозу расейскага рэваншызму — гэта брак духоўнасьці і „вакуум бязьвер’я“. Севярынец кажа, што паважае людзей зь „Белага легіёну“, БПС і „Краю“, куды сыходзяць некаторыя актывісты „МФ“. „Я ведаю многіх людзей з гэтых арганізацый, і я не магу сказаць, што яны нясуць разбуральныя ідэі, — кажа ён. — Яны таксама прысягаюць на вернасьць Богу і Беларусі. Але яны памыляюцца, думаючы, што сілы нянавісьці можна перамагчы з дапамогай гвалту“. Аднак Севярынец прызнае, што многія людзі ў „МФ“ не падзяляюць гэтай ягонай думкі.
Вінцук Вячорка, лідэр БНФ, сьцьвярджае, што радыкальныя моладзевыя арганізацыі ёсьць натуральнай рэакцыяй на сёньняшнюю антыбеларускую палітыку ўладаў Беларусі. Ён дадае, што, калі Расея анэксуе Беларусь, яна павінная быць гатовая да партызанскага руху, бо нават сёньняшнія памяркоўныя сілы будуць ужываць любыя мэтады, каб аднавіць незалежнасьць краіны.
Аднак Севярынец кажа, што нават калі Беларусь зробіцца часткай Расейскай Фэдэрацыі, ён ўсё роўна будзе выступаць за негвалтоўнае змаганьне за незалежнасьць. Многія актывісты апазыцыі мяркуюць, што ад такога падыходу патыхае здрадніцтвам. Але Севярынец пярэчыць: „Паглядзеце на краіны Прыбалтыкі. Яны доўга былі пад акупацыяй, але здолелі захаваць нацыянальную тоеснасьць. Калі мы ня хочам, каб Расея захапіла Беларусь, нам патрэбныя духовыя пераўтварэньні“.

P. S. З часу, калі гэты артыкул быў апублікаваны ў *Transitions Online*, многае ў апазыцыйным моладзевым руху Беларусі зьмянілася — раскалолася БПС, частка чальцоў „Маладога фронту“ адышла ад арганізацыі, незадаволеная Севярынцам, узяўшы ўдзел у стварэньні новай арганізацыі „Зубр“, што ўсё гучней заяўляе аб сабе.
Увідавочнілася таксама і зьява, якая ставіць пад сумнеў адну з галоўных тэзаў артыкулу — аб тым, што беларуская

радыкальная правіца ня ёсьць ксэнафобскай і расісцкай. Шэраг бачынаў у Інтэрнэце, гаспадары якіх дэкляруюць скрайне правую ідэалёгію (прыкладам „Правае Рэха“ ці „Слова Нацыі“), часьцей абрынаюцца на такіх ворагаў, як гомасэксуалісты, жыды ці беларуская лібэральная апазыцыя, чым на кіраўнічы рэжым. Цяжка сказаць, наколькі яны адлюстроўваюць настроі беларускага правага руху, але гэтыя бачыны зроблены больш прафэсійна й цікава за многія іншыя ў беларускім сеціве, а падчас дыскусіяў іхныя аўтары часьцяком выступаюць больш аргумэнтавана за апанэнтаў. Таму яны непазьбежна будуць прыцягваць увагу чытачоў і фармаваць погляд на беларускую радыкальную правіцу.

Я далёкі ад таго, каб абвяшчаць такія выданьні „відавочнымі гэбэшнымі правакацыямі“, як гэта часта робіцца ў нас у адносінах да любога радыкалізму. Але ж дзіўнавата чытаць, калі людзі, якія называюць сябе беларускімі нацыяналістамі, „выкрываюць“ лібэральныя хібы газэты „Наша Ніва“, „мангалёіднасьць“ рэдактара ARCHE Валеркі Булгакава ці жыдоўства і шкодныя напрамкі ў музыцы Лявона Вольскага.

І яшчэ адзін факт: „Белы Легіён“ ня мае Інтэрнэт-старонкі, „Край“ займеў сваю старонку толькі нядаўна (**www.spa-kraj.org**), як: БПС (**www.bps-belarus.narod.ru**). Тады як беларускамоўныя бачыны, на якіх спавядаюцца шавіністычныя ідэі, прадстаўленыя ў Сеціве несувымерна больш, чым у грамадзтве (большасьць „груповак“, якія іх выдаюць, складаецца зь некалькіх чалавек). Гэта стварае ўражаньне, нібыта большасьць беларускай радыкальнай правіцы лічыць, што ўсе цяперашнія беды Беларусі з-за таго, што Лукашэнка ды ягонае атачэньне — гэта жыды, якія начамі п’юць кроў хрысьціянскіх / паганскіх і славянскіх / балцкіх немаўлятак. На шчасьце, рэальная беларуская правіца ня ўпала ў такія трызьненьні, як віртуальная.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 29-07-2001
[image]

Аляксей Знаткевіч

Любымі даступнымі сродкамі

АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ
супрацоўнік агенцыі навін БелаПАН і карэспандэнт Інтэрнэт-часопісу Transitions Online (www.tol.cz), што асьвятляе падзеі ў 28 краінах былога сацыялістычнага блёку і СНД.

„Любымі даступнымі сродкамі" - гэта дапрацаваная вэрсія артыкулу, апублікаванага Transitions.

„Паглядзеце на гэтыя твары: у іх няма нічога чалавечага, толькі прага разбурэньня", — кіпеў увечары камэнтатар БТ. На экране тым часам паказвалі твары маладых людзей з тых тысячаў, што рушылі па праспэкце Скарыны ў Менску падчас сьвяткаваньня Дня Волі 23 сакавіка 1997 году. Вядучы не шкадаваў словаў для шальмаваньня „падагрэтых гарэлкай хуліганаў, якія падпальвалі камэрцыйныя кіёскі". Каб давесьці слушнасьць абвінавачваньня, камэра спынілася на лапіку агню на асфальце — хутчэй за ўсё гарэў плякат з партрэтам Аляксандра Лукашэнкі. Якраз перад тым улады абавязалі вывесіць такія партрэты ва ўсіх установах. Нягледзячы на мірны характар пратэсту, у той дзень міліцыя неаднаразова атакавала дэманстрантаў, зьбіваючы гумавымі дручкамі ня толькі „трэніраваных адмарозкаў", калі карыстацца выразам Зімоўскага, але й жанчын, і старых.

Некалькі гадоў запар мірныя антыўрадавыя дэманстрацыі — лідэры дэмакратычнай апазыцыі настойвалі на неабходнасьці выключна негвалтоўных мэтадаў супраціву — зь нязьменнай

жорсткасьцю разганялі, арыштоўваючы найбольш актыўных удзельнікаў. Пры гэтым амаль пасьля кожнай акцыі некаторых затрыманых зьбівалі ў пастарунках. Паступова сярод часткі ўдзельнікаў, не ў апошнюю чаргу тых, што прайшлі праз турмы, высьпявала думка, што посьпеху можна дасягнуць толькі адказваючы гвалтам на гвалт.

Два гады пазьней, 17 кастрычніка 1999 году каля 20 тысяч чалавек выйшлі на вуліцы Менску, каб запатрабаваць адстаўкі Лукашэнкі, выступіць супраць ягоных плянаў аб'яднаньня з Расеяй, а таксама запатрабаваць расьсьледаваньня зьнікненьняў вядомых палітыкаў і спыненьня палітычна матываваных рэпрэсій. Гэтым разам частка дэманстрантаў была гатовая да бойкі. Калі падчас першай сутычкі на рагу Фрунзэ й Першамайскай адзін зь міліцыянтаў упаў на зямлю, яго зьбівалі нагамі. Як міліцыя атрымала загад атакаваць, прыкладна тысяча дэманстрантаў — большасьць зь іх складалі маладыя хлопцы — замест таго, каб разьбегчыся, як гэта найчасьцей бывала раней, узяліся за камяні і калы. Балазе побач апынуўся кантэйнэр з тратуарнай пліткай (як сьцьвярджае былы міліцыянт і сёньняшні палітэмігрант Алег Батурын, адмыслова падвезенай уладамі, каб справакаваць жорсткія сутыкненьні). Першая атака амонаўцаў была адбітая. Паводле прэс-рэлізу ўладаў, 53 міліцыянты атрымалі пашкоджаньні, а чацьвёра трапілі ў шпіталь. Пазьней стала вядома, што затрыманых падчас гэтай дэманстрацыі катавалі сьпярша ў міліцэйскіх машынах, а пасьля ў пастарунках. Лукашэнка любіць паўтараць, што ягоны ўлюбёны праект — беларуска-расейская саюзная дзяржава, якая павінна пераняць лепшае з Савецкага Саюзу — падтрымліваецца ўсімі беларусамі. Аднак дасьледаваньні недзяржаўных сацыялягічных службаў паказваюць, што грамадзтва падзялілася ў адносінах да гэтага пытаньня. Пры гэтым маладзейшыя рэспандэнты часьцей выступаюць за захаваньне поўнае незалежнасьці Беларусі.

Сярод студэнтаў, напрыклад, рэдка знойдзеш такіх, якія б адчувалі настальгію па Савецкім Саюзе. І менавіта студэнцтва актыўна ўдзельнічала ў пратэстах супраць першага беларуска-расейскага саюзнага пагадненьня ўвесну 1996 году. Тады дэманстрацыі ў Менску зьбіралі ад 10 да 50 тысяч удзельнікаў, нягледзячы на арышты соцень людзей. Студэнтаў тузінамі

выключалі з універсытэтаў, а настаўнікі па загадах з аддзелаў адукацыі рабілі ўсё, каб утрымаць вучняў ад выхаду на дэманстрацыі.
Сёньня, калі мінулася пяць год, многія маладыя людзі расчараваліся ў традыцыйнай беларускай апазыцыі, арганізатарцы тых пратэстаў у 1996 годзе. Многія юнакі лічаць яе слабой і неэфэктыўнай. Некаторыя зь іх эмігравалі, некаторыя адышлі ад палітыкі, але ёсьць і такія, што далучыліся да арганізацый, якія лічаць гвалт адным з магчымых мэтадаў вырашэньня сёньняшніх праблем Беларусі.

Нататкі з падпольля
Сябры арганізацый „Край“ і „Белы легіён“ актыўна ўдзельнічалі ў сутыкненьнях зь міліцыяй у кастрычніку 1999-га. Гэтыя тыповыя для Беларусі „праварадыкальныя“ арганізацыі не дэкляруюць ідэі перавагі беларусаў над іншымі нацыянальнымі супольнасьцямі. Яны не вызнаюць расізму ані шавінізму (хоць пры гэтым часам ужываюць жорсткую антырасейскую — у сэнсе антыімпэрскую — рыторыку). У гэтым іхнае прынцыповае адрозьненьне ад радыкальнай правіцы на Захадзе — яны, як правіла, не шукаюць сабе ворагаў сярод меншасьцяў (прынамсі пакуль). Яны таксама не прапагандуюць гвалт дзеля гвалту. Але з гледзішча сёньняшніх беларускіх уладаў яны ўяўляюць небясьпеку для дзяржаўнага ладу, і таму іх сябрам даводзіцца захоўваць канспірацыю, каб ня трапіць пад каптур КДБ. Калі ў „Белым легіёне“, прынамсі, кіраўнік вядомы грамадзкасьці, дык кіраўнікі „Краю“ дагэтуль захоўваюць інкогніта. Таму сябры „Краю“ не адгукнуліся на просьбу *Transitions* аб інтэрвію. Але калі меркаваць па нешматлікіх заявах „Краю“ для прэсы, іхных падпольна друкаваных бюлетэнях і Інтэрнэт-сайце, ідэалёгія арганізацыі дастаткова блізкая да ідэалёгіі „Белага легіёну“, чые налепкі і ўлёткі з нумарам пэйджэра і словамі „Радзіма альбо сьмерць!“ можна пабачыць у мэтро і на будынках у Менску.
„Белы легіён“ узначальвае 33-гадовы Сяргей Чыслаў, які быў адным зь лідэраў Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў (БЗВ) на пачатку 90-х. Большасьць чальцоў БЗВ была вымушаная сысьці з войска пад ціскам кебічаўскае адміністрацыі або пасьля прыходу Лукашэнкі да ўлады. Чыслаў заснаваў „Белы легіён“ разам з часткай маладзейшых сяброў БЗВ. Паводле

словаў Чыслава, сёньня ў арганізацыі каля 200 чалавек па ўсёй краіне — большасьць зь іх мужчыны да 30 гадоў.
Чыслаў кажа, што „Белы легіён“ аб’ядноўвае патрыётаў Беларусі як дзяржавы, якія, у адрозьненьне ад груповак кшталту „Русского национального единства“ (РНЕ) — нэанацысцкай арганізацыі, імпартаванай у Беларусь з Расеі, адмаўляюць этнічны нацыяналізм. Як і беларускія радыкальныя арганізацыі, РНЕ не зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі. Аднак ёсьць шмат сьведчаньняў таго, што арганізацыя атрымоўвае фінансаваньне з Расеі, і хадзілі чуткі, што яе чальцоў трэніравалі афіцэры беларускіх спэцпадразьдзяленьняў міліцыі і войска, што часткова пацьвердзілася з арыштам былых байцоў спэцгрупы Міністэрства ўнутраных справаў „Алмаз“ В. Ігнатовіча ды ягоных калегаў у сувязі са справай З. Завадзкага.
„У адрозьненьне ад РНЕ, мы не пытаемся ў людзей, што хочуць да нас далучыцца, напрыклад, ці ёсьць у іх сэміцкая кроў“, — кажа Чыслаў. Ён дадае, што згодны з многімі праграмнымі ідэямі традыцыйнай беларускай апазыцыі, але ня верыць яе лідэрам. Паводле ягоных словаў, многія зь іх задаволеныя сёньняшняй сытуацыяй у Беларусі, бо яна дае ім магчымасьць атрымоўваць заходнія гранты як „змагарам з рэжымам“.
„Белы Легіён“ ніколі не рабіў спробаў афіцыйна зарэгістравацца, у адрозьненьне ад Беларускай партыі свабоды (БПС), якая падавала адпаведную просьбу і якой было адмоўлена ў рэгістрацыі. „Сёньня немагчыма дзейнічаць у адпаведнасці з законам, — кажа лідэр БПС, 29-гадовы Сяргей Высоцкі. — Як толькі вы пачынаеце падпарадкоўвацца існуючым законам, рэжым адразу прыдумае для вас новыя, яшчэ больш жорсткія. Да таго ж, аддаць сьпісы сяброў уладам [што неабходна для рэгістрацыі] значыла б фактычна „здаць“ іх.“
Высоцкі кажа, што ягоная партыя мае каля 200 актывістаў у Менску і некалькі суполак з пару тузінаў чалавек у іншых гарадох Беларусі. Абсалютная бальшыня чальцоў — маладыя хлопцы.
Высоцкі ня згодны з тымі лідэрамі беларускай апазыцыі, якія кажуць аб неабходнасьці „аксамітнай рэвалюцыі“. „Тыя, хто рыхтуецца да „аксамітнай рэвалюцыі“, не атрымаюць ніякай“, — лічыць ён. Аднак пры гэтым ён не ўважае сяброў БПС

ультрарадыкаламі. „Мы — дзесьці паміж традыцыйнымі эўрапейскімі кансэрватарамі і „новымі правымі“… Беларусь, магчыма, адна зь нешматлікіх краінаў Эўропы, якой патрэбны нацыяналізм. Як і любая кансэрватыўная партыя, мы падтрымліваем беларускую дзяржаўнасьць і лічым, што абараняць яе трэба любымі мэтадамі.“

БПС была заснаваная ў 1992 годзе групай студэнтаў Менскага пэдінстытуту, дзе ў той час вучыўся Высоцкі. У 1993-м яны наладзілі першую невялікую мірную дэманстрацыю пратэсту, патрабуючы вываду расейскіх войскаў зь Беларусі. У лістападзе 1996-га Высоцкі выйшаў у другі тур на давыбарах у Вярхоўны Савет, апярэдзіўшы свайго суперніка (у Менску ў Зялёным Лузе). Але давыбары праходзілі адначасова з рэфэрэндумам, пасьля якога Лукашэнка дадаў сабе два гады прэзыдэнцтва, распусьціў аднапалатны Вярхоўны Савет і абраў 110 ляяльных дэпутатаў зь Вярхоўнага Савету ў ніжнюю палату новага парлямэнту. Такім чынам другі тур давыбараў быў скасаваны. Высоцкі кажа, што было б наіўна спадзявацца на тое, што цяпер сытуацыю можна будзе зьмяніць праз выбары. „Трэба рыхтаваць нацыянальныя сілы, бо сілу можна перамагчы толькі іншай сілай.“ Ён кажа, што згубіў павагу да многіх памяркоўных лідэраў апазыцыі пасьля лістападаўскага крызысу 96-га году. „Я бачыў камандзіраў вайковых частак і дэлегацыі шахтароў, якія прыходзілі ў Вярхоўны Савет і вызываліся бараніць яго. Але кіраўніцтва Вярхоўнага Савету адмаўлялася ад такіх прапаноў і ехала ў Маскву кансультавацца і прасіць дапамогі.“

У краіне, дзе беларускую мову рэдка пачуеш на вуліцах пасьля двухсотгадовай русіфікацыі і дзе нават беларускія культурныя ініцыятывы часта бэсьцяцца афіцыёзнымі СМІ як „праявы нацыяналізму“, БПС выступае пад адкрыта нацыяналістычнымі лёзунгамі. Партыйны бюлетэнь „Наш шлях“ выходзіць пад эпіграфам „Беларусь вышэй за ўсё!“ і часам зьмяшчае фота самога Высоцкага ў „фюрэрскай“ позе. Пры гэтым у бюлетэні не сустрэнеш адкрытага расізму ці этнічных фобіяў (за выняткам слова „маскалі“, якое сёньня, бясспрэчна, набыло адмоўныя канатацыі).

Высоцкі кажа, што сябры ягонай партыі ня раз мелі сутычкі з чальцамі РНЕ. Пры гэтым ён ганарыцца тым, што БПС здолела стварыць канкурэнцыю РНЕ ў асяродку менскіх футбольных

фанатаў.

Зьмены пачынаюцца з сэрца

У той час як значная частка маладых апазыцыйных актывістаў радыкалізуецца, лідэр найбуйнейшай і найбольш вядомай апазыцыйнай моладзевай арганізацыі „Малады фронт“ у пошуку адказаў на сёньняшнія праблемы Беларусі зьвяртаецца да Бога.

24-гадовы Павал Севярынец далучыўся да моладзевай фракцыі Беларускага Народнага Фронту у 1995 годзе і браў актыўны ўдзел у масавых пратэстах апазыцыі ў 1996—1998 гадох. „У той час для нас галоўным было прарвацца празь яшчэ адзін міліцэйскі кардон, падысьці на дзесяць мэтраў бліжэй да будынку прэзыдэнцкай адміністрацыі, — кажа Севярынец. — Асноўныя ідэі фармуляваліся „ад зваротнага“: супраць дыктатуры, супраць расейскага імпэрыялізму.“ Севярынца некалькі разоў затрымлівалі ў 1997 годзе за ўдзел у шэсьцях і мітынгах. У 98-м супраць яго завялі крымінальную справу па абвінавачваньні ў „злосным хуліганстве“ (разам з хаўрусьнікамі ён сарваў канцэрт у падтрымку беларуска-расейскага саюзу, які меркавалася правесьці 2 красавіка 1997 году на плошчы Якуба Коласа). Яго кінулі ў Валадарку, але выпусьцілі праз два месяцы пад ціскам, як ён лічыць, грамадзкіх пратэстаў у Беларусі і за яе межамі.

Калі 236 дэлегатаў з усёй Беларусі сабраліся на ўстаноўчы сход „Маладога фронту“ ў 1997 годзе, менавіта Севярынец быў абраны старшынём новай арганізацыі. Сёньня большасьць сяброў „МФ“ — а іх каля 1500 ува ўсёй краіне — маладзейшыя за 21 год, а амаль палова — маладзейшыя за 18. У адрозьненьне ад „Белага Легіёну“ і БПС, значная частка чальцоў „МФ“ — дзяўчыны.

„Малады фронт“ імкнецца весьці апазыцыйную дзейнасьць новымі для Беларусі мэтадамі, напрыклад, правядзеньнем дыскатэк і віктарынаў. Час ад часу актывісты арганізацыі ўночы масава вывешваюць на будынках па ўсёй краіне тузіны бел-чырвона-белых сьцягоў.

„У 1999-м годзе перад намі паўстаў выбар: ці мы проста застаемся ў апазыцыі з ранейшай плятформай, ці мы прапануем альтэрнатыву, — кажа Севярынец. — Традыцыйныя ідэі дэмакратыі, адкрытага грамадзтва і рынкавай эканомікі

недастатковыя для стварэньня такое альтэрнатыўнае плятформы. Ідэі хрысьціянства, якія маюць глыбокія карані ў беларускай гісторыі, далі нам адказ.“
Лідэр „Маладога фронту“ лічыць, што асноўныя праблемы Беларусі глыбейшыя за аўтарытарную ўладу і пагрозу расейскага рэваншызму — гэта брак духоўнасьці і „вакуум бязьвер’я“. Севярынец кажа, што паважае людзей зь „Белага легіёну“, БПС і „Краю“, куды сыходзяць некаторыя актывісты „МФ“. „Я ведаю многіх людзей з гэтых арганізацый, і я не магу сказаць, што яны нясуць разбуральныя ідэі, — кажа ён. — Яны таксама прысягаюць на вернасьць Богу і Беларусі. Але яны памыляюцца, думаючы, што сілы нянавісьці можна перамагчы з дапамогай гвалту“. Аднак Севярынец прызнае, што многія людзі ў „МФ“ не падзяляюць гэтай ягонай думкі.
Вінцук Вячорка, лідэр БНФ, сьцьвярджае, што радыкальныя моладзевыя арганізацыі ёсьць натуральнай рэакцыяй на сёньняшнюю антыбеларускую палітыку ўладаў Беларусі. Ён дадае, што, калі Расея анэксуе Беларусь, яна павінная быць гатовая да партызанскага руху, бо нават сёньняшнія памяркоўныя сілы будуць ужываць любыя мэтады, каб аднавіць незалежнасьць краіны.
Аднак Севярынец кажа, што нават калі Беларусь зробіцца часткай Расейскай Фэдэрацыі, ён ўсё роўна будзе выступаць за негвалтоўнае змаганьне за незалежнасьць. Многія актывісты апазыцыі мяркуюць, што ад такога падыходу патыхае здрадніцтвам. Але Севярынец пярэчыць: „Паглядзеце на краіны Прыбалтыкі. Яны доўга былі пад акупацыяй, але здолелі захаваць нацыянальную тоеснасьць. Калі мы ня хочам, каб Расея захапіла Беларусь, нам патрэбныя духовыя пераўтварэньні“.

P. S. З часу, калі гэты артыкул быў апублікаваны ў *Transitions Online*, многае ў апазыцыйным моладзевым руху Беларусі зьмянілася — раскалолася БПС, частка чальцоў „Маладога фронту“ адышла ад арганізацыі, незадаволеная Севярынцам, узяўшы ўдзел у стварэньні новай арганізацыі „Зубр“, што ўсё гучней заяўляе аб сабе.
Увідавочнілася таксама і зьява, якая ставіць пад сумнеў адну з галоўных тэзаў артыкулу — аб тым, што беларуская

радыкальная правіца ня ёсьць ксэнафобскай і расісцкай. Шэраг бачынаў у Інтэрнэце, гаспадары якіх дэкляруюць скрайне правую ідэалёгію (прыкладам „Правае Рэха“ ці „Слова Нацыі“), часьцей абрынаюцца на такіх ворагаў, як гомасэксуалісты, жыды ці беларуская лібэральная апазыцыя, чым на кіраўнічы рэжым. Цяжка сказаць, наколькі яны адлюстроўваюць настроі беларускага правага руху, але гэтыя бачыны зроблены больш прафэсійна й цікава за многія іншыя ў беларускім сеціве, а падчас дыскусіяў іхныя аўтары часьцяком выступаюць больш аргумэнтавана за апанэнтаў. Таму яны непазьбежна будуць прыцягваць увагу чытачоў і фармаваць погляд на беларускую радыкальную правіцу.

Я далёкі ад таго, каб абвяшчаць такія выданьні „відавочнымі гэбэшнымі правакацыямі“, як гэта часта робіцца ў нас у адносінах да любога радыкалізму. Але ж дзіўнавата чытаць, калі людзі, якія называюць сябе беларускімі нацыяналістамі, „выкрываюць“ лібэральныя хібы газэты „Наша Ніва“, „мангалёіднасьць“ рэдактара ARCHE Валеркі Булгакава ці жыдоўства і шкодныя напрамкі ў музыцы Лявона Вольскага.

І яшчэ адзін факт: „Белы Легіён“ ня мае Інтэрнэт-старонкі, „Край“ займеў сваю старонку толькі нядаўна (**www.spa-kraj.org**), як: БПС (**www.bps-belarus.narod.ru**). Тады як беларускамоўныя бачыны, на якіх спавядаюцца шавіністычныя ідэі, прадстаўленыя ў Сеціве несувымерна больш, чым у грамадзтве (большасьць „груповак“, якія іх выдаюць, складаецца зь некалькіх чалавек). Гэта стварае ўражаньне, нібыта большасьць беларускай радыкальнай правіцы лічыць, што ўсе цяперашнія беды Беларусі з-за таго, што Лукашэнка ды ягонае атачэньне — гэта жыды, якія начамі п’юць кроў хрысьціянскіх / паганскіх і славянскіх / балцкіх немаўлятак. На шчасьце, рэальная беларуская правіца ня ўпала ў такія трызьненьні, як віртуальная.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 29-07-2001
[image]

Лявон Юрэвіч

Сьвет эміграцыйнага эпісталярыю
З матар'ялаў архіву Рады БНР[1]

„Вядомы факт: беларуская кніжка нарадзілася на эміграцыі. Гісторыя беларускай палітыкі ў першую чаргу — гэта таксама эміграцыя: Рыга, Коўна, Бэрлін, Парыж, Прага… Не апошнім месцам, дзе людзі на выгнаньні змагаліся за незалежную Беларусь, была і ёсьць Амэрыка.
Калі на пачатку 1993 году я прыехаў у Злучаныя Штаты, яшчэ жылі Натальля Арсеньнева, Антон Адамовіч, Вітаўт Тумаш, Мікола Ганько. Яшчэ жыла мастачка Галіна Русак, сястра *таго* Ўсевалада Родзькі. Яшчэ пісалі вершы Янка Золак, Масей Сяднёў. Гэта было неверагодна: людзі *таго* часу, *гістарычныя* людзі, якія самі сабою, сваім існаваньнем набліжалі *той* час, урэчаісьнівалі гісторыю, рабілі яе амаль што свойскаю.

ЛЯВОН ЮРЭВІЧ
архівіст Рады БНР, супрацоўнік Нью-Ёрскай публічнай бібліятэкі. Аўтар гістарычных кніг "Вырваныя бачыны. Да гісторыі Саюзу Беларускае Моладзі" ("Энцыклапедыкс", 2001), "Барыс Рагуля. Жыцьцё над агнём" (ARCHE, 1999), зборніку літаратура-знаўчых артыкулаў "Камэнтары" (Менск, 1999).

Уверх

Пэўна штосьці падобнае мусілі вычуваць яны самі, калі ў 1952 годзе сабраліся ўсе разам каля Ніягары на Першы з'езд Сустрэчу ды ўбачылі на ўласныя вочы Янку Чарапука (такую мянушку яму даў Іван Луцкевіч — гэта ведаюць усе Міколы Абрамчыка), прадстаўніка Ўраду БНР — на Ластоўскага, Ураду Луцкевіча.

Ёсьць небясьпека падацца троху патэтычным, але нявыразна ў гэтым пераемнасьць, своеасаблівая повязь ня розумных людзей адной справы, імя якой — Беларуская Народная Рэспубліка.

Дзеля трываласьці гэтай еднасьці, лучнасьці, сувязі — *сёньня*, каб было *заўтра*, варта памятаць усіх, хто ствараў БНР. Асабліва такіх асобаў, якім быў Янка Чарапук. Янка Чарапук, Антонаў сын, нарадзіўся ў каталіцкай сям'і 30 (18) жніўня 1896 году ў мястэчку Новы Двор Сакольскага павету. Пачатковую адукацыю атрымаў у расейскамоўным Навадворскім Гарадзкім вучылішчы, скончыў Гарадзенскую гімназію, у 1914 годзе паступіў у Пецярбурскі Ўніверсытэт на юрыдычны факультэт. Напэўна, менавіта ў гэтым горадзе, адным з цэнтраў беларускага адраджэньня[3], Янка Чарапук пачаў нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў і ўкраінцаў. Пра гэты ён сам пісаў пра гэта ў анкеце: „У 1917 г. быў Саветам Украінскай Місіі ў Пецярбурзе, затым быў адкамандзіраваны да М[іністэрства] З[амежных] С[праў] Укр. Н. Рэспублікі, дзе быў за часоў Кабінэту Луцкевіча Дыпляматычным кур'ерам, затым Чыноўнікам спэцыяльных даручэньняў, за Ўрадам Ластоўскага Сакратаром Місіі ў Латвіі і Эстоніі, затым Дэлегатам Міністэрства Загран. Спраў“[4]. У грамадзкіх арганізацыях „у Пецярбурзе зьяўляўся Тав. старш. Культ.-Прасьвет. Тав. „Вольных Беларусоў“, у Кіеве Сябром Бел. рады на Ўкраіне і Сябром Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны. … Зарганізаваў на Ўкраіне бел. парт. незалежных рэвалюцыянэраў, пасьля ў 1918 г. ўступіў да б.п. сац.-рэв.“[5]. Друкаваўся ў газэце „Беларусь“, у „Родным Краі“, „Нашай Думцы“.

сіласьцяў, 1952 годзе Беларускую Народную Думу. Сустрэчу ды ўбачылі на ўласныя вочы Янку Чарапука (такую мянушку яму даў Іван Луцкевіч — гэта ведаюць усе Міколы Абрамчыка), прадстаўніка Ўраду БНР — на Ластоўскага, Ураду Луцкевіча.

Ёсьць небясьпека падацца троху патэтычным, але нявыразна ў гэтым пераемнасьць, своеасаблівая повязь ня розумных людзей адной справы, імя якой — Беларуская Народная Рэспубліка.

Дзеля трываласьці гэтай еднасьці, лучнасьці, сувязі — *сёньня*, каб было *заўтра*, варта памятаць усіх, хто ствараў БНР. Асабліва такіх асобаў, якім быў Янка Чарапук. Янка Чарапук, Антонаў сын, нарадзіўся ў каталіцкай сям'і 30 (18) жніўня 1896 году ў мястэчку Новы Двор Сакольскага павету. Пачатковую адукацыю атрымаў у расейскамоўным Навадворскім Гарадзкім вучылішчы, скончыў Гарадзенскую гімназію, у 1914 годзе паступіў у Пецярбурскі Ўніверсытэт на юрыдычны факультэт. Напэўна, менавіта ў гэтым горадзе, адным з цэнтраў беларускага адраджэньня[3], Янка Чарапук пачаў нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў і ўкраінцаў. Пра гэты ён сам пісаў пра гэта ў анкеце: „У 1917 г. быў Саветам Украінскай Місіі ў Пецярбурзе, затым быў адкамандзіраваны да М[іністэрства] З[амежных] С[праў] Укр. Н. Рэспублікі, дзе быў за часоў Кабінэту Луцкевіча Дыпляматычным кур'ерам, затым Чыноўнікам спэцыяльных даручэньняў, за Ўрадам Ластоўскага Сакратаром Місіі ў Латвіі і Эстоніі, затым Дэлегатам Міністэрства Загран. Спраў“[4]. У грамадзкіх арганізацыях „у Пецярбурзе зьяўляўся Тав. старш. Культ.-Прасьвет. Тав. „Вольных Беларусоў“, у Кіеве Сябром Бел. рады на Ўкраіне і Сябром Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны. … Зарганізаваў на Ўкраіне бел. парт. незалежных рэвалюцыянэраў, пасьля ў 1918 г. ўступіў да б.п. сац.-рэв.“[5]. Друкаваўся ў газэце „Беларусь“, у „Родным Краі“, „Нашай Думцы“.

З нагоды 1997 года ў ЗША і Канадзе, прымаючы да ўвагі 80-ю гадавіну БНР (30 – 31 жніўня 1997 г.), Архіў Баляслава Грабінскага „Сакольшчына-Горадня-Вільня“, надрукаваныя

з нагоды 1997 года ў ЗША і Канадзе, прымаючы да ўвагі 80-ю гадавіну БНР (30 – 31 жніўня 1997 г.), Архіў Баляслава Грабінскага „Сакольшчына-Горадня-Вільня“, надрукаваныя

Архіў Рады БНР, які пачаў выходзіць у 1997 годзе

Архіў Рады БНР, які пачаў выходзіць у 1997 годзе

Архіў Рады БНР, які пачаў выходзіць у 1997 годзе

ў „ARCHE“, № 5, 2000. С. 179—208. Таксама: Грынкевіч С. Тры спатканьні / / Бацькаўшчына, № 51—52, 1957. С. 6.

[3] Гл.: Семашкевіч Р. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе. Менск, 1971.

[4] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Том 1. Кніга 2. Вільня—Нью-Ёрк—Менск—Прага, 1998. С. 1084.

[5] Тамсама.

Але дзейнасьць Янкі Чарапука да выезду ў Амэрыку — тэма асобнага дасьледаваньня[6]. Зараз жа нас цікавіць амэрыканскі

пэрыяд ягонага жыцьця, а яшчэ больш дакладна — паваенны этап (да таго ж у тых фрагмэнтах, якія дазваляе задакумэнтаваць архіў БНР), калі пасьля другой сусьветнай вайны ў Злучаныя Штаты пачала прыбываць новая хваля беларускай эміграцыі.

Трэба сказаць, што кон, захаваўшы Янку Чарапук на бацькаўшчыне, тым ня менш ня надта песьціў, на карагох Амэрыкі. Ад 1936 году да пэнсіі ён працаваў на дрэваапрацоўчай *„Chicago and Riverdale Lumber Company“*, што гарантавала пэўны мінімум на жыцьцё, але ня болей. Беларуская дзейнасьць, як вядома, на выгнаньні, не прыносіць прыбытак, колькі вымагае як грашовых ахвяраў, гэтак і побытавага аскетызму.

Магчыма, менавіта гэта сталася падставаю й сямейных складанасьцяў. У 1949 годзе жонка Янкі Чарапука, Клара Змагар (менавіта пад гэтым прозьвішчам яна зафіксавана ў судовых паперах), 53 гадоў, падала на развод. Яна адпускала сабе сямейны дом на Прынстан Авэню коштам у $2000, з які гаспадар мусіў пакінуць у 24 гадзіны з $500, а вынікі (1922 — 1923) жонкаю, ужо былой, у якасьці кампэнсацыі за суботнюю маёмасьць, таксама былую.

У 1951 годзе чыкагскія газэты абышоў здымак: жаночы, з павелічальным шклом узіраецца ў здымак палонных. „Я не верыць, што гэта яе зьніклы сын“, — сьведчылі подпісы.

І распавядалі наступную гісторыю: на вочы Клары Змагар трапіў здымак палонных амэрыканцаў у Карэі, зроблены ў агітацыйных мэтах кітайскім урадам. Яна пазнала (ці ёй здалося, што пазнала) у адным з палонных свайго сына, Адрыяна, зьвестак аб якім не было ад траўня 1950 году — менавіта тады яна атрымала апошні ліст сына, 29-гадовага ваеннага мэдыка з 24-й Дывізіі, залічанага ў войска 1 траўня 1943 г., напісаны зь Японіі, перад адпраўкаю ў Карэю. Сын лічыўся зьніклым бязь зьвестак з 16 ліпеня 1950 году. „Я абсалютна пераканана, што гэта ён. Бачыце, можна разгледзець нават шнар на ягоных вуснах“, — цытавалі газэты словы маткі. Магчыма, што гэта насамрэч быў ён. Але амэрыканскае ваеннае камандаваньне прытрымлівалася іншай думкі. У 1954 г. Клара Змагар атрымала паведамленьне, што ейны сын, Adrian J. Kusiolek, быў забіты 16 ліпеня 1950 г. Сымбалічныя паховіны адбыліся 28 жніўня 1954 г.

6 Зацікаўленых чытачоў адаслаем да артыкулу В. Пандрэвіча „Янка Чарапук-Змагар“, у галаве „Бацькаўшчына“, № 51—52, 1957 і публікацыі С. Шукана „Лісты Янкі Чарапука-Змагара з Амэрыкі (1922—1923)“ у „Запісах БІНІМ“, № 21, 1994. С. 125—137.

Гэта што да жыцьця прыватнага. Жыцьцё грамадзкае было таксама няпростым. Натуральна, яно не было лёгкім ад самага пачатку: нястача людзей, грошай, інфармацыі — усё гэта не спрыяла прадуктыўнай дзейнасьці першага амбасадара БНР у Злучаных Штатах. Але пасьля вайны праблемы набылі іншы кірунак. І „чалавечы фактар“ ня быў тут апошнім: ад першай хвалі новых эмігрантаў зь Беларусі Янка Чарапук апынуўся паміж варагуючымі кааліцыямі, згуртаваньнямі, аб’яднаньнямі і задзіночаньнямі, прычым сутнасьць той варажнечы часта заставалася для яго невытлумачальнай. Дый як было зразумець падзел такой вялікай, выраслай кагорты нацыянальна сьведамых беларусаў на крывічоў і зарубежнікаў, на ўсходнікаў і заходнікаў, на БЦР і БНР. Пра рэлігійны падзел, асабліва сярод праваслаўных, ужо й гаварыць не выпадала: часам здавалася, што менавіта адтуль ішла небясьпека расколу для беларускага руху.
Падтрымкі Чарапука-Змагара шукалі розныя колы, царкоўныя — не ў апошнюю чаргу. Адным зь першых зьвярнуўся да яго япіскап Васіль (Тамашчык):

„Высокапаважаны сп. Я. Змагар!
Хаця мы асабіста яшчэ не знаёмы, а ўсё ж — як бы браты; таму й пішу Вам пару слоў. Я чуў аб Вас ужо нямала добрага ад М. Дзямідава яшчэ ў Нямеччыне, а тут — ад майго прыяцеля др. С. Грынкевіча. Апошні апавядаў мне ці мала цікавых рэчаў аб Вашай дзейнасьці, чым незвычайна заахвоціў мяне да беспасярэдняй сувязі з Вамі.
На жаль, я точна ня ведаю дасюль Вашага асабістага становішча да нашае сьвятое БАПЦ, таму ня ведаю, як і што сказаць Вам адносна яе й майго цяпер тут палажэньня ў Нью-Ёрку.
Калі знойдзеце магчымым адпісаць мне на гэты ліст і Вас будзе крыху цікавіць мая дзейнасьць і стан БАПЦ — з прыемнасьцю дам Вам адказ.
Тымчасам быў бы Вам вельмі ўдзячны, калі б Вы знайшлі магчымым падзяліцца са мною весткамі аб Вашай дзейнасьці па лініі ірляндцаў і інш. Я быў бы таксама ўдзячны Вам, калі б Вы захацелі даць мне пару радкоў адносна амэрыканскага жыцьця пад кутом гледжаньня характару маёй дзейнасьці як

духаўніка, бо я ўважаю, што Вы тут маеце ўжо добрую практыку і ўсякія адпаведныя „разлады“, а я толькі ведаю пагаворку: „Што край, то абычай“.
Быў бы Вам таксама ўдзячны, калі б Вы мне піснулі пару слоў адносна сп. М. Дзямідава, бо я ўжо чуў тут пра яго ўсякія дзіўныя рэчы і ня ведаю, што праўда, а што не. Гэта мне асабліва важна ведаць, бо ён заклікае мяне да вас — у Чыкага.
За ўсё буду Вам вельмі ўдзячны.
Яшчэ раз прашу мне выбачыць, што першы пішу да Вас, але гэта мне станоўча парадзіў др. С. Грынкевіч.
Шчыра й сардэчна вітаю Вас.
Бог Вас благаславіць.
З малітвамі й любоўю ў Хрысьце,
Ваш Япіскап Васіль.
Бруклін, 3.08.1951.“

Янка Чарапук адказаў хутка:

„Яго Эксцэленцыі
Вельмі паважанаму Васілю — Япіскапу БАПЦ.
Прывет шчыры й радасны.
Дзякую за Ваш мілы ліст да мяне з дня 3.08.1951. Я ня мог адказаць Вам зараз жа, бо ня быў дома — быў у разьездах.
Я, як беларус-дзяржаўнік, уважаю гістарычны акт абвяшчэньня Аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы як другі важны акт пасьля акту абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.
Падзіўляю Ваш чын — пасьвяціцца Службе Божай і службе роднаму Вам і мне Беларускаму Народу — цяпер тут, на сапраўды вольнай і дэмакратычнай зямлі Вашынгтону, а з часам — дасьць Бог — на роднай Вам і мне Беларускай-Крывічанскай зямельцы. Памагай Вам Бог зьдзейсьніць Вашы намер і жаданьні! Я меў нагоду нядаўнімі днямі пахваліцца майму Высокаму Рыцару Калюмба аб Вашай Асобе і аб маім прыязным становішчы да Вас. Мой Высокі Рыцар адказаў, што „калі Япіскап Васіль зьяўляецца беларускім патрыётам і выказаў сілу волі і настойчывасьці ў навуках і ў грамадзкай працы, значыцца, заслужыў, каб беларусы-патрыёты лажылі яму найвышэйшы гонар“. Далей мой Высокі Рыцар сказаў, што

маім (Я.Ч.-З.) абавязкам ёсьць зарэкамэндаваць Вас, Уладыка, у Міністэрстве Спраў Загранічных, і тады у МЗС будуць так паважна Вас трактаваць, як Вы на гэта заслужылі ў ведамых там прадстаўнікоў БНР. Да выкананьня гэнай добрай рады, згоднай з маім жычэньнем і намерам, я ўзяўся па-прыяцельску да Вас.

Далей ён мне парадзіў, каб я Вам прыпомніў, што пажаданым ёсьць, каб Вы ад сябе злажылі ў МЗС мэмарыял аб Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве наагул (гісторыя, цяперашняе становішча на чужыне, усюды і асабліва ў ЗША) і аб відах на прышласьць тут.

Я ня знаю Вашых плянаў, ня ведаю, дзе мае быць цэнтар Вашай душпастырскай працы — ці ў Нью-Ёрку, ці ў Чыкага, ці дзесь у іншым горадзе, наагул, мала маю інфармацыў пра Вас асабіста, так што пра Вас мала маю чым пахваліцца. Між іншым, хацеў бы ведаць, ці можаце прамаўляць па-ангельску?

Ваш прыезд у Чыкага пажадана ёсьць каб адбыўся на запросіны спэцыяльнага Камітэту — каб паважней выглядала дзеля Вашай Япіскапскай павагі і дзеля грамадзкага абавязку праваслаўных беларусаў. Аб такім камітэце тут цяпер ідуць нарады. На гэтым тыдні ад М. Дзямідава даведаюся — аб канчатковым выніку гэтых нарад.

Ён, М. Дзямідаў, характару парывістага: часамі добрую прыслугу можыць зрабіць, а часамі — хоць уцякай ад яго. Усё залежыць ад настрою, а настрой ад напою — ці ў меру, ці празь меру. А часамі настрой залежыць і ад „залежнасьці“, і ад аўтарытэту. Настрой яго ўмерыць я стараюся, велічаючы яго тытулам палкоўнік.

А што да пагаворкі „што край, то абычай“, дык усё ж такі й тут, як і шмат дзе ў іншых краёх, імпануе стройны выгляд, бодры й вясёлы настрой, бойкі, жывы паварот, спагада да дабрабыту, гутаркі адрывістыя з гумарам, строй элеганцкі напаўсьвецкі, нахіл да прыяцельскага знаёмства й хатняга госьця. І — убок ад зацятай дыскусіі.

Ведама, быў бы рады пазнаёміцца з Вашым мэмарандумам, таму прашу надзяліць мяне копіяй.

Дзямідаву маніцца ў канцы гэтага тыдня выслаць Вам ад сябе нейкія інфармацыі, так што я на гэтым кончу.

Бывайце здаровенькі і ўсяго Вам найлепшага!

Слава Хрысту!

Хай жыве БНР!
Паддаюся Вашым малітвам.
Ваш прыяцель Янка Чарапук- Змагар.
Чыкага, 15.08.1951.“

У сваім адказе Янка Чарапук задаволіўся такой паўжартоўнай ацэнкаю характару М. Дзямідава. Але зерне сумневу, недаверу, закінутае япіскапам Васілём, дало свае ўсходы, што і адбілася ў лісьце да генэрала Андэрса ад 10.09.1952:

„Вельмішаноўны пан Генэрал,
ад імя Рады БНР у Чыкага маю гонар зьвярнуцца да Пана Генэрала з просьбаю асабістай апініі пра асобу М. Дзямідава, знаёмага з часоў супольнага сядзеньня ў Маскве на Лубянцы. Збор незалежнай інфармацыі пра вышэйназванаю асобу, якая зараз жыве ў Чыкага, ёсьць для нас надта важным“.

Адказ зь Лёндану, з Waverton Street 7, дзе жыў генэрал Андэрс, прыйшоў праз 10 дзён:

„Wielce Szanowny Panie Prezesie,
W odpowiedzi na list Pański z dn. 10 sierpnia b.r. uprzejmie komunikuję:

Będąc w więzieniu w Moskwie na Łubiance przebywałem czas jakiś w jednej celi z niejakim panem, który podawał się za Diemidowa, o ile sobie przypominam Mikołaj Iwanowicz. Wspominał, że brał udział w ruchu Białoruskim. Muszę zaznaczyć, że mam o nim jaknajgorszą opinię. Nie tylko ja, ale i wielu współwięźniów w celi było przekonanych, że p. Diemidow donosi wszystkie rozmowy do NKWD.
Wracając ze śledztwa, przynosił zawsze ze sobą papierosy i jabłka, co sie nikomu nigdy nie zdarzało. Wielokrotnie też podkreślał, że zawsze współpracował i miał kontakty z Sowietami. Jestem głęboko przekonany, że tak było, zresztą wiem z całą pewnoscią, że został z więzienia zwolniony po rozpoczęice się wojny niemiecko-sowieckiej. Jest to ostatni człowiek, do którego — moim zdaniem — można by mieć zaufanie.
Nie dziwiłbym się zupełnie gdyby to była wtyczka bolszewicka.
Dla informacji podaję, że ów p. Diemidow był raczej mniej niż średniego wzrostu, o nalanej twarzy, ciemnych włosach, nieprzyjemnych oczach i bardzo gadatliwy. Nie moglibym wprost zrozumieć, żeby p. Diemidow mógł się dostać normalną drogą do Stanów Zjednoczonych.
Łączę wyrazy poważania.
Gen. Dyw. W. Anders“.

Перад тым, як вярнуцца да ліставаньня зь япіскапам Васілём ды наагул да кантактаў з прадстаўнікамі паваеннай эміграцыі, неабходна зрабіць невялікі адступ ды патлумачыць часты зварот рэспандэнтаў Янкі Чарапука

[7] **Гл.: http://www.kofc.org/knights**

[8] **На той час Раду Кангрэсовага Камітэту**

як „Рыцара Беларусі“. У гэтым звароце — ня толькі выяўленьне пашаны, але й канкрэтнае ўказаньне на рыцарства — Рыцарства Калюмба.

складалі: М. Шчорс — прэзыдэнт, І. Лобач і Б. Кіт — віцэ-прэзыдэнты, сябры Рады — М. Філіповіч, С. Коўш, А. Русак, М. Сенька, А. Сабаленскі, С. Жамойда.

Арганізацыя „Рыцары Калюмба“[7] была заснавана 9 кастрычніка 1881 году невялічкаю групаю людзей, аб’яднаных ідэяй абароны сваёй краіны, сваіх сем’яў і сваёй Веры, аб’яднаных імем Хрыстафора Калюмба, чалавека, які прынёс у іхную краіну, у Амэрыку, Веру. З часам гэтае братэрства сталася найбольш уплывовай каталіцкай арганізацыяй, дзейнасьць якой не абмяжоўвалася адной толькі Амэрыкаю. У 1900 годзе, 22 лютага, да трох галоўных прынцыпаў (і адначасна Ступеняў) Ордэну — Цноты, Еднасьці, Братэрства — быў дададзены яшчэ адзін: Патрыятызму. Гэты прынцып мянуецца Чацьвёртаю Ступеньню й зьяўляецца па сёньня найвышэйшым у Ордэне. Калюмбавым Рыцарам Чацьвёртай Ступені быў Янка Чарапук.

Але вернемся да падзей 1951 году, калі вакол Янкі Чарапука адбываліся эпісталярныя двубоі.

Амаль адначасна зь япіскапам Васілём падтрымкі ў Чыкага, толькі ўжо ў інтарэсах сваёй групы, Беларускага Кангрэсовага Камітэту[8], пачаў шукаць доктар Мікалай Шчорс. Трэба сказаць, што Я. Чарапук напачатку намагаўся застацца ўбаку ад тых спрэчак, неаднаразова прапаноўваючы др. Шчорсу сустрэцца ня толькі зь япіскапам Васілём, але й з раднымі БНР, каб высьветліць і зьліквідаваць усе непаразуменьні дзеля супольнай справы. Такія сустрэчы адбыліся, толькі жаданага плёну не прынесьлі.

Гэтак, др. Шчорс пісаў (18.10.1951):

„Ваша Дастойнасьць.

Беручы пад увагу выказанае Вамі падчас мае бытнасьці ў Чыкага заінтарасаваньне справай кансалідацыі нашага грамадзянства ў межах ЗША, нягледзячы на неатрыманьне адказу на мой апошні да Вас ліст, пішу ізноў. Хацеў бы давесьці да Вашага ведама факт спатканьня і адбыцьця даўжэйшае гутаркі між Вашым слугою й старшынёй Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня сп. інжэнэрам Гарошкам. Хаця гутарка насіла, так сказаць, шчупальны характар, можна аднак на яе падставе зрабіць наступныя вывады: незаінтарасаваньне ў кансалідацыі нашых сьціплых сілаў гэтак званае крывіцкае стараны. Спадар Гарошка на проціўлеглым ад майго пункце гледжаньня. Я прапанаваў і далей прапаноўваю кансалідацыю й супрацоўніцтва на плошчы нацыянальна-грамадзкіх і культурных дачыненьняў, уважаючы, што апошняе ёсьць шмат лягчэйшым да прывядзеньня ў практычнае жыцьцё з прычыны адсутнасьці спэцыяльных разыходжаньняў. Сп. Гарошка ўважае, што трэба спачатку скансалідавацца на палітычным адрэзку, і нават запрапанаваў „просты“ рэцэпт практычнага яго вырашэньня: зьліквідаваць БЦР і прызнаць гэтак званую БНР. Тэарэтычна рэцэпт сапраўды просты, нават вельмі просты — толькі што нерэальны. Кансалідацыя й супрацоўніцтва нармальна базуюцца на пэўных кампрамісах, уступствах кантрагентаў, а не на бескампрамісных праектах самаліквідацыі. Каб апошняя наступіла, ня трэба гутарак аб супрацоўніцтве. Патрэба толькі пераконаньня аб фальшывасьці займанага становішча, а гэтага ніхто зь людзей, гуртуючыхся вакол БЦР, ня мае й мець ня будзе. БЦР — гэта не тэстамэнтавы твор, гэта таксама й ня твор эміграцыйны, падобна гэтак званай Радзе БНР, якая паўстала у сарамлівых абставінах і паўкансьпірацыйна праведзеным зьезьдзе аднае крывіцкае групоўкі ў Остэргофэне (Нямеччына). БЦР — гэта ўстанова, пакліканая й пацьверджаная воляй, калі ўжо не ўсяго беларускага народу, то прынамсі ўсяго яго актыву. 1039 дэлегатаў у сталіцы Беларусі Менску — гэта ня некалькі дзясяткаў эмігрантаў аднае групоўкі ў задрыпаным нямецкім гарадзішку. Параўнаньня тут ня можа быць ніякага! БЦР не паўстала воляй эміграцыі й ня можа быць воляй эміграцыі зьліквідавана. Яе можа зьліквідаваць III Усебеларускі Зьезд на Бацькаўшчыне, толькі й вылучна“.

Што М. Шчорс не атрымаў адказу ад звычайна пунктуальнага й акуратнага ў такіх справах Янкі Чарапука, не было выпадковым. У гэты час ён актыўна ліставаўся зь япіскапам Васілём, выпрацоўваючы ўласную пазыцыю. А Васіль пісаў[9]:

[9] Ліст ад 6.09.1951 г. падпісаны япіскапам Васілём і С. Грынкевічам.

[10] С. Грынкевіча.

„Ваша Эксцэленцыя, Дарагі й Нязломны Рыцару Беларусі.
Шчыра дзякую за Ваш мілы ліст і за незвычайна цікавыя лісты др. Шчорса. Згодна з Вашым пажаданьнем прыйшоў да Стася[10], прачыталі мы яшчэ супольна дзівачныя творы гэтага знамянітага „палітыка“ й хочам сказаць Вам пару аб’ектыўных слоў. Нас перадусім незвычайна дзівіць „шчырае“ жаданьне гэтага панка адносна аб’еднаньня беларускіх сіл. Што гэта за круцельства й шарлатанства зь ягонага боку, хочам Вам падаць хаця б наступныя тры прыклады.
1. Гэты панок у свой час належыў да нашае нацыянальнае Рады й нават да Ўраду БНР. Гэтыя свае функцыі, аднак, з часам пакінуў дзеля таго, што нічога ніколі не хацеў рабіць, а займаныя ім пасты яго ніколі не задавальнялі, бо, бачыце, усё яму здавалася, што яны (пасты) не адпавядалі яго амбіцыі, дадаем — шалёнай амбіцыі, бо та ж над ім усё яшчэ быў нехта вышэйшы — гэта значыць спадар Прэзыдэнт М. Абрамчык. Тады, спачатку, тэстамэнт сп. Прэзыдэнта ня выклікаў у яго ніякіх сумлеваў, але калі яго дзікія амбіцыі былі не задаволеныя, ён ня толькі адышоў ад адзінае нашае тады канкрэтнае працы, але перайшоў да ворагаў нашага

вызвольнага руху на чале з панам Астроўскім, бо, бачыце, яму далі функцыю „віцэ-прэзыдэнта“. Але мала таго, ён пасьля праздрадзіў ворагам нашым усе тайны нашае працы й нашага змаганьня.
2. У 1948 г. мы гатаваліся да перавыбараў нашага Цэнтральнага Нацыянальнага Камітэту на Нямеччыну. Панок Астроўскі з гэтым вось панам Шчорсам ужо разьвярнулі сваю незвычайна разбуральную працу. Нягледзячы на гэта, беларускія патрыёты, жадаючы адзінства ўсіх беларускіх сіл, зрабілі спробу вяртаньня адзінага беларускага фронту й правядзеньня супольных выбараў у Цэнтральны Камітэт. Да пана Шчорса быў выдэлегаваны др. В. Войтанка. Др. Шчорс паставіў яму шмат вымогаў „дэмакратычнага“ характару, і ўрэшце яны дагаварыліся, што калі наша Цэнтральная Выбарчая Камісія прыме гэтыя ягоныя вымогі, тады В. Войтанка яму затэлефануе й нашая Камісія пачакае на назначэньне парытэтнай колькасьці іх кандыдатаў для правядзеньня супольных выбараў. Калі В. Войтанка зрэфэраваў камісіі пастаноўку пытаньня, была праведзеная грунтоўная дыскусія й прынятая пастанова-згода. Др. Войтанка пайшоў затэлефанаваць аб гэтым др. Шчорсу. Хутка ён вярнуўся й сказаў, што др. Шчорс нічога канкрэтнага не сказаў. Так вось выглядала „шчырасьць“ пана Шчорса. Але можа яна выглядала лепей у пытаньні царкоўнай справы.
3. Ня будзем Вам тут апісваць працэсу здрады беларускіх япіскапаў — пераходу іх да расейскай царквы й гэтым ліквідацыі нашага царкоўнага жыцьця. Скажам толькі, што гэтыя здраднікі пачалі арганізоўваць антыбеларускі фронт, на чале якога пазьней стаў пан Астроўскі й да якога далучыўся яго „віцэ-прэзыдэнт“ пан Шчорс“.

Але, відаць, Васілю аднаго ліста падалося недастаткова для вытлумачэньня, і ён дасылае наўздагон другі, ужо толькі ад свайго імя:

„Ваша Эксцэленцыя!
Учора мы з Стасем улажылі Вам пэўныя выясьненьні на ліст др. Шчорса. Магчыма, гэтыя нашы выясьненьні ня вышлі так

гладка й грунтоўна, як бы нам хацелася, бо пісалі мы іх, можна сказаць, экспромтам. Таму хачу дадаць да іх яшчэ пару слоў.
Я сам асабіста ня толькі хацеў і хачу аб'яднаць усіх нашых сіл у адную нашу сямейку, але асабліва, калі ўступіў на духоўны шлях, усімі сіламі імкнуся да гэтага. Толькі пры гэтым я мушу прыймаць пад увагу думкі людзей, якія з самага пачатку й цяпер дзейна дапамагаюць мне будаваць нашу вялікую й слаўную справу — БАПЦ. А думкі іх такія: др. Шчорс і кампанія — гэта толькі малая частка нашых сіл. І запраўды: ён хваліцца, што ў яго на сьвяце было каля 150 асобаў! На гэта скажу: гэта ўсё, што яны тут маюць, ну, няхай яшчэ 50 асоб. Тым часам я быў нядаўна ў нашых людзей у Нью-Брансўіку каля Нью-Ёрку, і там у мяне было на Службе Божай каля 150 асоб, а пасьля на абедзе каля 100 асоб, а крыху больш гэтага ёсьць у Нью-Ёрку, а Кліўленд, а іншыя аддзелы БАЗА? А па-за Амэрыкаю? Нашы арганізацыі ў Канадзе (ужо запрашаюць ехаць), у Аргентыне, у Францыі, Бэльгіі, Англіі (у дзьвёх апошніх краінах ёсьць Царква БАПЦ), у Нямеччыне ўсё яшчэ выходзіць „Бацькаўшчына", у Італіі, у Аўстраліі. Гэта яшчэ ня ўсе краіны, дзе працуюць нашыя людзі. Толькі студэнты, якія ідуць з намі, налічваюць 150 асоб. А што ўжо гаварыць пра сп. М. Абрамчыка, які быў ужо ўва ўсіх сталіцах заходняга сьвету й быў прыняты самым Папам!
Якою ж мухаю выглядае др. Шчорс з сваімі 150—200 чалавек і ня быўшы ні ў адной сталіцы заходняга сьвету!"
Нарэшце Я. Чарапук дасылае адказ М. Шчорсу, напісаны ў адпаведнасьці з парадамі япіскапа Васіля:

„Паважаны др. М. Шчорс.
У апошнім сваім лісьце да мяне Вы пішаце, што я вам не адказаў на папярэдні Ваш ліст. Так, гэта праўда. Чаму я Вам не адказаў на яго? Я, як беларус-дзяржаўнік, быў яшчэ тады на раздарожжы. Ня ведаў, што Вам сказаць. Але апошнія падзеі ў Чыкага канчаткова пераканалі мяне, што Вы й Ваша арганізацыя ня хочаце служыць беларускім інтарэсам, наадварот, Вы — саюзьнік расейцаў. Што сталася? Мы ў Чыкага чакалі на япіскапа Васіля. Даведаліся аб гэтым і расейцы. Нашы людзі тут, праваслаўныя беларусы, плянавалі адцягнуць ад расейцаў адну іх царкву, дзе выключна старыя беларусы.

І вось расейскія манархісты зараз жа пасьпяшаліся паслаць сюды самога Анастасія, каб перашкодзіць беларусам. Ну, што ж, расейцы як расейцы, яны робяць сваю варожую нам работу. Ня гэта страшна, але страшна тое, што Ваш сьвяшчэньнік Лапіцкі зараз жа пасьпяшыў памагчы расейцам сваёй злобай і брудам на нашу дзяржаўную рэч — сьв. БАПЦ і япіскапа Васіля. Стварыўся адзіны фронт расейцаў і Вас! Гэтага для мяне даволі! Бо ж і для мяне ўжо ясна, што расейцы атакуюць толькі тое, што для іх шкодна, а для нас карысна. Вось жа, не хачу болей бачыць такіх „белоруссов“, якія памагаюць нашым вечным ворагам“.

Ліст скончваўся патрабаваньнем канкрэтнага адказу, па сутнасьці, выбару паміж БНР і БЦР, а яшчэ больш дакладна — выбару Царквы. Гэта было разрывам адносінаў ня толькі з Шчорсам, але й з усімі беларусамі, што стаялі за ім.
Да разьбежнасьцяў паміж БЦР і БНР на эміграцыі дадаваліся несуцяшальныя зьвесткі з Бацькаўшчыны. У лісьце да невядомага адрасата 6 чэрвеня 1954 г. Янка Чарапук пісаў: „Паважаны Спадару! Я атрымаў Ваш ліст з 27 красавіка, дзякую. У мяне быў прадстаўнік беларускай арміі ад імя Вітушкі. Ён прадставіў мне ўсю справу, якая эгзыстуе на Беларусі. Я быў зьдзіўлены, ногі яго былі адмарожаныя. Гэта быў праўдзівы прадстаўнік беларускай арміі. Я даў яму прытулак. Чакаю на выпадкі міжнародныя. Здаецца, будзе ізноў адозва да беларускага сьвету. Генэрал Вітушка шле таксама прывітаньні Абрамчыку“.

А ўжо 26 чэрвеня ён пісаў да Віталя Кажана (скарбніка рады БНР):

„Ваша Дастойнасьць, у адказ на Вашае другое пісьмо маю гонар давесьці да Вашага ведама як сябру Рады БНР, што Вітушка, галоўны правадыр Беларускіх Паўстанцкіх Сіл, не прызнае ніякіх дагавораў, зробленых Прэзыдэнтам Рады БНР Міколам Абрамчыкам, ані Радаславам Астроўскім, прэзыдэнтам БЦР. Ягоны прадстаўнік Антон Лабенец, які знаходзіцца ў Чыкага,

сугеруе мне, каб выдаць адозву да беларусаў сьвету аб стварэньні Дзяржаўнага Фонду, так як маюць іншыя нацыі. Гэты Фонд павінен быць выкарыстаны толькі на патрэбу Беларускіх Паўстанцкіх Сіл і Беларускай Народнай Рэспублікі. Я маю засьцярогу, што ў выпадку такой адозвы гэта выкліча вялікую рэакцыю з боку бальшавіцкіх прадстаўнікоў Беларускай Рэспублікі Кісялёва й Грамыкі. Чакаю адказу й Вашага погляду, як заставацца да сытуацыі“.

Але, верагодна, найбольш балела за справы ў сваім Чыкага. Так атрымалася, што найбліжэйшы (і найстарэйшы) паплечнік, Я. Варонка, пачаўшы ад выданьня расейскамоўнай „Белорусской Трибуны“, паступова ўсё больш аддаляўся ад беларускіх спраў, заняўся расейскім радыё, якое закранала беларускія праблемы адно напачатку й тое — зрэдку, а пазьней не хацеў нават чуць, каб даць

11 М. Абрамчык быў у Чыкага ў сакавіку 1950 году. Тады ж была

эфір М. Дзямідаву альбо самому Чарапуку, які губляўся ў здагадках: што гэта, стомленасьць ад нацыянальнай працы, якая быццам бы аказалася бясплённай, страх перад усёмагутнымі бальшавікамі (хадзілі нават чуткі, што Варонка перадаў ім некаторыя паперы з асабістага архіву і архіву БНР), уплыў сям'і, далёкай ад беларускіх праблемаў?

арганізавана радыёперадача ў праграме Я. Варонкі — прамова Прэзыдэнта БНР да беларусаў Чыкага, прысьвечаная 32-й гадавіне абвешчаньня незалежнасьці.

[12] М. Дзямідаў.

Гэтая тэма ня раз закраналася і ў ліставаньні з Прэзыдэнтам БНР Міколам Абрамчыкам, які ў лісьце ад 6.04.1950 г. пісаў у Чыкага:

„Высока паважаны й дарагі Рыцар, толькі што атрымаў Ваш ліст, дзякую. Выбачце, што адказваю на такой паперы. Якраз мушу сядзець у хаце, чакаць нейкага журналіста — Шварцара з Вашынгтону. Ён даведаўся аб маім тут побыце і прасіў інтэрвію; дык не магу выйсьці з хаты і хочу выкарыстаць час,

каб Вам адказаць.
Чыкага! Калісьці я захоплівaўся ягонай разьлеглай прыгажосьцю! Праўда, было й так, але было інакш часамі. Часамі й сьціскалася сэрца. Але я, даражэнькі Рыцар, наўчыўся за сваіх асабліва сем апошніх гадоў рэагаваць ня сэрцам. Можа сказаў трохі замоцна, „навучыўся“, лепш сказаць „хачу“ рэагаваць ня сэрцам.
Кастусь Каліноўскі на судзе сказаў маскалям, што „прайгралі паўстаньне таму, што ягоныя саюзьнікі-палякі мелі сэрца не ў грудзях, а ў галаве“. У гэтых простых словах Каліноўскага крыецца глыбокі сэнс палітычнай філязофіі.
Мець сэрца „не ў галаве“ сапраўды рэч ня лёгкая. Палітыка, на жаль, патрабуе гэтага амаль што як асноўнай рэгулы. Трымаць моцна сэрца на сваім месцы, не дапускаць яго падымацца, а капітуляваць і абыходзіцца толькі сухім розумам — бяз помачы, без уздыму сэрца. Я вось і намагаюся, стараюся й вучуся гэтак дзеяць.
Прыглядаючыся да палітычнай сфэры — сьвету рафінаванага ў гэтым сэнсе, мы знойдзем, што яны сапраўды так дзеюць, так навучыліся дзеіць, як быццам таго сэрца й зусім ня маюць. Можа гэта і не прыгожа ўжо так выглядае, але ж ня нам зламіць гэтыя векавыя традыцыі, векавыя рэгулы. Непрыгожыя традыцыі ў змаганьні — войны, забіваньні людзей, але покуль такі сьвет існуе, не абыдземся мы без такой формы змаганьня. У мабілізацыі сягоньня нашых сілаў мусім вэрбаваць ня толькі рыцараў аж 100% беззаганных нацыянальна і ахвярных людзей. Такіх людзей у кожным грамадзтве, кожным народзе няшмат. Пішаце, Чыкага ня шэнціць на нашу інтэлігенцыю. Праўда, моцна ня шэнціць!
Варонка, безумоўна, наша трагедыя, і, магчыма, гэта трагедыя для яго самога яшчэ большая. Я ведаю, на ягоным месцы Вы б зарэагавалі начы. Вы б загаварылі на ўсе дзьве гадзіны так, як гавораць нямногіх 10% адданых ідэі нашай вызвольнай справы. Я ад Варонкі гэтага не спадзяваўся, балела сэрца, але цешыўся, што будзем мець ад яго хоць нейкія 3% — на сухі палітычны розум рахавалася й гэта здабыткам. Па Вашым апошнім лісьце ставіцца й гэта пад сумнеў.
Відаць, на Варонку не зрабіў і я ўплыву, а калі гэты ўплыў быў, дык толькі хвілёвы[11].
Што ж цяпер рабіць? Падняць проці яго апазыцыю, пачаць біць

яго на разе ня выгадна нам.
Але трэба аднак яго Вам, узяўшы моцна „сэрца ў жменю“, старанна трымаць пры сабе, хоць на 10% ці 5% выкарыстоўваць. А галоўнае — тармазіць яго, каб іншыя % не выкарыстоўвалі чужыя.
Калі б Варонка не займаў у нашай гісторыі такога месца, безумоўна, гульні такой, цацканьня такога зь ім мець не было б сэнсу. Або калі б гэта было ў Бацькаўшчыне, таксама загаварылі б зь ім іншымі мовамі. Ня выключана, што зьменяцца абставіны й тут. Сэрцам нават загаворым да яго! Іншая рэч, калі заўважыце, што Варонка нас ашуквае й дзець там. *Тагды ўжо безумоўна мусім прыступіць да апэрацыі, хоць як бы балючай яна ні была.*
Палкоўнік[12] добры чалавек, толькі яго безумоўна добра трэба трымаць за полы. У яго выяўляюцца нравы, якія бываюць у многіх старых людзей. А ён моцна стары.
Згодзен, што Вам патрэбна помач. Яе чакаем. На жаль, ня ўсё гэта залежыць ад нас. <…>
А пакуль бывайце здаровенькі і ня падайце духам, Рыцару. „Яшчэ мы прыйдзем палямі ўзорнымі“ да тых вёсак. І тэй вёскі Гародзеншчыны з касьцёлкам Беларускім. Ці ж ня верыце ў гэта, Рыцар? Я моцна веру.
Жыве БНР!
Ваш М. Абрамчык“.

Найбольш шчыльна Я. Чарапук ліставаўся з Станіславам Грынкевічам, сваім далёкім сваяком, якому шмат дапамагаў парадамі, афармленьнем папераў „на доктара“. У першую чаргу ад яго даведваўся ён пра падзеі ў нацыянальным актыве ў гады вайны, у лягерох ДП, ад яго атрымліваў інфармацыю пра новых, невядомых яму дзеячоў руху (а такіх была пераважная большасьць). Напэўна, ня будзе перабольшаньнем сказаць, што С. Грынкевіч у значнай ступені фармаваў пагляды Чарапука на новую беларускую сытуацыю. Лісты рознабаковыя, інфармацыйныя, часам іх можна назваць у пэўнай ступені сэнсацыйнымі; яны дадаюць багата што да роздуму пра іх аўтара й адрасата.
„Мой даражэнькі Братка!
Вярнуўся з одпуску, зь вялікай радасьцю браў да рук чакаючыя

на мяне апошнія Твае пісьмы. Калі чытаў іх, з кожным прачытаным сказам узрастала маё глыбокае задавальненьне, што нягледзячы на гады і адарваньне ад свайго асяродку, Твой энтузіязм, як і глыбокая нацыянальная маральнасьць і патрыятызм у нічым не прытупіліся, а наадварот, у Тваей асобе праявілася далеказорная палітычная сьпеласьць пры ўдалым дыпляматычным падыходзе. Таму, здаецца, толькі Ты адзін у часе апошняе вайны ўмеў заняць такое становішча, якое й сёньня актуальнае. <…>
Сёньня сьпяшу пісаць Табе на тэму нашых міжнародных зносінаў.
Кантакт з Ізраілем ды Ірляндыяй зьяўляецца для нас амаль ключавой пазыцыяй, таму Твая ініцыятыва небывала шчасьлівая ды карысная. Таму гэтыя дзьве дзялянкі трактуй як надта важныя ды справу беспрарыўна пхай наперад. Я тут пастараюся коратка гэтыя дзьве справы з Табой прадыскутаваць.
Ірляндыя. Засьцярогі ірляндцаў у адносінах да нас зусім неапраўданыя. БНР ад часоў яшчэ Ластоўскага глядзела зь вялікай пашанай на Ватыкан. А й цяпер нашыя адносіны да Апостальскага пасаду як найлепшыя. Пэўна ведаеш, што яшчэ ў 1946 г. наша дэлегацыя ў асобе кс. Чарняўскага ды інж. Рыдлеўскага была прынята Папам Піюсам XII. Ватыкан даў стыпэндыі для некалькіх дзясяткаў нашых студэнтаў на ўнівэрсытэце ў Лювэне, выдае на нашай мове малітоўнікі, газэту „Зьніч“, радыёвыя аўдыцыі. Апрача гэтага, нядаўна й сам Прэзыдэнт Абрамчык быў прыняты надта цёпла гэтым жа Папам. Дык як бачыш, каталіцкія пачуцьці ірляндцаў надта зусім ня будуць абражаныя.
Што датыкае нас, дык мы ў сваіх асяродках яшчэ ў Нямеччыне пашыралі сымпатыі да ірляндцаў. Ды гэту сымпатыю маем і цяпер. У часу акупацыі нямецкай, калі ірляндзкая грамадзянка, жонка др. Антановіча, была пасаджана ў канцэнтрацыйны табар, беларускі актыў на чале з сьв. п. В. Іваноўскім выступіў гэтак рашуча перад немцамі, што апошнія выпусьцілі ўвязьняную, хаця гэткія ануляваньні выдадзеных загадаў немцы былі непрывыкшы рабіць. Тут варта надмяніць, што адзін толькі Ермачэнка стаяў наўбаку справы асвабаджэньня ўвязьнянай. Наадварот, таму, што др. Антановіч стаяў на чале Беларускага Чырвонага Крыжа й стараўся ўтрымаць

арганізацыю на яе самарытанскай чысьціні, Ермачэнка супольна зь немцамі разграміў арганізацыю, робячы зь яе карыкатуру ў форме Самапомачы.
У канклюзіі йшло б нам пра навязаньне прыязных адносінаў з ірляндзкім урадам, як і мясцовымі тут арганізацыямі. Заўтра адразу пішу сп. Абрамчыку, каб у найкаротшым часе пастараўся адведаць Ірляндыю. Тым больш гэта будзе карысным, бо ў пачатках зімы сп. Прэзыдэнт мае адведаць ізноў ЗША.
Аднак, магчыма, больш важна, чымся справа нашых адносінаў з ірляндцамі, справа зносінаў з Ізраілем.
Прасьледаваньне жыдоў у царскай Расеі, магчыма, было прычынай утварэньня выняткова добрых адносінаў між прыгнечаным нашым народам з жыдамі. Таму й нашая краіна сталася амаль маткай сёньняшняму Ізраілю. Хопіць толькі паглядзець на пэрсанальны склад сёньняшняга ўраду Ізраіля а пабачым, што ў бальшыні яны паходзяць зь Беларусі. І гэта непрыпадкова, у нас былі найвышэйшыя жыдоўскія школы, адсюль і выходзіла вярхушка жыдоўскай інтэлігенцыі. Пагромы ў нас няведамыя. Памятаеш адносіны БНР да жыдоў ад самага пачатку, памятаеш таксама пастанову нашага Ўраду адносна Балаховіча, які ў той час быў так патрэбны, а Ўрад яго ўвольніў за жыдоўскія пагромы ў Пінску. Варта надмяніць, што адкінутага Балаховіча палякі прыгарнулі да сябе. Пад Польшчаю Беларускі Народ ніколі не запаліўся да моднага ў Польшчы антысэмітызму, а наадварот, пасіўна падтрымліваў жыдоў. Важны факт у сэрыі гэтых зносінаў, што дэлегатам да зносінаў зь Вялікай Брытаніяй ад імя БНР быў пасланы жыд, якога прозьвішча прыпадкова забыў.
У часу жыдоўскае трагедыі-гітлераўшчыны ізноў беларусы спагадаюць жыдом, дзе толькі магчыма, з собскай небясьпекаю жыцьця хаваюць жыдоў (як інж. Душэўскі, які сам прыплаціў жыцьцём). Найболей яскравым фактам гуманных адносінаў нашага народу да жыдоў можа гэты факт, што немцы не змаглі нашымі рукамі ліквідаваць жыдоў, а былі прымушаныя ўзяць батальёны нашых суседзяў, як летувісаў, латышоў ды расейцаў (Камінскі). Нат у нас, у Новым Двары, раскідаць жыдоўскі магільнік не знайшлі ахвотнікаў за грошы ды спэцыяльныя прыдзелы картачак, а пагналі людзей паліцыяй. А потым, як наш селянін ласы на зямлю, хаця немцы аддавалі дармо зямлю,

ніхто яе ня ўзяў. Гэтаксама немцам не ўдалося спрычыніць паўстаньне беларускае нацыянал-сацыялістычнае партыі. Пробаваў няўдачна рабіць гэта Акінчыц, але справа скончылася толькі лідэрам, безь сяброў партыі.
Безумоўна, зусім дапушчальныя прыпадкі спарадычных асабістых прыпадкаў расправы з жыдамі, як высказ помсты. Але гэта жыды самыя разумеюць, бо нямала іх суродзічаў як савецкія камісары мелі нямала на сваім сумленьні беларускага жыцьця. Таму гэтыя прыпадкі ня ўлічваюцца, бо беларусы ліквідавалі й сваіх камуністаў.
Таму ў імя тут коратка накінутай мною мінуўшчыны адносінаў беларуска-жыдоўскіх з жыдоўскага боку належыцца нам пэўнае забавязваньне ў форме помачы, якую на сёньняшні дзень мы можам толькі ад іх дастаць. Узамен за гэта мы забавязваемся, што ня то жывыя, а нат і памёршыя на нашай зямлі ня будуць спрафанаваныя. Справа адносінаў міждзяржаўных — гэта справа ўжо будучыні. Разумею, што пры сучаснай палітычнай сытуацыі прызнаньне de jure *нашага Ўраду немагчымае. На сёньняшні дзень нам надта патрэбна матэрыяльная падтрымка ў наступнай форме:*
1. Зарганізаваць тут на ўсходнім узьбярэжжы, а мо нават і ў Чыкага штодзённую гадзіну камэрцыйных перадачаў, як гэта тут практыкуецца. Фірмы, якія гэта возьмуць на сябе, зь цягам часу пакрыюць свае кошты, бо гэтых радыёвых перадачаў будуць слухаць соткі тысяч людзей.
2. Свайміўплывамі дапамагчы нам дастаць месца ў „Голасе Амэрыкі“.
3. Даць магчымасьць у жыдамі кантраляванай прэсе ў ангельскай мове час ад часу папулярызацыю ў нашай справе.
4. Матэрыяльную помач, у форме падарку або доўгатэрміновае пазыкі, у вышыні $40000 на куплю царквы або дому, што зьяўляецца нам неабходным дзеля адваяваньня старое эміграцыі.
Праўда, гэта немалыя вымаганьні, але адначасна й невялікія для гэтак магутнай жыдоўскае супольнасьці. Дзеля гэтага чым хутчэй старайся ўвязацца з адпаведнымі жыдоўскімі дзейнікамі, пераконваючы іх у карыснасьці гэтае справы для абодвух бакоў. Калі б удалося нам асягнуць усе чатыры мной пададзеныя пункты, на Новы год мы ўжо змаглі б выдаваць сваю штодзённую газэту, а Задзіночаньне налічвала б якія

тысячы сяброў. Гэту справу разглядай як надта важную, бо акрамя Цябе, здаецца, ніхто іншы ня зможа яе правесьці.
На днях атрымаў пісьмо ад сп. Абрамчыка. Ён успамінае аб былым консулу БНР Альбэрце Курляндзкім, які рэпрэзэнтаваў наш Урад у Данцыгу. З Курляндзкім ён апошні раз бачыўся ў 1948 г. у Даніі. Тады сам Курляндзкі падымаўся нашу справу прадставіць жыдам, жыдоўскай прэсе пашыраць паясьненьні аб Беларусі.
Жыве БНР.
Твой Стась.
17.7.1951.“

„Мой даражэнькі Яначка!
Дзякую за апошнія пісьмы. Я надта рады, што Ты бачыш, якая перамена наступіла ў нацыянальным усьведамленьні нашага народу. Ужо зьявішча патрыятычных сем’яў не зьвяжацца ў нас рэдкасьцю. Палітычная рамантыка ахапіла ў нас ня толькі хлапцоў, як гэта было раней, а й дзяўчаты таксама пачынаюць трымаюць крок у маршы наперад за лепшую будучыню.
І Жанна д’Арк зьяўляецца ў нас ужо даволі часты прыметнікам. Я ганаруся, што гэты прыметнік быў ужыты ўжыты на азначэньне патрыятызму мае жонкі, нам і зь нямецкага боку.
Тут пасылаю Табе з гэтым пісьмом мае спасьцярогі, аднае зь фігураў зарубежжа — Каўша. Прачытайш і падумай, як пагадзіць гэтыя ўсе спасьцярогі і які мімахоць накідаецца выснаў.
Думаю, ведаеш, ён зьяўляецца сынам праваслаўнага сьвятара, які амаль што адзін прызнаваўся да беларускасьці й нат актыўна працаваў. З гэтае прычыны й не любілі яго сябры-маскалі або маскафілы-сьвятары. З прыходам на Беларусь немцаў у 1941 г. айцец Коўш таксама маніфэстуецца сваёй беларускасьцю, дастае прыход, і было б усё карысна. Але трэба трагедый. Трудна мне сказаць, якімі матывамі кіраваўся а. Коўш, але ён пачынае хрысьціць жыдоў, выстаўляючы ім мэтрыкі. Тыя, хто знаў яго лепш, казалі, што ён гэта рабіў за золата (як вядома, хрысьціянская мэтрыка давала жыдам магчымасьці ратунку ад сьмерці). А мо ён гэта рабіў з гуманнага пачуцьця. Як весткі кажуць, праваслаўныя сьвятары данесьлі аб гэтым немцам і апошнія зьнішчылі а. Кайпуша[14] у 1942

[13] **Гл.: S. Cous. The Story of the Byelorussian Catholic Watenstadt, Germany. 1945 — 1949. A Pictured Album in Byelorussian. USA, 1981. 112 p.**

[14] **Гл.: Юрэвіч Зьбіўся ў нагах. Кайпуша**

г. Усе, якія ведалі а. Каўша, вестку аб ягонай сьмерці прынялі
надта горка, у гэтым ліку і я, хаця асабіста й ня ведаў яго.
Цяпер на фоне гэтае падзеі здарылася зусім парадаксальнае
зьявішча. Дзеці зьнішчанага немцамі бацькі йдуць да ворагаў
на службу, і то як агенты гестапа! Сучасны супрацоўнік др.
Шчорса Сьвятаслаў Коўш працуе ў аддзеле гестапа, а ягоная
сястра Зоя Коўш як гестапаўскі агент устаўляецца ў склад
Нацыянальны Камітэт у Вільні як сакратарка. Дарэчы, і яна
старшыня Камітэту меў нямала зь ёю клопатаў, бо сваёй
пазыцыяй у немцаў ня раз паважна шантажавала. Аб гэтым
цяпер можа расказаць др. Грабінскі, які жыве ў ЗША. Таму
Камітэт быў прымушаны насіцца з Зояй, як з „балячкаю“. Усе
беларусы, якія зналі а. Каўша, а тым больш, што нашыя
палітычныя разыходжаньні зь немцамі ўжо на самым пачатку
зусім выявіліся, таму паводзіны дзяцей а. Каўша ўсім выдаліся
зусім ненатуральнымі, проста хвараблівымі. Бо няхай і была б
нейкая палітычная канцэпцыя карысная, але нармальнай
людзкой рэакцыяй ёсьць, што калі нейкая ўлада зьнішчыць
бацьку, у такім прыпадку з такой уладай супрацоўніцтва
актыўнае зусім не да падуманьня.

Гістарычны Веды я Таксальныя Лісты да Юркі Віцюбіча // Запіскі БНІМ, № 24, 1999. С. 184—285.

Зоя, ведамая са сваіх афіцыйных і цёплых кантактаў зь
немцамі, ужо ў гадох партызаншчыны 1943—44, быццам у
характары чорнага гандлю разьяжджае ў партызанскія
камуністычныя раёны й вяртаецца жывая. На гэта ў пачатках не
зьвярнулася ўвагі — мо мае шчасьце. Потым, ня ведаю якой
дарогай, яна зьяўляецца пачаткова ў Менску, а потым, летам
1944, ужо ў Бэрліне сакратаркаю Астроўскага. Якім парадкам
гэта сталася, ці немцы Астроўскаму ўціснулі, ці ён сам яе ўзяў,
на гэта не магу сказаць. У Бэрліне Зоя, сама як дзяўчына
непрыгожая, часта паказвалася крыху ў рамантычнай форме з
Жданюком, сярэдняй катэгорыі агентам гестапа, таксама. На
гэта не зьвярталася ўвагі. Дзяўчына хоча мець хлопца, а й
супольная дзялянка працы лучыць — усё ўзноў лягічна ды
ясна. Але тут узноў іншы інцыдэнт.

Ведамы ў нашым жыцьці мэцэнат Шкялёнак, вяртаючыся раз
поўначы а другой гадзіне ночы, застае Зою, перадрукоўваючую
пратаколы БЦР. Зьляпаная на гарачым сьледзе, дзяўчына
растраціласа, але псыхалягічна апанаваны Шкялёнак ня даў па
сабе пазнаць, што зарыентаваўся ў яе акцыі. На другі дзень ён
расказаў мне аб гэтым. Мэта яе работы здавалася быць зусім

ясна — рабіць копіі для немцаў, на жаданьне ад яе самой ці на заказ ад Жданюка, каб гэты мог паказацца актыўнасьцю.
У тагачасных умовах немагчыма было нейкае больш рашучае пастанаўленьне адносна Зоі, было праведзена на жаданьне Шкялёнка найбольш лагоднае, перанесена яе з канцылярыі Астроўскага да аддзелу Сацыяльнае дапамогі — да Сабалеўскага. На гэтым адрэзку Зоя працуе аж да капітуляцыі немцаў.
З прыбліжэньнем бальшавікоў пад Бэрлін пры помачы нямецкай, значыць, безь ніякіх асабістых клопатаў БЦР за ўсімі сваімі аддзеламі эвакуявалася на Захад Нямеччыны. У агульным ліку працаўнікоў паехала туды й Зоя, але скора вяртае ўзноў да Бэрліну й тут застаецца. Паколькі маем весткі, бальшавікі адразу, як толькі прыйшлі да Бэрліна, адразу зьнішчылі ўсіх беларусаў, якія не пасьпелі сваечасна пакінуць Бэрлін. У ліку зьнішчаных надта важны малады дзеяч — Пётра Бачак, Амельяновіч ды іншыя. Зоі не сталася нічога.
Прыхавацца ёй як немцы амаль немагчыма. Перша — фізычна адменны тып, а да таго ж і слабое валоданьне нямецкай мовы. Узноў — мо мае шчасьце.
Але тут ужо зусім нешта незразумелае. Калі пару тыдняў па капітуляцыі Бэрлін быў падзелены на акупацыйныя сэктары, усе чужынцы, якіх ня здолелі вылапаць бальшавікі, адразу перасяліліся ў заходнія сэктары, як ангельскі, амэрыканскі ці французскі. Зоя тым часам зусім сябе бясьпечна й добра пачувае ў савецкім сэктары, дзе пражывае да канца 1946-га.
Восеньню 1946 г. я выйшаў з інтэрнаваньня й даведаўся такія рэчы: у ангельскай зоне ў Ватэнштаце Сьвятаслаў Коўш, які ад самага пачатку як камэндант беларускага лягеру[13] надта пазытыўны быў пад кожным паглядам, у апошнім часе пачаў рабіць небывала нізкія інтрыгі, проста маральна й арганізацыйна пачаў развальваць лягер. Даведваюся, што гэтага самага Каўша нядаўна адведала ягоная сястра з Бэрліна, што расказвала жудасныя рэчы пра бальшавікоў і што пастанавіла перабірацца ў амэрыканскую ці ангельскую зону. Адно толькі, таму, што там, у Бэрліне аставіла „лахі“, паедзе яшчэ раз туды, прадасьць усё, а потым прыйдзе назад. Вартасных рэчаў яна не магла там мець. А „лахаў“ Коўш у той час як камэндант лягеру ёй мог даць цэлы самаход, бо ўсё УНРРАўскае майно было ў ягоных руках. А далей, ведаючы,

што там — бальшавікі, дык пускаць сястру на гэтакую небясьпеку зусім не па-братэрску. Коўш, аднак, пускае сястру і ад гэтага часу сам мяняецца.
Па нейкім часе прыходзіць вестка ў заходнія зоны Нямеччыны, што Зоя пайшла на „чорны рынак“ на Аляксандарпляц і была арыштаваная бальшавікамі й вывезеная ў невядомым кірунку. Коўш цяпер пачаў рэклямаваць мучальніцкую сьмерць сястры за Бацькаўшчыну. І ад гэтага часу пачаў праводзіць такую работу, якую можна назваць толькі бальшавіцкай агентурай, а пра сутнасьць работы, дык, думаю, Ты даволі зарыентаваны ад Пануцэвіча й Жызьнеўскіх. Таму аргумэнтаў на гэту тэму ня буду падымаць.
Коўш уключаецца як адзін з арганізатараў зарубежжа. Астроўскі ды Шчорс таксама. Ведаючы тэхніку арышту на рынку, як заключаны можа сам паведаміць? Хто тады паведаміў? І нашто? На гэта няма як дастаць адказу. Зарубежжа пачалося афармляцца, і толькі ў канцы 1947 году рэпатрыюецца ў Саюз паэтка Таполя[14] з найбліжэйшымі, а трэба зазначыць, што Коўш да іх быў надта прыхільны.
Цяпер перакінем абзэрвацыю да вашага Чыкага. Па радыёвым выступленьні Варонкі выглядала, што гэты апошні, хаця й цяжка было, але здабыўся на адвагу й парваў усе ніткі з бальшавікамі, якія яго няслаўна зьвязалі па ягонай згодзе.
І бачыў, колькі розных пасланцоў з Нью-Ёрку прыяжджала да Варонкі, зьвярнулі яго са шляху павароту на паўдарозе.
Тут разгледзеў я толькі аднаго, а да кожнага зь іх маем не асабістыя прэтэнзіі, а вылучна прынцыпова маральныя матывы, таму я сам асабіста пераконаны, што тут ніякага ня можа быць паразуменьня.
Твой Стась
8.16.1951.“

Так пачыналіся для Янкі Чарапука 50-ыя гады. Можна толькі гадаць ды здагадвацца, якім быў бы ягоны ўваход у жыцьцё й справы маладой беларускай эміграцыі. Маладой — таго, паваеннага часу.
Але другая палова пяцідзясятых была надта неспрыяльнай для ўжо немаладога дзеяча. 6 кастрычніка 1955 г. па дарозе на чарговае паседжаньне „Рыцараў Калюмбу“ Я. Чарапук быў зьбіты аўтамабілем. Апынуўся ў шпіталі са зламаным каленам.

Ляжаў больш за тры месяцы, потым, пасьля апэрацый, яго выпісалі дахаты, але само лячэньне заняло яшчэ блізу год. Магчыма, гэтае здарэньне падштурхнула Янку Чарапука да напісаньня тэстамэнту (12.12.1955):
„Я маю гонар Вас прасіць у выпадку маёй сьмерці выпаўніць ніжэйпададзенае: я хачу быць пахаваным на ўкраінскім каталіцкім цэмэнтары. Жалобнае набажэнства павінна быць адпраўлена ў рымска-каталіцкім касьцёле (нягледзячы да якой народнасьці належыць) сьвятаром пры галоўным аўтаром езуітам, а каб маліліся сьвятар-беларус і сьвятар-украінец. Я ў труне хачу быць убраны як 4 Degree Knights of Columbus. *Труна павінна быць пакрыта беларускім дзяржаўным сьцягам. <…> Пастаўце скромны помнік: Ян Чарапук-Змагар, Беларус. 1896—195…“.*
Напэўна, адчуваў, што гэта будуць пяцідзясятыя гады. Так і адбылося: Янка Чарапук-Змагар памёр 16 лістапада 1957 году.

Але мы — не таго мы шукаем,
Не таго на чужыне нам трэба…

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2001**
[image]

Лявон Юрэвіч

Сьвет эміграцыйнага эпісталярыю
З матар'ялаў архіву Рады БНР[1]

„Вядомы факт: беларуская кніжка нарадзілася на эміграцыі. Гісторыя беларускай палітыкі ў першую чаргу — гэта таксама эміграцыя: Рыга, Коўна, Бэрлін, Парыж, Прага… Не апошнім месцам, дзе людзі на выгнаньні змагаліся за незалежную Беларусь, была і ёсьць Амэрыка.
Калі на пачатку 1993 году я прыехаў у Злучаныя Штаты, яшчэ жылі Натальля Арсеньнева, Антон Адамовіч, Вітаўт Тумаш, Мікола Ганько. Яшчэ жыла мастачка Галіна Русак, сястра *таго* Ўсевалада Родзькі. Яшчэ пісалі вершы Янка Золак, Масей Сяднёў. Гэта было неверагодна: людзі *таго* часу, *гістарычныя* людзі, якія самі сабою, сваім існаваньнем набліжалі *той* час, урэчаісьнівалі гісторыю, рабілі яе амаль што свойскаю.

ЛЯВОН ЮРЭВІЧ
архівіст Рады БНР, супрацоўнік Нью-Ёрскай публічнай бібліятэкі. Аўтар гістарычных кніг "Вырваныя бачыны. Да гісторыі Саюзу Беларускае Моладзі" ("Энцыклапедыкс", 2001), "Барыс Рагуля. Жыцьцё над агнём" (ARCHE, 1999), зборніку літаратура-знаўчых артыкулаў "Камэнтары" (Менск, 1999).

Уверх

Пэўна штосьці падобнае мусілі вычуваць яны самі, калі ў 1952 годзе сабраліся ўсе разам каля Ніягары на Першы з'езд Сустрэчу ды ўбачылі на ўласныя вочы Янку Чарапука (такую мянушку яму даў Іван Луцкевіч — гэта ведаюць усе Міколы Абрамчыка), прадстаўніка Ўраду БНР — на Ластоўскага, Ураду Луцкевіча.

Ёсьць небясьпека падацца троху патэтычным, але нявыразна ў гэтым пераемнасьць, своеасаблівая повязь ня розумных людзей адной справы, імя якой — Беларуская Народная Рэспубліка.

Дзеля трываласьці гэтай еднасьці, лучнасьці, сувязі — *сёньня*, каб было *заўтра*, варта памятаць усіх, хто ствараў БНР. Асабліва такіх асобаў, якім быў Янка Чарапук. Янка Чарапук, Антонаў сын, нарадзіўся ў каталіцкай сям'і 30 (18) жніўня 1896 году ў мястэчку Новы Двор Сакольскага павету. Пачатковую адукацыю атрымаў у расейскамоўным Навадворскім Гарадзкім вучылішчы, скончыў Гарадзенскую гімназію, у 1914 годзе паступіў у Пецярбурскі Ўніверсытэт на юрыдычны факультэт. Напэўна, менавіта ў гэтым горадзе, адным з цэнтраў беларускага адраджэньня[3], Янка Чарапук пачаў нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў і ўкраінцаў. Пра гэты ён сам пісаў пра гэта ў анкеце: „У 1917 г. быў Саветам Украінскай Місіі ў Пецярбурзе, затым быў адкамандзіраваны да М[іністэрства] З[амежных] С[праў] Укр. Н. Рэспублікі, дзе быў за часоў Кабінэту Луцкевіча Дыпляматычным кур'ерам, затым Чыноўнікам спэцыяльных даручэньняў, за Ўрадам Ластоўскага Сакратаром Місіі ў Латвіі і Эстоніі, затым Дэлегатам Міністэрства Загран. Спраў“[4]. У грамадзкіх арганізацыях „у Пецярбурзе зьяўляўся Тав. старш. Культ.-Прасьвет. Тав. „Вольных Беларусоў“, у Кіеве Сябром Бел. рады на Ўкраіне і Сябром Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны. … Зарганізаваў на Ўкраіне бел. парт. незалежных рэвалюцыянэраў, пасьля ў 1918 г. ўступіў да б.п. сац.-рэв.“[5]. Друкаваўся ў газэце „Беларусь“, у „Родным Краі“, „Нашай Думцы“.

сіласьцяў, 1952 годзе Беларускую Народную Думу. Сустрэчу ды ўбачылі на ўласныя вочы Янку Чарапука (такую мянушку яму даў Іван Луцкевіч — гэта ведаюць усе Міколы Абрамчыка), прадстаўніка Ўраду БНР — на Ластоўскага, Ураду Луцкевіча.

Ёсьць небясьпека падацца троху патэтычным, але нявыразна ў гэтым пераемнасьць, своеасаблівая повязь ня розумных людзей адной справы, імя якой — Беларуская Народная Рэспубліка.

Дзеля трываласьці гэтай еднасьці, лучнасьці, сувязі — *сёньня*, каб было *заўтра*, варта памятаць усіх, хто ствараў БНР. Асабліва такіх асобаў, якім быў Янка Чарапук. Янка Чарапук, Антонаў сын, нарадзіўся ў каталіцкай сям'і 30 (18) жніўня 1896 году ў мястэчку Новы Двор Сакольскага павету. Пачатковую адукацыю атрымаў у расейскамоўным Навадворскім Гарадзкім вучылішчы, скончыў Гарадзенскую гімназію, у 1914 годзе паступіў у Пецярбурскі Ўніверсытэт на юрыдычны факультэт. Напэўна, менавіта ў гэтым горадзе, адным з цэнтраў беларускага адраджэньня[3], Янка Чарапук пачаў нацыянальна-вызваленчага руху беларусаў і ўкраінцаў. Пра гэты ён сам пісаў пра гэта ў анкеце: „У 1917 г. быў Саветам Украінскай Місіі ў Пецярбурзе, затым быў адкамандзіраваны да М[іністэрства] З[амежных] С[праў] Укр. Н. Рэспублікі, дзе быў за часоў Кабінэту Луцкевіча Дыпляматычным кур'ерам, затым Чыноўнікам спэцыяльных даручэньняў, за Ўрадам Ластоўскага Сакратаром Місіі ў Латвіі і Эстоніі, затым Дэлегатам Міністэрства Загран. Спраў“[4]. У грамадзкіх арганізацыях „у Пецярбурзе зьяўляўся Тав. старш. Культ.-Прасьвет. Тав. „Вольных Беларусоў“, у Кіеве Сябром Бел. рады на Ўкраіне і Сябром Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны. … Зарганізаваў на Ўкраіне бел. парт. незалежных рэвалюцыянэраў, пасьля ў 1918 г. ўступіў да б.п. сац.-рэв.“[5]. Друкаваўся ў газэце „Беларусь“, у „Родным Краі“, „Нашай Думцы“.

З нагоды 1997 года ў ЗША і Канадзе, прымаючы да ўвагі 80-ю гадавіну БНР (30 – 31 жніўня 1997 г.), Архіў Баляслава Грабінскага „Сакольшчына-Горадня-Вільня“, надрукаваныя

з нагоды 1997 года ў ЗША і Канадзе, прымаючы да ўвагі 80-ю гадавіну БНР (30 – 31 жніўня 1997 г.), Архіў Баляслава Грабінскага „Сакольшчына-Горадня-Вільня“, надрукаваныя

Архіў Рады БНР, які пачаў выходзіць у 1997 годзе

Архіў Рады БНР, які пачаў выходзіць у 1997 годзе

Архіў Рады БНР, які пачаў выходзіць у 1997 годзе

ў „ARCHE“, № 5, 2000. С. 179—208. Таксама: Грынкевіч С. Тры спатканьні / / Бацькаўшчына, № 51—52, 1957. С. 6.

[3] Гл.: Семашкевіч Р. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе. Менск, 1971.

[4] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Том 1. Кніга 2. Вільня—Нью-Ёрк—Менск—Прага, 1998. С. 1084.

[5] Тамсама.

Але дзейнасьць Янкі Чарапука да выезду ў Амэрыку — тэма асобнага дасьледаваньня[6]. Зараз жа нас цікавіць амэрыканскі

пэрыяд ягонага жыцьця, а яшчэ больш дакладна — паваенны этап (да таго ж у тых фрагмэнтах, якія дазваляе задакумэнтаваць архіў БНР), калі пасьля другой сусьветнай вайны ў Злучаныя Штаты пачала прыбываць новая хваля беларускай эміграцыі.

Трэба сказаць, што кон, захаваўшы Янку Чарапук на бацькаўшчыне, тым ня менш ня надта песьціў, на карагох Амэрыкі. Ад 1936 году да пэнсіі ён працаваў на дрэваапрацоўчай *„Chicago and Riverdale Lumber Company“*, што гарантавала пэўны мінімум на жыцьцё, але ня болей. Беларуская дзейнасьць, як вядома, на выгнаньні, не толькі прыносіць прыбытак, колькі вымагае як грашовых ахвяраў, гэтак і побытавага аскетызму.

Магчыма, менавіта гэта сталася падставаю й сямейных складанасьцяў. У 1949 годзе жонка Янкі Чарапука, Клара Змагар (менавіта пад гэтым прозьвішчам яна зафіксавана ў судовых паперах), 53 гадоў, падала на развод. Яна адпускала сабе сямейны дом на Прынстан Авэню коштам у $2000, з якіх гаспадар мусіў пакінуць у 24 гадзіны з $500, а вырашаным жонкаю, ужо былой, у якасьці кампэнсацыі за суботнія, маёмасьць, таксама былую.

У 1951 годзе чыкагскія газэты абышоў здымак: жанчына, з павелічальным шклом узіраецца ў здымак палонных. „Я верыць, што гэта яе зьніклы сын“, — сьведчылі подпісы.

І распавядалі наступную гісторыю: на вочы Клары Змагар трапіў здымак палонных амэрыканцаў у Карэі, зроблены ў агітацыйных мэтах кітайскім урадам. Яна пазнала (ці ёй здалося, што пазнала) у адным з палонных свайго сына, Адрыяна, зьвестак аб якім не было ад траўня 1950 году — менавіта тады яна атрымала апошні ліст сына, 29-гадовага ваеннага мэдыка з 24-й Дывізіі, залічанага ў войска 1 траўня 1943 г., напісаны зь Японіі, перад адпраўкаю ў Карэю. Сын лічыўся зьніклым бязь зьвестак з 16 ліпеня 1950 году. „Я абсалютна пераканана, што гэта ён. Бачыце, можна разгледзець нават шнар на ягоных вуснах“, — цытавалі газэты словы маткі. Магчыма, што гэта насамрэч быў ён. Але амэрыканскае ваеннае камандаваньне прытрымлівалася іншай думкі. У 1954 г. Клара Змагар атрымала паведамленьне, што ейны сын, Adrian J. Kusiolek, быў забіты 16 ліпеня 1950 г. Сымбалічныя паховіны адбыліся 28 жніўня 1954 г.

6 Зацікаўленых чытачоў адаслаем да артыкулу В. Пандрэвіча „Янка Чарапук-Змагар“, у галіце „Бацькаўшчына“, № 51—52, 1957 і публікацыі С. Шукана „Лісты Янкі Чарапука-Змагара з Амэрыкі (1922—1923)“ у „Запісах БІНІМ“, № 21, 1994. С. 125—137.

Гэта што да жыцьця прыватнага. Жыцьцё грамадзкае было таксама няпростым. Натуральна, яно не было лёгкім ад самага пачатку: нястача людзей, грошай, інфармацыі — усё гэта не спрыяла прадуктыўнай дзейнасьці першага амбасадара БНР у Злучаных Штатах. Але пасьля вайны праблемы набылі іншы кірунак. І „чалавечы фактар“ ня быў тут апошнім: ад першай хвалі новых эмігрантаў зь Беларусі Янка Чарапук апынуўся паміж варагуючымі кааліцыямі, згуртаваньнямі, аб’яднаньнямі і задзіночаньнямі, прычым сутнасьць той варажнечы часта заставалася для яго невытлумачальнай. Дый як было зразумець падзел такой вялікай, выраслай кагорты нацыянальна сьведамых беларусаў на крывічоў і зарубежнікаў, на ўсходнікаў і заходнікаў, на БЦР і БНР. Пра рэлігійны падзел, асабліва сярод праваслаўных, ужо й гаварыць не выпадала: часам здавалася, што менавіта адтуль ішла небясьпека расколу для беларускага руху.
Падтрымкі Чарапука-Змагара шукалі розныя колы, царкоўныя — не ў апошнюю чаргу. Адным зь першых зьвярнуўся да яго япіскап Васіль (Тамашчык):

„Высокапаважаны сп. Я. Змагар!
Хаця мы асабіста яшчэ не знаёмы, а ўсё ж — як бы браты; таму й пішу Вам пару слоў. Я чуў аб Вас ужо нямала добрага ад М. Дзямідава яшчэ ў Нямеччыне, а тут — ад майго прыяцеля др. С. Грынкевіча. Апошні апавядаў мне ці мала цікавых рэчаў аб Вашай дзейнасьці, чым незвычайна заахвоціў мяне да беспасярэдняй сувязі з Вамі.
На жаль, я точна ня ведаю дасюль Вашага асабістага становішча да нашае сьвятое БАПЦ, таму ня ведаю, як і што сказаць Вам адносна яе й майго цяпер тут палажэньня ў Нью-Ёрку.
Калі знойдзеце магчымым адпісаць мне на гэты ліст і Вас будзе крыху цікавіць мая дзейнасьць і стан БАПЦ — з прыемнасьцю дам Вам адказ.
Тымчасам быў бы Вам вельмі ўдзячны, калі б Вы знайшлі магчымым падзяліцца са мною весткамі аб Вашай дзейнасьці па лініі ірляндцаў і інш. Я быў бы таксама ўдзячны Вам, калі б Вы захацелі даць мне пару радкоў адносна амэрыканскага жыцьця пад кутом гледжаньня характару маёй дзейнасьці як

духаўніка, бо я ўважаю, што Вы тут маеце ўжо добрую практыку і ўсякія адпаведныя „разлады“, а я толькі ведаю пагаворку: „Што край, то абычай“.
Быў бы Вам таксама ўдзячны, калі б Вы мне піснулі пару слоў адносна сп. М. Дзямідава, бо я ўжо чуў тут пра яго ўсякія дзіўныя рэчы і ня ведаю, што праўда, а што не. Гэта мне асабліва важна ведаць, бо ён заклікае мяне да вас — у Чыкага.
За ўсё буду Вам вельмі ўдзячны.
Яшчэ раз прашу мне выбачыць, што першы пішу да Вас, але гэта мне станоўча парадзіў др. С. Грынкевіч.
Шчыра й сардэчна вітаю Вас.
Бог Вас благаславіць.
З малітвамі й любоўю ў Хрысьце,
Ваш Япіскап Васіль.
Бруклін, 3.08.1951.“

Янка Чарапук адказаў хутка:

„Яго Эксцэленцыі
Вельмі паважанаму Васілю — Япіскапу БАПЦ.
Прывет шчыры й радасны.
Дзякую за Ваш мілы ліст да мяне з дня 3.08.1951. Я ня мог адказаць Вам зараз жа, бо ня быў дома — быў у разьездах.
Я, як беларус-дзяржаўнік, уважаю гістарычны акт абвяшчэньня Аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы як другі важны акт пасьля акту абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.
Падзіўляю Ваш чын — пасьвяціцца Службе Божай і службе роднаму Вам і мне Беларускаму Народу — цяпер тут, на сапраўды вольнай і дэмакратычнай зямлі Вашынгтону, а з часам — дасьць Бог — на роднай Вам і мне Беларускай-Крывічанскай зямельцы. Памагай Вам Бог зьдзейсьніць Вашы намер і жаданьні! Я меў нагоду нядаўнімі днямі пахваліцца майму Высокаму Рыцару Калюмба аб Вашай Асобе і аб маім прыязным становішчы да Вас. Мой Высокі Рыцар адказаў, што „калі Япіскап Васіль зьяўляецца беларускім патрыётам і выказаў сілу волі і настойчывасьці ў навуках і ў грамадзкай працы, значыцца, заслужыў, каб беларусы-патрыёты лажылі яму найвышэйшы гонар“. Далей мой Высокі Рыцар сказаў, што

маім (Я.Ч.-З.) абавязкам ёсьць зарэкамэндаваць Вас, Уладыка, у Міністэрстве Спраў Загранічных, і тады у МЗС будуць так паважна Вас трактаваць, як Вы на гэта заслужылі ў ведамых там прадстаўнікоў БНР. Да выкананьня гэнай добрай рады, згоднай з маім жычэньнем і намерам, я ўзяўся па-прыяцельску да Вас.

Далей ён мне парадзіў, каб я Вам прыпомніў, што пажаданым ёсьць, каб Вы ад сябе злажылі ў МЗС мэмарыял аб Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве наагул (гісторыя, цяперашняе становішча на чужыне, усюды і асабліва ў ЗША) і аб відах на прышласьць тут.

Я ня знаю Вашых плянаў, ня ведаю, дзе мае быць цэнтар Вашай душпастырскай працы — ці ў Нью-Ёрку, ці ў Чыкага, ці дзесь у іншым горадзе, наагул, мала маю інфармацыў пра Вас асабіста, так што пра Вас мала маю чым пахваліцца. Між іншым, хацеў бы ведаць, ці можаце прамаўляць па-ангельску?

Ваш прыезд у Чыкага пажадана ёсьць каб адбыўся на запросіны спэцыяльнага Камітэту — каб паважней выглядала дзеля Вашай Япіскапскай павагі і дзеля грамадзкага абавязку праваслаўных беларусаў. Аб такім камітэце тут цяпер ідуць нарады. На гэтым тыдні ад М. Дзямідава даведаюся — аб канчатковым выніку гэтых нарад.

Ён, М. Дзямідаў, характару парывістага: часамі добрую прыслугу можыць зрабіць, а часамі — хоць уцякай ад яго. Усё залежыць ад настрою, а настрой ад напою — ці ў меру, ці празь меру. А часамі настрой залежыць і ад „залежнасьці“, і ад аўтарытэту. Настрой яго ўмерыць я стараюся, велічаючы яго тытулам палкоўнік.

А што да пагаворкі „што край, то абычай“, дык усё ж такі й тут, як і шмат дзе ў іншых краёх, імпануе стройны выгляд, бодры й вясёлы настрой, бойкі, жывы паварот, спагада да дабрабыту, гутаркі адрывістыя з гумарам, строй элеганцкі напаўсьвецкі, нахіл да прыяцельскага знаёмства й хатняга госьця. І — убок ад зацятай дыскусіі.

Ведама, быў бы рады пазнаёміцца з Вашым мэмарандумам, таму прашу надзяліць мяне копіяй.

Дзямідаву маніцца ў канцы гэтага тыдня выслаць Вам ад сябе нейкія інфармацыі, так што я на гэтым кончу.

Бывайце здаровенькі і ўсяго Вам найлепшага!

Слава Хрысту!

Хай жыве БНР!
Паддаюся Вашым малітвам.
Ваш прыяцель Янка Чарапук- Змагар.
Чыкага, 15.08.1951.“

У сваім адказе Янка Чарапук задаволіўся такой паўжартоўнай ацэнкаю характару М. Дзямідава. Але зерне сумневу, недаверу, закінутае япіскапам Васілём, дало свае ўсходы, што і адбілася ў лісьце да генэрала Андэрса ад 10.09.1952:

„Вельмішаноўны пан Генэрал,
ад імя Рады БНР у Чыкага маю гонар зьвярнуцца да Пана Генэрала з просьбаю асабістай апініі пра асобу М. Дзямідава, знаёмага з часоў супольнага сядзеньня ў Маскве на Лубянцы. Збор незалежнай інфармацыі пра вышэйназванаю асобу, якая зараз жыве ў Чыкага, ёсьць для нас надта важным“.

Адказ зь Лёндану, з Waverton Street 7, дзе жыў генэрал Андэрс, прыйшоў праз 10 дзён:

„Wielce Szanowny Panie Prezesie,
W odpowiedzi na list Pański z dn. 10 sierpnia b.r. uprzejmie komunikuję:

Będąc w więzieniu w Moskwie na Łubiance przebywałem czas jakiś w jednej celi z niejakim panem, który podawał się za Diemidowa, o ile sobie przypominam Mikołaj Iwanowicz. Wspominał, że brał udział w ruchu Białoruskim. Muszę zaznaczyć, że mam o nim jaknajgorszą opinię. Nie tylko ja, ale i wielu współwięźniów w celi było przekonanych, że p. Diemidow donosi wszystkie rozmowy do NKWD.
Wracając ze śledztwa, przynosił zawsze ze sobą papierosy i jabłka, co sie nikomu nigdy nie zdarzało. Wielokrotnie też podkreślał, że zawsze współpracował i miał kontakty z Sowietami. Jestem głęboko przekonany, że tak było, zresztą wiem z całą pewnoscią, że został z więzienia zwolniony po rozpoczęice się wojny niemiecko-sowieckiej. Jest to ostatni człowiek, do którego — moim zdaniem — można by mieć zaufanie.
Nie dziwiłbym się zupełnie gdyby to była wtyczka bolszewicka.
Dla informacji podaję, że ów p. Diemidow był raczej mniej niż średniego wzrostu, o nalanej twarzy, ciemnych włosach, nieprzyjemnych oczach i bardzo gadatliwy. Nie moglibym wprost zrozumieć, żeby p. Diemidow mógł się dostać normalną drogą do Stanów Zjednoczonych.
Łączę wyrazy poważania.
Gen. Dyw. W. Anders“.

Перад тым, як вярнуцца да ліставаньня зь япіскапам Васілём ды наагул да кантактаў з прадстаўнікамі паваеннай эміграцыі, неабходна зрабіць невялікі адступ ды патлумачыць часты зварот рэспандэнтаў Янкі Чарапука

[7] **Гл.: http://www.kofc.org/knights**

[8] **На той час Раду Кангрэсовага Камітэту**

як „Рыцара Беларусі“. У гэтым звароце — ня толькі выяўленьне пашаны, але й канкрэтнае ўказаньне на рыцарства — Рыцарства Калюмба.

складалі: М. Шчорс — прэзыдэнт, І. Лобач і Б. Кіт — віцэ-прэзыдэнты, сябры Рады — М. Філіповіч, С. Коўш, А. Русак, М. Сенька, А. Сабаленскі, С. Жамойда.

Арганізацыя „Рыцары Калюмба“[7] была заснавана 9 кастрычніка 1881 году невялічкаю групаю людзей, аб’яднаных ідэяй абароны сваёй краіны, сваіх сем’яў і сваёй Веры, аб’яднаных імем Хрыстафора Калюмба, чалавека, які прынёс у іхную краіну, у Амэрыку, Веру. З часам гэтае братэрства сталася найбольш уплывовай каталіцкай арганізацыяй, дзейнасьць якой не абмяжоўвалася адной толькі Амэрыкаю. У 1900 годзе, 22 лютага, да трох галоўных прынцыпаў (і адначасна Ступеняў) Ордэну — Цноты, Еднасьці, Братэрства — быў дададзены яшчэ адзін: Патрыятызму. Гэты прынцып мянуецца Чацьвёртаю Ступеньню й зьяўляецца па сёньня найвышэйшым у Ордэне. Калюмбавым Рыцарам Чацьвёртай Ступені быў Янка Чарапук.

Але вернемся да падзей 1951 году, калі вакол Янкі Чарапука адбываліся эпісталярныя двубоі.

Амаль адначасна зь япіскапам Васілём падтрымкі ў Чыкага, толькі ўжо ў інтарэсах сваёй групы, Беларускага Кангрэсовага Камітэту[8], пачаў шукаць доктар Мікалай Шчорс. Трэба сказаць, што Я. Чарапук напачатку намагаўся застацца ўбаку ад тых спрэчак, неаднаразова прапаноўваючы др. Шчорсу сустрэцца ня толькі зь япіскапам Васілём, але й з раднымі БНР, каб высьветліць і зьліквідаваць усе непаразуменьні дзеля супольнай справы. Такія сустрэчы адбыліся, толькі жаданага плёну не прынесьлі.

Гэтак, др. Шчорс пісаў (18.10.1951):

„Ваша Дастойнасьць.

Беручы пад увагу выказанае Вамі падчас мае бытнасьці ў Чыкага заінтарасаваньне справай кансалідацыі нашага грамадзянства ў межах ЗША, нягледзячы на неатрыманьне адказу на мой апошні да Вас ліст, пішу ізноў. Хацеў бы давесьці да Вашага ведама факт спатканьня і адбыцьця даўжэйшае гутаркі між Вашым слугою й старшынёй Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня сп. інжэнэрам Гарошкам. Хаця гутарка насіла, так сказаць, шчупальны характар, можна аднак на яе падставе зрабіць наступныя вывады: незаінтарасаваньне ў кансалідацыі нашых сьціплых сілаў гэтак званае крывіцкае стараны. Спадар Гарошка на проціўлеглым ад майго пункце гледжаньня. Я прапанаваў і далей прапаноўваю кансалідацыю й супрацоўніцтва на плошчы нацыянальна-грамадзкіх і культурных дачыненьняў, уважаючы, што апошняе ёсьць шмат лягчэйшым да прывядзеньня ў практычнае жыцьцё з прычыны адсутнасьці спэцыяльных разыходжаньняў. Сп. Гарошка ўважае, што трэба спачатку скансалідавацца на палітычным адрэзку, і нават запрапанаваў „просты“ рэцэпт практычнага яго вырашэньня: зьліквідаваць БЦР і прызнаць гэтак званую БНР. Тэарэтычна рэцэпт сапраўды просты, нават вельмі просты — толькі што нерэальны. Кансалідацыя й супрацоўніцтва нармальна базуюцца на пэўных кампрамісах, уступствах кантрагентаў, а не на бескампрамісных праектах самаліквідацыі. Каб апошняя наступіла, ня трэба гутарак аб супрацоўніцтве. Патрэба толькі пераконаньня аб фальшывасьці займанага становішча, а гэтага ніхто зь людзей, гуртуючыхся вакол БЦР, ня мае й мець ня будзе. БЦР — гэта не тэстамэнтавы твор, гэта таксама й ня твор эміграцыйны, падобна гэтак званай Радзе БНР, якая паўстала у сарамлівых абставінах і паўкансьпірацыйна праведзеным зьезьдзе аднае крывіцкае групоўкі ў Остэргофэне (Нямеччына). БЦР — гэта ўстанова, пакліканая й пацьверджаная воляй, калі ўжо не ўсяго беларускага народу, то прынамсі ўсяго яго актыву. 1039 дэлегатаў у сталіцы Беларусі Менску — гэта ня некалькі дзясяткаў эмігрантаў аднае групоўкі ў задрыпаным нямецкім гарадзішку. Параўнаньня тут ня можа быць ніякага! БЦР не паўстала воляй эміграцыі й ня можа быць воляй эміграцыі зьліквідавана. Яе можа зьліквідаваць III Усебеларускі Зьезд на Бацькаўшчыне, толькі й вылучна“.

Што М. Шчорс не атрымаў адказу ад звычайна пунктуальнага й акуратнага ў такіх справах Янкі Чарапука, не было выпадковым. У гэты час ён актыўна ліставаўся зь япіскапам Васілём, выпрацоўваючы ўласную пазыцыю. А Васіль пісаў[9]:

[9] Ліст ад 6.09.1951 г. падпісаны япіскапам Васілём і С. Грынкевічам.

[10] С. Грынкевіча.

„Ваша Эксцэленцыя, Дарагі й Нязломны Рыцару Беларусі.
Шчыра дзякую за Ваш мілы ліст і за незвычайна цікавыя лісты др. Шчорса. Згодна з Вашым пажаданьнем прыйшоў да Стася[10], прачыталі мы яшчэ супольна дзівачныя творы гэтага знамянітага „палітыка“ й хочам сказаць Вам пару аб’ектыўных слоў. Нас перадусім незвычайна дзівіць „шчырае“ жаданьне гэтага панка адносна аб’еднаньня беларускіх сіл. Што гэта за круцельства й шарлатанства зь ягонага боку, хочам Вам падаць хаця б наступныя тры прыклады.
1. Гэты панок у свой час належыў да нашае нацыянальнае Рады й нават да Ўраду БНР. Гэтыя свае функцыі, аднак, з часам пакінуў дзеля таго, што нічога ніколі не хацеў рабіць, а займаныя ім пасты яго ніколі не задавальнялі, бо, бачыце, усё яму здавалася, што яны (пасты) не адпавядалі яго амбіцыі, дадаем — шалёнай амбіцыі, бо та ж над ім усё яшчэ быў нехта вышэйшы — гэта значыць спадар Прэзыдэнт М. Абрамчык. Тады, спачатку, тэстамэнт сп. Прэзыдэнта ня выклікаў у яго ніякіх сумлеваў, але калі яго дзікія амбіцыі былі не задаволеныя, ён ня толькі адышоў ад адзінае нашае тады канкрэтнае працы, але перайшоў да ворагаў нашага

вызвольнага руху на чале з панам Астроўскім, бо, бачыце, яму далі функцыю „віцэ-прэзыдэнта“. Але мала таго, ён пасьля праздрадзіў ворагам нашым усе тайны нашае працы й нашага змаганьня.
2. У 1948 г. мы гатаваліся да перавыбараў нашага Цэнтральнага Нацыянальнага Камітэту на Нямеччыну. Панок Астроўскі з гэтым вось панам Шчорсам ужо разьвярнулі сваю незвычайна разбуральную працу. Нягледзячы на гэта, беларускія патрыёты, жадаючы адзінства ўсіх беларускіх сіл, зрабілі спробу вяртаньня адзінага беларускага фронту й правядзеньня супольных выбараў у Цэнтральны Камітэт. Да пана Шчорса быў выдэлегаваны др. В. Войтанка. Др. Шчорс паставіў яму шмат вымогаў „дэмакратычнага“ характару, і ўрэшце яны дагаварыліся, што калі наша Цэнтральная Выбарчая Камісія прыме гэтыя ягоныя вымогі, тады В. Войтанка яму затэлефануе й нашая Камісія пачакае на назначэньне парытэтнай колькасьці іх кандыдатаў для правядзеньня супольных выбараў. Калі В. Войтанка зрэфэраваў камісіі пастаноўку пытаньня, была праведзеная грунтоўная дыскусія й прынятая пастанова-згода. Др. Войтанка пайшоў затэлефанаваць аб гэтым др. Шчорсу. Хутка ён вярнуўся й сказаў, што др. Шчорс нічога канкрэтнага не сказаў. Так вось выглядала „шчырасьць“ пана Шчорса. Але можа яна выглядала лепей у пытаньні царкоўнай справы.
3. Ня будзем Вам тут апісваць працэсу здрады беларускіх япіскапаў — пераходу іх да расейскай царквы й гэтым ліквідацыі нашага царкоўнага жыцьця. Скажам толькі, што гэтыя здраднікі пачалі арганізоўваць антыбеларускі фронт, на чале якога пазьней стаў пан Астроўскі й да якога далучыўся яго „віцэ-прэзыдэнт“ пан Шчорс“.

Але, відаць, Васілю аднаго ліста падалося недастаткова для вытлумачэньня, і ён дасылае наўздагон другі, ужо толькі ад свайго імя:

„Ваша Эксцэленцыя!
Учора мы з Стасем улажылі Вам пэўныя выясьненьні на ліст др. Шчорса. Магчыма, гэтыя нашы выясьненьні ня вышлі так

гладка й грунтоўна, як бы нам хацелася, бо пісалі мы іх, можна сказаць, экспромтам. Таму хачу дадаць да іх яшчэ пару слоў.
Я сам асабіста ня толькі хацеў і хачу аб'яднаць усіх нашых сіл у адную нашу сямейку, але асабліва, калі ўступіў на духоўны шлях, усімі сіламі імкнуся да гэтага. Толькі пры гэтым я мушу прыймаць пад увагу думкі людзей, якія з самага пачатку й цяпер дзейна дапамагаюць мне будаваць нашу вялікую й слаўную справу — БАПЦ. А думкі іх такія: др. Шчорс і кампанія — гэта толькі малая частка нашых сіл. І запраўды: ён хваліцца, што ў яго на сьвяце было каля 150 асобаў! На гэта скажу: гэта ўсё, што яны тут маюць, ну, няхай яшчэ 50 асоб. Тым часам я быў нядаўна ў нашых людзей у Нью-Брансўіку каля Нью-Ёрку, і там у мяне было на Службе Божай каля 150 асоб, а пасьля на абедзе каля 100 асоб, а крыху больш гэтага ёсьць у Нью-Ёрку, а Кліўленд, а іншыя аддзелы БАЗА? А па-за Амэрыкаю? Нашы арганізацыі ў Канадзе (ужо запрашаюць ехаць), у Аргентыне, у Францыі, Бэльгіі, Англіі (у дзьвёх апошніх краінах ёсьць Царква БАПЦ), у Нямеччыне ўсё яшчэ выходзіць „Бацькаўшчына", у Італіі, у Аўстраліі. Гэта яшчэ ня ўсе краіны, дзе працуюць нашыя людзі. Толькі студэнты, якія ідуць з намі, налічваюць 150 асоб. А што ўжо гаварыць пра сп. М. Абрамчыка, які быў ужо ўва ўсіх сталіцах заходняга сьвету й быў прыняты самым Папам!
Якою ж мухаю выглядае др. Шчорс з сваімі 150—200 чалавек і ня быўшы ні ў адной сталіцы заходняга сьвету!"
Нарэшце Я. Чарапук дасылае адказ М. Шчорсу, напісаны ў адпаведнасьці з парадамі япіскапа Васіля:

„Паважаны др. М. Шчорс.
У апошнім сваім лісьце да мяне Вы пішаце, што я вам не адказаў на папярэдні Ваш ліст. Так, гэта праўда. Чаму я Вам не адказаў на яго? Я, як беларус-дзяржаўнік, быў яшчэ тады на раздарожжы. Ня ведаў, што Вам сказаць. Але апошнія падзеі ў Чыкага канчаткова пераканалі мяне, што Вы й Ваша арганізацыя ня хочаце служыць беларускім інтарэсам, наадварот, Вы — саюзьнік расейцаў. Што сталася? Мы ў Чыкага чакалі на япіскапа Васіля. Даведаліся аб гэтым і расейцы. Нашы людзі тут, праваслаўныя беларусы, плянавалі адцягнуць ад расейцаў адну іх царкву, дзе выключна старыя беларусы.

І вось расейскія манархісты зараз жа пасьпяшаліся паслаць сюды самога Анастасія, каб перашкодзіць беларусам. Ну, што ж, расейцы як расейцы, яны робяць сваю варожую нам работу. Ня гэта страшна, але страшна тое, што Ваш сьвяшчэньнік Лапіцкі зараз жа пасьпяшыў памагчы расейцам сваёй злобай і брудам на нашу дзяржаўную рэч — сьв. БАПЦ і япіскапа Васіля. Стварыўся адзіны фронт расейцаў і Вас! Гэтага для мяне даволі! Бо ж і для мяне ўжо ясна, што расейцы атакуюць толькі тое, што для іх шкодна, а для нас карысна. Вось жа, не хачу болей бачыць такіх „белоруссов“, якія памагаюць нашым вечным ворагам“.

Ліст скончваўся патрабаваньнем канкрэтнага адказу, па сутнасьці, выбару паміж БНР і БЦР, а яшчэ больш дакладна — выбару Царквы. Гэта было разрывам адносінаў ня толькі з Шчорсам, але й з усімі беларусамі, што стаялі за ім.
Да разьбежнасьцяў паміж БЦР і БНР на эміграцыі дадаваліся несуцяшальныя зьвесткі з Бацькаўшчыны. У лісьце да невядомага адрасата 6 чэрвеня 1954 г. Янка Чарапук пісаў: „Паважаны Спадару! Я атрымаў Ваш ліст з 27 красавіка, дзякую. У мяне быў прадстаўнік беларускай арміі ад імя Вітушкі. Ён прадставіў мне ўсю справу, якая эгзыстуе на Беларусі. Я быў зьдзіўлены, ногі яго былі адмарожаныя. Гэта быў праўдзівы прадстаўнік беларускай арміі. Я даў яму прытулак. Чакаю на выпадкі міжнародныя. Здаецца, будзе ізноў адозва да беларускага сьвету. Генэрал Вітушка шле таксама прывітаньні Абрамчыку“.

А ўжо 26 чэрвеня ён пісаў да Віталя Кажана (скарбніка рады БНР):

„Ваша Дастойнасьць, у адказ на Вашае другое пісьмо маю гонар давесьці да Вашага ведама як сябру Рады БНР, што Вітушка, галоўны правадыр Беларускіх Паўстанцкіх Сіл, не прызнае ніякіх дагавораў, зробленых Прэзыдэнтам Рады БНР Міколам Абрамчыкам, ані Радаславам Астроўскім, прэзыдэнтам БЦР. Ягоны прадстаўнік Антон Лабенец, які знаходзіцца ў Чыкага,

сугеруе мне, каб выдаць адозву да беларусаў сьвету аб стварэньні Дзяржаўнага Фонду, так як маюць іншыя нацыі. Гэты Фонд павінен быць выкарыстаны толькі на патрэбу Беларускіх Паўстанцкіх Сіл і Беларускай Народнай Рэспублікі. Я маю засьцярогу, што ў выпадку такой адозвы гэта выкліча вялікую рэакцыю з боку бальшавіцкіх прадстаўнікоў Беларускай Рэспублікі Кісялёва й Грамыкі. Чакаю адказу й Вашага погляду, як заставацца да сытуацыі“.

Але, верагодна, найбольш балела за справы ў сваім Чыкага. Так атрымалася, што найбліжэйшы (і найстарэйшы) паплечнік, Я. Варонка, пачаўшы ад выданьня расейскамоўнай „Белорусской Трибуны“, паступова ўсё больш аддаляўся ад беларускіх спраў, заняўся расейскім радыё, якое закранала беларускія праблемы адно напачатку й тое — зрэдку, а пазьней не хацеў нават чуць, каб даць

11 М. Абрамчык быў у Чыкага ў сакавіку 1950 году. Тады ж была

эфір М. Дзямідаву альбо самому Чарапуку, які губляўся ў здагадках: што гэта, стомленасьць ад нацыянальнай працы, якая быццам бы аказалася бясплённай, страх перад усёмагутнымі бальшавікамі (хадзілі нават чуткі, што Варонка перадаў ім некаторыя паперы з асабістага архіву і архіву БНР), уплыў сям'і, далёкай ад беларускіх праблемаў?

арганізавана радыёперадача ў праграме Я. Варонкі — прамова Прэзыдэнта БНР да беларусаў Чыкага, прысьвечаная 32-й гадавіне абвешчаньня незалежнасьці.

[12] М. Дзямідаў.

Гэтая тэма ня раз закраналася і ў ліставаньні з Прэзыдэнтам БНР Міколам Абрамчыкам, які ў лісьце ад 6.04.1950 г. пісаў у Чыкага:

„Высока паважаны й дарагі Рыцар, толькі што атрымаў Ваш ліст, дзякую. Выбачце, што адказваю на такой паперы. Якраз мушу сядзець у хаце, чакаць нейкага журналіста — Шварцара з Вашынгтону. Ён даведаўся аб маім тут побыце і прасіў інтэрвію; дык не магу выйсьці з хаты і хочу выкарыстаць час,

каб Вам адказаць.
Чыкага! Калісьці я захоплівaўся ягонай разьлеглай прыгажосьцю! Праўда, было й так, але было інакш часамі. Часамі й сьціскалася сэрца. Але я, даражэнькі Рыцар, наўчыўся за сваіх асабліва сем апошніх гадоў рэагаваць ня сэрцам. Можа сказаў трохі замоцна, „навучыўся“, лепш сказаць „хачу“ рэагаваць ня сэрцам.
Кастусь Каліноўскі на судзе сказаў маскалям, што „прайгралі паўстаньне таму, што ягоныя саюзьнікі-палякі мелі сэрца не ў грудзях, а ў галаве“. У гэтых простых словах Каліноўскага крыецца глыбокі сэнс палітычнай філязофіі.
Мець сэрца „не ў галаве“ сапраўды рэч ня лёгкая. Палітыка, на жаль, патрабуе гэтага амаль што як асноўнай рэгулы. Трымаць моцна сэрца на сваім месцы, не дапускаць яго падымацца, а капітуляваць і абыходзіцца толькі сухім розумам — бяз помачы, без уздыму сэрца. Я вось і намагаюся, стараюся й вучуся гэтак дзеяць.
Прыглядаючыся да палітычнай сфэры — сьвету рафінаванага ў гэтым сэнсе, мы знойдзем, што яны сапраўды так дзеюць, так навучыліся дзеіць, як быццам таго сэрца й зусім ня маюць. Можа гэта і не прыгожа ўжо так выглядае, але ж ня нам зламіць гэтыя векавыя традыцыі, векавыя рэгулы. Непрыгожыя традыцыі ў змаганьні — войны, забіваньні людзей, але покуль такі сьвет існуе, не абыдземся мы без такой формы змаганьня. У мабілізацыі сягоньня нашых сілаў мусім вэрбаваць ня толькі рыцараў аж 100% беззаганных нацыянальна і ахвярных людзей. Такіх людзей у кожным грамадзтве, кожным народзе няшмат. Пішаце, Чыкага ня шэнціць на нашу інтэлігенцыю. Праўда, моцна ня шэнціць!
Варонка, безумоўна, наша трагедыя, і, магчыма, гэта трагедыя для яго самога яшчэ большая. Я ведаю, на ягоным месцы Вы б зарэагавалі начы. Вы б загаварылі на ўсе дзьве гадзіны так, як гавораць нямногіх 10% адданых ідэі нашай вызвольнай справы. Я ад Варонкі гэтага не спадзяваўся, балела сэрца, але цешыўся, што будзем мець ад яго хоць нейкія 3% — на сухі палітычны розум рахавалася й гэта здабыткам. Па Вашым апошнім лісьце ставіцца й гэта пад сумнеў.
Відаць, на Варонку не зрабіў і я ўплыву, а калі гэты ўплыў быў, дык толькі хвілёвы[11].
Што ж цяпер рабіць? Падняць проці яго апазыцыю, пачаць біць

яго на разе ня выгадна нам.
Але трэба аднак яго Вам, узяўшы моцна „сэрца ў жменю“, старанна трымаць пры сабе, хоць на 10% ці 5% выкарыстоўваць. А галоўнае — тармазіць яго, каб іншыя % не выкарыстоўвалі чужыя.
Калі б Варонка не займаў у нашай гісторыі такога месца, безумоўна, гульні такой, цацканьня такога зь ім мець не было б сэнсу. Або калі б гэта было ў Бацькаўшчыне, таксама загаварылі б зь ім іншымі мовамі. Ня выключана, што зьменяцца абставіны й тут. Сэрцам нават загаворым да яго! Іншая рэч, калі заўважыце, што Варонка нас ашуквае й дзець там. *Тагды ўжо безумоўна мусім прыступіць да апэрацыі, хоць як бы балючай яна ні была.*
Палкоўнік[12] добры чалавек, толькі яго безумоўна добра трэба трымаць за полы. У яго выяўляюцца нравы, якія бываюць у многіх старых людзей. А ён моцна стары.
Згодзен, што Вам патрэбна помач. Яе чакаем. На жаль, ня ўсё гэта залежыць ад нас. <…>
А пакуль бывайце здаровенькі і ня падайце духам, Рыцару. „Яшчэ мы прыйдзем палямі ўзорнымі“ да тых вёсак. І тэй вёскі Гародзеншчыны з касьцёлкам Беларускім. Ці ж ня верыце ў гэта, Рыцар? Я моцна веру.
Жыве БНР!
Ваш М. Абрамчык“.

Найбольш шчыльна Я. Чарапук ліставаўся з Станіславам Грынкевічам, сваім далёкім сваяком, якому шмат дапамагаў парадамі, афармленьнем папераў „на доктара“. У першую чаргу ад яго даведваўся ён пра падзеі ў нацыянальным актыве ў гады вайны, у лягерох ДП, ад яго атрымліваў інфармацыю пра новых, невядомых яму дзеячоў руху (а такіх была пераважная большасьць). Напэўна, ня будзе перабольшаньнем сказаць, што С. Грынкевіч у значнай ступені фармаваў пагляды Чарапука на новую беларускую сытуацыю. Лісты рознабаковыя, інфармацыйныя, часам іх можна назваць у пэўнай ступені сэнсацыйнымі; яны дадаюць багата што да роздуму пра іх аўтара й адрасата.
„Мой даражэнькі Братка!
Вярнуўся з одпуску, зь вялікай радасьцю браў да рук чакаючыя

на мяне апошнія Твае пісьмы. Калі чытаў іх, з кожным прачытаным сказам узрастала маё глыбокае задавальненьне, што нягледзячы на гады і адарваньне ад свайго асяродку, Твой энтузіязм, як і глыбокая нацыянальная маральнасьць і патрыятызм у нічым не прытупіліся, а наадварот, у Тваей асобе праявілася далеказорная палітычная сьпеласьць пры ўдалым дыпляматычным падыходзе. Таму, здаецца, толькі Ты адзін у часе апошняе вайны ўмеў заняць такое становішча, якое й сёньня актуальнае. <…>
Сёньня сьпяшу пісаць Табе на тэму нашых міжнародных зносінаў.
Кантакт з Ізраілем ды Ірляндыяй зьяўляецца для нас амаль ключавой пазыцыяй, таму Твая ініцыятыва небывала шчасьлівая ды карысная. Таму гэтыя дзьве дзялянкі трактуй як надта важныя ды справу беспрарыўна пхай наперад. Я тут пастараюся коратка гэтыя дзьве справы з Табой прадыскутаваць.
Ірляндыя. Засьцярогі ірляндцаў у адносінах да нас зусім неапраўданыя. БНР ад часоў яшчэ Ластоўскага глядзела зь вялікай пашанай на Ватыкан. А й цяпер нашыя адносіны да Апостальскага пасаду як найлепшыя. Пэўна ведаеш, што яшчэ ў 1946 г. наша дэлегацыя ў асобе кс. Чарняўскага ды інж. Рыдлеўскага была прынята Папам Піюсам XII. Ватыкан даў стыпэндыі для некалькіх дзясяткаў нашых студэнтаў на ўнівэрсытэце ў Лювэне, выдае на нашай мове малітоўнікі, газэту „Зьніч“, радыёвыя аўдыцыі. Апрача гэтага, нядаўна й сам Прэзыдэнт Абрамчык быў прыняты надта цёпла гэтым жа Папам. Дык як бачыш, каталіцкія пачуцьці ірляндцаў надта зусім ня будуць абражаныя.
Што датыкае нас, дык мы ў сваіх асяродках яшчэ ў Нямеччыне пашыралі сымпатыі да ірляндцаў. Ды гэту сымпатыю маем і цяпер. У часу акупацыі нямецкай, калі ірляндзкая грамадзянка, жонка др. Антановіча, была пасаджана ў канцэнтрацыйны табар, беларускі актыў на чале з сьв. п. В. Іваноўскім выступіў гэтак рашуча перад немцамі, што апошнія выпусьцілі ўвязьняную, хаця гэткія ануляваньні выдадзеных загадаў немцы былі непрывыкшы рабіць. Тут варта надмяніць, што адзін толькі Ермачэнка стаяў наўбаку справы асвабаджэньня ўвязьнянай. Наадварот, таму, што др. Антановіч стаяў на чале Беларускага Чырвонага Крыжа й стараўся ўтрымаць

арганізацыю на яе самарытанскай чысьціні, Ермачэнка супольна зь немцамі разграміў арганізацыю, робячы зь яе карыкатуру ў форме Самапомачы.
У канклюзіі йшло б нам пра навязаньне прыязных адносінаў з ірляндзкім урадам, як і мясцовымі тут арганізацыямі. Заўтра адразу пішу сп. Абрамчыку, каб у найкаротшым часе пастараўся адведаць Ірляндыю. Тым больш гэта будзе карысным, бо ў пачатках зімы сп. Прэзыдэнт мае адведаць ізноў ЗША.
Аднак, магчыма, больш важна, чымся справа нашых адносінаў з ірляндцамі, справа зносінаў з Ізраілем.
Прасьледаваньне жыдоў у царскай Расеі, магчыма, было прычынай утварэньня выняткова добрых адносінаў між прыгнечаным нашым народам з жыдамі. Таму й нашая краіна сталася амаль маткай сёньняшняму Ізраілю. Хопіць толькі паглядзець на пэрсанальны склад сёньняшняга ўраду Ізраіля а пабачым, што ў бальшыні яны паходзяць зь Беларусі. І гэта непрыпадкова, у нас былі найвышэйшыя жыдоўскія школы, адсюль і выходзіла вярхушка жыдоўскай інтэлігенцыі. Пагромы ў нас няведамыя. Памятаеш адносіны БНР да жыдоў ад самага пачатку, памятаеш таксама пастанову нашага Ўраду адносна Балаховіча, які ў той час быў так патрэбны, а Ўрад яго ўвольніў за жыдоўскія пагромы ў Пінску. Варта надмяніць, што адкінутага Балаховіча палякі прыгарнулі да сябе. Пад Польшчаю Беларускі Народ ніколі не запаліўся да моднага ў Польшчы антысэмітызму, а наадварот, пасіўна падтрымліваў жыдоў. Важны факт у сэрыі гэтых зносінаў, што дэлегатам да зносінаў зь Вялікай Брытаніяй ад імя БНР быў пасланы жыд, якога прозьвішча прыпадкова забыў.
У часу жыдоўскае трагедыі-гітлераўшчыны ізноў беларусы спагадаюць жыдом, дзе толькі магчыма, з собскай небясьпекаю жыцьця хаваюць жыдоў (як інж. Душэўскі, які сам прыплаціў жыцьцём). Найболей яскравым фактам гуманных адносінаў нашага народу да жыдоў можа гэты факт, што немцы не змаглі нашымі рукамі ліквідаваць жыдоў, а былі прымушаныя ўзяць батальёны нашых суседзяў, як летувісаў, латышоў ды расейцаў (Камінскі). Нат у нас, у Новым Двары, раскідаць жыдоўскі магільнік не знайшлі ахвотнікаў за грошы ды спэцыяльныя прыдзелы картачак, а пагналі людзей паліцыяй. А потым, як наш селянін ласы на зямлю, хаця немцы аддавалі дармо зямлю,

ніхто яе ня ўзяў. Гэтаксама немцам не ўдалося спрычыніць паўстаньне беларускае нацыянал-сацыялістычнае партыі. Пробаваў няўдачна рабіць гэта Акінчыц, але справа скончылася толькі лідэрам, безь сяброў партыі.
Безумоўна, зусім дапушчальныя прыпадкі спарадычных асабістых прыпадкаў расправы з жыдамі, як высказ помсты. Але гэта жыды самыя разумеюць, бо нямала іх суродзічаў як савецкія камісары мелі нямала на сваім сумленьні беларускага жыцьця. Таму гэтыя прыпадкі ня ўлічваюцца, бо беларусы ліквідавалі й сваіх камуністаў.
Таму ў імя тут коратка накінутай мною мінуўшчыны адносінаў беларуска-жыдоўскіх з жыдоўскага боку належыцца нам пэўнае забавязваньне ў форме помачы, якую на сёньняшні дзень мы можам толькі ад іх дастаць. Узамен за гэта мы забавязваемся, што ня то жывыя, а нат і памёршыя на нашай зямлі ня будуць спрафанаваныя. Справа адносінаў міждзяржаўных — гэта справа ўжо будучыні. Разумею, што пры сучаснай палітычнай сытуацыі прызнаньне de jure *нашага Ўраду немагчымае. На сёньняшні дзень нам надта патрэбна матэрыяльная падтрымка ў наступнай форме:*
1. Зарганізаваць тут на ўсходнім узьбярэжжы, а мо нават і ў Чыкага штодзённую гадзіну камэрцыйных перадачаў, як гэта тут практыкуецца. Фірмы, якія гэта возьмуць на сябе, зь цягам часу пакрыюць свае кошты, бо гэтых радыёвых перадачаў будуць слухаць соткі тысяч людзей.
2. Свайміўплывамі дапамагчы нам дастаць месца ў „Голасе Амэрыкі“.
3. Даць магчымасьць у жыдамі кантраляванай прэсе ў ангельскай мове час ад часу папулярызацыю ў нашай справе.
4. Матэрыяльную помач, у форме падарку або доўгатэрміновае пазыкі, у вышыні $40000 на куплю царквы або дому, што зьяўляецца нам неабходным дзеля адваяваньня старое эміграцыі.
Праўда, гэта немалыя вымаганьні, але адначасна й невялікія для гэтак магутнай жыдоўскае супольнасьці. Дзеля гэтага чым хутчэй старайся ўвязацца з адпаведнымі жыдоўскімі дзейнікамі, пераконваючы іх у карыснасьці гэтае справы для абодвух бакоў. Калі б удалося нам асягнуць усе чатыры мной пададзеныя пункты, на Новы год мы ўжо змаглі б выдаваць сваю штодзённую газэту, а Задзіночаньне налічвала б якія

тысячы сяброў. Гэту справу разглядай як надта важную, бо акрамя Цябе, здаецца, ніхто іншы ня зможа яе правесьці.
На днях атрымаў пісьмо ад сп. Абрамчыка. Ён успамінае аб былым консулу БНР Альбэрце Курляндзкім, які рэпрэзэнтаваў наш Урад у Данцыгу. З Курляндзкім ён апошні раз бачыўся ў 1948 г. у Даніі. Тады сам Курляндзкі падымаўся нашу справу прадставіць жыдам, жыдоўскай прэсе пашыраць паясьненьні аб Беларусі.
Жыве БНР.
Твой Стась.
17.7.1951.“

„Мой даражэнькі Яначка!
Дзякую за апошнія пісьмы. Я надта рады, што Ты бачыш, якая перамена наступіла ў нацыянальным усьведамленьні нашага народу. Ужо зьявішча патрыятычных сем’яў не зьвяжацца ў нас рэдкасьцю. Палітычная рамантыка ахапіла ў нас ня толькі хлапцоў, як гэта было раней, а й дзяўчаты таксама пачынаюць трымаюць крок у маршы наперад за лепшую будучыню.
І Жанна д’Арк зьяўляецца ў нас ужо даволі часты прыметнікам. Я ганаруся, што гэты прыметнік быў ужыты ўжыты на азначэньне патрыятызму мае жонкі, нам і зь нямецкага боку.
Тут пасылаю Табе з гэтым пісьмом мае спасьцярогі, аднае зь фігураў зарубежжа — Каўша. Прачытайш і падумай, як пагадзіць гэтыя ўсе спасьцярогі і які мімахоць накідаецца выснаў.
Думаю, ведаеш, ён зьяўляецца сынам праваслаўнага сьвятара, які амаль што адзін прызнаваўся да беларускасьці й нат актыўна працаваў. З гэтае прычыны й не любілі яго сябры-маскалі або маскафілы-сьвятары. З прыходам на Беларусь немцаў у 1941 г. айцец Коўш таксама маніфэстуецца сваёй беларускасьцю, дастае прыход, і было б усё карысна. Але трэба трагедый. Трудна мне сказаць, якімі матывамі кіраваўся а. Коўш, але ён пачынае хрысьціць жыдоў, выстаўляючы ім мэтрыкі. Тыя, хто знаў яго лепш, казалі, што ён гэта рабіў за золата (як вядома, хрысьціянская мэтрыка давала жыдам магчымасьці ратунку ад сьмерці). А мо ён гэта рабіў з гуманнага пачуцьця. Як весткі кажуць, праваслаўныя сьвятары данесьлі аб гэтым немцам і апошнія зьнішчылі а. Кайпуша[14] у 1942

[13] **Гл.: S. Cous. The Story of the Byelorussian Catholic Watenstadt, Germany. 1945 — 1949. A Pictured Album in Byelorussian. USA, 1981. 112 p.**

[14] **Гл.: Юрэвіч Зьбіўся ў нагах. Кайпуша**

г. Усе, якія ведалі а. Каўша, вестку аб ягонай сьмерці прынялі
надта горка, у гэтым ліку і я, хаця асабіста й ня ведаў яго.
Цяпер на фоне гэтае падзеі здарылася зусім парадаксальнае
зьявішча. Дзеці зьнішчанага немцамі бацькі йдуць да ворагаў
на службу, і то як агенты гестапа! Сучасны супрацоўнік др.
Шчорса Сьвятаслаў Коўш працуе ў аддзеле гестапа, а ягоная
сястра Зоя Коўш як гестапаўскі агент устаўляецца ў склад
Нацыянальны Камітэт у Вільні як сакратарка. Дарэчы, і яна
старшыня Камітэту меў нямала зь ёю клопатаў, бо сваёй
пазыцыяй у немцаў ня раз паважна шантажавала. Аб гэтым
цяпер можа расказаць др. Грабінскі, які жыве ў ЗША. Таму
Камітэт быў прымушаны насіцца з Зояй, як з „балячкаю“. Усе
беларусы, якія зналі а. Каўша, а тым больш, што нашыя
палітычныя разыходжаньні зь немцамі ўжо на самым пачатку
зусім выявіліся, таму паводзіны дзяцей а. Каўша ўсім выдаліся
зусім ненатуральнымі, проста хвараблівымі. Бо няхай і была б
нейкая палітычная канцэпцыя карысная, але нармальнай
людзкой рэакцыяй ёсьць, што калі нейкая ўлада зьнішчыць
бацьку, у такім прыпадку з такой уладай супрацоўніцтва
актыўнае зусім не да падуманьня.

Гістарычны Веды я Таксальныя Лісты да Юркі Віцюбіча // Запіскі БНІМ, № 24, 1999. С. 184—285.

Зоя, ведамая са сваіх афіцыйных і цёплых кантактаў зь
немцамі, ужо ў гадох партызаншчыны 1943—44, быццам у
характары чорнага гандлю разьяжджае ў партызанскія
камуністычныя раёны й вяртаецца жывая. На гэта ў пачатках не
зьвярнулася ўвагі — мо мае шчасьце. Потым, ня ведаю якой
дарогай, яна зьяўляецца пачаткова ў Менску, а потым, летам
1944, ужо ў Бэрліне сакратаркаю Астроўскага. Якім парадкам
гэта сталася, ці немцы Астроўскаму ўціснулі, ці ён сам яе ўзяў,
на гэта не магу сказаць. У Бэрліне Зоя, сама як дзяўчына
непрыгожая, часта паказвалася крыху ў рамантычнай форме з
Жданюком, сярэдняй катэгорыі агентам гестапа, таксама. На
гэта не зьвярталася ўвагі. Дзяўчына хоча мець хлопца, а й
супольная дзялянка працы лучыць — усё ўзноў лягічна ды
ясна. Але тут узноў іншы інцыдэнт.

Ведамы ў нашым жыцьці мэцэнат Шкялёнак, вяртаючыся раз
поўначы а другой гадзіне ночы, застае Зою, перадрукоўваючую
пратаколы БЦР. Зьляпаная на гарачым сьледзе, дзяўчына
растраціласа, але псыхалягічна апанаваны Шкялёнак ня даў па
сабе пазнаць, што зарыентаваўся ў яе акцыі. На другі дзень ён
расказаў мне аб гэтым. Мэта яе работы здавалася быць зусім

ясна — рабіць копіі для немцаў, на жаданьне ад яе самой ці на заказ ад Жданюка, каб гэты мог паказацца актыўнасьцю.
У тагачасных умовах немагчыма было нейкае больш рашучае пастанаўленьне адносна Зоі, было праведзена на жаданьне Шкялёнка найбольш лагоднае, перанесена яе з канцылярыі Астроўскага да аддзелу Сацыяльнае дапамогі — да Сабалеўскага. На гэтым адрэзку Зоя працуе аж да капітуляцыі немцаў.
З прыбліжэньнем бальшавікоў пад Бэрлін пры помачы нямецкай, значыць, безь ніякіх асабістых клопатаў БЦР за ўсімі сваімі аддзеламі эвакуявалася на Захад Нямеччыны. У агульным ліку працаўнікоў паехала туды й Зоя, але скора вяртае ўзноў да Бэрліну й тут застаецца. Паколькі маем весткі, бальшавікі адразу, як толькі прыйшлі да Бэрліна, адразу зьнішчылі ўсіх беларусаў, якія не пасьпелі сваечасна пакінуць Бэрлін. У ліку зьнішчаных надта важны малады дзеяч — Пётра Бачак, Амельяновіч ды іншыя. Зоі не сталася нічога.
Прыхавацца ёй як немцы амаль немагчыма. Перша — фізычна адменны тып, а да таго ж і слабое валоданьне нямецкай мовы. Узноў — мо мае шчасьце.
Але тут ужо зусім нешта незразумелае. Калі пару тыдняў па капітуляцыі Бэрлін быў падзелены на акупацыйныя сэктары, усе чужынцы, якіх ня здолелі вылапаць бальшавікі, адразу перасяліліся ў заходнія сэктары, як ангельскі, амэрыканскі ці французскі. Зоя тым часам зусім сябе бясьпечна й добра пачувае ў савецкім сэктары, дзе пражывае да канца 1946-га.
Восеньню 1946 г. я выйшаў з інтэрнаваньня й даведаўся такія рэчы: у ангельскай зоне ў Ватэнштаце Сьвятаслаў Коўш, які ад самага пачатку як камэндант беларускага лягеру[13] надта пазытыўны быў пад кожным паглядам, у апошнім часе пачаў рабіць небывала нізкія інтрыгі, проста маральна й арганізацыйна пачаў развальваць лягер. Даведваюся, што гэтага самага Каўша нядаўна адведала ягоная сястра з Бэрліна, што расказвала жудасныя рэчы пра бальшавікоў і што пастанавіла перабірацца ў амэрыканскую ці ангельскую зону. Адно толькі, таму, што там, у Бэрліне аставіла „лахі“, паедзе яшчэ раз туды, прадасьць усё, а потым прыйдзе назад. Вартасных рэчаў яна не магла там мець. А „лахаў“ Коўш у той час як камэндант лягеру ёй мог даць цэлы самаход, бо ўсё УНРРАўскае майно было ў ягоных руках. А далей, ведаючы,

што там — бальшавікі, дык пускаць сястру на гэтакую небясьпеку зусім не па-братэрску. Коўш, аднак, пускае сястру і ад гэтага часу сам мяняецца.
Па нейкім часе прыходзіць вестка ў заходнія зоны Нямеччыны, што Зоя пайшла на „чорны рынак“ на Аляксандарпляц і была арыштаваная бальшавікамі й вывезеная ў невядомым кірунку. Коўш цяпер пачаў рэклямаваць мучальніцкую сьмерць сястры за Бацькаўшчыну. І ад гэтага часу пачаў праводзіць такую работу, якую можна назваць толькі бальшавіцкай агентурай, а пра сутнасьць работы, дык, думаю, Ты даволі зарыентаваны ад Пануцэвіча й Жызьнеўскіх. Таму аргумэнтаў на гэту тэму ня буду падымаць.
Коўш уключаецца як адзін з арганізатараў зарубежжа. Астроўскі ды Шчорс таксама. Ведаючы тэхніку арышту на рынку, як заключаны можа сам паведаміць? Хто тады паведаміў? І нашто? На гэта няма як дастаць адказу. Зарубежжа пачалося афармляцца, і толькі ў канцы 1947 году рэпатрыюецца ў Саюз паэтка Таполя[14] з найбліжэйшымі, а трэба зазначыць, што Коўш да іх быў надта прыхільны.
Цяпер перакінем абзэрвацыю да вашага Чыкага. Па радыёвым выступленьні Варонкі выглядала, што гэты апошні, хаця й цяжка было, але здабыўся на адвагу й парваў усе ніткі з бальшавікамі, якія яго няслаўна зьвязалі па ягонай згодзе.
І бачыў, колькі розных пасланцоў з Нью-Ёрку прыяжджала да Варонкі, зьвярнулі яго са шляху павароту на паўдарозе.
Тут разгледзеў я толькі аднаго, а да кожнага зь іх маем не асабістыя прэтэнзіі, а вылучна прынцыпова маральныя матывы, таму я сам асабіста пераконаны, што тут ніякага ня можа быць паразуменьня.
Твой Стась
8.16.1951.“

Так пачыналіся для Янкі Чарапука 50-ыя гады. Можна толькі гадаць ды здагадвацца, якім быў бы ягоны ўваход у жыцьцё й справы маладой беларускай эміграцыі. Маладой — таго, паваеннага часу.
Але другая палова пяцідзясятых была надта неспрыяльнай для ўжо немаладога дзеяча. 6 кастрычніка 1955 г. па дарозе на чарговае паседжаньне „Рыцараў Калюмбу“ Я. Чарапук быў зьбіты аўтамабілем. Апынуўся ў шпіталі са зламаным каленам.

Ляжаў больш за тры месяцы, потым, пасьля апэрацый, яго выпісалі дахаты, але само лячэньне заняло яшчэ блізу год. Магчыма, гэтае здарэньне падштурхнула Янку Чарапука да напісаньня тэстамэнту (12.12.1955):
„Я маю гонар Вас прасіць у выпадку маёй сьмерці выпаўніць ніжэйпададзенае: я хачу быць пахаваным на ўкраінскім каталіцкім цэмэнтары. Жалобнае набажэнства павінна быць адпраўлена ў рымска-каталіцкім касьцёле (нягледзячы да якой народнасьці належыць) сьвятаром пры галоўным аўтаром езуітам, а каб маліліся сьвятар-беларус і сьвятар-украінец. Я ў труне хачу быць убраны як 4 Degree Knights of Columbus. *Труна павінна быць пакрыта беларускім дзяржаўным сьцягам. <…> Пастаўце скромны помнік: Ян Чарапук-Змагар, Беларус. 1896—195…“.*
Напэўна, адчуваў, што гэта будуць пяцідзясятыя гады. Так і адбылося: Янка Чарапук-Змагар памёр 16 лістапада 1957 году.

Але мы — не таго мы шукаем,
Не таго на чужыне нам трэба…

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2001**
[image]

АЛІСА БІЗЯЕВА
выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.

Аліса Бізяева

Пачаткі беларускай сеціратуры

Беларускі Інтэрнэт пераважна складаюць негуманітарныя праекты. Усё з той прычыны, што зусім няшмат беларусаў маюць кампутары дома, яшчэ менш маюць дома выхад у Інтэрнэт — большасьць карыстаецца ім на працы, а таму беларускую вэбаўскую публіку пераважна складаюць тэхнары і спэцыялісты па кампутарах. Каб задаволіць густы большасьці, дастаткова электроннай крамы, дзе прадаюць музычныя дыскі й кнігі: фантастыку ды кампутарныя падручнікі. Прачытаць сьвежы жарт, пакінуць сябру цыдулку на адным са шматлікіх форумаў газэты „Компьютерные вести“ і паглядзець навіны дня — часта на гэтым узаемаадносіны паміж Інтэрнэтам і чалавекам заканчваюцца.

Беларусы, якія зьвязалі сваю дзейнасьць з Сусьветным Сецівам, абмяркоўваюць праблемы Інтэрнэту на сэмінарах і сустрэчах. У прыватнасьці, на беларускім Інтэрнэт-форуме, які адбыўся пры канцы мінулага году, асабліва настойліва паўтаралася, што беларуская частка Сеціва мае патрэбу ў папулярызацыі,

мэта якой далучыць да кола патэнцыйных карыстальнікаў як мага больш людзей. Такія офлайн (off-line) мерапрыемствы самі па сабе выпаўняюць ролю адукацыйных і спрыяюць пашырэньню Інтэрнэт-аўдыторыі. Але самае галоўнае для прыцягненьня людзей менавіта ў беларускі Інтэрнэт — стварэньне новых цікавых праектаў для карыстальнікаў з рознымі інтарэсамі і густамі. Калі, пачуўшы з розных крыніц, ці то ад сябра, ці з газэты, пра цуды Сусьветнага Сеціва, новы „юзэр“ нічога не знаходзіць для сябе на беларускіх сайтах, ён пойдзе чытаць расейскія.
У разьдзеле „Літаратура“ каталёг-рэйтынг „Акавіта“ паказвае толькі 19 рэсурсаў, а ў калекцыі спасылак пошукавай сыстэмы **www.all.by** увогуле няма асобнай літаратурнай рубрыкі — толькі 2 ці 3 літаратурныя спасылкі ўключаныя ў склад агульнага разьдзелу „Бібліятэкі, кнігарні, кнігі“. Параўнаньне з польскай, ці нават з украінскай і малдаўскай статыстыкай такога ж кшталту будзе не на карысьць беларусаў.
Аднак нельга не зазначыць, што апошнія тры гады адбываецца актыўны рост беларускага Сеціва. Праўда, большасьць літаратурных праектаў зробленая на энтузіязьме і на сродкі саміх аўтараў. Прычым шмат гэтых сайтаў карыстаюцца паслугамі бясплатнага гостынгу — праекты пры тутэйшых умовах вымушаныя туліцца на замежных сэрвэрах, куды з прычыны дрэннай сувязі трапіць ня кожны беларускі карыстальнік.

Зарэгістраваць і кожны год плаціць за тэхнічную падтрымку кароткага запамінальнага дамэну — імя сайту — таксама не стае грошай. Некаторыя назвы немагчыма ня тое што запомніць, набраць на кампутары без памылкі. Напрыклад, тэксты па гісторыі беларускай мовы, пісьменства і культуры ляжаць на далёкім **www.geocities.com/Paris/chateau/7855/kasic/kas.htm**. З гэтай прычыны сабраць разам усе сайты, зробленыя беларусамі, ужо амаль немагчыма. Адна з найлепшых, і пакуль унікальная, спроба гэта зрабіць — каталёг беларускіх Інтэрнэт-рэсурсаў, створаны **Мікалаем Касьцюковічам** на сайце Акадэміі навук (**www.ac.by**). На сёньня гэты рэсурс лічыцца найпаўнейшым. Тут сабраныя спасылкі на ўсе старонкі зь Беларусі і пра Беларусь, нават артыкулы электронных энцыкляпэдый, на ўсіх мовах, з усяго

сьвету. Вялізны разьдзел каталёгу прысьвечаны беларускім літаратурным рэсурсам Сеціва. Аднак няма агульнага электроннага рэсурсу па беларускай літаратуры, дзе б зьмяшчаліся ўсе тэксты беларускіх аўтараў, навіны выдавецтваў, рэцэнзіі на новыя кнігі, агляды і ўсе спасылкі на старонкі аўтараў і іншыя літаратурныя вэб-крыніцы. Беларускія афіцыйныя культурніцкія ўстановы не сьпяшаюцца зьдзейсьніць гэты праект, які быў бы вельмі важнай справай. Зусім нядаўна сайт сэрыі „Беларускі кнігазбор“ зьмяніў свой адрас www.wuwien.ac.at/groups/belarus/bk на больш кароткае **bk.knihi.com**. Іх старонка не разьлічана на беларускіх чытачоў кніг выдавецтва, яна зьмяшчае заклік да інвэстараў дапамагчы з выданьнем наступнай кнігі: „Рыхтуецца да друку зборнік Наталлі Арсенневай. Будзем вельмі ўдзячныя дапамозе як фінансавай, так і тэкставай (лісты паэткі і г. д.)“.
Некаторыя з кніг, якія ўжо ёсьць у продажы, прадстаўленыя ў электронным варыянце, прамоцыя астатніх абмяжоўваецца анатацыяй зьместу. Дызайн сайту вельмі просты, функцыянальны. Такі, як рабілі напачатку WWW, калі магчымасьці праграмаў для вёрсткі і рэпрадукцыі вэб-старонак былі нашмат болей абмежаваныя, чым цяпер.
Найбольш поўны электронны збор беларускіх літаратурных твораў „Беларуская палічка“ (**knihi.com**) падтрымліваецца Андрусем Жвіром зь Вены, гэта яшчэ адзін яго праект, апроч сайту „Беларускага кнігазбору“. Амаль гатовы новы дызайн „Беларускай палічкі“. На сайце ў катэгорыях Проза, Паэзія, Гісторыя й палітыка, Філязофія, Мова, Мастацтва, Казкі, Рэлігія й міталёгія, Замежная мастацкая літаратура, Іншамоўныя творы і пераклады, Нашы славутыя землякі разьмешчаныя некалькі соцен літаратурных крыніц, і іх колькасьць павялічваецца амаль штодня. Штотыдзень сайт абнаўляецца новымі тэкстамі і лінкамі. Вось тыповы набор абнаўленьняў (за 14 сакавіка): з новых тэкстаў — пераклад „*Роздумаў*“ Марка Аўрэліюса; *Эвангельле паводле Лукаша*; „*Успаміны пра Івана Луцкевіча*“ Максіма Гарэцкага; „*Птушкі*“ Бруна Шульца; Тэкст Берасьцейскай уніі 1596 г.; апавяданьне Яна Чачкоўскага „*Guten Tag, Alex!..*“; кніга Энтані Сьміта „*Нацыяналізм у XX стагоддзі*“; тэкст „*Аняменне*“ з кнігі „Знішчэнне беларускай мовы: у кантэксце гісторыі і палітыкі“; што датычыць старонак у каталозе, самая цікавая з апошніх — Дыскусійная група

„Мовазнаўства“ (**groups.yahoo.com/group/movaznaustva**). Многія беларускія рэсурсы ня толькі зробленыя на расейскай мове, яны наўмысна арыентуюцца на Расею, імкнуцца стаць часткай Рунэту. Адна з прычын — фінансавая: фундатары і стваральнікі беларускіх праектаў спадзяюцца знайсьці інвэстараў сярод расейскіх капіталістаў. Беларусаў вабіць і шматлікая расейская аўдыторыя.
Расейскамоўная вэрсія не адзіная ўмова, каб трапіць на расейскую вэб-арэну. Гэта павінен быць сапраўды варты ўвагі рэсурс, якіх мала. І з дапамогаю Інтэрнэту яны распавядаюць пра беларускую культуру. Збольшага расейскамоўны альманах „Клінамэн“ (**www.klinamen.com**) зьмяшчае матэрыялы, якія трапляюць і ў кола інтарэсаў расейскай аўдыторыі. Але ў ім беларускія думкі пра літаратуру і мастацтва, беларускі погляд на зьявы культурніцкай прасторы, разважаньні пра адметнасьці беларускага мысьленьня і ўспрыманьня твораў, якія зьявіліся ў гэтай прасторы. Сярод тэкстаў часам зьяўляюцца матэрыялы па-беларуску. Рубрыкі сайту: *четвертая критика, дистанционный смотритель, point of no return, инфра_философия, аллегории чтения* і іншыя — акумулюць тэксты беларускіх культуролягаў і філёзафаў. Рэдактарамі альманаху зьяўляюцца: Дмитрий Король, Арсен Меликян, Владислав Софронов-Антомони и Дунаев. Тэксты „Клінамэну“ балянсуюць на мяжы літаратуры, крытыкі, філязофіі. Аўтары абмяркоўваць тэмы, якія нельга назваць актуальнымі і своечасовымі для беларускага грамадзтва, але можна лічыць нагодай і імпульсам для вобразнага і суб’ектыўнага асэнсаваньня нейкай цікавай зьявы рэчаіснасьці, якая зьяўляецца тыповай, адпавядае менавіта гэтаму часу ў беларускай прасторы.

Альміра Ўсманова ў дасьледаваньні „Насилие как культурная метафора“ робіць выснову: „*Насилия не существует ... иначе, как в репрезентации*“. Дзьмітры Кароль і Арсэн Мелікян дасьледуюць асаблівасьці беларускага мысьленьня ў рабоце „Политика разрывов. Слабое мышление в эпоху кризиса“ і вызначаюць заканамернасьць: „*Беларусь и Армения: постсоветские близнецы. В нижеприведенных заметках наше внимание приковывает отношение власть-политика, которому присущ высокотехнологический характер функционирования*“. Агляд некалькіх кніг Уладзіслаў Сафронаў-Антамоні называе

„Путеводитель по сегодня“. Аўтара зацікавіла тое, што *„…эти книги настолько выбиваются изо всех рамок, что их невозможно сопоставить с той традицией и школой, к которой каждая из них принадлежит“*. Альманах „Клінамен“ друкуе таксама дасьледаваньні гісторыі сучаснага мастацтва, пераклады вядомых заходніх філёзафаў і людзей мастацтва, сярод якіх Жан Бадрыяр, Люк Брэсон, Жан Бары, Мішэль Дэлён, Жыль Дэлёз; рэцэнзіі на сучасныя фільмы і кнігі.

Вядома, што ў Інтэрнэце найбольшым попытам карыстаецца фантастычная бэлетрыстыка. У электроннай краме **OZ.by** большасьць прададзеных кніг складае літаратура такога кшталту. Вось жа, пад крылом „Адкрытага кантакту“ (**www.ok.open.by**) створаны сайт для аматараў фантастыкі і фэнтэзі (**fantasy.open.by**). Рубрыка „Фантасты Беларусі: біяграфія, бібліяграфія, выбранае“ зьмяшчае матэрыялы пра тры хвалі беларускай фантастыкі. Называюць заснавальнікам беларускай фантастычнай літаратуры і адносяць да першай хвалі пісьменьніка Янку Маўра, у прыватнасьці яго раманы „Чалавек ідзе“ (1925), „Фантамабіль прафэсара Цылякоўскага“ (1954) і апавяданьне на расейскай мове „Путешествие в преисподнюю“ (1958). Да прадстаўнікоў другой хвалі (60-я — пачатак 80-х гадоў) адносяць Мікалая Гамолку, Навума Цыпіса, Уладзімера Шыціка. Трэцяя хваля прадстаўлена значна большай колькасьцю беларускіх аўтараў, якія пісалі ў 80-х — 90х гадах. Адзін зь іх, Аляксандар Патупа, як паведамляе артыкул, акрамя літаратурнай дзейнасьці ў галіне навуковай фантастыкі займаўся футуралягічным прагназаваньнем напрамкаў разьвіцця грамадзка-эканамічнага жыцьця Беларусі. Расейскамоўная „Белорусская деловая газета“ на сваім сайце стварыла невялікую кніжную палічку (**www.bdg.minsk.by/culture**), на якой разьмяшчаюцца неапублікаваныя творы беларускіх аўтараў. Да выхаду ў сьвет у папяровым варыянце на гэтым сайце ляжала і кніга Дзьмітрыя Падбярэскага „Саксафон Чынгісхана“.

Аднак усё ж такі сярод гуманітарных праектаў, якія надаюць увагу пераважна зьместу — кантэнту, беларускамоўныя атрымліваюцца больш цікавымі і пасьпяховымі. Вакол іх звычайна хутка ствараюцца так званыя „online communities“ (віртуальныя супольнасьці), што лічыцца паказьнікам дамэтнасьці рэсурсу, які ня проста займае электронную

прастору, але задавальняе нейкую патрэбу пэўнай аўдыторыі. „Карчма ў старога Язэпа“, якая была ўжо займела шмат прыхільнікаў, асабліва спаміж журналістаў, зноў адкрылася на сайце **www.jazep.f2s.com**. Цудоўная электронная бібліятэка на „Беларускай палічцы“ (**knihi.com**) ужо стварыла каштоўную скарбніцу беларускіх кніг і працягвае яе павялічваць. Асаблівай увагі заслугоўвае беларускі партал і каталёг „Дзед Талаш“ (**dt.home.by**), які нядаўна займеў новую структуру і дызайн. Асабліва ўражвае яго сталая рубрыка „Лісты зь Ніадкуль“, у якой Андранік Антанян робіць публіцыстычныя агляды, публікуе свае разважаньні, уражаньні і назіраньні пра беларускае жыцьцё і навакольны сьвет. Аўтар зь „ніадкуль“ выцягвае на паверхню тэмы зусім нечаканыя, напрыклад, разважае пра выміраючыя прафэсіі: камінароў, мастакоў афішаў і фатографаў фотаатэлье; заклікае пісаць нармальныя сучасныя казкі для дзяцей пра Інтэрнэт і кампутары і, дарэчы, разважае на нашую тэму — „пра магчымы ўдзел беларускіх літаратараў у разьвіцьці зоны **.by**“. Ён піша, што „*многім літаратарам хочацца як мага прасьцейшым шляхам знайсьці свайго чытача сёньня, і зусім не турбуе праблема, ці ўвойдуць іхныя творы праз 50 гадоў у школьныя праграмы... Пару гадоў таму на старонках „Нашай Нівы“ абвяшчалася пра пачатак інцярнэт-рэвалюцыі, але вынікаў гэтае абвяшчэньне не дало, апрача таго паўздохлага нашаніўскага хамяка. Беларускія выдаўцы як адзін перакананыя, што онлайнавая публікацыя тэксту зьменшыць і без таго мізэрную колькасьць ягоных пакупнікоў. Маўляў, на халеру чалавеку плаціць грошы за кніжку, калі ён можа скачаць яе на халяву?.. Калі кажаш, што онлайнавая публікацыя — гэта нармальны, а да таго ж амаль* ***бясплатны*** *рэклямны інструмэнт на кніжным рынку, які даволі ўдала функцыянуе, то на цябе глядзяць як на ідыёта. У Беларусі ніхто ў такія пэрспэктывы разьвіцьця ня верыць. А таму мала хто займаецца*“.

У прыклад таго, што праблема ўсё ж такі пачала вырашацца, спадар Антанян прыводзіць пэрсанальную старонку Адама Глёбуса (**adam-globus.com**), на якой нядаўна адкрыўся форум. На сайце ёсьць усе творы з кнігі „Тэксты“, якую яшчэ можна купіць у кнігарнях, — аўтар, здаецца, не баіцца, што праз гэта паменшыцца колькасьць прададзеных асобнікаў. Паглядзець на эратычныя малюнкі спадара Глёбуса, якія нядаўна былі

разьмешчаныя на сайце, сюды хоць раз прыйдзе кожны. Можа і з „Дамавікамэрону“ які разьдзел прачытае (ці перачытае). Добра, калі б усе творчыя людзі Беларусі сваю прагу да самавыяўленьня ператваралі ў беларускі кантэнт, якога не хапае ня толькі літаратурным сайтам, а ўвогуле беларускаму Інтэрнэту. Але ствараць свае старонкі — хай з дапамогаю простага Front Page — могуць ня ўсе. Вельмі істотна адчуваецца адсутнасьць абагульняльнага літаратурнага Інтэрнэт-рэсурсу, які б ствараў умовы для зносін паміж беларускімі аўтарамі і чытачамі, для выказваньня думак філёзафамі, крытыкамі. Інтэрнэт дае магчымасьць супрацоўніцтва, дапамагае людзям сабрацца для рэалізацыі супольнай справы. Ён спрыяе інтэрактыўнай камунікацыі — дыялёгу, у якім можа нарадзіцца шмат новых ідэй. Пакуль большасьць беларускіх літаратурных сайтаў — ня болей, чым люстэркі, якія пераводзяць на электронныя носьбіты тое, што ўжо ёсьць у друкаваным выглядзе. Некаторыя тэксты трапляюць у Інтэрнэт на старонках электронных вэрсій папяровых выданьняў. На сайце часапісу „Калосьсе“ (**kalossie.freeservers.com**) ёсьць усе аповесьці, апавяданьні і пераклады, што былі на яго старонках. Тэксты з ужо спрададзеных нумароў часапісу „ARCHE“ (**arche.home.by**) таксама прадстаўленыя ў Інтэрнэце.

На беларускіх сайтах рэдка калі знойдзеш рэакцыю на падзеі літаратурнага жыцьця — пакуль што няма месца, дзе можна было б зьмяшчаць такія матэрыялы рэгулярна, даводзіцца рабіць адмысловыя сайты ў кожным асобным выпадку. У рамках культурнага праекту „Новы горад“ (**www.nsys.by/newtown**) існуе старонка „4 + 4 + 4“ (**poetry.nsys.by**), прысьвечаная беларуска-швэдзкай сустрэчы паэтаў, дзе надрукаваныя творы беларускіх і швэдзкіх (перакладзеных беларусамі) паэтаў і пісьменьнікаў. Удзельнікі з швэдзкага боку — Агнэта Плеел, Сіла Наўман, паэты — Крыстафэр Леандоэр, Кенэт Клемэц; зь беларускага — Алесь Разанаў, Сяргей Законьнікаў, Ірына Туровіч, Алесь Туровіч, Серж Мінскевіч, Ніна Мацяш, Зьміцер Вішнёў.

Справа стварэньня бібліятэкі вядомых і невядомых беларускіх твораў у электроннай прасторы цяпер больш-менш рэалізуецца намаганьнямі асобных энтузіястаў, але гэта яшчэ ня ўсё, што Інтэрнэт можа даць для разьвіцьця нацыянальнай літаратуры.

Мастакі і пісьменьнікі ўсяго сьвету выкарыстоўваюць магчымасьці Інтэрнэту ў сваёй творчасьці. Некалькі год таму зьявілася паняцьце „сеціратура“ (ці літ-нэт), але ў Беларусі яшчэ няма твораў, якія можна было б залічыць да новага напрамку, галоўныя ідэі якога — глябалізацыя, касмапалітызм літаратуры, каапэрацыя мастакоў і выкарыстаньне апошніх тэхнічных вынаходак.
На жаль, няма беларускіх твораў, якія выкарыстоўвалі б асаблівасьці Інтэрнэт-прасторы як сродак выяўленьня. Летась нямала шуму нарабіла віртуальная гераіня Белнэту — Фанатка. На сайце **dfpoint.nsys.by/girl** ляжаць яе вершы, дзёньнік, дзе ў якасьці галоўных герояў фігуруюць вядомыя постаці Байнэту, і стылізаваная пад міліцэйскі пратакол гісторыя яе сьмерці. Але гэткія спробы стварыць электронныя літаратурныя тэксты пакуль што не выходзяць за межы зацікаўленьняў беларускай Інтэрнэт-тусоўкі й ня маюць рэгулярнага характару.
Аднак усё зьмяняецца, асабліва хутка ў Інтэрнэце, які разрастаецца стыхійна і вокамгненна. За гэты час у Белнэце несумненна зьяўляліся новыя рэсурсы, і, хто ведае, можа пакуль матэрыял рыхтаваўся да друку, хтосьці пачаў пісаць беларускі гіпэрраман ці дзіцячую казку пра Інтэрнэт і кампутары...

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **30-07-2001**
[image]

АЛІСА БІЗЯЕВА
выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.

Аліса Бізяева

Пачаткі беларускай сеціратуры

Беларускі Інтэрнэт пераважна складаюць негуманітарныя праекты. Усё з той прычыны, што зусім няшмат беларусаў маюць кампутары дома, яшчэ менш маюць дома выхад у Інтэрнэт — большасьць карыстаецца ім на працы, а таму беларускую вэбаўскую публіку пераважна складаюць тэхнары і спэцыялісты па кампутарах. Каб задаволіць густы большасьці, дастаткова электроннай крамы, дзе прадаюць музычныя дыскі й кнігі: фантастыку ды кампутарныя падручнікі. Прачытаць сьвежы жарт, пакінуць сябру цыдулку на адным са шматлікіх форумаў газэты „Компьютерные вести“ і паглядзець навіны дня — часта на гэтым узаемаадносіны паміж Інтэрнэтам і чалавекам заканчваюцца.

Беларусы, якія зьвязалі сваю дзейнасьць з Сусьветным Сецівам, абмяркоўваюць праблемы Інтэрнэту на сэмінарах і сустрэчах. У прыватнасьці, на беларускім Інтэрнэт-форуме, які адбыўся пры канцы мінулага году, асабліва настойліва паўтаралася, што беларуская частка Сеціва мае патрэбу ў папулярызацыі,

мэта якой далучыць да кола патэнцыйных карыстальнікаў як мага больш людзей. Такія офлайн (off-line) мерапрыемствы самі па сабе выпаўняюць ролю адукацыйных і спрыяюць пашырэньню Інтэрнэт-аўдыторыі. Але самае галоўнае для прыцягненьня людзей менавіта ў беларускі Інтэрнэт — стварэньне новых цікавых праектаў для карыстальнікаў з рознымі інтарэсамі і густамі. Калі, пачуўшы з розных крыніц, ці то ад сябра, ці з газэты, пра цуды Сусьветнага Сеціва, новы „юзэр“ нічога не знаходзіць для сябе на беларускіх сайтах, ён пойдзе чытаць расейскія.
У разьдзеле „Літаратура“ каталёг-рэйтынг „Акавіта“ паказвае толькі 19 рэсурсаў, а ў калекцыі спасылак пошукавай сыстэмы **www.all.by** увогуле няма асобнай літаратурнай рубрыкі — толькі 2 ці 3 літаратурныя спасылкі ўключаныя ў склад агульнага разьдзелу „Бібліятэкі, кнігарні, кнігі“. Параўнаньне з польскай, ці нават з украінскай і малдаўскай статыстыкай такога ж кшталту будзе не на карысьць беларусаў.
Аднак нельга не зазначыць, што апошнія тры гады адбываецца актыўны рост беларускага Сеціва. Праўда, большасьць літаратурных праектаў зробленая на энтузіязьме і на сродкі саміх аўтараў. Прычым шмат гэтых сайтаў карыстаюцца паслугамі бясплатнага гостынгу — праекты пры тутэйшых умовах вымушаныя туліцца на замежных сэрвэрах, куды з прычыны дрэннай сувязі трапіць ня кожны беларускі карыстальнік.

Зарэгістраваць і кожны год плаціць за тэхнічную падтрымку кароткага запамінальнага дамэну — імя сайту — таксама не стае грошай. Некаторыя назвы немагчыма ня тое што запомніць, набраць на кампутары без памылкі. Напрыклад, тэксты па гісторыі беларускай мовы, пісьменства і культуры ляжаць на далёкім **www.geocities.com/Paris/chateau/7855/kasic/kas.htm**. З гэтай прычыны сабраць разам усе сайты, зробленыя беларусамі, ужо амаль немагчыма. Адна з найлепшых, і пакуль унікальная, спроба гэта зрабіць — каталёг беларускіх Інтэрнэт-рэсурсаў, створаны **Мікалаем Касьцюковічам** на сайце Акадэміі навук (**www.ac.by**). На сёньня гэты рэсурс лічыцца найпаўнейшым. Тут сабраныя спасылкі на ўсе старонкі зь Беларусі і пра Беларусь, нават артыкулы электронных энцыкляпэдый, на ўсіх мовах, з усяго

сьвету. Вялізны разьдзел каталёгу прысьвечаны беларускім літаратурным рэсурсам Сеціва. Аднак няма агульнага электроннага рэсурсу па беларускай літаратуры, дзе б зьмяшчаліся ўсе тэксты беларускіх аўтараў, навіны выдавецтваў, рэцэнзіі на новыя кнігі, агляды і ўсе спасылкі на старонкі аўтараў і іншыя літаратурныя вэб-крыніцы. Беларускія афіцыйныя культурніцкія ўстановы не сьпяшаюцца зьдзейсьніць гэты праект, які быў бы вельмі важнай справай. Зусім нядаўна сайт сэрыі „Беларускі кнігазбор“ зьмяніў свой адрас www.wuwien.ac.at/groups/belarus/bk на больш кароткае **bk.knihi.com**. Іх старонка не разьлічана на беларускіх чытачоў кніг выдавецтва, яна зьмяшчае заклік да інвэстараў дапамагчы з выданьнем наступнай кнігі: „Рыхтуецца да друку зборнік Наталлі Арсенневай. Будзем вельмі ўдзячныя дапамозе як фінансавай, так і тэкставай (лісты паэткі і г. д.)“.
Некаторыя з кніг, якія ўжо ёсьць у продажы, прадстаўленыя ў электронным варыянце, прамоцыя астатніх абмяжоўваецца анатацыяй зьместу. Дызайн сайту вельмі просты, функцыянальны. Такі, як рабілі напачатку WWW, калі магчымасьці праграмаў для вёрсткі і рэпрадукцыі вэб-старонак былі нашмат болей абмежаваныя, чым цяпер.
Найбольш поўны электронны збор беларускіх літаратурных твораў „Беларуская палічка“ (**knihi.com**) падтрымліваецца Андрусем Жвіром зь Вены, гэта яшчэ адзін яго праект, апроч сайту „Беларускага кнігазбору“. Амаль гатовы новы дызайн „Беларускай палічкі“. На сайце ў катэгорыях Проза, Паэзія, Гісторыя й палітыка, Філязофія, Мова, Мастацтва, Казкі, Рэлігія й міталёгія, Замежная мастацкая літаратура, Іншамоўныя творы і пераклады, Нашы славутыя землякі разьмешчаныя некалькі соцен літаратурных крыніц, і іх колькасьць павялічваецца амаль штодня. Штотыдзень сайт абнаўляецца новымі тэкстамі і лінкамі. Вось тыповы набор абнаўленьняў (за 14 сакавіка): з новых тэкстаў — пераклад „*Роздумаў*“ Марка Аўрэліюса; *Эвангельле паводле Лукаша*; „*Успаміны пра Івана Луцкевіча*“ Максіма Гарэцкага; „*Птушкі*“ Бруна Шульца; Тэкст Берасьцейскай уніі 1596 г.; апавяданьне Яна Чачкоўскага „*Guten Tag, Alex!..*“; кніга Энтані Сьміта „*Нацыяналізм у XX стагоддзі*“; тэкст „*Аняменне*“ з кнігі „Знішчэнне беларускай мовы: у кантэксце гісторыі і палітыкі“; што датычыць старонак у каталозе, самая цікавая з апошніх — Дыскусійная група

„Мовазнаўства“ (**groups.yahoo.com/group/movaznaustva**). Многія беларускія рэсурсы ня толькі зробленыя на расейскай мове, яны наўмысна арыентуюцца на Расею, імкнуцца стаць часткай Рунэту. Адна з прычын — фінансавая: фундатары і стваральнікі беларускіх праектаў спадзяюцца знайсьці інвэстараў сярод расейскіх капіталістаў. Беларусаў вабіць і шматлікая расейская аўдыторыя.
Расейскамоўная вэрсія не адзіная ўмова, каб трапіць на расейскую вэб-арэну. Гэта павінен быць сапраўды варты ўвагі рэсурс, якіх мала. І з дапамогаю Інтэрнэту яны распавядаюць пра беларускую культуру. Збольшага расейскамоўны альманах „Клінамэн“ (**www.klinamen.com**) зьмяшчае матэрыялы, якія трапляюць і ў кола інтарэсаў расейскай аўдыторыі. Але ў ім беларускія думкі пра літаратуру і мастацтва, беларускі погляд на зьявы культурніцкай прасторы, разважаньні пра адметнасьці беларускага мысьленьня і ўспрыманьня твораў, якія зьявіліся ў гэтай прасторы. Сярод тэкстаў часам зьяўляюцца матэрыялы па-беларуску. Рубрыкі сайту: *четвертая критика, дистанционный смотритель, point of no return, инфра_философия, аллегории чтения* і іншыя — акумулюць тэксты беларускіх культуролягаў і філёзафаў. Рэдактарамі альманаху зьяўляюцца: Дмитрий Король, Арсен Меликян, Владислав Софронов-Антомони и Дунаев. Тэксты „Клінамэну“ балянсуюць на мяжы літаратуры, крытыкі, філязофіі. Аўтары абмяркоўваць тэмы, якія нельга назваць актуальнымі і своечасовымі для беларускага грамадзтва, але можна лічыць нагодай і імпульсам для вобразнага і суб’ектыўнага асэнсаваньня нейкай цікавай зьявы рэчаіснасьці, якая зьяўляецца тыповай, адпавядае менавіта гэтаму часу ў беларускай прасторы.

Альміра Ўсманова ў дасьледаваньні „Насилие как культурная метафора“ робіць выснову: „*Насилия не существует ... иначе, как в репрезентации*“. Дзьмітры Кароль і Арсэн Мелікян дасьледуюць асаблівасьці беларускага мысьленьня ў рабоце „Политика разрывов. Слабое мышление в эпоху кризиса“ і вызначаюць заканамернасьць: „*Беларусь и Армения: постсоветские близнецы. В нижеприведенных заметках наше внимание приковывает отношение власть-политика, которому присущ высокотехнологический характер функционирования*“. Агляд некалькіх кніг Уладзіслаў Сафронаў-Антамоні называе

„Путеводитель по сегодня“. Аўтара зацікавіла тое, што *„…эти книги настолько выбиваются изо всех рамок, что их невозможно сопоставить с той традицией и школой, к которой каждая из них принадлежит“*. Альманах „Клінамен“ друкуе таксама дасьледаваньні гісторыі сучаснага мастацтва, пераклады вядомых заходніх філёзафаў і людзей мастацтва, сярод якіх Жан Бадрыяр, Люк Брэсон, Жан Бары, Мішэль Дэлён, Жыль Дэлёз; рэцэнзіі на сучасныя фільмы і кнігі.

Вядома, што ў Інтэрнэце найбольшым попытам карыстаецца фантастычная бэлетрыстыка. У электроннай краме **OZ.by** большасьць прададзеных кніг складае літаратура такога кшталту. Вось жа, пад крылом „Адкрытага кантакту“ (**www.ok.open.by**) створаны сайт для аматараў фантастыкі і фэнтэзі (**fantasy.open.by**). Рубрыка „Фантасты Беларусі: біяграфія, бібліяграфія, выбранае“ зьмяшчае матэрыялы пра тры хвалі беларускай фантастыкі. Называюць заснавальнікам беларускай фантастычнай літаратуры і адносяць да першай хвалі пісьменьніка Янку Маўра, у прыватнасьці яго раманы „Чалавек ідзе“ (1925), „Фантамабіль прафэсара Цылякоўскага“ (1954) і апавяданьне на расейскай мове „Путешествие в преисподнюю“ (1958). Да прадстаўнікоў другой хвалі (60-я — пачатак 80-х гадоў) адносяць Мікалая Гамолку, Навума Цыпіса, Уладзімера Шыціка. Трэцяя хваля прадстаўлена значна большай колькасьцю беларускіх аўтараў, якія пісалі ў 80-х — 90х гадах. Адзін зь іх, Аляксандар Патупа, як паведамляе артыкул, акрамя літаратурнай дзейнасьці ў галіне навуковай фантастыкі займаўся футуралягічным прагназаваньнем напрамкаў разьвіцця грамадзка-эканамічнага жыцьця Беларусі. Расейскамоўная „Белорусская деловая газета“ на сваім сайце стварыла невялікую кніжную палічку (**www.bdg.minsk.by/culture**), на якой разьмяшчаюцца неапублікаваныя творы беларускіх аўтараў. Да выхаду ў сьвет у папяровым варыянце на гэтым сайце ляжала і кніга Дзьмітрыя Падбярэскага „Саксафон Чынгісхана“.

Аднак усё ж такі сярод гуманітарных праектаў, якія надаюць увагу пераважна зьместу — кантэнту, беларускамоўныя атрымліваюцца больш цікавымі і пасьпяховымі. Вакол іх звычайна хутка ствараюцца так званыя „online communities“ (віртуальныя супольнасьці), што лічыцца паказьнікам дамэтнасьці рэсурсу, які ня проста займае электронную

прастору, але задавальняе нейкую патрэбу пэўнай аўдыторыі. „Карчма ў старога Язэпа“, якая была ўжо займела шмат прыхільнікаў, асабліва спаміж журналістаў, зноў адкрылася на сайце **www.jazep.f2s.com**. Цудоўная электронная бібліятэка на „Беларускай палічцы“ (**knihi.com**) ужо стварыла каштоўную скарбніцу беларускіх кніг і працягвае яе павялічваць. Асаблівай увагі заслугоўвае беларускі партал і каталёг „Дзед Талаш“ (**dt.home.by**), які нядаўна займеў новую структуру і дызайн. Асабліва ўражвае яго сталая рубрыка „Лісты зь Ніадкуль“, у якой Андранік Антанян робіць публіцыстычныя агляды, публікуе свае разважаньні, уражаньні і назіраньні пра беларускае жыцьцё і навакольны сьвет. Аўтар зь „ніадкуль“ выцягвае на паверхню тэмы зусім нечаканыя, напрыклад, разважае пра выміраючыя прафэсіі: камінароў, мастакоў афішаў і фатографаў фотаатэлье; заклікае пісаць нармальныя сучасныя казкі для дзяцей пра Інтэрнэт і кампутары і, дарэчы, разважае на нашую тэму — „пра магчымы ўдзел беларускіх літаратараў у разьвіцьці зоны **.by**“. Ён піша, што „*многім літаратарам хочацца як мага прасьцейшым шляхам знайсьці свайго чытача сёньня, і зусім не турбуе праблема, ці ўвойдуць іхныя творы праз 50 гадоў у школьныя праграмы... Пару гадоў таму на старонках „Нашай Нівы“ абвяшчалася пра пачатак інцярнэт-рэвалюцыі, але вынікаў гэтае абвяшчэньне не дало, апрача таго паўздохлага нашаніўскага хамяка. Беларускія выдаўцы як адзін перакананыя, што онлайнавая публікацыя тэксту зьменшыць і без таго мізэрную колькасьць ягоных пакупнікоў. Маўляў, на халеру чалавеку плаціць грошы за кніжку, калі ён можа скачаць яе на халяву?.. Калі кажаш, што онлайнавая публікацыя — гэта нармальны, а да таго ж амаль* ***бясплатны*** *рэклямны інструмэнт на кніжным рынку, які даволі ўдала функцыянуе, то на цябе глядзяць як на ідыёта. У Беларусі ніхто ў такія пэрспэктывы разьвіцьця ня верыць. А таму мала хто займаецца*“.

У прыклад таго, што праблема ўсё ж такі пачала вырашацца, спадар Антанян прыводзіць пэрсанальную старонку Адама Глёбуса (**adam-globus.com**), на якой нядаўна адкрыўся форум. На сайце ёсьць усе творы з кнігі „Тэксты“, якую яшчэ можна купіць у кнігарнях, — аўтар, здаецца, не баіцца, што праз гэта паменшыцца колькасьць прададзеных асобнікаў. Паглядзець на эратычныя малюнкі спадара Глёбуса, якія нядаўна былі

разьмешчаныя на сайце, сюды хоць раз прыйдзе кожны. Можа і з „Дамавікамэрону“ які разьдзел прачытае (ці перачытае). Добра, калі б усе творчыя людзі Беларусі сваю прагу да самавыяўленьня ператваралі ў беларускі кантэнт, якога не хапае ня толькі літаратурным сайтам, а ўвогуле беларускаму Інтэрнэту. Але ствараць свае старонкі — хай з дапамогаю простага Front Page — могуць ня ўсе. Вельмі істотна адчуваецца адсутнасьць абагульняльнага літаратурнага Інтэрнэт-рэсурсу, які б ствараў умовы для зносін паміж беларускімі аўтарамі і чытачамі, для выказваньня думак філёзафамі, крытыкамі. Інтэрнэт дае магчымасьць супрацоўніцтва, дапамагае людзям сабрацца для рэалізацыі супольнай справы. Ён спрыяе інтэрактыўнай камунікацыі — дыялёгу, у якім можа нарадзіцца шмат новых ідэй. Пакуль большасьць беларускіх літаратурных сайтаў — ня болей, чым люстэркі, якія пераводзяць на электронныя носьбіты тое, што ўжо ёсьць у друкаваным выглядзе. Некаторыя тэксты трапляюць у Інтэрнэт на старонках электронных вэрсій папяровых выданьняў. На сайце часапісу „Калосьсе“ (**kalossie.freeservers.com**) ёсьць усе аповесьці, апавяданьні і пераклады, што былі на яго старонках. Тэксты з ужо спрададзеных нумароў часапісу „ARCHE“ (**arche.home.by**) таксама прадстаўленыя ў Інтэрнэце.

На беларускіх сайтах рэдка калі знойдзеш рэакцыю на падзеі літаратурнага жыцьця — пакуль што няма месца, дзе можна было б зьмяшчаць такія матэрыялы рэгулярна, даводзіцца рабіць адмысловыя сайты ў кожным асобным выпадку. У рамках культурнага праекту „Новы горад“ (**www.nsys.by/newtown**) існуе старонка „4 + 4 + 4“ (**poetry.nsys.by**), прысьвечаная беларуска-швэдзкай сустрэчы паэтаў, дзе надрукаваныя творы беларускіх і швэдзкіх (перакладзеных беларусамі) паэтаў і пісьменьнікаў. Удзельнікі з швэдзкага боку — Агнэта Плеел, Сіла Наўман, паэты — Крыстафэр Леандоэр, Кенэт Клемэц; зь беларускага — Алесь Разанаў, Сяргей Законьнікаў, Ірына Туровіч, Алесь Туровіч, Серж Мінскевіч, Ніна Мацяш, Зьміцер Вішнёў.

Справа стварэньня бібліятэкі вядомых і невядомых беларускіх твораў у электроннай прасторы цяпер больш-менш рэалізуецца намаганьнямі асобных энтузіястаў, але гэта яшчэ ня ўсё, што Інтэрнэт можа даць для разьвіцьця нацыянальнай літаратуры.

Мастакі і пісьменьнікі ўсяго сьвету выкарыстоўваюць магчымасьці Інтэрнэту ў сваёй творчасьці. Некалькі год таму зьявілася паняцьце „сеціратура“ (ці літ-нэт), але ў Беларусі яшчэ няма твораў, якія можна было б залічыць да новага напрамку, галоўныя ідэі якога — глябалізацыя, касмапалітызм літаратуры, каапэрацыя мастакоў і выкарыстаньне апошніх тэхнічных вынаходак.
На жаль, няма беларускіх твораў, якія выкарыстоўвалі б асаблівасьці Інтэрнэт-прасторы як сродак выяўленьня. Летась нямала шуму нарабіла віртуальная гераіня Белнэту — Фанатка. На сайце **dfpoint.nsys.by/girl** ляжаць яе вершы, дзёньнік, дзе ў якасьці галоўных герояў фігуруюць вядомыя постаці Байнэту, і стылізаваная пад міліцэйскі пратакол гісторыя яе сьмерці. Але гэткія спробы стварыць электронныя літаратурныя тэксты пакуль што не выходзяць за межы зацікаўленьняў беларускай Інтэрнэт-тусоўкі й ня маюць рэгулярнага характару.
Аднак усё зьмяняецца, асабліва хутка ў Інтэрнэце, які разрастаецца стыхійна і вокамгненна. За гэты час у Белнэце несумненна зьяўляліся новыя рэсурсы, і, хто ведае, можа пакуль матэрыял рыхтаваўся да друку, хтосьці пачаў пісаць беларускі гіпэрраман ці дзіцячую казку пра Інтэрнэт і кампутары...

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **30-07-2001**
[image]

Андрэй Хадановіч

Засьпетыя на Гарацым. Тры стратэгіі будаўніцтва “Помнікаў” (Пушкін, Міцкевіч, Бадлер ды іншыя)

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ паэт, перакладчык паэзіі, выкладчык БДУ, аўтар артыкулу "Паляваньне на клясыкаў. Нататкі на палёх перакладаў Бадлера, Малярмэ, Ейтса" ў "Скарыне" № 6-2000.

I

Тэма “несьмяротнай славы паэта” ўзьнікае ў глыбокай старажытнасьці. Вялікую даніну аддалі ёй антычныя паэты, прычым ня толькі лацінскія, але й грэцкія. Ды ўсё-ткі архетыпам самарэфлексіі паэта пра сваю творчасьць і заслужаную славу стаецца творчасьць рымскага паэта Квінта Гарацага Фляка, у якога адразу некалькі паэтычных тэкстаў распрацоўваюць матывы “паэтычнай несьмяротнасьці”. Найвядомейшы зь іх — трыццаты твор з трэцяе кнігі одаў, што называецца „Да Мэльпамэны”, а філёлягам-няклясыкам больш

вядомы як „Помнік”, — аказаўся настолькі ўзорна-паказальным, настолькі поўна ўвасобіў у сабе гэтыя матывы, што пачаў выконваць ролю пэўнага першаўзору, на які арыентаваўся шэраг паэтычных геніяў і, напэўна, цэлы легіён графаманаў. Прывядзем тэкст оды ў нашым перакладзе:

Помнік я збудаваў трывалейшы за медзь,
Высачэйшы за высь велічных пірамід.
Ні навалы залеў, ні Аквілёна моц
Не зруйнуюць яго, ані бясконцы бег
Незьлічоных гадоў, хуткага часу плынь!
Бо ня цалкам памру! Лепшае, што ўва мне,
Не спазнае труны: слава мая расьці
Вечна будзе паміж спадчыньнікаў, пакуль
Ўсходзіць на Капітоль зь дзевай маўклівай жрэц.
Дзе ў бязводным краі стэпавым людам Даўн
Валадарыў, дзе мчыць воды свае Аўфід,
Скажуць так пра мяне: нізкі, сягнуў вышынь,
Сама першы, хто стаў на эалійскі лад
Па-лацінску пяяць і заслужыў хвалу.
Дык ганарыся мной і валасы мае
Ты зычліва вянком, Мэльпамэна, спаві.

Калі на прыкладзе гарацыеўскай оды паспрабаваць “намацаць” і пералічыць асноўныя структурныя кампанэнты топасу “помніка”, тыя складнікі, якія могуць быць вельмі прыдатнымі пры стварэньні гэтага топасу альбо безь якіх яго наагул немагчыма сабе ўявіць, дык мы атрымаем наступны альгарытм пабудовы помніка самому сабе.

1. *Абвяшчэньне пра помнік.*
2. Шэраг параўнаньняў нематэрыяльнага помніка зь нетым матэрыяльным, якія добра акрэсьліваюць трывалы сэнс “манумэнту”. (У Гарацага гэта параўнаньне зь вечнымі пірамідамі й медзьдзю).
3. *Пералік магутных сілаў, што бясьсільныя разбурыць гэты помнік.* (Проліўні, неўтаймоўны аквілён (сівер), а па-за тым — сам час, галоўны ў сьвеце разбуральнік.)
4. *Цьверджаньне паэта, што лепшае, што ў ім ёсьць, ратуе, што ягоная слава будзе жыць.* (“Большая частка” паэта ўмікне сустрэчы зь Лібітынаю, багіняю пахаваньняў, то ён сам

[1] **Степанов В. Г. Мотив пространственного расширения “бессмертной славы поэта” / Взаимодействие литературных мировых литератур**

сьмерцю.)

процессе. Ч. 2. Гродно, 1997. С. 179–180.

5. Выбар і называньне таго сымбалю існага стан рэчаў, які супастаўны сваёй трываласьцю зь неўміручаю славай паэта. (Узыходжаньне на Капіталійскі пагорак вярхоўнага пантыфіка з маўкліваю дзевай — старэйшаю вэсталкай.)

6. Спроба акрэсьліць той арэал, дзе будуць памятаць пра паэта, — будучую (і сёньняшнюю) краіну сваёй паэтычнай славы.

7. Пастуляваньне таго, чым менавіта паэт заслужыў гэтую славу, прычым істотна, каб жыхары гэтай акрэсьленай краіны самі мусілі добра разумець, за што яны шануюць памяць пра паэта.

8. Фінальны зварот да музы.

Наступным чыньнікам стварэньня топасу “помніка”, чыньнікам чыста фармальным, можна назваць *спэцыфічную “сымэтрычнасьць” (ці нават “люстрана-сымэтрычнасьць”) рытмічнай пабудовы твору.* Вось яе схема:

/ / / / / \
— — *U U* — // — *U U* — *U* —

Мэтрыка твору напраўду нагадвае люстра. Першае й другое паўрадкоўе кожнага радка становіць сабою люстрана-сымэтрычную канструкцыю, а функцыі люстра, ці восі сымэтрыі, выконвае цэзура. Уяўленьні пра сымэтрыю зьвязаныя ў нашай сьвядомасьці з пэўнымі паняткамі пра хараство, лад, гармонію, з паняткамі пра красу ў яе статычным разуменьні. Сымэтрыя — застылая краса, што асацыюецца пераважна з архітэктураю... Менавіта стварэньня ў сваім творы ілюзіі архітэктурнай пабудовы, думаецца, і імкнуўся дасягнуць аўтар оды „Да Мэльпамэны”. Самастойна навеяць чытачу такую ідэю ня можа ніякая сымэтрыя, але ў спалучэньні з пастуляванай Гарацым „архітэктурнасьцю” твору гэтая мэтрычная пабудова бліскуча выконвае свае функцыі. У некаторых пасьлядоўнікаў рымскага паэта таксама назіраюцца сьвядомыя альбо несьвядомыя спробы стварэньня “сымэтрычнай” вершаванай пабудовы.

Апрача оды “Да Мэльпамэны” матыў “паэтычнай несьмяротнасьці” разьвіваецца рымскім творцам у ня менш знакамітай одзе “Да Мэцэната” (кніга II, ода 20), вядомай яшчэ пад назовам “Лебедзь”. Лірычны герой малюе свой узьлёт у нябёсы на магутных крылах. Дзьве страфы, якія нас тут

найбольш цікавяць, гэта шырокая панарама земляў, што разгортваецца перад паэтам-птахам. Лірычны герой грунтоўна пералічвае, каго ён убачыць згары й хто пазнае яго. Вось гэты фрагмэнт у нашым перакладзе:

Вышэй за сына мчацьму Дэдалава,
Пяюн крылаты, бераг Басфора я
Угледжу шумны, і гетулаў
Сырты, і гіпэрбарэйцаў стэпы.
Вядомы стану дакам, што ў вусьцішы
Ад вояў Рыму, колхам, дасьведчаным
Ібэрам і гелёнам дальнім,
Галам, якія ваду п'юць з Роны.

На першы пагляд, перад намі адно ўвасабленьне бясконцасьці паэтычнай славы, маўляў, праўдзівая паэзія ня ведае межаў і хутка распаўсюджваецца па ўсім сьвеце. Але пералічаныя землі й плямёны — гэта народы, якія ці то ўвайшлі ў склад Рымскай імпэрыі, ці то неўзабаве маюць быць скораныя Рымам (калхідзяне, дакі, гелёны). З аднаго боку, паэт спадзяецца, што ягоная слава будзе стала пашырацца; з другога — ён верыць і ў пастаяннае тэрытарыяльнае павелічэньне дзяржавы, што будзе й надалей улучаць у сябе землі новых і новых плямёнаў. Пашырэньне славы паэта-грамадзяніна імпэрыі для яго немагчымае без пашырэньня й самой імпэрыі — гэта для паэта два бакі аднаго й таго самага працэсу. "Гарацы разумее распаўсюджаньне славы не на ўзроўні картаграфічнага бачаньня сьвету (як у старажытнагрэцкай паэзіі), але ў геапалітычным сэнсе, як шанаваньне яго народамі, якія будуць у складзе Рыму. І слава яму патрэбная адно асьвечаная ідэяй дзяржаўнасьці, бо ў гэтым выпадку індывідуальныя заслугі падвойваюцца"[1].

Характэрна, што пэўны "імпэрскі" патэнцыял месьціць у сабе й гарацыеўскі "Помнік", які нас цікавіць насамперш. Апалёгіі шматнацыянальнай дзяржавы, як ні дзіўна, няма ў пералічэньні тых мясьцінаў, дзе будуць гаварыць пра паэта — Гарацы абмежаваўся згадкай сваёй радзімы — Апуліі. Мабыць, ён проста не хацеў паўтарацца, бо сьпіс далучаных да імпэрыі й ягонага паэтычнага слова чужынцаў ён дае ў вышэйзгаданым "Лебедзі". Але гэта ня значыць, што грамадзянскі патас у вершы адсутнічае. Ён праяўляецца ў абяцаньні быць слынным,

покуль на Капітоль узыходзіць пантыфік. Такое ўзыходжаньне вярхоўнага жраца ў суправаджэньні старэйшай вэсталкі, што мусіла падчас усёй цырымоніі захоўваць маўчаньне, адбывалася раз на год. Пантыфік маліў Юпітэра пра шчасьце й дабрабыт Рыму і ўсёй рымскай дзяржавы. Калі перафразаваць Гарацыеў вобраз, атрымаецца, што слава паэта будзе пашырацца, пакуль будзе існаваць (таксама пашырацца, а як інакш!) Рымская імпэрыя.

II

Твор Гарацага адразу ж стаўся ўзорам для перайманьня, прычым топас “помніка” стаў улучаць у сябе ня толькі пытаньне прыжыцьцёвай ды пасьмяротнай паэтычнай славы, але й праблему адносінаў паэта і грамадзтва (найчасьцей, паэта і імпэрыі). З гарацыеўскай ідэальнай гармоніяй прыватна-паэтычнага й грамадзка-дзяржаўніцкага мы сустракаемся ў творы жыхара іншай эпохі й іншай імпэрыі — Расійскай.

Гарацыеўскі “Помнік” мае багатую гісторыю ў расійскай літаратурнай традыцыі. Гэтую оду пераклаў Ламаносаў, насьледаваў ёй Дзяржавін (верш “Памятник”), але ж галоўным постгарацыеўскім творам на гэтую тэму ў расійскай паэзіі стаўся хрэстаматыйна вядомы пушкінскі верш, які афіцыйна называецца ня “Помнік”, а проста па першым радку — “*Я памятник себе воздвиг нерукотворный…*”. Расійскія дасьледнікі літаратуры не бяз гонару адзначаюць, што стварыць шэдэўр, падобны да пушкінскага, праз амаль дзьве тысячы год пасьля Гарацага — задача складаная. Яны згадваюць, да прыкладу, не адзін дзясятак нямецкіх паэтаў XVIII — пачатку XIX стагодзьдзя, якія насьледавалі Гарацаму й яго одзе, але ж гэта былі паэты нават не другога, а трэцяга літаратурнага эшалёну. А тут — менавіта ў расійскага паэта Пушкіна — вялікі твор! Не без злосьлівасьці дазволім сабе перайначыць гэтую думку: чаму тэма й патас, здольныя ў іншых літаратурах спарадзіць адно шматлікіх графаманаў, далі сьвету шэдэўр менавіта ў літаратуры расійскай?

Паставіў помнік я сабе нерукатворны,
Не зарасьце к яму людзкая сьцежка дзён,
Вышэй узьнёсься галавою непакорны

За стоўп Александрыйскі ён.
Не, ўвесь я не памру — душа ў жаданай ліры
Мой прах перажыве, адрынуўшы нябыт,
І ў славе буду я, пакуль пад небам шчыры
Жыць будзе хоць адзін пііт.
(Тут і далей пераклад Рыгора Барадуліна)
Несумнеўна, што мы маем дачыненьне не зь перакладам, а з вольным насьледаваньнем, досыць самастойным вершам, але ж у яго аснову, канечне, пакладзены гарацыеўскі топас. Абсалютна традыцыйны паводле духу пачатак — канстатацыя ўзьнясеньня помніка, за якой ідзе знакамітае параўнаньне гэтага "нерукатворнага" помніка з матэрыяльным "Александрыйскім стаўпом", то бок Аляксандраўскаю калёнай, што была пастаўленая ў Пецярбургу ў 1834 г. у гонар нябожчыка-імпэратара Аляксандра І. Аляксандраўская калёна — годны эквівалент "царскіх пірамідаў" — усёй вэртыкальнасьцю свайго аблічча, мілай кожнаму фройдаўцу, проста правакуе дзёрзкіх "*узьнесьціся вышэй*".
Абяцаньне "*ўвесь я не памру*" даслоўна супадае з адпаведным гарацыянскім, а "*душа ў жаданай ліры*" вельмі пасуе ў якасьці найлепшай, неўміручай часткі паэта, што, як сьцьвярджаў Гарацы, унікне сустрэчы зь Лібітынаю. Спэцыфічна пушкінскім сымбалем трываласьці ўсяго існага стаецца такі стан рэчаў, у якім на зямлі, пад месяцам, яшчэ жыве прынамсі адзін "пііт" — першы й апошні выпадак у вершы, калі аўтар апэруе сусьветнымі катэгорыямі, не абмяжоўваючы фантазію рамамі Расійскай імпэрыі (і гэта на фоне таго, што "адпаведны" фрагмэнт у Гарацага ставіць знак роўнасьці паміж славаю паэта й славаю імпэрыі, да якой ён належыць). Ці то Пушкін на хвіліну забываецца пра свой грамадзянскі абавязак мысьліць катэгорыямі дзяржаўнымі, ці то ў паэтычным захапленьні пашырае межы сваёй краіны да памераў сусьвету. Аднак "агульначалавечае" доўжыцца толькі адну страфу, за якой наступае самы "вялікадзяржаўны" фрагмэнт пушкінскага тэксту.

Маё імя памкне ў прасьцяг Русі вялікі,
І звыкне да яго, калі яшчэ ня звык,
І горды ўнук славян, і фін, і покуль дзікі
Тунгус, і стэпаў друг калмык.

Дадамо, што чарнавы варыянт рукапісу вершу прадугледжваў тут яшчэ трох “меншых братоў” — грузіна, кіргіза й чаркеса, ды, мабыць, пачуццё меры ўзяло верх.
Радыкальна трансфармуецца фінальны зварот да Музы:

Пачуй, о муза, слова Боскае з пашанай,
Ня бойся праўды ты і пра вянок ня дбай;
Паклёп і пахвалу прымай з душой рахманай
І спрэчкі з дурнем не ўшчынай.
Муза губляе вялікую літару ў сваім напісаньні, а разам зь ёй і свой нябесны статус. Гэта ўжо не звышнатуральная істота (Мэльпамэна альбо іншая), не напаўбагавіца, якая спрыяе паэтам. Часы, калі міт успрымаўся як праўда, незваротна сышлі ў нябыт; цяпер ён — адно прыгожая паэтычная мэтафара. Таму й муза ў Пушкіна — адно пэрсаніфікацыя паэтычнага натхненьня. Аднак патрэба ў вялікіх літарах па-ранейшаму існуе, таму побач з музаю-натхненьнем, музаю-пасярэдніцаю ўзьнікае вышэйшая, напраўду аўтарытэтная інстанцыя: паэт у сваёй творчасьці мусіць быць слухмяным “*слову Боскаму*”, якое наперад апраўдвае яго дзеяньні настолькі, што можна быць абыякавым як да паэтычнай славы, так і да няслаўя. Апрача таго, высьвятляецца, што лірычны герой Пушкіна, як і гарацыеўскі, вельмі добра ведае сабе цану й ня будзе лічыцца зь меркаваньнем першага-лепшага чытача, будзь ён хоць “*дзікі тунгус*”.

І доўга буду тым прыязны я народу,
Што лірай добрыя пачуцьці абуджаў,
Што ў мой няўмольны век уславіў я Свабоду
І літасьць да нябог гукаў.
Вось узор максымальнай сьмеласьці й грамадзянскага патасу, дазволеных у мікалаеўскай Расіі: з аднаго боку, хвалюе кожнае шляхетнае сэрца, зь іншага — за такое ў імпэрыі шчэ не караюць. Вось знакаміты прыклад сэмантычнага рыму — “*народу — Свабоду*”. Вось трыяда пушкінскіх заслуг, што робяць яго вартым ушанаваньня “помнікам”: абуджэньне ліраю добрых пачуцьцяў — тая мяжа, дзе эстэтычнае пераходзіць у этычнае; вострапалітычнае ўхваленьне Вольнасьці зь вялікай літары плюс “*літасьць да нябог*”, дзе хрысьціянская спагада да бліжняга ўрываецца ў звычайна чужыя ёй дзяржаўныя справы

(зьвернуты да цара заклік амніставаць удзельнікаў бунту 1825 г.). Вось, дадамо, адны з самых растыражаваных у масавай сьвядомасьці радкоў паэта, што часьцяком суправаджаюць пушкінскія партрэты. Менавіта гэтая страфа ў скажоным цэнзураю выглядзе (з рымам “любезен — полезен” замест “народу — Свободу”) аздабляе вядомы пушкінскі помнік. (Натуральна ж, расійскі, а ня той, што зь нядаўняга часу стаіць у нас на ўзьбярэжжы Сьвіслачы — братні падарунак “*Белоруссии*”.)

Аднак маляваць аўтара адною фарбай усё-ткі не выпадае. Асаблівай увагі варты радок “*І літасьць да нябог гукаў*” (у расійскім арыгінале — “*И милость к падшим призывал*”). У нашым векавым захапленьні пушкінскай міласэрнасьцю (пашкадаваў жа няшчасных дзекабрыстаў!) ды сьмеласьцю (наважыўся ж публічна нагадаць пра лёс ахвяраў царызму!) традыцыйна губляецца за суседнімі словамі слоўка “*падшие*”. А, між іншага, слова гэтае мусіла насьцярожыць сваёй зьняважлівасьцю. (Рыгор Барадулін тонка адчуў гэтую зьняважлівасьць, пераклаўшы “падшие” як “нябогі”.) Відавочна, слова “падший” — “падший” анёл, “падшая” жанчына — не найлепшы эпітэт, які можна было б абраць, характарызуючы хай былых, але ўсё-ткі сваіх аднадумцаў. Калі былыя таварышы, дзекабрысты — грэшнікі, якія, тым ня менш, вартыя спагады — насуперак сваім грахам, таму, што добры хрысьціянін і проста чалавек павінен быць спагадлівым, — дык як гэты радок стасуецца з патасам папярэдняга радка: “*Што ў мой няўмольны век уславіў я Свабоду*”? Калі дзекабрысты — “падшие”, дык з кім паэт гэтую свабоду ўхваляў?

Што гэта? Супярэчнасьць паміж душою, якая прагне вольнасьці, і розумам, які цьвяроза ведае пра неабходнасьць слухмянасьці закону? Канфлікт паміж грамадзянінам Імпэрыі й Грамадзянінам у высокім, радзішчаўскім сэнсе гэтага слова? (У чарнавым варыянце рукапісу Пушкіна чытаем: “*Что вслед Радищеву восславил я Свободу*”.) Думаецца, што супярэчнасьць, да якой мы прыйшлі, уяўная. Дзьве рэчы, якія пушкінскі герой лічыць сваёй заслугаю, — ухваленьне Вольнасьці й заклік дараваць віны грэшнікам — рабіліся ім не адначасова, а зьмянялі адна адну ў часе, і кожнага разу — шчыра й арганічна. Палкі прыхільнік свабоды расчароўваецца (не без дапамогі вонкавых абставінаў!) у сваіх — такіх юначых! —

ідэалах, каб пасьля стацца перакананым апалягетам існага дзяржаўнага ладу. І ўсё б выглядала бездакорна й лягічна пасьлядоўна, каб не адно “але”. Даніну свабодзе лірычны герой аддаваў уласнаю пэрсонай, а “літасьць абуджаў” да іншых, да якіх сам ужо нібыта й не належаў. Пушкін *неўпрыкмет* выключае сябе зь ліку “падших”. Магчыма, спадзяецца, што былая крамола забылася за даўнасьцю гадоў? Альбо лічыць, што ўзорнымі паводзінамі ўжо заслужыў поўную грамадзянскую рэабілітацыю? Але для таго, каб годна разьвітацца з адной пазыцыяй і з усім правам паэта-грамадзяніна прэтэндаваць на іншую, ці не абавязковы шчэ адзін, прамежкавы этап — нешта накшталт каяты, простае ці ўскоснае вырачэньне (публічнае!) сваіх аблудаў, прызнаньне іх няслушнасьці, урэшце, просьба дараваць, зьвернутая да чытачоў, якіх паэт, сам не жадаючы таго, пэўны час уводзіў у зман? Ці не занадта лёгкі спосаб разьвітаньня з уласным мінулым абірае паэт?

Топас “помніка”, гарацыянская формула несьмяротнасьці не дазваляе такіх вольнасьцяў, як “даруй, вельмішаноўны чытачу, я ня меў рацыі!”. Тон лірычнага аповеду мусіць быць роўным ды ўрачыста-ўзьнёслым, не дапускаючы неапраўданых дысанансаў, а корпаньне ў сабе — ня спосаб стварыць сьветлы вобраз песьняра. У гарацыеўскай одзе “Да Мэльпамэны” няма ані згадкі пра рэспубліканскае мінулае рымскага паэта, што пэўны час узначальваў легіён у арміі Брута й змагаўся супраць імпэрскіх плянаў Актавіяна й Антонія. Навошта публічна каяцца, калі сама Ўлада — увасобленая ці то ў Актавіяну з Мэцэнатам, ці то ў Мікалаю з Бэнкендорфам — даравала твае віны, заплюшчыла на іх вочы, прыйшла да высновы, што вялікі паэт, які будзе шчыра й таленавіта ўхваляць новы лад, значна карысьнейшы ёй за дробнага бунтаўніка, пакаранага на навуку іншым! (Да таго ж, іншых пакараных бунтаўнікоў было досыць!) Вось жа, якія б свае заслугі сам паэт, што бярэцца будаваць сабе прыжыцьцёвы помнік, ні палічыў патрэбным згадаць насамперш — прышчапленьне старажытнагрэцкіх вершаваных памераў лацінскай літаратурнай традыцыі альбо абуджэньне ліраю добрых пачуцьцяў у межах усёй “Русі” вялікай, — ягоным галоўным паэтычным вычынам аказваецца сьвядомае ці несьвядомае ўхваленьне існага ладу. А гэткім ладам звычайна бывае імпэрыя, дзе знаходзіцца месца

шматлікім іншамоўным народам, стэпаваму люду цара Даўна, як у Гарацага, альбо сябру іншых стэпаў калмыку; народам, для якіх мова паэта зь цягам часу станецца блізкай і зразумелай і якія з удзячнасьцю будуць выхоўвацца на грамадзянскай лірыцы “старэйшага брата”. Трывалейшыя за медзь нерукачынныя помнікі паэтам — заслужаная ўзнагарода за аптымістычнае сьветаўспрыманьне й сьцьвярджальны патас, за стварэньне — ужывем гэтае папулярнае сёньня словазлучэньне — пазытыўнага вобразу сваёй краіны.

III

Чытаючы верш Адама Міцкевіча “*Exegi munimentum aere perennius… З Гарацага*”, зь вялікай цяжкасьцю даведваешся, што твор быў напісаны трыма гадамі раней за аналізаваны вамі верш Пушкіна, — настолькі ён, здаецца, супрацьпастаўлены пушкінскаму. Але ж твор напраўду напісаны ў Парыжы 12 сакавіка 1833 г., а ўражаньне супрацьпастаўленасьці Пушкіну вынікае адно з ваяўнічай “антыімпэрскасьці” Міцкевіча. Паэт таксама кіраваўся Гарацым як першаўзорам — і польскамоўны верш зьмяшчае ў сабе амаль усе адзнакі топасу “помніка”, якія мы вызначылі вышэй. Але ж як істотна дэфармуецца амаль кожная з гэтых адзнакаў! Прывядзем верш у адзіным на сёньня эквірытмічным беларускім перакладзе, што выкананы Сержам Мінскевічам:

Помнік мой перажыць мае красу Пулаў,
Склеп Касьцюшкі і гмах, што ў Вільні Пац узьняў,
І ня зможа яго Віртэмбэрг разбамбіць,
Ні сьвіньня-аўстрыяк штукай нямецкай зрыць.
Ад Панарскіх вяршынь дый блізкіх Коўна вод
Славай перасягну Прыпяці плыннай брод.
Ўвесь Наваградак, Менск верш прачытаюць мой —
Перапіша радкі моладзь сваёй парой.
У дачок ахмістрынь мой будзе ў ласцы твор,
З браку лепшых яго нават чытацьме двор!
Вось жа, паўз царскі гнеў, турмы й замкі дзьвярэй
Возіць тайна ў Літву кнігі мае габрэй.

Дэфармаваньне гарацыянскага топасу паэт пачынае зь першага ж складніку “помніка” — з самога абвяшчэньня пра пабудаваны манумэнт. Па-першае, паэт будуе не зусім помнік, даючы адно

[2] Adam Mickiewicz. Wybór poezyj. T. 2. Wrocław, 1986. S. 288.

іранічную парафразу оды Гарацага. “*Exegi munimentum…*”, — сьцьвярджае ён назваю свайго твору, то бок — “Я паставіў цьвердзь…”. Па-другое, у Міцкевічавым тэксьце няма дзеяслова, адпаведнага лацінскаму “*exegi*” — акцэнтуецца адно вынік таго, што “помнік” пастаўлены: “*Świeci się pomnik mój*”.
Як і рымскі творца, Міцкевіч таксама параўноўвае “нерукачынны помнік” паэта з пэўнымі матэрыяльнымі аб’ектамі, што ўвасабляюць трываласьць і неўміручасьць. У Міцкевіча такіх аб’ектаў тры. Гэта “*Puław dach*” — славутая рэзыдэнцыя князёў Чартарыйскіх у Пулавах, якая ад часоў Станіслава-Аўгуста й да паўстаньня 1830 г. была асяродкам сьвецкага й культурнага жыцьця магнацкіх колаў. Гэта “*Kościuszki grób*” — вавэльская катэдра ў Кракаве, шырэй — Вавэль як такі. І, нарэшце, гэта “*Paców w Wilnie gmach*” — гаворка ці то пра палац заможнага беларускага магната Антонія Міхала Паца, пабудаваны ў сярэдзіне XVIII ст., ці то пра касьцёл Сьв. Пятра й Паўла, знакаміты сваёй барочнай разьбою, фундатарамі якога таксама былі Пацы. Аднак гэты матыў суаднясеньня “рукачыннага” й “нерукачыннага” істотна пераасэнсоўваецца. Калі гарацыянскія матэрыяльныя аб’екты ўвасаблялі пэўную трываласьць і ледзь ня вечнасьць (прайграючы адно славе паэта), дык Міцкевіч згадвае, між іншага, “*szklany Puław dach*”, які, аказваецца, лёгка можа быць разбураны Віртэмбэргам ці іншым “лотрам” альбо „сьвінюком”. Паэт акцэнтуе крохкасьць, нетрываласьць, нявечнасьць матэрыяльнага — нават калі помнікаў “высокай культуры”, як у выпадку з рэзыдэнцыяй Чартарыйскіх.
Разбуральнікамі ў рымскага паэта былі проліўні ды вятры, а таксама ўсёмагутны час. Міцкевіч ня згадвае прыродных стыхіяў, а называе суб’ектаў вялікай палітыкі, што нясуць сур’ёзную небясьпеку тым вартасьцям, якія рэпрэзэнтуюць паэт ды яго “помнік”. Па-першае, гэта „*лотр Віртэмбэрг*”. Князь Адам Віртэмбэрскі быў сынам нямецкага князя й Марыі з Чартарыйскіх, але пасьля разводу бацькоў выхоўваўся бацькам як немец. Ён быў афіцэрам на расійскай царскай службе й падчас лістападаўскага паўстаньня бамбардаваў згаданы вышэй палац у Пулавах — свой радавы палац. Паводле свайго службовага становішча й паводле свайго выхаваньня ён пэрсаніфікуе адразу двух непрыяцеляў — Расійскую й Прускую імпэрыі. Па-другое, гэта “*сьвіньня-аўстрыяк*”, згадка пра якога

падмацаваная ізноў-ткі выпадам супраць нямецкай тактыкі падкопаў (“*niemiecką sztuką zryć*”). Згадваюцца краіны-агрэсары, імпэрыі, што анэксавалі Рэч Паспалітую, — Расія, Прусія ды Аўстра-Вугоршчына.

Гарацыеўскі альгарытм будаўніцтва помнікаў дыктуе паэту наступны “крок” — ён мусіць акрэсьліць арэал сваёй будучай славы, край, дзе яго будуць шанаваць (пры гэтым добра ўсьведамляючы, за што менавіта шануюць). Міцкевіч акрэсьлівае такую краіну, але ход у творы ня толькі й ня столькі пра будучую славу, колькі пра мясьціны, дзе *ўжо цяпер*, у момант напісаньня вершу, шануюць паэта. Паэт гаворыць пра Панарскія горы, то бок пра Віленшчыну, не забываючы й “*bliźnich Kowna wód*” — маюцца наўвеце Нёман і Вяльля, месца зьліцьця якіх — акурат Коўна. Вось жа, паўночная мяжа славы паэта — Віленшчына й Ковеншчына. Паўднёвая мяжа славы Міцкевіча супадае з паўднёвай мяжой сёньняшняй Беларусі: “*za Prypieci bród*” (захаваўся таксама варыянт “*do poleskich błot*”). Згадваючы мясьціны, дзе яны некалі будуць слынныя, Гарацы, альбо Пушкін, альбо кожны паэт, што распрацоўваў “імпэрскі” варыянт топасу, гавораць пра рубяжы, якіх сягне іх неўміручая слава, якіх таксама сягне ці ўжо сягнула імпэрыя, што яны рэпрэзэнтуюць. То бок разгортваньне паэтычнага тэксту суправаджаецца пэўным працэсам тэрытарыяльнага пашырэньня прысутнасьці (ледзь не сказаў — ваеннай прысутнасьці) паэта. Паэт і яго паэтычная слава скіраваныя вонкі, і іх мэта — апаноўваць новыя й новыя пляцдармы. Зусім па-іншаму ўспрымаецца геаграфічная прастора, акрэсьленая Міцкевічам. Тое, што помнік названы “крэпасьцю”, дазваляе паэту ня проста пералічваць месцы сваёй прыйдучай славы й не імкнуцца да новых і новых межаў, а, хутчэй, узводзіць сьцены гэтага ўмацаваньня. Існаваньне крэпасьці прадугледжвае пэўную вонкавую небясьпеку, ад якой трэба бараніцца. Менавіта гэтай вонкавай небясьпецы й супрацьстаіць паэтычная слава паэта, што ў пэўнай ступені супастаўная з абароннымі мурамі, пра будаўніцтва якіх абвесьціў паэт. Разам з тым, гэтая акрэсьленая Міцкевічам крэпасьць — ня Польшча з Кракавам ды Пулавамі, хаця яны — таксама неабходны складнік топасу помніка. Яны ў нечым эквівалентныя таму сымбалю трываласьці існага стану рэчаў, што абавязкова прысутнічае ў “імпэрскім” топасе помніка

(гарацыеўскі Капітоль з пантыфікам *etc*). Яны нагадваюць пра былую веліч і становяць сабою запаруку велічы будучай. Праўдзівая ж фартэцыя Міцкевіча — гэта гістарычная Літва, тэрыторыі сёньняшняй Беларусі й Летувы. Фартэцыя, якая знаходзіцца ў аблозе, тады як паэт спрабуе дапамагчы ёй звонку. (Твор напісаны ў Парыжы, нагадаем.) Таму не выпадкова згадваецца менская й наваградзкая моладзь, што не лянуецца шматкроць перапісваць вершы паэта: пасьля падзей 1830—1831 гг. творы Міцкевіча ў Расійскай імпэрыі былі забароненыя й хадзілі ў сьпісах. Ад рукі перапісваліся тыя томікі, што кантрабандаю ўвозіліся з-за мяжы — акурат такім чынам, як гэта апісвае аўтар у апошнім радку твору.

Дарэчы, цікавы лёс напаткаў гэты апошні радок у беларускім перакладзе Рыгора Барадуліна. Габрэй, што нелегальна правозіць цераз мяжу забароненыя творы Міцкевіча, стаецца "карчмаром": "*Мае тамы крадком вязе ў Літву карчмар!*" Шмат тагачасных габрэяў напраўду былі карчмарамі — і перакладчык ужывае назву прафэсіі як кантэкстуальны сынонім нацыянальнасьці. Аднак пра каго ў вершы гаворка? Пра Францішка Гжымалу, чыім візытам натхнёны твор. Ф. Гжымала быў вядомым варшаўскім публіцыстам і ў 1821—1825 гадах выдаваў некалькі часопісаў, між іншага "Надвісьлянскую сыбілу" й "Астрэю", дзе зьмясьціў першую рэцэнзію на віленскае выданьне "Вершаў" Міцкевіча[2]. Трохі нетыповы занятак для "карчмара". Вось жа, нават самым таленавітым паэтам, што бяруцца за пераклад, ніколі не пашкодзіць своечасова зазірнуць у камэнтары!

Нарэшце, яшчэ адна істотная адзнака топасу помніка — сымэтрычнасьць рытмічнай пабудовы твору. Мы ўжо адзначалі "люстрана-сымэтрычную" рытміку оды Гарацага, дзе функцыю восі сымэтрыі выконвае цэзура. Калі ўважліва зірнуць на рытмічную арганізацыю верша Міцкевіча, пэўныя рэчы могуць уразіць. Па-першае, гэта мужчынскія канчаткі ўва ўсіх радкох, так званыя мужчынскія кляўзулы — у кожным радку апошні націск прыпадае на апошні склад. Гэта звычайная зьява для беларускага вершаскладаньня, што лёгка дасягаецца за кошт рухомага ў нас націску; але ж у польскай мове націск фіксаваны, прыпадае на перадапошні склад, таму мужчынская кляўзула магчымая адно за кошт вынясеньня ў канец радка выключна кароткіх, аднаскладовых словаў. Па-другое, гэта

рэгулярная мужчынская цэзура пасьля шостага складу. Ізноў-ткі, нічога дзіўнага для нашага сылябатанічнага вершаскладаньня. Так званы “александрыйскі верш”, шасьцістопны ямб з абавязковаю цэзурай пасьля трэцяй стапы, патрабуе ад паэта чагосьці падобнага. Таму нічога дзіўнага, што беларускія пераклады К. Цьвіркі й Р. Барадуліна выкананыя шасьцістопным ямбам з цэзурай. Але тут пачынаюцца цікавасьці. Рэч у тым, што ў польскім сылябічным вершаскладаньні памер, адпаведны “александрыйцу”, — гэта так званы “трынаццаціскладовец”, які вымагае цэзуры не пасьля шостага, а пасьля сёмага складу. Менавіта “трынаццаціскладовец” (накшталт “*Litwo, ojczyzno moja! // Jesteś jak zdrowie…*”) звычайна перакладаецца на нашую мову такім чынам, як Цьвірка й Барадулін пераклалі твор Міцкевіча, але ў Міцкевічавага арыгіналу абсалютна іншы памер — нагадваю, цэзура пасьля шостага, а не пасьля сёмага складу. Гэты памер — аказіянальны для польскай сыстэмы вершаскладаньня. Ён прымушае згадаць памер гарацыеўскай оды — Асклепіядаў верш. Тэкст Міцкевіча — рытмічная стылізацыя пад “Помнік” Гарацага, з такою самай люстрана-сымэтрычнаю пабудовай. І такая мэтрычная арганізацыя невыпадковая: люстраная сымэтрыя, нагадваем, як найбольш пасуе ў рытме твору, які прыпадабняецца аўтарам да архітэктурнай пабудовы. Менавіта таму сярод наяўных беларускіх перакладаў верша мы аддалі перавагу працытаванаму вышэй перакладу Сержа Мінскевіча — як найбліжэйшаму да арыгіналу рытмічна.

IV

Калі Міцкевіч сваім “*munimentum*” паставіў пад знак запытаньня манумэнтальнасьць уласнага твору, дык іншыя “будаўнікі” антыімпэрска-іранічных “помнікаў” робяць болей, ставячы пад сумнеў саму ключавую для такіх твораў мэтафару помніка як несьмяротнай творчасьці й вечнай славы паэта. Можна сказаць, што для такіх паэтаў больш не існуе прэзумпцыі нерукачыннасьці помніка. Само слова “помнік” у гэтым кантэксьце імкліва страчвае свой пераносны сэнс, набываючы якасьці рэальнай пабудовы. Ужо сам Міцкевіч гуляе магчымымі ў ягоным творы “архітэктурнымі” асацыяцыямі. Помнікі ж яго наступнікаў набываюць выразныя антрапаморфныя рысы, якія пакуль могуць намі ўспрымацца як рысы “скульптурныя”. Так,

у вершы Бродзкага пералічваюцца канкрэтныя “помнікавыя” дэталі, запазычаныя з сфэры чалавечай анатоміі:

Я памятник воздвиг себе иной!
К постыдному столетию — *спиной.*
К любви своей потерянной — лицом.
И грудь — велосипедным колесом.
А ягодицы — к морю полуправд <…>.
Ты, Муза, не вини меня за то.
Рассудок мой теперь, как решето,
а не богами налитый сосуд.
Пускай меня низвергнут и снесут,
пускай в самоуправстве обвинят,
пускай меня разрушат, расчленят <…>.
Ніштаватая атрымалася статуя — у найлепшых традыцыях антычнай скульптурнай выявы. (Гэта пацьвярджаюць і “белыя невідушчыя вочы” — заўсёдны атрыбут антычных скульптур, што дайшлі да нас менавіта ў такім выглядзе.)
Але гэта толькі пачатак разбурэньня мэтафары помніка, першы этап гэтага працэсу. Ужо радок Бродзкага “*пускай меня разрушат, расчленят*” наводзіць на пэўныя роздумы. Дзеяслоў “*расчленят*” ня толькі ўзмацняе ўражаньне ад “*разрушат*”, але й дазваляе па-іншаму зірнуць на помнік у творы. Ёсьць у гэтым вобразе нешта чалавечае ўва ўсёй жывой цялеснасьці. Скульптурнай выяве зь верша Бродзкага знаёмае пачуцьцё болю. Вось жа, традыцыйная дыстанцыя паміж творцам і яго творам парушаная, і помнік ужо не ўспрымаецца асобна ад чалавека, якому пастаўлены.

V

Заканамерны крок на шляху ўцелаўленьня ўласнага помніка робіць беларускі літаратар Серж Мінскевіч у сваім тэксьце, што апэлюе ня столькі да гарацыеўскага першаўзору, колькі да пушкінскага твору, значна бліжэйшага да нас у часе й культурнай прасторы. Як прызнаецца сам аўтар, у Смаленску яго вельмі ўразіў такі культурны атракцыён, прызначаны яўна не для нэрвовых: побач з помнікам час ад часу няўгледна ўмыкаўся прайгравальнік — і гучэлі творы. Крыніца “саўндтрэку” заставалася нябачнаю, таму ўражаньне, што побач адбываецца сэанс нейкага чэрававяшчаньня, было досыць

моцным. Шчодрае ўяўленьне нашага аўтара спрацавала “на ўсе сто” — і паўстаў паэтычны тэкст “Помнік з гукавым афармленьнем”:

Акунуўшы мазгі ў ацэтон
Я пяю і сьпяваю пра…
В. Булгакаў

Узладзіў помнік я сабе нерукачынны
А. Пушкін

Там дзе
шумны праспэкт
да пляцу прыходзіць
і тоўсты асфальт
не разбураць
люду тысячы пятак
завяжу я свой погляд
на вузел
марскі
і ногі шырэй расстаўлю
гэтак мушу стаяць пакуль… покуль…
чорт што там далей
пакуль мусіць ня здохну
ці страўнік хрыбта не абдыме
гэтак маю стаяць
і буду раўці
аб нечым… пра… пра…
чорт што там далей…
аб нечым мабыць сьмешна-
жалобным
вось люд той ня пяткай
узгадае калі-нікалі
што нехта… што хтосьці…
чорт што там далей…
што нехта здаецца стаяў і хрыпеў
як помнік з гукавым афармленьнем

У Сержавым опусе недвухсэнсоўна сьцьвярджаецца: помніка, які б існаваў асобна ад свайго аўтара, наагул няма й быць ня

можа. Літаратар, што жыве на мяжы тысячагодзьдзяў, не такі наіўны, каб не ўсьведамляць, наколькі зьмяніўся статус творцы ў чалавечым грамадзтве за апошнія сто пяцьдзясят гадоў. Паэзія як занятак сталася нашмат меней прэстыжнаю, і ўпэўненасьць сучаснага лірыка ва ўласнай несьмяротнасьці выглядала б ці то як гранічная наіўнасьць, ці то як парадыйная гульня ў Гарацага. Нашмат старэйшы за “бумбамлітаўца” Мінскевіча, значна больш дасьведчаны і ўшанаваны паэтычнымі ўзнагародамі аўтар, польскі паэт Чэслаў Мілаш, таксама закрануў гарацыеўска-міцкевічаўска-пушкінскі топас “помніка” — і як жа зьнізіў ягоны патас:

Так, ня цалкам памру. Ад мяне застанецца
Згадка ў энцыкляпэдыі, у чатырнаццатым томе,
Побач з сотняю Мілераў і Мікі-Маўсам…

Пра традыцыйна зразуметы помнік тут няма й размовы: манумэнты патрэбныя ў эпохі, калі аматараў спажываць “разумнае, добрае, вечнае” нашмат больш за колькасьць вытворцаў гэтага дэфіцытнага прадукту. Пісьменьнікаў, мастакоў, кампазытараў яшчэ ня так даўно не ставала на ўсіх, што хацелі адчуць сваю далучанасьць да сьвятоўнага. Таму іх колькасьць можна было штучна падвоіць, патроіць і гэтак далей, паставіўшы *n* у *n*-ай ступені манумэнтаў. Цяпер жа попыт рэзка зьнізіўся, і сёньняшняму чалавеку — асабліва ў краінах, над якімі не вісіць небясьпекі фізычнага зьнішчэньня, а таму й функцыі творцы там вузейшыя — наўрад ці прыйдзе да галавы, што сучасныя яму аўтары вартыя пасьмяротных (ня кажучы ўжо аб прыжыцьцёвых) помнікаў. Ня маюць рацыі тыя, хто кажа, што колькасьць чытачоў паэзіі ў сёньняшнім сьвеце роўная колькасьці паэтаў. Як на мяне, чытачоў сёньня нават менш ад паэтаў, бо далёка ня кожны вершаскладальнік дае сабе працу чытаць калег па пяры, абмяжоўваючыся сабою, улюбёным. Але гэта палова бяды. Цікава супаставіць верш Мінскевіча з эсэ Юрася Барысевіча “Жывыя помнікі”, дзе гаворка ўжо ня толькі пра творцаў, але й пра ўсіх жывых людзей наагул: “Пераважную частку нашага існаваньня ў чалавекападобнай форме мы ня гэтулькі жывём, колькі выконваем функцыю надмагільных помнікаў папярэднім

пакаленьням”[3]. Гэтая ўнівэрсальная заканамернасьць датычыць і сьвету культуры. Назваўшыся паэтам, ты ўжо ня столькі чалавечая асоба сама па сабе, колькі прадстаўнік віду паэтаў. Ты ўжо не індывід, а закладнік паэтычнай традыцыі, адзіны довад яе патрэбнасьці, дарэчнасьці й наагул існаваньня. Лірычны герой нашага паэта ня толькі помнік самому сабе. Ён няхай сабе й карыкатурны, але ўсё-ткі манумэнт усім творцам мінулага. Таму нічога дзіўнага, што ў нязграбнай паставе Сержавага героя можна ўгледзець і ляўравы вянок Гарацага, і пушкінскія бакенбарды, і лысіну Бродзкага, і шмат чаго яшчэ.

Аднак жывы чалавек, у адрозьненьне ад трывалейшых за бронзу стодаў, мусіць сілкавацца чымсьці, апрача ўдзячнасьці нашчадкаў. Таму вынік такога экспэрымэнту лёгка прадказальны й ня вельмі вясёлы: раней ці пазьней рымская багіня Лібітына зьявіцца ў банальнай постаці галоднай сьмерці. Усё, чым застаецца сябе суцяшаць, — гэта людзкая згадка, мімалётны ўспамін пра цікавы пэрформанс, яскравы гепэнінг, так удала зладжаны творцам.

Пераадолець дыстанцыю паміж аўтарам і творам, зрабіць помнік з чалавечага (свайго) цела — гэтага для паэта ўжо замала, і ў ход ідуць графічныя выяўленчыя сродкі. Мінскевіч зьмяшчае свой тэкст на паперы такім чынам, што тэкст гэты ўтварае чалавечую постаць з шырока расстаўленымі рукамі й нагамі. Перад намі прыклад каліграмы, што даводзіць да лягічнага канца ўсе ранейшыя спробы сымэтрычнай арганізацыі тэкстаў, занураных у топас помніка. Прыклад вынаходніцтва, якое, здаецца, ляжала на паверхні, але доўга не выкарыстоўвалася; вынаходніцтва, якое найбольш станоўка пераадольвае мэтафарычную дыстанцыю паміж рэальным корпусам вершаў паэта і ўяўным целам помніка, што прыгожа ўвасабляе ў вечнасьці гэтыя вершы.

VI

Тры апошнія тэксты (улучна з прыведзеным тут беларускім опусам) відочна належаць да іранічнай, антыімпэрскай, неафіцыйнай стратэгіі ў распрацоўцы топасу помніка. Цікава, аднак, наколькі плённым гэты топас стаўся ў нас для

пісьменства каляніяльнага. Найбольш яскравае ўвасабленьне топасу помніка й матыву вечнай славы (хай сабе й непаэтычнай) у беларускай савецкай літаратуры — куляшоўскі “Камсамольскі білет”, аповед пра камсамольца-героя, што загінуў, не пажадаўшы разьвітацца з камсамольскім білетам, сымбалем для сябе чагосьці значна важнейшага за сваё чалавечае жыцьцё:

Так і стаяў, сьмеючыся над катам,
Доўга па целе сьцякала вада;
Так і застаўся стаяць каля хаты,
Быццам з чысьцюткага літы ільда.
Так і стаіць, як жывы, перад намі,
Так і стаіць, прыціскае білет,
І не разьвітваецца зь сябрамі,
І прастаіць яшчэ тысячы лет.
Ды не карой ледзяною пакрыты,
Ды не абліты вадой ледзяной, —
Выліты з бронзы і сонцам абліты
Будзе ён вечна стаяць над зямлёй.
Каляніяльнасьць літаратуры такога гатунку відаць няўзброеным вокам. Гэта праяўляецца і на роўні зьместу (неарыгінальнасьць тэматыкі, што прымушае шукаць першакрыніцу недзе ў мэтраполіі: першае, што прыходзіць да галавы, — “Стихи о советском паспорте” Маякоўскага), і на лінгвістычным роўні (крэалізаванасьць мовы, відаць, вынікае з таго, што твор пісаўся найперш па-расійску, і ўжо потым прыстасоўваўся для патрэбаў беларускага чытача; гэта добра відаць па такіх формах, як “дапрос” замест “допыту”, “ільда” замест “лёду”, “тысячу лет” — паэту не хацелася істотна перарабляць расійскамоўных рымаў).
Але драбязу згаданых мастацкіх хібаў зь лішкам кампэнсуе геніяльны вобраз, варты авідыеўскіх “Мэтамарфозаў”. Цела падлетка, аблітае сьцюдзёнай вадою й такім чынам ператворанае ў лёд, у нас на вачах ператвараецца ў бронзавы помнік гэтаму самаму падлетку. Розум падказвае чытачу, што гэта ня так, што мусіў прамінуць пэўны час, перш як памяць пра героя была ўшанаваная помнікам, але сэрца адмаўляецца даваць веры. Дый як жа ня верыць уласным вачам! Хвілю таму была ледзяная кара — і вось цела ўжо вылітае з бронзы, што

адбываецца ледзь не на вачах патаптаных ворагаў, над якімі трыюмфуюць камсамол ды “каштоўнасьці”, якія ён увасабляе! Вось жа, не ў дысыдэнцкія шасьцідзясятыя гады ў творы Бродзкага, і не ў постмадэрнісцкія дзевяностыя пад гульлівым пяром Мінскевіча, а нашмат раней дыстанцыя паміж помнікам і целам таго, каму гэты помнік ставіцца, была пасьпяхова пераадоленая. І хай гэта не зусім топас “неўміручай паэтычнай славы”, але ж можна на хвілінку прымружыць вочы і ўявіць сабе, што на месцы камсамольскага білета мог быць членскі білет Саюзу Пісьменьнікаў.

VII

Цяжка, аднак, сабе ўявіць, што сусьветная літаратура складаецца адно з тэкстаў, якія нясуць выразны імпэрскі зарад і скіраваныя вонкі, і, з другога боку, з твораў, што стаяць у пэўнай апазыцыі да вышэйзгаданых тэкстаў. Можна згадаць і пэўныя нацыянальныя літаратуры, пэўную культурную сытуацыю, для якой гэтая апазыцыя імпэрскага й антыімпэрскага, вонкіскіраванага й фартэцыібудуючага, уплывыпашыраючага й каштоўнасьцібаронячага й г. д. можа аказацца абсалютна неістотнай. Гэта можна прасачыць і на ўзроўні топасу. Так, вялізарны імпэрскі ці антыімпэрскі патэнцыял, заключаны ў топасе, у такіх культурных варунках можа застацца незапатрабаваным, бо аўтар актуалізуе ў ім зусім іншае, палічыўшы яго патрэбнейшым.
Менавіта такім чынам выкарыстоўвае гарацыеўскі топас помніка Шарль Бадлер. Яго санэт „Мой верш — табе…” („*Je te donne ces vers…*”), які ўва ўсіх трох выданьнях зборніка „Краскі Зла” (*Les Fleurs du Mal*) заканчвае найбольшы ў кнізе цыкль вершаў, прысьвечаны Жане Дзюваль, і ёсьць своеасаблівым „помнікам” каханьня паэта да яе. Найважнейшае ў творы ня тое, што падрыхтаваны чытач мусіць адчуць інтэртэкстуальныя сувязі з Гарацым. Найважнейшае тут тое, што ўвесь палітычны зьмест топасу помніка, безь якога ён, здавалася б, і немагчымы, аказваецца для Бадлера неістотным. Выяўляецца, што паэт у рамах акрэсьленага топасу можа мысьліць сябе асобна ад сваёй дзяржавы, суадносячы й атаесамляючы свой “помнік”, сваю паэтычную спадчыну й будучую славу не з краінаю, нацыяю, эпохаю (як із знакам “плюс”, так і з знакам “мінус”), а з пачуцьцём глыбока інтымным, з сваім пакутлівым каханьнем

да жанчыны, бяз вобразу якой ужо цяжка ўявіць сабе французскую мілосную паэзію. Прывядзем тэкст у нашым перакладзе:

Мой верш — табе! Калі майго натхненьня плён
У будучых часах чытацьме хтось натхнёна,
Калі маё імя падыме на рамёны
І ў далеч панясе магутны аквілён;
Хай памяць пра цябе, нібыта перазвоны,
Чаруе чытача, бярэ яго ў палон —
Ля рымаў гордзівых, нібыта ля калён,
Братэрскіх ланцугоў яе трымаюць зьвёны!
Праклятая, каму ад пекла да нябёс
Адпавядаў адно мой неразумны лёс!
Як згублены з вачэй няпэўны сьлед уночы,
Ты сьветлым позіркам з тупых сьмяротных кпіш,
Ты, стодзе велічны, анёле, чые вочы —
З гагату, а чало — высакародны сьпіж!

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **30-07-2001**
[image]

Андрэй Хадановіч

Засьпетыя на Гарацым. Тры стратэгіі будаўніцтва “Помнікаў” (Пушкін, Міцкевіч, Бадлер ды іншыя)

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ паэт, перакладчык паэзіі, выкладчык БДУ, аўтар артыкулу "Паляваньне на клясыкаў. Нататкі на палёх перакладаў Бадлера, Малярмэ, Ейтса" ў "Скарыне" № 6-2000.

I

Тэма “несьмяротнай славы паэта” ўзьнікае ў глыбокай старажытнасьці. Вялікую даніну аддалі ёй антычныя паэты, прычым ня толькі лацінскія, але й грэцкія. Ды ўсё-ткі архетыпам самарэфлексіі паэта пра сваю творчасьць і заслужаную славу стаецца творчасьць рымскага паэта Квінта Гарацага Фляка, у якога адразу некалькі паэтычных тэкстаў распрацоўваюць матывы “паэтычнай несьмяротнасьці”. Найвядомейшы зь іх — трыццаты твор з трэцяе кнігі одаў, што называецца „Да Мэльпамэны”, а філёлягам-няклясыкам больш

вядомы як „Помнік”, — аказаўся настолькі ўзорна-паказальным, настолькі поўна ўвасобіў у сабе гэтыя матывы, што пачаў выконваць ролю пэўнага першаўзору, на які арыентаваўся шэраг паэтычных геніяў і, напэўна, цэлы легіён графаманаў. Прывядзем тэкст оды ў нашым перакладзе:

Помнік я збудаваў трывалейшы за медзь,
Высачэйшы за высь велічных пірамід.
Ні навалы залеў, ні Аквілёна моц
Не зруйнуюць яго, ані бясконцы бег
Незьлічоных гадоў, хуткага часу плынь!
Бо ня цалкам памру! Лепшае, што ўва мне,
Не спазнае труны: слава мая расьці
Вечна будзе паміж спадчыньнікаў, пакуль
Ўсходзіць на Капітоль зь дзевай маўклівай жрэц.
Дзе ў бязводным краі стэпавым людам Даўн
Валадарыў, дзе мчыць воды свае Аўфід,
Скажуць так пра мяне: нізкі, сягнуў вышынь,
Сама першы, хто стаў на эалійскі лад
Па-лацінску пяяць і заслужыў хвалу.
Дык ганарыся мной і валасы мае
Ты зычліва вянком, Мэльпамэна, спаві.

Калі на прыкладзе гарацыеўскай оды паспрабаваць “намацаць” і пералічыць асноўныя структурныя кампанэнты топасу “помніка”, тыя складнікі, якія могуць быць вельмі прыдатнымі пры стварэньні гэтага топасу альбо безь якіх яго наагул немагчыма сабе ўявіць, дык мы атрымаем наступны альгарытм пабудовы помніка самому сабе.

1. *Абвяшчэньне пра помнік.*
2. Шэраг параўнаньняў нематэрыяльнага помніка зь нетым матэрыяльным, якія добра акрэсьліваюць трывалы сэнс “манумэнту”. (У Гарацага гэта параўнаньне зь вечнымі пірамідамі й медзьдзю).
3. *Пералік магутных сілаў, што бясьсільныя разбураць гэты помнік.* (Проліўні, неўтаймоўны аквілён (сівер), а па-за тым — сам час, галоўны ў сьвеце разбуральнік.)
4. *Цьверджаньне паэта, што лепшае, што ў ім ёсьць, ратуе, што ягоная слава будзе жыць.* (“Большая частка” паэта ўмікне сустрэчы зь Лібітынаю, багіняю пахаваньняў, то ён сам

[1] **Степанов В. Г. Мотив пространственного расширения “бессмертной славы поэта” /Взаимодействие сыграл в мировом литературном**

сьмерцю.)

процессе. Ч. 2. Гродно, 1997. С. 179–180.

5. Выбар і называньне таго сымбалю існага стан рэчаў, які супастаўны сваёй трываласьцю зь неўміручаю славай паэта. (Узыходжаньне на Капіталійскі пагорак вярхоўнага пантыфіка з маўкліваю дзевай — старэйшаю вэсталкай.)

6. Спроба акрэсьліць той арэал, дзе будуць памятаць пра паэта, — будучую (і сёньняшнюю) краіну сваёй паэтычнай славы.

7. Пастуляваньне таго, чым менавіта паэт заслужыў гэтую славу, прычым істотна, каб жыхары гэтай акрэсьленай краіны самі мусілі добра разумець, за што яны шануюць памяць пра паэта.

8. Фінальны зварот да музы.

Наступным чыньнікам стварэньня топасу “помніка”, чыньнікам чыста фармальным, можна назваць *спэцыфічную “сымэтрычнасьць” (ці нават “люстрана-сымэтрычнасьць”) рытмічнай пабудовы твору.* Вось яе схема:

/ / / / / \
— — *U U* — // — *U U* — *U* —

Мэтрыка твору напраўду нагадвае люстра. Першае й другое паўрадкоўе кожнага радка становіць сабою люстрана-сымэтрычную канструкцыю, а функцыі люстра, ці восі сымэтрыі, выконвае цэзура. Уяўленьні пра сымэтрыю зьвязаныя ў нашай сьвядомасьці з пэўнымі паняткамі пра хараство, лад, гармонію, з паняткамі пра красу ў яе статычным разуменьні. Сымэтрыя — застылая краса, што асацыюецца пераважна з архітэктураю... Менавіта стварэньня ў сваім творы ілюзіі архітэктурнай пабудовы, думаецца, і імкнуўся дасягнуць аўтар оды „Да Мэльпамэны”. Самастойна навеяць чытачу такую ідэю ня можа ніякая сымэтрыя, але ў спалучэньні з пастуляванай Гарацым „архітэктурнасьцю” твору гэтая мэтрычная пабудова бліскуча выконвае свае функцыі. У некаторых пасьлядоўнікаў рымскага паэта таксама назіраюцца сьвядомыя альбо несьвядомыя спробы стварэньня “сымэтрычнай” вершаванай пабудовы.

Апрача оды “Да Мэльпамэны” матыў “паэтычнай несьмяротнасьці” разьвіваецца рымскім творцам у ня менш знакамітай одзе “Да Мэцэната” (кніга II, ода 20), вядомай яшчэ пад назовам “Лебедзь”. Лірычны герой малюе свой узьлёт у нябёсы на магутных крылах. Дзьве страфы, якія нас тут

найбольш цікавяць, гэта шырокая панарама земляў, што разгортваецца перад паэтам-птахам. Лірычны герой грунтоўна пералічвае, каго ён убачыць згары й хто пазнае яго. Вось гэты фрагмэнт у нашым перакладзе:

Вышэй за сына мчацьму Дэдалава,
Пяюн крылаты, бераг Басфора я
Угледжу шумны, і гетулаў
Сырты, і гіпэрбарэйцаў стэпы.
Вядомы стану дакам, што ў вусьцішы
Ад вояў Рыму, колхам, дасьведчаным
Ібэрам і гелёнам дальнім,
Галам, якія ваду п'юць з Роны.

На першы пагляд, перад намі адно ўвасабленьне бясконцасьці паэтычнай славы, маўляў, праўдзівая паэзія ня ведае межаў і хутка распаўсюджваецца па ўсім сьвеце. Але пералічаныя землі й плямёны — гэта народы, якія ці то ўвайшлі ў склад Рымскай імпэрыі, ці то неўзабаве маюць быць скораныя Рымам (калхідзяне, дакі, гелёны). З аднаго боку, паэт спадзяецца, што ягоная слава будзе стала пашырацца; з другога — ён верыць і ў пастаяннае тэрытарыяльнае павелічэньне дзяржавы, што будзе й надалей улучаць у сябе землі новых і новых плямёнаў. Пашырэньне славы паэта-грамадзяніна імпэрыі для яго немагчымае без пашырэньня й самой імпэрыі — гэта для паэта два бакі аднаго й таго самага працэсу. "Гарацы разумее распаўсюджаньне славы не на ўзроўні картаграфічнага бачаньня сьвету (як у старажытнагрэцкай паэзіі), але ў геапалітычным сэнсе, як шанаваньне яго народамі, якія будуць у складзе Рыму. І слава яму патрэбная адно асьвечаная ідэяй дзяржаўнасьці, бо ў гэтым выпадку індывідуальныя заслугі падвойваюцца"[1].

Характэрна, што пэўны "імпэрскі" патэнцыял месьціць у сабе й гарацыеўскі "Помнік", які нас цікавіць насамперш. Апалёгіі шматнацыянальнай дзяржавы, як ні дзіўна, няма ў пералічэньні тых мясьцінаў, дзе будуць гаварыць пра паэта — Гарацы абмежаваўся згадкай сваёй радзімы — Апуліі. Мабыць, ён проста не хацеў паўтарацца, бо сьпіс далучаных да імпэрыі й ягонага паэтычнага слова чужынцаў ён дае ў вышэйзгаданым "Лебедзі". Але гэта ня значыць, што грамадзянскі патас у вершы адсутнічае. Ён праяўляецца ў абяцаньні быць слынным,

покуль на Капітоль узыходзіць пантыфік. Такое ўзыходжаньне вярхоўнага жраца ў суправаджэньні старэйшай вэсталкі, што мусіла падчас усёй цырымоніі захоўваць маўчаньне, адбывалася раз на год. Пантыфік маліў Юпітэра пра шчасьце й дабрабыт Рыму і ўсёй рымскай дзяржавы. Калі перафразаваць Гарацыеў вобраз, атрымаецца, што слава паэта будзе пашырацца, пакуль будзе існаваць (таксама пашырацца, а як інакш!) Рымская імпэрыя.

II

Твор Гарацага адразу ж стаўся ўзорам для перайманьня, прычым топас “помніка” стаў улучаць у сябе ня толькі пытаньне прыжыцьцёвай ды пасьмяротнай паэтычнай славы, але й праблему адносінаў паэта і грамадзтва (найчасьцей, паэта і імпэрыі). З гарацыеўскай ідэальнай гармоніяй прыватна-паэтычнага й грамадзка-дзяржаўніцкага мы сустракаемся ў творы жыхара іншай эпохі й іншай імпэрыі — Расійскай.

Гарацыеўскі “Помнік” мае багатую гісторыю ў расійскай літаратурнай традыцыі. Гэтую оду пераклаў Ламаносаў, насьледаваў ёй Дзяржавін (верш “Памятник”), але ж галоўным постгарацыеўскім творам на гэтую тэму ў расійскай паэзіі стаўся хрэстаматыйна вядомы пушкінскі верш, які афіцыйна называецца ня “Помнік”, а проста па першым радку — “*Я памятник себе воздвиг нерукотворный…*”. Расійскія дасьледнікі літаратуры не бяз гонару адзначаюць, што стварыць шэдэўр, падобны да пушкінскага, праз амаль дзьве тысячы год пасьля Гарацага — задача складаная. Яны згадваюць, да прыкладу, не адзін дзясятак нямецкіх паэтаў XVIII — пачатку XIX стагодзьдзя, якія насьледавалі Гарацаму й яго одзе, але ж гэта былі паэты нават не другога, а трэцяга літаратурнага эшалёну. А тут — менавіта ў расійскага паэта Пушкіна — вялікі твор! Не без злосьлівасьці дазволім сабе перайначыць гэтую думку: чаму тэма й патас, здольныя ў іншых літаратурах спарадзіць адно шматлікіх графаманаў, далі сьвету шэдэўр менавіта ў літаратуры расійскай?

Паставіў помнік я сабе нерукатворны,
Не зарасьце к яму людзкая сьцежка дзён,
Вышэй узьнёсься галавою непакорны

За стоўп Александрыйскі ён.
Не, ўвесь я не памру — душа ў жаданай ліры
Мой прах перажыве, адрынуўшы нябыт,
І ў славе буду я, пакуль пад небам шчыры
Жыць будзе хоць адзін пііт.
(Тут і далей пераклад Рыгора Барадуліна)
Несумнеўна, што мы маем дачыненьне не зь перакладам, а з вольным насьледаваньнем, досыць самастойным вершам, але ж у яго аснову, канечне, пакладзены гарацыеўскі топас. Абсалютна традыцыйны паводле духу пачатак — канстатацыя ўзьнясеньня помніка, за якой ідзе знакамітае параўнаньне гэтага "нерукатворнага" помніка з матэрыяльным "Александрыйскім стаўпом", то бок Аляксандраўскаю калёнай, што была пастаўленая ў Пецярбургу ў 1834 г. у гонар нябожчыка-імпэратара Аляксандра І. Аляксандраўская калёна — годны эквівалент "царскіх пірамідаў" — усёй вэртыкальнасьцю свайго аблічча, мілай кожнаму фройдаўцу, проста правакуе дзёрзкіх "*узьнесьціся вышэй*".
Абяцаньне "*ўвесь я не памру*" даслоўна супадае з адпаведным гарацыянскім, а "*душа ў жаданай ліры*" вельмі пасуе ў якасьці найлепшай, неўміручай часткі паэта, што, як сьцьвярджаў Гарацы, унікне сустрэчы зь Лібітынаю. Спэцыфічна пушкінскім сымбалем трываласьці ўсяго існага стаецца такі стан рэчаў, у якім на зямлі, пад месяцам, яшчэ жыве прынамсі адзін "пііт" — першы й апошні выпадак у вершы, калі аўтар апэруе сусьветнымі катэгорыямі, не абмяжоўваючы фантазію рамамі Расійскай імпэрыі (і гэта на фоне таго, што "адпаведны" фрагмэнт у Гарацага ставіць знак роўнасьці паміж славаю паэта й славаю імпэрыі, да якой ён належыць). Ці то Пушкін на хвіліну забываецца пра свой грамадзянскі абавязак мысьліць катэгорыямі дзяржаўнымі, ці то ў паэтычным захапленьні пашырае межы сваёй краіны да памераў сусьвету. Аднак "агульначалавечае" доўжыцца толькі адну страфу, за якой наступае самы "вялікадзяржаўны" фрагмэнт пушкінскага тэксту.

Маё імя памкне ў прасьцяг Русі вялікі,
І звыкне да яго, калі яшчэ ня звык,
І горды ўнук славян, і фін, і покуль дзікі
Тунгус, і стэпаў друг калмык.

Дадамо, што чарнавы варыянт рукапісу вершу прадугледжваў тут яшчэ трох “меншых братоў” — грузіна, кіргіза й чаркеса, ды, мабыць, пачуццё меры ўзяло верх.
Радыкальна трансфармуецца фінальны зварот да Музы:

Пачуй, о муза, слова Боскае з пашанай,
Ня бойся праўды ты і пра вянок ня дбай;
Паклёп і пахвалу прымай з душой рахманай
І спрэчкі з дурнем не ўшчынай.
Муза губляе вялікую літару ў сваім напісаньні, а разам зь ёй і свой нябесны статус. Гэта ўжо не звышнатуральная істота (Мэльпамэна альбо іншая), не напаўбагавіца, якая спрыяе паэтам. Часы, калі міт успрымаўся як праўда, незваротна сышлі ў нябыт; цяпер ён — адно прыгожая паэтычная мэтафара. Таму й муза ў Пушкіна — адно пэрсаніфікацыя паэтычнага натхненьня. Аднак патрэба ў вялікіх літарах па-ранейшаму існуе, таму побач з музаю-натхненьнем, музаю-пасярэдніцаю ўзьнікае вышэйшая, напраўду аўтарытэтная інстанцыя: паэт у сваёй творчасьці мусіць быць слухмяным “*слову Боскаму*”, якое наперад апраўдвае яго дзеяньні настолькі, што можна быць абыякавым як да паэтычнай славы, так і да няслаўя. Апрача таго, высьвятляецца, што лірычны герой Пушкіна, як і гарацыеўскі, вельмі добра ведае сабе цану й ня будзе лічыцца зь меркаваньнем першага-лепшага чытача, будзь ён хоць “*дзікі тунгус*”.

І доўга буду тым прыязны я народу,
Што лірай добрыя пачуцьці абуджаў,
Што ў мой няўмольны век уславіў я Свабоду
І літасьць да нябог гукаў.
Вось узор максымальнай сьмеласьці й грамадзянскага патасу, дазволеных у мікалаеўскай Расіі: з аднаго боку, хвалюе кожнае шляхетнае сэрца, зь іншага — за такое ў імпэрыі шчэ не караюць. Вось знакаміты прыклад сэмантычнага рыму — “*народу — Свабоду*”. Вось трыяда пушкінскіх заслуг, што робяць яго вартым ушанаваньня “помнікам”: абуджэньне ліраю добрых пачуцьцяў — тая мяжа, дзе эстэтычнае пераходзіць у этычнае; вострапалітычнае ўхваленьне Вольнасьці зь вялікай літары плюс “*літасьць да нябог*”, дзе хрысьціянская спагада да бліжняга ўрываецца ў звычайна чужыя ёй дзяржаўныя справы

(зьвернуты да цара заклік амніставаць удзельнікаў бунту 1825 г.). Вось, дадамо, адны з самых растыражаваных у масавай сьвядомасьці радкоў паэта, што часьцяком суправаджаюць пушкінскія партрэты. Менавіта гэтая страфа ў скажоным цэнзураю выглядзе (з рымам “любезен — полезен” замест “народу — Свободу”) аздабляе вядомы пушкінскі помнік. (Натуральна ж, расійскі, а ня той, што зь нядаўняга часу стаіць у нас на ўзьбярэжжы Сьвіслачы — братні падарунак “*Белоруссии*”.)

Аднак маляваць аўтара адною фарбай усё-ткі не выпадае. Асаблівай увагі варты радок “*І літасьць да нябог гукаў*” (у расійскім арыгінале — “*И милость к падшим призывал*”). У нашым векавым захапленьні пушкінскай міласэрнасьцю (пашкадаваў жа няшчасных дзекабрыстаў!) ды сьмеласьцю (наважыўся ж публічна нагадаць пра лёс ахвяраў царызму!) традыцыйна губляецца за суседнімі словамі слоўка “*падшие*”. А, між іншага, слова гэтае мусіла насьцярожыць сваёй зьняважлівасьцю. (Рыгор Барадулін тонка адчуў гэтую зьняважлівасьць, пераклаўшы “падшие” як “нябогі”.) Відавочна, слова “падший” — “падший” анёл, “падшая” жанчына — не найлепшы эпітэт, які можна было б абраць, характарызуючы хай былых, але ўсё-ткі сваіх аднадумцаў. Калі былыя таварышы, дзекабрысты — грэшнікі, якія, тым ня менш, вартыя спагады — насуперак сваім грахам, таму, што добры хрысьціянін і проста чалавек павінен быць спагадлівым, — дык як гэты радок стасуецца з патасам папярэдняга радка: “*Што ў мой няўмольны век уславіў я Свабоду*”? Калі дзекабрысты — “падшие”, дык з кім паэт гэтую свабоду ўхваляў?

Што гэта? Супярэчнасьць паміж душою, якая прагне вольнасьці, і розумам, які цьвяроза ведае пра неабходнасьць слухмянасьці закону? Канфлікт паміж грамадзянінам Імпэрыі й Грамадзянінам у высокім, радзішчаўскім сэнсе гэтага слова? (У чарнавым варыянце рукапісу Пушкіна чытаем: “*Что вслед Радищеву восславил я Свободу*”.) Думаецца, што супярэчнасьць, да якой мы прыйшлі, уяўная. Дзьве рэчы, якія пушкінскі герой лічыць сваёй заслугаю, — ухваленьне Вольнасьці й заклік дараваць віны грэшнікам — рабіліся ім не адначасова, а зьмянялі адна адну ў часе, і кожнага разу — шчыра й арганічна. Палкі прыхільнік свабоды расчароўваецца (не без дапамогі вонкавых абставінаў!) у сваіх — такіх юначых! —

ідэалах, каб пасьля стацца перакананым апалягетам існага дзяржаўнага ладу. І ўсё б выглядала бездакорна й лягічна пасьлядоўна, каб не адно “але”. Даніну свабодзе лірычны герой аддаваў уласнаю пэрсонай, а “літасьць абуджаў” да іншых, да якіх сам ужо нібыта й не належаў. Пушкін *неўпрыкмет* выключае сябе зь ліку “падших”. Магчыма, спадзяецца, што былая крамола забылася за даўнасьцю гадоў? Альбо лічыць, што ўзорнымі паводзінамі ўжо заслужыў поўную грамадзянскую рэабілітацыю? Але для таго, каб годна разьвітацца з адной пазыцыяй і з усім правам паэта-грамадзяніна прэтэндаваць на іншую, ці не абавязковы шчэ адзін, прамежкавы этап — нешта накшталт каяты, простае ці ўскоснае вырачэньне (публічнае!) сваіх аблудаў, прызнаньне іх няслушнасьці, урэшце, просьба дараваць, зьвернутая да чытачоў, якіх паэт, сам не жадаючы таго, пэўны час уводзіў у зман? Ці не занадта лёгкі спосаб разьвітаньня з уласным мінулым абірае паэт?

Топас “помніка”, гарацыянская формула несьмяротнасьці не дазваляе такіх вольнасьцяў, як “даруй, вельмішаноўны чытачу, я ня меў рацыі!”. Тон лірычнага аповеду мусіць быць роўным ды ўрачыста-ўзьнёслым, не дапускаючы неапраўданых дысанансаў, а корпаньне ў сабе — ня спосаб стварыць сьветлы вобраз песьняра. У гарацыеўскай одзе “Да Мэльпамэны” няма ані згадкі пра рэспубліканскае мінулае рымскага паэта, што пэўны час узначальваў легіён у арміі Брута й змагаўся супраць імпэрскіх плянаў Актавіяна й Антонія. Навошта публічна каяцца, калі сама Ўлада — увасобленая ці то ў Актавіяну з Мэцэнатам, ці то ў Мікалаю з Бэнкендорфам — даравала твае віны, заплюшчыла на іх вочы, прыйшла да высновы, што вялікі паэт, які будзе шчыра й таленавіта ўхваляць новы лад, значна карысьнейшы ёй за дробнага бунтаўніка, пакаранага на навуку іншым! (Да таго ж, іншых пакараных бунтаўнікоў было досыць!) Вось жа, якія б свае заслугі сам паэт, што бярэцца будаваць сабе прыжыцьцёвы помнік, ні палічыў патрэбным згадаць насамперш — прышчапленьне старажытнагрэцкіх вершаваных памераў лацінскай літаратурнай традыцыі альбо абуджэньне ліраю добрых пачуцьцяў у межах усёй “Русі” вялікай, — ягоным галоўным паэтычным вычынам аказваецца сьвядомае ці несьвядомае ўхваленьне існага ладу. А гэткім ладам звычайна бывае імпэрыя, дзе знаходзіцца месца

шматлікім іншамоўным народам, стэпаваму люду цара Даўна, як у Гарацага, альбо сябру іншых стэпаў калмыку; народам, для якіх мова паэта зь цягам часу станецца блізкай і зразумелай і якія з удзячнасьцю будуць выхоўвацца на грамадзянскай лірыцы “старэйшага брата”. Трывалейшыя за медзь нерукачынныя помнікі паэтам — заслужаная ўзнагарода за аптымістычнае сьветаўспрыманьне й сьцьвярджальны патас, за стварэньне — ужывем гэтае папулярнае сёньня словазлучэньне — пазытыўнага вобразу сваёй краіны.

III

Чытаючы верш Адама Міцкевіча “*Exegi munimentum aere perennius… З Гарацага*”, зь вялікай цяжкасьцю даведваешся, што твор быў напісаны трыма гадамі раней за аналізаваны вамі верш Пушкіна, — настолькі ён, здаецца, супрацьпастаўлены пушкінскаму. Але ж твор напраўду напісаны ў Парыжы 12 сакавіка 1833 г., а ўражаньне супрацьпастаўленасьці Пушкіну вынікае адно з ваяўнічай “антыімпэрскасьці” Міцкевіча. Паэт таксама кіраваўся Гарацым як першаўзорам — і польскамоўны верш зьмяшчае ў сабе амаль усе адзнакі топасу “помніка”, якія мы вызначылі вышэй. Але ж як істотна дэфармуецца амаль кожная з гэтых адзнакаў! Прывядзем верш у адзіным на сёньня эквірытмічным беларускім перакладзе, што выкананы Сержам Мінскевічам:

Помнік мой перажыць мае красу Пулаў,
Склеп Касьцюшкі і гмах, што ў Вільні Пац узьняў,
І ня зможа яго Віртэмбэрг разбамбіць,
Ні сьвіньня-аўстрыяк штукай нямецкай зрыць.
Ад Панарскіх вяршынь дый блізкіх Коўна вод
Славай перасягну Прыпяці плыннай брод.
Ўвесь Наваградак, Менск верш прачытаюць мой —
Перапіша радкі моладзь сваёй парой.
У дачок ахмістрынь мой будзе ў ласцы твор,
З браку лепшых яго нават чытацьме двор!
Вось жа, паўз царскі гнеў, турмы й замкі дзьвярэй
Возіць тайна ў Літву кнігі мае габрэй.

Дэфармаваньне гарацыянскага топасу паэт пачынае зь першага ж складніку “помніка” — з самога абвяшчэньня пра пабудаваны манумэнт. Па-першае, паэт будуе не зусім помнік, даючы адно

[2] Adam Mickiewicz. Wybór poezyj. T. 2. Wrocław, 1986. S. 288.

іранічную парафразу оды Гарацага. “*Exegi munimentum…*”, — сьцьвярджае ён назваю свайго твору, то бок — “Я паставіў цьвердзь…”. Па-другое, у Міцкевічавым тэксьце няма дзеяслова, адпаведнага лацінскаму “*exegi*” — акцэнтуецца адно вынік таго, што “помнік” пастаўлены: “*Świeci się pomnik mój*”.
Як і рымскі творца, Міцкевіч таксама параўноўвае “нерукачынны помнік” паэта з пэўнымі матэрыяльнымі аб’ектамі, што ўвасабляюць трываласьць і неўміручасьць. У Міцкевіча такіх аб’ектаў тры. Гэта “*Puław dach*” — славутая рэзыдэнцыя князёў Чартарыйскіх у Пулавах, якая ад часоў Станіслава-Аўгуста й да паўстаньня 1830 г. была асяродкам сьвецкага й культурнага жыцьця магнацкіх колаў. Гэта “*Kościuszki grób*” — вавэльская катэдра ў Кракаве, шырэй — Вавэль як такі. І, нарэшце, гэта “*Paców w Wilnie gmach*” — гаворка ці то пра палац заможнага беларускага магната Антонія Міхала Паца, пабудаваны ў сярэдзіне XVIII ст., ці то пра касьцёл Сьв. Пятра й Паўла, знакаміты сваёй барочнай разьбою, фундатарамі якога таксама былі Пацы. Аднак гэты матыў суаднясеньня “рукачыннага” й “нерукачыннага” істотна пераасэнсоўваецца. Калі гарацыянскія матэрыяльныя аб’екты ўвасаблялі пэўную трываласьць і ледзь ня вечнасьць (прайграючы адно славе паэта), дык Міцкевіч згадвае, між іншага, “*szklany Puław dach*”, які, аказваецца, лёгка можа быць разбураны Віртэмбэргам ці іншым “лотрам” альбо „сьвінюком”. Паэт акцэнтуе крохкасьць, нетрываласьць, нявечнасьць матэрыяльнага — нават калі помнікаў “высокай культуры”, як у выпадку з рэзыдэнцыяй Чартарыйскіх.
Разбуральнікамі ў рымскага паэта былі проліўні ды вятры, а таксама ўсёмагутны час. Міцкевіч ня згадвае прыродных стыхіяў, а называе суб’ектаў вялікай палітыкі, што нясуць сур’ёзную небясьпеку тым вартасьцям, якія рэпрэзэнтуюць паэт ды яго “помнік”. Па-першае, гэта „*лотр Віртэмбэрг*”. Князь Адам Віртэмбэрскі быў сынам нямецкага князя й Марыі з Чартарыйскіх, але пасьля разводу бацькоў выхоўваўся бацькам як немец. Ён быў афіцэрам на расійскай царскай службе й падчас лістападаўскага паўстаньня бамбардаваў згаданы вышэй палац у Пулавах — свой радавы палац. Паводле свайго службовага становішча й паводле свайго выхаваньня ён пэрсаніфікуе адразу двух непрыяцеляў — Расійскую й Прускую імпэрыі. Па-другое, гэта “*сьвіньня-аўстрыяк*”, згадка пра якога

падмацаваная ізноў-ткі выпадам супраць нямецкай тактыкі падкопаў (“*niemiecką sztuką zryć*”). Згадваюцца краіны-агрэсары, імпэрыі, што анэксавалі Рэч Паспалітую, — Расія, Прусія ды Аўстра-Вугоршчына.

Гарацыеўскі альгарытм будаўніцтва помнікаў дыктуе паэту наступны “крок” — ён мусіць акрэсьліць арэал сваёй будучай славы, край, дзе яго будуць шанаваць (пры гэтым добра ўсьведамляючы, за што менавіта шануюць). Міцкевіч акрэсьлівае такую краіну, але ход у творы ня толькі й ня столькі пра будучую славу, колькі пра мясьціны, дзе *ўжо цяпер*, у момант напісаньня вершу, шануюць паэта. Паэт гаворыць пра Панарскія горы, то бок пра Віленшчыну, не забываючы й “*bliźnich Kowna wód*” — маюцца наўвеце Нёман і Вяльля, месца зьліцьця якіх — акурат Коўна. Вось жа, паўночная мяжа славы паэта — Віленшчына й Ковеншчына. Паўднёвая мяжа славы Міцкевіча супадае з паўднёвай мяжой сёньняшняй Беларусі: “*za Prypieci bród*” (захаваўся таксама варыянт “*do poleskich błot*”). Згадваючы мясьціны, дзе яны некалі будуць слынныя, Гарацы, альбо Пушкін, альбо кожны паэт, што распрацоўваў “імпэрскі” варыянт топасу, гавораць пра рубяжы, якіх сягне іх неўміручая слава, якіх таксама сягне ці ўжо сягнула імпэрыя, што яны рэпрэзэнтуюць. То бок разгортваньне паэтычнага тэксту суправаджаецца пэўным працэсам тэрытарыяльнага пашырэньня прысутнасьці (ледзь не сказаў — ваеннай прысутнасьці) паэта. Паэт і яго паэтычная слава скіраваныя вонкі, і іх мэта — апаноўваць новыя й новыя пляцдармы. Зусім па-іншаму ўспрымаецца геаграфічная прастора, акрэсьленая Міцкевічам. Тое, што помнік названы “крэпасьцю”, дазваляе паэту ня проста пералічваць месцы сваёй прыйдучай славы й не імкнуцца да новых і новых межаў, а, хутчэй, узводзіць сьцены гэтага ўмацаваньня. Існаваньне крэпасьці прадугледжвае пэўную вонкавую небясьпеку, ад якой трэба бараніцца. Менавіта гэтай вонкавай небясьпецы й супрацьстаіць паэтычная слава паэта, што ў пэўнай ступені супастаўная з абароннымі мурамі, пра будаўніцтва якіх абвесьціў паэт. Разам з тым, гэтая акрэсьленая Міцкевічам крэпасьць — ня Польшча з Кракавам ды Пулавамі, хаця яны — таксама неабходны складнік топасу помніка. Яны ў нечым эквівалентныя таму сымбалю трываласьці існага стану рэчаў, што абавязкова прысутнічае ў “імпэрскім” топасе помніка

(гарацыеўскі Капітоль з пантыфікам *etc*). Яны нагадваюць пра былую веліч і становяць сабою запаруку велічы будучай. Праўдзівая ж фартэцыя Міцкевіча — гэта гістарычная Літва, тэрыторыі сёньняшняй Беларусі й Летувы. Фартэцыя, якая знаходзіцца ў аблозе, тады як паэт спрабуе дапамагчы ёй звонку. (Твор напісаны ў Парыжы, нагадаем.) Таму не выпадкова згадваецца менская й наваградзкая моладзь, што не лянуецца шматкроць перапісваць вершы паэта: пасьля падзей 1830—1831 гг. творы Міцкевіча ў Расійскай імпэрыі былі забароненыя й хадзілі ў сьпісах. Ад рукі перапісваліся тыя томікі, што кантрабандаю ўвозіліся з-за мяжы — акурат такім чынам, як гэта апісвае аўтар у апошнім радку твору.

Дарэчы, цікавы лёс напаткаў гэты апошні радок у беларускім перакладзе Рыгора Барадуліна. Габрэй, што нелегальна правозіць цераз мяжу забароненыя творы Міцкевіча, стаецца "карчмаром": "*Мае тамы крадком вязе ў Літву карчмар!*" Шмат тагачасных габрэяў напраўду былі карчмарамі — і перакладчык ужывае назву прафэсіі як кантэкстуальны сынонім нацыянальнасьці. Аднак пра каго ў вершы гаворка? Пра Францішка Гжымалу, чыім візытам натхнёны твор. Ф. Гжымала быў вядомым варшаўскім публіцыстам і ў 1821—1825 гадах выдаваў некалькі часопісаў, між іншага "Надвісьлянскую сыбілу" й "Астрэю", дзе зьмясьціў першую рэцэнзію на віленскае выданьне "Вершаў" Міцкевіча[2]. Трохі нетыповы занятак для "карчмара". Вось жа, нават самым таленавітым паэтам, што бяруцца за пераклад, ніколі не пашкодзіць своечасова зазірнуць у камэнтары!

Нарэшце, яшчэ адна істотная адзнака топасу помніка — сымэтрычнасьць рытмічнай пабудовы твору. Мы ўжо адзначалі "люстрана-сымэтрычную" рытміку оды Гарацага, дзе функцыю восі сымэтрыі выконвае цэзура. Калі ўважліва зірнуць на рытмічную арганізацыю верша Міцкевіча, пэўныя рэчы могуць уразіць. Па-першае, гэта мужчынскія канчаткі ўва ўсіх радкох, так званыя мужчынскія кляўзулы — у кожным радку апошні націск прыпадае на апошні склад. Гэта звычайная зьява для беларускага вершаскладаньня, што лёгка дасягаецца за кошт рухомага ў нас націску; але ж у польскай мове націск фіксаваны, прыпадае на перадапошні склад, таму мужчынская кляўзула магчымая адно за кошт вынясеньня ў канец радка выключна кароткіх, аднаскладовых словаў. Па-другое, гэта

рэгулярная мужчынская цэзура пасьля шостага складу. Ізноў-ткі, нічога дзіўнага для нашага сылябатанічнага вершаскладаньня. Так званы “александрыйскі верш”, шасьцістопны ямб з абавязковаю цэзурай пасьля трэцяй стапы, патрабуе ад паэта чагосьці падобнага. Таму нічога дзіўнага, што беларускія пераклады К. Цьвіркі й Р. Барадуліна выкананыя шасьцістопным ямбам з цэзурай. Але тут пачынаюцца цікавасьці. Рэч у тым, што ў польскім сылябічным вершаскладаньні памер, адпаведны “александрыйцу”, — гэта так званы “трынаццаціскладовец”, які вымагае цэзуры не пасьля шостага, а пасьля сёмага складу. Менавіта “трынаццаціскладовец” (накшталт “*Litwo, ojczyzno moja! // Jesteś jak zdrowie…*”) звычайна перакладаецца на нашую мову такім чынам, як Цьвірка й Барадулін пераклалі твор Міцкевіча, але ў Міцкевічавага арыгіналу абсалютна іншы памер — нагадваю, цэзура пасьля шостага, а не пасьля сёмага складу. Гэты памер — аказіянальны для польскай сыстэмы вершаскладаньня. Ён прымушае згадаць памер гарацыеўскай оды — Асклепіядаў верш. Тэкст Міцкевіча — рытмічная стылізацыя пад “Помнік” Гарацага, з такою самай люстрана-сымэтрычнаю пабудовай. І такая мэтрычная арганізацыя невыпадковая: люстраная сымэтрыя, нагадваем, як найбольш пасуе ў рытме твору, які прыпадабняецца аўтарам да архітэктурнай пабудовы. Менавіта таму сярод наяўных беларускіх перакладаў верша мы аддалі перавагу працытаванаму вышэй перакладу Сержа Мінскевіча — як найбліжэйшаму да арыгіналу рытмічна.

IV

Калі Міцкевіч сваім “*munimentum*” паставіў пад знак запытаньня манумэнтальнасьць уласнага твору, дык іншыя “будаўнікі” антыімпэрска-іранічных “помнікаў” робяць болей, ставячы пад сумнеў саму ключавую для такіх твораў мэтафару помніка як несьмяротнай творчасьці й вечнай славы паэта. Можна сказаць, што для такіх паэтаў больш не існуе прэзумпцыі нерукачыннасьці помніка. Само слова “помнік” у гэтым кантэксьце імкліва страчвае свой пераносны сэнс, набываючы якасьці рэальнай пабудовы. Ужо сам Міцкевіч гуляе магчымымі ў ягоным творы “архітэктурнымі” асацыяцыямі. Помнікі ж яго наступнікаў набываюць выразныя антрапаморфныя рысы, якія пакуль могуць намі ўспрымацца як рысы “скульптурныя”. Так,

у вершы Бродзкага пералічваюцца канкрэтныя “помнікавыя” дэталі, запазычаныя з сфэры чалавечай анатоміі:

Я памятник воздвиг себе иной!
К постыдному столетию — *спиной.*
К любви своей потерянной — лицом.
И грудь — велосипедным колесом.
А ягодицы — к морю полуправд <…>.
Ты, Муза, не вини меня за то.
Рассудок мой теперь, как решето,
а не богами налитый сосуд.
Пускай меня низвергнут и снесут,
пускай в самоуправстве обвинят,
пускай меня разрушат, расчленят <…>.
Ніштаватая атрымалася статуя — у найлепшых традыцыях антычнай скульптурнай выявы. (Гэта пацьвярджаюць і “белыя невідушчыя вочы” — заўсёдны атрыбут антычных скульптур, што дайшлі да нас менавіта ў такім выглядзе.)
Але гэта толькі пачатак разбурэньня мэтафары помніка, першы этап гэтага працэсу. Ужо радок Бродзкага “*пускай меня разрушат, расчленят*” наводзіць на пэўныя роздумы. Дзеяслоў “*расчленят*” ня толькі ўзмацняе ўражаньне ад “*разрушат*”, але й дазваляе па-іншаму зірнуць на помнік у творы. Ёсьць у гэтым вобразе нешта чалавечае ўва ўсёй жывой цялеснасьці. Скульптурнай выяве зь верша Бродзкага знаёмае пачуцьцё болю. Вось жа, традыцыйная дыстанцыя паміж творцам і яго творам парушаная, і помнік ужо не ўспрымаецца асобна ад чалавека, якому пастаўлены.

V

Заканамерны крок на шляху ўцелаўленьня ўласнага помніка робіць беларускі літаратар Серж Мінскевіч у сваім тэксьце, што апэлюе ня столькі да гарацыеўскага першаўзору, колькі да пушкінскага твору, значна бліжэйшага да нас у часе й культурнай прасторы. Як прызнаецца сам аўтар, у Смаленску яго вельмі ўразіў такі культурны атракцыён, прызначаны яўна не для нэрвовых: побач з помнікам час ад часу няўгледна ўмыкаўся прайгравальнік — і гучэлі творы. Крыніца “саўндтрэку” заставалася нябачнаю, таму ўражаньне, што побач адбываецца сэанс нейкага чэрававяшчаньня, было досыць

моцным. Шчодрае ўяўленьне нашага аўтара спрацавала “на ўсе сто” — і паўстаў паэтычны тэкст “Помнік з гукавым афармленьнем”:

Акунуўшы мазгі ў ацэтон
Я пяю і сьпяваю пра…
В. Булгакаў

Узладзіў помнік я сабе нерукачынны
А. Пушкін

Там дзе
шумны праспэкт
да пляцу прыходзіць
і тоўсты асфальт
не разбураць
люду тысячы пятак
завяжу я свой погляд
на вузел
марскі
і ногі шырэй расстаўлю
гэтак мушу стаяць пакуль… покуль…
чорт што там далей
пакуль мусіць ня здохну
ці страўнік хрыбта не абдыме
гэтак маю стаяць
і буду раўці
аб нечым… пра… пра…
чорт што там далей…
аб нечым мабыць сьмешна-
жалобным
вось люд той ня пяткай
узгадае калі-нікалі
што нехта… што хтосьці…
чорт што там далей…
што нехта здаецца стаяў і хрыпеў
як помнік з гукавым афармленьнем

У Сержавым опусе недвухсэнсоўна сьцьвярджаецца: помніка, які б існаваў асобна ад свайго аўтара, наагул няма й быць ня

можа. Літаратар, што жыве на мяжы тысячагодзьдзяў, не такі наіўны, каб не ўсьведамляць, наколькі зьмяніўся статус творцы ў чалавечым грамадзтве за апошнія сто пяцьдзясят гадоў. Паэзія як занятак сталася нашмат меней прэстыжнаю, і ўпэўненасьць сучаснага лірыка ва ўласнай несьмяротнасьці выглядала б ці то як гранічная наіўнасьць, ці то як парадыйная гульня ў Гарацага. Нашмат старэйшы за “бумбамлітаўца” Мінскевіча, значна больш дасьведчаны і ўшанаваны паэтычнымі ўзнагародамі аўтар, польскі паэт Чэслаў Мілаш, таксама закрануў гарацыеўска-міцкевічаўска-пушкінскі топас “помніка” — і як жа зьнізіў ягоны патас:

Так, ня цалкам памру. Ад мяне застанецца
Згадка ў энцыкляпэдыі, у чатырнаццатым томе,
Побач з сотняю Мілераў і Мікі-Маўсам…

Пра традыцыйна зразуметы помнік тут няма й размовы: манумэнты патрэбныя ў эпохі, калі аматараў спажываць “разумнае, добрае, вечнае” нашмат больш за колькасьць вытворцаў гэтага дэфіцытнага прадукту. Пісьменьнікаў, мастакоў, кампазытараў яшчэ ня так даўно не ставала на ўсіх, што хацелі адчуць сваю далучанасьць да сьвятоўнага. Таму іх колькасьць можна было штучна падвоіць, патроіць і гэтак далей, паставіўшы *n* у *n*-ай ступені манумэнтаў. Цяпер жа попыт рэзка зьнізіўся, і сёньняшняму чалавеку — асабліва ў краінах, над якімі не вісіць небясьпекі фізычнага зьнішчэньня, а таму й функцыі творцы там вузейшыя — наўрад ці прыйдзе да галавы, што сучасныя яму аўтары вартыя пасьмяротных (ня кажучы ўжо аб прыжыцьцёвых) помнікаў. Ня маюць рацыі тыя, хто кажа, што колькасьць чытачоў паэзіі ў сёньняшнім сьвеце роўная колькасьці паэтаў. Як на мяне, чытачоў сёньня нават менш ад паэтаў, бо далёка ня кожны вершаскладальнік дае сабе працу чытаць калег па пяры, абмяжоўваючыся сабою, улюбёным. Але гэта палова бяды. Цікава супаставіць верш Мінскевіча з эсэ Юрася Барысевіча “Жывыя помнікі”, дзе гаворка ўжо ня толькі пра творцаў, але й пра ўсіх жывых людзей наагул: “Пераважную частку нашага існаваньня ў чалавекападобнай форме мы ня гэтулькі жывём, колькі выконваем функцыю надмагільных помнікаў папярэднім

пакаленьням”[3]. Гэтая ўнівэрсальная заканамернасьць датычыць і сьвету культуры. Назваўшыся паэтам, ты ўжо ня столькі чалавечая асоба сама па сабе, колькі прадстаўнік віду паэтаў. Ты ўжо не індывід, а закладнік паэтычнай традыцыі, адзіны довад яе патрэбнасьці, дарэчнасьці й наагул існаваньня. Лірычны герой нашага паэта ня толькі помнік самому сабе. Ён няхай сабе й карыкатурны, але ўсё-ткі манумэнт усім творцам мінулага. Таму нічога дзіўнага, што ў нязграбнай паставе Сержавага героя можна ўгледзець і ляўравы вянок Гарацага, і пушкінскія бакенбарды, і лысіну Бродзкага, і шмат чаго яшчэ.

Аднак жывы чалавек, у адрозьненьне ад трывалейшых за бронзу стодаў, мусіць сілкавацца чымсьці, апрача ўдзячнасьці нашчадкаў. Таму вынік такога экспэрымэнту лёгка прадказальны й ня вельмі вясёлы: раней ці пазьней рымская багіня Лібітына зьявіцца ў банальнай постаці галоднай сьмерці. Усё, чым застаецца сябе суцяшаць, — гэта людзкая згадка, мімалётны ўспамін пра цікавы пэрформанс, яскравы гепэнінг, так удала зладжаны творцам.

Пераадолець дыстанцыю паміж аўтарам і творам, зрабіць помнік з чалавечага (свайго) цела — гэтага для паэта ўжо замала, і ў ход ідуць графічныя выяўленчыя сродкі. Мінскевіч зьмяшчае свой тэкст на паперы такім чынам, што тэкст гэты ўтварае чалавечую постаць з шырока расстаўленымі рукамі й нагамі. Перад намі прыклад каліграмы, што даводзіць да лягічнага канца ўсе ранейшыя спробы сымэтрычнай арганізацыі тэкстаў, занураных у топас помніка. Прыклад вынаходніцтва, якое, здаецца, ляжала на паверхні, але доўга не выкарыстоўвалася; вынаходніцтва, якое найбольш станоўка пераадольвае мэтафарычную дыстанцыю паміж рэальным корпусам вершаў паэта і ўяўным целам помніка, што прыгожа ўвасабляе ў вечнасьці гэтыя вершы.

VI

Тры апошнія тэксты (улучна з прыведзеным тут беларускім опусам) відочна належаць да іранічнай, антыімпэрскай, неафіцыйнай стратэгіі ў распрацоўцы топасу помніка. Цікава, аднак, наколькі плённым гэты топас стаўся ў нас для

пісьменства каляніяльнага. Найбольш яскравае ўвасабленьне топасу помніка й матыву вечнай славы (хай сабе й непаэтычнай) у беларускай савецкай літаратуры — куляшоўскі “Камсамольскі білет”, аповед пра камсамольца-героя, што загінуў, не пажадаўшы разьвітацца з камсамольскім білетам, сымбалем для сябе чагосьці значна важнейшага за сваё чалавечае жыцьцё:

Так і стаяў, сьмеючыся над катам,
Доўга па целе сьцякала вада;
Так і застаўся стаяць каля хаты,
Быццам з чысьцюткага літы ільда.
Так і стаіць, як жывы, перад намі,
Так і стаіць, прыціскае білет,
І не разьвітваецца зь сябрамі,
І прастаіць яшчэ тысячы лет.
Ды не карой ледзяною пакрыты,
Ды не абліты вадой ледзяной, —
Выліты з бронзы і сонцам абліты
Будзе ён вечна стаяць над зямлёй.
Каляніяльнасьць літаратуры такога гатунку відаць няўзброеным вокам. Гэта праяўляецца і на роўні зьместу (неарыгінальнасьць тэматыкі, што прымушае шукаць першакрыніцу недзе ў мэтраполіі: першае, што прыходзіць да галавы, — “Стихи о советском паспорте” Маякоўскага), і на лінгвістычным роўні (крэалізаванасьць мовы, відаць, вынікае з таго, што твор пісаўся найперш па-расійску, і ўжо потым прыстасоўваўся для патрэбаў беларускага чытача; гэта добра відаць па такіх формах, як “дапрос” замест “допыту”, “ільда” замест “лёду”, “тысячу лет” — паэту не хацелася істотна перарабляць расійскамоўных рымаў).
Але драбязу згаданых мастацкіх хібаў зь лішкам кампэнсуе геніяльны вобраз, варты авідыеўскіх “Мэтамарфозаў”. Цела падлетка, аблітае сьцюдзёнай вадою й такім чынам ператворанае ў лёд, у нас на вачах ператвараецца ў бронзавы помнік гэтаму самаму падлетку. Розум падказвае чытачу, што гэта ня так, што мусіў прамінуць пэўны час, перш як памяць пра героя была ўшанаваная помнікам, але сэрца адмаўляецца даваць веры. Дый як жа ня верыць уласным вачам! Хвілю таму была ледзяная кара — і вось цела ўжо вылітае з бронзы, што

адбываецца ледзь не на вачах патаптаных ворагаў, над якімі трыюмфуюць камсамол ды “каштоўнасьці”, якія ён увасабляе! Вось жа, не ў дысыдэнцкія шасьцідзясятыя гады ў творы Бродзкага, і не ў постмадэрнісцкія дзевяностыя пад гульлівым пяром Мінскевіча, а нашмат раней дыстанцыя паміж помнікам і целам таго, каму гэты помнік ставіцца, была пасьпяхова пераадоленая. І хай гэта не зусім топас “неўміручай паэтычнай славы”, але ж можна на хвілінку прымружыць вочы і ўявіць сабе, што на месцы камсамольскага білета мог быць членскі білет Саюзу Пісьменьнікаў.

VII

Цяжка, аднак, сабе ўявіць, што сусьветная літаратура складаецца адно з тэкстаў, якія нясуць выразны імпэрскі зарад і скіраваныя вонкі, і, з другога боку, з твораў, што стаяць у пэўнай апазыцыі да вышэйзгаданых тэкстаў. Можна згадаць і пэўныя нацыянальныя літаратуры, пэўную культурную сытуацыю, для якой гэтая апазыцыя імпэрскага й антыімпэрскага, вонкіскіраванага й фартэцыібудуючага, уплывыпашыраючага й каштоўнасьцібаронячага й г. д. можа аказацца абсалютна неістотнай. Гэта можна прасачыць і на ўзроўні топасу. Так, вялізарны імпэрскі ці антыімпэрскі патэнцыял, заключаны ў топасе, у такіх культурных варунках можа застацца незапатрабаваным, бо аўтар актуалізуе ў ім зусім іншае, палічыўшы яго патрэбнейшым.
Менавіта такім чынам выкарыстоўвае гарацыеўскі топас помніка Шарль Бадлер. Яго санэт „Мой верш — табе…” („*Je te donne ces vers…*”), які ўва ўсіх трох выданьнях зборніка „Краскі Зла” (*Les Fleurs du Mal*) заканчвае найбольшы ў кнізе цыкль вершаў, прысьвечаны Жане Дзюваль, і ёсьць своеасаблівым „помнікам” каханьня паэта да яе. Найважнейшае ў творы ня тое, што падрыхтаваны чытач мусіць адчуць інтэртэкстуальныя сувязі з Гарацым. Найважнейшае тут тое, што ўвесь палітычны зьмест топасу помніка, безь якога ён, здавалася б, і немагчымы, аказваецца для Бадлера неістотным. Выяўляецца, што паэт у рамах акрэсьленага топасу можа мысьліць сябе асобна ад сваёй дзяржавы, суадносячы й атаесамляючы свой “помнік”, сваю паэтычную спадчыну й будучую славу не з краінаю, нацыяю, эпохаю (як із знакам “плюс”, так і з знакам “мінус”), а з пачуцьцём глыбока інтымным, з сваім пакутлівым каханьнем

да жанчыны, бяз вобразу якой ужо цяжка ўявіць сабе французскую мілосную паэзію. Прывядзем тэкст у нашым перакладзе:

Мой верш — табе! Калі майго натхненьня плён
У будучых часах чытацьме хтось натхнёна,
Калі маё імя падыме на рамёны
І ў далеч панясе магутны аквілён;
Хай памяць пра цябе, нібыта перазвоны,
Чаруе чытача, бярэ яго ў палон —
Ля рымаў гордзівых, нібыта ля калён,
Братэрскіх ланцугоў яе трымаюць зьвёны!
Праклятая, каму ад пекла да нябёс
Адпавядаў адно мой неразумны лёс!
Як згублены з вачэй няпэўны сьлед уночы,
Ты сьветлым позіркам з тупых сьмяротных кпіш,
Ты, стодзе велічны, анёле, чые вочы —
З гагату, а чало — высакародны сьпіж!

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **30-07-2001**
[image]

Юлія Андрэева

ЮЛІЯ АНДРЭЕВА кампазытарка, музычны крытык, выкладчыца Беларускага калегіюму, музычны агляднальнік газэты "Наша Ніва". Апошні артыкул у часопісе --- "Сьвятарная ўдоба на музычным траўніку" (№4-2000).

Легенда пра Вялікае Княства
Легенды Вялікага Княства: Гістарычная музыка Беларусі. Розныя выканаўцы. БМА group. (P) 2001.

Сёлета аматары музыкі атрымалі магчымасьць папоўніць свае фанаграфічныя калекцыі цікавай навінкай. У сакавіку быў выдадзены музычны альбом “Легенды Вялікага Княства”. Апрача “Беларускай музычнай альтэрнатывы”, якая пачынаючы з 1996 году ажыцьцяўляе нацыянальныя праекты ў галіне рок-культуры і ўжо выпусьціла свой чацьверты кампакт-дыск, да гэтай падзеі спрычыніліся беларуская рэдакцыя Радыё Палёнія (альбом надрукаваны ў Польшчы), цэнтар “Супольнасьць” і

моладзевы клюб “Рыцары Вялікага Княства”. Рэклямную кампанію забясьпечыў “Сярэднявечны інфарматар” — электронная сыстэма рассылкі прад’юсэра Ігара Міхны.
Альбом выдадзены на касэце і на кампакт-дыску. На вокладцы (густоўная работа Зьмітра Герасімовіча) можна прачытаць рэклямны тэкст Ігара Міхны, зь якога вынікае, што “Легенды Вялікага Княства” — гэта “першы з плянаванай сэрыі дыскаў, аб’яднаных унікальнай канцэпцыяй”, каб “данесьці слухачу праз голас і гукі інструмэнтаў дух Сярэднявечча й Рэнэсансу. Даць яму адчуць водар свойскага піва, прахалоду замкавых сьценаў, цяпло палацовых камінаў, адчуць стан узбуджэньня ваяра перад бітвай, калі вырашэньне ягонага лёсу перададзена Небу. Змусіць палюбіць сваю тысячагадовую краіну — без выстаўленьня ўмоваў!”.
Канцэпцыя безумоўна паэтычная ды з многіх прычын прывабная. Хаця б таму, што беларускамоўныя цяперака амаль пагалоўна настальгуюць па залатой часіне Вялікага Княства Літоўскага. Выдаўцы альбому пайшлі насустрач гэтай настальгіі, сабраўшы ў адным альбоме розную музыку, якая ва ўяўленьні звычайнага слухача мусіць скласьціся ў рамантычны вобраз Вялікага Княства — краіны-мары. Вясковы фальклёр у альбоме суседзіць з заходнеэўрапейскімі прыдворнымі танцамі. Сучасная беларуская мова — з старажытнай расейшчынай. Акадэмічны хор — з электрагітараю. Аўтэнтычныя мэлёдыі старасьвецкіх кантаў і псальмаў — зь відавочнымі падробкамі “пад даўніну”. Сучасныя рамансы ў стылі Шнітке ці Шастаковіча — з аматарскімі рок-стылізацыямі кшталту савецкіх турысцкіх “аўтарскіх песень”.
Гэткая экстрэмальная разнастайнасьць — натуральны вынік таго, што альбом задумваўся найперш для чыста практычных патрэбаў рыцарскага клюбу, якім кіруе сп-ня Вячорка. У траўні 1999-га “Рыцары Вялікага Княства” распачалі падрыхтоўку да фэсту “Навагрудак 2000”, і ім спатрэбілася музыка, прыдатная для аздабленьня рыцарскіх сьвятаў, вечарынаў і рытуалаў. Першы варыянт альбому быў выдадзены ў Інтэрнэце на сайце “Вызвольнага камітэту Літвы” (**http://members.nbci.com/_XMCM/paustan/main/muz.htm**) пад прэтэнцыёзным назовам “Найлепшы збор ліцьвінскіх песень”.

Яшчэ за часам “Майстроўні” ды “Талакі” ў беларускіх

асяродках гучалі народныя песьні, якім няцяжка было надаць выразны ваярскі калярыт. Існавала нават традыцыя выкананьня тых песень на Аршанскім полі ды пад мурамі Наваградку. Некаторыя зь іх (“Бегла старожа…” і “Валы”) трапілі ў альбом і ўтварылі ягонае зьмястоўнае ядро. Аднак гэтага музычнага матар’ялу было недастаткова. Патрэбныя былі іншыя творы і больш шырокая канцэпцыя. Дзеля гэтага ўкладальнікі дыску прыцягнулі да супрацоўніцтва навуковых кансультантаў — кандыдатку мастацтвазнаўства Вольгу Дадзіёмаву і Аляксея Глушка. Гэткім чынам на вокладцы альбому апынуўся абавязваючы падзагаловак — “Гістарычная музыка Беларусі”. Прэтэнзія на гістарызм, пры ўсёй сваёй прывабнасьці, небясьпечная тым, што прадугледжвае больш высокія патрабаваньні да ўкладальнікаў. Паўстаюць пытаньні пра аўтэнтычнасьць прадстаўленых твораў, пра іх крыніцы, пра слушнасьць іхнае атрыбутыкі, дакладнасьць расшыфроўкі (старажытныя сыстэмы натацыі пакідаюць выканаўцам шмат прасторы для собскае творчасьці) ды пра стыльнасьць выканаўчае інтэрпрэтацыі.

Песьні, сьпяваныя майстроўцамі ды талакоўцамі, паходзілі пераважна з афіцыйных савецкіх натазбораў. Гэтыя песьні, што бытавалі ў народзе, у нататніках фальклярыстаў амаль непазьбежна гублялі сваю аўтэнтычнасьць. Агульнапрынятая сыстэма нотапісу ў дачыненьні да жывое фальклёрнае стыхіі ўвогуле спрыяе скажэньням, бо няздольная зафіксаваць некаторыя дэталі, істотныя для слушнага адтварэньня народнае песьні, а ўдасканаленая сыстэма запісу, больш прыдатная для перадачы адмысловых мэлядыйных арнамэнтаў і іншых тонкасьцяў, характэрных для беларускага песеннага фальклёру, дрэнна прыжывалася ў навуковых установах і музычных выдавецтвах. Гэткім чынам, песьні, якія сьпяваліся ў моладзевых суполках, ужо былі прэпараваныя. Што горш, яны часьцяком былі сфальсыфікаваныя пад уплывам тагачасных ідэалягічных забабонаў. Далей распачынаўся наступны цыкл перапрацоўкі гэтых песень — традыцыйным шляхам, з вуснаў у вусны, але цяпер ужо ў цалкавіта новым культурным кантэксьце. Нават калі песьні абарочваліся ў дастаткова вузкім коле дый ня зьведвалі рашучых трансфармацыяў, яны ў кожным выпадку былі пераінтанаваныя на больш-менш сучасны лад.

Пры запісе асучасьненых народных песень на кампакт-дыск паўстае дылема. Альбо трэба аднавіць іхнае аўтэнтычнае аблічча, ачысьціўшы іх ад рознага роду дэфармацыяў, — аднак у гэтым выпадку губляецца жывы сэнс гэтых песень, іх непасрэдная сувязь з найноўшаю адраджэнскаю традыцыяй, зь лёсамі людзей і суполак, — з усім, што нам дарагое тут і цяпер. Альбо варта захаваць песьні ў тым выглядзе, які яны атрымалі ў выніку сучасных трансфармацыяў, — але адначасова адмовіцца ад усялякае прэтэнзіі на гістарызм, аўтэнтызм, навуковасьць, факталягічную дакладнасьць. Укладальнікі музычнага альбому зусім не абавязаныя прытрымлівацца строгіх крытэраў акадэмічнага музыказнаўства і маюць права абмежаваць свае мэты чыстай забаўляльнасьцю. Калі б выдаўцы выбралі для сабе гэткую тактыку, іх не было б за што крытыкаваць і яны б напэўна заваявалі больш даверу з боку слухачоў.

Зрэшты, калі б навуковыя кансультанты напісалі кароткую гісторыю кожнай песьні, вызначылі ейны першапачатковы жанр, паказалі выпадковыя ды сьвядомыя скажэньні, якія яна зазнала на доўгім шляху да сучаснага слухача, тады былі б і козы сытыя, і сена цэлае. Моладзь атрымала б песьні, якія можна сьпяваць на плошчы, людзі сярэдняга пакаленьня задаволілі б сваю настальгію па рамантычных часох нацыянальнага Адраджэньня, часох іхнае маладосьці, а беларуская гуманістыка ўзбагацілася б каштоўнымі гістарычнымі матар'ялямі. Мо гэткім чынам і ўдалося б спалучыць быццам бы неспалучальнае — рэальную гісторыю Вялікага Княства зь ягонай прыўкраснай легендай? Да гэткага сынтэзу і імкнуліся выдаўцы альбому, аднак задача аказалася невырашальнай. Гэта выявілася ня толькі ў камэнтарах да песень і анатацыях, але іншым разам і ў якасьці выкананьня. Для таго каб ухапіць істоту песьні, ейны характар і патаемны сэнс, трэба ведаць фальклёрныя першакрыніцы і ўмець дакладна вызначыць жанр. Калі гэта не ўдаецца, выканаўца апынаецца ў невыгодным становішчы. Прыкладам, кампазытарка Ларыса Сімаковіч сьпявае песьню "Бегла старожа…", узятую з рэпэртуару "Майстроўні" (сп-ня Сімаковіч была заснавальніцай ейнага сьпеўнага гуртка), у собскай апрацоўцы, якая выдае неразуменьне жанру твору. На маю думку, гэта песьня валачобная (сьпяваная выканаўцамі на

Вялікдзень) — пра гэта сьведчыць традыцыйны прыпеў “Добры вечар…”, а значыць, цесна зьвязаная зь веснавым каляндарным песенным цыклем, з даўнымі веснавымі абрадамі і гульнямі. Адной з гэтых гульняў было жартаўлівае выкраданьне нявестаў (“А мы проса сеялі, сеялі… А мы проса вытапчам, вытапчам…”). Менавіта ў гэтым любоўна-жартаўлівым сэнсе й трэба разумець сэнс словаў:

…Ўжо ж тваю дзевачку татары ўзялі,
Добры вечар…
Я ж тых татароў мячом пасяку,
Добры вечар…
Я ж ту дзевачку за сябе вазьму…

Іначай кажучы, гэтая песьня — накшталт вясковае сэрэнады. Хадзілі валачобнікі па дварох, пужалі дзяўчат казачнымі татарамі, а яны цешыліся, бо песьня распавядала ім пра каханьне ды будучы шлюб. Не разумеючы гэтага, сп-ня Сімаковіч сьпявае пра гвалт і вайну. Такія памылкі ў дачыненьні да фальклёру даволі тыповыя. Прыкладам:

Ой, наехала Літва,
Будзе бітва не мала…

Вельмі лёгка памыліцца, калі ня ведаеш, што гэтая песьня *свадзёбная*.

А прычына памылкі толькі ў тым, што песьня вырваная з свайго натуральнага кантэксту. Сп-ня Сімаковіч напэўна заўдзячвае і тэкст, і музычны матар’ял, прадстаўлены на дыску, альбо “Анталёгіі беларускай народнай песьні” Генадзя Цітовіча (Менск: Беларусь, 1962, выд. 2-е, дап., 1975), альбо акадэмічнаму збору “Зімовыя песьні”, таксама выдадзенаму яшчэ за савецкім часам. У абодвух натазборах песьня памылкова пазначана як калядная, і гэтае ж азначэньне надрукаванае на вокладцы касэты (гэтая папяровая вокладка ўвогуле значна багацейшая на інфармацыю, чым шыкоўная капэрта кампакт-дыску).

З анталёгіямі ўсё цалкам зразумела. Валачобных песень савецкая навука не любіла, як і ўсіх, зьвязаных з рэлігійнымі сьвятамі. Аднак гэта зусім ня значыць, што жанр валачобнай песьні быў занядбаны маладымі дасьледчыкамі — студэнтамі ды школьнікамі. На пачатку 1980-ых гэтым жанрам цікавіўся

таленавіты музыказнаўца Сяржук Мыцько, але месца на кансэрваторскай катэдры для яго не знайшлося, і ён пайшоў працаваць на завод. Ягоныя распрацоўкі засталіся, дый прафэсарка Ларыса Касьцюкавец вучыла сваіх студэнтаў адрозьніваць валачобныя песьні ад калядных. Аднак ані сп-ня Сімаковіч, ані навуковыя кансультанты не заўважылі памылкі. Яшчэ больш цікавая гісторыя надарылася зь песьняю “Юр’я й цмок”. У анатацыі сп-ні Дадзіёмава вызначае гэтую песьню як міталягічную — я, праўду кажучы, такі жанр сустракаю ўпершыню. У сапраўднасьці ж гэта псальма, прычым шырока распаўсюджаная ў Беларусі — рэдкі год кансэрваторская фальклёрная экспэдыцыя не прывозіць чарговага ейнага варыянту.

Псальма — гэта старажытны духоўны кант, адзін з жанраў беларускага фальклёру: песьня на біблійны альбо жыційны сюжэт, перапрацаваны ў апакрыфічным сялянскім духу; гэткія песьні сьпяваліся пераважна лірнікамі. (Псальму (жаночага роду) ня варта блытаць з псальмам (мужчынскага роду), бо псальм альбо псалом — гэта кананічны верш з Псалтыры, і іх аўтарства традыцыйна прыпісваецца цару Давіду.)

Што да “Юр’я”, дык наш славуты дасьледчык Рыгор Шырма хацеў надрукаваць гэтую песьню ў трэцім томе сваіх “Беларускіх народных песень” (Менск: Дзяржвыд. БССР, 1962), але цэнзура забараніла друкаваць тэкст, прасякнуты глыбокім рэлігійным пачуцьцём. Тады нейкі трэцярадны паэт — цяпер ужо немагчыма высьветліць ягонае прозьвішча — за сьціплы савецкі ганарар напісаў новыя вершы (“Даўно, даўно тое было — кругом зямлі мора лягло…”).

Гэткім чынам псальма трапіла-ткі ў Шырмаў збор. Адтуль, зразумела ж, у сфальсыфікаваным варыянце, яна перавандравала ў анталёгію. Цяпер ужо цяжка з дакладнасьцю вызначыць, які тэкст “Юр’я” прапанаваў выдаўцам Рыгор Шырма, бо псальма гэтая ходзіць у народзе ў розных варыянтах. Хіба што можна працытаваць яе пачатковыя радкі з кнігі Паўла Шэйна “Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края” (т. 2, ч. 1, Пецярбург, 1887—1902. С. 599—600):

А гдзе ж была няверная зямля —
Ня верыли госпаду богу,

А верыли поганому цмоку.
Давали яму дань вяликую,
Як дай подай до остатняго.
Прышла по дань и к самому цару,
К самому цару на яго доню…

Далей у гэтай доўгай і прыгожай псальме распавядаецца, як падмануў цар сваю дачку, як павёз яе да цмока, як яна плакала, як плаваў цмок у сінім моры, як цар з дачкой богу памаліліся (“пацеркі казалі”), як сьвяты Юры сваім кап’ём дзяўчыну ад цмока выратаваў… У вершы трэцяраднага паэта нічога гэтага, вядома ж, няма: уся прыгажосьць і паэтычнасьць кудысьці зьнікла.
Пераўтварыўшы псальму ў “юраўскую песьню” і пазбавіўшы яе рэлігійнасьці, выдаўцы анталёгіяў заадно пазьбеглі якіх-любя згадак пра беларускіх лірнікаў, апяяных Манюшкам і Сыракомлем. Лірнікі хадзілі па вёсках і сьпявалі псальмы; гэта была адметная частка беларускай культурнай традыцыі, якая не ўмяшчалася ў тэарэтычныя схемы афіцыйнага музыказнаўства. Паводле марксісцкіх тэорыяў, творцам народнае музыкі мог быць толькі народ. Шэрая і безаблічная сялянская маса, у якой губляецца ўсякая індывідуальнасьць. Лірнікі ж былі незалежнымі вольнымі творцамі. Цікава, што Алег Пузыня выконвае “Юр’я” з акампанэмэнтам ліры, хаця псальма запісаная ў альбом у сфальсыфікаваным (“юраўскім”) варыянце. Паводле ўспамінаў Віялеты Кавалёвай, кіраўнічкі сьпеўнага гуртка “Дзяньніца”, які існаваў у другой палове 80-ых, іхны саліст Іван Агееў сьпяваў гэтую псальму таксама зь “юраўскім” тэкстам, прычым сябры суполкі былі ўпэўненыя, што песьня сапраўдная, рэдкая і што Агееў прывёз яе з сваёй роднай вёскі. Фальсыфікацыі не заўважылі й навуковыя кансультанты, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы альбому. Увогуле, навуковыя кансультанты безразважна прымалі на веру ўсё, што паведамлялі ім выканаўцы наконт той ці іншай песьні. Прыкладам, удзельнікі “Майстроўні” заўжды былі ўпэўненыя, што “Вайтоўна” — гэта старадаўняя гістарычная песьня.
У анатацыі, зьмешчанай на вокладцы касэты, сп-ня Дадзіёмава некрытычна паўтарае гэтую характарыстыку, хоць паводле ўсіх прыкметаў гэта народная баляда XIX — пачатку XX стагодзьдзя з тыповымі для яе пэрсанажамі — Войтам і Вайтоўнай — і

фантазійным сюжэтам.
Песьня “Валы” апынулася ў альбоме ўвогуле без усялякіх камэнтароў, хаця яны патрэбныя гэтаму расповеду пра тое, як “…Не сьцюдзёну воду пілі, Па тры разы ў Крым хадзілі…”. Вэтэраны моладзевых суполак дружна сьцьвярджаюць, што яна засталася ў спадчыну ад “Майстроўні” ды “Талакі”. Мо таму сп. Міхна называе гэтую песьню ваярскай. Аднак “Валы” — песьня не ваярская, а чумацкая і датуецца другой паловай XVIII стагодзьдзя. Хадзілі некалі чумакі да чарнаморскіх ліманаў па соль, ня ведаючы, што гэткія скарбы ў неверагодных колькасьцях ляжаць у іх пад нагамі. Падарожжы па соль былі доўгія й небясьпечныя — праца для сапраўдных мужчынаў. Але ваяўнічасьці ў гэтых крымскіх прыгодах было няшмат, дый самі чумакі наўрад ці былі падобныя да грунвальдзкіх рыцараў. Фантазія моладзі цалкам перамяніла песьню знутры, надаўшы ёй іншы сэнс і захаваўшы некранутай ейную форму. Зрэшты, гэткія трансфармацыі ўвогуле тыповыя для фальклёру. Прыкладам, “Саўку і Грышку” сьпявалі даўней на Каляды, а ў XX стагодзьдзі гэтая песьня перайшла ў дзіцячы ўжытак. Але гісторыя з “Валамі” — у пэўным сэнсе ўнікальная: чумацкая песьня загучала на рыцарскіх сьвятах. Хіба ж ня варта было хаця б зазначыць этапы гэткай дзівоснай эвалюцыі? Мяркуючы па ўсім, навуковыя кансультанты яе папросту не заўважылі. Як не заўважылі й рэчаў куды больш прыкметных. Яскравы прыклад — “Гой-гой”. Паводле азначэньня, зьмешчанага на вокладцы касэты, — застольная шляхецкая песьня XVII стагодзьдзя. Як распавёў мне спадар Міхна, гэтая мэлёдыя сталася вядомая ў моладзевых суполках дзякуючы ўдзельніцы фольк-гурту “Гуда” Вользе Емяльянчык (цяпер яна жыве ў Наваполацку ды працуе выкладчыцаю ў Полацкім унівэрсытэце). У той жа навучальні працаваў і Зьміцер Сасноўскі. Тамака ён і пачуў гэтую песьню ды апрацаваў яе для свайго гурту “Стары Ольса”.
Аднак гэта толькі частка гісторыі. “Гой-гой” — застольны эратычны кант, узяты з натазбору “Куранты” (1733) — аднаго з галоўных помнікаў беларуска-ўкраінскае пісьмовае музычнае традыцыі. Збор складаецца з застольных кантаў рознага зьместу — часам ня дужа прыстойных — і захоўваецца ў Санкт-Пецярбургу, дзе яго дэталёва дасьледаваў Адам Мальдзіс. Гісторык культуры зрабіў з гэтага рукапісу ксэракопію, прывёз

яе ў Беларусь і аддаў кампазытару Віктару Капыцьку. Той апрацаваў старадаўнія мэлёдыі ды стварыў зь іх вялізную кантату, якая з посьпехам выконвалася ў філярмоніі. Навукоўцы, праўда, тую кантату лаялі, бо Капыцька крыху наблытаў ў расшыфроўцы кантаў дый нібыта сказіў сам дух XVIII стагодзьдзя. Аднак шырокая публіка была ў захапленьні. Сп-ня Емяльянчык мела магчымасьць праслухаць Капыцькаву кантату ня толькі ў менскай філярмоніі, але і ў Полацку, куды Дзяржаўны камэрны хор Беларусі пад кіраўніцтвам Ігара Мацюхова неаднойчы прыяжджаў на гастролі. Сп-ня Емяльянчык запомніла мэлёдыю з надзвычайнай дакладнасьцю. Хіба што тэкст аказаўся сфальсыфікаваны: у арыгінале ён напісаны старабеларускай мовай, а ў варыянце, які апынуўся на дыску, — найсучаснейшай беларушчынай. Як гэта сталася? Даведацца ўжо хіба што немагчыма.

Дзіўна, што шаноўныя навукоўцы не распазналі гэтай мэлёдыі, а найдзіўней, што яны не распазналі яшчэ аднаго нумару з Капыцькавай кантаты, узятага адтуль, як кажуць, жыўцом — у аўтарызаваным выкананьні Дзяржаўнага камэрнага хору Беларусі (на вокладцы ён пазначаны як “хор пад кіраўніцтвам І. Мацюхова”). Гэты фрагмэнт пазначаны на дыску як “застольны кант”. Але ні прозьвішча аўтара, ні крыніца, зь якой ён быў узяты, нідзе ня згадваюцца.

Кантам навуковыя кансультанты ўвогуле не далі рады. Прыкладам, “Кант” (пазначаны дадаткова як “старажытная песьня”) у напаўдылетанцкім выкананьні двух студэнтаў кансэрваторыі — насамрэч зусім ня кант, а страсная псальма (“Нас дзеля расьпятага Марыя відзяшчы…”) на верш расейскага паэта, праваслаўнага мітрапаліта Дзімітрыя Растоўскага Тупталы (1651—1709). Імя паэта на вокладцы не пазначанае. А яно акурат сьведчыць пра расейска-ўкраінскае паходжаньне гэтай псальмы, хаця яна шырока сьпявалася й беларусамі, і сэрбамі, і баўгарамі. Паўстаюць істотныя пытаньні таксама й наконт таго, зь якой крыніцы яна была ўзятая. Напэўна ж, не з рукапісу, які знаходзіцца ў расейскіх архівах (н. пр. 20 ГИМ, ед. хр. А 926, Щукинск. сб., 554, № 48) і амаль недаступны для нашых дасьледчыкаў. Да таго ж, калі б псальма была ўзятая з арыгіналу, выканаўцы б засьпявалі некалькі куплетаў, бо псальма доўгая і прыгожая. Напрошваецца адзіная магчымая выснова: што яна была “запазычаная”, разам з навуковаю

расшыфроўкаю, альбо з рукапісных матар'ялаў прафэсаркі Ларысы Касьцюкавец, якія апошнім часам вандравалі па руках розных дасьледчыкаў, альбо зь ейнай кнігі "Кантовая культура в Белоруссии" (Менск: Вышэйшая школа, 1975. С. 61.) Варта было б надрукаваць адпаведную спасылку, але гэта не было зроблена.

Да таго ж, спосаб выкананьня гэтай псальмы істотна перакруціў ейны стыль і дух. У арыгінале яна сьпявалася на тры галасы, што ўвогуле характэрна для псальмаў XVIII стагодьздзя. Сольны сьпеў з акампанэмэнтам гітары разбурае сувязь з традыцыяй праваслаўнай царкоўнай музыкі і надае гэтай псальме рысы італьянскай эратычнай песенькі з часоў чынквэчэнта. Калі ж укладальнікі дыску сьвядома мелі на мэце гэткую трансфармацыю, варта было хаця б указаць аўтара аранжаваньня.

Прафэсійная музычная культура Беларусі прадстаўлена лютневымі п'есамі Войцеха Длугарая і Валянціна Бакфарка. Гэтыя творы трапілі ў альбом з ініцыятывы сп-ні Дадзіёмавай. Яна ж падрыхтавала біяграфічныя нататкі пра абодвух кампазытараў. І Длугарай, і Бакфарк даволі папулярныя ў Эўропе. Іхная творчасьць добра дасьледаваная, а пераважная большасьць твораў даступныя для праслухоўваньня ў Інтэрнэце праз сыстэму Real Audio. Гэткім чынам, можна чытаць, слухаць і параўноўваць. Сп-ня Дадзіёмава піша, што Длугарай нарадзіўся ў 1550 ці ў 1557 годзе, а памёр у 1619 і што месца ягонага нараджэньня невядомае. "Mała encyklopedia muzyki" (Warszawa, PWN, 1981) паведамляе, што кампазытар нарадзіўся прыблізна ў 1550 годзе, а памёр пасьля 1619. Гэткія ж зьвесткі — і ў "Музыкальной энциклопедии" (Т. 2. Москва, Советская энциклопедия, 1974). А вось у некаторых інтэрнэтаўскіх даведніках (прыкладам, "Tim's Classical Music Database", **www.timdebrie.myweb.nl**) чытаем, што Войцех Адальбэрт Длугарай нарадзіўся каля 1550-га, а памёр каля 1603 году. Што ж датычыць месца нараджэньня, дык усе даступныя нам даведнікі ўказваюць на мястэчка Гастынец недзе ў Польшчы (як высьветлілася, мястэчкаў з гэткім назовам у Польшчы даволі-ткі многа).

Далей сп-ня Дадзіёмава піша, што музычную адукацыю Длугарай "атрымаў дзякуючы мэцэнату Самуэлю Збароўскаму". Аднак Збароўскі быў кім заўгодна — палітыкам, інтрыганам,

забойцам — толькі не мэцэнатам. (На пачатку XX стагодзьдзя ў Парыжы жыў паэт і мэцэнат Леапольд Збароўскі, які апекаваўся беларускім мастаком Хаімам Суціным. Ня блытаць.) Длугарай трапіў у двор Збароўскага падлеткам і цярпеў ад таго бясконцыя зьдзекі. Потым зьбег у кляштар, адкуль яго прагналі за неадчэпную прагу да жыцьцёвых асалодаў (якіх — гісторыя маўчыць). Тут яго ізноў "прыхапіў" Збароўскі, але тым разам хлопец адшукаў кампрамат на свайго "мэцэната" і перадаў яго ў рукі Яна Замойскага — тагачаснага вялікага кароннага канцлера і кароннага гетмана. Збароўскаму адсяклі галаву, а спрытны лютніст уладкаваўся на працу ў каралеўскую капэлу Сьцяпана Батуры. Пра гэтую гісторыю сп-ня Дадзіёмава ня згадвае, затое даводзіць, што Длугарай цягам трох гадоў (1583—1586) служыў пры Батуравым двары ў Горадні. Аднак каралеўская капэла месьцілася ня ў Горадні, а ў Кракаве — афіцыйнай рэзыдэнцыі польскіх каралёў, і Длугарай пратрымаўся ў ёй ня тры гады, а два. У 1585 годзе, ратуючыся ад помсты магутных сваякоў Самуэля Збароўскага, лютніст зьбег у Нямеччыну, і далей ягоныя сьляды губляюцца.

Ёсьць памылкі і ў біяграфічнай даведцы пра Валентыя (Балента) Бакфарка, які, паводле ўсіх даведнікаў, нарадзіўся ў 1507 годзе, а не ў 1506-м, як пазначана на дыску. Ды ў Вільні ён працаваў не адзінаццаць гадоў запар (1554—1565), а значна меней. Насамрэч, кампазытар прыехаў туды ў 1551 годзе, але ў хуткім часе выправіўся ў падарожжа, наведаў Данцыг, Аўгсбург, Ліён, Рым, Вэнэцыю і, нарэшце, Каралявец, дзе пасябраваў з герцагам Брандэнбурскім — найлюцейшым ворагам Літвы і Кароны. За гэта Жыгімонт II Аўгуст у 1559 годзе выправіў Бакфарка з Рэчы Паспалітай. А потым загадаў жаўнерам абрабаваць і разбурыць Бакфаркаў дом у Вільні. Яшчэ больш пытаньняў выклікаюць самі творы. Адкуль зьявіліся п'еса "Танец Баторы", а таксама "Танцы" № 18 і 22, якія не фігуруюць ні ў адным сьпісе Длугараевых ды Бакфаркавых твораў? Бакфарк увогуле не кампанаваў аніякіх танцаў. Верны вучань нідэрляндзкіх паліфаністаў, ён пісаў амаль выключна рычэркары ды фантазіі. (Рычэркар — жанр імітацыйнай паліфоніі, тыповы для позьняга рэнэсансу і раньняга барока; інструмэнтальная п'еса, скампанаваная паводле жорсткіх правілаў ды мудрагелістых матэматычных

разьлікаў. Фантазія — таксама жанр імітацыйнай паліфоніі; інструмэнтальная п’еса больш свабоднай пабудовы, аднак у межах паліфанічнага “строгага стылю”.) Сам творчы мэтад, ужываны Бакфаркам, быў надта далёкі ад побытавае музычнае стыхіі. Ідучы за прынцыпамі “вучонае музыкі”, кампазытар быў вымушаны вынішчаць з сваёй музыкі якія-любя прыкметы сымэтрыі, а значыцца — і танцавальнасьці.

Музыка Длугарая, на першы погляд, бліжэйшая да побытавых першакрыніцаў. Амаль усе п’есы ў кароткім сьпісе ягоных твораў належаць да папулярнага ў той час жанру вілянэлы*. “Танцу Баторы” і проста “Танцу” ў гэтым сьпісе няма. Адзіны твор, які выбіваецца з традыцыйнай на той час намэнклятуры жанраў, — гэта “Chorea polonica” (“Польскі танец”). Усе творы Длугарая, даступныя для праслухоўваньня, напісаныя ў аднолькавай манеры. Яны грунтуюцца на сярэднявечнай мадальнай гармоніі, аздобленай далікатнымі паліфанічнымі ўкрапінамі. Абодва творы, што трапілі на дыск, створаны зусім у іншым стылі, з выключнаю апораю на гэтак званыя “тры акорды”, характэрныя для побытавай музыкі XVIII стагодзьдзя, а яшчэ больш — для падробак пад даўніну.

У гэтым жа стылі напісаны і “Танец” Бакфарка — пры тым, што Бакфарк быў паліфаністам… Магчыма, гэта пралік недасьведчанага расшыфроўніка? У XIV—XVII стагодзьдзях інструмэнтальная музыка — асабліва ж лютневыя творы — друкаваліся ў выглядзе табулятуры. Гэтая форма запісу адлюстроўвала музыку даволі-ткі схематычна, з выкарыстаньнем складанай сыстэмы літараў і лічбаў. Чытаньне табулятуры патрабуе пэўных навыкаў. У нас спэцыялістаў гэткага кшталту ўвогуле не рыхтуюць, таму было б асабліва цікава даведацца, хто рабіў расшыфроўкі. Нядрэнна было б зьмясьціць і спасылкі на адпаведныя натазборы, каб слухач быў упэўнены ў аўтэнтычнасьці прапанаваных яму старажытных твораў. А таксама на дасьледчыкаў, якія рупіліся, каб адшукаць гэтыя творы ў архівах.

На шчасьце, музычны зьмест новага альбому апынуўся лепшым, чым ягонае навуковае забесьпячэньне. Прынамсі, у якасьці лёгкай музыкі для адпачынку ён спадабаецца і прыдасца. Тут нават ёсьць свае шэдэўры. Адну толькі песьню выканаў Алег Пузыня — але й яе аказалася дастаткова, каб надаць альбому адметны калярыт. Пузыня — чалавек вядомы ў

сваім рамястве. Менавіта ён у 1980-ых гадох пачаў граць на старажытных беларускіх музычных інструмэнтах, якія на той час амаль цалкам выйшлі з ужытку. Дзякуючы Пузыню шырокія колы слухачоў упершыню даведаліся, што ў Беларусі, акрамя цымбалаў, існавалі й дудка, ліра, басэтля. Нават скрыпку за савецкім часам выкрэсьлівалі зь ліку беларускіх народных інструмэнтаў, каб падагнаць гучаньне беларускіх народных аркестраў пад узор расейскага аркестру балалаечнікаў імя В. Андрэева. Гукавы сьвет беларускай народнай музыкі, які адкрыў сп. Пузыня, быў нашмат багацейшы.

Два творы — “А мой дзядзька дуднік быў” і “Кракавяк” — гучаць у выкананьні дудара Алеся Журы. Жура — адзін з найлепшых выканаўцаў народнае музыкі ў цэлай Беларусі. Летась ён меў вялікі посьпех на славутым дударскім фэсьце імя Ўільяма Кенэдзі ў мястэчку Эрд Мхача (Паўночная Ірляндыя). Дарэчы, дзіўна было чытаць у ARCHE (“Слоўнік Свабоды”, № 7, 2000), што дуда і дудка — тое самае. Памыліўся Міхась Скобла: падабенства тутака ня болей, чым паміж шафай і шапікам.

Прыемна паслухаць і галасы цудоўных сьпевакоў — Андрэя Латушкіна, Рамана Ліхашапкі й Паўла Сілівончыка. Гэтыя хлопцы выконваюць ня толькі баляды, але й песьні каляндарнага цыклю, што засталіся нам у спадчыну ад паганскае старажытнасьці. Сьпяваюць утрох, без акампанэмэнту і паліфанічных мудрагелістасьцяў, характэрных для старажытных песень, найчасьцей ва ўнісон — так, як зазвычай сьпяваліся салдацкія песьні на пачатку XX стагодзьдзя. Гучыць сьвежа й вельмі па-наску.

Не расчаруецца слухач, калі паслухае апрацоўкі народных песень, зробленыя Зьмітром Сасноўскім для свайго фольк-рок-гурту “Стары Ольса”. Тут менеў аўтэнтычнасьці, затое болей шыку і весялосьці. Прываблівае нечаканая натуральнасьць спалучэньня старажытных акустычных і сучасных электрычных інструмэнтаў, мадэрных вострых рытмаў і старасьвецкіх плынных мэлёдыяў. Намаганьнямі фальклёрных гуртоў, якія сьпяваюць песьні, папулярныя ў асяродках беларускай інтэлігенцыі, тыя песьні вяртаюцца ў народ — той народ, што выходзіць на дэманстрацыі ды змагаецца за сваю лепшую долю. Гэтаму народу адчайна не стае песень, хаця песьні неверагодным багацьцем ляжаць у яго пад нагамі…

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **04-08-2001**
[image]

Юлія Андрэева

ЮЛІЯ АНДРЭЕВА кампазытарка, музычны крытык, выкладчыца Беларускага калегіюму, музычны агляднальнік газэты "Наша Ніва". Апошні артыкул у часопісе --- "Сьвятарная ўдоба на музычным траўніку" (№4-2000).

Легенда пра Вялікае Княства
Легенды Вялікага Княства: Гістарычная музыка Беларусі. Розныя выканаўцы. БМА group. (P) 2001.

Сёлета аматары музыкі атрымалі магчымасьць папоўніць свае фанаграфічныя калекцыі цікавай навінкай. У сакавіку быў выдадзены музычны альбом “Легенды Вялікага Княства”. Апрача “Беларускай музычнай альтэрнатывы”, якая пачынаючы з 1996 году ажыцьцяўляе нацыянальныя праекты ў галіне рок-культуры і ўжо выпусьціла свой чацьверты кампакт-дыск, да гэтай падзеі спрычыніліся беларуская рэдакцыя Радыё Палёнія (альбом надрукаваны ў Польшчы), цэнтар “Супольнасьць” і

моладзевы клюб “Рыцары Вялікага Княства”. Рэклямную кампанію забясьпечыў “Сярэднявечны інфарматар” — электронная сыстэма рассылкі прад’юсэра Ігара Міхны.
Альбом выдадзены на касэце і на кампакт-дыску. На вокладцы (густоўная работа Зьмітра Герасімовіча) можна прачытаць рэклямны тэкст Ігара Міхны, зь якога вынікае, што “Легенды Вялікага Княства” — гэта “першы з плянаванай сэрыі дыскаў, аб’яднаных унікальнай канцэпцыяй”, каб “данесьці слухачу праз голас і гукі інструмэнтаў дух Сярэднявечча й Рэнэсансу. Даць яму адчуць водар свойскага піва, прахалоду замкавых сьценаў, цяпло палацовых камінаў, адчуць стан узбуджэньня ваяра перад бітвай, калі вырашэньне ягонага лёсу перададзена Небу. Змусіць палюбіць сваю тысячагадовую краіну — без выстаўленьня ўмоваў!”.
Канцэпцыя безумоўна паэтычная ды з многіх прычын прывабная. Хаця б таму, што беларускамоўныя цяперака амаль пагалоўна настальгуюць па залатой часіне Вялікага Княства Літоўскага. Выдаўцы альбому пайшлі насустрач гэтай настальгіі, сабраўшы ў адным альбоме розную музыку, якая ва ўяўленьні звычайнага слухача мусіць скласьціся ў рамантычны вобраз Вялікага Княства — краіны-мары. Вясковы фальклёр у альбоме суседзіць з заходнеэўрапейскімі прыдворнымі танцамі. Сучасная беларуская мова — з старажытнай расейшчынай. Акадэмічны хор — з электрагітараю. Аўтэнтычныя мэлёдыі старасьвецкіх кантаў і псальмаў — зь відавочнымі падробкамі “пад даўніну”. Сучасныя рамансы ў стылі Шнітке ці Шастаковіча — з аматарскімі рок-стылізацыямі кшталту савецкіх турысцкіх “аўтарскіх песень”.
Гэткая экстрэмальная разнастайнасьць — натуральны вынік таго, што альбом задумваўся найперш для чыста практычных патрэбаў рыцарскага клюбу, якім кіруе сп-ня Вячорка. У траўні 1999-га “Рыцары Вялікага Княства” распачалі падрыхтоўку да фэсту “Навагрудак 2000”, і ім спатрэбілася музыка, прыдатная для аздабленьня рыцарскіх сьвятаў, вечарынаў і рытуалаў. Першы варыянт альбому быў выдадзены ў Інтэрнэце на сайце “Вызвольнага камітэту Літвы” (**http://members.nbci.com/_XMCM/paustan/main/muz.htm**) пад прэтэнцыёзным назовам “Найлепшы збор ліцьвінскіх песень”.

Яшчэ за часам “Майстроўні” ды “Талакі” ў беларускіх

асяродках гучалі народныя песьні, якім няцяжка было надаць выразны ваярскі калярыт. Існавала нават традыцыя выкананьня тых песень на Аршанскім полі ды пад мурамі Наваградку. Некаторыя зь іх (“Бегла старожа…” і “Валы”) трапілі ў альбом і ўтварылі ягонае зьмястоўнае ядро. Аднак гэтага музычнага матар’ялу было недастаткова. Патрэбныя былі іншыя творы і больш шырокая канцэпцыя. Дзеля гэтага ўкладальнікі дыску прыцягнулі да супрацоўніцтва навуковых кансультантаў — кандыдатку мастацтвазнаўства Вольгу Дадзіёмаву і Аляксея Глушка. Гэткім чынам на вокладцы альбому апынуўся абавязваючы падзагаловак — “Гістарычная музыка Беларусі”. Прэтэнзія на гістарызм, пры ўсёй сваёй прывабнасьці, небясьпечная тым, што прадугледжвае больш высокія патрабаваньні да ўкладальнікаў. Паўстаюць пытаньні пра аўтэнтычнасьць прадстаўленых твораў, пра іх крыніцы, пра слушнасьць іхнае атрыбутыкі, дакладнасьць расшыфроўкі (старажытныя сыстэмы натацыі пакідаюць выканаўцам шмат прасторы для собскае творчасьці) ды пра стыльнасьць выканаўчае інтэрпрэтацыі.

Песьні, сьпяваныя майстроўцамі ды талакоўцамі, паходзілі пераважна з афіцыйных савецкіх натазбораў. Гэтыя песьні, што бытавалі ў народзе, у нататніках фальклярыстаў амаль непазьбежна гублялі сваю аўтэнтычнасьць. Агульнапрынятая сыстэма нотапісу ў дачыненьні да жывое фальклёрнае стыхіі ўвогуле спрыяе скажэньням, бо няздольная зафіксаваць некаторыя дэталі, істотныя для слушнага адтварэньня народнае песьні, а ўдасканаленая сыстэма запісу, больш прыдатная для перадачы адмысловых мэлядыйных арнамэнтаў і іншых тонкасьцяў, характэрных для беларускага песеннага фальклёру, дрэнна прыжывалася ў навуковых установах і музычных выдавецтвах. Гэткім чынам, песьні, якія сьпяваліся ў моладзевых суполках, ужо былі прэпараваныя. Што горш, яны часьцяком былі сфальсыфікаваныя пад уплывам тагачасных ідэалягічных забабонаў. Далей распачынаўся наступны цыкл перапрацоўкі гэтых песень — традыцыйным шляхам, з вуснаў у вусны, але цяпер ужо ў цалкавіта новым культурным кантэксьце. Нават калі песьні абарочваліся ў дастаткова вузкім коле дый ня зьведвалі рашучых трансфармацыяў, яны ў кожным выпадку былі пераінтанаваныя на больш-менш сучасны лад.

Пры запісе асучасьненых народных песень на кампакт-дыск паўстае дылема. Альбо трэба аднавіць іхнае аўтэнтычнае аблічча, ачысьціўшы іх ад рознага роду дэфармацыяў, — аднак у гэтым выпадку губляецца жывы сэнс гэтых песень, іх непасрэдная сувязь з найноўшаю адраджэнскаю традыцыяй, зь лёсамі людзей і суполак, — з усім, што нам дарагое тут і цяпер. Альбо варта захаваць песьні ў тым выглядзе, які яны атрымалі ў выніку сучасных трансфармацыяў, — але адначасова адмовіцца ад усялякае прэтэнзіі на гістарызм, аўтэнтызм, навуковасьць, факталягічную дакладнасьць. Укладальнікі музычнага альбому зусім не абавязаныя прытрымлівацца строгіх крытэраў акадэмічнага музыказнаўства і маюць права абмежаваць свае мэты чыстай забаўляльнасьцю. Калі б выдаўцы выбралі для сабе гэткую тактыку, іх не было б за што крытыкаваць і яны б напэўна заваявалі больш даверу з боку слухачоў.

Зрэшты, калі б навуковыя кансультанты напісалі кароткую гісторыю кожнай песьні, вызначылі ейны першапачатковы жанр, паказалі выпадковыя ды сьвядомыя скажэньні, якія яна зазнала на доўгім шляху да сучаснага слухача, тады былі б і козы сытыя, і сена цэлае. Моладзь атрымала б песьні, якія можна сьпяваць на плошчы, людзі сярэдняга пакаленьня задаволілі б сваю настальгію па рамантычных часох нацыянальнага Адраджэньня, часох іхнае маладосьці, а беларуская гуманістыка ўзбагацілася б каштоўнымі гістарычнымі матар'ялямі. Мо гэткім чынам і ўдалося б спалучыць быццам бы неспалучальнае — рэальную гісторыю Вялікага Княства зь ягонай прыўкраснай легендай? Да гэткага сынтэзу і імкнуліся выдаўцы альбому, аднак задача аказалася невырашальнай. Гэта выявілася ня толькі ў камэнтарах да песень і анатацыях, але іншым разам і ў якасьці выкананьня. Для таго каб ухапіць істоту песьні, ейны характар і патаемны сэнс, трэба ведаць фальклёрныя першакрыніцы і ўмець дакладна вызначыць жанр. Калі гэта не ўдаецца, выканаўца апынаецца ў невыгодным становішчы. Прыкладам, кампазытарка Ларыса Сімаковіч сьпявае песьню "Бегла старожа…", узятую з рэпэртуару "Майстроўні" (сп-ня Сімаковіч была заснавальніцай ейнага сьпеўнага гуртка), у собскай апрацоўцы, якая выдае неразуменьне жанру твору. На маю думку, гэта песьня валачобная (сьпяваная выканаўцамі на

Вялікдзень) — пра гэта сьведчыць традыцыйны прыпеў “Добры вечар…”, а значыць, цесна зьвязаная зь веснавым каляндарным песенным цыклем, з даўнымі веснавымі абрадамі і гульнямі. Адной з гэтых гульняў было жартаўлівае выкраданьне нявестаў (“А мы проса сеялі, сеялі… А мы проса вытапчам, вытапчам…”). Менавіта ў гэтым любоўна-жартаўлівым сэнсе й трэба разумець сэнс словаў:

…Ўжо ж тваю дзевачку татары ўзялі,
Добры вечар…
Я ж тых татароў мячом пасяку,
Добры вечар…
Я ж ту дзевачку за сябе вазьму…

Іначай кажучы, гэтая песьня — накшталт вясковае сэрэнады. Хадзілі валачобнікі па дварох, пужалі дзяўчат казачнымі татарамі, а яны цешыліся, бо песьня распавядала ім пра каханьне ды будучы шлюб. Не разумеючы гэтага, сп-ня Сімаковіч сьпявае пра гвалт і вайну. Такія памылкі ў дачыненьні да фальклёру даволі тыповыя. Прыкладам:

Ой, наехала Літва,
Будзе бітва не мала…

Вельмі лёгка памыліцца, калі ня ведаеш, што гэтая песьня *свадзёбная*.

А прычына памылкі толькі ў тым, што песьня вырваная з свайго натуральнага кантэксту. Сп-ня Сімаковіч напэўна заўдзячвае і тэкст, і музычны матар’ял, прадстаўлены на дыску, альбо “Анталёгіі беларускай народнай песьні” Генадзя Цітовіча (Менск: Беларусь, 1962, выд. 2-е, дап., 1975), альбо акадэмічнаму збору “Зімовыя песьні”, таксама выдадзенаму яшчэ за савецкім часам. У абодвух натазборах песьня памылкова пазначана як калядная, і гэтае ж азначэньне надрукаванае на вокладцы касэты (гэтая папяровая вокладка ўвогуле значна багацейшая на інфармацыю, чым шыкоўная капэрта кампакт-дыску).

З анталёгіямі ўсё цалкам зразумела. Валачобных песень савецкая навука не любіла, як і ўсіх, зьвязаных з рэлігійнымі сьвятамі. Аднак гэта зусім ня значыць, што жанр валачобнай песьні быў занядбаны маладымі дасьледчыкамі — студэнтамі ды школьнікамі. На пачатку 1980-ых гэтым жанрам цікавіўся

таленавіты музыказнаўца Сяржук Мыцько, але месца на кансэрваторскай катэдры для яго не знайшлося, і ён пайшоў працаваць на завод. Ягоныя распрацоўкі засталіся, дый прафэсарка Ларыса Касьцюкавец вучыла сваіх студэнтаў адрозьніваць валачобныя песьні ад калядных. Аднак ані сп-ня Сімаковіч, ані навуковыя кансультанты не заўважылі памылкі. Яшчэ больш цікавая гісторыя надарылася зь песьняю “Юр’я й цмок”. У анатацыі сп-ні Дадзіёмава вызначае гэтую песьню як міталягічную — я, праўду кажучы, такі жанр сустракаю ўпершыню. У сапраўднасьці ж гэта псальма, прычым шырока распаўсюджаная ў Беларусі — рэдкі год кансэрваторская фальклёрная экспэдыцыя не прывозіць чарговага ейнага варыянту.

Псальма — гэта старажытны духоўны кант, адзін з жанраў беларускага фальклёру: песьня на біблійны альбо жыційны сюжэт, перапрацаваны ў апакрыфічным сялянскім духу; гэткія песьні сьпяваліся пераважна лірнікамі. (Псальму (жаночага роду) ня варта блытаць з псальмам (мужчынскага роду), бо псальм альбо псалом — гэта кананічны верш з Псалтыры, і іх аўтарства традыцыйна прыпісваецца цару Давіду.)

Што да “Юр’я”, дык наш славуты дасьледчык Рыгор Шырма хацеў надрукаваць гэтую песьню ў трэцім томе сваіх “Беларускіх народных песень” (Менск: Дзяржвыд. БССР, 1962), але цэнзура забараніла друкаваць тэкст, прасякнуты глыбокім рэлігійным пачуцьцём. Тады нейкі трэцярадны паэт — цяпер ужо немагчыма высьветліць ягонае прозьвішча — за сьціплы савецкі ганарар напісаў новыя вершы (“Даўно, даўно тое было — кругом зямлі мора лягло…”).

Гэткім чынам псальма трапіла-ткі ў Шырмаў збор. Адтуль, зразумела ж, у сфальсыфікаваным варыянце, яна перавандравала ў анталёгію. Цяпер ужо цяжка з дакладнасьцю вызначыць, які тэкст “Юр’я” прапанаваў выдаўцам Рыгор Шырма, бо псальма гэтая ходзіць у народзе ў розных варыянтах. Хіба што можна працытаваць яе пачатковыя радкі з кнігі Паўла Шэйна “Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края” (т. 2, ч. 1, Пецярбург, 1887—1902. С. 599—600):

А гдзе ж была няверная зямля —
Ня верыли госпаду богу,

А верыли поганому цмоку.
Давали яму дань вяликую,
Як дай подай до остатняго.
Прышла по дань и к самому цару,
К самому цару на яго доню…

Далей у гэтай доўгай і прыгожай псальме распавядаецца, як падмануў цар сваю дачку, як павёз яе да цмока, як яна плакала, як плаваў цмок у сінім моры, як цар з дачкой богу памаліліся (“пацеркі казалі”), як сьвяты Юры сваім кап’ём дзяўчыну ад цмока выратаваў… У вершы трэцяраднага паэта нічога гэтага, вядома ж, няма: уся прыгажосьць і паэтычнасьць кудысьці зьнікла.
Пераўтварыўшы псальму ў “юраўскую песьню” і пазбавіўшы яе рэлігійнасьці, выдаўцы анталёгіяў заадно пазьбеглі якіх-любя згадак пра беларускіх лірнікаў, апяяных Манюшкам і Сыракомлем. Лірнікі хадзілі па вёсках і сьпявалі псальмы; гэта была адметная частка беларускай культурнай традыцыі, якая не ўмяшчалася ў тэарэтычныя схемы афіцыйнага музыказнаўства. Паводле марксісцкіх тэорыяў, творцам народнае музыкі мог быць толькі народ. Шэрая і безаблічная сялянская маса, у якой губляецца ўсякая індывідуальнасьць. Лірнікі ж былі незалежнымі вольнымі творцамі. Цікава, што Алег Пузыня выконвае “Юр’я” з акампанэмэнтам ліры, хаця псальма запісаная ў альбом у сфальсыфікаваным (“юраўскім”) варыянце. Паводле ўспамінаў Віялеты Кавалёвай, кіраўнічкі сьпеўнага гуртка “Дзяньніца”, які існаваў у другой палове 80-ых, іхны саліст Іван Агееў сьпяваў гэтую псальму таксама зь “юраўскім” тэкстам, прычым сябры суполкі былі ўпэўненыя, што песьня сапраўдная, рэдкая і што Агееў прывёз яе з сваёй роднай вёскі. Фальсыфікацыі не заўважылі й навуковыя кансультанты, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы альбому. Увогуле, навуковыя кансультанты безразважна прымалі на веру ўсё, што паведамлялі ім выканаўцы наконт той ці іншай песьні. Прыкладам, удзельнікі “Майстроўні” заўжды былі ўпэўненыя, што “Вайтоўна” — гэта старадаўняя гістарычная песьня.
У анатацыі, зьмешчанай на вокладцы касэты, сп-ня Дадзіёмава некрытычна паўтарае гэтую характарыстыку, хоць паводле ўсіх прыкметаў гэта народная баляда XIX — пачатку XX стагодзьдзя з тыповымі для яе пэрсанажамі — Войтам і Вайтоўнай — і

фантазійным сюжэтам.
Песьня “Валы” апынулася ў альбоме ўвогуле без усялякіх камэнтароў, хаця яны патрэбныя гэтаму расповеду пра тое, як “…Не сьцюдзёну воду пілі, Па тры разы ў Крым хадзілі…”. Вэтэраны моладзевых суполак дружна сьцьвярджаюць, што яна засталася ў спадчыну ад “Майстроўні” ды “Талакі”. Мо таму сп. Міхна называе гэтую песьню ваярскай. Аднак “Валы” — песьня не ваярская, а чумацкая і датуецца другой паловай XVIII стагодзьдзя. Хадзілі некалі чумакі да чарнаморскіх ліманаў па соль, ня ведаючы, што гэткія скарбы ў неверагодных колькасьцях ляжаць у іх пад нагамі. Падарожжы па соль былі доўгія й небясьпечныя — праца для сапраўдных мужчынаў. Але ваяўнічасьці ў гэтых крымскіх прыгодах было няшмат, дый самі чумакі наўрад ці былі падобныя да грунвальдзкіх рыцараў. Фантазія моладзі цалкам перамяніла песьню знутры, надаўшы ёй іншы сэнс і захаваўшы некранутай ейную форму. Зрэшты, гэткія трансфармацыі ўвогуле тыповыя для фальклёру. Прыкладам, “Саўку і Грышку” сьпявалі даўней на Каляды, а ў XX стагодзьдзі гэтая песьня перайшла ў дзіцячы ўжытак. Але гісторыя з “Валамі” — у пэўным сэнсе ўнікальная: чумацкая песьня загучала на рыцарскіх сьвятах. Хіба ж ня варта было хаця б зазначыць этапы гэткай дзівоснай эвалюцыі? Мяркуючы па ўсім, навуковыя кансультанты яе папросту не заўважылі. Як не заўважылі й рэчаў куды больш прыкметных. Яскравы прыклад — “Гой-гой”. Паводле азначэньня, зьмешчанага на вокладцы касэты, — застольная шляхецкая песьня XVII стагодзьдзя. Як распавёў мне спадар Міхна, гэтая мэлёдыя сталася вядомая ў моладзевых суполках дзякуючы ўдзельніцы фольк-гурту “Гуда” Вользе Емяльянчык (цяпер яна жыве ў Наваполацку ды працуе выкладчыцаю ў Полацкім унівэрсытэце). У той жа навучальні працаваў і Зьміцер Сасноўскі. Тамака ён і пачуў гэтую песьню ды апрацаваў яе для свайго гурту “Стары Ольса”.
Аднак гэта толькі частка гісторыі. “Гой-гой” — застольны эратычны кант, узяты з натазбору “Куранты” (1733) — аднаго з галоўных помнікаў беларуска-ўкраінскае пісьмовае музычнае традыцыі. Збор складаецца з застольных кантаў рознага зьместу — часам ня дужа прыстойных — і захоўваецца ў Санкт-Пецярбургу, дзе яго дэталёва дасьледаваў Адам Мальдзіс. Гісторык культуры зрабіў з гэтага рукапісу ксэракопію, прывёз

яе ў Беларусь і аддаў кампазытару Віктару Капыцьку. Той апрацаваў старадаўнія мэлёдыі ды стварыў зь іх вялізную кантату, якая з посьпехам выконвалася ў філярмоніі. Навукоўцы, праўда, тую кантату лаялі, бо Капыцька крыху наблытаў ў расшыфроўцы кантаў дый нібыта сказіў сам дух XVIII стагодзьдзя. Аднак шырокая публіка была ў захапленьні. Сп-ня Емяльянчык мела магчымасьць праслухаць Капыцькаву кантату ня толькі ў менскай філярмоніі, але і ў Полацку, куды Дзяржаўны камэрны хор Беларусі пад кіраўніцтвам Ігара Мацюхова неаднойчы прыяжджаў на гастролі. Сп-ня Емяльянчык запомніла мэлёдыю з надзвычайнай дакладнасьцю. Хіба што тэкст аказаўся сфальсыфікаваны: у арыгінале ён напісаны старабеларускай мовай, а ў варыянце, які апынуўся на дыску, — найсучаснейшай беларушчынай. Як гэта сталася? Даведацца ўжо хіба што немагчыма.

Дзіўна, што шаноўныя навукоўцы не распазналі гэтай мэлёдыі, а найдзіўней, што яны не распазналі яшчэ аднаго нумару з Капыцькавай кантаты, узятага адтуль, як кажуць, жыўцом — у аўтарызаваным выкананьні Дзяржаўнага камэрнага хору Беларусі (на вокладцы ён пазначаны як “хор пад кіраўніцтвам І. Мацюхова”). Гэты фрагмэнт пазначаны на дыску як “застольны кант”. Але ні прозьвішча аўтара, ні крыніца, зь якой ён быў узяты, нідзе ня згадваюцца.

Кантам навуковыя кансультанты ўвогуле не далі рады. Прыкладам, “Кант” (пазначаны дадаткова як “старажытная песьня”) у напаўдылетанцкім выкананьні двух студэнтаў кансэрваторыі — насамрэч зусім ня кант, а страсная псальма (“Нас дзеля расьпятага Марыя відзяшчы…”) на верш расейскага паэта, праваслаўнага мітрапаліта Дзімітрыя Растоўскага Тупталы (1651—1709). Імя паэта на вокладцы не пазначанае. А яно акурат сьведчыць пра расейска-ўкраінскае паходжаньне гэтай псальмы, хаця яна шырока сьпявалася й беларусамі, і сэрбамі, і баўгарамі. Паўстаюць істотныя пытаньні таксама й наконт таго, зь якой крыніцы яна была ўзятая. Напэўна ж, не з рукапісу, які знаходзіцца ў расейскіх архівах (н. пр. 20 ГИМ, ед. хр. А 926, Щукинск. сб., 554, № 48) і амаль недаступны для нашых дасьледчыкаў. Да таго ж, калі б псальма была ўзятая з арыгіналу, выканаўцы б засьпявалі некалькі куплетаў, бо псальма доўгая і прыгожая. Напрошваецца адзіная магчымая выснова: што яна была “запазычаная”, разам з навуковаю

расшыфроўкаю, альбо з рукапісных матар'ялаў прафэсаркі Ларысы Касьцюкавец, якія апошнім часам вандравалі па руках розных дасьледчыкаў, альбо зь ейнай кнігі "Кантовая культура в Белоруссии" (Менск: Вышэйшая школа, 1975. С. 61.) Варта было б надрукаваць адпаведную спасылку, але гэта не было зроблена.

Да таго ж, спосаб выкананьня гэтай псальмы істотна перакруціў ейны стыль і дух. У арыгінале яна сьпявалася на тры галасы, што ўвогуле характэрна для псальмаў XVIII стагодьздзя. Сольны сьпеў з акампанэмэнтам гітары разбурае сувязь з традыцыяй праваслаўнай царкоўнай музыкі і надае гэтай псальме рысы італьянскай эратычнай песенькі з часоў чынквэчэнта. Калі ж укладальнікі дыску сьвядома мелі на мэце гэткую трансфармацыю, варта было хаця б указаць аўтара аранжаваньня.

Прафэсійная музычная культура Беларусі прадстаўлена лютневымі п'есамі Войцеха Длугарая і Валянціна Бакфарка. Гэтыя творы трапілі ў альбом з ініцыятывы сп-ні Дадзіёмавай. Яна ж падрыхтавала біяграфічныя нататкі пра абодвух кампазытараў. І Длугарай, і Бакфарк даволі папулярныя ў Эўропе. Іхная творчасьць добра дасьледаваная, а пераважная большасьць твораў даступныя для праслухоўваньня ў Інтэрнэце праз сыстэму Real Audio. Гэткім чынам, можна чытаць, слухаць і параўноўваць. Сп-ня Дадзіёмава піша, што Длугарай нарадзіўся ў 1550 ці ў 1557 годзе, а памёр у 1619 і што месца ягонага нараджэньня невядомае. "Mała encyklopedia muzyki" (Warszawa, PWN, 1981) паведамляе, што кампазытар нарадзіўся прыблізна ў 1550 годзе, а памёр пасьля 1619. Гэткія ж зьвесткі — і ў "Музыкальной энциклопедии" (Т. 2. Москва, Советская энциклопедия, 1974). А вось у некаторых інтэрнэтаўскіх даведніках (прыкладам, "Tim's Classical Music Database", **www.timdebrie.myweb.nl**) чытаем, што Войцех Адальбэрт Длугарай нарадзіўся каля 1550-га, а памёр каля 1603 году. Што ж датычыць месца нараджэньня, дык усе даступныя нам даведнікі ўказваюць на мястэчка Гастынец недзе ў Польшчы (як высьветлілася, мястэчкаў з гэткім назовам у Польшчы даволі-ткі многа).

Далей сп-ня Дадзіёмава піша, што музычную адукацыю Длугарай "атрымаў дзякуючы мэцэнату Самуэлю Збароўскаму". Аднак Збароўскі быў кім заўгодна — палітыкам, інтрыганам,

забойцам — толькі не мэцэнатам. (На пачатку XX стагодзьдзя ў Парыжы жыў паэт і мэцэнат Леапольд Збароўскі, які апекаваўся беларускім мастаком Хаімам Суціным. Ня блытаць.) Длугарай трапіў у двор Збароўскага падлеткам і цярпеў ад таго бясконцыя зьдзекі. Потым зьбег у кляштар, адкуль яго прагналі за неадчэпную прагу да жыцьцёвых асалодаў (якіх — гісторыя маўчыць). Тут яго ізноў "прыхапіў" Збароўскі, але тым разам хлопец адшукаў кампрамат на свайго "мэцэната" і перадаў яго ў рукі Яна Замойскага — тагачаснага вялікага кароннага канцлера і кароннага гетмана. Збароўскаму адсяклі галаву, а спрытны лютніст уладкаваўся на працу ў каралеўскую капэлу Сьцяпана Батуры. Пра гэтую гісторыю сп-ня Дадзіёмава ня згадвае, затое даводзіць, што Длугарай цягам трох гадоў (1583—1586) служыў пры Батуравым двары ў Горадні. Аднак каралеўская капэла месьцілася ня ў Горадні, а ў Кракаве — афіцыйнай рэзыдэнцыі польскіх каралёў, і Длугарай пратрымаўся ў ёй ня тры гады, а два. У 1585 годзе, ратуючыся ад помсты магутных сваякоў Самуэля Збароўскага, лютніст зьбег у Нямеччыну, і далей ягоныя сьляды губляюцца.

Ёсьць памылкі і ў біяграфічнай даведцы пра Валентыя (Балента) Бакфарка, які, паводле ўсіх даведнікаў, нарадзіўся ў 1507 годзе, а не ў 1506-м, як пазначана на дыску. Ды ў Вільні ён працаваў не адзінаццаць гадоў запар (1554—1565), а значна меней. Насамрэч, кампазытар прыехаў туды ў 1551 годзе, але ў хуткім часе выправіўся ў падарожжа, наведаў Данцыг, Аўгсбург, Ліён, Рым, Вэнэцыю і, нарэшце, Каралявец, дзе пасябраваў з герцагам Брандэнбурскім — найлюцейшым ворагам Літвы і Кароны. За гэта Жыгімонт II Аўгуст у 1559 годзе выправіў Бакфарка з Рэчы Паспалітай. А потым загадаў жаўнерам абрабаваць і разбурыць Бакфаркаў дом у Вільні. Яшчэ больш пытаньняў выклікаюць самі творы. Адкуль зьявіліся п'еса "Танец Баторы", а таксама "Танцы" № 18 і 22, якія не фігуруюць ні ў адным сьпісе Длугараевых ды Бакфаркавых твораў? Бакфарк увогуле не кампанаваў аніякіх танцаў. Верны вучань нідэрляндзкіх паліфаністаў, ён пісаў амаль выключна рычэркары ды фантазіі. (Рычэркар — жанр імітацыйнай паліфоніі, тыповы для позьняга рэнэсансу і раньняга барока; інструмэнтальная п'еса, скампанаваная паводле жорсткіх правілаў ды мудрагелістых матэматычных

разьлікаў. Фантазія — таксама жанр імітацыйнай паліфоніі; інструмэнтальная п’еса больш свабоднай пабудовы, аднак у межах паліфанічнага “строгага стылю”.) Сам творчы мэтад, ужываны Бакфаркам, быў надта далёкі ад побытавае музычнае стыхіі. Ідучы за прынцыпамі “вучонае музыкі”, кампазытар быў вымушаны вынішчаць з сваёй музыкі якія-любя прыкметы сымэтрыі, а значыцца — і танцавальнасьці.

Музыка Длугарая, на першы погляд, бліжэйшая да побытавых першакрыніцаў. Амаль усе п’есы ў кароткім сьпісе ягоных твораў належаць да папулярнага ў той час жанру вілянэлы*. “Танцу Баторы” і проста “Танцу” ў гэтым сьпісе няма. Адзіны твор, які выбіваецца з традыцыйнай на той час намэнклятуры жанраў, — гэта “Chorea polonica” (“Польскі танец”). Усе творы Длугарая, даступныя для праслухоўваньня, напісаныя ў аднолькавай манеры. Яны грунтуюцца на сярэднявечнай мадальнай гармоніі, аздобленай далікатнымі паліфанічнымі ўкрапінамі. Абодва творы, што трапілі на дыск, створаны зусім у іншым стылі, з выключнаю апораю на гэтак званыя “тры акорды”, характэрныя для побытавай музыкі XVIII стагодзьдзя, а яшчэ больш — для падробак пад даўніну.

У гэтым жа стылі напісаны і “Танец” Бакфарка — пры тым, што Бакфарк быў паліфаністам… Магчыма, гэта пралік недасьведчанага расшыфроўніка? У XIV—XVII стагодзьдзях інструмэнтальная музыка — асабліва ж лютневыя творы — друкаваліся ў выглядзе табулятуры. Гэтая форма запісу адлюстроўвала музыку даволі-ткі схематычна, з выкарыстаньнем складанай сыстэмы літараў і лічбаў. Чытаньне табулятуры патрабуе пэўных навыкаў. У нас спэцыялістаў гэткага кшталту ўвогуле не рыхтуюць, таму было б асабліва цікава даведацца, хто рабіў расшыфроўкі. Нядрэнна было б зьмясьціць і спасылкі на адпаведныя натазборы, каб слухач быў упэўнены ў аўтэнтычнасьці прапанаваных яму старажытных твораў. А таксама на дасьледчыкаў, якія рупіліся, каб адшукаць гэтыя творы ў архівах.

На шчасьце, музычны зьмест новага альбому апынуўся лепшым, чым ягонае навуковае забесьпячэньне. Прынамсі, у якасьці лёгкай музыкі для адпачынку ён спадабаецца і прыдасца. Тут нават ёсьць свае шэдэўры. Адну толькі песьню выканаў Алег Пузыня — але й яе аказалася дастаткова, каб надаць альбому адметны калярыт. Пузыня — чалавек вядомы ў

сваім рамястве. Менавіта ён у 1980-ых гадох пачаў граць на старажытных беларускіх музычных інструмэнтах, якія на той час амаль цалкам выйшлі з ужытку. Дзякуючы Пузыню шырокія колы слухачоў упершыню даведаліся, што ў Беларусі, акрамя цымбалаў, існавалі й дудка, ліра, басэтля. Нават скрыпку за савецкім часам выкрэсьлівалі зь ліку беларускіх народных інструмэнтаў, каб падагнаць гучаньне беларускіх народных аркестраў пад узор расейскага аркестру балалаечнікаў імя В. Андрэева. Гукавы сьвет беларускай народнай музыкі, які адкрыў сп. Пузыня, быў нашмат багацейшы.

Два творы — “А мой дзядзька дуднік быў” і “Кракавяк” — гучаць у выкананьні дудара Алеся Журы. Жура — адзін з найлепшых выканаўцаў народнае музыкі ў цэлай Беларусі. Летась ён меў вялікі посьпех на славутым дударскім фэсьце імя Ўільяма Кенэдзі ў мястэчку Эрд Мхача (Паўночная Ірляндыя). Дарэчы, дзіўна было чытаць у ARCHE (“Слоўнік Свабоды”, № 7, 2000), што дуда і дудка — тое самае. Памыліўся Міхась Скобла: падабенства тутака ня болей, чым паміж шафай і шапікам.

Прыемна паслухаць і галасы цудоўных сьпевакоў — Андрэя Латушкіна, Рамана Ліхашапкі й Паўла Сілівончыка. Гэтыя хлопцы выконваюць ня толькі баляды, але й песьні каляндарнага цыклю, што засталіся нам у спадчыну ад паганскае старажытнасьці. Сьпяваюць утрох, без акампанэмэнту і паліфанічных мудрагелістасьцяў, характэрных для старажытных песень, найчасьцей ва ўнісон — так, як зазвычай сьпяваліся салдацкія песьні на пачатку XX стагодзьдзя. Гучыць сьвежа й вельмі па-наску.

Не расчаруецца слухач, калі паслухае апрацоўкі народных песень, зробленыя Зьмітром Сасноўскім для свайго фольк-рок-гурту “Стары Ольса”. Тут менеў аўтэнтычнасьці, затое болей шыку і весялосьці. Прываблівае нечаканая натуральнасьць спалучэньня старажытных акустычных і сучасных электрычных інструмэнтаў, мадэрных вострых рытмаў і старасьвецкіх плынных мэлёдыяў. Намаганьнямі фальклёрных гуртоў, якія сьпяваюць песьні, папулярныя ў асяродках беларускай інтэлігенцыі, тыя песьні вяртаюцца ў народ — той народ, што выходзіць на дэманстрацыі ды змагаецца за сваю лепшую долю. Гэтаму народу адчайна не стае песень, хаця песьні неверагодным багацьцем ляжаць у яго пад нагамі…

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **04-08-2001**
[image]

Алесь Эроціч

Адзін погляд на Бэрлін з Крыжовай гары

АЛЕСЬ ЭРОЦІЧ беларускі мастак-нонканфарміст. У 90-ых заснаваў у Менску мастацкую суполку "Галіна", галерэю "Шостая лінія" і тэатар Сталёвы аргазм". Аўтар артыкулу Беларускі стрыптыз" у АКСНЕ-Парнаграфіі. З 1999 году стала жыве ў Бэрліне.

Вялікі бэзавы месяц прыматкабожыўся каля краю каменнага коміну. Куды ні кінеш позірк, паўсюль дахі, дахі… І толькі сьпічастыя кірхі вылазяць, нібыта шылы зь меху… Я ўсадзіў сваё ўяўленьне на дах, густа парослы экзатычнымі флянцамі, і слухаю музыку начнога гораду. Ноч падае на зямлю зорнай мапай, летаргія скавала горад, здранцьвеньне павісла сярод бэтонных скалаў. Натыкаючыся на сонныя ліпы, блукаюць россыпы жаночага сьмеху… Тут паветра мае смак, а гук — гушчыню. Суседнія тэрасы густа пакрыты елачкамі гашышу, і самотная варона завісла над імі ў шкляным паветры. Шіха струменіць час над дахамі, незаўважна пракручваюцца гадзіны ночы, зоркі сьцякаюць вільгацьцю… Паціху фантазіі канвэртуюцца ў фізіялёгію, і ўсё гэта становіцца Кройцбэргам. Нехта скажа пра Кройцбэрг, што гэта каменны мех у цэнтры Бэрліна, што тут цэнтар нямецкага культурнага і палітычнага андэграўнду, што Кройцбэрг — гэта сталіца туркаў у Нямеччыне, прытулак бамжоў і абдахлёсаў, што гэта гняздо

фэмінізму. І ўсе яны будуць мець рацыю. Кройцбэрг — гэта сапраўды ўнікальнае месца. Увогуле і ў прыватнасьці.
Хто толькі ні жыве ў „чорным“ Кройцбэргу! Туркі, грэкі, югаславы, палякі, пуэртарыканцы і пэруанцы, манголы і кітайцы, арабы, маўры і іншыя афрыканцы; карацей, большасьць з 440 тысячаў аўслэндэраў, што насяляюць Бэрлін. Але не беларусы. Беларусы аддаюць перавагу Шонэбэргу, Штэгліцу, Маабіту, у горшым выпадку „беламу“ Кройцбэргу. Але ня ў „чорным“. Верагодна, я адзіны беларус, які жыве на вуліцы з прыгожай славянскай назвай „Горліца“. Месяцамі ня чую тут расейскай мовы. Толькі аднойчы ў Горліца-парку натыкнуўся на купку падлеткаў, якія размаўлялі па-расейску. Але з такой колькасьцю мату…
Я люблю прахадзіцца па кварталах, якія абкружаюць *Kottbuser Tor*. Бывае так, што памяць становіцца канцэнтрацыяй тугі. Гэтая частка Кройцбэргу мае нейкія гіпнатычныя ўласьцівасьці. Прыходжу туды, калі дзень, сшалелы ад мітусьні, уносіцца прэч, а на зьмену яму апускаецца бэзавы полаг вечара ў чаканьні лілёвай вядзьмаркі-начы… Люблю слухаць цяжкое дыханьне паўночных каналаў з прыклеенымі на іх фосфарна-белымі шванамі, глядзець, як гараць у антрацытавай цемры рыбацкія вогнішчы — ілюмінатары караблёў-рэстарацыяў, прышвартаваных у затоне ля *Admiral Brücke*… Уваходзіць у аазысы векавых дрэваў, аточаных джунглямі бэтонных каробак. Блукаць, каб злавіць выпадковасьць, сустрэчу, зь якой пачынаецца новы лёс, цянюткі струменьчык радасьці ў грымотным канцэрце жыцьця… Ухапіцца за нешта трывалае, больш трывалае, чым гэтае занадта новае жыцьцё наперадзе.

Уночы ў Кройцбэргу ўсё нагадвае сон энтамоляга, няма ні ўчора, ні заўтра. Будынкі са сьлядамі чалавечае фанабэрыі. Вуліцы зь мёртвымі каналамі, што цягнуцца бясконца і не вядуць нікуды. Ліхтары праціраюць вочы ў заспаных падваротнях са старасьвецкімі вадакалёнкамі ў вітых чыгунных балясах. Тут пачынае дзейнічаць нешта падобнае да таго, што складае для чалавека магію любое даўніны, любой руіны ці помніка: таямнічая прыцягальнасьць мінулага часу, які прыносіць разбурэньні. Але й надае вартасьць усяму таму, што астоілася. Стагодзьдзі наплываюць з глыбокага сну сьпячай Шпрэе.

Кройцбэрг — адзін з найстарэйшых раёнаў Бэрліна. Ён існаваў ужо тады, калі яшчэ не было *Neukolln*, *Tempelhof*, *Schöneberg* і інш. Яго будавалі надзейна і грунтоўна з каменя і бэтону дужыя вусатыя нямецкія дзецюкі, якія глядзяць на нас са старых фатаздымкаў.
А пабудаваўшы, сышлі ваяваць за справу кайзэра… І не вярнуліся. Не вярнуліся таксама іх дзеці і ўнукі ўжо з наступнай вайны, склаўшы галовы за справу фюрэра. І цяпер у іх дамох жывуць аўслэндэры. У Кройцбэргу ёсьць вуліцы са стопрацэнтова ненямецкім насельніцтвам. Даведайся пра гэта Гітлер, ён бы перавярнуўся ў труне.
Кройцбэрг — гэта эклектыка ў архітэктуры, дзе сарамлівая старадаўнасьць часта суседзіць з навязьлівым мадэрнам. Калі ідзеш старымі вулкамі, так і хочацца парасьпіхаць дамы, пабачыць, што ў іх там унутрах. Шкада толькі, што *Potsdamer Platz*, гэтая лябараторыя сучаснай архітэктуры, сёньня не ўваходзіць ужо, як і *Tiergarten*, у Кройцбэрг. Раён моцна пацярпеў падчас апошняй вайны. Толькі 3 лютага 1945 году 958 амэрыканскіх бамбавікоў скінулі на раёны *Mitte* і *Kreuzberg* 2270 тонаў бомбаў. Некаторыя вуліцы стаяць нібыта са шчарбінамі: шчыльны шэраг дамоў і раптам — пляцоўка для гульняў ці зялёны аазыс паміж імі.
Дасталося і кірхам. Некаторыя так і стаяць напаўразбураныя, некаторыя без купалоў.
Але кірхі паміраюць ня толькі ад бомбаў. Жыцьцё сыходзіць адтуль, калі няма адказу на актуальныя пытаньні сучаснасьці. І званы тады звоняць дарэмна…
Багема Кройцбэргу — самабытная і незвычайная. Гэта зрэалізаваныя і незрэалізаваныя мастакі і літаратары, музыкі і тэатралы, іншагароднія студэнты, палітыкі і нелегалы. Гэтых яго насельнікаў пабачыць ня так і проста. Іх палітычныя, анархічныя, фэміна-лесьбійскія, рэлігійныя і іншыя арганізацыі сядзяць у глыбокім андэграўндзе, схаваўшыся за шыльдамі „Babilonia“, „Wagendorf“ ці проста сьціпла — „Kulturclub“. Каб пазнаёміцца зь імі, вам давядзецца цёплым летнім вечарам заняць месца за столікам у тыповай кройцбэрскай кавярні з паабсыпанай тынкоўкай, бруднай падлогай і мігатлівымі ў цемры сьвечкамі недзе на *Oranienstrasse*, *Wienstrasse* ці *Gneisenau*. Бліжэй да паўночы яны пачнуць запаўняцца пэрсанажамі, выгляд каторых выкліча мэтамарфозы ў вашай гістарычнай

памяці. Лысыя жанчыны і мужчыны з косамі і хвастамі, барадачы да такой ступені, што выраз твару не зразумець ні за што, асабліва калі гэта твар, густа пакрыты колцамі і татуіроўкамі. У вопратцы, што мае музэйную каштоўнасьць, і той, якой, верагодна, мыюць падлогу. Такое адчуваньне, што хтосьці зь іх толькі што пакінуў манаскую цэлю, хтосьці вярнуўся з крыжовага паходу, хтосьці быў сябрам Тыля Ўленшпігеля, а хтосьці — куртызанкай часоў Мапасана. Скальды, пілігрымы, канкістадоры і іншыя флібусцьеры… На тварах у многіх зь іх напісана: „Насамрэч я яшчэ лепшы, я шэдэўр! Але наўрад ці вы лёгка трапіце ў маю прорву…“ Каго толькі ні сустрэнуць у гэтых прыцінах тыя, хто ўцякае ад нуднага правінцыйнага й сямейнага побыту, дзе жыцьцё страціла сюжэт.

Ёсьць і другая катэгорыя насельнікаў багемнага Кройцбэргу. Ранкамі на вохэнэд (гэта па-нямецку „ўік-энд“) каля скульптурнага комплексу на *Wrangelstrasse* часта мільдуецца (тусуецца) яшчэ адна вычварная кодла. Бабы, якім за 60, але ў міні-спадніцах, прыталеных расклёшаных нагавіцах, з глыбокім дэкальтэ, дзядкі зь белымі бародамі, хто ў белай тройцы і белых ботах на высокім абцасе, хто ў скураным прыкідзе з клёпкамі. Стаптаныя капыты ў пыле, шыя заплыла ў галаву, але на „Гарлі Дэвідсанах“… Вэтэраны гіпі і „Вудстаку“, першыя нямецкія рокеры, а можа, і былыя сябры *RAF*. Першы і апошні рудымэнт свабоды, як яны сябе называюць.

Няма нічога больш забаўнага, чымсьці назіраньне за рознага кшталту палітычнымі дэманстрацыямі ў Кройцбэргу. Вось тыповы Першамай. На *Oranien Platz* зранку ўжо хоць гаць гаці паліцэйскіх машынаў. *Polizei*, маладыя хлопцы з завушніцамі, некаторыя з бародкамі і ў акулярах, какетнічаюць з будучымі дэманстранткамі. Лысымі, з бугрыстымі галовамі, нібыта зь фільму „Марс атакуе“, татуяванымі так, што нашым паханом і ня сьнілася, і строгімі. Худзенькія дзяўчыняткі-*polizei* — на галаве коскі, за пасам — вялікія пісталеты — у сваю чаргу какетнічаюць з паважнымі панкамі ў савецкіх вайсковых ботах. Дзесьці ў абед зьяўляецца мноства плякатаў кшталту: „Далоў капіталізм!“, „Далоў эксплюатацыю“ — зь сярпамі й молатамі, элемэнтамі савецкай агітацыйнай графікі 20–30-ых гадоў і тройцай у выглядзе Маркса, Маа і Леніна. Далей суворыя фэміністкі з байранічнай бледасьцю, жывы сымбаль гатоўнасьці

пайсьці за ідэю хоць на край сьвету, пачынаюць лекцыю. Магутныя дынамікі перадаюць слухачам гнеўны патас іхных прамоваў аб загнілым капіталізьме, які бязьлітасна гнобіць працоўных, прыпудраных і падрумяненых зь іх падачы. А ў гэты час самі працоўныя, а дакладней непрацоўныя — сацыяльнікі — напампоўваюцца півам і танчаць „рэп“. Бліжэй да вечара жарсьці распальваюцца… і пайшла пісаць губэрня. Камуністы — панкі і анархісты з рознакаляровымі іракезамі на галовах — скандуюць лёзунгі, у тым ліку і ўлюбёны: „Die Arbeit ist Scheise!“. Носяцца з чырвонымі сьцягамі, сікаюць мінаком пад ногі і правакуюць паліцыю на сутычкі. Як і мае быць, сутычкі адбываюцца, самых буяных грузяць у машыны, і абодва бакі разыходзяцца з пачуцьцём выкананага абавязку. Ім, як і нашым „дафіністам“, неістотна, супраць каго і як бунтаваць, абы бунтаваць. Сёньня ён з чырвоным сьцягам, а заўтра — чорна-чырвоным, абы піва не канчалася.

Колькі словаў і пра аўтаномную турэцкую рэспубліку „Кройцбэрг“. Тут туркі жывуць так, як і ў сваіх фільмах, — знарочыста экспрэсіўна, з тэатральнымі вулічнымі сцэнамі, дзе любая нязначная праблема разьдзімаецца да памераў слана. Ад раньня і да вечара ў вокнах імбісаў (забягайлавак) відаць вусатых янычараў, што колюць ятаганамі бярвеньні мяса на пожагах. Запрашаюць шыльдамі на турэцкай мове крамы, кавярні і рэстарацыі, кірмашы і дыскатэкі. Зьбіраючы нэктар зь нямецкіх кветак, туркі старанна ігнаруюць усё нямецкае… апроч *Sozialamt*. У іх свая культура, заснаваная на пурытанстве і „*домострое*“, свая кухня, свая музыка, свая мода, ад якой жахаюцца фэмініcткі. Забаўна глядзець, як турэцкія паненкі ў туга павязаных хустках, задраўшы прыполы доўгіх спадніц, гуляюць у футбол. Ці як паважная маці радзіны, па самыя вочы захутаная ў чорнае, падвозіць свае дзеці ўраньні ў школу. Кажуць, калі адкрыліся межы, жыхароў былой ГДР больш за усё шакавала тое, як многа туркаў носіцца па Кройцбэргу на шыкоўных „Мэрсэдэсах“ і што пры гэтым няма ніводнага „Трабанту“. А што робіцца, калі „Галатасарай“ выйграе! Ува ўсіх турэцкіх кавярнях дым стаўпом і роў чуваць за кілямэтар. На вуліцах усю ноч страляніна, а машыны з турэцкімі сьцягамі ганяюць і сыгналяць безь пярэдыху…

І яшчэ пра адну славутасьць Кройцбэргу варта распавесьці. *Prinzenbad* — тут гэта свайго кшталту Рыўера, Лазурны бераг.

Летам тут сыходзіцца бамонд Кройцбэргу сябе паказаць і людзей паглядзець. Тут наладжваюць агледзіны сваіх трафэяў немкі, якія вярнуліся з набегаў у паўднёвыя краіны, тыя немкі, якія ставяцца з пагардай да нямецкіх мужчын. Даволі займальна бачыць, як мамці, абкружаныя дзецьмі і густа пакрытыя татуіроўкамі, у суправаджэньні рознакаляровых бацькоў сямействаў дэфілююць ад басэйну да басэйну, сустракаючыся, шчабечуць, дзеляцца ўражаньнямі…
Камю сьцьвярджаў, што самы зручны спосаб пазнаёміцца з горадам — гэта паспрабаваць даведацца, як тут працуюць, як тут кахаюць, як адпачываюць і як паміраюць. Паспрабуйце зрабіць гэта ў Кройцбэргу і вы.

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **04-08-2001**
[image]

Алесь Эроціч

Адзін погляд на Бэрлін з Крыжовай гары

АЛЕСЬ ЭРОЦІЧ беларускі мастак-нонканфарміст. У 90-ых заснаваў у Менску мастацкую суполку "Галіна", галерэю "Шостая лінія" і тэатар Сталёвы аргазм". Аўтар артыкулу Беларускі стрыптыз" у АКСНЕ-Парнаграфіі. З 1999 году стала жыве ў Бэрліне.

Вялікі бэзавы месяц прыматкабожыўся каля краю каменнага коміну. Куды ні кінеш позірк, паўсюль дахі, дахі… І толькі сьпічастыя кірхі вылазяць, нібыта шылы зь меху… Я ўсадзіў сваё ўяўленьне на дах, густа парослы экзатычнымі флянцамі, і слухаю музыку начнога гораду. Ноч падае на зямлю зорнай мапай, летаргія скавала горад, здранцьвеньне павісла сярод бэтонных скалаў. Натыкаючыся на сонныя ліпы, блукаюць россыпы жаночага сьмеху… Тут паветра мае смак, а гук — гушчыню. Суседнія тэрасы густа пакрыты елачкамі гашышу, і самотная варона завісла над імі ў шкляным паветры. Шіха струменіць час над дахамі, незаўважна пракручваюцца гадзіны ночы, зоркі сьцякаюць вільгацьцю… Паціху фантазіі канвэртуюцца ў фізіялёгію, і ўсё гэта становіцца Кройцбэргам. Нехта скажа пра Кройцбэрг, што гэта каменны мех у цэнтры Бэрліна, што тут цэнтар нямецкага культурнага і палітычнага андэграўнду, што Кройцбэрг — гэта сталіца туркаў у Нямеччыне, прытулак бамжоў і абдахлёсаў, што гэта гняздо

фэмінізму. І ўсе яны будуць мець рацыю. Кройцбэрг — гэта сапраўды ўнікальнае месца. Увогуле і ў прыватнасьці.
Хто толькі ні жыве ў „чорным“ Кройцбэргу! Туркі, грэкі, югаславы, палякі, пуэртарыканцы і пэруанцы, манголы і кітайцы, арабы, маўры і іншыя афрыканцы; карацей, большасьць з 440 тысячаў аўслэндэраў, што насяляюць Бэрлін. Але не беларусы. Беларусы аддаюць перавагу Шонэбэргу, Штэгліцу, Маабіту, у горшым выпадку „беламу“ Кройцбэргу. Але ня ў „чорным“. Верагодна, я адзіны беларус, які жыве на вуліцы з прыгожай славянскай назвай „Горліца“. Месяцамі ня чую тут расейскай мовы. Толькі аднойчы ў Горліца-парку натыкнуўся на купку падлеткаў, якія размаўлялі па-расейску. Але з такой колькасьцю мату…
Я люблю прахадзіцца па кварталах, якія абкружаюць *Kottbuser Tor*. Бывае так, што памяць становіцца канцэнтрацыяй тугі. Гэтая частка Кройцбэргу мае нейкія гіпнатычныя ўласьцівасьці. Прыходжу туды, калі дзень, сшалелы ад мітусьні, уносіцца прэч, а на зьмену яму апускаецца бэзавы полаг вечара ў чаканьні лілёвай вядзьмаркі-начы… Люблю слухаць цяжкое дыханьне паўночных каналаў з прыклеенымі на іх фосфарна-белымі шванамі, глядзець, як гараць у антрацытавай цемры рыбацкія вогнішчы — ілюмінатары караблёў-рэстарацыяў, прышвартаваных у затоне ля *Admiral Brücke*… Уваходзіць у аазысы векавых дрэваў, аточаных джунглямі бэтонных каробак. Блукаць, каб злавіць выпадковасьць, сустрэчу, зь якой пачынаецца новы лёс, цянюткі струменьчык радасьці ў грымотным канцэрце жыцьця… Ухапіцца за нешта трывалае, больш трывалае, чым гэтае занадта новае жыцьцё наперадзе.

Уночы ў Кройцбэргу ўсё нагадвае сон энтамоляга, няма ні ўчора, ні заўтра. Будынкі са сьлядамі чалавечае фанабэрыі. Вуліцы зь мёртвымі каналамі, што цягнуцца бясконца і не вядуць нікуды. Ліхтары праціраюць вочы ў заспаных падваротнях са старасьвецкімі вадакалёнкамі ў вітых чыгунных балясах. Тут пачынае дзейнічаць нешта падобнае да таго, што складае для чалавека магію любое даўніны, любой руіны ці помніка: таямнічая прыцягальнасьць мінулага часу, які прыносіць разбурэньні. Але й надае вартасьць усяму таму, што астоілася. Стагодзьдзі наплываюць з глыбокага сну сьпячай Шпрэе.

Кройцбэрг — адзін з найстарэйшых раёнаў Бэрліна. Ён існаваў ужо тады, калі яшчэ не было *Neukolln*, *Tempelhof*, *Schöneberg* і інш. Яго будавалі надзейна і грунтоўна з каменя і бэтону дужыя вусатыя нямецкія дзецюкі, якія глядзяць на нас са старых фатаздымкаў.
А пабудаваўшы, сышлі ваяваць за справу кайзэра… І не вярнуліся. Не вярнуліся таксама іх дзеці і ўнукі ўжо з наступнай вайны, склаўшы галовы за справу фюрэра. І цяпер у іх дамох жывуць аўслэндэры. У Кройцбэргу ёсьць вуліцы са стопрацэнтова ненямецкім насельніцтвам. Даведайся пра гэта Гітлер, ён бы перавярнуўся ў труне.
Кройцбэрг — гэта эклектыка ў архітэктуры, дзе сарамлівая старадаўнасьць часта суседзіць з навязьлівым мадэрнам. Калі ідзеш старымі вулкамі, так і хочацца парасьпіхаць дамы, пабачыць, што ў іх там унутрах. Шкада толькі, што *Potsdamer Platz*, гэтая лябараторыя сучаснай архітэктуры, сёньня не ўваходзіць ужо, як і *Tiergarten*, у Кройцбэрг. Раён моцна пацярпеў падчас апошняй вайны. Толькі 3 лютага 1945 году 958 амэрыканскіх бамбавікоў скінулі на раёны *Mitte* і *Kreuzberg* 2270 тонаў бомбаў. Некаторыя вуліцы стаяць нібыта са шчарбінамі: шчыльны шэраг дамоў і раптам — пляцоўка для гульняў ці зялёны аазыс паміж імі.
Дасталося і кірхам. Некаторыя так і стаяць напаўразбураныя, некаторыя без купалоў.
Але кірхі паміраюць ня толькі ад бомбаў. Жыцьцё сыходзіць адтуль, калі няма адказу на актуальныя пытаньні сучаснасьці. І званы тады звоняць дарэмна…
Багема Кройцбэргу — самабытная і незвычайная. Гэта зрэалізаваныя і незрэалізаваныя мастакі і літаратары, музыкі і тэатралы, іншагароднія студэнты, палітыкі і нелегалы. Гэтых яго насельнікаў пабачыць ня так і проста. Іх палітычныя, анархічныя, фэміна-лесьбійскія, рэлігійныя і іншыя арганізацыі сядзяць у глыбокім андэграўндзе, схаваўшыся за шыльдамі „Babilonia“, „Wagendorf“ ці проста сьціпла — „Kulturclub“. Каб пазнаёміцца зь імі, вам давядзецца цёплым летнім вечарам заняць месца за столікам у тыповай кройцбэрскай кавярні з паабсыпанай тынкоўкай, бруднай падлогай і мігатлівымі ў цемры сьвечкамі недзе на *Oranienstrasse*, *Wienstrasse* ці *Gneisenau*. Бліжэй да паўночы яны пачнуць запаўняцца пэрсанажамі, выгляд каторых выкліча мэтамарфозы ў вашай гістарычнай

памяці. Лысыя жанчыны і мужчыны з косамі і хвастамі, барадачы да такой ступені, што выраз твару не зразумець ні за што, асабліва калі гэта твар, густа пакрыты колцамі і татуіроўкамі. У вопратцы, што мае музэйную каштоўнасьць, і той, якой, верагодна, мыюць падлогу. Такое адчуваньне, што хтосьці зь іх толькі што пакінуў манаскую цэлю, хтосьці вярнуўся з крыжовага паходу, хтосьці быў сябрам Тыля Ўленшпігеля, а хтосьці — куртызанкай часоў Мапасана. Скальды, пілігрымы, канкістадоры і іншыя флібусцьеры… На тварах у многіх зь іх напісана: „Насамрэч я яшчэ лепшы, я шэдэўр! Але наўрад ці вы лёгка трапіце ў маю прорву…“ Каго толькі ні сустрэнуць у гэтых прыцінах тыя, хто ўцякае ад нуднага правінцыйнага й сямейнага побыту, дзе жыцьцё страціла сюжэт.

Ёсьць і другая катэгорыя насельнікаў багемнага Кройцбэргу. Ранкамі на вохэнэд (гэта па-нямецку „ўік-энд“) каля скульптурнага комплексу на *Wrangelstrasse* часта мільдуецца (тусуецца) яшчэ адна вычварная кодла. Бабы, якім за 60, але ў міні-спадніцах, прыталеных расклёшаных нагавіцах, з глыбокім дэкальтэ, дзядкі зь белымі бародамі, хто ў белай тройцы і белых ботах на высокім абцасе, хто ў скураным прыкідзе з клёпкамі. Стаптаныя капыты ў пыле, шыя заплыла ў галаву, але на „Гарлі Дэвідсанах“… Вэтэраны гіпі і „Вудстаку“, першыя нямецкія рокеры, а можа, і былыя сябры *RAF*. Першы і апошні рудымэнт свабоды, як яны сябе называюць.

Няма нічога больш забаўнага, чымсьці назіраньне за рознага кшталту палітычнымі дэманстрацыямі ў Кройцбэргу. Вось тыповы Першамай. На *Oranien Platz* зранку ўжо хоць гаць гаці паліцэйскіх машынаў. *Polizei*, маладыя хлопцы з завушніцамі, некаторыя з бародкамі і ў акулярах, какетнічаюць з будучымі дэманстранткамі. Лысымі, з бугрыстымі галовамі, нібыта зь фільму „Марс атакуе“, татуяванымі так, што нашым паханом і ня сьнілася, і строгімі. Худзенькія дзяўчыняткі-*polizei* — на галаве коскі, за пасам — вялікія пісталеты — у сваю чаргу какетнічаюць з паважнымі панкамі ў савецкіх вайсковых ботах. Дзесьці ў абед зьяўляецца мноства плякатаў кшталту: „Далоў капіталізм!“, „Далоў эксплюатацыю“ — зь сярпамі й молатамі, элемэнтамі савецкай агітацыйнай графікі 20–30-ых гадоў і тройцай у выглядзе Маркса, Маа і Леніна. Далей суворыя фэміністкі з байранічнай бледасьцю, жывы сымбаль гатоўнасьці

пайсьці за ідэю хоць на край сьвету, пачынаюць лекцыю. Магутныя дынамікі перадаюць слухачам гнеўны патас іхных прамоваў аб загнілым капіталізьме, які бязьлітасна гнобіць працоўных, прыпудраных і падрумяненых зь іх падачы. А ў гэты час самі працоўныя, а дакладней непрацоўныя — сацыяльнікі — напампоўваюцца півам і танчаць „рэп“. Бліжэй да вечара жарсьці распальваюцца… і пайшла пісаць губэрня. Камуністы — панкі і анархісты з рознакаляровымі іракезамі на галовах — скандуюць лёзунгі, у тым ліку і ўлюбёны: „Die Arbeit ist Scheise!“. Носяцца з чырвонымі сьцягамі, сікаюць мінаком пад ногі і правакуюць паліцыю на сутычкі. Як і мае быць, сутычкі адбываюцца, самых буяных грузяць у машыны, і абодва бакі разыходзяцца з пачуцьцём выкананага абавязку. Ім, як і нашым „дафіністам“, неістотна, супраць каго і як бунтаваць, абы бунтаваць. Сёньня ён з чырвоным сьцягам, а заўтра — чорна-чырвоным, абы піва не канчалася.

Колькі словаў і пра аўтаномную турэцкую рэспубліку „Кройцбэрг“. Тут туркі жывуць так, як і ў сваіх фільмах, — знарочыста экспрэсіўна, з тэатральнымі вулічнымі сцэнамі, дзе любая нязначная праблема разьдзімаецца да памераў слана. Ад раньня і да вечара ў вокнах імбісаў (забягайлавак) відаць вусатых янычараў, што колюць ятаганамі бярвеньні мяса на пожагах. Запрашаюць шыльдамі на турэцкай мове крамы, кавярні і рэстарацыі, кірмашы і дыскатэкі. Зьбіраючы нэктар зь нямецкіх кветак, туркі старанна ігнаруюць усё нямецкае… апроч *Sozialamt*. У іх свая культура, заснаваная на пурытанстве і „*домострое*“, свая кухня, свая музыка, свая мода, ад якой жахаюцца фэмініcткі. Забаўна глядзець, як турэцкія паненкі ў туга павязаных хустках, задраўшы прыполы доўгіх спадніц, гуляюць у футбол. Ці як паважная маці радзіны, па самыя вочы захутаная ў чорнае, падвозіць свае дзеці ўраньні ў школу. Кажуць, калі адкрыліся межы, жыхароў былой ГДР больш за усё шакавала тое, як многа туркаў носіцца па Кройцбэргу на шыкоўных „Мэрсэдэсах“ і што пры гэтым няма ніводнага „Трабанту“. А што робіцца, калі „Галатасарай“ выйграе! Ува ўсіх турэцкіх кавярнях дым стаўпом і роў чуваць за кілямэтар. На вуліцах усю ноч страляніна, а машыны з турэцкімі сьцягамі ганяюць і сыгналяць безь пярэдыху…

І яшчэ пра адну славутасьць Кройцбэргу варта распавесьці. *Prinzenbad* — тут гэта свайго кшталту Рыўера, Лазурны бераг.

Летам тут сыходзіцца бамонд Кройцбэргу сябе паказаць і людзей паглядзець. Тут наладжваюць агледзіны сваіх трафэяў немкі, якія вярнуліся з набегаў у паўднёвыя краіны, тыя немкі, якія ставяцца з пагардай да нямецкіх мужчын. Даволі займальна бачыць, як мамці, абкружаныя дзецьмі і густа пакрытыя татуіроўкамі, у суправаджэньні рознакаляровых бацькоў сямействаў дэфілююць ад басэйну да басэйну, сустракаючыся, шчабечуць, дзеляцца ўражаньнямі…
Камю сьцьвярджаў, што самы зручны спосаб пазнаёміцца з горадам — гэта паспрабаваць даведацца, як тут працуюць, як тут кахаюць, як адпачываюць і як паміраюць. Паспрабуйце зрабіць гэта ў Кройцбэргу і вы.

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **04-08-2001**
[image]

Палеміка

Да рэцэнзіі на кнігу Ю. Гарбінскага

У № 8 Вашага выдання за мінулы год змешчана вялікая рэцэнзія Юрася Лаўрыка “Даведнік з памылкамі“ на кнігу Ю. Гарбінскага “Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя“, выдадзеную ў 1999 г. у “Менску—Мюнхене“. Пасля васьмі старонак крытычных заўваг, якія ў пераважнай большасці я падзяляю (і нават мог бы дадаць нямала сваіх), сярод іншых высноў робіцца і такая: “Шкода таксама, што дактары навук Ул. Конан і А. Мальдзіс, імёны якіх, як сяброў Навукова-Рэдакцыйнае Рады, значацца ў кнізе (...), не паставіліся належным чынам да сваіх абавязкаў (можа, прывычка быць “вясельнымі генэраламі“ прывучае думаць пра свой навуковы аўтарытэт як пра нешта незварушнае і непрамінучае?)“ Аплявуха ў цэлым слушная, і павінен быў бы я прыняць яе з хрысціянскай пакорлівасцю, калі б не адна, мабыць, невядомая аўтару рэцэнзіі і, тым больш, чытачам “дробязь“. “Вясельны генерал“ звычайна прысутнічае на вяселлі, запрошаны на яго загадзя, а часам у яго нават “і па барадзе цячэ“. У мяне ж была зусім іншая сітуацыя: калі мне сказалі, што дзеля грыфу я павінен стаць адным з трох навуковых рэдактараў кнігі, у

патрэбнасці якой, па-мойму, ніхто не сумняваецца, я згадзіўся: “Добра, нясіце мне на які тыдзень рукапіс“. Пасля доўгага чакання мне паказалі “нявесту“ (яна ж будучая кніга) на якія трыццаць хвілінаў. Але нават гэтага часу мне было дастаткова, каб заўважыць асноўныя хібы: няпэўнасць крытэрыяў адбору, недастатковую сістэмнасць, кур’ёзнасць бібліяграфічнага апісання. І запатрабаваў, каб мне была прадастаўлена магчымасць не “генеральскага“, а сапраўднага рэдагавання. У адказ пачуў: “Позна.. Кніжка ўжо друкуецца...“ З “нявестай“ жа я грунтоўна пазнаёміўся — пасля настойлівых патрабаванняў — толькі праз два месяцы. Так што на “вяселлі“ я так і не змог папрысутнічаць. Сёння пра гэта пішу крыху з гумарам, няхай і змрочным, а раней толькі самабічаваўся: чаму не запратэставаў?! Мусіць, таму, што палічыў: у кніжцы ўсё ж сабраны значны фактычны матэрыял, яна ўсё ж можа стаць падставай для будучага паўнацэннага даведачнага выдання. Калі аўтар-укладальнік прыме крытыку і зробіць з яе належныя вывады. Бо сама задума, само імкненне былі патрэбныя, “міленійныя“.
Адам Мальдзіс

Яшчэ раз пра вясельле і вясельных маршалкаў
У № 8 *Літаратуры і Мастацтва* за гэты год зьявіўся допіс Уладзімера Конана “Драма беларускага хрысьціянскага адраджэньня“, прысьвечаны кнізе “Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя“ і маёй крытычнай рэцэнзіі на яе. У гэтай публікацыі доктар Конан, відаць, пакрыўдаваўшы на тое, што я назваў яго “вясельным генэралам“, паставіў за мэту ўсялякім чынам пераканаць чытача, што мая рэцэнзія — тэндэнцыйная, а мае цьверджаньні — няслушныя.
Частку артыкулу, мне прысьвечаную, д-р Конан пачынае з абвінавачваньняў у тэндэнцыйнасьці і “саветызьме“, але ніякіх цытатаў не падае. Д-ру Конану дастаткова некалькі разоў паўтарыць слова “тэндэнцыйнасьць“ — і справа зроблена, усе пераканаңыя! Мусіць, таксама дзеля гэтай пераканальнасьці, ён і адказ свой апублікаў не ў ARCHE-Скарына, у якім дыскусія была распачатая, а ў *ЛіМе* — то бо, выданьні з зусім іншай чытацкай аўдыторыяй, якая маёй рэцэнзіі не чытала і ня зможа параўнаць.
У сваім адказе д-р Конан вельмі спрытна абмінае пытаньне

вялікай колькасьці памылак, што прысутнічаюць у рэцэнзаваным даведніку. Гаворачы пра энцыкляпэдычныя выданьні са “шматлікім штатам рэдактараў і сотнямі аўтараў“, ён адзначае, што й там “не абыходзіцца без памылак, недакладнасцяў“. Рацыя — не абыходзіцца! Толькі праўда такая, што выраз “не абыходзіцца“ мае наўвеце невялікую колькасьць памылак, а я ў сваёй рэцэнзіі даводжу, што “ўся даведачная частка (кнігі “Беларускія рэлігійныя дзеячы...“) прасякнутая памылкамі наскрозь“ (С. 53—54). Каб там усяго толькі “не абышлося без памылак“, я нават і не падумаў бы марнаваць свой час на напісаньне такой рэцэнзіі.
Далей апанэнт распавядае, што “Юрась Гарбінскі адзін выдаў кнігу“, а таксама скардзіцца на ўмовы, у якіх аўтару і добраахвотным рэдактарам прыходзілася працаваць. Згадвае ён і пра тое, што сп-ру Гарбінскаму “прыходзілася спяшацца, як і кожнаму даследчыку, хто сёння хоча выдаць кніжку ў Беларусі. Адкладзеш на год — наяўныя грошы *сублімуюцца* (выветрываюцца, выпараюцца)“.
На маю думку, гэта ўсё гучыць бязглузда.
Абсалютна не разумею, чаму сп. Гарбінскаму так закарцела менавіта “сёння... выдаць кніжку ў Беларусі“, а не давесьці яе да ладу ды выдаць “заўтра“, каб сапраўды яму ўсе сказалі дзякуй?! Наяўныя грошы тут апраўданьнем служыць ня могуць, бо яны, да ведама майго апанэнта, маюць уласьцівасьць няблага перахоўвацца ў выглядзе валюты.
Д-р Конан выказвае поўны брак арыентацыі ў матэрыялах, пра якія выказваецца, найперш у пытаньні бібліяграфіі.
Тым ня менш, ёсьць у словах апанэнта адна думка, зь якой я не магу не пагадзіцца — лепей не зьмяшчаць ніякага бібліяграфічнага апісаньня ўвогуле, чым даваць яго з памылкамі.
Да слова мушу тут зазначыць, што ўвесь свой “бібліяграфічны“ пасаж быў адрасаваны ня столькі Ю. Гарбінскаму, колькі таму адмысловаму “рэдактару-бібліёграфу“, імя якога значыцца на адвароце тытульнага ліста кнігі. Бо для мяне гэта нонсэнс, што выданьне мае адмысловага рэдактара па бібліяграфічных пытаньнях (рэч даволі рэдкая!), а само ажно “роіцца“ бібліяграфічнымі памылкамі — і то прынцыповымі! Да таго ж, у мяне і ў думках не было абвінавачваць Ю. Гарбінскага ў тым, што ён не паставіў свайго імя на тытульным лісьце — я лічу

гэта цалкам нармальным. Але, разам з тым, я не ўважаю гэты момант за “сведчанне беларускай і хрысціянскай сціпласці Ю. Гарбінскага“ — гэта проста **нармальная навуковая карэктнасьць**. І я зусім не разумею, пры чым тут алюзіі паважанага апанэнта да нацыянальнасьці ды рэлігіі аўтара. Іду далей. Некалькі разоў д-р Конан ужывае адзін і той жа прыём: сьпярша замоўчвае асноўнае маё цьверджаньне, нібы яго і не было, а пасьля — з большай ці меншай рацыяй — пачынае чапляцца да цьверджаньня другаснага. Часта пры гэтым нават абцінаючы частку сказу, калі яна яму ня выгадная. Вось, напрыклад, піша: “Ю. Лаўрык крытыкуе загаловак кнігі “Беларускія рэлігійныя дзеячы“, кажучы, што “пры такой назьве ў кнізе мусяць быць зьмешчаны пэрсаналіі рабінаў ды імамаў зь Беларусі, чаго, аднак, не назіраецца“. Мабыць, рэцэнзент не ведае нашай Бацькаўшчыны. То я напомню: у нас няма беларускіх вернікаў ісламскага і юдэйскага веравызнання, як няма беларускіх імамаў і равінаў, якія б прапаведавалі Каран і Талмуд па-беларуску. (...) Вось калі Ю.Лаўрык захоча выдаць даведнік “Рэлігійныя дзеячы ў Беларусі ХХ стагоддзя“, то гэтая наіўная ў нашым кантэксце заўвага набудзе сур’ёзны змест“. Пішучы ўсё гэта, шаноўны доктар чамусьці “забыўся“ вытлумачыць, за **што** канкрэтна я крытыкую назву, і ў выніку ўсё выглядае так, нібы мне не даспадобы адсутнасьць сярод пэрсаналіяў гэтых самых імамаў ды рабінаў. От жа ж не: выбар крытэраў — справа аўтара; ён можа абмежавацца толькі хрысьціянскімі канфэсіямі, а можа ахапіць і прадстаўнікоў іншых рэлігіяў — ягоная воля! Праблема ў іншым — у тым, каб назва кнігі адпавядала зьместу. Тутака ж мы маем сытуацыю, калі кніга падрыхтавана выключна на хрысьціянскім матэрыяле, а ў тытуле значыцца: “рэлігійныя“ — што мае наўвеце **значна шырэйшы кантэкст**. (Я думаю, што пры такім зьмесьце лепей падышла б назва “Беларускія **хрысьціянскія** дзеячы“). І каб д-р Конан быў добрасумленным апанэнтам, ён мусіў бы альбо прызнаць маю рацыю, альбо аспрэчыць яе, калі мае на тое адрозныя меркаваньні, — але ні ў якім разе не рабіць выгляд, што я казаў нешта іншае.

Аднак нават абцінаючы мой сказ, паважаны доктар не ўсьцярогся, каб не ўвайсьці ў супярэчнасьць са сваімі ўласнымі словамі; бо на пачатку свайго артыкулу ён піша наступнае:

“Этнічнае паходжанне і нацыянальная прысутнасць далёка не адно і тое ж. Асноўны крытэр тут — жыццё і творчасць у кантэксце нацыянальнай мовы і культурнай традыцыі беларусаў. Сярод нашых рэлігійных дзеячоў былі беларускія, будуць палякі, украінцы, рускія, латышы, літоўцы. Дык скажыце, тады за што такая дыскрымінацыя ў адносінах да татараў? За тое, што яны ўжо ў XVII ст. мелі Каран па-беларуску[1] (а жыды, дарэчы, — шэраг біблійных арабскіх у XVI-м[2])? Ці за тое, што гэтыя самыя татары як неасьмотра, дык, прынамсі, ад XVI стагодзьдзя стваралі, перакладалі і камэнтавалі па-беларуску рэлігійныя тэксты?[3] Ці, можа, для майго шаноўнага апанэнта ў навіну тое, што гэтыя тэксты, зьмешчаныя ў Аль-Кітабах ды Хамаілах, ажно да пачатку XX стагодзьдзя ўключна стала ўзнаўляліся[4] — а знаходзіць, выкарыстоўваліся ў рэлігійнай практыцы? Няўжо ж усё пералічанае ня сьведчыць пра “жыццё і творчасць у кантэксце нацыянальнай мовы і культурнай традыцыі беларусаў”? Я працытую меркаваньне д-ра Янкі Станкевіча, які ў 3-ім годзе XX стагодзьдзя пісаў **пра сучасных яму** беларускіх татараў, адназначна называючы іх “беларускімі мусульманамі”: “Як калісь, так і цяперака просты беларускі народ завецца мусульманаў Татарамі, разумеючы пад гэтым назовам іх належнасьць да ісламу. І, таксама як калісь, мусульманы беларускія ўважаюць гэты назоў за зьнявагу, **заяўляючы, што яны мусульмане, а не Татары**. Беларускія мусульмане, апрычоных звычаяў, абрадаў, убораў і пад. ня маюць 12-ва ўсім, **апрача веры, ня розьняцца ад іншых Беларусаў**”[5] (Падкрэсьліваньні мае — **Ю.Л.**).

Бадай, лішне дадаваць, што, напрыклад, цяпер перадамной на стале ляжаць тры выпускі *Бейраму* (квартальнік Мусульманскага рэлігійнага аб’яднаньня ў Беларусі), Беларускага згуртаваньня татараў-мусульман “Аль-Кітаб” за 1999 год, дзе большасьць матэрыялаў апублікавана па-беларуску, і сярод іх, між іншым, прысутнічае сувязь беларускі пераклад Карану (Кур’ану), а таксама некаторыя іншыя рэлігійныя тэксты.

Што да беларускасьці тутэйшых жыдоў у XX стагодзьдзі, дык я, трэба прызнаць, падобных сьведчаньняў ня маю (хоць ёсьць пэўныя як ускосныя, так і беспасярэднія зьвесткі, раскіданыя па часе ад XII да XIX стагодзьдзяў[6]). Тое праўда, што ў Станкевіч

1. **Станкевіч Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом. Вільня, 1933. С. 8.**
2. **Wexler P. Christian, Jewish and Muslim translations of the Bible and Koran in Byelorussia: 16 – 19 centuries // The Journal of Byelorussian Studies, 1988, Vol. VI, No. 1, pp. 12-19.**
3. **Ayubauer M. The Five Biblical Scrolls in a Sixteenth-century Jewish Translation into Belorussian (Vilnius Codex 262). Jerusalem, 1992.**
3. **Станкевіч Я.**

жыды хутчэй зрусіфікаваныя, але тым ня менш, таксама
“небеларускасьць“ цягам усяго разгляданага ў дадзеным
пэрыяду зусім не зьяўляецца для мяне рэччу аніводнасьці,
ані даказанай..

У сваім артыкуле мой апанэнт увесь час спрабуе выцягнуць
“мэту — выкрыць аўтара кнігі“. Мушу падкрэсьліць, што
крытыцы не было нічога асабістага. Мая рэцэнзія была
скіраваная не супраць асобаў, а супраць **непрафэсіяналізму**
непрафэсіяналізму тых спэцыялістаў, што гэтую кнігу
рыхтавалі: аўтара, бібліёграфа, адказнага рэдактара. Гаворка
йдзе не пра асобы, а пра справу. А справа — фактам, голым
фактам — зробленая недасканала!

У пытаньні пра тэрмін “беларускі хрысьціянскі рух“ Конан
спачатку зазначае, што я аспрэчваю прымальнасьць
згаданага тэрміну да XVIII–XIX стагодзьдзяў, а пасьля
спасылаючыся на аўтарытэт кс. Адама Станкевіча
асобаў, якія, на ягоную думку, да гэтага руху належалі і
названы пэрыяд, і на заканчэньне падсумоўвае: “Ці
альбо не чытаў гэтай грунтоўнай кніжкі, альбо не хоча
спрачацца з яе аўтарам“.

Па-першае, цікава, дзе ж падзеліся XVI і XVII стагодзьдзі,
таксама згадваў? Па-другое, проста захапляе тая
даверлівасьць, зь якой д-р Конан прымае кожнае
названага аўтара, мяняючы яго зь невымоўным
“першадаследчыкам“.

Кнігі А. Станкевіча — сапраўдная скарбніца фактаў
гісторыі хрысьціянства ў Беларусі. Аднак гэта не
мы павінны бескрытычна прымаць усе ягоныя
палажэньні. За тыя 60 зь лішкам гадоў, што прайшлі
выхаду ягоных прац у сьвет, у мэтадалёгіі гістарычных
адбыліся пэўныя зьмены, і мы павінны на гэтыя
зважаць. Сёньня ніводзін сур’ёзны дасьледчык ня будзе
спрачацца зь цьверджаньнем, што нельга ацэньваць
паводле крытэраў сучаснасьці. Мы можам дашукацца
папярэдніх вякоў вытокаў тае ці іншае мадэрнае
можам пераносіць на рэаліі XVIII ці XIX ст. тэрміны,
датычаць рэаліяў стагодзьдзя XX-га. Гэта будзе
увагі на адрозныя палітычныя, эканамічныя ды
ўмовы, а тым болей — з увагі на сутнасны зьмест
зьявы; і беларускага хрысьціянскага руху гэта

Тамажа.; Meredith-Owens G. M., Nadson A. The Byelorussian Tartars and their Writings // The Journal of Byelorussian Studies. 1970. Vol. II, No. 2, pp. 141—176; Дуткін С. У., Канадскія татары. Нарысы гісторыі і культуры. Менск, 1993. С. 173; Рошчын М. Духоўная літаратура кітоўскіх татараў як этнакансалідацыйны фактар // Спадчына. 1997. № 6. С. 114—122.

першую чаргу!

Два абзацы д-р Конан прысьвячае бск. Лазінскаму. Пачынае апанэнт з апісаньня маіх пачуцьцяў, пра якія — у каторы раз — яму вядома болей, чым мне самому: “Не спадабаўся рэкцыянту біскуп Лазінскі, і ён палічыў за памылку ўключэньне жанга дзеяча ў даведнік“.

Па вялікім рахунку, калі ён хоць нешта зрабіў для Бацькаўшчыны, дык мае права быць узгаданы. Але хто магу зразумець, чаму для яго — пры ўсіх ягоных прапанаваных поглядах і дзейнасьці — Ю. Гарбінскі знайшоў чаму мяне, тады як пра а. Яна Матусевіча, які не адзін дзясятак гадоў аддаў сьвятарскаму служэньню ды ўдзельнічаў ледзь не ўва ўсіх буйных адраджэнскіх імпрэзах канца 1980 — пачатку 1990х, няма ні ўзгадкі, а Ю. Рапецкі і Э. Сабіла не ўвайшлі ў даведнік “з тэхнічных прычынаў“!

Абгрунтоўваючы патрэбу наяўнасьці біяграмы З. Лазінскага ў даведніку, д-р Конан спасылаецца на кнігі А. Станкевіча, а таксама на даведку ў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі“ — але ці то ня ведае, ці то сьвядома ігнаруе факт, што пра з. Лазінскі быў вядомы як польскі патрыёт, і толькі ў 1918 г. выступіў раптам як дабрадзей беларушчыны ў Каталіцкім Касьцёле. Ува ўсёй літаратуры перажоўваецца **толькі адзін рэальны факт** ягонае беларускае дзейнасьці: даўжэй прапаведаваць па-беларуску ў межах Менскае дыяцэзіі ды ўласныя казаньні на адпраўленай разам з а. Абрамовічам імшы ў сакавіку 1918 г. (Беларускасьць заснаванай Менскай сэмінарыі — гэта міт; там не было ані выкладаньня па-беларуску, ані нават беларускай мовы як прадмету). Прыгода беларускіх казаньняў простая: у лістападзе 1917-га Папам Бэнэдыктам XV была рэактываваная Менская рыма-каталіцкая дыяцэзія, якую царскія ўлады жывасілам скасавалі ў 1869-ым. Адначасова на ейны пасад быў намінаваны ардынар — кс. З. Лазінскі. Гэта быў час спадзяваньняў беларусаў на ўласную дзяржаўнасьць. Сьнежань 1917-га: Усебеларускі Зьезд і яго разгон бальшавікамі. Люты-сакавік 1918-га: акупацыя большай часткі Беларусі немцамі, Устаўныя граматы, абвяшчэньне БНР. Ужо на пачатку сакавіка ўсё гаворыць за тое, што беларуская дзяржава паўстане. Што мае рабіць у такой сытуацыі яшчэ не зацьверджаны канчаткова біскуп новаўтворанае дыяцэзіі? Разумеючы, наколькі хісткае ягонае

Менск, 1997. С. 6–14.

5 Станкевіч Я. Там жа. С. 12.

6 Гл., напр.: Wexler P. Jewish, Tatar and Karaite Communal Dialects and their Importance for Byelorussian Historical Linguistics // The Journal of Byelorussian Studies. 1973, Vol. III, No. 1, pp. 41–54; Brzezina M. Polszczyzna żydów. Warszawa-Kraków, 1986. S. 124, 506.

становішча, ён захоча прадэманстраваць сваю ляяльнасьць да будучых уладаў. Вось бск.. Лазінскі і знаходзіць спосаб гэта зрабіць — адпраўляе мшу сумесна з а. Абрантовічам (якога ведаў яшчэ па Пецярбургу) і гаворыць беларускае казаньне. Дазваляе таксама і іншым сьвятаром сваёй дыяцэзіі прамаўляць з амбоны па-беларуску. Але толькі напачатку — пакуль шанцы на ўмацаваньне беларускае дзяржаўнасьці падаюцца істотнымі. Нават калі прыходзяць бальшавікі і пачынаюць будаваць ува Ўсходняй Беларусі савецкую ўладу, ён яшчэ нейкі час талеруе беларушчыну — зрэшты, нядоўга. Як толькі ён пачынае разумець, што БССР — рэспубліка больш савецкая, чым беларуская, ягоная палітыка зноў набывае выразны прапольскі (чытай: антыбеларускі) характар.
Увесь артыкул майго апанэнта пабудаваны альбо на перакручваньнях, альбо на спробе маніпуляваць эмоцыямі чытача. Д-р Конан піша: “Што ж датычыцца “факталагічных і тэрміналагічных памылак“, то спадзяюся, мне ўдалося пераканаць чытача: яны маюць пераважна ідэалагічны і ацэначны характар, нечым нагадваюць (не зместам, а “пафасам“) бальшавіцкую крытыку“.
Безумоўна, гэтак няцяжка пераканаць чытача ў чым заўгодна, асабліва калі ад яго схаваць арыгінальны тэкст, а пасьля — пачынаючы ад спрытна падабранага эпіграфу з Эвангельля і заканчваючы “малітвай прымірэньня“ пры канцы допісу — даводзіць, што зробленая сьвятая справа, але ёсьць у краіне цёмныя сілы, якія ня дрэмлюць... Вельмі ўдалы ход, і вельмі “па-хрысьціянску“ — сьпярша выставіць свайго апанэнта дурнем, а пасьля сказаць: “Браце, я Табе дарую!“
Юрась Лаўрык, Лёндан

Водгук
Паважаны галоўны рэдактар!
Дазвольце падзякаваць Вам і спадару Юрасю Лаўрыку за рэцэнзію на кнігу Алены Яскевіч (ARCHE, 2001, № 1). Год таму ў адной з мінскіх кнігарняў я з жахам перагартаў гэты ейны “вучоны“ опус, дзе пазначана было і маё імя. Я напісаў абвяржэнне. За ім, аднак, аўтарка падняла “справу“ на прыступку вышэй, уводзячы ў беларускае “літаратуразнаўства“ вучонага-славіста Яраслава Альбертавіча Чыквіна. Няма такога

ў прыродзе! Поўная містыфікацыя!!! Падобна як няма ў прыродзе прафесаркі Сарбоны Шэр (апошні раздзел у кнізе)! Шкада, што аўтарка ўвяла ў зман і Інстытут літаратуры НАН, і выдавецтва.
Ян Чыквін, Бельск-Падляскі

Удакладненьне
Першы абзац майго артыкулу ў мінулым нумары “ARCHE-Скарыны” трэба чытаць гэтак: “Чаму беларускую культуру так кепска ведаюць у сьвеце? Чаму яна застаецца нават для суседзяў такой безаблічнай? Пры словах “польская культура“ адукаваны эўрапеец узгадвае Шапэна і Кесьлёўскага, пры словах “нарвэская культура“ — Мунка і Грыга. Пры словах “беларуская культура“ масквіч узгадае хіба фольк-рокераў з папулярнага ў савецкі час гурту “Песьняры“, а вось ужо ў бэрлінца найхутчэй увогуле ня ўзьнікне ніякіх асацыяцый, апроч Чарнобылю й Лукашэнкі”.
Андрэй Дынько

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **04-08-2001**
[image]

Палеміка

Да рэцэнзіі на кнігу Ю. Гарбінскага

У № 8 Вашага выдання за мінулы год змешчана вялікая рэцэнзія Юрася Лаўрыка “Даведнік з памылкамі“ на кнігу Ю. Гарбінскага “Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя“, выдадзеную ў 1999 г. у “Менску—Мюнхене“. Пасля васьмі старонак крытычных заўваг, якія ў пераважнай большасці я падзяляю (і нават мог бы дадаць нямала сваіх), сярод іншых высноў робіцца і такая: “Шкода таксама, што дактары навук Ул. Конан і А. Мальдзіс, імёны якіх, як сяброў Навукова-Рэдакцыйнае Рады, значацца ў кнізе (...), не паставіліся належным чынам да сваіх абавязкаў (можа, прывычка быць “вясельнымі генэраламі“ прывучае думаць пра свой навуковы аўтарытэт як пра нешта незварушнае і непрамінучае?)“ Аплявуха ў цэлым слушная, і павінен быў бы я прыняць яе з хрысціянскай пакорлівасцю, калі б не адна, мабыць, невядомая аўтару рэцэнзіі і, тым больш, чытачам “дробязь“. “Вясельны генерал“ звычайна прысутнічае на вяселлі, запрошаны на яго загадзя, а часам у яго нават “і па барадзе цячэ“. У мяне ж была зусім іншая сітуацыя: калі мне сказалі, што дзеля грыфу я павінен стаць адным з трох навуковых рэдактараў кнігі, у

патрэбнасці якой, па-мойму, ніхто не сумняваецца, я згадзіўся: “Добра, нясіце мне на які тыдзень рукапіс“. Пасля доўгага чакання мне паказалі “нявесту“ (яна ж будучая кніга) на якія трыццаць хвілінаў. Але нават гэтага часу мне было дастаткова, каб заўважыць асноўныя хібы: няпэўнасць крытэрыяў адбору, недастатковую сістэмнасць, кур’ёзнасць бібліяграфічнага апісання. І запатрабаваў, каб мне была прадастаўлена магчымасць не “генеральскага“, а сапраўднага рэдагавання. У адказ пачуў: “Позна.. Кніжка ўжо друкуецца...“ З “нявестай“ жа я грунтоўна пазнаёміўся — пасля настойлівых патрабаванняў — толькі праз два месяцы. Так што на “вяселлі“ я так і не змог папрысутнічаць. Сёння пра гэта пішу крыху з гумарам, няхай і змрочным, а раней толькі самабічаваўся: чаму не запратэставаў?! Мусіць, таму, што палічыў: у кніжцы ўсё ж сабраны значны фактычны матэрыял, яна ўсё ж можа стаць падставай для будучага паўнацэннага даведачнага выдання. Калі аўтар-укладальнік прыме крытыку і зробіць з яе належныя вывады. Бо сама задума, само імкненне былі патрэбныя, “міленійныя“.
Адам Мальдзіс

Яшчэ раз пра вясельле і вясельных маршалкаў
У № 8 *Літаратуры і Мастацтва* за гэты год зьявіўся допіс Уладзімера Конана “Драма беларускага хрысьціянскага адраджэньня“, прысьвечаны кнізе “Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя“ і маёй крытычнай рэцэнзіі на яе. У гэтай публікацыі доктар Конан, відаць, пакрыўдаваўшы на тое, што я назваў яго “вясельным генэралам“, паставіў за мэту ўсялякім чынам пераканаць чытача, што мая рэцэнзія — тэндэнцыйная, а мае цьверджаньні — няслушныя.
Частку артыкулу, мне прысьвечаную, д-р Конан пачынае з абвінавачваньняў у тэндэнцыйнасьці і “саветызьме“, але ніякіх цытатаў не падае. Д-ру Конану дастаткова некалькі разоў паўтарыць слова “тэндэнцыйнасьць“ — і справа зроблена, усе пераканаңыя! Мусіць, таксама дзеля гэтай пераканальнасьці, ён і адказ свой апублікаў не ў ARCHE-Скарына, у якім дыскусія была распачатая, а ў *ЛіМе* — то бо, выданьні з зусім іншай чытацкай аўдыторыяй, якая маёй рэцэнзіі не чытала і ня зможа параўнаць.
У сваім адказе д-р Конан вельмі спрытна абмінае пытаньне

вялікай колькасьці памылак, што прысутнічаюць у рэцэнзаваным даведніку. Гаворачы пра энцыкляпэдычныя выданьні са “шматлікім штатам рэдактараў і сотнямі аўтараў“, ён адзначае, што й там “не абыходзіцца без памылак, недакладнасцяў“. Рацыя — не абыходзіцца! Толькі праўда такая, што выраз “не абыходзіцца“ мае наўвеце невялікую колькасьць памылак, а я ў сваёй рэцэнзіі даводжу, што “ўся даведачная частка (кнігі “Беларускія рэлігійныя дзеячы...“) прасякнутая памылкамі наскрозь“ (С. 53—54). Каб там усяго толькі “не абышлося без памылак“, я нават і не падумаў бы марнаваць свой час на напісаньне такой рэцэнзіі.
Далей апанэнт распавядае, што “Юрась Гарбінскі адзін выдаў кнігу“, а таксама скардзіцца на ўмовы, у якіх аўтару і добраахвотным рэдактарам прыходзілася працаваць. Згадвае ён і пра тое, што сп-ру Гарбінскаму “прыходзілася спяшацца, як і кожнаму даследчыку, хто сёння хоча выдаць кніжку ў Беларусі. Адкладзеш на год — наяўныя грошы *сублімуюцца* (выветрываюцца, выпараюцца)“.
На маю думку, гэта ўсё гучыць бязглузда.
Абсалютна не разумею, чаму сп. Гарбінскаму так закарцела менавіта “сёння... выдаць кніжку ў Беларусі“, а не давесьці яе да ладу ды выдаць “заўтра“, каб сапраўды яму ўсе сказалі дзякуй?! Наяўныя грошы тут апраўданьнем служыць ня могуць, бо яны, да ведама майго апанэнта, маюць уласьцівасьць няблага перахоўвацца ў выглядзе валюты.
Д-р Конан выказвае поўны брак арыентацыі ў матэрыялах, пра якія выказваецца, найперш у пытаньні бібліяграфіі.
Тым ня менш, ёсьць у словах апанэнта адна думка, зь якой я не магу не пагадзіцца — лепей не зьмяшчаць ніякага бібліяграфічнага апісаньня ўвогуле, чым даваць яго з памылкамі.
Да слова мушу тут зазначыць, што ўвесь свой “бібліяграфічны“ пасаж быў адрасаваны ня столькі Ю. Гарбінскаму, колькі таму адмысловаму “рэдактару-бібліёграфу“, імя якога значыцца на адвароце тытульнага ліста кнігі. Бо для мяне гэта нонсэнс, што выданьне мае адмысловага рэдактара па бібліяграфічных пытаньнях (рэч даволі рэдкая!), а само ажно “роіцца“ бібліяграфічнымі памылкамі — і то прынцыповымі! Да таго ж, у мяне і ў думках не было абвінавачваць Ю. Гарбінскага ў тым, што ён не паставіў свайго імя на тытульным лісьце — я лічу

гэта цалкам нармальным. Але, разам з тым, я не ўважаю гэты момант за “сведчанне беларускай і хрысціянскай сціпласці Ю. Гарбінскага“ — гэта проста **нармальная навуковая карэктнасьць**. І я зусім не разумею, пры чым тут алюзіі паважанага апанэнта да нацыянальнасьці ды рэлігіі аўтара. Іду далей. Некалькі разоў д-р Конан ужывае адзін і той жа прыём: сьпярша замоўчвае асноўнае маё цьверджаньне, нібы яго і не было, а пасьля — з большай ці меншай рацыяй — пачынае чапляцца да цьверджаньня другаснага. Часта пры гэтым нават абцінаючы частку сказу, калі яна яму ня выгадная. Вось, напрыклад, піша: “Ю. Лаўрык крытыкуе загаловак кнігі “Беларускія рэлігійныя дзеячы“, кажучы, што “пры такой назьве ў кнізе мусяць быць зьмешчаны пэрсаналіі рабінаў ды імамаў зь Беларусі, чаго, аднак, не назіраецца“. Мабыць, рэцэнзент не ведае нашай Бацькаўшчыны. То я напомню: у нас няма беларускіх вернікаў ісламскага і юдэйскага веравызнання, як няма беларускіх імамаў і равінаў, якія б прапаведавалі Каран і Талмуд па-беларуску. (...) Вось калі Ю.Лаўрык захоча выдаць даведнік “Рэлігійныя дзеячы ў Беларусі ХХ стагоддзя“, то гэтая наіўная ў нашым кантэксце заўвага набудзе сур’ёзны змест“. Пішучы ўсё гэта, шаноўны доктар чамусьці “забыўся“ вытлумачыць, за **што** канкрэтна я крытыкую назву, і ў выніку ўсё выглядае так, нібы мне не даспадобы адсутнасьць сярод пэрсаналіяў гэтых самых імамаў ды рабінаў. От жа ж не: выбар крытэраў — справа аўтара; ён можа абмежавацца толькі хрысьціянскімі канфэсіямі, а можа ахапіць і прадстаўнікоў іншых рэлігіяў — ягоная воля! Праблема ў іншым — у тым, каб назва кнігі адпавядала зьместу. Тутака ж мы маем сытуацыю, калі кніга падрыхтавана выключна на хрысьціянскім матэрыяле, а ў тытуле значыцца: “рэлігійныя“ — што мае наўвеце **значна шырэйшы кантэкст**. (Я думаю, што пры такім зьмесьце лепей падышла б назва “Беларускія **хрысьціянскія** дзеячы“). І каб д-р Конан быў добрасумленным апанэнтам, ён мусіў бы альбо прызнаць маю рацыю, альбо аспрэчыць яе, калі мае на тое адрозныя меркаваньні, — але ні ў якім разе не рабіць выгляд, што я казаў нешта іншае.

Аднак нават абцінаючы мой сказ, паважаны доктар не ўсьцярогся, каб не ўвайсьці ў супярэчнасьць са сваімі ўласнымі словамі; бо на пачатку свайго артыкулу ён піша наступнае:

“Этнічнае паходжанне і нацыянальная прысутнасць далёка не адно і тое ж. Асноўны крытэр тут — жыццё і творчасць у кантэксце нацыянальнай мовы і культурнай традыцыі беларусаў. Сярод нашых рэлігійных дзеячоў былі беларускія, будуць палякі, украінцы, рускія, латышы, літоўцы. Дык скажыце, тады за што такая дыскрымінацыя ў адносінах да татараў? За тое, што яны ўжо ў XVII ст. мелі Каран па-беларуску[1] (а жыды, дарэчы, — шэраг біблійных арабскім XVI-м[2])? Ці за тое, што гэтыя самыя татары як неасьмотра, дык, прынамсі, ад XVI стагодзьдзя стваралі, перакладалі і камэнтавалі па-беларуску рэлігійныя тэксты?[3] Ці, можа, для майго шаноўнага апанэнта ў навіну тое, што гэтыя тэксты, зьмешчаныя ў Аль-Кітабах ды Хамаілах, ажно да пачатку XX стагодзьдзя ўключна стала ўзнаўляліся[4] — а значыць, і выкарыстоўваліся ў рэлігійнай практыцы? Няўжо ж усё пералічанае ня сьведчыць пра “жыццё і творчасць у кантэксце нацыянальнай мовы і культурнай традыцыі беларусаў”? Я працытую меркаваньне д-ра Янкі Станкевіча, які ў 3-ім годзе XX стагодзьдзя пісаў **пра сучасных яму** беларускіх татараў, адназначна называючы іх “беларускімі мусульманамі”: “Як калісь, так і цяперака просты беларускі народ завецца мусульманаў Татарамі, разумеючы пад гэтым назовам іх належнасьць да ісламу. І, таксама як калісь, мусульмане беларускія ўважаюць гэты назоў за зьнявагу, **заяўляючы, што яны мусульмане, а не Татары**. Беларускія мусульмане, апрычоных звычаяў, абрадаў, убораў і пад. ня маюць 12-ва ўсім, **апрача веры, ня розьняцца ад іншых Беларусаў**”[5] (Падкрэсьліваньні мае — **Ю.Л.**).

Бадай, лішне дадаваць, што, напрыклад, цяпер перадамной на стале ляжаць тры выпускі *Бейраму* (квартальнік Мусульманскага рэлігійнага аб’яднаньня ў Беларусі), Беларускага згуртаваньня татараў-мусульман “Аль-Кітаб” за 1999 год, дзе большасьць матэрыялаў апублікавана па-беларуску, і сярод іх, між іншым, прысутнічае сувязь беларускі пераклад Карану (Кур’ану), а таксама некаторыя іншыя рэлігійныя тэксты.

Што да беларускасьці тутэйшых жыдоў у XX стагодзьдзі, дык я, трэба прызнаць, падобных сьведчаньняў ня маю (хоць ёсьць пэўныя як ускосныя, так і беспасярэднія зьвесткі, раскіданыя па часе ад XII да XIX стагодзьдзяў[6]). Тое праўда, што ў канцы

[1] **Станкевіч Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом. Вільня, 1933. С. 8.**

[2] **Wexler P. Christian, Jewish and Muslim translations of the Bible and Koran in Byelorussia: 16 – 19 centuries // The Journal of Byelorussian Studies, 1988, Vol. VI, No. 1, pp. 12–19.**

[3] **Ayubauer M. The Five Biblical Scrolls in a Sixteenth-century Jewish Translation into Belorussian (Vilnius Codex 262). Jerusalem, 1992.**

[3] **Станкевіч Я.**

жыды хутчэй зрусіфікаваныя, але тым ня менш, таксама
“небеларускасьць“ цягам усяго разгляданага ў дадзеным
пэрыяду зусім не зьяўляецца для мяне рэччу аніводнасьці,
ані даказанай..

У сваім артыкуле мой апанэнт увесь час спрабуе выцягнуць
“мэту — выкрыць аўтара кнігі“. Мушу падкрэсьліць, што
крытыцы не было нічога асабістага. Мая рэцэнзія была
скіраваная не супраць асобаў, а супраць **непрафэсіяналізму**
непрафэсіяналізму тых спэцыялістаў, што гэтую кнігу
рыхтавалі: аўтара, бібліёграфа, адказнага рэдактара. Гаворка
йдзе не пра асобы, а пра справу. А справа — фактам, голым
фактам — зробленая недасканала!

У пытаньні пра тэрмін “беларускі хрысьціянскі рух“ Конан
спачатку зазначае, што я аспрэчваю прымальнасьць
згаданага тэрміну да XVIII–XIX стагодзьдзяў, а пасьля
спасылаючыся на аўтарытэт кс. Адама Станкевіча
асобаў, якія, на ягоную думку, да гэтага руху належалі і
названы пэрыяд, і на заканчэньне падсумоўвае: “Ці
альбо не чытаў гэтай грунтоўнай кніжкі, альбо не хоча
спрачацца з яе аўтарам“.

Па-першае, цікава, дзе ж падзеліся XVI і XVII стагодзьдзі,
таксама згадваў? Па-другое, проста захапляе тая
даверлівасьць, зь якой д-р Конан прымае кожнае
названага аўтара, мяняючы яго зь невымоўным
“першадаследчыкам“.

Кнігі А. Станкевіча — сапраўдная скарбніца фактаў
гісторыі хрысьціянства ў Беларусі. Аднак гэта не
мы павінны бескрытычна прымаць усе ягоныя
палажэньні. За тыя 60 зь лішкам гадоў, што прайшлі
выхаду ягоных прац у сьвет, у мэтадалёгіі гістарычных
адбыліся пэўныя зьмены, і мы павінны на гэтыя
зважаць. Сёньня ніводзін сур’ёзны дасьледчык ня будзе
спрачацца зь цьверджаньнем, што нельга ацэньваць
паводле крытэраў сучаснасьці. Мы можам дашукацца
папярэдніх вякоў вытокаў тае ці іншае мадэрнае
можам пераносіць на рэаліі XVIII ці XIX ст. тэрміны,
датычаць рэаліяў стагодзьдзя XX-га. Гэта будзе
увагі на адрозныя палітычныя, эканамічныя ды
ўмовы, а тым болей — з увагі на сутнасны зьмест
зьявы; і беларускага хрысьціянскага руху гэта

Тамажа.; Meredith-Owens G. M., Nadson A. The Byelorussian Tartars and their Writings // The Journal of Byelorussian Studies. 1970. Vol. II, No. 2, pp. 141—176; Дуткін С. У., Канадскія татары. Нарысы гісторыі і культуры. Менск, 1993. С. 173; Рошчын М. Духоўная літаратура кітоўскіх татараў як этнакансалідацыйны фактар // Спадчына. 1997. № 6. С. 114—122.

першую чаргу!

Два абзацы д-р Конан прысьвячае бск. Лазінскаму. Пачынае апанэнт з апісаньня маіх пачуцьцяў, пра якія — у каторы раз — яму вядома болей, чым мне самому: “Не спадабаўся рэкцыянту біскуп Лазінскі, і ён палічыў за памылку ўключэньне жанга дзеяча ў даведнік“.

Па вялікім рахунку, калі ён хоць нешта зрабіў для Бацькаўшчыны, дык мае права быць узгаданы. Але хто магу зразумець, чаму для яго — пры ўсіх ягоных прапанаваных поглядах і дзейнасьці — Ю. Гарбінскі знайшоў чаму месца, тады як пра а. Яна Матусевіча, які не адзін дзясятак гадоў аддаў сьвятарскаму служэньню ды ўдзельнічаў ледзь не ўва ўсіх буйных адраджэнскіх імпрэзах канца 1980 — пачатку 1990х, няма ні ўзгадкі, а Ю. Рапецкі і Э. Сабіла не ўвайшлі ў даведнік “з тэхнічных прычынаў“!

Абгрунтоўваючы патрэбу наяўнасьці біяграмы З. Лазінскага ў даведніку, д-р Конан спасылаецца на кнігі А. Станкевіча, а таксама на даведку ў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі“ — але ці то ня ведае, ці то сьвядома ігнаруе факт, што пра з. Лазінскі быў вядомы як польскі патрыёт, і толькі ў 1918 г. выступіў раптам як дабрадзей беларушчыны ў Каталіцкім Касьцёле. Ува ўсёй літаратуры перажоўваецца **толькі адзін рэальны факт** ягонае беларускае дзейнасьці: даўжэй прапаведаваць па-беларуску ў межах Менскае дыяцэзіі ды ўласныя казаньні на адпраўленай разам з а. Абрамовічам імшы ў сакавіку 1918 г. (Беларускасьць заснаванай Менскай сэмінарыі — гэта міт; там не было ані выкладаньня па-беларуску, ані нават беларускай мовы як прадмету). Прыгода беларускіх казаньняў простая: у лістападзе 1917-га Папам Бэнэдыктам XV была рэактываваная Менская рыма-каталіцкая дыяцэзія, якую царскія ўлады жывасілам скасавалі ў 1869-ым. Адначасова на ейны пасад быў намінаваны ардынар — кс. З. Лазінскі. Гэта быў час спадзяваньняў беларусаў на ўласную дзяржаўнасьць. Сьнежань 1917-га: Усебеларускі Зьезд і яго разгон бальшавікамі. Люты-сакавік 1918-га: акупацыя большай часткі Беларусі немцамі, Устаўныя граматы, абвяшчэньне БНР. Ужо на пачатку сакавіка ўсё гаворыць за тое, што беларуская дзяржава паўстане. Што мае рабіць у такой сытуацыі яшчэ не зацьверджаны канчаткова біскуп новаўтворанае дыяцэзіі? Разумеючы, наколькі хісткае ягонае

Менск, 1997. С. 6–14.

5 Станкевіч Я. Там жа. С. 12.

6 Гл., напр.: Wexler P. Jewish, Tatar and Karaite Communal Dialects and their Importance for Byelorussian Historical Linguistics // The Journal of Byelorussian Studies. 1973, Vol. III, No. 1, pp. 41–54; Brzezina M. Polszczyzna żydów. Warszawa-Kraków, 1986. S. 124, 506.

становішча, ён захоча прадэманстраваць сваю ляяльнасьць да будучых уладаў. Вось бск.. Лазінскі і знаходзіць спосаб гэта зрабіць — адпраўляе мшу сумесна з а. Абрантовічам (якога ведаў яшчэ па Пецярбургу) і гаворыць беларускае казаньне. Дазваляе таксама і іншым сьвятаром сваёй дыяцэзіі прамаўляць з амбоны па-беларуску. Але толькі напачатку — пакуль шанцы на ўмацаваньне беларускае дзяржаўнасьці падаюцца істотнымі. Нават калі прыходзяць бальшавікі і пачынаюць будаваць ува Ўсходняй Беларусі савецкую ўладу, ён яшчэ нейкі час талеруе беларушчыну — зрэшты, нядоўга. Як толькі ён пачынае разумець, што БССР — рэспубліка больш савецкая, чым беларуская, ягоная палітыка зноў набывае выразны прапольскі (чытай: антыбеларускі) характар.
Увесь артыкул майго апанэнта пабудаваны альбо на перакручваньнях, альбо на спробе маніпуляваць эмоцыямі чытача. Д-р Конан піша: “Што ж датычыцца “факталагічных і тэрміналагічных памылак“, то спадзяюся, мне ўдалося пераканаць чытача: яны маюць пераважна ідэалагічны і ацэначны характар, нечым нагадваюць (не зместам, а “пафасам“) бальшавіцкую крытыку“.
Безумоўна, гэтак няцяжка пераканаць чытача ў чым заўгодна, асабліва калі ад яго схаваць арыгінальны тэкст, а пасьля — пачынаючы ад спрытна падабранага эпіграфу з Эвангельля і заканчваючы “малітвай прымірэньня“ пры канцы допісу — даводзіць, што зробленая сьвятая справа, але ёсьць у краіне цёмныя сілы, якія ня дрэмлюць... Вельмі ўдалы ход, і вельмі “па-хрысьціянску“ — сьпярша выставіць свайго апанэнта дурнем, а пасьля сказаць: “Браце, я Табе дарую!“
Юрась Лаўрык, Лёндан

Водгук
Паважаны галоўны рэдактар!
Дазвольце падзякаваць Вам і спадару Юрасю Лаўрыку за рэцэнзію на кнігу Алены Яскевіч (ARCHE, 2001, № 1). Год таму ў адной з мінскіх кнігарняў я з жахам перагартаў гэты ейны “вучоны“ опус, дзе пазначана было і маё імя. Я напісаў абвяржэнне. За ім, аднак, аўтарка падняла “справу“ на прыступку вышэй, уводзячы ў беларускае “літаратуразнаўства“ вучонага-славіста Яраслава Альбертавіча Чыквіна. Няма такога

ў прыродзе! Поўная містыфікацыя!!! Падобна як няма ў прыродзе прафесаркі Сарбоны Шэр (апошні раздзел у кнізе)! Шкада, што аўтарка ўвяла ў зман і Інстытут літаратуры НАН, і выдавецтва.
Ян Чыквін, Бельск-Падляскі

Удакладненьне
Першы абзац майго артыкулу ў мінулым нумары “ARCHE-Скарыны” трэба чытаць гэтак: “Чаму беларускую культуру так кепска ведаюць у сьвеце? Чаму яна застаецца нават для суседзяў такой безаблічнай? Пры словах “польская культура“ адукаваны эўрапеец узгадвае Шапэна і Кесьлёўскага, пры словах “нарвэская культура“ — Мунка і Грыга. Пры словах “беларуская культура“ масквіч узгадае хіба фольк-рокераў з папулярнага ў савецкі час гурту “Песьняры“, а вось ужо ў бэрлінца найхутчэй увогуле ня ўзьнікне ніякіх асацыяцый, апроч Чарнобылю й Лукашэнкі”.
Андрэй Дынько

[image]
[image]

№ 3 (17) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **04-08-2001**
[image]

Адам Глёбус

Хайку, напісаныя на дарогах зь Менску ў Вільню й зь Вільні ў Менск

Студзень
* * *

Насустрач сьнегу
прыдарожны чорны крыж
раскінуў рукі.

* * *

Цячэ дарога
праз шэрае малако
сьнежнай завеі.

Люты
* * *

Чорны сабачка
засьнежанае поле

АДАМ ГЛЁБУС літаратар і выдавец, мастацкі рэдактар часопісу "ARCHE". Апошнія кнігі - зборнік выбранае прозы "Тэксты" ("АСТ", 2000), том афарызмаў "Кантамінацыі" ("Наша Ніва", 1999).

перабягае.

* * *

Сядзяць на лёдзе
рыбакі ў чорных кажу-
хох… Вечарэе.

* * *

Доўгачаканы
горад на даляглядзе
шыбамі зазьзяў.

Сакавік

* * *

Зырка сьвеціцца
на карычневым полі
сьнег у барознах.

* * *

Жоўтыя кроквы
на сакавіцкім сонцы
пахнуць смалою.

* * *

Мястэчка Ракаў
парасстаўляла дамкі
паміж гарамі.

* * *

Расклаў селянін
зь леташняга быльнягу
вогнішча ў полі.

* * *

* * * * * * * * * *

* * * На жоўтым
полі
лапік сьнегу
растае —
гарыць на
вачах. * * * * *

* * * * * * * * *
* * * * * * * * *
* * * * * * * * *
* * * *

Танчаць за акном
сьветла-малочныя па-
рушынкі сьнегу.
Празь лес, па сьнезе,
заклаўшы рукі за сьпі-
ну, йдзе селянін.
На тонкай шыбе
мой папяровы анёл
прычакаў вясну.
Сьнег сышоў, а сад
у лагчыне між грудоў
усё яшчэ сьпіць.
На ровары праз
возера хутка едзе
па лёдзе рыбак.

Танку й хайку, напісаныя ў паветры
ў дарозе зь Менску ў Маскву

Цёмна-сіняе
самалётнае крыло
лёгка ўздрыгвае
над засьнежаным полем,
далёкім, як Радзіма.

Красавік

Чытаючы Кёсі
Падаецца мне,
гэта ластаўка ў небе
займела душу.
Зусім павольна
па сьцяжыне праз могілкі
іду да сваіх.
Адбіваюцца
тонкія бярэзіны
ў сінім возеры.
Іду нясьпешна
па вільготных імхах, праз

красавіцкі лес.
Мытня на мяжы.
З маленькай сіняй хмары
раптам сьнег пайшоў.
На Кальварыі.
Маўчаньне старых крыжоў
пад голым клёнам.
Красавіцкі сьнег —
густы, вільготны, цяжкі —
ляціць на Вільню.
Прыгадваецца
папяровы караблік,
гляджу на ручай.
Сонца. Вялікдзень.
П'яніца на дарозе.
Другі, трэці, чаць...
Сьцюдзёны вецер.
У будцы хаваюцца
міліцыянты.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 04-08-2001
[image]

Адам Глёбус

Хайку, напісаныя на дарогах зь Менску ў Вільню й зь Вільні ў Менск

Студзень
* * *

Насустрач сьнегу
прыдарожны чорны крыж
раскінуў рукі.

* * *

Цячэ дарога
праз шэрае малако
сьнежнай завеі.

Люты
* * *

Чорны сабачка
засьнежанае поле

АДАМ ГЛЁБУС літаратар і выдавец, мастацкі рэдактар часопісу "ARCHE". Апошнія кнігі - зборнік выбранае прозы "Тэксты" ("АСТ", 2000), том афарызмаў "Кантамінацыі" ("Наша Ніва", 1999).

перабягае.

* * *

Сядзяць на лёдзе
рыбакі ў чорных кажу-
хох… Вечарэе.

* * *

Доўгачаканы
горад на даляглядзе
шыбамі зазьзяў.

Сакавік

* * *

Зырка сьвеціцца
на карычневым полі
сьнег у барознах.

* * *

Жоўтыя кроквы
на сакавіцкім сонцы
пахнуць смалою.

* * *

Мястэчка Ракаў
парасстаўляла дамкі
паміж гарамі.

* * *

Расклаў селянін
зь леташняга быльнягу
вогнішча ў полі.

* * *

* * * * * * * * * *

* * * На жоўтым
полі
лапік сьнегу
растае —
гарыць на
вачах. * * * * *

* * * * * * * * *
* * * * * * * * *
* * * * * * * * *
* * * *

Танчаць за акном
сьветла-малочныя па-
рушынкі сьнегу.
Празь лес, па сьнезе,
заклаўшы рукі за сьпі-
ну, йдзе селянін.
На тонкай шыбе
мой папяровы анёл
прычакаў вясну.
Сьнег сышоў, а сад
у лагчыне між грудоў
усё яшчэ сьпіць.
На ровары праз
возера хутка едзе
па лёдзе рыбак.

Танку й хайку, напісаныя ў паветры
ў дарозе зь Менску ў Маскву

Цёмна-сіняе
самалётнае крыло
лёгка ўздрыгвае
над засьнежаным полем,
далёкім, як Радзіма.

Красавік

Чытаючы Кёсі
Падаецца мне,
гэта ластаўка ў небе
займела душу.
Зусім павольна
па сьцяжыне праз могілкі
іду да сваіх.
Адбіваюцца
тонкія бярэзіны
ў сінім возеры.
Іду нясьпешна
па вільготных імхах, праз

красавіцкі лес.
Мытня на мяжы.
З маленькай сіняй хмары
раптам сьнег пайшоў.
На Кальварыі.
Маўчаньне старых крыжоў
пад голым клёнам.
Красавіцкі сьнег —
густы, вільготны, цяжкі —
ляціць на Вільню.
Прыгадваецца
папяровы караблік,
гляджу на ручай.
Сонца. Вялікдзень.
П'яніца на дарозе.
Другі, трэці, чаць...
Сьцюдзёны вецер.
У будцы хаваюцца
міліцыянты.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 04-08-2001
[image]